Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій»

**І. А. Пушкін**
**А. Р. Агееў**

# КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ЎСХОДНІХ РЭГІЁНАЎ БССР (1944–1991)

МАНАГРАФІЯ

Магілёў
БДУТ
2022

УДК 94(476)
ББК Т63.3 (4Бел)
П91

**Пушкін, І. А.** Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў : БДУТ, 2022. – 302 с. – ISBN 978-985-7281-36-7.

У манаграфіі ахарактарызаваны прамысловасць і кадравы склад усходніх рэгіёнаў Савецкай Беларусі ў 1944–1991 гг., асвятляюцца і аналізуюцца фактары і ўмовы фарміравання кадравага патэнцыялу, кадравая палітыка і меры цэнтральных і рэгіянальных улад па пераадоленні эканамічных і сацыяльных праблем у прамысловасці ва ўсходняй частцы БССР (1944–1991).

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам і студэнтам, а таксама ўсім, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй.

Табл. 17. Бібліягр.: 345 наз.

Друкуецца па рашэнні
Савета ўніверсітэта ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій»

Рэцэнзенты:
Загадчык цэнтра гісторыі Беларусі канца XVIII–XXI стагоддзяў
Інстытута гісторыі НАН Беларусі
доктар гістарычных навук, дацэнт *М. У. Смяховіч,*
загадчык кафедры эканамічнай гісторыі
Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта
доктар гістарычных навук, дацэнт *Н. І. Палятаева,*
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі
Інстытута гісторыі НАН Беларусі
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *В. Г. Мазец*

**ISBN 978-985-7281-36-7**

© Пушкін І. А., Агееў А. Р., 2022
© Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
харчовых і хімічных тэхналогій», 2022

**Змест**


Уводзіны *(І. Пушкін, А. Агееў)* ………………………………… 5

**Глава 1 Агульная характарыстыка прамысловасці і кадраў БССР** 13

1.1Фарміраванне і характарыстыка структуры прамысловасці ў 1944–1990 гг. *(А. Агееў, І. Пушкін)* ……………………….. 13

1.2 Характарыстыка і сацыяльная стратыфікацыя прамысловых кадраў БССР у 1944–1970 гг. *(А. Агееў)* …………………….. 44

1.3 Кадравы склад прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі ў 1970–1991 гг.: шляхі фарміравання і ўдасканалення *(І. Пушкін)* …………………………………………………… 61

1.4 Нацыянальны склад і фактары міжэтнічнага ўзаемадзеяння ў працэсе фарміравання кадравага патэнцыялу прамысловых прадпрыемстваў у 1945–1991 гг. *(А. Агееў, І. Пушкін)* …………………………………………………… 84

**Глава 2 Фактары і ўмовы фарміравання кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР у 1945–1991 гг.** ……………………… 93

2.1 Уплыў рэформ і змен умоў жыцця грамадства на развіццё прамысловасці і фарміраванне яе кадравага патэнцыялу ў другой палове 1940–1960-х гг. *(А. Агееў)* ……………………. 93

2.2 Меры фарміравання і ўдасканалення кадраў прамысловасці як фактара ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця БССР у 1955–1970 гг. *(А. Агееў)* …….. 112

2.3 Уплыў грамадска-палітычных, эканамічных і сацыякультурных фактараў на змест і фарміраванне кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР у 1970–1991 гг. *(І. Пушкін)* ………………………………………………….. 132

**Глава 3 Кадравая палітыка ў Савецкай Беларусі** …………………. 156

3.1 Партыйнае кіраўніцтва і кантроль за фарміраваннем кадраў прамысловых прадпрыемстваў у 1944–1970 гг. *(А. Агееў)*… 156

3.2 Кадравая палітыка кіраўніцтва СССР і БССР у 1970–1980-я гг. *(І. Пушкін)* ………………………………………………….. 166

3.3 Кадравы патэнцыял па матэрыялах рэгіянальных органаў КПБ (1970–1991) *(І. Пушкін)* ……………………………… 183

**Глава 4 Меры цэнтральных і рэгіянальных улад па пераадоленню эканамічных і сацыяльных праблем у прамысловасці** …… 193

4.1 Антыкарупцыйныя аспекты кадравай палітыкі ў прамысловасці і рашучае навядзенне парадку ў кадравай сферы і народнай гаспадарцы БССР у 1944–1970 гг. *(А. Агееў)* …………………………………………………… 193

4.2 Вытворчыя канфлікты на прамысловых прадпрыемствах, спосабы іх урэгулявання і ўплыў на кадравую палітыку ў 1950–1970 гг. *(А. Агееў)* ………………………………………… 212
4.3 Пралікі ў правядзенні кадравай палітыкі БССР на прыкладзе ўсходнебеларускіх абласцей *(І. Пушкін)* …………………….. 224
4.4 Меры цэнтральных і рэгіянальных улад па пераадоленні эканамічных і сацыяльных праблем у прамысловасці (1970–1991) *(І. Пушкін)* ……………………………………… 234
Высновы і заключэнне *(І. Пушкін, А. Агееў,)* …………………….. 263
Бібліяграфія …………………………………………………... 272
Дадаткі ………………………………………………………... 294
Спіс скарачэнняў ……………………………………………... 300
Summary ………………………………………………………. 301

## Уводзіны

Прамысловы комплекс з'яўляўся ў XX ст. адным з галоўных сектараў забеспячэння эканамічнай бяспекі краіны, шмат у чым вызначаў размяшчэнне прадукцыйных сіл і фарміраванне навукова-тэхнічнага патэнцыялу. Сучаснае развіццё эканомікі Рэспублікі Беларусь патрабуе фарміравання канкурэнтаздольнага інавацыйнага прамысловага комплексу, арыентаванага на стварэнне высокавытворчых працоўных месцаў. Гэтага немагчыма дасягнуць без аналізу і ўсебаковага вывучэння шляхоў эканамічнага развіцця Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды. У прыватнасці часу, калі Савецкая Беларусь паступова стала займаць вядучыя пазіцыі ў прамысловасці СССР. Даследаванне і раскрыццё зместу кадравага патэнцыялу прамысловасці ў 1944–1991 гг. дазваляе выпрацаваць глыбока прадуманую, адпаведную інтарэсам краіны, дзяржаўную палітыку ў сферы эканомікі і гуманітарнага развіцця сучаснага беларускага грамадства.

Аб'ектам нашага даследавання з'яўляліся кадры прамысловасці, а прадметам – фарміраванне і ўдасканаленне кадравага патэнцыялу прамысловасці і кадравая палітыка ў БССР на прыкладзе ўсходніх рэгіёнаў Беларусі ў 1944–1991 гг.[1] Геаграфічныя межы даследавання абумоўлены тым, што да 1939 г. развіццё прамысловасці Беларусі адбывалася найперш на ўсходзе рэспублікі. Гэтая асаблівасць захоўвалася ў першыя дзесяцігоддзі пасля Другой сусветнай вайны і аказвала пэўны ўплыў у пазнейшы час. Мы зыходзілі з таго, што **кадры** – гэта кваліфікаваныя, спецыяльна падрыхтаваныя для той ці іншай дзейнасці работнікі, калі іх выкарыстанне прадугледжвае максімальную аддачу таго, што здольны даць спецыяліст па сваёй адукацыі, асабістым якасцям, набытаму досведу працы. **Кадравы патэнцыял** – магчымасці пэўнай катэгорыі рабочых, спецыялістаў, іншых груп работнікаў, якія могуць быць прыведзены ў дзеянне ў працэсе працоўнай дзейнасці ў адпаведнасці са службовымі абавязкамі і пастаўленымі перад калектывам, рэгіёнам і грамадствам мэтамі. Пад **кадравай палітыкай** разумелі мэты, прынцыпы і мерапрыемствы па забеспячэнню прамысловага комплексу кадрамі з улікам патрэбаў развіцця вытворчасцей і павышэння канкурэнтаздольнасці традыцыйных відаў эканамічнай дзейнасці.

Кадры прамысловасці БССР можна падзяліць на чатыры групы: кіраўнікі, спецыялісты, рабочыя і кадры вышэйшай кваліфікацыі. Да першай групы адносяцца: 1) партыйна-савецкі апарат, які вызначаў асноўныя кірункі сацыяльна-эканамічнага развіцця; 2) кіруючыя кадры вышэйшага звяна кіравання: кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў і іх намеснікі, начальнікі самастойных упраўленняў і аддзелаў цэнтральнага апарату міністэрстваў і ведамстваў і іх намеснікі, генеральныя дырэктары прамысловых аб'яднанняў і іх намеснікі, генеральныя дырэктары навукова-вытворчых аб'яднанняў, кіраўнікі самастойных прадпрыемстваў, трэстаў, камбінатаў і іх намеснікі; 3) кіруючыя кадры сярэдняга звяна кіравання: кіраўнікі прадпрыемстваў і іх

[1] У межах сучасных Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей. У якасці дапаўненняў і параўнання выкарыстоўваўся фактычны матэрыял і па іншых рэгіёнах Беларусі.

намеснікі, галоўныя інжынеры (галоўныя тэхнолагі, галоўныя эканамісты, галоўныя бухгалтары) прадпрыемстваў, рэктары, прарэктары, дырэктары ўстаноў і арганізацый і іх намеснікі; 4) кіруючыя кадры ніжняга звяна кіравання: начальнікі змен, цэхаў, дэканы, загадчыкі аддзелаў (кафедр), прарабы, майстры. Да другой групы (спецыялісты): 1) кваліфікаваныя кадры з вышэйшай адукацыяй (інжынерна-гаспадарчыя спецыялісты, выкладчыкі, навуковыя работнікі і спецыялісты); 2) кваліфікаваныя кадры з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (тэхнолагі). Трэцяя група – рабочыя кадры: 1) кваліфікаваныя кадры рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй; 2) кваліфікаваныя кадры рабочых з сярэдняй і пачатковай адукацыяй. Да чацвёртай групы кадраў адносіліся кіраўнікі і спецыялісты, якія мелі навуковую ступень або званне: кандыдаты і дактары навук, акадэмікі і члены-карэспандэнты, прафесары і дацэнты.

Улічваючы, што склад партыйна-савецкага апарату і працэс фарміравання рабочых кадраў актыўна разглядаўся ў гістарычнай навуцы, мы засяродзілі сваю ўвагу ў асноўным на аналізе якаснага складу кіраўнікоў і спецыялістаў прамысловых прадпрыемстваў, адлюстроўваючы, пры неабходнасці, працэсы, звязаныя з партыйным кіраваннем і рабочымі. Не засяроджваючы сваю ўвагу на падрабязным асвятленні агульнавядомых дасягненняў прамысловага развіцця ў савецкі час, мы даём толькі агульную характарыстыку і раскрываем найбольш важныя працэсы і праблемы, якія мелі непасрэдныя дачыненні да кадраў прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР.

У манаграфіі аналіз кадравага патэнцыялу прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў Савецкай Беларусі праводзіцца з улікам эканамічных перадумоў, у цеснай ўзаемасувязі з навукова-тэхнічным, працоўным, вытворчым патэнцыялам, якія аказвалі непасрэдны ўплыў на колькасныя і якасныя параметры кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР, заканамернасці яго развіцця і эфектыўнага выкарыстання.

На аснове апублікаваных крыніц і новых архіўных матэрыялаў намі ахарактарызаваны структура прамысловасці і кадраў усходніх абласцей БССР, асноўныя напрамкі кадравай палітыкі партыйна-савецкай улады як інструмента павышэння эфектыўнасці працы прамысловых прадпрыемстваў у 1944–1991 гг.; вызначаны шляхі падбору і прызначэння на кіруючыя пасады, фарміравання кадравага рэзерву (кадравага актыву ў сучаснай тэрміналогіі), змест і ўдасканаленне кадравага складу прамысловасці; сістэма перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў для прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі; праведзены аналіз кадравага патэнцыялу з улікам наступстваў урбанізацыі; выяўлены і ахарактарызаваны ўплыў геапалітычных, грамадска-палітычных, дэмаграфічных, аксіялагічных, сацыякультурных, гендэрных, навукова-тэхнічных, эканамічных і вытворчых фактараў, міжэтнічнага ўзаемадзеяння на працэсы фарміравання, удасканалення і рэалізацыі кадравага патэнцыялу беларускай прамысловасці; эканамічныя і сацыяльныя праблемы, якія аказвалі істотны ўплыў на фарміраванне і ўдасканаленне кадравага патэнцыялу прамысловасці ва ўсходняй частцы БССР і меры па іх пераадоленню.

У працэсе працы праводзіліся аналіз і абагульненне апублікаваных індывідуальных і калектыўных манаграфій, навуковых артыкулаў, крыніц і матэрыялаў, даследчыцкая і пошукавая дзейнасць у архівах Віцебска, Гомеля, Магілёва, Мінска, Полацка, Оршы.

Асвятляючы развіццё прамысловасці ў БССР, трэба мець на ўвазе, што шмат якія даныя афіцыйнай савецкай статыстыкі тэндэнцыйныя і няпоўныя, асабліва ў першы пасляваенны перыяд, яны дазвалялі афіцыйна скажаць у бок завышэння рэальны рост эканомікі. Аднак мы вымушаны звяртацца да статыстычнага ўліку, паколькі і яго скажоныя дадзеныя з’яўляюцца пэўным адлюстраваннем тагачаснай эканамічнай рэчаіснасці.

У гістарыяграфіі пасляваеннага аднаўлення і развіцця прамысловасці БССР вылучаюць два асноўныя перыяды: савецкі, які завяршыўся з распадам СССР, і паслясавецкі, або сучасны, перыяд, які пачынаецца з пачатку 90-х гг. XX ст. і працягваецца да цяперашняга часу. У савецкі час даследаванні праводзіліся на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі. Другі перыяд, пачатак якога супаў са стварэннем незалежнай Рэспублікі Беларусь, адрозніваецца метадалагічным плюралізмам.

Агульная характарыстыка прамысловых кадраў, найперш рабочых, давалася ў шматлікіх публікацыях савецкага часу, але тагачасныя даследчыкі грашылі статыстычнасцю і ідэалагічнасцю – прывязанасцю аналізу дадзеных да камуністычных ідэалагічных установак. У выніку, характэрнай рысай работ, якія напісаны ў савецкі перыяд, з’яўляецца іх ідэалагічная накіраванасць. Акрамя таго, у савецкіх даследчыкаў не было магчымасці поўнамаштабнага выкарыстання архіўных матэрыялаў. Напрыклад, у працах тых гадоў асновай аднаўлення разбуранай у перыяд Вялікай Айчыннай вайны народнай гаспадаркі ў гэтых працах абвяшчалася гераічная праца савецкага народа, кіруючая роля КПСС і перавагі планавага вядзення гаспадаркі. Роля і значэнне КПСС у справе падрыхтоўкі, фарміравання і кіравання кадрамі даследавалася строга ў рэчышчы “генеральнай лініі” партыі. У публікацыях галоўным было паказаць тое, што задачы, якія ставіліся перад кадравым складам, былі падпарадкаваны фарміраванню новага сацыялістычнага ладу пад кіраўніцтвам КПСС.

Для прац савецкага перыяду характэрна замоўчванне выкарыстанне прымусовай працы, наяўнасць судовай адказнасці рабочых за прагулы, выкарыстанне камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання, пастаўкі і выкарыстанне прамысловага абсталявання па рэпарацыях, сацыяльна-эканамічныя праблемы ў прамысловасці і на прадпрыемствах. Адсутнічала спроба вызначэння тых кадравых груп прамысловасці, якія не ўпісваліся ў каноны марксісцкай тэорыі. Пралікі і недахопы як у развіцці прамысловасці, так і ў кадравай палітыцы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва савецкай Беларусі даследаваліся толькі пасля змены кіраўніцтва СССР ці БССР, на якое і ўскладалася асноўная віна за ўсе праблемы.

У савецкай гістарыяграфіі тэма кадравага патэнцыялу прамысловасці знайшла некаторае адлюстраванне ў калектыўных працах[1] і публікацыях А. Ліса[2], І. Равуна[3], А. Купрэевай[4], Г. Аляхновіча[5], прысвечаных пасляваеннаму аднаўленню і развіццю ў наступныя дзесяцігоддзі народнай гаспадаркі БССР. Працэс тэхнічнай рэканструкцыі беларускай прамысловасці, будаўніцтва новых заводаў і фабрык, падрыхтоўкі новых кваліфікаваных кадраў змешчаны ў двух манаграфіях І. Марчанка[6], дзе асаблівая ўвага ўдзяляецца раскрыццю дзейнасці партыйных арганізацый па развіццю працоўнай і палітычнай актыўнасці працоўных, масавага сацыялістычнага спаборніцтва, руху наватараў вытворчасці, адлюстраваны колькасныя і якасныя змены працоўнага класа.

Важным дасягненнем беларускай гістарыяграфіі стала выданне "Гісторыі Беларускай ССР" у 5 тамах (1972–1975)[7]. У 5-м томе гэтай працы паказана рознабаковая дзейнасць працоўных калектываў прамысловых прадпрыемстваў БССР.

Вялікае значэнне мае вывучэнне вопыту вытворчай дзейнасці прадпрыемстваў на аснове дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, масавай тэхнічнай творчасці, удзелу рабочых прамысловасці ў рацыяналізацыі і вынаходніцтве, руху наватараў вытворчасці. Першымі буйнымі даследаваннямі на гэтую тэму з'явіліся манаграфіі В. Фаміна[8] і М. Лахманенка[9]. Метады фарміравання і ўдасканалення кадравага патэнцыялу аналізуюцца ў працах Р. Петухова і калектыўным дапаможніку пад агульнай рэдакцыяй М. Лісіцына[10]. Прававы і фактычны матэрыял пра развіццё прамысловасці ўтрымліваецца ў абагульняючых працах савецкага перыяду[11]. Неабходна

[1] Экономика Советской Белоруссии. 1917–1967 / редкол.: Ф. Мартинкевич (отв. ред.) [и др.]. Минск, 1967; Экономика Белоруссии в период послевоенного возрождения / З. И. Гиоргидзе [и др.] ; под ред. В. И. Дрица. Минск, 1988; Энергетика Белоруссии (1917–1967). Минск, 1968; Промышленность Белорусской ССР (1913–1975). Минск, 1976; Белорусская ССР в годы Советской власти. Стат. сб. Под ред. Червенева Б. Н. и др. Минск, 1967; Народное хозяйство Белорусской ССР. Минск, 1965.

[2] Лис А. Г. Проблемы развития и размещения производительных сил Белоруссии. М., 1972.

[3] Равун И. И. Национальный доход Белорусской ССР на этапе развитого социализма. Минск , 1978.

[4] Купреева А. П. Возрождение народного хозяйства Белоруссии. Минск, 1976; Яе ж. Дапамога савецкага ўрада і працоўных брацкіх рэспублік у аднаўленні народнай гаспадаркі Беларусі (верасень 1943–1945 г.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1972. № 2. С. 13–21.

[5]Олехнович Г. И. Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны (1941–1945). Минск, 1982.

[6] Марченко И. Е. Рабочий класс БССР в послевоенные годы (1945–1950). Минск, 1962; Яго ж. Трудовой подвиг рабочего класса Белорусской ССР (1943–1950). Минск, 1977.

[7] Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. Т. 4 : Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.) / І. С. Краўчанка [і інш.]. Мінск, 1975; Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. Т. 5 : Беларуская ССР у перыяд стварэння развітога сацыялістычнага грамадства і будаўніцтва камунізму (1945–1974 гг.) / А. А. Філімонаў [і інш.]. Мінск, 1975.

[8] Фомин В. М. Профсоюзы Белоруссии в борьбе за технический прогресс в промышленности (1946–1971 гг.). Минск, 1971.

[9] Лохманенко Н. А. Технический прогресс и творчество масс. Минск, 1976.

[10] Лисицин Н. А., Синица Л. М., Висюлин Ф. П. Экономика, организация и планирование промышленного производства : Учебное пособие для экономических вузов и факультетов. Минск, 1990; Петухов Р. М. Оценка эффективности промышленного производства : Методы и показатели. М., 1990.

[11] Гісторыя Беларускай ССР: У 2 т. Т. 2 / Пад. рэд. І. С. Краўчанкі, Н. В. Каменскай. Мінск, 1958; Прамысловасць Беларусі. Мінск, 1980; История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 4. Рабочий класс БССР на этапе совершенствования социализма (1961–1986) / Редкол.тома: И. Е. Марченко (отв.ред.) и др. Минск, 1987; Социальные изменения рабочего класса Белоруссии в процессе строительства коммунизма / В. И. Степанов, [и др.] ; под ред. К. П. Буслова. Минск, 1985.

таксама адзначыць публікацыі, прысвечаныя найбуйнейшым прамысловым прадпрыемствам БССР, у якіх коратка адлюстравана гісторыя іх аднаўлення або стварэння ў пасляваенны перыяд[1].

Для сучасных даследаванняў гісторыі Савецкай Беларусі і СССР, у тым ліку кадравай палітыкі ў галіне прамысловасці, каштоўнай крыніцай з'яўляюцца матэрыялы КПБ (КПСС) і Вярхоўнага Савета БССР[2]; абагульняючыя статыстычныя звесткі, якія ўтрымліваюцца ў зборніках аб развіцці народнай гаспадаркі БССР[3] і матэрыялы цэнтральных і рэгіянальных архіваў Беларусі[4].

Формы і метады падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі партыйных і савецкіх кадраў у партыйных навучальных установах рэспублікі, у сістэме курсаў і семінараў пры мясцовых партыйных камітэтах, роля і значэнне КПСС і КПБ у справе падрыхтоўкі, фарміравання і кіравання кадрамі раскрыты ў шэрагу публікацый 1970–1980 гг. У іх кадры разумеліся як асноўны сталы склад падрыхтаваных работнікаў партыйных, савецкіх, гаспадарчых і грамадскіх арганізацый, дзеячаў навукі і культуры, ваеннаслужачых, а таксама работнікаў масавых прафесій усіх галін народнай гаспадаркі. У гэты круг уключаліся як кіруючыя кадры, так і шараговыя працаўнікі[5].

Толькі пасля пачатку палітыкі перабудовы і распаду СССР раней забароненыя тэмы атрымалі новы імпульс. Працы, створаныя ў постсавецкі перыяд, адрозніваюцца выкарыстаннем вялікай колькасці архіўных дадзеных,

---

[1] Напрыклад: Котенок И. П., Майоров Н. Н., Райский В. Я. Гомсельмаш. Минск, 1970; Казаков Г. М., Райский В. Я., Фабрикант Д. М. Гомельский станкостроительный. Минск : Беларусь, 1979; Блистинов М. М., Богушевич Ю. К., Вайнруб Е. Г. Минский автомобильный. Очерк истории завода. Минск, 1972; Короткевич А. Т. Минский вагоноремонтный. Минск, 1971.

[2] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. Минск, 1983; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. Минск, 1987; Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. М., 1986; Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 13. М., 1986; Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 14. М., 1987; Трэцяя сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР восьмага склікання 22–23 чэрвеня 1972 года. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1972.

[3] Народное хозяйство Белорусской ССР. Минск, 1965; Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г.: стат. ежегод. Минск, 1975; Народное хозяйство СССР за 70 лет: Юбилейный стат. ежегодник. М., 1987; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1987 г.: Стат. ежегодник. Минск, 1988; Народное хозяйство СССР в 1970 году: Стат. ежегодник. М., 1971 і інш.

[4] Государственный архив Витебской области: путеводитель, 1917–2006 / сост. Т. В. Буевич, Ю. С. Петухов. Минск, 2011; Зональный государственный архив в г. Полоцке. Путеводитель. 1943–2007 / сост. Т. В. Буевич, Р. В. Счастная, И. Д. Третьяк. Минск, 2011; Путеводитель. 1917–2004. Зональный государственный архив в г. Орше. Орша, 2009.

[5] Возрастание руководящей роли КПСС в строительстве социализма и коммунизма / Редкол.: Родионов П. А. и др. М., 1979; Бобков Б.А. Укрепление рядов сельских коммунистов. Деятельность КПБ по организационному укреплению партийных организаций колхозов и совхозов (1961–1966 гг.). Минск, 1972; Клецко Л. Г. Ответственность руководителя // Партийная жизнь. 1983. № 1. С. 30–35; Куличенко Л. Школы партийно-хозяйственного актива важное средство теоретической и практической подготовки кадров // Партийная жизнь. 1982. № 2. С. 21–26; Петровичев Н.А. Возрастание руководящей роли КПСС и вопросы организационно-политической работы. М., 1982; Пронин И. И. Руководящие кадры: подбор, расстановка и воспитание. М., 1981; Разумов Е.З. Проблемы кадровой политики КПСС. М., 1983; Таратута В. Н. Залог успешной деятельности руководящих кадров // Партийная жизнь. 1982. № 7. С. 27–32; Шаньгин Б. Подбор, расстановка и воспитание кадров ключевая задача // Партийная жизнь. 1984. № 29. С. 39–43; Костеров А. П. Формы и методы работы Компартии Белоруссии по подготовке, переподготовке и воспитанию партийных и советских кадров (1961–1965 гг.): Автореф.дис...канд.ист.наук 07.00.01. Минск, 1984.

раней недаступных для навукоўцаў, адрозніваюцца ад публікацый савецкага часу не толькі метадалогіяй і шырынёй архіўных дадзеных, але і істотнай зменай прыярытэтаў. Гістарыяграфія ў гэты перыяд папоўнілася навуковымі працамі па эканамічнай гісторыі Беларусі, дзе былі перагледжаны погляды на гісторыю народнай гаспадаркі Беларусі, пераасэнсаваны шматлікія палажэнні і вывады, якія панавалі ў гісторыка-эканамічнай навуцы і не вытрымалі выпрабавання часам[1].

На высокім навуковым узроўні разглядаюцца ўрбанізацыя, этнічныя працэсы і іх роля ў развіцці культуры гарадскога насельніцтва ў калектыўнай манаграфіі "Этнічныя працэсы і лад жыцця". У ёй упершыню беларускія даследчыкі звярнуліся да міжэтнічнага ўзаемадзеяння ў працоўных калектывах[2].

Эканамічнае развіццё БССР закранута як у абагульняючых працах[3], так і ў публікацыях вучоных: Г. Бушчык[4], М. Касцюка[5], М. Несцяровіча[6] і інш. Асаблівасці кадравай палітыкі ў БССР і асобных галінах гаспадаркі раскрыты І. Літвіноўскім, В. Саковічам, У. Кузьменкам, К. Барвінком і І. Саракавіком, А. Цікавенка[7]. Пытанні арганізацыі і эфектыўнага выкарыстання кадравых службаў на прадпрыемствах, спробы на аснове аналізу кадраў прамысловасці БССР і Рэспубліці Беларусь распрацаваць рэкамендацыі па падрыхтоўцы кадраў і выкарыстоўванні працоўных рэсурсаў на сучасным этапе развіцця Беларусі разглядаюцца А. Ванкевіч, П. Дзімітруком, Н. Макоўскай, А. Папковым[8]. Каштоўнымі для разумення агульных тэндэнцый развіцця кадравай палітыкі КПСС, працэсаў фарміравання і ролі рэгіянальных кадраў з'яўляюцца працы расійскага даследчыка А. Фёдарава[9].

---

[1] Эканамічная гісторыя Беларусі / Пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. Мінск, 1996.
[2] Этнические процессы и образ жизни : (на материалах исслед. населения городов БССР) / ред. В. К. Бондарчик. Минск, 1980.
[3] Экономическая история Беларуси: Учеб. пособие / В. И. Голубович, Г. И. Ермашкевич, Г. П. Бущик и др. Минск, 2001; Мировая экономика: тенденции 90-х годов. М., 1999 і інш.
[4] Бущик Г. П. Экономические связи Беларуси в годы послевоенного восстановления народного хозяйства // Директор. 2005. № 5. С. 56–59; Яе ж. Экономические связи Беларуси: исторический опыт развития // Веснік БДЭУ. 2006. № 1 С. 100–106; Эканамічныя сувязі Беларусі ў перыяд аднаўлення гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны: новыя даследаванні // Веснік БДУ. 2005. № 2. С. 40–44.
[5] Костюк М. П. Большевисткая система власти в Беларуси. М., 2002.
[6] Несцяровіч М. Б. Эканоміка Беларусі ў аднаўленчы перыяд 1946–1950 гг. // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. № 1. С. 54–61; Яго ж. Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.) // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. № 4. С. 43–50.
[7] Литвиновский И. А. Кадровая политика Белорусской энергосистемы в 1945–1975 гг. // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5. Мінск, 2010. С. 91–102; Кузьменка У. І. Інтэлігенцыя Беларусі ў пасляакупацыйны ваенны перыяд // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2003. № 1. С. 56–61; Саковіч В. С. Сельскагаспадарчыя кадры Рэспублікі Беларусь у канцы ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2004. № 3. С. 52–59; Барвінок К. І., Саракавік І. А. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах ХХ ст. // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2005. № 4. С. 69–75; Тиковенко А. Г. Кадровая политика в условиях перестройки. Минск, 1990.
[8] Ванкевич Е. Кадровые службы: направления активизации // Беларуская думка. 2011. № 1. С. 52–59; Дзімітрук П. П. Кадравая сітуацыя ў навуцы Рэспублікі Беларусь // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2002. № 1. С. 5–13; Маковская Н. В. Современные особенности функционирования рынка труда в Беларуси: монография. Могилев, 2020; Яе ж. Трансформация трудовых процессов в условиях модернизации предприятий: монография. Могилев, 2015; Папкоў А. А. Аграрныя кадры сяла: стан, праблемы і перспектывы // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2006. № 2. С. 40–45.
[9] Федоров А. В. Кадровая политика СССР в период внутри- и внешнеполитического развития в 1970–1980-х гг. // Сборник трудов молодых ученых МПИ ФСБ России. Вып. 3. М., 2004. С. 12-19; Яго ж. Кадровая политика

Развіццё прамысловасці і фарміраванне буйных гарадоў БССР, склад партыйна-савецкага кіраўніцтва і яго роля ў развіцці эканомікі, сістэма падрыхтоўкі кадраў закрануты і ў абагульняючых працах, якія былі выдадзены ў апошнія дзесяцігоддзі акадэмічнымі вучонымі Беларусі[1].

Тэарэтычныя і практычныя аспекты рэалізацыі кадравай палітыкі, карупцыйныя рызыкі і фарміраванне кадравага патэнцыялу прамысловасці ў мінулым і на сучасным этапе развіцця грамадства раскрыты ў зборніках навуковых прац[2].

Гістарыяграфічны аналіз апублікаваных прац паказвае, што існуючыя навуковыя працы засяроджвалі сваю ўвагу пераважна на дасягненнях у развіцці прамысловасці, асвятляўся ў асноўным адукацыйны і сацыяльны склад рабочых кадраў, кадравая палітыка разглядалася ў кантэксце ідэалагічных установак таго часу, таму па-за ўвагаю заставаўся аналіз кіруючых кадраў, сацыяльна-эканамічных праблем у прамысловасці БССР і мер па іх вырашэнню. У сваіх публікацыях даследчыкі не ў поўным аб'ёме асвятлілі пралікі і недахопы ў кадравай палітыцы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва савецкай Беларусі.

У манаграфіі прааналізаваны і выкарыстаны матэрыялы з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Расійскага дзяржаўнага архіва навейшай гісторыі, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці, Занальнага дзяржаўнага архіву ў г. Оршы, Занальнага дзяржаўнага архіву ў г. Полацку.

Трэба адзначыць, што архіўныя дакументы і апублікаваныя крыніцы, якія закранаюць кадры прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў Савецкай Беларусі, характарызуюцца наяўнасцю вялікага аб'ёму крытычнага матэрыялу ў другой палове 1940–1960-х гг. і паступовым яго скарачэннем з пераходам да ўсё большага ўхвалення існаваўшага становішча ў 1970 – першай палове 1980-х гг., а затым у другой палове 1980-х зноў сталі вельмі крытычнымі.

Выкарыстанне новага дакументальнага матэрыялу, а таксама комплексны, крытычны аналіз усіх груп крыніц (архіўных і апублікаваных) дазволіў, на прыкладзе буйных прамысловых цэнтраў усходняй часткі Беларусі, стварыць агульную карціну фарміравання і складу кадравага патэнцыялу прамысловасці

---

СССР на завершающем этапе индустриальной модернизации (конец 1950–1980-е гг.): автореферат диссертации на соискание учёной степени к. ист. н.: специальность 07.00.02. М., 2005.

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. / А. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. Мінск, 1995; Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М. П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2008; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч і інш.; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.). Мінск, 2011; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 / М. У. Смяховіч і інш. Мінск, 2012; Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык, В. М. Белявіна, Г. І. Каспяровіч і інш. Мінск, 2001; Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко і інш. Мінск, 2002; Беларусь у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах 1946–2006 гг. / навук. рэд. М. П. Касцюк. Мінск, 2007.

[2] Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 года / уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў. Магілёў, 2018; Карупцыйныя рызыкі кадравага патэнцыяла Беларусі: зборнік навуковых артыкулаў / уклад. Ю. М. Бубнаў, І. А. Пушкін. Магілёў, 2019.

БССР ва ўмовах адзінага народнагаспадарчага комплексу (1944–1991) як фактара ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця дзяржавы.

Пры падрыхтоўцы манаграфіі да друку аўтары пры напісанні глаў, прысвечаных перыяду 1944–1955 гг., выкарысталі некаторыя фактычныя матэрыялы, якія назапасіў былы член творчага навуковага калектыву А. Кузьмін, якога, на вялікі жаль, ужо няма з намі.

Частка глаў манаграфіі была падрыхтавана ў рамках выканання навуковых даследаванняў “Кадравы патэнцыял прамысловасці БССР ва ўмовах адзінага народнагаспадарчага комплексу (1944–1991 гг.)” (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. А. Пушкін) Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў (ДПНД) на 2016–2020 гг. “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства” і “Кадры прамысловасці Беларусі як фактар трансфармацыі палітычнай сістэмы і эканамічных мадэляў (1945–2019)” (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. А. Пушкін) ДПНД на 2021–2025 гг. “Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы” (навуковы кіраўнік – акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя) падпраграмы № 1 “Гісторыя” (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза), задання 12.1.3 “Гісторыя Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI стст.” (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, дацэнт М. У. Смяховіч).

## Глава 1
## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАМЫСЛОВАСЦІ І КАДРАЎ БССР

Развіццё незалежнай Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе патрабуе глыбокага навуковага асэнсавання, пошуку і вызначэння найбольш эфектыўных форм і метадаў функцыянавання яе грамадскіх інстытутаў. Сёння на першы план выступаюць праблемы, якія закранаюць дзейнасці ўсіх звёнаў дзяржаўнага апарату, сферы кіравання і менеджменту, неабходнасць удасканалення кадравага патэнцыялу краіны, што дазволіць паспяхова пераадолець крызісныя з'явы ў эканоміцы. Паспяховае вырашэнне праблем тармозяць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны, адну з якіх, кадравую, мы паспрабуем прааналізаваць з пункту гледжання гістарычнага вопыту.

Даследуемы перыяд характарызуецца лёсавызначальнымі гадамі для нашай краіны: 1945, 1953, 1956, 1964, 1985 гг. Аналіз падзей, што адбыліся, дазваляе адзначыць некаторыя тэндэнцыі, якія паўплывалі на фарміраванне кадравага патэнцыялу і правядзенне кадравай палітыкі ў прамысловасці БССР.

### 1.1 Фарміраванне і характарыстыка структуры прамысловасці ў 1944–1990 гг.

Другая сусветная вайна нанесла значныя страты сусветнай эканоміцы. Вялізнымі былі эканамічныя страты СССР, асабліва яго акупаваных тэрыторый. У Беларусі на пачатак 1946 г., калі ўжо некаторая частка прадпрыемстваў была часткова ці цалкам адноўлена, аб'ём прамысловай вытворчасці, па даных Дзяржплана БССР, складаў толькі 20,4 % ад узроўню 1940 г. У выніку вайны было страчана больш за палову нацыянальнага багацця рэспублікі, у той час як у цэлым па СССР страты склалі каля 30 % нацыянальнага даходу[1]. Агульнапрынята лічыць, што за гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі было разбурана і спалена 209 гарадоў і раённых цэнтраў, 9 200 вёсак. Разбурана было больш за 10 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, ліквідавана 90 % станочнага парку. Агульныя матэрыяльныя страты БССР дасягалі 75 млрд руб., гэта ў 35 разоў больш за дзяржаўны бюджэт рэспублікі 1940 г. У 1945 г. у параўнанні з даваенным 1940 г. у Беларусі засталося менш паловы рабочых і служачых, паўсюдна назіраўся моцны недахоп спецыялістаў.

Пасляваенныя дзесяцігоддзі – гэта час далейшага функцыянавання і развіцця ў Беларусі, як і ў цэлым у СССР, адміністрацыйна-каманднай (сацыялістычнай) эканамічнай сістэмы, якая сфарміравалася яшчэ ў 1930-я гг. Пэўныя настроі на змякчэнне ці змяненне тых ці іншых аспектаў савецкай эканамічнай палітыкі праніклі ў партыйна-савецкае кіраўніцтва краіны, дзе выявіўся шэраг кіраўнікоў розных рангаў, якія выступалі, за больш

[1] Несцяровіч М. Б. Эканоміка Беларусі ў аднаўленчы перыяд 1946–1950 гг. С. 54.

збалансаванае развіццё народнай гаспадаркі, некаторую дэцэнтралізацыю яе кіравання. Падобныя прапановы выказваліся, у прыватнасці, пры распрацоўцы і закрытым абмеркаванні новай канстытуцыі СССР і новай праграмы УКП (б)[1]. Але абвастрэнне адносін з капіталістычнымі краінамі стала адным з вырашальных фактараў таго, што Сталін і яго прыхільнікі не толькі не змянілі былую мадэль эканомікі, але і зрабілі яе яшчэ больш жорсткай. Эканамічнае развіццё пасляваеннага СССР па ранейшаму вызначалася панаваннем дзяржаўнай уласнасці на ўсе віды рэсурсаў, жорсткім цэнтралізаваным кіраваннем і рэгуляваннем усіх сацыяльна-эканамічных працэсаў, дырэктыўным планаваннем, вялікай роллю пазаэканамічнага прымусу да працы.

У пасляваенны час у БССР, у адрозненні ад міжваенных дзесяцігоддзяў, асноўны ўпор у прамысловасці цяпер рабіўся на развіццё цяжкай індустрыі і яе ваенных галін, паколькі геапалітычнае становішча рэспублікі змянілася. Цяпер БССР знаходзілася ўдалечыні ад тэрыторыі класавага і патэнцыйнага ваеннага суперніка. Менавіта таму чацвёрты па ліку пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі, нягледзячы на бядотнае матэрыяльнае становішча беларусаў, прадугледжваў найбольш высокія тэмпы аднаўлення і развіцця машынабудавання – асновы цяжкай прамысловасці. Асноўнай задачай пяцігодкі абвяшчалася: “забяспечыць першачарговае аднаўленне і развіццё цяжкай прамысловасці і чыгуначнага транспарту…” Пры гэтым меркавалася ўжо “ў бліжэйшы час” дагнаць і перавысіць дасягненні навукі за межамі СССР.[2]

Да канца 1950 г. планаваўся не толькі выхад на даваенны ўзровень вытворчасці, але і значнае перавышэнне яго. Прадугледжвалася аднаўленне і ўвядзенне ў дзеянне Гомельскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання, станкабудаўнічых заводаў агульнай магутнасцю ў 4 500 станкоў, завяршэнне будаўніцтва аўтамабільнага, стварэнне трактарнага, веласіпеднага і іншых заводаў[3].

ЦК КП(б)Б ужо ў ліпені 1945 г. дакладваў пра аднаўленне працы Бабруйскага лесакамбіната, Гомельскага шклозавода, паравоза-вагонарамонтнага завода і электрастанцыі, станкабудаўнічых заводаў[4]. Больш хутка аднаўлялі сваю працу прадпрыемствы Гомельскай вобласці, якая ў значнай ступені была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў раней за астатнія рэгіёны Беларусі ўжо ў 1943 г. Ужо ў пачатку 1947 г. былі адноўлены і пушчаны Бабруйскі мясакамбінат, Гомсельмаш, папяровыя фабрыкі ў Добрушы і Чашніках, Клімавіцкі сілікатны завод і іншыя прадпрыемствы

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. С. 337-338
[2] Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам, [1917–1967 гг.] : в 5 т. : [сб. док. за 50 лет]. Т. 3 : 1941–1952 гг. / сост.: К. У. Черненко, М. С. Смиртюков. М., 1968. С. 250.
[3] Несцяровіч М. Б. Эканоміка Беларусі ў аднаўленчы перыяд 1946–1950 гг. С. 55.
[4] Постановление ЦК КП(б)Б “О недостатках в деле организации промышленного производства и о мерах по их устранению”. 7-12. 07. 1945 г. // Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов, и пленумов ЦК. Т. 4. С. 30.

рэспубліканскай і мясцовай прамысловасці[1]. Афіцыйна мэта пяцігодкі была дасягнута ў першым квартале 1949 г.

Поспехам у аднаўленні і развіцці савецкай індустрыі спрыялі не толькі самаадданая праца людзей і "эканомія" на іх жыццёвым узроўні, але і пазаэканамічны прымус да працы, які ў пасляваенны час ніколькі не змяншаўся (судовая адказнасць рабочых за прагулы, прымусовая праца зняволеных сістэмы ГУЛАГа). На важнейшых аднаўленчых работах у прамысловасці і гарадах рэспублікі выкарыстоўваліся ваеннапалонныя і інтэрнаваныя асобы (на тэрыторыі Беларускай ССР налічвалася 98 237 ваеннапалонных і інтэрніраваных, да 1 студзеня 1949 г. гэта лічба зменшылася да 21 007, а ў 1951 г. працэс перадачы дадзеных асоб нямецкаму боку быў завершаны[2]).

За першае пасляваеннае пяцігоддзе ў БССР высокімі тэмпамі ішло ўзнаўленне прамысловасці – у 1950 г. аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў параўнанні з 1946 г. у тры з паловай разы. Былі створаны новыя галіны прамысловасці – аўтамабільная, трактарная, веласіпедная, лакамабільная, цукровая. Гордасцю рэспублікі сталі гіганты беларускай індустрыі – аўтамабільны і трактарны заводы. Значна пашырыліся станкабудаўнічая, паліўная, тэкстыльная, харчовая галіны прамысловасці. Ішло актыўнае стварэнне энергетычнай базы – будаўніцтва электрастанцый.

Пад'ём цяжкай прамысловасці, безумоўна, садзейнічаў аднаўленню і нарошчванню эканамічнага патэнцыялу Беларусі, але звышканцэнтрацыя сродкаў у цяжкай прамысловасці і яе ваенных галінах выклікала дыспрапорцыі ў структуры эканомікі. Рост лёгкай і харчовай прамысловасці, вытворчасці тавараў народнага спажывання, быў надзвычай павольным. Такая дыспрапорцыя ў структуры прамысловасці замінала павышэнню матэрыяльнага дабрабыту народа.

Тэмпы росту прамысловасці БССР істотна адставалі не толькі ад сярэднесаюзных, але і ад тэмпаў росту прамысловасці амаль усіх саюзных рэспублік[3]. Памер выраблената нацыянальнага даходу на душу насельніцтва заставаўся ў Беларусі таксама ніжэйшы за сярэднесаюзны ўзровень. Адставанне беларускай эканомікі ад эканомік вядучых капіталістычных краін было яшчэ больш значным. Прычынамі такой сітуацыі былі не толькі нанесеныя вайной велізарныя матэрыяльныя страты Беларусі, слабаразвітая вытворчасць яе заходніх рэгіёнаў, але і эканамічная палітыка сталінскага кіраўніцтва.

Як паказалі даследаванні М. Несцяровіча, у 1946–1950 гг. у СССР і адпаведна ў БССР рэалізоўваўся найбольш складаны і рэсурсаёмісты варыянт аднаўлення і развіцця эканомікі, які прадугледжваў не толькі развіццё з апорай на ўласныя сілы, але і быў абцяжараны курсам на максімальнае, без уліку рэальных магчымасцяў, фарсіраванне цяжкай індустрыі і ваенна-прамысловага комплексу (ВПК) за кошт беспрэцэдэнтнага рабавання вёскі, стрымлівання

[1] Постановление ЦК ВКП(б) "О работе ЦК КП(б) Белоруссии". 25.01.1947 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 80.
[2] Касцюк М. П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск, 2000. С. 240.
[3] Народное хозяйство СССР в 1970 году: Стат. ежегодник. М., 1971. С. 139.

росту жыццёвага ўзроўню насельніцтва, развіцця сацыяльнай сферы, лёгкай і харчовай прамысловасці, маштабнага пазаэканамічнага прымусу, масавых рэпрэсій[1].

Трэба адзначыць, што савецкая эканамічная сістэма асабліва ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі характарызавалася ўстойлівым эканамічным ростам. Асабліва хуткімі тэмпамі развівалася экономіка ў 1950-я гг., калі ў Савецкім Саюзе выконваліся пяты (1951–1955) і шосты (1955–1960) пяцігадовыя планы развіцця народнай гаспадаркі. Сярэднегадавыя тэмпы росту вядучай галіны экономікі – прамысловасці – у той час склалі ў СССР прыкладна 10 %. Сярэднегадавыя тэмпы росту прадукцыі беларускай прамысловасці ў гэтым дзесяцігоддзі былі вышэй, чым у цэлым па СССР, і складалі прыкладна 14 %. Аднак па тэмпах росту прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва БССР яшчэ адставала ад большасці саюзных рэспублік. Выраблены нацыянальны даход на душу насельніцтва ў 1960 г. у рэспубліцы быў ніжэйшы за сярэднесаюзны ўзровень на 24 %[2].

Сацыяльна-эканамічнае жыццё БССР у 1950–1960-я гг. вызначаецца і характарызуецца перш за ўсё хуткім працэсам індустрыялізацыі, у выніку якога БССР пераўтвараецца ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку. Ужо ў пачатку 1960 гг. прамысловасць БССР дагнала, а ў канцы дзесяцігоддзя канчаткова абышла сельскую гаспадарку па долі ў валавым унутраным прадукце ў вартасным выражэнні. Масавае перасяленне насельніцтва ў гарады прывяло да таго, што сялянскі свет сыходзіў у мінулае, адбываўся хуткі працэс урбанізацыі.

Тэмпы росту аб'ёму прадукцыі прамысловасці БССР дасягалі 12–13 % у год у канцы 1950 – пачатку 1960 гг., у сярэдзіне 1960 гг. некалькі знізіліся да 10 % і зноўку нязначна выраслі да 12 % напачатку 1970 гг. Згодна афіцыйнай статыстыцы з 1950 г. па 1960 г. аб'ём прамысловай прадукцыі вырас у 3,6 разы, а да 1970 г. у 11 разоў. У вялікай ступені гэта быў экстэнсіўны рост, бо пры гэтым тэмпы росту вытворчасці працы былі значна ніжэйшымі. З 1950 г. па 1970 г. яна вырасла ўсяго ў 4 разы[3]. Нават з улікам асаблівасцей савецкага статыстычнага ўліку, які дазваляў афіцыйна скажаць у бок завышэння рэальны рост экономікі, развіццё прамысловасці БССР ішло шпаркімі тэмпамі.

Адзінай формай уласнасці ў прамысловасці БССР паступова станавілася дзяржаўная, кіраванне якой ажыццяўлялася цэнтралізавана ў межах каманднa-адміністрацыйнай сістэмы. Кааператыўныя прадпрыемствы паступова абдзяржаўліваліся. Недахопы гэтай сістэмы падштурхоўвалі партыю і ўрад некалькі разоў у другой палове 1950 гг., другой палове 1960 гг., другой палове 1980 гг. праводзіць рэформы, накіраваныя на ўдасканаленне дадзенай сістэмы кіравання прамысловасцю.

Пасля смерці кіраўніка СССР І. Сталіна ў эканамічнай палітыцы СССР назіралася імкненне да большай збалансаванасці развіцця прамысловасці,

---

[1] Несцяровіч М. Б. Экономіка Беларусі ў аднаўленчы перыяд 1946–1950 гг. С. 59-60.
[2] Равун И. И. Национальный доход Белорусской ССР на этапе развитого социализма. Минск , 1978. С. 52; Несцяровіч М. Б. Экономіка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай экономік (1951–1990 гг.). С. 44-45.
[3] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. Стат. ежегод. Минск, 1981. С. 46, 59.

развіцця новых галін вытворчасці, тавараў масавага спажывання. У рэзалюцыі XX з'езда ў 1956 г. па справаздачным дакладзе ЦК КПСС было падкрэслена, што партыя і надалей лічыць неабходным забяспечыць апераджаючы рост цяжкай прамысловасці, але было адзначана, што ўзровень вытворчасці дазваляе хуткімі тэмпамі развіваць вытворчасць прадметаў народнага спажывання[1]. Рашэнні гэтага і наступных з'ездаў і вызначалі структуру і тэмпы развіцця прамысловасці БССР.

У 1957 г. была зроблена спроба пераходу ад галіновага да тэрытарыяльнага кіравання прамысловасцю. Большасць агульнасаюзных міністэрстваў, якія кіравалі асобнымі галінамі прамысловасці, былі скасаваны, а замест іх створаны саветы народнай гаспадаркі – саўнаргасы, у іх ліку Савет народнай гаспадаркі БССР. Такое рэфармаванне прывяло да павелічэння гаспадарчай самастойнасці БССР у межах СССР. Яно спрыяла аптымізацыі народнагаспадарчых сувязяў. Аднак разам з тым дзяржаўныя ведамствы працягвалі вызначаць у межах дзяржаўнага плана амаль усе паказчыкі і характарыстыкі прамысловай прадукцыі, дробязна кантраляваць працэс яе вытворчасці і размеркавання[2].

У 1950–1960 гг. паступова змяняецца структура прамысловасці БССР. Машынабудаўнічая і металаапрацоўчая прамысловасць захоўвала свае вядучыя пазіцыі, але пачала шпарка развівацца і электратэхнічная, а затым і хімічная прамысловасць. Таксама развіваліся і іншыя галіны прамысловасці: будаўнічых матэрыялаў, дрэваапрацоўчая, лёгкая, гадзіннікавая, харчовая, гарбарная і інш. У другой палове 1950 – першай палове 1980 гг. значна ўзмацнілася паліўна-энергетычная база прамысловасці БССР. Галоўнымі відамі транспарту заставаліся чыгуначны, аўтамабільны, водны і паветраны. З 1960 г. у БССР будуецца сетка газа і нафтаправодаў.

Пастанова Пленума ЦК КПСС пра паскоранае развіццё хімічнай прамысловасці і асабліва вытворчасці сінтэтычных матэрыялаў і вырабаў з іх для задавальнення патрэбаў насельніцтва і патрэб народнай гаспадаркі 1958 г. прадугледжвала паскоранае развіццё "перадавой" галіны вытворчасці[3] У выніку ў 1960–1970 гг. БССР стала рэспублікай "вялікай хіміі". Ва ўсіх рэгіёнах былі пабудаваны або будаваліся буйныя хімічныя комплексы па вытворчасці мінеральных угнаенняў, хімічных валокнаў, перапрацоўцы нафты, выпуску палімераў. Калі ў 1950 гг. машынабудаванне і хімічная прамысловасць развіваліся прыблізна аднолькавымі тэмпамі. То ў 1960 гг. хімічная і

[1] XX съезд КПСС. 1956 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 16

[2] Постановление Пленума ЦК КПСС. 14 октября 1964 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 418.

[3] Постановление Пленума ЦК КПСС "Об ускоренном развитии химической промышленности и особенно производства синтетических материалов и изделий из них для удовлетворения потребностей населения и нужд народного хозяйства". 6-7 мая 1958 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 236–242.

нафтахімічная прамысловасць па тэмпу прыросту аб’ёму прадукцыі амаль у два разы апераджала машынабудаванне[1].

Эканоміка ўсходніх рэгіёнаў БССР у гэты перыяд характарызавалася не толькі развіццём традыцыйных для Беларусі галін харчовай, тэкстыльнай, будаўнічых матэрыялаў, лесаперапрацоўчай прамысловасці, але і апераджальнымі тэмпамі росту прадпрыемстваў машынабудавання, а з 1960 гг. – хімічнай. нафтаперапрацоўчай і электратэхнічнай галін народнай гаспадаркі. Поспехі ў развіцці эканомікі, і перш-наперш у развіцці індустрыі, прыкрывалі ў грамадскай свядомасці шматлікія дыспрапорцыі і сацыяльныя праблемы, якія былі ўласцівы эканоміцы і ўсяму тагачаснаму савецкаму грамадству.

На пасяджэнні Выканкама Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных і Віцебскага абкама КПСС ад 03.08.1956 г. пры разглядзе пытання аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва на прамысловых прадпрыемствах, транспарце і будаўніцтве вобласці за II квартал 1956 г. была адзначана праца такіх перадавых прадпрыемстваў г. Віцебска, як маслазавод, ТЭЦ, завод заточных станкоў, льношпагатная фабрыка, Аршанскага льнокамбіната і завода швейных машын, Полацкага ліцейна-механічнага завода. У той жа час за поспехамі перадавых прадпрыемстваў хавалася невыкананне плана больш чым паловай прадпрыемстваў (52,4 % – 184 з агульнай колькасці 351)[2]. Безумоўна, што па выніках года колькасць прадпрыемстваў, якія не выканалі план, рэзка скарачалася дзякуючы дапамозе вышэйстаячых арганізацый, карэктыроўцы планавых паказчыкаў, арганізацыйным мерапрыемствам і банальнай “штурмаўшчыне”.

План пятай пяцігодкі прамысловасць Полацка выканала на 104,3 %. Найхутчэй выраслі аб’ёмы вытворчасці завода буддэталяў (116,2 %), хлебакамбіната (109,7 %), электрасетак (107,5 %), арцелі “Чырвоны маяк” (111,9 %). Не выканалі гадавы план 8 прадпрыемстваў, сярод якіх: камбінат будматэрыялаў, птушкакамбінат, піўзавод, ліцейна-механічны завод[3]. У 1956 г. станоўча вызначаліся па валавых паказчыках мэблевая фабрыка, ліцейна-механічны завод, вагоннае дэпо, гармалзавод, харчкамбінат, мясакамбінат, вінзавод. Прамысловасць горада вырасла на 7,1 % у год. У 1956 г. з 30 прамысловых прадпрыемстваў план не выконвалі сем[4].

Пасля вайны прамысловасць Магілёўскай вобласці была хутка адноўлена, а напачатку шостай пяцігодкі, як сведчыць даведка аб працы прамысловых прадпрыемстваў вобласці за 1957 г., на Магілёўшчыне працавала ўжо каля 300-т прамысловых прадпрыемстваў, якія за год выпускалі прадукцыі больш чым на 2,5 трыльёны руб. Тэмпы росту па вобласці складалі больш за 10 % у год. Вытворчасць працы расла больш павольна на 6–7 % штогод.

[1] Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г.: стат. ежегод. Минск, 1975. С. 76, 80.

[2] Постановление Исполкома Витебского Областного Совета депутатов трудящихся и Витебского обкома КПСС от 03.08.1956 г. Об итогах социалистического соревнования промышленных предприятий, транспорта и строительства области за II квартал 1956 г. // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 168. Арк. 65-68.

[3] Протокол сессии Полоцкого городского Совета депутатов трудящихся пятого созыва. 18. 01. 1956 г. // Там жа. Спр. 172. Арк. 1-5.

[4] Доклад о работе Исполкома городского Совета депутатов трудящихся г. Полоцка // Там жа. Спр. 179. Арк. 55-56.

Нягледзячы на станоўчую агульную статыстыку, кожнае пятае прадпрыемства не выконвала планавыя паказчыкі. Так, у 1957 г. 69 прамысловых прадпрыемстваў з агульнай колькасці 303 не выканалі планавыя заданні на суму 33 422 тыс. руб.[1]

Нерытмічнасць працы заставалася рэальнай праблемай прамысловасці на працягу ўсіх 1950–1980 гг.

Яшчэ адной з важных праблем у прамысловасці, якая патрабавала зменаў у кадравай палітыцы, былі нізкія тэмпы росту вытворчасці працы адносна росту валавой прадукцыі. Пры наяўнасці вялізных страт рабочага часу на многіх прадпрыемствах утрымлівалася празмерная колькасць рабочых, асабліва на падсобна-дапаможных працах, і адначасова ў вялікіх памерах прымяняліся звышурочныя работы.

Сесія Гомельскага абласнога (прамысловага) Савета дэпутатаў працоўных абмяркоўвала задачы саветаў дэпутатаў працоўных па кіраванню гаспадарчым і культурным будаўніцтвам 16.03.1963 г. Было адзначана, што савецкі народ “ідзе ад перамогі да перамогі ў барацьбе за стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма” і пералічаны працоўныя поспехі. У той жа час было канстатавана, што ў 1962 г. 30 прадпрыемстваў вобласці не выканалі план вытворчасці валавой прадукцыі, завод Гомсельмаш недадаў 541 камбайн, 42 прадпрыемствы (18 %) не выканалі план росту вытворчасці працы, а асабліва кепска распачала прамысловасць 1963 г. Шмат праблем назапасілася ў мясцовай прамысловасці, на прадпрыемствах якой з 1 056 ІТР работала 479 практыкаў, уключаючы 10 галоўных інжынераў без спецыяльнай тэхнічнай адукацыі[2].

У даведцы ад 19.09.1962 г. прамыслова-транспартнага аддзела Гомельскага абкама КПБ указвалася, што пры наяўнасці вялізных страт рабочага часу на многіх прадпрыемствах утрымліваецца празмерная колькасць рабочых, асабліва на падсобна-дапаможных працах, і адначасова ў вялікіх памерах прымяняюцца звышурочныя работы. Указвалася, што на такіх прадпрыемствах перавыкананне плана па выпуску прадукцыі дасягаецца, галоўным чынам, за кошт залішняй рабочай сілы, а не за кошт выкарыстання рэзерваў дадатковага росту вытворчасці працы. У выніку такіх метадаў кіравання вытворчымі працэсамі ў 1961 г. пры выкананні плана прадпрыемствамі вобласці па выпуску прадукцыі на 103 %, план па росту вытворчасці працы быў недавыкананы на 0,4 %. На прадпрыемствах вобласці налічвалася амаль тры тысячы звышнарматыўных работнікаў з ліку прамысловага персаналу. План па вырабу валавой прадукцыі на аднаго работніка быў выкананы на 99,6 %, а на прадпрыемствах Саўнаргаса нават на 99,1 %[3].

---

[1] Справка о работе промышленных предприятий Могилевской области за 1957 год // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 131. Спр. 82. Арк. 58.

[2] Пратакол №1 Сессии Гомельского областного (промышленного) Совета депутатов трудящихся 16 марта 1963 г. // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8А. Спр. 2. Арк. 1-20.

[3] Справка промышленно-транспортного отдела Гомельского обкома КПБ «О недостатках в работе хозяйственных и партийных организаций по повышению производительности труда в промышленности и строительстве» от 19 сентября 1962 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 340. Арк. 255-256.

Важна адзначыць, што падобная сітуацыя на прамысловых прадпрыемствах склалася дастаткова даўно. Звышурочна на прадпрыемствах Гомельскай вобласці ў 1959 г. было адпрацавана 105 тыс. чалавека-часоў, у 1960 г. – 85,1 тыс., у 1961 г. – 61,5 тыс.[1] У праекце запіскі адзначалася, што ўнутрызменныя прастоі на многіх прадпрыемствах складаюць 10 % рабочага часу, што страты рабочага часу на аднаго рабочага ў прамысловасці склалі ў 1961 г. 1,6 дня, а ў будаўніцтве – 1,3 дня. Штодзённа ў прамысловасці вобласці ў разліку на год не працавала каля 500 чалавек[2].

Дастаткова аб'ектыўны і крытычны тон запіскі падштурхнуў да яе абмеркавання на пасяджэнні бюро Гомельскага абкама партыі, на якім прызнала неабходным разаслаць запіску і абязаць разабрацца ў выкананні задач па росту вытворчасці працы ў прамысловасці і будаўніцтве, правесці пленумы партыйных арганізацый і распрацаваць мерапрыемствы па паляпшэнню сітуацыі і выканання планавых заданняў[3].

Тым не менш, як у БССР, так і на абшарах СССР празмерная колькасць рабочых, асабліва на падсобна-дапаможных працах, і адначасова вялікія памеры звышурочных работ былі характэрнай з'явай. На "няправільную практыку прымянення масавых звышурочных работ і работы ў выхадныя дні" звяртаў увагу ЦК КПСС у 1962 г. у спецыяльнай пастанове аб працы ташкенцкага тэкстыльнага камбіната. Падымалася і пытанне аб "прывядзенні колькасці працаўнікоў на камбінаце ў адпаведнасць з планам выпуску прадукцыі[4].

Рост прамысловасці і індустрыяльнае будаўніцтва ў БССР у другой палове 1950–1960-я гг. адбываліся надзвычай шпаркімі тэмпамі, але планавая цэнтралізаваная камандна-адміністрацыйная сістэма перашкаджала хуткаму ўкараненню тэхналагічных інавацый. Прычынамі такой сітуацыі з'яўляліся таксама арыентацыя эканомікі перадусім на атрыманне даходаў ад экспарту сыравіны, у сувязі з чым значэнне тэхнічнай мадэрнізацыі прамысловасці хаця і ставілася ў якасці мэты, але фактычна адыходзіла на другі план у спісе прыярытэтаў і пастаўленых аператыўных задач. Недастатковае фінансаванне навукі, слабае ўзаемадзеянне навукі і вытворчасці таксама заставаліся адной з традыцыйна праблемных сфер. Яшчэ адной важнай праблемай, якая замінала хуткаму, а галоўнае эфектыўнаму развіццю прамысловасці, выпуску тавараў высокай якасці была праблема падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і замацавання на прадпрыемствах кваліфікаваных і творчых кадраў, асабліва ў сферы кіравання вытворчасцю.

---

[1] Справка промышленно-транспортного отдела Гомельского обкома КПБ «О недостатках в работе хозяйственных и партийных организаций по повышению производительности труда в промышленности и строительстве» от 19 сентября 1962 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 340. Арк. 256.

[2] Справка промышленно-транспортного отдела Гомельского обкома КПБ. 1962 г. // Там жа. Арк. 311.

[3] Протокол № 27 заседания бюро Гомельского обкома КПБ ад 19.09.1962 г. // Там жа. Арк. 224.

[4] Постановление ЦК КПСС «О работе партийной организации ташкентского текстильного комбината по выполнению решений XXII съезда КПСС о расширении производства и улучшении качества выпускаемой продукции". 20 марта 1962 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 235.

Невыпадкова, змена палітычнага кіраўніцтва краіны падштурхнула да ажыццяўлення новай эканамічнай рэформы 1965 г. Ужо праз месяц пасля таго, як у кастрычніку 1964 г. Пленум ЦК КПСС вызваліў М. Хрушчова і абраў Л. Брэжнева першым сакратаром ЦК КПСС, прамысловыя і сельскія партыйныя арганізацыі былі аб'яднаны[1] Была адноўлена адміністрацыйная вертыкаль улады. Яна прадугледжвала змену сістэмы планавання ў прамысловасці, увядзенне гаспадарчага разліку на прадпрыемствах, пашырыла гаспадарчую самастойнасць прамысловых прадпрыемстваў. Зноў адбыліся змены ў арганізацыі кіравання прамысловасцю: былі ліквідаваны саўнаргасы і адноўлены агульнасаюзныя міністэрствы па галінах прамысловасці. Касыгінская эканамічная рэформа прывяла да пэўнага павелічэння тэмпаў росту аб'ёмаў прамысловай прадукцыі ў другой палове 1960 – першай палове 1970-х гг.

На XXIII з'ездзе КПСС у 1966 г. больш казалася аб невыкананні паказчыкаў сямігадовага плану, галоўнай прычынай чаго палічылі недахопы кіравання народнай гаспадаркай і недаацэнку эканамічных метадаў кіраўніцтва, няпоўнае выкарыстанне матэрыяльных і маральных стымулаў, пралікі ў планаванні, суб'ектывісцкі падыход да рашэння шэрагу эканамічных праблем, што закранала і кадравую палітыку. Невыпадкова, дырэктывы з'езда патрабавалі расшырыць "дэмакратычныя асновы кіравання"[2].

Восьмая пяцігодка (1966–1970) аказалася ў пасляваенныя гады самай выніковай: унутраны валавы прадукт у Беларусі павялічыўся на 58 %, выраблены нацыянальны даход – на 56 %, прадукцыйнасць працы – на 39 % у прамысловасці, рэальныя даходы на душу насельніцтва – на 37 % [3]. Да пачатку 1970-х гг. было амаль цалкам пераадолена адставанне Беларусі ад сярэднесаюзнага ўзроўню вырабу нацыянальнага даходу на душу насельніцтва, яна шчыльна зблізілася з краінай у цэлым па агульнаэканамічным развіцці, саступаючы толькі РСФСР, Украінскай ССР і рэспублікам Прыбалтыкі[4].

Аднак поспех пачатковага этапу гаспадарчай рэформы 1965 г. быў непрацяглы. Ужо ў першыя гады яе ажыццяўлення пачаліся шматлікія карэкціроўкі, папраўкі, абмежаванні. Некалькі ўмацаваўшыся, эканамічныя метады кіравання не сталі дамінуючымі. Панавалі, як і раней, адміністрацыйныя метады. Эканоміка па-ранейшаму развівалася пераважна экстэнсіўным шляхам.

Па-ранейшаму назіраліся дыспрапорцыі ў развіцці галін цяжкай прамысловасці і галін, якія забяспечвалі вытворчасць тавараў масавага спажывання. Апошнія развіваліся больш павольна, што прывяло да дэфіцыту

[1] Постановление ЦК КПСС "Об объединении промышленнях и сельских областных, краевых партийных организаций». 16 ноября 1964 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 418.
[2] XXIII съезд КПСС. 1966 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 17–18, 38.
[3] Народное хозяйство СССР в 1970 году: Стат. ежегодник. М., 1971. С. 22, 23.
[4] Несцяровіч М. Б. Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.). С. 43–50.

тавараў народнага спажывання, які назіраўся ў 1950–1960 гг, а ў 1970–1980 гг., нягледзячы на рост аб'ёмаў вытворчасці, стаў асабліва заўважным. Паступова дэфіцыт прадуктаў і тавараў стаў асобнай важнай сацыяльна-эканамічнай праблемай, якую ўжо цяжка было патлумачыць наступствамі вайны. Дыспрапорцыі ў развіцці галін прамысловасці вызначалі многія іншыя сацыяльна-эканамічныя праблемы савецкай краіны.

За цягам гадоў сёння адбываецца натуральная ідэалізацыя тагачаснага жыцця, якое часам уяўляецца па-сяброўску бесканфліктным і паступальна прагрэсіўным найперш у эканоміцы. Але ж праблем было і тады дастаткова. Як бачна з дакументаў, у прамысловасці поспехі назіраліся перш-наперш у росце валавых паказчыкаў, а ў арганізацыі працы прамысловых прадпрыемстваў і якасных паказчыках назіраліся вялікія праблемы. З гэтага жа часу пачынае становіцца ўсё больш відавочным якаснае адставанне прамысловай прадукцыі БССР і СССР у цэлым ад прамысловай прадукцыі развітых у прамысловых адносінах краін Захаду.

На працягу 1970 – першай паловы 1980 гг. у БССР працягвалася пашырэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы прамысловасці, адбываліся змены яе галіновай структуры і спецыялізацыі, павышалася канцэнтрацыя вытворчасці. Для гэтых мэт павялічвалася фінансаванне. Будаваліся ў асноўным буйныя прадпрыемствы з перадавой тэхнікай і са спецыялізацыяй на выпуск прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай, лёгкай, харчовай і іншых галін прамысловасці. За гэтыя гады ўвайшлі ў строй 186 новых буйных фабрык і заводаў, на шэрагу прадпрыемстваў была пашырана і абноўлена вытворчасць.

Прыкметнай з'явай гэтага часу былі высокія тэмпы развіцця хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. У гэту новую для Беларусі галіну індустрыі ўваходзілі вытворчыя аб'яднанні "Беларуськалій", "Бабруйскшына", "Палімір", "Азот", "Хімвалакно", Светлагорскі завод штучнага валакна, Крычаўскі завод гумавых вырабаў і іншыя прадпрыемствы. Наваполацкі, а затым і Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы выпускалі больш за 50 відаў нафтапрадуктаў. Каля паловы гэтай прадукцыі вывозілася ў іншыя рэспублікі, а таксама за мяжу.

Калектывы многіх прадпрыемстваў, навукова-даследчых і праектна-канструктарскіх арганізацый актыўна распрацоўвалі і ўкаранялі ў вытворчасць новую тэхніку, прагрэсіўныя тэхналогіі і больш дасканалую арганізацыю працы. З 1971 да 1975 гг. у прамысловасці было ўстаноўлена больш за 1 200 струменева-механізаваных і аўтаматычных ліній, комплексна механізавана і аўтаматызавана 460 цэхаў, участкаў і вытворчасцей, уведзена ў дзеянне 9 буйных інфармацыйна-вылічальных цэнтраў на базе электронна-вылічальных машын[1]. Асвойваліся прагрэсіўныя тэхналагічныя працэсы – выраб дэталяў метадам дакладнага ліцця і штампоўкі, новыя спосабы вытворчасці сінтэтычных палімерных матэрыялаў і механізаваныя струменевыя працэсы.

На шэрагу прадпрыемстваў уводзілася ў дзеянне новая, больш прадукцыйная тэхніка, мадэрнізавалася абсталяванне, здымалася з эксплуатацыі састарэлая тэхніка. Аснову тэхнічнай рэканструкцыі фабрык і

[1] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. С. 278.

заводаў складала аснашчэнне вытворчасці механізаванымі паточнымі і аўтаматычнымі лініямі, разнастайнымі станкамі, інструментамі. Былі распрацаваны і запушчаны ў вытворчасць 2 197 новых тыпаў машын, абсталявання, апаратаў і прыбораў; колькасць механізаваных паточных ліній у прамысловасці рэспублікі павялічылася з 3 750 да 8 131, аўтаматычных з 369 да 1 749, комплексна-механізаваных і аўтаматызаваных прадпрыемстваў са 151 да 2 273.

Дзякуючы ўкараненню новых тэхналогій і творчай актыўнасці работнікаў прадпрыемстваў, павысілася прадукцыйнасць працы. Так, у Магілёўскай вобласці ў першай палове 1970-х гг. было асвоена 180 новых відаў машын, абсталявання, апаратаў і прыбораў, укаранёна 417 механізаваных паточных і аўтаматычных ліній; у выніку прадукцыйнасць працы павысілася на 46,3 % (пры заданні на 45,8 %)[1]. А на прадпрыемствах Оршы і Барані Віцебскай вобласці ўкаранілі 53 паточна-механізаваныя і аўтаматызаваныя лініі, комплексна механізавалі і аўтаматызавалі 115 цэхаў і ўчасткаў, усталявалі 4 тыс. адзінак высокапрадукцыйнага абсталявання, асвоілі 394 новыя прагрэсіўныя тэхналагічныя працэсы[2].

У Гомельскай вобласці за перыяд з 1971 па 1975 гг. аб'ём станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці павялічыўся больш чым у 2,5 разы, прыборабудаўніцтва ў 3,5 разы. Колькасць механізаваных паточных ліній узрасла больш чым у 2 разы, аўтаматычных ліній – у 2,8 раза, колькасць цэхаў і ўчасткаў з комплекснай механізацыяй у 2 разы[3]. Да 1979 г. засвоілі серыйную вытворчасць 730 новых відаў машын, вырабаў і матэрыялаў[4].

У той жа час 20 прадпрыемстваў Гомельскай вобласці не выканалі план па выпуску прадукцыі, а каля 30 па вытворчасці працы (1975). Не справіліся з выкананнем пяцігадовага плана 50 % прадпрыемстваў горада Рэчыцы. Значнай перашкодай пры ўкараненні новай тэхнікі і тэхналогій з'яўлялася не дастатковая тэхнічная падрыхтоўка рабочых і спецыялістаў, а таксама ўзровень павышэння іх дзелавой кваліфікацыі.

На сярэдзіну 1985 г. у прамысловасці БССР дзейнічала 9 880 паточных і аўтаматычных ліній, іх колькасць у параўнанні з 1971 г. павялічылася ў 2,4 разы, у тым ліку аўтаматычных – амаль у 5 разоў. Са 151 да 227 узрасла колькасць комплексна-механізаваных і аўтаматызаваных прадпрыемстваў. За 1986–1989 гг. у Беларусі былі створаны 424 узоры новай тэхнікі, былі пабудаваны і ўведзены ў дзеянне 24 новыя буйныя прамысловыя прадпрыемствы, рэканструявана шмат іншых. Пры гэтым варта адзначыць, – штогод у рэспубліцы ўдасканальвалася не больш за 6 тыс. адзінак

---

[1] Доклад "Основные итоги развития народного хозяйства Могилевской области за 1971–1975 годы" // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 2. Арк. 1-2.

[2] Информация «О ходе выполнения плана экономического и социального развития города Орши на 1971–1975 годы» на 12-й сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 22 марта 1975 года // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 146.

[3] Пратакол XIX Гомельскай абласной партыйнай канферэнцыі (1975) // ДАГАГом. – Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 12, 13.

[4] Пратакол Гомельскай абласной партыйнай канферэнцыі (1979) // Там жа. Воп. 153. Спр. 78. Арк. 17-19; Пушкін І.А. Кадравая палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей). С. 26–27.

абсталявання, а патрабавалася абнаўляць больш за 100 тыс. У сярэдзіне 1980-х гг. удзельная вага станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем у машынабудаванні складала 1,7 %. Аўтаматызаванай працай у прамысловым комплексе БССР было занята толькі крыху больш за 2 % рабочых[1].

Характэрнай рысай эканомікі СССР была яе надзвычай высокая ступень мілітарызацыі. Да пачатку 1970 гг. БССР разам з Расіяй і Украінай увайшла ў лік асноўных саюзных рэспублік-вытворцаў зброі і ваеннай тэхнікі, спецыяльных камплектуючых вырабаў. Шырокі спектр ваеннай тэхнікі выпускалі прадпрыемствы сельска-гаспадарчага машынабудавання БССР, куды ўваходзілі Мінскі трактарны завод, Гомсельмаш, 26 іншых прадпрыемстваў. Многімі прадпрыемствамі ў рэспубліцы была прадстаўлена аўтамабільная прамысловасць, якая выпускала ваенную тэхніку. Сярод іх Мінскі, Беларускі (г. Жодзіна) і Магілёўскі ім. С.М. Кірава аўтамабільныя заводы, Барысаўскі аўтатрактарнага абсталявання, Гродзенскі карданных валоў, два падшыпнікавыя заводы. Новыя ўзоры ваеннай аўтамабільнай тэхнікі рэгулярна абнаўляліся калектывам Мінскага аўтазавода[2]. Перыяд 1971–1985 гг. характарызаваўся павелічэннем у прамысловасці значэння прадпрыемстваў ваеннапрамысловага комплексу, абарончых праграм[3].

Высокія сусветныя цэны на нафту і выдатная фінансавая кан’юнктура садзейнічалі нарошчванню матэрыяльна-тэхнічнай базы прамысловасці БССР. У 1975 г. нацыянальны даход на душу насельніцтва дасягнуў сярэднесаюзнага ўзроўню[4]. Тым не менш, у першай палове 1970 гг. у эканоміцы сталі паступова нарастаць негатыўныя з’явы, якія ўсё больш узмацняліся ў наступныя гады. Зніжаліся многія важнейшыя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. У БССР сярэднегадавыя тэмпы прыросту нацыянальнага даходу паменшыліся амаль ў 2 разы: 9,1 % (1966–1970) і 5,1 % (1976–1980); росту рэальных заробкаў насельніцтва з 7,1 % у другой палове 1960-х гг. да 3,8 % на працягу другой паловы 1970-х гг.[5], прыросту прадукцыі прамысловасці ў 1971–1975 гг. у 1,2 разы, а ў 1981–1985 гг. – ужо ў 2,3 разы (у параўнанні з 1966–1970)[6]. Тэмпы развіцця эканомікі ў 1981–1982 гг. склалі толькі 1,1 %, г. зн. упалі да ўзроўню простага (нерасшыранага) узнаўлення. У 1982 г. прырост рэальных даходаў на душу насельніцтва знізіўся да неадчувальнага паказчыка – 0,1 %. Гэта фактычна азначала ўступленне краіны ў стадыю эканамічнага застою (стагнацыі)[7]. Але партыйнае і савецкае кіраўніцтва, з ідэалагічных прычынаў, па выніках эканамічнага развіцця прымалі дакументы дастаткова аптымістычнага характару.

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 385-386, 424; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 395-396.
[2] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 393-394.
[3] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 403.
[4] Равун И. И. Национальный доход Белорусской ССР на этапе развитого социализма. С. 59.
[5] Народное хозяйство БССР в 1988 году: Стат. ежегодник. Минск, 1989. С. 7; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 401.
[6] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1987 г.: Стат. Ежегодник. Минск, 1988. С. 23-24; Народное хозяйство СССР за 70 лет. М., 1987. С. 51.
[7] Несцяровіч М. Б. Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.). С. 43-50.

Паглыблялася залежнасць прамысловасці Беларусі ад вытворчых сувязей са многімі прадпрыемствамі СССР. Асабліва вялікай стала залежнасць ад паставак энерганосьбітаў – нафты, газу, вугалю. Са свайго бок Беларусь пастаўляла саюзным рэспублікам шмат сваёй прамысловай прадукцыі. Па крыніцах забеспячэння запатрабаванняў рэспублікі таварамі народнага спажывання БССР знаходзілася на 3 месцы ў катэгорыі рэсурсы ўласнай вытворчасці: РСФСР – 73 %, УССР – 77 %, БССР – 71 %. Увезеная прадукцыя (імпарт): РСФСР – 27 %, УССР – 23 %, БССР – 29 %; вывезеная (экспарт): РСФСР – 15 %, УССР – 22 %, БССР – 52 %[1]. Глыбокая інтэграцыя прамысловасці і ўсёй гаспадаркі Беларусі ў агульнасаюзную эканоміку не спрыяла ўмацаванню эканамічнай самастойнасці рэспублікі, што супярэчыла яе нацыянальным інтарэсам. Не апраўдаў сябе курс на стварэнне на тэрыторыі Беларусі занадта вялікай колькасці буйных прадпрыемстваў, асабліва тых, што працавалі на завазных матэрыялах і сыравіне[2].

Паглыбленне спецыялізацыі і павышэнне канцэнтрацыі вытворчасці шляхам стварэння аб’яднанняў пасадзейнічала пашырэнню структуры кіравання прамысловасцю. У 1985 г. у БССР дзейнічалі 231 аб’яднанне, у склад якіх уваходзілі больш за 1 900 прадпрыемстваў. Практычна ва ўсіх галінах рост адміністрацыйнага персаналу адбываўся хутчэй, чым расла агульная колькасць працоўных. За 1976–1985 гг. у БССР апарат кіравання павялічыўся на 28 %[3].

Новае кіраўніцтва краіны на чале з Ю. Андропавым, які ў лістападзе 1982 г. пасля смерці Л. Брэжнева стаў Генеральным сакратаром ЦК КПСС, паспрабавала змяніць эканамічную сітуацыю. Аднак зробленая чыста адміністрацыйнымі метадамі пры дапамозе службаў правапарадку і бяспекі гэтая чарговая спроба “ўдасканалення сацыялізму” дазволіла толькі часова стрымаць развіццё негатыўных тэндэнцый (у 1983 тэмпы развіцця эканомікі ўзраслі да 4,2 %), некалькі замарудзіла, але не спыніла набліжэнне крызісу. Пасля смерці Ю. Андропава (1984) палітычнае кіраўніцтва СССР на чале з К. Чарненкам вярнулася да былых брэжнеўскіх парадкаў. Эканамічныя паказчыкі зноў знізіліся.

У 1980-я гг. сфарміраваліся аб’ектыўныя і суб’ектыўныя, унутраныя і знешнія прычыны для рэфармавання сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця. Галоўнай перашкодай пераўтварэнняў у эканоміцы з’яўлялася камандна-адміністрацыйная сістэма, якая была аплотам манапалізму ў вытворчасці, звышцэнтралізаванага кіравання, бюракратызму. Павялічвалася адставанне ад передавых краін свету ў навукова-тэхнічным прагрэсе. Другі этап НТР, які пачаўся ў 1970 гг. з вынаходства мікрапрацэсараў, масавай камп’ютарызацыі і характарызаваўся рэзкім пашырэннем размаху і тэмпаў навуковых і тэхналагічных адкрыццяў, слаба закрануў савецкую эканоміку (за выключэннем абаронных галін). Эканоміка БССР, як і СССР у цэлым, знаходзілася ў асноўным на індустрыяльнай стадыі развіцця, у той час як

[1] Источники обеспечения потребностей республик СССР в товарах народного потребления в 1987 году // РДАНГ. Ф. 2. Воп. 5. Спр. 334. Арк. 54

[2] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 385-386.

[3] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 387-388.

большасць краін свету паднялася на навукова-індустрыяльную стадыю. У грамадстве сфарміраваўся своеасаблівы механізм тармажэння. Узмацніліся элементы сацыяльнай карозіі грамадства, асабліва партыйнай і дзяржаўнай эліты, што негатыўна паўплывала на духоўны настрой народа. Ідэалагічныя ўстаноўкі, абмежаванне дэмакратыі параджалі апатыю людзей. Абвастрыўся дэфіцыт тавараў, знікла ілюзія сацыялістычнага росквіту. Сур'ёзнымі заставаліся праблемы харчовага і жыллёвага забеспячэння насельніцтва[1].

Рэальныя захады па выпраўленні становішча былі зроблены толькі ў 1985 г., калі Беларусь, знаходзячыся ў складзе СССР, як і іншыя савецкія рэспублікі, уступіла ў перыяд радыкальных эканамічных і сацыяльных пераўтварэнняў. Красавіцкі (1985) пленум ЦК КПСС, XXVII з'езд партыі (1986) вызначылі новы палітычны курс, які атрымаў назву "перабудова" і быў скіраваны на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця, выпраўленне дапушчаных у мінулыя гады памылак і ўсебаковае абнаўленне грамадства. Затым гэты курс канкрэтызаваўся ў рашэннях XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі (1988), XXVIII з'езда КПСС (1990), шэрагу пленумаў ЦК[2].

Першым этапам перабудовы дэкларавалася – паскарэнне, пад якім разумеліся высокія тэмпы росту сацыяльна-эканамічнага развіцця за кошт павышэння вытворчасці працы, інтэнсіўнага развіцця, паварот дзяржавы да запатрабаванняў людзей. Паскарэнне было разлічана на энтузіязм працоўных у прывядзенні ў дзеянне схаваных рэзерваў росту. Галоўны з іх заключаўся ў поўнай загрузцы магутнасцей вытворчага патэнцыялу, паўсюдным пераводзе яго на шматзменную форму працы[3]. Аднак на практыцы шматзменны рэжым нярэдка не садзейнічаў павышэнню колькасці і якасці выпушчанай прадукцыі: ускладнялася дастаўка работнікаў начных змен, нізкай была прадукцыйнасць працы, зніжалася тэхніка бяспекі і г. д.[4]

Ажыццяўленне новага курсу напачатку прывяло да пэўных зрухаў у эканоміцы. Прадпрыемствы БССР устойліва нарошчвалі выпуск прадукцыі і павышалі прадукцыйнасць працы. Так, супраць 1985 г. аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі ў 1986 г. склаў 107 %, у 1987 г. – 114, у 1988 г. – 122 %. Нацыянальны даход Беларусі за 1986–1987 гг. узрос на 11,5 % пры плане 9,1 %. Найбольш значна аб'ём прадукцыі павялічыўся ў машынабудаванні і металургічным комплексе. За 1986–1988 гг. было асвоена 696 новых відаў прадукцыі. За 1986–1990 гг. прамысловасць рэспублікі павялічыла выпуск

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 420–421; Федоров А.В. Кадровая политика СССР в период внутри- и внешнеполитического развития в 1970–1980-х гг. С. 12–19; Пушкін Ігар. Вытокі карупцыі і злоўжыванняў уладай у савецкім мінулым (на прыкладзе Беларусі) // Українознавчий альманах. Випуск 24. Київ, 2019. С. 93–100; Яго ж. Коррупция и злоупотребления властью в восточных регионах БССР (1970–1980 гг.) // Молодежная Галактика № 16, 2019. С. 182–196; Злоўжыванні ўладаю і пралікі ў кадравай палітыцы БССР у 1970–1980-я гг. (на прыкладзе Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей). С. 32–42; Пралікі ў кадравай палітыкі БССР у 1970-я гг. С. 29–33; Кадравая палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей). С. 25–30.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 420; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 337–338.

[3] Постановление ЦК КПСС, СМ СССР и ВЦСПС № 194 от 12.02.1987 г. «О переходе объединений, предприятий и организаций промышленности и других отраслей народного хозяйства на многосменный режим работы с целью повышения эффективности производства» // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 172-176.

[4] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 545.

прадукцыі на 26 % і нават пераўзышла запланаваны на пяцігодку ўзровень. Тое ж самае можна сказаць і адносна прадукцыйнасці працы, якая павялічылася за гэты час на 30,1 %[1].

У першыя гады правядзення перабудовы і да канца 1980-х гг. эканоміка БССР дэманстравала даволі высокія тэмпы росту і заставалася адной з самых развітых у СССР. Выраблены нацыянальны даход у разліку на аднаго жыхара і тэмпы яго росту былі большыя, чым у сярэднім па СССР, і саступалі толькі тром рэспублікам: РСФСР, Латвіі і Эстоніі (гл. дад. А).

У Беларусі, Літве, Расіі назіраўся стабільны рост выробленага нацыянальнага даходу ў разліку на аднаго жыхара, ва Украіне ён захоўваўся на адным узроўні, а ў Латвіі, Эстоніі і Малдавіі зніжаўся. У 1988 г. па тэмпах росту на 1–2 месцы знаходзіліся: РСФСР і Латвія; 3–4 месцы: БССР і Эстонія. Вышэй агульнасаюзнага яшчэ быў толькі ў Літвы.

БССР знаходзілася на 4 месцы (пасля РСФСР, Латвіі і Эстоніі) па тэмпах росту вытворчасці працы (гл. дад. Б), у той жа час знаходзячыся па памерах сярэднямесячнага заробку на аднаго работніка толькі на 7 месцы (гл. дад. В).

Нягледзячы на тое, што душавы выраб эканамічнай прадукцыі ў БССР быў у сярэдзіне 1980-х гг. адным з самых высокіх у СССР, узровень жыцця ў цэлым быў ніжэйшы, чым у сярэднім па краіне. Так, у 1985 г. сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у цэлым па народнай гаспадарцы рэспублікі склала 91,4 % ад агульнасаюзнага ўзроўню, выплаты і льготы з грамадскіх фондаў спажывання – 96,5 %. Пераразмеркаванне выробленага нацыянальнага багацця на карысць цэнтра не спрыяла эканамічнай самастойнасці і эканамічнаму развіццю Беларусі, супярэчыла яе нацыянальным інтарэсам[2].

Эканамічныя пераўтварэнні другой паловы 1980-х гг. у БССР ажыццяўляліся марудна і супярэчліва, існавалі шматлікія пралікі і памылкі. Устаноўленая законам аб дзяржаўным прадпрыемстве (аб’яднанні) сістэма размеркавання прыбыткаў аказалася неэфектыўнай, шмат якія прадпрыемствы, прыкрываючыся шырмай самастойнасці, прымалі заніжаныя планы з маўклівай згоды міністэрстваў. Напрыклад, згодна афіцыйнай статыстыкі на шэрагу прадпрыемстваў Віцебскай вобласці паспяхова выканалі план па асноўным тэхнічна-эканамічным паказчыкам Віцебскае і Браслаўскія ВА будматэрыялаў, Бешанковіцкая шорная фабрыка і інш. Але гэта стала магчымым з-за заніжаных планаў[3].

Значны ўплыў на эканамічнае жыццё БССР аказаў шэраг фактараў як аб’ектыўнага, так і суб’ектыўнага характару. Адным з іх стала катастрофа на Чарнобыльскай АЭС (26.04.1986), экалагічныя і эканамічныя праблемы пераадолення яе наступстваў. Наступным – антыалкагольная кампанія, якая

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 424–427; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 338; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. С. 552–553.

[2] Несцяровіч М. Б. Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.). С. 48–49.

[3] Справка о состоянии работы по подбору и расстановке кадров, исполнительской и трудовой дисциплины, совершенствованию организации труда в объединениях и на предприятиях Витебского облместпрома (1989) // ДАВц. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 189. Арк. 53, 54; Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 425.

праводзілася па ініцыятыве ЦК КПСС. Яе пачатак паклала пастанова ЦК КПСС ад 07.05.1985 г. "Аб мерах па пераадоленні п'янства і алкагалізму". Скарачэнне продажу алкагольных напіткаў было балючым ударам па фінансах, грошы ад продажу спіртных напіткаў традыцыйна былі адной са значныхі стабільных крыніц напаўнення бюджэту і, адпаведна, падтрымання неабходнага ўзроўню жыцця ў краіне[1].

На індустрыяльным развіцці рэспублікі негатыўна адбівалася павялічаная разбалансаванасць гаспадаркі, міжнацыянальныя канфлікты, у выніку чаго на прадпрыемствах пачала скарачацца вытворчасць з-за парушэнняў дагаворных абавязацельстваў, недапаставак сумежнікамі камплектуючых дэталяў і вузлоў, матэрыялаў і сыравіны. З 1989 г. рэспублікі Савецкага Саюза апынуліся ў становішчы эканамічнага крызісу. Варта адзначыць, што крызісныя з'явы ў эканоміцы БССР праявіліся пазней, чым у іншых рэспубліках СССР і ў краіне ў цэлым.

Кіраўніцтва Беларусі імкнулася ліквідаваць пагрозу крызісу, не абапіраючыся на прафесіяналізм, ініцыятыву і адказнасць кадраў, а шляхам прыняцця шэрагу пастаноў: бюро ЦК КПБ "Аб прапрацоўцы пытання па ўвядзенні ў Беларускай ССР грашовай адзінкі" (10.03.1990), Савета Міністраў БССР "Аб неадкладных мерах па паляпшэнні становішча на спажывецкім рынку рэспублікі" (19.09.1990), Вярхоўнага Савета "Аб пераходзе Беларускай ССР да рыначнай эканомікі" (13.10.1990). На пасяджэнні прэзідыума СМ БССР разглядалася пытанне 22.01.1991 г. "Аб мерах па стварэнню і развіццю малых прадпрыемстваў у рэспубліцы"[2]. Вярхоўны Савет БССР 25.10.1990 г. прыняў закон "Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку Беларускай ССР". Нягледзячы на гэта, больш як 400 прадпрыемстваў і аб'яднанняў Беларусі ў 1990 г. знізілі аб'ём прамысловай прадукцыі[3]. У 1991 г. упершыню адбылося абсалютнае падзенне вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі.

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што інтэнсіўнае прамысловае будаўніцтва – характэрная рыса 1950–1980 гг. ва ўсіх абласцях усходняй Беларусі. Менавіта ў гэты час сфарміравалася структура прамысловасці БССР і яе ўсходніх рэгіёнаў.

**Віцебская вобласць. Віцебск** быў трэцім па валавым аб'ёмам прамысловым цэнтрам БССР. Горад меў шматпрофільную прамысловасць, пры гэтым у структуры яго прамысловага комплексу вылучалася машынабудаванне. Важную ролю ігралі прадпрыемствы дадатковых галін: лёгкай, будаўнічых матэрыялаў, харчовай, дрэваапрацоўчай прамысловасці. Але менавіта машынабудаванне было вызначальнай галіной прамысловасці Віцебска ў другой палове XX ст., а станкабудаванне было яго асновай.

Адным з флагманаў машынабудавання быў заснаваны ў 1877 г. Віцебскі станкабудаўнічы завод, які насіў імя Камінтэрна. Не менш вядомым быў

---

[1] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 341-342.
[2] Перечень вопросов, подлежащих рассмотрению на заседаниях СМ БСС и Президиума СМ БССР в первом полугодии 1991 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3971. Арк. 95–100.
[3] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 426-427.

Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Кірава. Завод заточных станкоў у 1945 г. быў перабазіраваны ў г. Віцебск. Віцебскі іголкавы завод адноўлены ў 1944 г., а ў лютым 1955 г. перайменаваны ў Віцебскі завод "Металаштамп", а ў лістападзе 1958 г. рэарганізаваны ў Віцебскі завод гадзіннікавых дэталяў[1].

Паступова Віцебск стаў цэнтрам таксама электратэхнічнай прамысловасці. У верасні 1952 г. быў створаны Віцебскі завод электравымяральных прыбораў, якому ў лістападзе 1977 г. прысвоена імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. У лютым 1958 г. пачаў працу Віцебскі завод радыёдэталяў. У маі 1977 г. аб'яднанне перайменавана ў Віцебскае вытворчае аб'яднанне "Маналіт" Міністэрства электроннай прамысловасці СССР[2].

У студзені 1955 г. была ўведзена ў эксплуатацыю Віцебская цеплаэлектрацэнтраль. Важнае значэнне для развіцця прамысловасці БССР меў пачатак будаўніцтва ў 1963 г. Лукомльскай электрычнай станцыі (Лукомльскай ДРЭС). 22.12.1969 г. станцыя пачала сваю працу. Паступова Віцебская вобласць пачала даваць каля паловы выпрацаванай электраэнергіі БССР.

Прадпрыемствы прамысловасці будаўнічых матэрыялаў забяспечвалі будаўніцтва прамысловых і інфраструктурных аб'ектаў. Віцебскі вапнавы завод аднавіў сваю дзейнасць у 1944 г. У маі 1978 г. на аснове яго, Віцебскага завода вапняковай мукі "Руба", і кар'ераўпраўлення "Гралево" створана Віцебскае вытворчае аб'яднанне "Даламіт". У жніўні 1944 г. у г. Віцебску адноўлены Беларускі дзяржаўны цагляна-чарапічны трэст № 2. Са студзеня 1950 г. на яго аснове створаны Віцебскі камбінат будаўнічых матэрыялаў. У студзені 1948 г. на аснове трэсту "Індубуд-2" быў створаны Віцебскі домабудаўнічы камбінат[3].

Віцебск быў буйным цэнтрам лёгкай прамысловасці. У горадзе працавалі: дзяржаўная швейная фабрыка "Сцяг індустрыялізацыі", абутковая фабрыка "Чырвоны Кастрычнік", дзяржаўны гарбарны завод (футравая фабрыка) імя М. А. Еўсцігнеева, панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ, якая ў 1986 г. пераўтворана ў Віцебскі ордэна Леніна панчошна-трыкатажны камбінат імя КІМ, вытворчае дывановае аб'яднанне імя 50-годдзя БССР, Віцебская ільнопрадзільная шпагатная фабрыка, камбінат шаўковых тканінаў, фабрыка мастацкіх вырабаў[4].

Віцебск, як і іншыя абласныя цэнтры, быў горадам развітай прамысловасці харчовых тавараў. У ім дзейнічаў мясны камбінат, маслабойны завод, хлебазавод № 1 і № 2, на аснове прадпрыемстваў хлебапякарнай прамысловасці г. Віцебска ў 1972 г. было створана Віцебскае вытворчае аб'яднанне хлебапякарнай прамысловасці, лікёра-гарэлачны завод, піваварны завод, дзяржаўная махоркавая фабрыка[5].

**Полацк** быў важным цэнтрам прамысловасці Віцебскай вобласці і ўсходніх рэгіёнаў Беларусі. Яго прамысловасць з'яўлялася тыповай для сярэдніх гарадскіх прамысловых гарадоў БССР. У горадзе не было ярка

[1] Государственный архив Витебской области : путеводитель, 1917–2006. С. 183–193.
[2] Там жа. С. 190–193.
[3] Там жа. С. 204–207.
[4] Там жа. С. 208–225.
[5] Там жа. С. 227–238.

выражанага горадабудаўнічага прадпрыемства, якое б давала асноўны аб'ём прадукцыі, ці некалькіх вядучых флагманаў. У ім у 1956 г. налічвалася 30 прамысловых прадпрыемстваў: ліцейна-механічны завод, вагоннае дэпо, рамонтны завод, завод буддэталяў, мэблевая фабрыка, электрасеткі, гармалзавод, мясакамбінат, вінзавод, піўзавод, птушкакамбінат, хлебакамбінат, некалькі арцеляў. У 1956 г. ішло аб'яднанне арцеляў, якія выпускалі харчовую прадукцыю, у Гарадскі харчовы камбінат. Полацкая гарадская электрастанцыя аднавіла дзейнасць у 1944 г., а ў чэрвені 1957 г. была пераўтворана ў Полацкую цеплаэлектрацэнтраль № 1.

Полацкая машынна-трактарная станцыя пачала сваю дзейнасць у лістападзе 1944 г. У 1947 г. яна ператворана ў Полацкую міжраённую майстэрню капітальнага рамонту, а сакавіка 1950 г. рэарганізавана ў Полацкі рамонтны завод, а ў снежні 1959 г. перайменавана ў Полацкі аўтарамонтны завод. Будаўніцтва Полацкага слясарна-механічнага (з красавіка 1946 г. – ліцейна-механічнага) завода было пачата ў 1945 г. У 1959 г. завод перайменаваны ў Полацкі завод санітарна-тэхнічных вырабаў і сельскагаспадарчага інвентару, а ў 1966 г. – у Полацкі ліцейна-механічны завод[1].

У 1944 г. аднавіў дзейнасць Полацкі мясакамбінат. У лістападзе 1964 г. у яго склад на правах філіяла ўвайшоў ліквідаваны Полацкі птушкакамбінат (1944–1964). У 1944 г. аднавіў дзейнасць Полацкі гарадскі малочны завод. У маі 1962 г. ён ператураны ў Полацкі гарадскі малочны камбінат, а ў лютым 1966 г. ператураны ў Полацкі гарадскі малочны завод. Ліквідаваны ў снежні 1987 г.[2]

У 1945 г. аднавіў дзейнасць Полацкі цагляны завод № 39. У 1949 г. у яго склад быў перададзены Полацкі торфазавод “Чарнаруча”. У 1950 г. ён пераўтвораны ў Полацкі камбінат будаўнічых матэрыялаў. У жніўні 1944 г. пачаў дзейнасць Полацкі гарадскі прамысловы камбінат, які ў лістападзе 1968 г. пераўтвораны ў Полацкі завод пластмасавых вырабаў. У ліпені 1975 г. спыніў сваю дзейнасць у сувязі з далучэннем да Полацкага ліцейна-механічнага аб'яднання на правах філіяла[3].

У сярэдзіне 1950-х гг. прамысловыя артэлі пачынаюць масава пераўтварацца ў прадпрыемствы. Полацкая мэблевая фабрыка ўтворана ў чэрвені 1956 г. на базе ліквідаванай у чэрвені 1956 г. прамыслова-кааператыўнай мэблевай арцелі “Парыжская камуна”. У чэрвені 1956 г. на базе Полацкай прамыслова-кааператыўнай арцелі “Харчавік” быў утвораны Полацкі гарадскі харчовы камбінат № 1. У красавіку 1957 г. у яго склад перададзены Полацкі гарадскі харчовы камбінат № 2, піваварны цэх вылучаны на самастойны баланс як піваварны завод. У 1960 г. камбінат перайменаваны ў Полацкі кансервавы завод[4].

Важную ролю для развіцця прамысловасці г. Полацка сыграла будаўніцтва завода шкловалакна. У 1956 г. для задавальнення патрэбаў

[1] Зональный государственный архив в г. Полоцке. Путеводитель. 1943–2007. С. 84–86.
[2] Там жа. С. 99–100, 102–103.
[3] Там жа. С. 88.
[4] Там жа. С. 93–94, 106–107.

электратэхнічнай, хімічнай і авіяцыйнай прамысловасці было зацверджана праектнае заданне на будаўніцтва на базе будаўніцтва швейнай фабрыкі новай вытворчасці. У сакавіку 1957 г. завод атрымаў найменне – Полацкі завод шкловалакна, а праз год – у лістападзе 1958 г. увайшла ў дзеянне першая чарга завода. У лістападзе 1970 г. заводу прысвоена званне імя Ленінскага камсамола Беларусі[1].

**Новаполацк.** У сувязі са стварэннем новай галіны народнай гаспадаркі ў рэспубліцы – нафтаперапрацоўчай прамысловасці ў маі 1958 г. у адпаведнасці з Пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 16.06.1958 г. пачалося будаўніцтва Полацкага нафтаперапрацоўчага завода. Ужо ў снежні 1962 г. была ўведзена ў эксплуатацыю першая чарга завода. У 1971 г. прадпрыемства было ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Сёння гэта Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства “Наваполацкае вытворчае аб’яднанне “Нафтан”[2]. Для Наваполацка ў 1959 г. пачалося будаўніцтва Полацкай цеплаэлектрацэнтралі № 2, якая пераназвана ў 1976 г. у Наваполацкую цеплаэлектрацэнтраль.

У чэрвені 1964 г. пачалося будаўніцтва Полацкага хімічнага камбіната, на якім у лютым 1968 г. быў атрыманы першы беларускі паліэтылен. Прадпрыемству Новаполацка ў снежні 1968 г. нададзена імя 50-годдзя БССР. У 1975 г. камбінат перайменаваны ў вытворчае аб'яднанне “Палімір” імя 50-годдзя БССР[3].

Наваполацкі завод бялкова-вітамінных канцэнтратаў быў заснаваны ў 1978 г. і з'яўляўся адным з найбуйнейшых сярод васьмі пабудаваных па падобным праекце заводаў, якія выраблялі буйнатанажныя партыі кармавых дрожджаў. Прадпрыемства было важнай доследнай пляцоўкай для інавацый савецкай мікрабіялагічнай прамысловасці.

**Орша.** Яшчэ адным з буйных прамысловых цэнтраў Віцебскай вобласці з’яўляўся горад Орша. У ім дзейнічала шэраг важных для рэгіёна і краіны прамысловых прадпрыемстваў.

Аршанскі станкабудаўнічы завод “Чырвоны барацьбіт” у гады вайны быў эвакуіраваны ў Свярдлоўскую вобласць РСФСР, а ў 1945 г. аднавіў сваю дзейнасць у Оршы. З 1957 па 1959 гг. называўся машынабудаўнічым заводам “Чырвоны барацьбіт”. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцягу ў 1971 г. Аршанскі завод швейных машын пачаў будавацца ў чэрвені 1952 г. на базе завода ацяпляльных катлоў і арцелі “Трэцяя пяцігодка”. Выпуск прадукцыі распачаўся ўжо ў 1953 г.. Перайменаваны ў завод лёгкага машынабудавання ў лютым 1968 г. Аршанскі трактарарамонтны завод быў створаны як машынна-трактарная майстэрня ў 1944 г. У 1947 г. прадпрыемства стала міжраённай майстэрняй капітальнага рамонту, у 1959 г. пераўтворана ў Аршанскі рамонтны завод, а ў 1959 г. перайменаваны ў трактарарамонтны завод[4]. Аршанскі інструментальны завод уведзены ў эксплуатацыю ў 1974 г. як спецыялізаванае

---

[1] Зональный государственный архив в г. Полоцке. Путеводитель. 1943–2007. С. 89–90.
[2] Там жа. С. 79–80.
[3] Там жа. С. 86–88.
[4] Путеводитель. 1917–2004. Зональный государственный архив в г. Орше. С. 50–54.

прадпрыемства па забеспячэнні металаапрацоўчымі прыладамі і станочным абсталяваннем прадпрыемстваў усяго Савецкага Саюза.

Градаўтваральным прадпрыемствам г.п. Копысь Аршанскага раёна ў 1944–1970 гг. быў Копыскі кафельна-плітачны завод. Яго вытворчая база пасля ліквідацыі прадпрыемства была перададзена Аршанскаму камбінату сілікатных вырабаў, які быў утвораны ў 1965 г. (як завод дзейнічаў з 1934 г.). У Оршы яшчэ дзейнічала тры заводы жалезабетонных вырабаў рознай галіновай падпарадкаванасці і прамысловыя базы будаўнічых арганізацый[1].

Наяўнасць некалькіх прамысловых прадпрыемстваў цяжкой прамысловасці і прадпрыемстваў з пераважна мужчынскімі працоўнымі калектывамі выклікала праблему жаночага працаўладкавання і неабходнасць развіцця ў горадзе лёгкай прамысловасці. Аршанскі льнокамбінат быў адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці горада і рэспублікі. Утвораны ў 1930 г. як ільночасальная фабрыка, ён пачаў аднаўленне сваёй дзейнасці ў 1944 г. За працоўныя поспехі ў 1966 г. калектыў камбінату быў узнагароджаны высокай узнагародай – ордэнам Леніна[2]. Паступова камбінат заняў манапольнае становішча ў вытворчасці льняных тканін у рэспубліцы і стаў адным з вядучых у СССР.

У 1960–1969 гг. у Оршы дзейнічала ватная фабрыка “Герой працы”, якую далучылі да Аршанскай ільнопрадзільнай фабрыкі “Днепр”. Апошняе прадпрыемства дзейнічала таксама з 1960 г., а ў 1973 г. было далучана да Аршанскага льнокамбіната. У 1960–1989 гг. у Оршы дзейнічала таксама фабрыка мастацкіх вырабаў. У гэтым жа 1960 г. быў аддазены загад аб утварэнні Аршанскай швейнай фабрыкі “Камунар”, цяпер прамыслова-гандлёвая фірма “Світанак”[3].

Буйным мясаперапрацоўчым прадпрыемствам БССР быў Аршанскі мясакамбінат. Прадпрыемства было ўтворана ў 1930 г., з 1951 г. называлася мясакансервавы камбінат, з 1964 г. – Аршанскі мясакансервавы камбінат імя М. А. Карначэнка[4]. У 1966–1975 гг. у Оршы дзейнічаў кансервавы завод, у 1976 г. на яго базе быў утвораны кансервавы і для сушкі агародніны завод[5].

У 1970–1980-я гг. прамысловасць Віцебскай вобласці прадстаўлялі буйныя заводы: каляровых тэлевізараў, бялкова-вітамінных канцэнтратаў, “Эвістар”, керамзітавага жвіру, “Легмаш”, “Чырвоны барацьбіт” і “Чырвоны Кастрычнік”; мэблевая фабрыка “Зара”, Віцебскі домабудаўнічы камбінат, вытворчыя аб’яднанні “Нафтан” (“Наваполацкнафтааргсінтэз”), “Палімір”, “Шкловалакно”, “Маналіт”, “Электравымяральнік”, “Оршабудматэрыялы” і многія іншыя[6].

**Магілёўская вобласць.** Характарыстычнай для ўсходніх рэгіёнаў БССР была сітуацыя ў прамысловым развіцці Магілёўскай вобласці. Напачатку

[1] Путеводитель. 1917–2004. Зональный государственный архив в г. Орше. С. 60–63.
[2] Там жа. С. 56–57.
[3] Там жа. С. 54–55, 57–58.
[4] Там жа. С. 66.
[5] Там жа. С. 67–68.
[6] Основные показатели проекта Государственного экономического и социального развития Витебской области на 1988 год // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 254. Арк. 30–32.

шостай пяцігодкі на Магілёўшчыне працавала ўжо каля 300 прамысловых прадпрыемстваў[1]. У перыяд даследавання буйнейшым прамысловым цэнтрам вобласці быў Магілёў, буйнымі – Бабруйск і Крычаў, кожны з якіх меў некалькі прадпрыемстваў-лідараў, якія вызначалі яго развіццё. У 1970–1980 гг. сярод раённых цэнтраў вобласці пачаў хутка развівацца і г. Асіповічы.

**Магілёў.** У пасляваеннае дзесяцігоддзе адбылося аднаўленне практычна ўсіх буйных прамысловых прадпрыемстваў, якія дзейнічалі ў даваенны час: аўтамабільны завод імя Кірава, штучнага валакна імя Куйбышава, “Строммашына”, прадпрыемствы харчовай галіны. Уводзіліся ў строй і новыя прадпрыемствы. Найбуйнейшы прамысловы цэнтр вобласці не меў відавочных прамысловых лідараў з-за наяўнасці некалькі буйных і сярэдніх прадпрыемстваў.

Магілёў займаў чацвёртае месца ў БССР па прамысловаму патэнцыялу пасля Мінска, Гомеля і Віцебска. У галіновай структуры прамысловага комплексу Магілёва дамінуючымі з'яўляліся дзве галіны: машынабудаванне і металаапрацоўка і хімічная прамысловасць. Суадносіны паміж імі паступова мяняліся на працягу вывучаемага перыяду на карысць апошняй. Важную ролю ігралі прадпрыемствы будаўнічых матэрыялаў, дрэваапрацоўчай, харчовай, лёгкай прамысловасці.

У сярэдзіне 1960 гг. у Магілёве працавала 56 фабрык, камбінатаў і заводаў. Прадпрыемствамі саюзнага падпарадкавання былі заводы: аўтамабільны імя Кірава (спецыялізацыя з 1958 г.), штучнага валакна імя Куйбышава, “Электрарухавік” (у 1958, 1966, 1973 уведзены новыя вытворчыя карпусы), “Строммашына” (спецыялізацыя з 1946), металургічны імя Мяснікава (трубаліцейны да 1953). Нарошчваў аб’ёмы вытворчасці завод металічных вырабаў (з 1965 – ложкавы, з 1971 да 1981 – металавырабаў), камбінат будаўнічых матэрыялаў, гарбарны і жэлацінавы заводы, швейная фабрыка (у 1966 г. праведзена рэканструкцыя) і іншыя прадпрыемствы.

Толькі за гады сямігодкі ў Магілёве пачалі вытворчасць дзевяць новых прамысловых прадпрыемстваў: фабрыкі – стужкаткацкая (1963), “Рэмабутак”, мастацкіх вырабаў (1960 г. на базе арцэлі імя Н. Крупскай), галаўных убораў, хлебазавод № 3, піўзавод (1961). Выпускалася прамысловай прадукцыі на чвэрць мільярда рублей. У 1968 г. пабудаваны камбінат сілікатных вырабаў, у 1969 г. пачала выпрабляць электраэнергію ЦЭЦ-2, у 1967 г. пачаў будавацца, а ў 1970 г. уступіў у строй ліфтабудаўнічы завод[2]. Асноўнымі будоўлямі ў 1970–1980-я гг. у Магілёўскай вобласці былі камбінат сінтэтычнага валакна, завод “Магілёўсельмаш” (з 1982), другая чарга камбіната шаўковых тканін, завод вентылізацыйных загатовак (1976), гармолзавод у Магілёве.

Вызначальным для Магілёва стала рашэнне СМ СССР аб будаўніцтве ў горадзе буйнейшага ў Еўропе камбіната хімічнага валакна. У верасні 1965 г. быў аддадзены загад аб утварэнні будтрэста № 17 “Лаўсанстрой”. Будаўніцтва было абвешчана Усесаюзнай ударнай камсамольскай будоўляй. На ім

---

[1] Справка о работе промышленных предприятий Могилевской области за 1957 год // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 131. Спр. 82. Арк. 58.
[2] Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 2. Мінск, 1996. С. 445–469.

працавала больш за 6 тыс чалавек. У выніку напружанай працы ўжо ў 1968 г. была ўведзена першая вопытная ўстаноўка і атрыманы першы беларускі лаўсан, прамысловая вытворчасць якога распачалася ў 1970 г. У 1976 г. здадзена ў эксплуатацыю 2-я, а ў 1977 г. 3-я чэргі вытворчасці[1] Аб’яднанне “Хімвалакно” на доўгія гады стала не толькі градаўтваральным прадпрыемствам Магілёва, але і вызначальным у прамысловым і фінансавых адносінах для ўсёй вобласці.

**Бабруйск.** Бабруйск у 1950-х гг. меў меншую чым Магілёў прамысловасць, і ўплыў яго буйных заводаў на развіццё горада быў мацнейшым, а іх удзельная вага ў прамысловай вытворчасці – значнай.

Найбуйнейшым прадпрыемствам горада ў 1950–1960 гг. была швейная фабрыка імя Дзяржынскага. Яна была створана ў 1930 г. на базе швейнай майстэрні, якая працавала з 1922 г. Адноўленая пасля вайны фабрыка ў 1957 г. мела 2 400 работнікаў і выпускала швейную прадукцыю 25-ці розных найменняў на 201 млн руб. Сярод іншых буйных заводаў і фабрык вылучалася яшчэ тры прадпрыемствы, якія разам са швейнай фабрыкай з’яўляліся асноўнымі месцамі працаўладкавання бабруйчанак.

Яшчэ адным буйным прадпрыемствам Бабруйска была кандытарская фабрыка “Чырвоны харчавік”. Сваю гісторыю яна вяла ад дрожджавага завода (1870), які ў 1930 г. быў пераўтвораны і ў 1957 г. пры штаце 570 работнікаў меў план выпуску прадукцыі на 70 500 тыс. руб.

Фанерадрэваапрацоўчы камбінат пачаў будавацца на базе старога двухрамнага завода ў 1926 г. Ён быў цалкам знішчаны ў гады вайны, але хутка адноўлены. У 1956 г. на ім працавала 2 864 чалавек, а план па валу складаў 79 807 тыс. руб. [2] У 1950–1980 гг. знакаміты “Фандак” развіваўся, будаваліся новыя цэхі і асвойваўся выпуск новай прадукцыі.

Нарошчваў аб’ёмы вытворчасці гідролізны завод, які быў наўмысна створаны ў 1936 г. для перапрацоўкі адыходаў дрэваапрацоўкі. Вядомымі ў рэспубліцы харчовымі прадпрыемствамі былі мясакамбінат і піўзавод.

Бабруйская арцэль “8 Сакавіка” ў 1960 г. пераўтворана ў фабрыку мастацкіх вырабаў. У гэтым жа годзе заснавана футравая фабрыка. У 1965 г. заснаваны Бабруйскі гарбарны камбінат.

Развівалася бабруйскае машынабудаванне. Традыцыйным гонарам Бабруйска быў машынабудаўнічы завод імя Сталіна. Утвораны ў 1898 г. завод, як і іншыя прадпрыемствы горада, быў моцна пашкоджаны і часткова разбураны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пасля аднаўлення ён спецыялізаваўся на выпуску насосаў для СССР і краін народнай дэмакратыі. У 1957 г. калектыў завода складаў 900 чалавек, а гадавая валавая прадукцыя дасягнула 27,9 млн руб.[3] Былі пушчаны ў эксплуатацыю цэхі: сталеліцейны (1961), чыгуналіцейны і электрацэх (1966–1971), машыназборачны (1981)[4].

---

[1]Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 9. Мінск, 1999. С. 467.
[2] Сведения о старейших предприятиях города Бобруйска. 8 октября 1957 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 131. Спр. 81. Арк. 34-37.
[3] Там жа.
[4] Бабруйскі машынабудаўнічы завод // Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 2. С. 191.

На базе рамонтных майстэрняў у 1959 г. створаны Бабрускі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў. У 1960 г. на базе рамонтна-механічнага завода быў створаны завод сельскагаспадарчага машынабудавання. А ў 1961 г. на базе горпрамкамбіната пачаў сваю працу Бабруйскі завод "Тармазныя апараты і механізмы". У 1971 г. быў заснаваны Бабруйскі завод па выпуску машын для агракомплексу[1].

Развівалася і будаўнічая галіна: Бабруйскі завод сілікатнай цэглы, камбінат крупнапанэльнага домабудавання.

Будаўніцтва шыннага завода распачалося ў 1963 г., але зацягнулася на 10 гадоў. У 1976 г. Беларускі шынны камбінат пераўтвораны ў Бабруйскае вытворчае аб'яднанне "Бабруйскшына". У 1979 г. прыняты ў эксплуатацыю завод масавых шын, а ў 1980 г. пачата будаўніцтва завода звышбуйнагабарытных шын.

**Крычаў.** У пасляваенны час у г. Крычаве Магілёўскай вобласці пачалося аднаўленне разбуранай вайной прадпрыемстваў і стварэнне новых для рэгіёна вытворчасцей. Так, у 1944–1948 гг. дзейнічаў Крычаўскі фасфарытны завод і сожскія руднікі Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР, а ў 1958–1962 гг. – Крычаўскі завод мінеральных угнаенняў Упраўлення хімічнай прамысловасці Савета народнай гаспадаркі БССР[2]. Крычаўскі завод гумавых вырабаў пачаў стварацца ў 1948 г.

На тэрыторыі Крычаўскага раёна дзейнічала ў 1956 г. 17 прамысловых прадпрыемстваў. З іх тры заводы мелі саюзнае падпарадкаванне і з'яўляліся асноўнымі месцамі працаўладкавання насельніцтва: Крычаўскі цэментавы завод, Крычаўскі шыферны завод, торфапрадпрыемства "Калектыўная праца". Яшчэ 9 прадпрыемстваў мела саюзна-рэспубліканскае падпарадкаванне, а 4 – рэспубліканскае[3].

Цэментны і шыферны заводы неаднаразова пераўтвараліся і мянялі афіцыйныя назвы, але доўгія гады заставаліся фактычнымі прамысловымі лідарамі горада і нават сталі своеасаблівым гарадскім брэндам. У кастрычніку 1943 г. Савецкім урадам прынята рашэнне аб аднаўленні цэментавага завода. Ужо ў студзені 1949 г. у эксплуатацыю здадзена першая тэхналагічная лінія. Да канца года для краіны выпушчана 65 тысяч тон цэменту. У красавіку 1950 г. была здадзена ў эксплуатацыю першая чарга шыфернага завода. У 1953 г. быў завершаны першы этап тэхнічнай рэканструкцыі прадпрыемства і вытворчыя магутнасці выраслі да 260 тысяч тон цэменту ў год.

У 1957 г. цэментавы і шыферны заводы былі аб'яднаны ў адно прадпрыемства – Крычаўскі цэментава-шыферны камбінат. У 1959 г. завершаны другі этап рэканструкцыі. Магутнасць па выпуску цэменту павялічана да 400 тысяч тон у год. У 1964–1976 была праведзена замена

---

[1] Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 2. С. 190.

[2] Кричевский завод минеральных удобрений управления химической промышленности Совета народного хозяйства БССР, г. Кричев Могилевской области. // Зональный государственный архив в г. Кричеве (ЗДАКр.). Ф. 1095, 1958–1962 гг.; Кричевский фосфоритный завод и сожские рудники Министерства местной промышленности БССР, г. Кричев Могилевской области. // ЗДАКр. Ф. 5, 1944–1948 гг.

[3] Справка об объеме промышленного производства Кричевского района // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 131. Спр. 37. Арк. 11.

чатырох тэхналагічных ліній па вытворчасці шыферу, здадзена ў эксплуатацыю пятая тэхналагічная лінія па выпуску плоскага буйнапамернага шыферу. У 1968 г. быў здадзены ў эксплуатацыю крэйдавы кар’ер “Каменка” і лінія гідратранспартакрэйдавага шламу працягласцю 6,8 кіламетра. У 1980 г. на базе цэментава-шыфернага камбіната створана вытворчае аб’яднанне “Крычаўцэменташыфер”[1].

Крычаўская цеплавая электрацэнтраль ствараецца ў 1960 г. Раённыя электрастанцыі: Мсціслаўская гідраэлектрастанцыя Клімавіцкага электрасеткавага раёна, г. Мсціслаў Магілёўскай вобласці.

Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод і Клімавіцкі камбінат будаўнічых матэрыялаў БССР аднавілі сваю дзейнасць у 1944 г. і доўгія гады былі градаўтваральнымі прадпрыемствамі райцэнтра Клімавічы.

Сярод райцэнтраў пачаў граць усё большую ролю г. Асіповічы. Кардонна-руберойдавы завод быў пабудаваны ў 1972–1973 гг. У горадзе дзейнічалі завод аўтамабільных агрэгатаў, жалезабетонных канструкцый, прадпрыемствы лёгкай, харчовай і дрэваапрацоўчай прамысловасці, у тым ліку завод сухога абястлушчана малака і фабрыка нятканых матэрыялаў.

Напрыканцы 1980-х гг. у Магілёўскай вобласці буйнымі вытворцамі прадукцыі былі: Бабруйскія ВА “Бабруйскферммаш”, заводы: машынабудаўнічы, гідролізны, трактарных дэталяў і агрэгатаў; Магілёўскія ВА шоўкавых ткан, “Тэхнапрыбор” , “Стромаўталінія”, заводы “Электрарухавік”, аўтазавод імя С. Кірава, “Магілёўсельмаш”, вопытна-эксперыментальны, металургічны, стужкаткацкая і абутковая фабрыкі; Асіповіцкі завод аўтамабільных агрэгатаў, Крычаўскі цэментава-шыферны камбінат, шклозавод “Кастрычнік”, папяровая фабрыка “Спартак” у Шклове[2]. Хімічную і нафтахімічную прамысловасць прадстаўлялі ВА “Хімвалакно”, “Бабруйскшына”, “Беларусьгуматэхніка”, заводы: Крычаўскі гумовых вырабаў і Магілёўскі рэгенератарны. У дадзеных галінах працавалі 25 % рабочых ад усяго прамыслова-вытворчага персаналу вобласці. На Магілёўшчыне выраблялася 45,6 % усёй хімічнай прадукцыі БССР[3].

**Гомельская вобласць.** Найбольшую ролю ў прамысловым развіцці вобласці адыгралі прадпрыемствы, якія падпарадкоўваліся непасрэдна кіраўніцтву СССР, заводы: “Гомсельмаш”, “Пускавых рухавікоў”, станкабудаўнічы імя Кірава, “Гідрапрывад”, нармалізаваных вузлоў, “Цэнтраліт”, Жлобінскі металургічны, Мазырскі нафтаперапрацоўчы, Жлобінскі мехкар’ер “Фармпяскі”, Мазырскі завод меліяратыўных машын, завод тарфянога машынабудавання, падшыпнікавы завод № 12, вымяральных прыбораў, “Гомелькабель”, “Мазыркабель”, вагонарамонтны, электратэхнічны,

---

[1] Открытое акционерное общество «КРИЧЕВЦЕМЕНТНОШИФЕР» // https://kcsh.by/company/history / Дата доступу: 15.07.2022.
[2] Итоги XXV съезда КПСС : материалы в помощь докладчикам. Март 1976 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2228а. Арк. 191-192; Список к статистичекому отчёту на 01.07.1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 99–162.
[3] Перечень испрашиваемых ставок для партийных комитетов Могилёвской области. 03.10.1980 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 72. Арк. 71, 82.

рамонтна-механічны, чатыры прадпрыемствы пад паштовымі скрынямі (ваеннае ведамства), Рэчыцкі метызны завод і іншыя[1].

**Гомель.** У гэты перыяд Гомель стаў другім па аб’ёмах вытворчасці і сваёй значнасці прамысловым цэнтрам БССР. Найбольшая ўдзельная вага ў агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі г. Гомеля фарміравалася прадпрыемствамі машынабудавання. Важную ролю ігралі харчовыя і іншыя перапрацоўчыя прамысловыя прадпрыемствы, а таксама хімічнай прамысловасці і па вытворчасці будматэрыялаў.

Машынабудаванне было асноўнай галіной прамысловасці горада. Доўгія гады яго флагманам быў завод сельскагаспадарчага машынабудавання “Гомсельмаш”. Матэрыяльна-тэхнічная база завода ў Гомелі выйшла на даваенны ўзровень за 1944–1947 гг. Пасля стварэння ў 1947 г. спецыяльнага канструктарскага бюро вызначаецца спецыялізацыя “Гомсельмаша” – стварэнне і вытворчасць машын для комплекснай механізацыі тэхналагічных працэсаў у кормавытворчасці. У 1984 г. па аб’ёмах гадавой вытворчасці самаходных кормаўборачных камбайнаў “Гомсельмаш” выйшаў на першае месца ў свеце[2].

Са снежня 1943 г. Гомельскі станкабудаўнічы завод імя С. М. Кірава аднавіў выпуск станочнай прадукцыі. Гомельскі рамонтна-падшыбнікавы завод у 1944–1967 гг. з’яўляўся адным з асноўных пастаўшчыкоў падшыпнікаў для вытворчасці ровараў у СССР. Некаторыя машынабудаўнічыя прадпрыемствы выпускалі прадукцыю адносна кароткі час. Створаны ў студзені 1945 г. маторарамонтны завод у 1959–1960 гг. дзейнічаў як “Гомельскі завод трактарных пускавых рухавікоў”. Гомельскі завод гідраапаратуры быў утвораны ў сакавіку 1961 г., з красавіка 1966 па 1976 гг. – завод “Гідрапрывад”. У маі 1944 г. быў утвораны ліцейна-механічны завод, у 1958–1980 гг. ён стаў Гомельскім заводам вымяральных прыбораў. Паравозавагонарамонтны завод быў утвораны ў 1944 г. і з 1948 па 1960 гг. спецыялізаваўся на рамонце пасажырскіх вагонаў і выпускаў запасныя часткі да іх. Гомельскі кабельны завод быў утвораны на базе завода “Металапракат” (1956–1958) і спецыялізаваўся па выпуску алюмініевых і сталеалюмініевых голых правадоў у 1958–1963 гг. У чэрвені 1956 г. быў пушчаны ў эксплуатацыю металазавод, у 1963–1976 гг. – Гомельскі завод сантэхабсталявання. Машынабудаўнічы завод “Рухавік рэвалюцыі” ў студзені 1966 г. стаў заводам тарфянога машынабудавання, з чэрвеня 1983 г. – Гомельскім заводам “Стромаўталінія” ў складзе Магілёўскага вытворчага аб’яднання стромаўталіній[3].

Беларускі суднабудаўнічы трэст у г. Гомель быў створаны ў лістападзе 1945 г. на базе ваенна-аднаўленчых атрадаў Дняпроўскага і Днепра-Дзвінскага параходства. У трэст уваходзілі верфі: Шацілкаўская, Нараўлянская, Рэчыцкая, Давыд-Гарадоцкая, Чэрыкаўская і Макашынская. Ліквідаваны ў снежні 1949 г.

[1] Список руководителей промышленных предприятий союзного подчинения Гомельской области на 01.03.1970 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 137. Спр. 55. Арк. 86–88.
[2] Гомсельмаш. История компании // сайт компании ОАО «Гомсельмаш» https://www.gomselmash.by/o-kompanii/istoriya-zavoda / Дата доступу: 15.07.2022.
[3] Государственный архив Гомельской области: путеводитель. Минск, 2009. С. 136–137, 157–158, 162, 169.

Гомельскі суднарамонтны завод, створаны ў красавіку 1945 г. У 1961–1963 гг. меў назву суднабудаўніча-суднарамонтны завод[1].

У горадзе меліся прадпрыемствы электратэхнічнай прамысловасці. Аднаўленчыя работы на Гомельскім электратэхнічным заводзе пачаты ў студзені 1944 г. Завод каля 40 гадоў выпускаў прадукцыю. Гомельскі электрамеханічны завод быў створаны ў 1948 г. і займаўся вырабам электраабсталявання, нестандартнага абсталявання і вырабаў, неабходнага для электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Завод "Электраапаратура" дзейнічаў у 1958–1985 гг.[2]

Паступова развівалася і хімічная вытворчасць. У лістападзе 1943 г. аднавіў дзейнасць мела-савелітавы завод "Чырвоны хімік", з лютага 1972 г. – мела-савелітавы завод, а з лістапада 1975 г. – Гомельскі завод хімічнага мелу. Навабеліцкі завод "Ізапліт" аднавіў сваю дзейнасць пасля вайны. З сакавіка 1953 г. ён называўся "Навабеліцкі лесахімічны камбінат", з 1972 г. – Гомельскі камбінат, з 31 сакавіка 1976 г. – "Гомельскі папярова-лесахімічны завод"[3].

З кастрычніка 1943 г. дзейнічаў абозабудаўнічы камбінат, якому ў студзені 1956 г. прысвоена найменне "Гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат". У студзені 1971 г. на базе камбіната як галаўнога прадпрыемства было створана вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне "Гомельдрэў"[4]. На правах філіяла ў яго ўвайшоў і Гомельскі фанеразапалкавы камбінат.

Вядомым у рэспубліцы быў шкляны завод імя Сталіна, які з лістапада 1962 г. насіў назву "Гомельскі шкляны завод імя М. В. Ламаносава". У 1970 гг. завод быў рэканструяваны ў сувязі з нарошчваннем вытворчых магутнасцяў і засваеннем новых відаў прадукцыі[5].

Будаўніцтва ўнікальнага прадпрыемства ў рэспубліцы – завода "Крышталь", якое спецыялізуецца на выпуску брыльянтаў з натуральных алмазаў, пачалося ў студзені 1971 г. Завод быў пушчаны ў эксплуатацыю ў снежні 1972 г. Першы беларускі брыльянт быў выраблены 27.12.1972 г.[6].

Лёгкая прамысловасць Гомеля пачала дзейнічаць адразу пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гомельская панчошна-трыкатажная фабрыка імя 8 Сакавіка дзейнічала ў 1945–1989 гг. Гомельская швейная фабрыка "Камінтэрн" са жніўня 1964 г. стала швейным вытворчым аб'яднаннем "Камінтэрн". Абутковая фабрыка "Праца (Труд)" у 1963 г. увайшла ў склад Гомельскага абутковага вытворчага аб'яднання як галаўное прадпрыемства[7].

З харчовых прадпрыемстваў найбольш вядомым у рэспубліцы быў заснаваны яшчэ ў 1930 г. Гомельскі харчовы камбінат "Спартак", з 1933 г. – кандытарскі камбінат, з кастрычніка 1971 г. – кандытарскі вытворчае аб'яднанне "Спартак", з красавіка 1976 г. – Гомельскае вытворчае аб'яднанне

[1] Государственный архив Гомельской области: путеводитель. С. 136, 169.
[2] Там жа. С. 159–162.
[3] Там жа. С. 164–165.
[4] Там жа. С. 145.
[5] Там жа. С. 155–156.
[6] Там жа. С. 163.
[7] Там жа. С. 143–144.

кандытарскай прамысловасці “Спартак”. У склад аб'яднанняў, акрамя галаўнога прадпрыемства, уваходзіла Нараўлянская кандытарская фабрыка “Чырвоны Мазыранін”. У 1984 г. з аб’яднання вылучаныя дзве самастойныя кандытарскія фабрыкі: “Спартак” і “Чырвоны Мазыранін”[1].

У канцы 1960 гг. БССР стала нафтаздабыўнай рэспублікай. Беларускі трэст па пошуках і разведцы нафтавых і газавых радовішчаў “Белнефтегазразведка” быў утвораны ў лютым 1965 г. на базе Беларускай канторы разведачнага свідравання для арганізацыі геолагаразведачных работ на нафце і газе. У склад трэста ўваходзілі: нафтаразведачная экспедыцыя глыбокага свідравання, нафтаразведачная экспедыцыя па выкарыстанні свідравін, экспедыцыя геафізічных даследаванняў (г. Мазыр), Беларуская нафтаразведачная экспедыцыя глыбокага бурэння ў Заходняй Сібіры і інш.[2]

**Рэчыца.** Значным абласным прамысловым цэнтрам Гомельскай вобласці быў г. Рэчыца. Вызначальнымі ў аб’ёме прамысловай прадукцыі горада былі прадпрыемствы металургіі і дрэваапрацоўкі, а дадатковымі: лёгкая, харчовая і будаўнічых матэрыялаў.

Металургічную галіну прадстаўляў адноўлены ў 1944 г. Рэчыцкі драцяна-цвіковы завод “Інтэрнацыянал”, які ўступіў у строй да канца 1945 г. У 1959 г. завод перайменаваны ў Рэчыцкі метызны завод[3].

Дрэваапрацоўчую прамысловасць прадстаўлялі некалькі прадпрыемстваў. Рэчыцкі лесазавод імя Кірава адноўлены ў снежні 1943 г. На базе фанернага завода № 19 і запалкавай фабрыкі “10 год Кастрычніка” арганізавана з 1944 г. будаўніцтва Рэчыцкага домабудаўнічага камбіната. Камбінат уступіў у эксплуатацыю ў 1948 г. У маі 1950 г. лесазавод імя Кірава ўліўся ў домабудаўнічы камбінат. У 1951 г. домабудаўнічы камбінат рэарганізаваны ў дзяржаўны Рэчыцкі фанерна-мэблевы камбінат. У 1960 гг. камбінат узбуйніўся за кошт далучэння дзвюх мэблевых фабрык. У функцыі камбіната ўваходзіла: выраб мэблі, фанеры, дрэваапрацоўка, лесапілаванне[4].

Да прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці горада адносілася Рэчыцкая швейная фабрыка[5].

Да прадпрыемстваў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, дэталяў і канструкцый адносіўся Рэчыцкі завод каналізацыйных труб, які быў утвораны ў 1957 г. З 1966 г. у сувязі са спецыфікай вытворчасці завод перайменаваны ў Рэчыцкі завод керамічных каналізацыйных труб Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў БССР[6].

У пасляваенны час у рэспубліцы развівалася і мікрабіялагічная прамысловасць. Беларускі экстрактавы завод “Дубіцель” імя Варашылава быў у кастрычніку 1946 г. адноўлены. У 1957 г. завод быў перайменаваны ў Рэчыцкі

---

[1] Государственный архив Гомельской области: путеводитель. С. 176.
[2] Там жа. С. 142.
[3] История развития промышленных предприятий Речицкого района: свидетельства архивных документов. Выпуск 2. 1956–1968 гг. Речица, 2019. С. 9–10.
[4] Там жа. С. 39-41.
[5] Там жа. С. 76.
[6] Там жа. С. 113.

завод дубільных экстрактаў, а ў 1963 г. – у гідролізна-дражджавы завод[1]. У 1975 г. у горадзе ўведзены ў эксплуатацыю піваварany завод.

**Жлобін.** Горад меў прадпрыемствы лёгкай, харчовай, будматэрыялаў прамысловасці. У 1978 г. была пабудавана Жлобінская фабрыка штучнага футра. Важнае значэнне для горада мела будаўніцтва Жлобінскага металургічнага завода (Беларускі металургічны завод). Прадпрыемства ўзвялі фірмы “Фэст-Альпінэ” (Аўстрыя), “Даніелі” (Італія) і інш. Першая разліўка сталі была праведзена 15 кастрычніка 1984 г.

**Мазыр** у гэты час стаў відным прамысловым цэнтрам Беларусі. Першая прадукцыя Мазырскага рамонтна-экскаватарнага завода была выпушчана ў 1953 г., выпуск вёўся адначасова з працягам будаўніцтва. У 1958 г. прадпрыемства было перайменавана ў Мазырскі завод меліярацыйных машын.

Будаўніцтва прадпрыемства пачалося ў 1958 г. на базе закансерваваных цэхаў недабудаванай швейнай фабрыкі. Завод “Мазыркабель” уведзены ў эксплуатацыю ў 1959 г. У 1970 гг. завод стаў галаўным прадпрыемствам вытворчага аб'яднання “Беларускабель”.

У 1956 г. арцель “Молат” пераўтворана ў ліцейна-механічны завод. У 1965 г. завод перайменаваны ў ліцейна-механічны завод. У 1974–1975 гг. завод пераўтвораны ў завод машынабудавання для птушкагадоўчых комплексаў і ферм “Мазырптушкамаш”. У 1980 гг. завод цалкам рэканструяваны і ў 1988 г. пераўтвораны ў Мазырскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання "Мазырсельмаш".

У 1975 і 1978 гг. былі ўведзены ў эксплуатацыю дзве комплексныя ўстаноўкі па перапрацоўцы нафты на Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе, які стаў градаўтваральным прадпрыемствам. Першапачаткова глыбіня нафтаперапрацоўкі складала 50 %, у выніку чаго істотную частку вырабаў складаў мазут, які ішоў на патрэбы энергетыкі. Для энергазабеспячэння Мазырскага НПЗ і іншых прадпрыемстваў прылеглага прамвузла была ў 1974 г. пабудавана электрастанцыя.

**Добруш**. Добрушская папяровая фабрыка “Герой працы”, якая была заснавана яшчэ ў 1870 г., аднавіла сваю дзейнасць у кастрычніку 1943 г. У сакавіку 1956 г. фабрыка рэарганізавана ў Добрушскі цэлюлозна-папяровы камбінат “Герой працы”. У 1950–1970 гг. была праведзена мадэрнізацыя вытворчасці, што дазволіла фабрыцы ў 1970 г. выпускаць 67 % саюзнай вытворчасці чарцёжнай і 50 % малявальнай паперы. Камбінат быў градаўтваральным гарадскім прадпрыемствам. У 1975–1978 гг. быў пабудаваны Добрушскі фарфоравы завод. У горадзе маюцца таксама прадпрыемствы харчовай прамысловасці.[2]

**Светлагорск** з 1963 г. стаў горадам абласнога падпарадкавання, што было выклікана вялікім прамысловым будаўніцтвам. Узвядзенне Шацілкаўскага завода штучнага валакна пачалося ў 1960 г. у пасёлку Шацілкі (1961 – перайменаваны ў Светлагорск) Гомельскай вобласці, а ў 1964 г. быў

[1] История развития промышленных предприятий Речицкого района: свидетельства архивных документов. С. 129–130.
[2] Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 6. Мінск, 1998. С. 173–174.

атрыманы першы метр кордавай тканіны. У 1970 гг. пачаўся выпуск тэрмаўстойлівых матэрыялаў, у 1980-х – уведзены ў эксплуатацыю ўчастак па вытворчасці вугляродных матэрыялаў. У 1983 г. прадпрыемства атрымала назву "Светлагорскае вытворчае аб'яднанне "Хімвалакно". Першая чарга Светлагорскага цэлюлозна-кардоннага камбіната пабудавана ў 1968 г. і на прадпрыемстве паступова ўводзіліся новыя магутнасці. Светлагорская ЦЭЦ пабудавана ў 1958 г., другая чарга ў 1965 г.[1]

Лепшыя прамысловыя прадпрыемствы абласцей траплялі ў спіс дазволеных для наведвання замежнымі дэлегацыямі. Так, сакратарыят Гомельскага абкама КПБ 29.03.1965 г. зацвердзіў спіс прамысловых, сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, навучальных устаноў, культурных, медыцынскіх і дзіцячых устаноў, якія дазвалялася наведваць замежным дэлегацыям[2]. Сярод 18 прадпрыемстваў і ўстаноў былі дзіцячыя садкі, школы, тэхнікум, Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, палацы піянераў, спорта і культуры, паліклініка, месцы адпачынку працоўных, два калгасы і адзін саўгас, а таксама лепшыя прамысловыя прадпрыемствы вобласці: завод Гомсельмаш, станкабудаўнічы завод імя Кірава, Гомельскі тлушчавы камбінат, шклозавод імя Ламаносава, камбінат "Спартак"[3]. Усяго ў спіс для наведвання было ўключана толькі шэсць прамысловых прадпрыемстваў, на якіх быў наладжаны вытворчы працэс і былі створаны прымальныя побытавыя ўмовы працы. Усе яны знаходзіліся ў Гомелі, відаць, для найлепшага кантролю над замежнікамі. Падобныя спісы складаліся ва ўсіх абласцях рэспублікі.

Ва ўсіх буйных прамысловых цэнтрах усходніх рэгіёнаў дзейнічалі прадпрыемствы харчовай прамысловасці: мукамольныя, хлебных вырабаў, крухмальныя, піваварэння, вінаробныя, безалкагольных напояў, малочныя, мясакамбінаты, кансервавыя, камбінаты харчовых вырабаў і інш. Ва ўсіх прамысловых цэнтрах развіваліся таксама прадпрыемствы прамысловасці будаўнічых матэрыялаў: заводы жалезабетонных вырабаў рознай галіновай падпарадкаванасці і прамысловыя базы будаўнічых арганізацый. Дзейнічалі прадпрыемствы дрэваапрацоўкі і мэблевай прамысловасці.

Ва ўсходняй частцы БССР градаўтваральных заводаў і фабрык – вытворчых прадпрыемстваў, на якіх была б занятая значная ці нават асноўная частка працоўных грамадзян горада ці пасёлка было шмат. Але гэта былі пераважна невялікія прадпрыемствы мясцовай прамысловасці ў малых гарадах і гарадскіх пасёлках. Для буйных прамысловых цэтраў гэтага часу ўласціва наяўнасць некалькі буйных і сярэдніх прадпрыемстваў, якія вызначалі структуру гарадской прамысловасці. Паступова, дзякуючы развіццю "вялікай" хіміі, на ўсходзе рэспублікі ўтварылася некалькі буйных манагарадоў:

[1] Светлагорскае вытворчае аб'яднанне "Хімвалакно" // Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 14. Мінск, 2002. С. 253–254.
[2] Протокол №1 заседания секретариата Гомельского обкома КП Белоруссии от 29 марта 1965 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 124. Спр. 9. Арк. 1, 12.
[3] Список промышленных, сельскохозяйственных предприятий, учебных заведений, культурных, медицинских и детских учреждений, которые разрешается посещать иностранным делегациям. 1965 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 124. Спр. 9. Арк. 21.

Наваполацк з градаўтваральным прадпрыемствам – нафтаперапрацоўчым заводам; Светлагорск утварыўся вакол пабудаванага завода Хімвалакно; будаўніцтва буйных хімічных прадпрыемстваў значна змяніла дэмаграфічную сітуацыю і сацыяльную інфраструктуру нават буйных індустрыяльных цэнтраў ўсходняй Беларусі Магілёва і Бабруйска. Манагарадамі заставаліся Добруш, Крычаў, стаў Новалукомль.

Вывучэнне змен падпарадкавання прамысловых прадпрыемстваў паказвае стабільныя спробы кіраўніцтва СССР і БССР арганізацыйна – структурнымі мерапрыемствамі, зменай падпарадкавання знайсці аптымальную схему кіравання прамысловасцю. Па зменах падпарадкавання прадпрыемстваў практычна ўсіх абласцей бачна, што найбольшая колькасць арганізацыйна- кіраўніцкіх пертурбацый адбывалася ў першыя пасляваенныя і “хрушчоўскія” гады.

Архіўныя дакументы сведчаць, што ў гэты перыяд важнымі кірункамі работы прамысловых прадпрыемстваў былі: выкананне вытворчых планаў, сацыялістычныя абавязацельствы і вынікі іх выканання, забеспячэнне ўводу ў дзеянне магутнасцяў, рэканструкцыя і мадэрнізацыя вытворчасці, забеспячэнне сыравінай, павышэнне тэхнічнага ўзроўню вытворчасці і ўкараненне прагрэсіўных тэхналогій, механізацыя вытворчасці, скарачэнні ручной працы, асваенне новых відаў прадукцыі, механізацыя і аўтаматызацыя вытворчых працэсаў, укараненне стандартаў, рацыяналізацыя і вынаходніцтва. З цягам часу ўсё большая ўвага надавалася павелічэнню выпуску тавараў народнага спажывання, рэалізацыі гатовай прадукцыі, выкарыстанню працоўнага часу на прадпрыемствах, праверцы прыродаахоўнай дзейнасці і стану аховы працы. Дакументы аб вытворчых і тэхнічных нарадах, пасяджэннях савета працоўнага калектыву, вопытных выпрабаваннях абсталявання і новых відаў вырабаў, планах сацыяльна-эканамічнага развіцця, тэхпрамфінпланах, мерапрыемствах па абясшкоджванні выкідаў у атмасферу, нормах выдаткавання сыравіны і матэрыялаў на вытворчасць прадукцыі, укараненні новай тэхнікі паказваюць пытанні, якія вырашалі працоўныя калектывы.

Такім чынам, развіццё прамысловасці ў пасляваенны час дасягалася ў першую чаргу за кошт нарошчвання экстэнсіўных фактараў развіцця. Гаспадаранне ўсё больш засноўвалася на ўцягванні ў вытворчасць усё новых і новых дадатковых рэсурсаў (як матэрыяльных, так і людскіх), а не на інтэнсіўных метадах і фактарах павелічэння аб’ёмаў прадукцыі: павышэнні прадукцыйнасці і фондаўзброенасці працы, аддачы асноўных вытворчых фондаў і зніжэнні матэрыялаёмістасці вытворчасці. У 1950-я гг. прыцягнутых дадатковых рэсурсаў аказалася дастаткова, каб забяспечыць высокія тэмпы эканамічнага росту.

Эканамічны прамысловы рост сталінскіх пяцігодак выглядае класічным прыкладам першаснай індустрыялізацыі, часам пераўтварэння аграрнай краіны ў індустрыяльную. Гэты перыяд звычайна для большасці краін характаразуецца хуткімі тэмпамі росту прамысловай прадукцыі, ростам сектара прамысловасці за кошт аграрнага сектара. Высокія тэмпы першаснага прамысловага росту былі абумоўлены задавальненнем першаснага попыту на прамысловыя тавары і

інвестыцыйным попытам на новае прамысловае абсталяванне для новых прадпрыемстваў. Тэмпы росту прамысловасці ў час сталінскіх пяцігодак, каласальныя змены ў структуры кадраў эканомікі, іх адукаванасці і кваліфікацыі трэба разглядаць не як эканамічны цуд ці вернасць курсу камуністычнай партыі, а як натуральныя працэсы, звязаныя з мадэрнізацыяй грамадства і яго эканомікі.

У наступныя гады тэмпы росту савецкай каманднай эканомікі сталі зніжацца. Пры гэтым зніжэнне адбывалася па ўсіх асноўных паказчыках эканамічнага развіцця СССР, у тым ліку і БССР. Каманднa-загадная сістэма ўсё ў большай ступені тармазіла эканамічнае развіццё краіны. Эканоміка Беларусі працягвала адставаць ад найбольш развітых капіталістычных краін і ад шэрагу рэспублік СССР[1]. Праблема зніжэння тэмпаў развіцця прамысловасці БССР і СССР мела аб’ектыўныя прычыны. У 1960 гг. перыяд першаснай індустрыялізацыі пачынае завяршацца. Яго межы былі абмежаваны магчымасцю рэкрутаваць кадры з аграрнага сектара і задавальненнем першаснага попыту на прамысловыя тавары. Прамысловасць БССР у гэты час канчаткова перавысіла аграрны сектар па аб’емах вытворчасці, а колькасць гарадскога насельніцтва стала большай за жыхароў вёсак. Надалей павінен быў надысці інвестыцыйны перыяд развіцця прамысловасці, які прадугледжвае прымяненне інавацый. БССР разам з СССР ужо ў 1960 гг. стаяла на парозе пераходу да інавацыйнага этапа.

Як паказаў вопыт краін з рынкавай эканомікай для пераходу да інвестыцыйнага перыяду эканамічнага развіцця вельмі важна выбудаваць механізм камертылізацыі інавацый. Самая паспяховая краіна ў гэтай сферы – ЗША, дзе створана найлепшая ў свеце сістэма камертылізацыі інавацый, у якую ўкладаюць найвялікшыя інвестыцыі. Усё гэта і забяспечвае стабільны эканамічны рост у ЗША. Па гэтым ж шляху з рознай ступенню паспяховасці ідуць і іншыя краіны з рынкавай эканомікай (“капіталістычныя” па савецкай тэрміналогіі).

У СССР у 1950–1980 гг. разумелі неабходнасць тэхнічных інавацый (“навукова тэхнічнага прагрэсу” ў савецкай тэрміналогіі), але дапусціць рэальную камертылізацыю гэтай сферы заміналі пастулаты савецкай ідэалогіі, найперш неабходнасці забеспячэння сацыяльнай роўнасці. Пайсці па так званым капіталістычным шляху камуністычнае кіраўніцтва не магло найперш з ідэалагічных меркаванняў.

Партыйнае кіраўніцтва, як уяўляецца з вышыні нашага часу, хаця і перманентна нагадвала ў партыйных і дзяржаўных дакументах пра неабходнасць паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, але не да канца разумела складанасць праблемы і памеры свайго адставання. Поспехі ў найбольш актуальных для яе сферах абароны (распрацоўкі новых відаў узбраенняў) і касмічных даследаванняў, не давалі магчымасці ацаніць памеры адставання ў гэтай сферы, падштурхоўвала да меркавання, што адставанне ў

[1] Несцяровіч М. Б. Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.). С. 43–50.

многіх кірунках навуковых даследаванняў, галінах прамысловасці выклікана недастатковай увагай да гэтых праблем і пралікамі ў кадравай рабоце.

У 1944–1990 гг. былі дасягнуты неаспрэчныя гаспадарчыя поспехі, абагульняльным паказчыкам якіх зрабіўся ўзросшы эканамічны патэнцыял. Пры гэтым тэмпы эканамічнага росту БССР былі ўвесь час на некалькі працэнтаў вышэй, чым па СССР у цэлым, у выніку чаго ў канцы 1980-х гг. яна стала адным з найбольш развітых раёнаў СССР[1]. З іншага боку, нежаданне савецкага кіраўніцтва кардынальна рэфармаваць адміністрацыйна-камандную эканоміку ў рыначным кірунку прывяло да нарастання негатыўных тэндэнцый, у выніку якіх да пачатку 1990-х гг. савецкая краіна безнадзейна адстала ад краін з рынкавай эканомікай. Эканоміка БССР, як і СССР у цэлым, знаходзілася ў асноўным на індустрыяльнай стадыі развіцця, у той час як большасць краін свету пераходзіла на навукова-індустрыяльную стадыю.

## 1.2 Характарыстыка і сацыяльная стратыфікацыя прамысловых кадраў БССР у 1944–1970 гг.

Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Беларусі захавалася толькі каля 15 % даваенных прадпрыемстваў, 26 % жыллёвага фонду гарадоў і райцэнтраў. Рэспубліка адчувала кадравы голад. Выпраўленню становішча і аднаўленню гаспадаркі садзейнічалі рээвакуацыя, накіраванне ў Беларусь спецыялістаў з глыбінных раёнаў СССР, наладжванне падрыхтоўкі кадраў у вызваленых абласцях.

У вызваленых раёнах рэспублікі нанава фарміраваліся кадры тэхнічных спецыялістаў. Кіраўнікі вытворчасцей, інжынеры і тэхнікі браліся на ўлік пры расфарміраванні партызанскіх атрадаў, адклікаліся пры неабходнасці з армейскіх частак. Да пачатку 1945 г. з глыбінных абласцей СССР было рээвакуявана 539 інжынерна-тэхнічных работнікаў (ІТР). Але недахоп ІТР для прамысловасці і будаўніцтва вызначаўся ў колькасці 4 188 чал. Тэхнічных спецыялістаў-кіраўнікоў у прамысловасці на пачатак 1945 г. мелася трохі больш, чым 60 % ад патрэбнай лічбы. Ужо на пачатак 1944/1945 навучальнага года ў Беларусі падрыхтоўкай кадраў займаліся 24 ВНУ з колькасцю студэнтаў каля 5 тыс. чал., звыш 60 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў[2]. Восенню 1944 г. у Мінск рээвакуіраваўся Белдзяржуніверсітэт. У прыстасаваных ацалелых будынках сярэдніх школ у дзве-тры змены пачалі навучанне каля 700 студэнтаў. У пачатку 1945 г. на кафедрах універсітэта ўжо працавала 113 выкладчыкаў[3]. Пастулова наладжвалася праца Акадэміі навук Беларусі. Кіраўніцтвам Беларусі ў гэты час перад навуковымі кадрамі ставіліся задачы найхутчэйшага аднаўлення народнай гаспадаркі і культуры БССР[4].

---

[1] Несцяровіч М. Б. Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951—1990 гг.). С. 49–50.
[2] Кузьменка У. І. Інтэлігенцыя Беларусі ў пасляакупацыйны ваенны перыяд. С. 56.
[3] Купреева А. П. Возрождение народного хозяйства Белоруссии. 1942–1945 гг. С. 194.
[4] Кузьменка У. І. Інтэлігенцыя Беларусі ў пасляакупацыйны ваенны перыяд. С. 58–59.

У другой палове 1945 г. колькасць ІТР у прамысловасці БССР дасягнула 8,6 тыс. чал., што складала каля 37 % даваеннага ўзроўню[1]. Тым не менш, патрэба ў інжынерна-тэхнічных ведах, высокакваліфікаваным кіраўніцтве працай была паўсюднай. Па стане на 01.01.1948 г. прамысловасць, транспарт і сувязь былі ўкамплектаваны інжынерамі на 59 %, а тэхнікамі на 55 %. Рэгіёны пастаянна прасілі ўрад БССР прыслаць неабходных спецыялістаў.

Характэрнай рысай пасляваеннага кадравага складу прадпрыемстваў, калгасаў, устаноў, органаў кіравання рэспублікай была яго вельмі высокая цякучасць. ЦК КП(б)Б адзначала гэтую праблему перманентна ў пастановах пасляваеннага часу. Адной з галоўных прычын такога стану кадраў бачылася "неабходнага клопату пра паляпшэнні жыллёва-побытавых умоў рабочых і інжынерна-тэхнічнага работнікаў"[2].

Адзначалася і вялікая змяняльнасць кіроўчага складу. У пастанове ЦК УсеКП(б) "Аб рабоце ЦК КП(б) Беларусі" ад 25.01.1947 г. было адзначана, што ў рэспубліцы назіраецца масавая змяняльнасць і перамяшчэнне кіраўнікоў. Толькі за 1945-й і 11 месяцаў 1946 г. змянілася больш за 90 % сакратароў райкамаў партыі, старшынь райвыканкамаў і гарвыканкамаў, старшынь сельсаветаў. Змяняльнасць кадраў была выклікана як аб'ектыўнымі прычынамі, напрыклад, рээвакуацыяй насельніцтва са ўсходніх рэгіёнаў СССР, дэмабілізацыяй ваеннаслужачых, якім абавязаны былі прадставіць былое месца працы, так і суб'ектыўнымі прычынамі практыкі работы мясцовых партыйных арганізацый, якія, на думку ЦК УсеКП(б), нездавальняюча працавалі з кадрамі[3].

На прамысловых прадпрыемствах БССР рухомасць кіраўніцтва была некалькі ніжэй і тым не менш хвалявала кіраўніцтва рэспублікі і СССР. Маскоўскае кіраўніцтва ў 1948 г. абавязала Міністра вугальнай прамысловасці заходніх рэгіёнаў "прыпыніць практыку частай змяняльнасці кіруючых кадраў" найперш на Данбасе[4]. У гэтым жа годзе Міністра вугальнай прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў абавязалі прыпыніць "заганную практыку частай зменлівасці начальнікаў, галоўных інжынераў шахт і начальнікаў участкаў[5].

Сістэма падбору кадраў на пасады кіраўнікоў у народнай гаспадарцы БССР і складанне кадравага рэзерву будзе намі падрабязна разгледжана ў наступным параграфе. Тут трэба адзначыць толькі тое, што сістэма падбору кіруючых кадраў і кантролю за імі фарміравалася яшчэ ў сталінскія часы і функцыянавала працяглы перыяд. У 1947 г. у пастанове ЦК УсеКП(б) "Аб рабоце ЦК КП(б) Беларусі" было жорстка прапанавана "прыпыніць масавую змяняльнасць і перамяшчэнне кіруючых работнікаў", наладзіць сістэму

---

[1] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 236

[2] Постановление ЦК КП(б)Б "О недостатках в деле организации промышленного производства и о мерах по их устранению". 7-12. 07. 1945 г. // Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов, и пленумов ЦК. Т. 4. С. 31.

[3] Постановление ЦК ВКП(б) "О работе ЦК КП(б) Белоруссии". 25.01.1947 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 85.

[4] Постановление ЦК ВКП(б) "О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Донбаса". 28.02.1948 г. // Там жа. С. 169.

[5] Постановление ЦК ВКП(б) "О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Кузбаса". 06.03.1948 г. // Там жа. С. 177.

папярэдняга выкліку і разгляду на пасяджэннях ЦК, абкамаў, гаркамаў і райкамаў партыі кіруючых кадраў, якія ўваходзяць у адпаведную наменклатуру. Звярталася ўвага на стварэнне пры КП(б)Б рэзерву кадраў[1].

Шырокі размах пасляваенных будаўніча-аднаўленчых работ выклікаў вялікую патрэбу у масавых, тэхнічна падрыхтаваных кадрах. За 1944–1946 гг. на прадпрыемствах рэспубліканскай прамысловасці колькасць рабочых узрасла ў 10 разоў, ІТР – у 5, служачых у 8 разоў. Аднак гэтых кадраў было далёка не дастаткова для вырашэння тых велізарных задач, якія паўсталі перад БССР у пасляваенныя гады. Многія прадпрыемствы адчувалі недахоп працоўнай сілы.

Значную дапамогу кадрамі, асабліва для новых галін прамысловасці, аказвалі Беларусі іншыя рэспублікі Савецкага Саюза, у першую чаргу РСФСР. У сакавіку 1945 г. з Беларэцка (Башкірская СССР) у Віцебск быў перабазіраваны завод заточных станкоў разам з 297 рабочымі, ІТР, служачымі, тэхнічнай дакументацыяй і абсталяваннем. Папоўнены за кошт віцяблян працоўны калектыў завода ў кароткія тэрміны наладзіў выпуск заточных і металарэзных станкоў. У 1947 г. у трэсце “Аўтапрамбуд” працавала звыш 50 прыбыўшых з РСФСР інжынераў і тэхнікаў[2]. Але асноўнае папаўненне кадраў рабочых, ІТР і служачых ішло ў асноўным за кошт беларускага насельніцтва.

Працоўныя, якія прыбылі на прамысловыя прадпрыемствы ў парадку грамадскіх заклікаў, у большасці сваёй мелі нізкую кваліфікацыю. Неабходна было ў шырокіх маштабах наладзіць падрыхтоўку новых кваліфікаваных кадраў. Вялікую колькасць рабочых па розных спецыяльнасцях па курсавой, брыгаднай і індывідуальнай сістэме падрыхтавалі за гэты час непасрэдна на вытворчасці. Павышэнне кваліфікацыі кадраў таксама вырашалася накіраваннем моладзі на роднасныя прадпрыемствы саюзных рэспублік. Найбольш распаўсюджаным было індывідуальнае навучанне. Яно праводзілася шляхам прымацавання працоўнага да інструктара вытворчага навучання, які прызначаўся з ліку кваліфікаваных рабочых, брыгадзіраў, майстроў і выконваў абавязкі інструктара па сумяшчальніцтве са сваёй асноўнай прафесіяй. Наступным па распаўсюджанасці метадам падрыхтоўкі рабочых на вытворчасці было брыгаднае навучанне. Некаторая колькасць новых рабочых, галоўным чынам складаных прафесій, рыхтавалася на курсах і ў пастаянна дзеючых школах як з адрывам, так і без адрыву ад вытворчасці. Для характарыстыкі ўдзельнай вагі кожнага з названых метадаў навучання прывядзем дадзеныя аб падрыхтоўцы новых рабочых на вытворчасці ў прамысловасці БССР за 1950 г. На працягу года ўсяго на вытворчасці было падрыхтавана 22 077 новых рабочых. З гэтага ліку 78,3 % прыходзілася на індывідуальнае навучанне і 16,4 % – на брыгаднае навучанне. На курсах з адрывам і без адрыву ад вытворчасці было падрыхтавана 5,3 % працоўных[3].

---

[1] Постановление ЦК ВКП(б) “О работе ЦК КП(б) Белоруссии”. 25.01.1947 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 92.

[2] Марченко И. Е. Рабочий класс БССР в послевоенные годы (1945–1950). С.107–108.

[3] Там жа. С.131–132.

Важную ролю ў падрыхтоўцы рабочых кадраў для прамысловасці адыгралі прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы сістэмы Дзяржаўных працоўных рэзерваў. У пачатку 1945 г. у БССР працавалі 55 устаноў гэтай сістэмы. У пачатку 1946 г. у рэспубліцы навучалася 13 499 юнакоў і дзяўчат. У 1948 г. пачалі стварацца рамесныя вучылішчы з 4-гадовым, а ў 1954 г. тэхнічных вучылішчаў з 2-гадовым навучаннем. У 1951 г. у сістэме прафесійна-тэхнічнага навучання функцыянавала 12 рамесных, 4 чыгуначных, 6 спецыялізаваных рамесных вучылішчаў і 34 будаўнічыя школы ФЗН. У 1951 г. яны накіравалі на прадпрыемствы 8 147 маладых рабочых, з якіх 3 340 чал. скончылі рамесныя і чыгуначныя вучылішчы, а 4 807 – школы ФЗН. Усяго за гады пятай пяцігодкі ў сістэме працоўных рэзерваў было падрыхтавана 33,8 тыс. кваліфікаваных рабочых. А за 1946–1955 гг. сістэма прафтэхадукацыі рэспублікі выпусціла 112,6 тыс. чалавек па ўсіх асноўных спецыяльнасцях [1].

Намаганнямі кіруючых кадраў, ІТР на прадпрыемствах рэспублікі паступова ўзнаўляліся курсы павышэння кваліфікацыі, гурткі тэхмінімумаў, на радзе вытворчасцей пачала аднаўляцца такая форма арганізацыйнай працы ў калектывах, як вытворча-тэхнічныя сходы.

У перыяд, які разглядаецца, істотна змянілася і ўзроставая структура кадраў. Аднаўленне прамысловасці суправаджалася прыцягваннем у вытворчасць новых работнікаў, пераважна з ліку моладзі. Па дадзеных перапісу на 5 мая 1950 г., 64,7 % работнікаў прамысловасці мелі стаж бесперапыннай працы да 3 гадоў, а 46,3 % работнікаў – узрост да 25 гадоў[2]. Да канца 1950-х гг. самай буйной узроставай групай сталі рабочыя і служачыя ад 26 да 35 гадоў. Іх удзельная вага узрасла з 24 % у 1950 г. да 39 % у 1957 г[3].

За пяць пасляваенных гадоў колькасць рабочых і служачых у рэспубліцы павялічылася больш чым у 1,7 разы, пры гэтым найбольш значна ў прамысловасці – амаль у 2,3 разы[4]. Разам з ростам працоўных кадраў у БССР вырасла колькасць інжынерна-тэхнічнай інтэлігенцыі.

За гады пятай пяцігодкі атрымалася вырашыць праблему аднаўлення кадравага складу прадпрыемстваў і нават перавысіць даваенны ўзровень колькасці рабочых. Колькасць прамысловых рабочых у БССР павялічылася на 75,4 тыс. і склала ў 1955 г. 317,8 тыс. чал. Чацвёртая частка ўсіх працоўных была занята ў машынабудаўнічай і металаапрацоўчай прамысловасці, з іх амаль палову складалі машынабудаўнікі. У параўнанні з даваенным перыядам гэтая група рабочых узрасла ў 1,7 разы. Павялічылася таксама ўдзельная вага рабочых паліўнай прамысловасці, электрастанцый, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. З 8,5 да 10,8 % узрасла ўдзельная вага буйных прадпрыемстваў у прамысловасці, а колькасць рабочых і служачых на іх штогод павялічвалася

---

[1] Казаков Ю. Л. Деятельность компартии Белоруссии по подготовке рабочих кадров и повышению их производственной квалификации (1951–1955) // Весн. Белорус. ун-та. Сер. 3. 1981. № 1. С. 8; Мандрык І. У. БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе: цяжкія вынікі з-за гітлераўскай акупацыі і складанасці ў ходзе аднаўлення гаспадарчага комплексу (на прыкладзе Віцебскай вобласці) // Учёные записки. 2017. Т. 24. С. 13; Социальные изменения рабочего класса Белоруссии в процессе строительства коммунизма. Минск, 1985. С. 31.
[2] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 268.
[3] Там жа. С. 361–362.
[4] Там жа. С. 273.

прыкладна на 10 тыс. чал. Прадукцыйнасць працы ў цэлым па прамысловасці БССР за 1951–1955 гг. вырасла на 56 %, перавысіўшы даваенны ўзровень на 80 %. Агульная колькасць рабочых (з сем'ямі) у 1959 г. дасягнула 2,8 млн чал., або 34,9 % агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі[1].

Адначасова ў рэспубліцы вялася падрыхтоўка спецыялістаў інжынерна-тэхнічнага ўзроўню. За 1951–1960 гг. ВНУ і тэхнікумы рэспублікі падрыхтавалі 78,3 тыс. спецыялістаў з вышэйшай і 133,4 тыс. з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. На 1 снежня 1959 г. у прамысловасці, будаўніцтве і на транспарце БССР працавала 42,7 тыс. спецыялістаў, з іх 12,3 тыс. чалавек з вышэйшай адукацыяй. У параўнанні з 1941 г. колькасць інжынераў у народнай гаспадарцы узрасла ў 3,5, а тэхнікаў – у 3,8 разы[2].

Высокія тэмпы росту сектара прамысловасці ў час першаснай індустрыялізацыі натуральна патрабавалі адпаведна і хуткага фарміравання кадравага складу прамысловых прадпрыемстваў, што аблягчалася адноснай нескладанасцю вытворчых навыкаў завадскіх рабочых пры выкананні простых аперацый, і як вынік з гэтага – магчымасць хуткага навучання новых кадраў. У кадравай сферы перыяд першаснай індустрыялізацыі характарызуецца наяўнасцю вялікага рэзерву папаўнення кадраў рабочых з аграрнага сектару, які, як правіла, спалучаецца з яшчэ адносна вялікай нараджальнасцю і высокімі тэмпамі дэмаграфічнага прыросту. Такая сітуацыя назіралася ў БССР яшчэ у другой палове 1950 – першай палове 1960-х гадоў.

У гады першых пасляваенных пяцігодак атрымалася аднавіць даваенны аб'ём прамысловай вытворчасці. Падчас аднаўлення і далейшага развіцця прамысловага патэнцыялу БССР адбыліся важныя змены ў кадравым складзе прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі. Зменшана цякучасць рабочай сілы. Склаліся вялікія па колькасці калектывы ізноў пабудаваных і новых буйных прамысловых прадпрыемстваў.

Дынамічная індустрыялізацыя і ўрбанізацыя БССР у 1945–1960-х гг. вызначалі агульную колькасць насельніцтва, якая была занятая ў народнай гаспадарцы БССР, яе структуру, яны проста паўплывалі на кадравы патэнцыял рэспублікі. У выніку шпаркага індустрыяльнага развіцця і хуткай урбанізацыі насельніцтва доля рабочых і служачых БССР у канцы 1960-х гг. дасягнула, а ў 1970-х гг. перавысіла палову ад агульнай колькасці занятых у народнай гаспадарцы рэспублікі. Пры гэтым доля работнікаў, якія працавалі ў прамысловасці і будаўніцтве, складала ў канцы 1950-х гг. адну чвэрць ад усіх занятых у народнай гаспадарцы БССР, а ў пачатку 1970-х гг. яна вырасла і перавысіла адну трэцюю частку працаўнікоў (гл. табл. 1)[3].

Статыстычныя дадзеныя паказваюць, што прамыслова-вытворчы персанал заводаў і фабрык вырас за перыяд са 152 да 1 030 тыс. чал. Ён складаў у 1945 г. адну чвэрць ад усіх рабочых і служачых занятых у народнай гаспадарцы БССР. Да 1950 г. яго доля рэзка вырасла да адной трэцяй, потым

[1] Народное хозяйство Белорусской ССР : статистический сборник. М., 1957. С.14–18.
[2] Социальные изменения рабочего класса Белоруссии в процессе строительства коммунизма. С. 35.
[3] Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г. С. 217.

крыху зменшылася да 30 % у 1960 г., і зноўку павялічылася да адной трэцяй у 1970 г.

Пры колькасным росце ўсіх катэгорый працаўнікоў прамысловасці аналіз іх удзельнай вагі ў агульным ліку работнікаў паказвае важныя тэндэнцыі зменаў кадравага складу персаналу.

Табліца 1 – Сярэднегадавая колькасць рабочых і служачых у народнай гаспадарцы БССР (тысяч чалавек)[1]

| | 1945 | 1950 | 1960 | 1970 |
|---|---|---|---|---|
| Усяго рабочых і служачых | 610 | 1 038 | 1 887 | 3 075 |
| У тым ліку рабочыя (уключаючы малодшы абслуговы персанал і работнікаў аховы) | – | – | 1 412 | 2 227 |
| Прамысловасць (прамыслова-вытворчы персанал) | 152 | 346 | 569 | 1 030 |
| У тым ліку: | | | | |
| Прамысловыя рабочыя | 112 | 279 | 483 | 850 |
| Вучні | 9 | 9 | 8 | 16 |
| Інжынерна-тэхнічныя работнікі | 8,5 | 24 | 44 | 108 |
| Служачыя | 13 | 20 | 24 | 42 |

Колькасць прамысловых рабочых вырасла за 25 гадоў у 7,5 разы са 112 да 850 тыс. чал. Пры гэтым доля рабочых у агульнай колькасці прамыслова-вытворчага персаналу прадпрыемстваў вырасла з 73,7 % у 1945 г. да максімальных 85 % у 1960 г., а затым да 1970 г. павольна і не надта істотна зменшылася да 82,5 %.

А вось колькасць вучняў і спецыялістаў за 25 гадоў хаця і павялічылася, але ўдзельная вага, наадварот, істотна знізілася. Так, колькасць вучняў на прадпрыемствах вырасла ў 1,8 разы – з 9 да 16 тыс., а доля зменшылася з 5,9 % да 1,5 %. Звязана гэта было з тым, што іх колькасць вучняў адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны была анамальна высокай у сувязі са стратай многіх работнікаў у гады вайны, з разбурэннем у гады акупацыі сістэмы падрыхтоўкі кадраў, неабходнасцю перавучвання кадраў, наборам некваліфікаваных работнікаў на вакансіі адноўленых прадпрыемстваў. Колькасць служачых на працягу ўсіх пасляваенных дзесяцігоддзяў таксама стабільна расла з 13 да 42 тыс., але доля няўхільна змяншалася з 8,5 % да 4 %.

Правядзенне рэканструкцыі і мадэрнізацыі шэрагу прадпрыемстваў, укараненне механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці павялічвала патрэбнасць у кадрах з тэхнічнай адукацыяй[2]. Разам з ростам працоўных кадраў у БССР павялічылася колькасць вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі. Крыніцамі яе

[1] Табліца складзена па: Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г.: стат. ежегод. Минск , 1975. С. 218–219; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. Стат. ежегод. Минск, 1981. С. 102, 187.
[2] Сасим А. М. Промышленность Беларуси в условиях реформирования и стагнации (1953–1985 гг.). Минск :, 2009. С. 21.

папаўнення з'яўляліся вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. За 1951–1960 гг. ВНУ і тэхнікумы рэспублікі падрыхтавалі 78,3 тыс. спецыялістаў з вышэйшай і 133,4 тыс. з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй[1].

Інжынерна-тэхнічныя работнікі былі адзінай катэгорыяй работнікаў доля якіх няўхільна ўзрастала, што настойліва патрабавалася для забеспячэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу (так сцвярджалася ў дырэктыўных дакументах). У выніку, колькасць ІТР вырасла ў 12,7 разы з 8,5 да 108 тыс., а ўдзельная вага вырасла з 5,6 % у 1945 г. да 10,5 % у 1970 г. а напачатку 1970-х гадоў падвоілася.[2]

Падобнай была сітуацыя амаль ва ўсіх галінах прамысловасці, а перш-наперш у тых, якія былі нацэленыя на выпуск і асваенне новай тэхнікі. Трэба адзначыць, што сацыяльныя наступствы тэхнічнага прагрэсу ў так званых "передавых галінах прамысловасці", як, напрыклад, у энергетыцы, машынабудаванні, прыборабудаванні, хімічнай прамысловасці выяўляліся больш рэльефна, чым ва ўсёй прамысловасці рэспублікі ўвогуле. Адным з самых высокакваліфікаваных атрадаў прамыслова-вытворчых кадраў на працягу ўсяго перыяду, які разглядаецца, былі энергетыкі. Тут удзельная вага інжынерна-тэхнічных работнікаў была значна вышэй, чым ва ўсёй прамысловасці БССР.

Так, напрыклад, інтэнсіўнае развіццё беларускай электраэнергетыкі з 1950 г. па 1975 г. прывяло да прыкметнага павелічэння ўдзельнай вагі кадраў энергетыкаў у агульнай колькасці рабочых і служачых у рэспубліцы з 1,5 % амаль да 2 %[3]. У электраэнергетыцы была асабліва прыкметная адзначаная тэндэнцыя да істотнага змянення суадносін паміж катэгорыямі персаналу. Нягледзячы на некаторыя ваганні ў асобныя перыяды, звязаныя найчасцей з уводам у дзеянне новых аб'ектаў, удзельная вага рабочых з 1960 г. мела ўстойлівую тэндэнцыю да скарачэння. Няўхільна зніжалася і доля служачых. Толькі ўдзельная вага інжынерна-тэхнічных работнікаў бесперапынна ўзрастала. Іх доля амаль падвоілася з 1950 па 1975 г. Гэтыя змены ўяўляліся сацыяльнымі наступствамі тэхнічнага прагрэсу, які адбываўся ў беларускай энергетыцы. Удзельная вага ІТР у энергетыцы была значна вышэйшай, чым ва ўсёй прамысловасці БССР. Гэта сведчыла пра тое, што ўкараненне ў вытворчасць новага абсталявання, тэхналогій, сістэм кіравання і г. д., дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу на электрастанцыях Беларусі ішло значна хутчэй, чым на прамысловых прадпрыемствах рэспублікі ў цэлым. Не выпадкова, што і тэмпы росту прадукцыйнасці працы ў электраэнергетыцы за 1950–1975 гг. больш чым у два разы перавышалі агульнапрамысловая[4].

Адным з недахопаў бюракратычнага ў адпаведнасці з інструкцыямі і прадпісаннямі росту ІТР на прадпрыемствах стала няпрофільнае іх працаўладкаванне, з'яўленне такіх дзіўных пасадаў, як "інжынер па дзіцячых

---

[1] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 358.
[2] Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г. С. 102.
[3] Промышленность Белорусской ССР (1913–1975). Минск : Беларусь, 1976. С. 57, 58, 112.
[4] Литвиновский И.А. Кадровая политика Белорусской энергосистемы в 1945–1975 гг. // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5. Мінск, 2010. С. 99–100.

садках” і г. д. Выклікана апошняе было шэрагам фактараў: забюракратызаванасцю сістэмы кіравання прадпрыемствамі, адсутнасцю ў прадпрыемстваў самастойнасці пры вызначэнні неабходных для функцыянавання пасад, якія часцяком былі не прадугледжаны штатным раскладам, выконваннем прадпрыемствамі вялікай колькасці сацыяльных функцый, неабходнасцю выконваць заданні аб росце “перадавых” з пункту гледжання марксісцкай тэорыі і палітыкі КПСС атрадаў работнікаў, да якіх адносілі не толькі рабочых, але і ІТР.

Важнае значэнне для характарыстыкі кадравага патэнцыялу мае галіновая структура кадраў прамысловасці БССР. Найбольшым атрадам рабочых і служачых прамысловасці Беларусі былі металісты. У прамысловасці БССР колькасць рабочых і спецыялістаў на прадпрыемствах машынабудавання і металаапрацоўкі вырасла з 52,5 тыс. чалавек у 1950 г. да 382,4 (з іх 300,4 тыс. рабочых) ужо ў 1970 г. Рост за 20 гадоў склаў 7,3 разы. Другімі па колькасці работнікаў былі працаўнікі лёгкай прамысловасці: 63,6 тыс. у 1950 г. і 225,1 (з якіх 196,7 тыс. рабочых) у 1970 г. Рост – 3,5 разы. Далей ішлі работнікі харчовай прамысловасці – 107,5 чалавек. Але рост тут склаў толькі 2,2 разы. Рабочыя і служачыя лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай галіны практычна не саступалі па колькасці харчовай, але колькасць працаўнікоў на яе прадпрыемствах зменшылася са 107 тыс. чал. у 1950 г. да 101,2 тыс. у 1970 г. У тры разы з 23,6 тыс. да 72,3 тыс. за 20 гадоў вырасла колькасць работнікаў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Колькасць занятых у паліўнай прамысловасці зменшылася з 24,1 тыс. да 20 тыс. чалавек. Затое электраэнергетыка развівалася вельмі хутка. Колькасць рабочых і служачых на яе прадпрыемствах узрасла з 5,2 тыс. да 22 тыс. чалавек. Рост склаў 4,2 разы.[1]

У 1950–1960 гг. адзначана тэндэнцыі павышэння ўзроўню адукаванасці і кваліфікацыі кадраў, амаладжэння кадраў на прамысловых прадпрыемствах. Сярод рабочых і служачых на працягу ўсяго перыяду даследавання, як бачна з табліцы 2, узрастае доля кваліфікаваных і адукаваных работнікаў.

Табліца 2 – Узровень адукацыі занятага насельніцтва БССР па грамадскіх групах (па дадзеных перапісаў насельніцтва)[2]

| | На 1 000 занятых прыходзіцца асоб з вышэйшай і сярэдняй (поўнай і няпоўнай) адукацыяй | | |
|---|---|---|---|
| | 1959 | 1970 | 1979 |
| Насельніцтва, якое занята ў народнай гаспадарцы | 331 | 594 | 763 |
| Рабочыя | 380 | 572 | 745 |
| Служачыя | 930 | 965 | 989 |
| Калгаснікі | 158 | 263 | 449 |

[1] Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г. С. 103.
[2] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. С. 12.

Такім чынам, за 20 гадоў узровень адукацыі занятага насельніцтва БССР – колькасць асоб з вышэйшай і сярэдняй (поўнай і няпоўнай) адукацыяй на 1 000 чал. насельніцтва вырасла ў 2,3 разы. Пры гэтым найбольш хуткі прырост колькасці адукаваных работнікаў назіраўся ў 1960-я гг. – на 263 чалавека, або ў 1,8 разы. У наступнае дзесяцігоддзе рост запаволіўся – ён склаў 169 чалавек – або ў 1,28 разы, у сувязі з тым, што база росту – колькасць малаадукаваных работнікаў зменшылася.

Колькасць адукаваных рабочых і спецыялістаў расла больш павольнымі тэмпамі. Гэтыя катэгорыі работнікаў і раней былі дастаткова адукаванымі. Так, сярод рабочых колькасць асоб з вышэйшай і сярэдняй (поўнай і няпоўнай) адукацыяй за 20 гадоў вырасла больш чым у 1,9 разы з 380 да 745 чалавек. Колькасць адукаваных служачых стабілізавалася і вырасла толькі ў 0,06 разы – ці на 6 %, з 930 да 989 чалавек на 1 000 чал. насельніцтва. Нязначнае перавышэнне тэмпу прыросту таксама назіралася ў 1960-я гг. у параўнанні з 1970 гг.

Табліца 3 – Колькасць спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія занятыя ў народнай гаспадарцы, па спецыяльнасці (тысяч чалавек)[1]

| | 1950 | 1957 | 1960 | 1970 | 1980 | 1990 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, якія занятыя ў народнай гаспадарцы | | 83,5 | 110,2 | 235,3 | 454 | |
| У тым ліку па спецыяльнасцях, якія атрыманы ў навучальных установах | | | | | | |
| інжынераў | | 13,7 | 21 | 67,2 | 161,7 | |
| эканамістаў | | 4 | 5,9 | 18,1 | 44,7 | |
| У тым ліку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на прамысловых прадпрыемствах | | 6,3 | 11,1 | 37,2 | 91,2 | |
| Усяго спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія занятыя ў народнай гаспадарцы | | 131,4 | 166 | 341,9 | 597,2 | |
| У тым ліку па спецыяльнасцях, якія атрыманы ў навучальных установах | | | | | | |
| тэхнікаў | | 27,5 | 45,4 | 127,3 | 263,9 | |
| планавікоў і статыстаў | | 9,2 | 14 | 39,6 | 80 | |
| У тым ліку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй на прамысловых прадпрыемствах | | 13,8 | 24 | 79 | 169,7 | |

[1] Табліца складзена па: Народное хозяйство Белорусской ССР. С. 224–226; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. С. 189–192.

Змены кадравага складу прамысловасці на прыкладзе Магілёўскай вобласці паказваюць, што агульная колькасць персаналу вобласці (без уліку калгаснікаў) вырасла толькі за адно дзесяцігоддзе амаль на трацiну з 231 778 чалавек у 1959 г. да 333 020 чал. у 1970 г. Пры гэтым рэзка павялічылася колькасць кваліфікаваных кадраў: спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй з 12 173 да 25 545, у тым ліку інжынераў з 1 358 да 5 526, спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй з 21 533 да 45 253[1]. Тым не менш, у сярэдзіне 1960-х гг. доля практыкаў на пасадах кіраўнікоў і спецыялістаў вобласці яшчэ складала 30 %. І толькі кожны чацвёрты "практык" вучыўся па спецыяльнасці[2].

Як бачна, недахоп кваліфікаваных спецыялістаў пастыпова пераадольваўся. Спецыялісты працавалі ў самых розных сферах грамадства, у тым ліку і ў прамысловасці, сферы кіравання, у партыйна-дзяржаўным апараце БССР. Гэтая група інтэлігенцыі з'яўлялася праваднікам дзяржаўнай палітыкі, пераважна дысцыплінавана функцыянавала ў зададзеных зверху рамках.

Асаблівасцю часу з'яўлялася тое, што павышэнне ўзроўню адукаванасці і кваліфікацыі кадраў спалучалася з высокай доляй спецыялістаў "практыкаў" на пасадах кіраўнікоў і спецыялістаў прадпрыемстваў. У пасляваенныя дзесяцігоддзі па-ранейшаму назіралася і нават узмацнілася расслаенне "кіруючых кадраў" прамысловасці і прадпрыемстваў на "практыкаў" і спецыялістаў з высокай профільнай адукацыяй. "Практыкі" характарызаваліся адсутнасцю прафесійнай адукацыі, лакальнай і сацыяльнай маларухомасцю, але яны мелі багаты вопыт работы і моцныя глыбокія сацыяльныя сувязі. Дыпламаваныя спецыялісты, як правіла, мелі добрую адукацыю, шырокі далягляд і высокі патэнцыял, у сувязі з чым былі дастаткова рухомымі і сацыяльна мабільнымі. Падобнай, дарэчы, была сітуацыя і сярод партыйных функцыянераў.

Кіраўніцтва СССР групу "практыкаў" разглядала як пэўны атавізм і перашкоду на шляху прагрэсу. Наяўнасць фармальнай профільнай адукацыі ўсё часцей іграла вырашальную ролю пры прызначэнні на пасады кіраўнікоў. Такі анкетны падыход з аднаго боку падштурхоўваў кадры да вучобы і перападрыхтоўкі, але, з іншага боку, з часам яго абсалютызацыя пачала перашкаджаць вылучэнню работнікаў, якія валодалі добрымі арганізацыйнымі здольнасцямі і вопытам працы на вытворчасці, на пасады кіраўнікоў.

Варта адзначыць, што з пазіцый падобнай класіфікацыі можна характарызаваць партыйныя, прамысловыя кадры не толькі БССР і СССР, але і суседніх краін у сярэдзіне XX ст. Напрыклад, характарызуючы тыпы партыйных функцыянераў прыбалтыйскіх краін да ўваходу ў склад СССР, даследчыкі таксама вылучаюць дзве падобныя дастаткова акрэсленыя групы, якія вызначаюцца па характару ўласцівых ім сацыяльных сувязяў. Паказчыкамі

[1] Сводные отчеты о численности и составе руководящих кадров и специалистов с высшим и средним специальным образованием на 1 декабря 1959 г. // ДАМаг. Ф. 2729. Воп. 1. Спр. 123. Арк. 1-9; Сводные отчеты о численности и составе руководящих кадров и специалистов с высшим и средним специальным образованием на 16 ноября 1970 г. // Там жа. Спр. 3287. Арк. 1-10.

[2] Информационная записка Могилевскому Обкому КПБ, Могилевскому Облисполкому, ЦСУ БССР, отделу статистки труда. 1 февраля 1966 // Там жа. Спр. 1275. Арк. 5.

груп з’яўляюцца сацыяльна-прафесійныя адрозненні, розныя пазіцыі ў той ці іншай сферах дзейнасці.

Так, да першай групы ў Латышскім сялянскім саюзе ў 1920–1930-я гг. былі аднесены прафесійна адукаваныя, лакальна не абмежаваныя ў сваім жыццёвым досведзе, рухомыя кадры, дзякуючы чаму яны валодалі большым даляглядам, былі вядомымі шырэйшай аўдыторыі. Сацыяльныя сувязі дадзенай групы партыйных функцыянераў дастаткова шырокія. Да другой групы даследчыкі адносяць сацыяльна маларухомых асоб, якіх характарызуе лакальнасць дзейнасці, адсутнасць прафесійнай адукацыі. Затое кіраўнікі гэтага тыпу мелі больш глыбокія сацыяльныя сувязі, дзякуючы занятаму месцу ў мясцовай “уладнай прасторы”. Уплыў гэтых сацыяльных сувязяў мог узмацняцца, дзякуючы даўжыні часу знаходжання на пасадзе і знаходжання адной асобы адначасова на некалькіх пасадах [1].

У гэты перыяд у прамысловасці адзначана тэндэнцыя няўхільнага росту ўдзельнай вагі асоб з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй сярод кіраўнікоў і інжынерна-тэхнічных работнікаў і скарачэння долі “практыкаў”. Пры гэтай спрыяльнай для развіцця прамысловасці тэндэнцыі ў сярэдзіне 1960-х гг. доля "практыкаў" на пасадах кіраўнікоў і спецыялістаў прамысловых прадпрыемстваў яшчэ складала крыху менш за трацiну, і ў рэгіёнах толькі кожны чацвёрты практык вучыўся па спецыяльнасці.

Праблема практыкаў мела саюзнае значэнне. Пастанова ЦК КПСС “Аб рабоце ЦК кампартыі Эстоніі з кіруючымі кадрамі” ад 30.01.1967 г. канстатавала, што партыйная арганізацыя рэспублікі не выяўляла дастатковага клопату па вылучэнню жанчын на пасады кіраўнікоў, а сярод кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, іх намеснікаў, начальнікаў і намеснікаў начальнікаў цэхаў па-ранейшаму працавала шмат практыкаў. Пераважная большасць з іх нідзе не вучылася [2].

Характэрнай з’яўляецца тэндэнцыя да гендарнага выраўноўвання ў 1945–1960-х гг. долі работнікаў на вытворчасці, якая мела вялікае значэнне. Адназначныя сцвярджэнні савецкіх вучоных пра павялічэнне ўдзельнай вагі жанчын на вытворчасці і адпаведнага змяншэння долі мужчын у пасляваенныя дзесяцігоддзі [3], з’яўляюцца справядлівымі для агульнай колькасці работнікаў і на працягу доўгай гістарычнай перспектывы. У асобных галінах прамысловасці, катэгорыях работнікаў і на карацейшых адрэзках часу агульная тэндэнцыя выглядае не такой адназначнай.

Склад працоўных БССР пасля вайны характарызаваўся высокай удзельнай вагой жанчын. Доля жанчын рэзка павялічылася ў 1940 гг. у выніку рэзкага змяншэння ў гады вайны колькасці працаздольных мужчын. Пасля

---

[1] Кузнецова Т.И. Информативных потенциал исторических источников: статистика в изучении политических партий // Актуальные проблемы источниковедения : материалы IV Международной научно-практической конференции к 420-летию дарования городу Витебску магдебургского права, Витебск, 20–21 апреля 2017 г. Витебск, 2017. С. 29.

[2] Постановление ЦК КПСС “О работе ЦК компартии Эстонии с руководящими кадрами”. 30 января 1967 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 141.

[3] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 362–363.

вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тысячы беларускіх жанчын прыйшлі на прадпрыемствы і ў будаўніцтва. У 1945 г. яны складалі амаль палову ўсіх рабочых і служачых, а ў прамысловасці 47,2 %. Асабліва шмат жанчын было ў такіх галінах прамысловасці як харчовая, абутковая, гарбарна-футравая, швейная, тэкстыльная і інш. Аднак у наступныя гады іх удзельная вага знізілася. У 1950 г. у народнай гаспадарцы БССР жанчыны складалі 45 %, у тым ліку ў прамысловасці і будаўніцтве 38,5 %. Такое становішча тлумачылася галоўным чынам вялікім прытокам на вытворчасць мужчын з Савецкай Арміі, а таксама памяншэннем колькасці жанчын у тых галінах прамысловасці, дзе былі цяжкія ўмовы працы, і мужчынская праца пераважае[1].

Пад уплывам вытворчых і сацыяльных фактараў зноў пачаліся адваротныя працэсы – сярод рабочых і служачых удзельная вага мужчын зменшылася, а жанчын павялічылася з 45 % у 1950 г. да 48 % у 1958 г. Гэтаму спрыяла развіццё галін прамысловасці з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для жаночай працы, асабліва ў лёгкай прамысловасці, а таксама механізацыя і аўтаматызацыя вытворчых працэсаў, укараненне тэхнікі бяспекі, пашырэнне сеткі дашкольных дзіцячых установаў і іншыя сацыяльна-эканамічныя фактары. Праслойка жанчын няўхільна павялічвалася і сярод спецыялістаў. На 01.12.1957 г. у рэспубліцы налічвалася 3,7 тыс. інжынераў-жанчын і 10 тыс. тэхнікаў-жанчын. Гэта складала 27,1 і 36,4 % агульнай колькасці названых катэгорый спецыялістаў, прычым найбольшая іх колькасць прыпадала на прадпрыемствы лёгкай і харчовай прамысловасці, а таксама сферу абслугоўвання.[2]

У 1950-я гг. пад уплывам вытворчых і сацыяльных фактараў адбываліся далейшыя змены ў кадравым складзе па палавой прыкмеце. У цэлым сярод рабочых і служачых удзельная вага мужчын зменшылася, жанчын павялічылася. У той жа час у шэрагу галін народнай гаспадаркі БССР у 1950-я гг. удзельная вага мужчын павялічылася, а жанчын знізілася. Як правіла, гэта мела месца на прадпрыемствах, вытворчасць якіх была звязана з цяжкімі ўмовамі працы, а таксама з перавагай спецыфічных мужчынскіх прафесій. Так, удзельная вага жанчын паменшылася сярод рабочых і служачых лясной гаспадаркі з 29 % у 1950 г. да 16 % у 1960 г., транспарту – з 24 да 22 %, будаўніцтва – з 33 да 30 %. Адпаведна ў гэтых галінах вырасла доля працаўнікоў мужчынскага полу. Аналагічнае становішча было на машынабудаўнічых і станкабудаўнічых заводах, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. У 1960 г. з агульнай колькасці жанчын-работніц і служачых 29 % было занята ў прамысловасці, 19 % – у сельскай гаспадарцы, 6 % – на транспарце і ў сувязі, 4 % – у будаўніцтве і г. д. Праслойка жанчын няўхільна павялічвалася сярод ІТР. На 01.12.1957 г. у рэспубліцы налічвалася 3,7 тыс. інжынераў-жанчын і 10 тыс. тэхнікаў-жанчын. Гэта складала 27,1 і 36,4 % агульнай колькасці названых катэгорый

[1] Социальные изменения рабочего класса Белоруссии в процессе строительства коммунизма. С. 36.
[2] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 362–363.

спецыялістаў, прычым найбольшая іх колькасць прыпадала на прадпрыемствы лёгкай і харчовай прамысловасці, а таксама сферу абслугоўвання[1].

Сярод спецыялістаў народнай гаспадаркі, у адрозненні ад першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, доля жанчын хаця і заставалася вельмі высокай, але мела тэндэнцыю да памяншэння, што звязана з паступовай ліквідацыяй дэмаграфічнага дысбалансу, які склаўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Так, ва ўсходнім рэгіёне БССР з 1959 г. па 1970 г. удзельная вага жанчын сярод спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у народнай гаспадарцы знізілася, напрыклад, па Магілёўскай вобласці з 68 %, калі і іх колькасць склала 22 909 чалавек, да 61,3 % пры росце агульнай колькасці да 43 352, сярод інжынераў іх доля паменшылася з 31,6 % да 25,7 %[2].

У пасляваенны час атрымала далейшае развіццё інтэрнацыяналізацыя кадравага складу прамысловых прадпрыемстваў. Пераважалі ў ім беларусы. На 01.04.1957 г. з 385,6 тыс. прамысловых рабочых беларусы складалі 274,2 тыс. Сярод ІТР і служачых ўдзельная вага беларусаў складала 57,6 % супраць 48 % на 01.01.1948 г. Разам з прадстаўнікамі карэннай нацыянальнасці ў складзе рабочага класа БССР было нямала рускіх, украінцаў, літоўцаў, яўрэяў, палякаў, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Асабліва шматнацыянальнымі былі калектывы буйных прадпрыемстваў БССР. Напрыклад, да канца 1950-х гг. на Віцебскім дывановым камбінаце калектыў работнікаў па нацыянальнаму складу размяркоўваўся наступным чынам: беларусаў – 76 %, рускіх – 12 %, украінцаў – 5 %, літоўцаў – 3 %[3].

Сярод актуальных праблем развіцця эканомікі важнае месца займалі пытанні павышэння працоўнай актыўнасці работнікаў. У перыяд, які разглядаецца, павялічвалася роля сацыялістычнага спаборніцтва як выпрабаванага сродку мабілізацыі працоўных калектываў. Найбольш маштабнай спробай стымуляваць працоўную актыўнасць работнікаў прамысловасці з'явілася рэформа па ўпарадкаванні нармавання і аплаты працы, рашэнне аб правядзенні якой было прынята ў 1956 г. Планавалася ажыццявіць перавод работнікаў на пагадзінную аплату працы і падняць ролю прэміравання за перавыкананне планавых заданняў. Аднак спробы ўвесці эканамічныя метады стымулявання працы ва ўмовах цэнтралізаванага кіравання ўсімі эканамічнымі працэсамі ў форме дырэктыўнага планавання не атрымалі шырокага распаўсюджвання ў перыяд, які разглядаецца[4]. Падобнай сітуацыя заставалася і ў наступныя дзесяцігоддзі.

Цякучасць была адной з характарыстык кадраў, якая ўплывала на работу прамысловасці. Ва многіх навуковых працах адзначаецца, што, нягледзячы на суровасць савецкага пасляваеннага працоўнага заканадаўства, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе па аб'ектыўных і суб’ектыўных прычынах была

---

[1] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 362–363.

[2] Сводные отчеты о численности и составе руководящих кадров и специалистов с высшим и средним специальным образованием на 1 декабря 1959 г. // ДАМаг. Ф. 2729. Воп. 1. Спр. 123. Арк. 1-9; Сводные отчеты о численности и составе руководящих кадров и специалистов с высшим и средним специальным образованием на 16 ноября 1970 г. // Там жа. Спр. 3287. Арк. 1-10.

[3] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 363–364.

[4] Сасим А. М. Промышленность Беларуси в условиях реформирования и стагнации (1953–1985 гг.). С. 52–55.

вельмі значнай цякучасць кадраў[1]. Цякучасць была агульнасаюзнай праблемай. Адна з самых цяжкіх сітуацый склалася на шахтах СССР, куды масава рэкрутавалі беларускіх рабочых. За два пасляваенныя гады ў Кузбас прыбыла 130 тыс., а выбыла 106 тыс. рабочых[2]. За 1947 г. толькі па камбінатах “Сталінвугаль” і “Арцёмвугаль” на Данбасе выбыла 117 тыс рабочых[3].

Звальненні адбываліся як па ўласным жаданні ў сувязі са станам здароўя, пераменай месца жыхарства, набыццём другой спецыяльнасці, пераходам на працу на роднасныя прадпрыемствы, так і прызывам на службу ў Савецкую Армію, за парушэнне працоўнай дысцыпліны. Нават на прадпрыемствах цяжкай прамысловасці цякучасць кадраў найчасцей вызначалася нізкааплатнымі работнікамі, са слабай прафесійнай падрыхтоўкай, якія былі занятыя на працаёмкіх аперацыях з цяжкімі ўмовамі працы[4].

У сярэдзіне 1956 гг. былі адменены многія рэпрэсіўныя пастановы: аб спрошчаным парадку вядзення спраў аб тэрарызме, шкодніцтве і дыверсіях; аб крымінальнай адказнасці рабочых і служачых за самавольнае пакіданне рабочых месцаў. За прагулы без паважлівых прычын цяпер былі прадугледжаны меры дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння.

Рэспубліканскія і рэгіянальныя кіраўнікі, кіраўніцтва асобных прадпрыемстваў разумела, якія негатыўныя наступствы для кадравай стабільнасці вытворчых калектываў ва ўмовах нізкіх заробкаў і цяжкіх умоў працы могуць мець прынятыя рашэнні аб змякчэнні рэпрэсіўнага заканадаўства. Мерапрыемствы партыйных і дзяржаўных органаў былі накіраваны на тое, каб зменшыць прагназаваны ўсплёск цякучасці кадраў і пагаршэнне працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах. Тым не менш, цалкам перадухіліць рост цякучасці кадраў і парушэнняў працоўнай дысцыпліны не ўдалося.

Ліст ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС аб умацаванні працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах і будоўлях прамысловасці і транспарту, у МТС, саўгасах і ўстановах ад 16.05.1956 г. з аднаго боку канстатаваў неабходнасць дэкрыміналізацыі прагулаў без паважлівых прычын і самавольных сыходаў з прадпрыемстваў і ліквідацыю судовай адказнасці за падобныя ўчынкі, якая была ўведзена напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а з іншага боку прадугледжваў шэраг эканамічных і выхаваўчых мерапрыемстваў[5].

Напрыклад, у Гомельскай вобласці ў другой палове 1950 гг. назіраўся рост цякучасці кадраў і парушэнняў працоўнай дысцыпліны. На бюро

[1] Литвиновский И.А. Кадровая политика Белорусской энергосистемы в 1945–1975 гг. С. 93–94.

[2] Постановление ЦК ВКП(б) “О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Кузбаса”. 06.03.1948 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 174.

[3] Постановление ЦК ВКП(б) “О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Донбаса”. 28.02.1948 г. // Там жа. С. 167.

[4] Литвиновский И.А. Кадровая политика Белорусской энергосистемы в 1945–1975 гг. С. 94.

[5] Письмо ЦК КПСС, Совета Министров СССР и ВЦСПС «Об укреплении трудовой дисциплины на предприятиях и стройках промышленности и транспорта, в МТС, совхозах и учреждениях». 16 мая 1956 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 98–104.

Гомельскага абкама КПБ у снежні 1958 г. разглядалася пытанне "Аб стане і мерах па паляпшэнні працоўнай дысцыпліны на прамысловых прадпрыемствах, транспарце і будаўніцтве вобласці". Было прызнана, што ў 1958 г. у параўнанні з 1957 г. на большасці прадпрыемстваў колькасць фактаў парушэння працоўнай дысцыпліны і прагулаў павялічылася. За 9 месяцаў 1958 г. колькасць прагулаў на заводзе Гомсельмаш склала 1 279 чалавекадзён, на мэблевым камбінаце – 796, на шклозаводзе імя Сталіна – 446, на Хойніцкім кансервавым заводзе 1 291, на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці – 3 807[1].

Прагулы і спазненні на працу, з'яўленне на працы ў нецвярозым стане станавіліся на прамысловых прадпрыемствах усё больш частымі з'явамі. Толькі за дзевяць месяцаў 1958 г. на прамысловых прадпрыемствах, транспарце і будоўлях Гомельскай вобласці было дапушчана 13 807 чалавекадзён прагулаў, а з дазволу адміністрацыі няяўка на працу склала 107 796 чалавека-дзён. Унутрызменныя прастоі склалі 689 392 чалавека-гадзіны[2].

У 1950-я гг. сярод працоўных і служачых БССР прыкметна ўзрасла ўдзельная вага кадраў, якія працяглы час працавалі на адным і тым жа прадпрыемстве. У прамысловасці доля рабочых і служачых з бесперапынным вытворчым стажам звыш 4 гадоў павялічылася з 19,2 % у 1950 г. да 45 % у 1957 г., у тым ліку са стажам больш за 5 гадоў – з 11,5 % да 36 %. У 1957 г. толькі 33 % рабочых і служачых прамысловасці мелі вытворчы стаж да 2 гадоў.[3] Тым не менш, цякучасць кадраў, нягледзячы на станоўчую тэндэнцыю да іх большага замацавання, заставалася высокай.

Аналіз сітуацыі ў Гомельскай вобласці зроблены функцыянерамі прамыслова-транспартнага аддзела абкама КПБ, паказаў, што цякучасць кадраў сапраўды заставалася вельмі высокай. У даведцы ад 19.09.1962 г. прама ўказваецца, што ў прамысловасці і будаўніцтве "працягвае заставацца высокай цякучасць кадраў, што дэзарганізуе вытворчасць, прыводзіць да зніжэння вытворчасці працы і падаражэння кошту работ". Далей канстатавалася, што ў 1961 г. на прамысловыя прадпрыемствы вобласці было прынята 29 % работнікаў ад агульнай колькасці персаналу, а выбыла 22 %. У будаўнічых арганізацыях сітуацыя была яшчэ горшай. Яны прынялі на працу 73,3 % ад агульнай колькасці персаналу, а выбыла 70 % работнікаў. Сярод негатыўных наступстваў такой цякучасці адзначалася падзенне вытворчасці працы напярэдадні звальнення работніка, а асваенне новым работнікам прыёмаў працы па спецыяльнасці працягвалася тры-пяць месяцаў. Вялікая рухомасць кадраў тлумачылася тым, што кіраўніцтва прадпрыемстваў не ўдзяляе неабходнай увагі пытанням стварэння для працоўных нармальных умоў працы. Прызнавалася нездавальняючая пастаноўка вытворчага навучання непасрэдна на вытворчасці, звальненне пэўнай часткі работнікаў з-за адсутнасці ўмоў для

---

[1] Протокол № 30 заседания бюро Гомельского обкома КП Белоруссии от 3 декабря 1958 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 247. Арк. 13-14.

[2] Справка промышленно-транспортного отдела Гомельскогообкома КПБ "О состоянии и мерах по улучшению трудовой дисциплины на промышленных предприятиях, транспорте и строительстве области". 1 декабря 1958 г. // Там жа. Арк. 80-85.

[3] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 361–362.

павышэння кваліфікацыі[1]. Запіску абмеркавалі на пасяджэнні бюро Гомельскага абкама партыі. Было прызнала неабходным яе разаслаць і распрацаваць мерапрыемствы па паляпшэнні сітуацыі і выканання планавых заданняў[2].

Падобная сітуацыя на мяжы 1950–1960 гг. была не толькі ў БССР, але і ў іншых рэгіёнах СССР, у тым ліку на ўкраінскіх прадпрыемствах, аб чым сведчыць пастанова ЦК КПСС ад 07.02.1961 г. "Аб рабоце Крыварожскай гарадской партыйнай арганізацыі па выкананні рашэнняў XXI з'езда КПСС і чэрвеньскага (1959 г.) пленума ЦК аб паскарэнні тэхнічнага прагрэса ў прамысловасці і будаўніцтве"[3]. У ёй адзначалася, што палітычная работа вядзецца ў адрыве ад практычных задач, што часцяком працоўныя не атрымоўваюць адказаў на пытанні, якія іх хвалююць, у выніку чаго маюцца буйныя парушэнні працоўнай і вытворчай дысцыпліны, вялікая цякучасць кадраў, аварыі і г. д. Толькі цягам наступнага дзесяцігоддзя сітуацыя пачала паступова стабілізавацца.

Ва ўмовах змякчэння працоўнага заканадаўства ў сярэдзіне 1950 гг. кіраўніцтва краіны, асобных галін народнай гаспадаркі, адміністрацыі прадпрыемстваў распрацоўвалі комплексы арганізацыйна-тэхнічных і сацыяльных мерапрыемстваў і прыкладалі вялікія намаганні для пераадолення праблемы цякучасці кадраў. Укараненне новага высокапрадукцыйнага абсталявання, замена малакваліфікаванай працы механізаванай, павелічэнне заработнай платы і паляпшэнне жыллёва-побытавых умоў работнікаў бачылася галоўнымі шляхамі яе рашэння. Сапраўды, вырашэнне гэтых задач па ўяўленнях і магчымасцях таго часу дазволіла ў 1960-х гг. у значнай ступені замацаваць кадры ва многіх перадавых галінах прамысловасці БССР, у прыватнасці на электрастанцыях БССР. Так, з'явіліся электрастанцыі, дзе ў асобныя гады наогул адсутнічала цякучасць рабочай сілы[4]. Тым не менш, праблема цякучасці кадраў заставалася сур'ёзнай, перш за ўсё на прадпрыемствах лёгкай і мясцовай прамысловасці.

Маральныя патрабаванні да кадраў былі удасканалены ў 1960-я гг.. На XXII з'ездзе КПСС у 1961 г. быў зацверджаны маральны кодэкс будаўніка камунізму, які быў пабудаваны на пэўных прынцыпах. Да адданасці справе камунізму, добрасумленнай працы, клопату пра грамадскую маёмасць, калектывізму, гуманных адносін і ўзаемнай павагі, чэснасці, маральнай чысціні, прастаты і сціпласці ў грамадскім і асабістым жыцці, сяброўства і братэрства народаў СССР, салідарнасці з працоўнымі ўсіх краін і непрымірымасці да

[1] Справка промышленно-транспортного отдела Гомельского обкома КПБ «О недостатках в работе хозяйственных и партийных организаций по повышению производительности труда в промышленности и строительстве» от 19 сентября 1962 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 340. Арк. 256.
[2] Пратакол № 27 пасяджэння бюро Гомельскага абкама КПБ ад 19 верасня 1962 г. // Там жа. Арк. 224.
[3] Постановление ЦК КПСС "О работе криворожской городской партийной организации по выполнению решений XXI съезда КПСС и июньского (1959 г.) пленума ЦК об ускорении технического прогресса в промышленности и строительстве". 7 лютага 1961 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 37–43.
[4] Литвиновский И.А. Кадровая политика Белорусской энергосистемы в 1945–1975 гг. С. 94.

ворагаў камунізму, дадаваўся такі прынцып, як "непрымірымасць да несправядлівасці, дармаедства, несумленнасці, кар'ерызму, скнарнасці"[1].

Дзве апошнія пазіцыі тычыліся і актыўнасці работнікаў, якую ўсяляк заклікалі выяўляць, але не ў спробах рухацца па кар'ернай лесвіцы, не ў жаданні дзякуючы гэтаму палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. Лічылася, што чалавек не павінен сам актыўна вылучацца і прэтэндаваць на вышэйшыя пасады, а калі ён варты вылучэння, то адпаведныя органы самі яго заўважаць. КПСС менавіта за партыйнымі органамі замацавала функцыю "падбору і расстаноўкі кіраўніцкіх кадраў, выхаванне іх у духу камуністычнай ідэйнасці, чэснасці і праўдзівасці, высокай адказнасці перад партыяй і народам за даручаную справу"[2].

У рэзалюцыі XXIII з'езда КПСС былі сфармуляваны патрабаванні да кіраўніцкіх кадраў. Лічылася, што ў першую чаргу на кіраўніцкую работу павінны вылучацца работнікі "адданыя ідэям камунізму, якія добра ведаюць сваю справу, стала звязаныя з масамі, умеюць арганізаваць іх…" Як бачна, палітычныя патрабаванні да кадраў, іх палітычная лаяльнасць, як і раней ставіліся на першае месца, але ўзрастае роля кваліфікацыі і арганізацыйных здольнасцяў. Зноўку было падкрэслена, што трэба "смялей вылучаць маладых, энергічных работнікаў", але тут жа падкрэслівалася, што неабходна правільна спалучаць энергію маладых "з вопытам старых кадраў"[3]. Відавочна, што праблема абнаўлення кадравага складу ва ўсіх галінах савецкай вертыкалі ўлады, неабходнасць забяспечыць прыток маладых арганізатараў вытворчасці стаяла ўжо ў 1960-я гг., яна пачала разумецца тэарэтычна, але, як паказала гісторыя наступнага дзесяцігоддзя, так і не была вырашана.

Кадры прамысловасці павінны былі з большага адпавядаць нормам статута КПСС і ўяўленням пра камуніста і савецкага кіраўніка. Мелася сістэма палітыка-выхаваўчай працы з кадрамі, але на прадпрыемствах вялікае значэнне яшчэ мела і выкананне прамысловых планаў, наладжванне тэхналагічнага працэсу, уменне кіраваць калектывам і г. д., у сувязі з чым прафесійная падрыхтоўка кадраў пачала ў рэальнасці іграць усё большую ролю.

Такім чынам, інтэнсіўнае прамысловае будаўніцтва на працягу ўсяго разглядджанага перыяду спрыяла няўхільнаму росту колькасці вытворчых кадраў. Сацыяльнымі наступствамі тэхнічнага прагрэсу ў прамысловасці сталі змены суадносін паміж катэгорыямі персаналу. Статыстычныя дадзеныя і дакументы органаў кіравання паказваюць, што за два з паловай дзесяцігоддзі пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны пры колькасным росце ўсіх катэгорый працаўнікоў прамысловасці, доля рабочых у агульнай колькасці прамыслова-вытворчага персаналу прадпрыемстваў вырасла з 73,7 % у 1945 г. да максімальных 85 % у 1960 г., а затым да 1970 г. зменшылася да 82,5 %. А

---

[1] XXII съезд КПСС. 1961 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 168–169, 200–201.
[2] Там жа. С. 196.
[3] XXIII съезд КПСС. 1966 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 24.

вось удзельная вага вучняў і спецыялістаў за 20 гадоў,наадварот, істотна знізілася. У перадавых галінах эканомікі ўжо ў 1960-я гг. намецілася тэндэнцыя да істотнага скарачэння ўдзельнай вагі рабочых і служачых, узрастання вагі інжынерна-тэхнічных работнікаў. ІТР былі адзінай катэгорыяй работнікаў доля якіх няўхільна ўзрастала.

У 1950–1960-я гг. адзначана тэндэнцыі павышэння ўзроўню адукаванасці і кваліфікацыі кадраў, амаладжэння кадраў на прамысловых прадпрыемствах. У гэты перыяд у прамысловасці назіраецца стабільны рост удзельнай вагі асоб з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй сярод кіраўнікоў і ІТР, скарачэнне долі "практыкаў". Пры гэтым доля "практыкаў" на пасадах кіраўнікоў і спецыялістаў прамысловых прадпрыемстваў у сярэдзіне 1960 гг. яшчэ складала амаль траціну. У канцы 1950–1960-я гг. назіралася гендарнае выраўноўванне дысбалансу, які быў выкліканы наступствамі Вялікай Айчыннай вайны. Заставалася сур'ёзнай праблема цякучасці кадраў, перш за ўсё на прадпрыемствах лёгкай і мясцовай прамысловасці. Адміністрацыі прадпрыемстваў распрацоўвалі комплексы арганізацыйна-тэхнічных і сацыяльных мерапрыемстваў і прыкладалі вялікія намаганні для пераадолення высокай цякучасці кадраў, якая разглядалася як вялікая праблема для арганізацыі стабільнага вытворчага працэсу. У сувязі з зацвярджаннем маральнага кодэксу будаўніка камунізму былі ўдасканалены маральныя патрабаванні да кадраў, які быў пабудаваны на прынцыпах адданасці ідэям камунізму.

## 1.3 Кадравы склад прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі ў 1970–1991 гг.: шляхі фарміравання і ўдасканалення

На пачатак 1970-х гг. рэзервы працоўнай сілы, якія з'яўляліся адным з асноўных фактараў эканамічнага росту, былі ў значнай ступені вычарпаны. Да пачатку 1980-х гг. магчымасці выкарыстаць прырост занятасці ў матэрыяльнай вытворчасці аказаліся яшчэ больш абмежаваныя. Калі ў першыя пасляваенныя пяцігодкі рост працоўных рэсурсаў у гарадах забяспечваўся за кошт жыхароў сельскіх мясцовасцей, то да 1980-х гг. гэтая крыніца практычна сябе вычарпала.

Узровень агульнаадукацыйнай і спецыяльнай падрыхтоўкі гаспадарчых кадраў у 1970-я-1980-я гг. паступова павялічваўся.

У 1972 г. у Магілёўскай вобласці мелася больш за 72 тысячы спецыялістаў народнай гаспадаркі і культуры з вышэйшай адукацыяй, 1 270 навуковых работнікаў, у тым ліку 12 дактароў і 341 кандыдат навук[1]. Пры гэтым не мелі вышэйшай адукацыі 49 % кіраўнікоў і 39 % галоўных інжынераў прамысловых прадпрыемстваў і будаўнічых арганізацый. З'яўляліся "практыкамі" 8,8 % кіраўнікоў, 7,7 % галоўных спецыялістаў, 22,4 % начальнікаў цэхаў, змен, участкаў, прарабаў, майстроў прадпрыемстваў прамысловасці і будаўніцтва[2].

[1] Протокол заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 171.
[2] Протокол пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 4.

У Віцебскай вобласці 58,4 % кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў не мелі вышэйшай адукацыі, 13 % спецыяльнай адукацыі і толькі 41,6 % з’яўляліся спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыі. Без спецыяльнай адукацыі працавалі 11,4 % галоўных спецыялістаў, 13,2 % начальнікаў цэхаў, 32 % начальнікаў смен, участкаў, цэхавых лабараторый і іх намеснікаў. “Практыкі”, якія не мелі нават сярэдняй спецыяльнай адукацыі, узначальвалі 35 прамысловых прадпрыемстваў вобласці і 13 будаўнічых арганізацый, да гэтай катэгорыі працаўнікоў адносіліся 54,9 % галоўных і старшых бухгалтараў, 76 % бухгалтараў, 23 % эканамістаў. 35,8 % майстроў на прадпрыемствах не мелі сярэдняй адукацыі[1]. На прамысловых прадпрыемствах г. Гомеля (1974) працавала вялікая колькасць “практыкаў” – сярод начальнікаў змен, пралётаў, участкаў звыш 12 %; старшых майстроў і майстроў каля 20 %, найбольшая вага іх была сярод начальнікаў забеспячэння і галоўных бухгалтараў[2].

За наступныя дзесяць-пятнаццаць гадоў удалося палепшыць кадравы склад за кошт прыняцця на працу маладых спецыялістаў і абучэння без адрыву ад вытворчасці. Толькі ў Гомельскай вобласці за тры гады (1976–1978) падрыхтавалі 25 000 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, звыш 41 000 кваліфікаваных рабочых[3]. У 1978 г. 70 % дырэктароў і галоўных інжынераў прамысловых прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці былі з вышэйшай спецыяльнай адукацыяй, 8 % завяршалі навучанне ў ВНУ. У той жа час не мелі вышэйшай адукацыі больш 60 % эканамістаў (10 % з іх “практыкі”), спецыяльнай сярэдняй адукацыі 24 % галоўных і 45 % старшых бухгалтараў. Амаль 28 % кіраўнікоў, 21 % галоўных інжынераў, 48 % кіраўнікоў цэхаў, службаў, аддзелаў і іх намеснікаў, галоўных спецыялістаў прадпрыемстваў не з’яўляліся спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыі[4]. У 1979 г. на 610 тыс. занятых у народнай гаспадарцы Магілёўскай вобласці прыходзіцца 107 тыс. (17,5 %) спецыялістаў, з іх 38 тыс. (35,5 %) вышэйшай кваліфікацыі[5]. Толькі кожны шосты спецыяліст быў з вышэйшай адукацыяй. Кожны трэці дырэктар і кожны чацвёрты галоўны інжынер прамысловых прадпрыемстваў не мелі вышэйшай кваліфікацыі. На інжынерна-тэхнічных пасадах працавалі 2 600 “практыкаў”, сярод іх 9 кіраўнікоў, 61 начальнік цэха і 701 майстар[6].

У БССР праводзілася пэўная праца па ўмацаванні кіраўніцкіх кадраў сярэдняга звяна на прамысловых прадпрыемствах. Асаблівая ўвага звярталася на майстроў. Для прыкладу, у 1978 г. Віцебскі АК КПБ прааналізаваў працу з майстрамі на прадпрыемствах Чыгуначнага раёна г. Віцебска і прыняў шэраг рэкамендацый. Праз два гады падвялі вынікі рэалізацыі прапаноў і адзначылі,

[1] Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ, 28–29.11.1972 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8. Арк. 9, 12, 124–127.
[2] Протокол заседания 3-го пленума Гомельского АК КПБ, 1974 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 142. Спр. 8. Арк. 100.
[3] Протокол Гомельской областной партийной конференции (1979) // Там жа. Воп. 153. Спр. 78. Арк. 37.
[4] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 159. Спр. 109. арк. 14, 28–30, 43–44.
[5] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 11.04.1979 г. // Там жа. Воп. 162. Спр. 12. Арк. 135.
[6] Там жа. Арк. 14–15.

што на прадпрыемствах рэгулярна аналізаваўся якасны склад работнікаў гэтай катэгорыі. Працаваў раённы савет майстроў, на пасяджэнні якога разглядаліся справаздачы завадскіх саветаў майстроў[1]. Узрасла колькасць прадпрыемстваў, дзе былі створаны спецыяльныя фонды майстра для заахвочвання найлепшых рабочых за дасягненне высокіх якасных і колькасных паказчыкаў. Палепшыўся якасны склад майстроў. Колькасць "практыкаў" сярод іх за 1978–1980 гг. скарацілася на 10,8 %. На пачатак 1981 г. 14 % майстроў мелі вышэйшую адукацыю, 72 % сярэднюю спецыяльную. Кожны другі – ударнік камуністычнай працы, кожны трэці актыўны рацыяналізатар і вынаходнік. 150 майстроў Чыгуначнага раёна г. Віцебска мелі ўрадавыя ўзнагароды[2].

Звесткі аб складзе кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і яб'яднанняў БССР у 1984–1987 гг. (гл. дад. Г) сведчаць, што ў 1986 г. 100 % генеральных дырэктароў і дырэктароў прамысловых прадпрыемстваў і аб'яднанняў Магілёўскай вобласці мелі вышэйшую адукацыю (1984 г. – 99,5 %), 99 % з іх былі спецыялістамі. Праз год з вышэйшай адукацыяй працавала 224 (99,6 %) кіраўніка прамысловасці і будаўніцтва, усе яны з'яўляліся спецыялістамі ў сваей галіне і ў іх складзе было чатыры кандыдаты і адзін доктар навук[3]. У абазначаны перыяд толькі адна жанчына ўзначальвала прадпрыемства, 100 % кіраўнікоў былі членамі КПСС, узрасла колькасць прадстаўнікоў тытульнай нацыі з 48, % (1984) да 56,4 % (1987), назіралася тэндэнцыя да павялічэння вагі кіраўнікоў сталага ўзросту (ад 51 да старэйшых за 60 год) – 38 % у 1984 г. і 48,5 % у 1986 г., колькасць маладых на пасадах (36–45 год) пабольшала толькі ў 1987 г. з 23 % да 26,3 %. Захоўвалася стабільнасць кадраў – на першым месцы (каля 30 %) былі тыя, што папрацавалі на пасадзе ад 5 да 10 год, на другім (каля 25 %) са стажам больш за 10 гадоў, толькі ў 1987 г. павялічылася вага "маладых" кіраўнікоў (час працы да 3 гадоў) – 41,7 %.[4]

Змяняльнасць і амаладжэнне кіраўніцкіх кадраў напрыканцы 1980-х гг. былі выкліканы тымі працэсамі, што адбываліся ў час "перабудовы". Так, у адпаведнасці з якасным складам кіраўнікоў прамысловах прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці па стане на 01.07.1988 г. (гл. дад. Д, Е, Ж) былі ва ўзросце ад 36 да 45 гадоў – 33,3 % дырэктароў, столькі ж 30–35 гадоў. Больш за 10 гадоў адпрацавалі на пасадзе 62,9 %, да 3 гадоў – 29,6 %, але на прадпрыемствах саюзнага падпарадкавання – 41,7 % кіраўнікоў мелі стаж працы менш за 3 гады[5].

У Віцебскай вобласці на 01.07.1988 г. было 23 генеральныя дырэктары і дырэктары прадпрыемстваў прамысловасці[6], у 1989 г. – 24 генеральныя

[1] На прадпрыемствах і ў арганізацыях, у якіх налічвалася больш 10 майстроў, былі створаны саветы майстроў.
[2] Справка о выполнении постановления бюро Витебского обкома КПБ от 27.06.1978 г. "О работе партийных организаций Железнодорожного района г. Витебска с кадрами мастеров", 1980 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 151. Спр. 80. Арк. 7-9.
[3] Пояснительная записка отдела организационно-партийной работы ЦК КПБ. 20.07.1987 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 406. Арк. 2.
[4] Справка о составе и сменяемости руководителей промышленных предприятий и объединений БССР. 1984–1987 гг. // Там жа. Спр. 982. Арк. 1-2 (1984–1985); Спр. 406. Арк. 4–5 (1986–1987).
[5] Список к статистичекому отчёту о составе и сменяемости кадров Могилёвской области по состоянию на 01.07.1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 99-162.
[6] Список руководителей предприятий, объединений и строительных организаций Витебской области на 01.07.1988 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 173. Спр. 49. Арк. 146-148.

дырэктары аб’яднанняў і дырэктары прадпрыемстваў, 2 дырэктары электрастанцый, 12 упраўляючых будаўнічымі трэстамі, 8 генеральных дырэктароў аб’яднанняў і дырэктараў прадпрыемстваў будматэрыялаў, 30 генеральных дырэктараў і дырэктараў прадпрыемстваў аграрнага сектара (харчовая прамысловасць)[1]. Усе дырэктары прамысловых прадпрыемстваў і ўпраўляючыя будаўнічымі трэстамі мелі вышэйшую адукацыю і з’яўляліся спецыялістамі народнай гаспадаркі[2]. На прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці за 1986–1988 гг. вага “практыкаў”, якія займалі пасады кіраўнікоў і спецыялістаў, паменшылася з 20,8 % да 13,4 % ці больш чым у 1,5 разы, а ўзровень кадраў з вышэйшай адукацыяй павялічыўся з 23,8 % да 31 % або ў 1,3 разы, у тым ліку на пасады кіраўнікоў з 24,3 % да 33 %. Палепшыць становішча ўдалося за кошт маладых спецыялістаў і абучэння без адрыву ад вытворчасці. Пры агульным скарачэнні практыкаў па ўпраўленню да 13,4 %, вага практыкаў, якія займалі пасады спецыялістаў на пэўных прадпрыемствах заставалася даволі высокай – ад 20 да 25,5 %. Асабліва значная вага “практыкаў” займала пасады бухгалтараў[3].

Адначасова на прамысловых прадпрыемствах павышалася колькасць асобаў з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй, якія працавалі на рабочых месцах. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці ў 1972 г. – 2 260 спецыялістаў, у тым ліку 1 990 інжынераў і тэхнікаў[4], у 1979 г. – 6676 чал., у тым ліку 78 інжынераў і 6 400 тэхнікаў[5]. Прычына ў тым, што ў сувязі з прамысловым развіццём, на прадпрыемствах заробак рабочых быў вышэйшы, чым у спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, і ў апошніх не было матэрыяльнай зацікаўленасці ў пераходзе на іншае месца працы. Варта адзначыць, што значная частка з іх мела адукацыю не па профілю сваіх прадпрыемстваў.

Год ад году паляпшаўся якасны склад кіраўнікоў вытворчасці, але не паўсюль надавалася дастаткова ўвагі ўмацаванню участкаў вытворчасці, якія адставалі, кваліфікаванымі і дасведчанымі спецыялістамі, павольна вырашаліся пытанні замены работнікаў, якія не спраўляліся са сваімі абавязкамі, дапускалася прызначэнне на інжынерна-тэхнічныя пасады асоб, якія не мелі спецыяльных ведаў. На прадпрыемствах часта замена работнікаў уяўляла простую механічную перастаноўку кадраў, не давала жаданага выніку. Складанай заставалася сітуацыя з кадрамі сярэдняга звяна.

У сацыяльным абліччы кіраўніцкіх кадраў у 1960–1980-я гг. адзначаецца тэндэнцыя рэгіяналізацыі працэсаў сацыяльнага рэкрутавання адказных работнікаў, а таксама тэндэнцыя да ўзмацнення самадастатковасці мясцовых

---

[1] Номенклатура должностей Витебского ОК КПБ. 1989 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 174. Спр. 62. Арк. 13-20.
[2] Пояснительная записка к статистическим отчётам о составе и сменяемости кадров на 01.07.1988 г. // Там жа. Воп. 173. Спр. 49. Арк. 150-151.
[3] Справка о состоянии работы по подбору и расстановке кадров, исполнительской и трудовой дисциплины, совершенствованию организации труда в объединениях и на предприятиях Витебского облместпрома (1989) // ДАВц. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 189. Арк. 53-54.
[4] Протокол пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 129.
[5] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 11.04.1979 г. // Там жа. Воп. 162. Спр. 12. арк. 14-15.

кадравых рэсурсаў для папаўнення складу кіраўніцкіх супрацоўнікаў і іншых спецыялістаў. Гэта выяўлялася як у цэлым па складзе кіраўнікоў, так і па тэрытарыяльных групах пасад. Калі ў 1940–1950-х гг. працэс узнаўлення кадраў істотна карэктаваўся цэнтрам (рэгуляванне адбору, масавыя перамяшчэнні і мабілізацыя работнікаў і інш.), цяпер працэсы іх станаўлення набылі пэўную аўтаномнасць. Быў запушчаны механізм самаразвіцця, які дзейнічаў незалежна ад волі цэнтра.

Ужо ў 1970-я гг., у адрозненні ад папярэдніх этапаў ў гісторыі СССР, асноўныя кіруючыя кадры сталі рэкрутаваць з гарадскіх, а не сельскіх жыхароў. Адукацыя, а не класавая прыналежнасць, стала адыгрываць вырашальную ролю пры заняцці адказных пасад[1]. Аб чым сведчыць аналіз сацыяльнага складу па Магілёўскай вобласці, калі год ад году павялічвалася колькасць служачых[2] і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй[3]. Таму ў 1980-я гг. менавіта прадстаўнікі інтэлігенцыі, у большасці сваёй тэхнічнай, сталі пераважаць у складзе кіраўніцкіх кадраў дзяржаўных і гаспадарчых структур. Далейшае павялічэнне долі тэхнічнай інтэлігенцыі на наменклатурных пасадах, якое насіла аб'ектыўны і заканамерны характар, прыводзіла да неабходнасці перабудовы самой сістэмы ўзаемаадносін палітычнай эліты і кіраўніцкіх работнікаў усіх узроўняў.

Паляпшэннем падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў, стварэннем іх рэзерву займалася цэнтральнае і мясцовае кіраўніцтва КПСС-КПБ. Для каардынацыі дзейнасці ў эканоміцы рэгіёна, у залежнасці ад узроўню развіцця прамысловасці і значнасці прадпрыемстваў пры абкамах КПБ і аблвыканкамах ствараліся рэгіянальныя кіраўніцкія структуры, напрыклад, у Магілёўскім абкаме КПБ існавала пасада – загадчык сектара хімічнай прамысловасці абкама КПБ[4], пры аблвыканкамах – упраўленні мясцовай прамысловасці[5].

**Падбор кадраў на пасады кіраўнікоў у народнай гаспадарцы БССР.** Павышэнне агульнаадукацыйнага і прафесійнага ўзроўню кіраўніцкіх кадраў народнай гаспадаркі, навукі і культуры па-ранейшаму з'яўлялася актуальным для ўсіх партыйна-савецкіх органаў усходнебеларускіх абласцей БССР. Прадметам асаблівага клопату стаў падбор і выхаванне кадраў сакратароў першасных і цэхавых партыйных арганізацый, партгрупоргаў. На гэта паўплывала тое, што першасным партарганізацыям надавалася права кантролю

---

[1] Федоров А.В. Кадровая политика СССР в период внутри- и внешнеполитического развития в 1970–1980-х гг. С. 12–19; Яго ж. Кадровая политика СССР на завершающем этапе индустриальной модернизации (конец 1950–1980-е гг.). С. 5–11.
[2] У іх лік уваходзілі: кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў, інжынерна-тэхнічныя работнікі, урачы, юрысты, дырэктары школ, настаўнікі, выкладчыкі ВНУ, работнікі культуры, бытавой сферы, кантралёры, бухгалтары і г. д.
[3] Статистические отчеты Могилевского обкома КПБ // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 61. Арк. 1–1адв. ; Спр. 61. Арк. 1–1 адв. ; Спр. 121. Арк. 1–1адв. ; Спр. 201. Арк. 1–2.
[4] Протокол заседания бюро Могилёвского обкома КПБ от 28.10.1975 г. // Там жа. Воп. 155. Спр. 44. Арк. 78.
[5] Напрыклад, 26.01.1940 г. быў створаны аддзел мясцовай прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. Спыніў працу ў 1941 г., аднавіў у студзені 1944 г., 16.07.1953 г. аб'яднаны з аддзелам мясцовай паліўнай прамысловасці і на іх базе створана упраўленне мясцовай і паліўнай прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. Пасля шэрагу аб'яднанняў і рэарганізацый 29.10.1965 г. пераўтворана ва ўпраўленне мясцовай прамысловасці, 12.05.1993 – у Віцебскае вытворчае ўпраўленне мясцовай прамысловасці. Государственный архив Витебской области: путеводитель, 1917–2006. С. 179.

дзейнасці адміністрацыі прадпрыемстваў і ўстаноў. Партыйнае кіраўніцтва лічыла неабходным “падабраць на кіраўніцкія пасады не толькі пісьменных людзей, але і знаходзіць сярод іх бліскучых арганізатараў сацыялістычнай вытворчасці, таленавітых выхавальнікаў працоўных, у гэтым павінны бачыць свой найважнейшы абавязак усе партыйныя органы і арганізацыі”[1].

У структурах рэспубліканскай улады і мясцовых выканкамаў у БССР існавалі ўпраўленні і аддзелы, якія займаліся кантролем і каардынацыяй выканання эканамічных праграм і дырэктыў партыйных і вышэйстаячых органаў улады. Варта адзначыць, што іх уплыў на дзейнасць прамысловых прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання быў зусім нязначным, так як гэтыя прадпрыемствы ім не падпарадкоўваліся, а кіраўнікі прызначаліся на пасады толькі па ўзгадненню з рэгіянальнымі партыйнымі структурамі. Адсюль немагчыма казаць аб непасрэдным уплыве рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады на фарміраванне кіраўніцкага складу работнікаў падобных прадпрыемстваў. Гэта пры тым, што гэтыя прадпрыемствы з’яўляліся градаўтваральнымі і менавіта яны аказвалі асноўны ўплыў на эканоміку ўсходняй частцы БССР.

Рэгіянальным партыйным камітэтам па вертыкалі, разам з абласнымі, гарадскімі і раённымі выканкамамі на сваім узроўні, адводзілася роля падбору кадраў для прамысловасці і абавязковае іх узгадненне з вышэйстаячымі органамі. Напрыклад, у адпаведнасці з наменклатурай пасад па прамыслова-транспартнаму аддзелу Гомельскага абкама (1972) зацвярджаліся і вызваляліся рашэннем: ЦК КПСС па ўзгадненню з АК КПБ – дырэктар “Гомсельмаша”, начальнік аб’яднання нафтаздабыўнай прамысловасці “Беларуснафта”; ЦК КПБ – 31 кіраўнік (з іх толькі 19 па ўзгадненню з АК КПБ); непасрэдна абкамам КПБ – 62 дырэктары і кіраўніка[2].

Непасрэдна на прамысловых прадпрыемствах усталявалася наступная практыка ў падборы і расстаноўцы кадраў. Па рэкамендацыі парткама складалася намэнклатура пасад для ўзгаднення цэхавымі партарганізацыямі і парткомамі заводаў на вылучэнне кандыдатур на кіраўніцкія пасады. На парткамах узгадняліся пасады ад намесніка ці начальніка ўчастка да начальніка аддзела або вытворчасці. Круг пасад работнікаў ад старшага майстра і ніжэй ўзгадняліся з начальнікам цэха, сакратаром партыйнай арганізацыі, старшынёй цэхавага камітэта прафсаюза і сакратаром камсамольскай арганізацыі цэха, а затым адпаведна кіраўніцтвам завода[3]. Такі парадак, у ідэале, даваў магчымасць пазбегнуць суб’ектывізму ў дачыненні да кадраў, забяспечваў планамернае выкарыстанне працаўнікоў завода. Прынцыповае значэнне надавалася прыцягненню да актыўнай дзяржаўнай, грамадскай і гаспадарчай працы жанчын. Аднак колькасць іх на адказных пасадах была нязначнай.

---

[1] Протокол пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 131.

[2] Номенклатура должностей, работники которых утверждаются и освобождаются решением бюро АК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 137. Спр. 10. Арк. 177-183

[3] Протокол № 8 пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 74.

Пры атэстацыі ІТР, па прадстаўленні адміністрацыі і партыйнай арганізацыі цэхаў, рэкамендаваныя кандыдатуры абмяркоўваліся на пасяджэнні атэстацыйнай камісіі і найбольш годныя залічваліся ў рэзерв на замяшчэнне кіраўніцкіх пасад. Так, напрыклад, на Магілёўскім заводзе штучнага валакна ў 1971 г. начальнік механічнага ўчастка быў залічаны ў рэзерв на замяшчэнне пасады галоўнага механіка, начальнік прадзільнага цэха № 1 – начальніка вытворчасці, старшая апаратчыца – начальніка змены (усе члены КПСС). З ліку рэзерву ў 1972 г. былі вылучаны на вышэйстаячыя пасады: старшы інжынер, сакратар цэхавай партыйнай арганізацыі на пасаду начальніка прадзільнага цэха № 3; старшы інжынер, старшыня камсамольскага пражэктара завода – начальнікам цэха; электрык – начальнікам змены. У перамотачным цэху № 2 была вылучана начальнікам змены "круцільшчыца", адзін памочнік майстра на пасаду намесніка начальніка цэха, а другі на начальніка змены[1].

Паслядоўнае правядзенне ў жыццё патрабаванняў КПСС аб працы з кадрамі прадугледжвала няўхільнае выкананне прынцыпаў пераемнасці кіраўніцтва, правільнае выкарыстанне старых, вопытных і маладых работнікаў. Аналіз складу кадраў па ўзросце і стажу паказвае, што гэты прынцып у асноўным выконваўся. Аднак у гаспадарчых органах былі нярэдкімі выпадкі, калі было бачна, што работнік не спраўляецца з ускладзенымі на яго абавязкамі, і замест таго, каб падабраць яму справу па сілах, трымалі на кіраўніцкай пасадзе. У той час, калі маладыя, перспектыўныя работнікі заседжваліся на другарадных пасадах, вылучаліся на пасады задужа павольна.

Не лепшым чынам праводзілася праца з падборам кадраў на пасады намеснікаў кіраўнікоў шэрагу прадпрыемстваў, упраўленняў і арганізацый. Па ўзроўні сваёй падрыхтоўкі толькі некаторыя з іх маглі ўзначаліць калектывы, у якіх працавалі. Па характары працы большасць намеснікаў кіраўнікоў займаліся пытаннямі забеспячэння вытворчасці, пры вырашэнні гэтых складаных пытанняў некаторыя праяўлялі "высокія дзелавыя", але зусім не высокія "маральныя якасці"[2]. Такое адбывалася пры забяспячэнні планавых, асабліва не фондавых паставак. На той час лічылася, што замяніць такіх людзей вельмі няпроста без шкоды для вытворчасці, прынамсі ў першы перыяд.

Рэгіянальныя партыйныя органы ў асноўным паспяхова праводзілі падбор кадраў. Але нярэдка пры вылучэнні работнікаў не прымаліся да ўвагі іх дзелавыя якасці. У выніку ў ролі кіраўнікоў з'яўляліся непадрыхтаваныя, безыніцыятыўныя работнікі ці асобы, якія не карысталіся аўтарытэтам, якія часам скампраметавалі сябе ў мінулым. Ад мясцовых партыйных органаў патрабавалі праяўляць высокую "палітычную пільнасць" пры падборы і прызначэнні работнікаў на адказныя пасады, не сароміцца дбайнай праверкай сігналаў аб нявартых паводзінах асобных кіраўнікоў. Прымаліся строгія меры да тых, хто праяўляў неразборлівасць і бестурботнасць пры вырашэнні кадравых пытанняў, узмацняўся партыйны кантроль за працай усіх кадраў. Так, на пасяджэнні сакратарыята Віцебскага АК КПБ прынялі рашэнне катэгарычна

---

[1] Протокол пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 74-75.
[2] Там жа. Арк. 53-54.

забараніць ГК і РК КПБ рабіць перастаноўку кадраў кіраўнікоў і спецыялістаў без адпаведнай па якасці замены і без узгаднення з абласнымі ведамствамі і арганізацыямі[1].

Сур'ёзнай праблемай заставаўся падбор, расстаноўка і выхаванне кадраў сярэдняга звяна, мела месца іх значная змяняльнасць, што адмоўна адбівалася на выніках практычнай працы. Вядомы шматлікія факты перамяшчэння з адной кіраўніцкай пасады на іншую асоб, якія не здолелі паспяхова выконваць прафесійныя абавязкі і скампраметавалі сябе. Мелі месца недахопы ў расстаноўцы і выкарыстанні спецыялістаў. Некаторыя гаспадарчыя кіраўнікі не стваралі маладым спецыялістам неабходных умоў, мала вылучалі на кіраўніцкія пасады маладых здольных інжынераў, эканамістаў, якія добра праявілі сябе на практычнай працы.

Вядома, названыя недахопы тлумачацца рознымі прычынамі, у тым ліку эканамічнымі. Але тагачасныя кіраўніцкія органы бачылі знікненне адмоўных з'яў толькі тады: "Калі павысіцца персанальная адказнасць сакратароў партыйных камітэтаў, усіх работнікаў партыйнага апарату за падбор кадраў. За несвоечасовае папярэджанне і выкрыццё правалаў на асобных участках працы, няправільныя паводзіны кадраў павінны несці адказнасць адпаведныя работнікі партыйнага апарату. Трэба падняць адказнасць кіраўнікоў савецкіх і гаспадарчых органаў, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў за работу з кадрамі. Прычым адказнасць персанальную. Кіраўнік павінен адказваць не толькі за вытворчасць, але і за падбор кадраў, выхаванне людзей, за ўсе негатыўныя з'явы, якія адбываюцца з кадрамі ў калектыве"[2].

Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва з мэтай паляпшэння падбору і расстаноўкі кадраў з году ў год патрабавала ад гаспадарчых і рэгіянальных партыйных арганізацый практычна адно і тое ж:

– глыбока і ўсебакова вывучаць дзелавыя і палітычныя якасці работнікаў у працэсе іх практычнай дзейнасці;

– дамагчыся, каб усе ўчасткі гаспадарчай і грамадскай працы ўзначальвалі палітычна пісьменныя, ініцыятыўныя і аўтарытэтныя работнікі, здольныя арганізатары і выхавальнікі, якія валодалі сучаснымі метадамі кіравання, пачуццём новага, умелі бачыць перспектыву і знаходзіць найбольш эфектыўныя шляхі вырашэння ўзніклых праблем;

– звярнуць сур'ёзную ўвагу на стварэнне рэзерву кадраў, актыўна выяўляць здольных работнікаў, дапамагаць ім удасканальваць спецыяльныя веды, уменні працаваць з людзьмі, ствараць умовы для павышэння дзелавой кваліфікацыі;

– звярнуць сур'ёзную ўвагу на вылучэнне жанчын на кіраўніцкую працу;

– уважліва разабірацца з кіраўніцкімі кадрамі адсталых участкаў вытворчасці, умацаваць іх умелымі работнікамі, якія валодалі арганізатарскімі

[1] Протокол заседания секретариата Витебского областного комитета КПБ от 16.04.1974 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 130. Спр. 76. Арк. 121-152.
[2] Протокол пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 135.

здольнасцямі і вопытам практычнай дзейнасці, забяспечыўшы пры гэтым правільнае спалучэнне старых, вопытных кадраў і маладых здольных работнікаў;

– не дапускаць неапраўданай змяняльнасці кадраў, рашуча пакончыць з заганнай практыкай вылучэння і перастановак на кіраўніцкія пасады работнікаў, якія правалiліся і скампраметавалі сябе;

– падняць ролю і адказнасць аддзелаў кадраў на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях за правільны падбор і расстаноўку кадраў;

– пастаянна весці працу па далейшым замяшчэнню кіраўнікоў, галоўных спецыялістаў, кадраў сярэдняга звяна прадпрыемстваў, арганізацый спецыялістамі вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі;

– разгарнуць эканамічнае навучанне работнікаў кіравання і спецыялістаў народнай гаспадаркі, больш накіроўваць моладзі на вучобу ў ВНУ і тэхнікумы ў якасці стыпендыятаў прадпрыемстваў;

– прыняць эфектыўныя меры да замацавання маладых спецыялістаў, пастаянна клапаціцца аб стварэнні ім неабходных умоў для працы;

– няўхільна павышаць ролю кіраўнікоў у ідэйна-палітычным і маральным выхаванні работнікаў, у стварэнні на прадпрыемствах і будоўлях здаровай маральна-псіхалагічнай атмасферы, ацэньваць дзейнасць любога кіраўніцкага работніка не толькі па ўдзелу ў барацьбе за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, але і па яго здольнасцях аказваць глыбокае палітычнае і маральнае ўздзеянне на працоўны калектыў;

– павысіць адказнасць у барацьбе з п'янствам, раскрадальнікамі сацыялістычнай уласнасці, дармаедамі, хабарнікамі, парушальнікамі грамадскага парадку.

Выкарыстоўваліся розныя шляхі і метады выканання прапаноў і рэкамендацый, не ўсе яны былі выкананы ў поўным аб'ёме і з запланаваным эфектам. Аднолькавыя і паўторныя прапановы і рэкамендацыі, змест якіх, безумоўна, быў выдатным і бясспрэчным, дазваляюць казаць аб тэндэнцыі стабільнасці праблем у працы з кадрамі на працягу 1970-1980-х гг.

**Удасканаленне кадравага патэнцыялу шляхам стварэння рэзерву кадраў.** Улічваючы тагачасныя патрабаванні па далейшым удасканаленні кіравання галінамі народнай гаспадаркі і іх падраздзяленнямі ствараўся рэзерв кадраў, за кошт якога ішло замяшчэнне вакантных пасад.

Улік рэзерву кадраў вёўся шляхам складання спісаў, у якіх адлюстроўваліся асноўныя звесткі аб работніку. Акрамя спісаў на рэзерв кіраўніцкіх кадраў, патрабавалася складанне назапашвальных анкет, у якіх адлюстроўваліся асноўныя ўліковыя дадзеныя аб работніку і іх змены, рабіліся адзнакі аб даручэннях і ацэнцы іх выканання, а таксама іншыя запісы, аналіз якіх па заканчэнні пэўнага часу даваў магчымасць найбольш поўна і ўсебакова скласці меркаванне аб якасцях работніка, мэтазгоднасці выкарыстання яго ў перспектыве і знаходжанні ў рэзерве.

Выкарыстоўваліся розныя формы і метады вывучэння людзей для адбору іх у рэзерв кіраўніцкіх кадраў і працы з імі. Гэта, перш за ўсё, вывучэнне

анкетных дадзеных, водгукі тых, хто ведаў работніка па яго сумеснай дзейнасці, асабістыя гутаркі, праверка на канкрэтных даручэннях, справаздачы работнікаў, залічаных у рэзерв. Абавязкова ўлічвалася меркаванне АК, ГК, РК КПБ і першасных партыйных арганізацый.

У якасці крыніцы адбору ў рэзерв кіраўніцкіх кадраў разглядаліся штатныя і пазаштатныя работнікі і члены партыйных камітэтаў, работнікі савецкіх і камсамольскіх органаў, партыйны, прафсаюзны і камсамольскі актыў, спецыялісты народнай гаспадаркі, намеснікі і памочнікі кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый і устаноў. Вялікае значэнне надавалася камплектаванню складу пазаштатных фарміраванняў і менавіта іх разглядалі як рэзерв на вылучэнне на больш адказную гаспадарчую кіраўніцкую працу. Напрыклад, у пачатку 1973 г. у Магілёўскіх гаркаме і райкамах КПБ было створана 18 пазаштатных фарміраванняў (аддзелаў, сектараў, камісій, саветаў), у якіх працавалі 155 актывістаў[1].

Састаўным элементам па выяўленню і паляпшэнню выкарыстання рэзерваў вытворчасці з’яўляліся рэкамендацыі і прапановы структур, створаных на грамадскіх пачатках: Гомельскага абласнога савета садзейнічання тэхнічнаму прагрэсу, савета дырэктароў у г. Магілёве і тэхніка-эканамічнага савета ў г. Бабруйску. У склад саветаў уваходзілі дырэктары, галоўныя інжынеры і спецыялісты, партыйныя і прафсаюзныя работнікі, якія мелі высокую кваліфікацыю і вопыт практычнай работы[2].

У склад рэзерва на пасаду кіраўніка ўключалі, як правіла, другую асобу ўстановы (прадпрыемства) – намесніка дырэктара або галоўнага інжынера[3]. На пачатак 1972 г. у рэзерве на вылучэнне на пасады дырэктароў, галоўных інжынераў і галоўных бухгалтараў прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці Магілёўскай вобласці было 8 асоб (на пасады дырэктароў усе члены КПСС), з іх чацвёра працавалі галоўнымі інжынерамі і адзін начальнікам тэхаддзела; на пасаду галоўнага інжынера ў рэзерве былі майстар цэха, выконваючы абавязкі галоўнага інжынера; на галоўнага бухгалтара – бухгалтары. Жанчыны былі ў рэзерве на пасады двух дырэктароў, на пасаду галоўнага інжынера і галоўнага бухгалтара. Кандыдаты на пасады дырэктароў былі ва ўзросце ад 35 да 41 года, галоўнага інжынера ад 23 да 27 гадоў[4].

У рэзерв падбіраліся пераважна асобы, якія працавалі ў тых жа калектывах і ведалі асаблівасці дадзенай вытворчасці, маральна-палітычны стан працоўнага калектыву. Акрамя таго, ГК КПБ ствараўся “абязлічаны” рэзерв кадраў, вылучэнне якіх планавалася не на канкрэтную пасаду, а на групу

[1] О создании резерва кадров и работе с ним в Могилевской городской партийной организации // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 153. Спр. 40.Арк. 53.

[2] Пратакол XIX Гомельскай абласной партыйнай канферэнцыі (1975) // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 2. Арк. 62; Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 159. Спр. 109. Арк. 39; Пратаколы пасяджэнняў бюро Гомельскага АК КПБ (1975 г.) // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 19. Арк. 20.

[3] Записка о работе Поставского райкома партии по подбору, расстановке и воспитанию руководящих кадров, созданию их резерва.1971 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 122. Спр. 39. Арк. 103-110.

[4] Список резерва на выдвижение на должности директоров, главных инжинеров и главных бухгалтеров предприятий местной промышленности Могилевской области. 01.01.1972 г. // ДАМаг. Ф. 2827. Воп. 1. Спр. 525. Арк. 22.

аднатыпных пасад, адпаведных іх спецыяльнасці, як на сваім, так і на роднасных прадпрыемствах горада. Замяшчэнне пасад работнікаў, якія ўваходзілі ў наменклатуру гарадскога і раённых камітэтаў партыі, адбывалася па рэкамендацыі адпаведных партыйных арганізацый і гаспадарчых кіраўнікоў і ў асноўным з ліку работнікаў, уключаных у рэзерв на выдвіжэнне. Так, усяго ў рэзерв Магілёўскага гаркама партыі ў 1972 г. на пасады галоўных спецыялістаў, начальнікаў цэхаў, аддзелаў, змен, майстроў уваходзілі: на прамысловых прадпрыемствах горада – 1 122 чалавекі, у будаўнічых арганізацыях – 351, арганізацыях транспарту – 108 чалавек; 777 з іх мелі вышэйшую спецыяльную адукацыю[1].

Вялікую ўвагу звярталі на павышэнне дзелавой кваліфікацыі і ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню работнікаў, залічаных у рэзерв. Існавалі розныя формы падрыхтоўкі рэзерву і ўдасканалення ведаў працоўных кіраўнікоў. Напрыклад, у Магілёве за 1968–1972 гг. 64 дырэктары, намеснікі дырэктароў і галоўных інжынераў прадпрыемстваў, 674 інжынерна-тэхнічныя работнікі сярэдняга звяна скончылі ўніверсітэт марксізму-ленінізму; у 1971 г. для рэзерву кадраў быў арганізаваны лекторый па аўтаматызаваным сістэмам кіравання вытворчасцю і пытаннях прымянення ў кіраванні эканоміка-матэматычных метадаў; у 1972 г. 82 работнікі з ліку рэзерву займаліся ў гарадскім універсітэце тэхніка-эканамічных ведаў; 99 кіраўніцкіх партыйных, камсамольскіх, савецкіх і гаспадарчых работнікаў з'яўляліся слухачамі школ партыйна-гаспадарчага актыву пры гаркаме і райкамах партыі; у 1971–1973 гг. пры гаркаме КПБ працавалі курсы рэзерву кіраўніцкіх кадраў, на якіх займалася група галоўных спецыялістаў, начальнікаў цэхаў і аддзелаў прамысловых прадпрыемстваў[2]. Прадугледжвалася такая форма павышэння кваліфікацыі рэзерву, як выкананне індывідуальных творчых заданняў, скіраваных на пошукі і рашэння праблемных месцаў на вытворчасці. Выканаўцы індывідуальных заданняў павінны былі весці назіранні, праводзіць даследаванні, вывучаць навінкі літаратуры па зададзенай тэме, затым складалі справаздачу з наступным разглядам і зацвярджэннем яе на тэхнічным савеце заводаў. Пры ўсім фармалізме, які існаваў, гэтая форма дапамагала выявіць асабістыя здольнасці і дзелавыя якасці спецыялістаў.

Найбольш перспектыўныя на выдвіжэнне работнікі далучаліся да грамадска-палітычнай дзейнасці. З ліку рэзерву кадраў на прадпрыемствах прамысловасці Магілёва, будаўніцтва, транспарту і сувязі актыўна працавалі: 91 чалавек – у складзе выбарных партыйных органаў горада, 520 – у выбарных органах першасных партарганізацый, 86 – выбраныя дэпутатамі мясцовых саветаў; 1 318 чалавек з'яўляліся прапагандыстамі сеткі партыйнай, камсамольскай палітасветы, тэхнічнай і эканамічнай вучобы, шмат было выбрана ў камітэты прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый, працавалі ў

---

[1] О создании резерва кадров и работе с ним в Могилевской городской партийной организации // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 153. Спр. 40. Арк. 54.
[2] Там жа. Арк. 55.

розных грамадскіх фарміраваннях[1]; 80 кіраўнікоў і інжынерна-тэхнічных работнікаў з'яўляліся прапагандыстамі, 76 лектарамі, 100 палітінфарматарамі, 86 агітатарамі, звыш 100 членамі метадычных саветаў і кансультантамі даведачна-інфармацыйнага цэнтра. На Магілёўскім заводзе штучнага валакна галоўны інжынер з'яўляўся старшынёй метадычнай рады завадскіх грамадскіх універсітэтаў; намеснік дырэктара – кіраўніком школы маладых камуністаў[2]. Уся праца з кадрамі непасрэдна на прадпрыемствах правяралася тым, якіх вынікаў дамогся калектыў у выкананні дзяржаўнага плана.

Пастаянная і мэтанакіраваная вучоба рэзерву кадраў, практычная грамадская праца спрыяла службоваму росту работнікаў. Так, напрыклад, А. Скаромны, выбіраўся некалькі гадоў сакратаром першаснай партыйнай арганізацыі малочнага завода, а затым быў вылучаны на пасаду дырэктара гэтага прадпрыемства, А. Мардашова, у мінулым сакратар партарганізацыі завода "Сантэхнарыхтовак", затым працавала галоўным інжынерам абутковай фабрыкі; былы сакратар партарганізацыі фабрыкі галаўных убораў Л. Хадановіч узначаліў гэтую фабрыку; пазаштатны інструктар аргаддзелу ГК КПБ Б. Лугін быў вылучаны на пасаду дырэктара транспартнага прадпрыемства[3].

Станоўчай адзнакі заслугоўвала праца па фарміраванні рэзерву кадраў на Магілёўскім заводзе штучнага валакна, камбінаце сінтэтычнага валакна, заводзе "Электрарухавік", будаўнічым трэсце № 17 "Лаўсанбуд", Магілёўскім аблаўтатрэсце, Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце і шэрагу іншых прадпрыемстваў і арганізацый.

Дзякуючы паляпшэнню падбору рэзерву кадраў і працы з ім, у калектывах прадпрыемстваў і арганізацый адбывалася ўмацаванне звяна бліжэйшых намеснікаў кіраўнікоў, а таксама кіраўнікоў сярэдняга звяна за кошт вылучэння маладых, здольных работнікаў і спецыялістаў. Толькі за 1971–1972 гг. на прадпрыемствах прамысловасці, будаўніцтва і транспарту Магілёва на больш высокую працу было вылучана 712 чалавек спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у тым ліку 172 чалавекі з ліку рабочых. З ліку намеснікаў начальнікаў цэхаў і аддзелаў 41 чалавек былі вылучаны на пасады кіраўнікоў самастойных вытворчых калектываў[4].

У 1985 г. у структурах Міністэрства лёгкай прамысловасці і Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР праводзілася праверка працы з кадрамі, якая засведчыла, што 96,8 % інжынерна-тэхнічных пасад займалі спецыялісты (1980 – 94,3 %), 8564 спецыялісты мелі вышэйшую адукацыю (1980 – 6549 чал.). Была створана і дзейнічала са студзеня 1984 г. школа дырэктароў, заняткі ў якой праводзіліся адзін раз у 2–3 месяцы на найлепшых прадпрыемствах галіны. У 1984 г. у Мінлегпраме і Мінмесцпраме БССР з рэзерву кадраў былі

[1] О создании резерва кадров и работе с ним в Могилевской городской партийной организации // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 153. Спр. 40. Арк. 55.
[2] Протокол пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // Там жа. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 76-77.
[3] О создании резерва кадров и работе с ним в Могилевской городской партийной организации // Там жа. Воп. 153. Спр. 40. Арк. 56.
[4] Там жа. Арк. 57.

вылучаны на больш высокія пасады 854 чал., у 1985 г. – 743 чал., пры гэтым з рэзэрву кадраў больш за 50 %[1].

У Міністэрстве лясной прамысловасці БССР за 1984–1985 гг. былі вылучаны з рэзэрву кадраў на больш высокія пасады: міністр, першы намеснік міністра, два намеснікі міністра, начальнік тэхнічнага ўпраўлення, намеснік начальніка вытворча-тэхнічнага ўпраўлення дрэваапрацоўчай і мэблевай прамысловасці, генеральны дырэктар аб’яднання “Рэчыцадрэў”, генеральны дырэктар аб’яднання “Бабруйскдрэў”, галоўны інжынер аб’яднання “Івацэвічыдрэў”, намеснік генеральнага дырэктара аб’яднання “Мінскдрэў”[2].

Міністэрствам і ведамствам БССР, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму 03.05.1989 г. былі накіраваны лісты “Аб распрацоўцы асноўных кірункаў і задач у вобласці кадравай працы на 1990–1995 гг.”, дзе патрабавалася, каб у складзе асоб, якія ўключаны ў рэзерв кіраўніцкіх кадраў, улічвалася колькасць маладых кадраў, жанчын, беспартыйных і асоб розных нацыянальнасцей у залежнасці ад складу насельніцтва[3].

Разам з тым у працы па стварэнні рэзерву кадраў і працы з ім мелі месца недахопы і хібы. Не на ўсіх прадпрыемствах была наладжана сістэмная праца са спецыялістамі, практыка дэталёвага вывучэння “палітычных” і дзелавых якасцяў, вылучаных на кіраўніцкія пасады, кантролю за іх дзейнасцю. У падрыхтоўцы кіраўнікоў вытворчых цэхаў, участкаў і майстроў ва ўсіх формах вучобы недастатковая ўвага надавалася вывучэнню фізіялогіі і псіхафізіялогіі працы, педагогікі, як навукі аб навучанні і выхаванні людзей.

Асобныя кіраўнікі прадпрыемстваў абмяжоўваліся фармальным складаннем спісаў рэзерву кадраў інжынерна-тэхнічных работнікаў і асабліва кадраў сярэдняга звяна. Напрыклад, у рэзерв кадраў на ліфтабудаўнічым заводзе (1974) было ўключана толькі 25 чалавек, з іх палова не мела вышэйшай адукацыі, на пасаду старшых майстроў і майстроў было залічана ўсяго 6 чалавек, або 7,3 % ад агульнай колькасці майстроў на заводзе. На заводах “Чырвоны металіст”, тэхналагічнага абсталявання, камбінаце будматэрыялаў, аўтамабільным заводзе імя С. Кірава і шэрагу іншых прадпрыемстваў Магілёва наогул адсутнічалі спісы рэзерву кадраў, пры гэтым многія інжынерна-тэхнічныя пасады займалі практыкі[4].

Не надавалася належнай увагі пытанням падрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў з рабочых. Шмат на якіх прадпрыемствах зусім не рэкамендавалі рабочых на падрыхтоўчыя аддзяленні вышэйшых навучальных устаноў, таму фарміраванне кантынгенту навучэнцаў завочных і вячэрніх аддзяленняў ВНУ і сярэдніх

---

[1] Справка № 05/199 от 23.12.1985 г. “О работе Минлегпрома БССР и Минместпрома БССР по реализации решений XII Пленума ЦК КПБ «О задачах партийных организаций республики по дальнейшему совершенствованию работы с кадрами в свете требований ЦК КПСС»” // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 27, 28.

[2] Справка № 02/247 от 13.12.1985 г. “О работе с резервом кадров в Минлеспроме БССР”// Там жа. Арк. 32.

[3] Письмо в министерства и ведомства БССР, облисполкомы и Мингорисполком от 3 мая 1989 г. “О разработке основных направлений и задач в области кадровой работы на 1990–1995 годы” // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2222. Арк. 133-134.

[4] О создании резерва кадров и работе с ним в Могилевской городской партийной организации, 29.10.1974 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 153. Спр. 40. Арк. 58.

спецыяльных навучальных установ праводзілася без уліку патрэб прадпрыемстваў у спецыялістах і перспектывы іх развіцця.

Не ў поўным аб'ёме абагульняўся назапашаны ў прамысловасці вопыт атэстацыі кіраўнікоў і інжынерна-тэхнічных работнікаў з мэтай фарміравання рэзерву кадраў. Так, на сакратарыяце Віцебскага АК КПБ (13.07.1987), з аднаго боку, было адзначана, што “кадры – галоўнае звяно ва ўмовах перабудовы формаў і метадаў работы, у сваёй працы з кадрамі мы імкнуліся выпрацаваць сістэму, вызначыць формы вывучэння дзелавых якасцяў, працы з выбарным актывам, кіраўнікамі, працоўнымі калектывамі”, а з другога – рэзерв сфарміравалі фармальна, у ім не мелася патрэбных кандыдатур на замяшчэнне шэрагу кіраўніцкіх пасад. Не накіравалі стыпендыянтаў у ВНУ і тэхнікумы – Орша, Полацк, Сенненскі, Шумілінскі, Чашніцкі, Дубровенскі і іншыя раёны[1].

Ва ўсіх абласцях БССР штогод праводзіліся, згодна зацверджаных планаў, заняткі ў школах савецкага будаўніцтва[2], але праходзілі яны фармальна і нецікава, ператвараючыся ў справаздачы кіраўнікоў і ідэалагічнае інфармаванне аб поспехах сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам БССР названыя недахопы па стварэнні рэзерву кадраў і працы з ім тлумачыліся недастатковым кіраўніцтвам дадзенай працай з боку бюро гаркамаў і райкамаў КПБ, адсутнасцю мэтанакіраванай працы шматлікіх партыйных камітэтаў і бюро, сакратароў партарганізацый прадпрыемстваў прамысловасці.

**Змяняльнасць кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў.** У другой палове 1980-х гг. паспрабавалі палепшыць якасны склад кіраўнікоў рознага ўзроўню шляхам вылучэння на кіраўніцкія пасады новых работнікаў. Але гэты працэс праходзіў вельмі марудна. Так, за перыяд з ліпеня 1984 па ліпень 1985 г. толькі на 1,9 % павялічылася змяняльнасць сярод 205 генеральных дырэктароў, дырэктароў прамысловых прадпрыемстваў і аб'яднанняў (гл. табл. 4).

У 1985 г. з ліку змененых кіраўнікоў прадпрыемстваў 6 асоб (30 %) былі вылучаны на больш адказную працу, 7 асоб (35 %) вызвалілі ў сувязі з выхадам на пенсію або па стане здароўя і толькі аднаго, які “скампраметаваў сябе”, звольнілі за ганебныя паводзіны – дырэктара Абольскага біяхімічнага завода[3]. Праз год сярод 229 кіраўнікоў прамысловасці і будаўніцтва 14 мелі ўзрост старэйшы за 60 год. За перыяд да ліпеня 1987 г. змяняльнасць павялічылася на 7,1 % і складала – 17,9 %: шэсць асобаў (14,6 %) былі вылучаны на больш адказную працу, 34 (15,1 %) былі вызвалены ў сувязі з пераходам на пенсію, па стане здароўя і па іншых прычынах, а дырэктар Гомельскага дзяржаўнага падшыпнікавага завода № 12 быў вызвалены, бо не справіўся з працай[4].

---

[1] Отчёт на секретариате Витебского ОК КПБ 13.07.1987 г. секретаря ОК КПБ Н.Н. Гутникова // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 168. Спр. 90. Арк. 21-27.

[2] Справка организационно-методического отдела Управления делами СМ БССР, 1985 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 42.

[3] Пояснительная записка сектора учёта и переподготовки кадров отдела организационно-партийной работы ЦК КПБ. 12.07.1985 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 982. Арк. 62.

[4] Пояснительная записка отдела организационно-партийной работы ЦК КПБ. 20.07.1987 г. // Там жа. Спр. 406. Арк. 2.

Табліца 4 – Змяняльнасць кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і яб’яднанняў БССР у 1984–1987 гг.[1]

| | 01.07.1984 | | 01.07.1985 | | 01.07.1986 | | 01.07.1987 | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % |
| Усяго кіраўніцкіх пасад / замешчаны работнікамі | 204 / 203 | 99,5 | 205 / 205 | 100 | 168 / 167 | 99,4 | 229 / 225 | 98,3 |
| Змянілася кіраўнікоў па прычынах: | 16 | 7,9 | 20 | 9,8 | 18 | 10,8 | 41 | 17,9 |
| вылучаныя на больш значную пасаду | 3 | 18,7 | 6 | 30 | 3 | 16,7 | 6 | 14,6 |
| накіраваныя на вучобу | 1 | 6,3 | – | – | 1 | 5,6 | – | – |
| накіраваныя на аналагічную працу | – | – | 1 | 5,0 | 1 | 5,6 | – | – |
| вызваленыя як скампраметаваўшыя сябе або не справіліся з даручанай працай | – | – | 1 | 5,0 | 1 | 5,6 | 1 | 2,4 |
| вызваленыя па сямейных абставінах, у сувязі з хваробай, пераходам на пенсію | 4 | 25,0 | 7 | 35,0 | 4 | 22,2 | 15 | 36,6 |
| вызваленыя па іншых прычынах | 8 | 50,0 | 5 | 25,0 | 8 | 44,4 | 19 | 46,4 |

Найбольшая змяняльнасць у 1986–1987 гг. была сярод генеральных дырэктароў і дырэктароў прадпрыемстваў машынабудавання для лёгкай і харчовай прамысловасці і бытавога абсталявання, упраўляючых трэстамі, генеральных дырэктараў і дырэктараў прадпрыемстваў станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці і складала адпаведна 37,5 %, 20,9 % і 17,2 %. У якасным складзе начальнікаў упраўленняў буравых работ, дырэктараў прадпрыемстваў хімічнага і нафтавага машынабудавання, упраўляючых раённымі ўпраўленнямі энергетыкі і электрыфікацыі, дырэктароў прадпрыемстваў цэлюлозна-папяровай прамысловасці істотных змен не адбылося, сярод іх змяняльнасці кадраў наогул не назіралася[2]. Такое становішча не садзейнічала якаснаму паляпшэнню кадравага патэнцыяла рэспублікі.

Спробы ў 1970–1980-я гг. выправіць становішча ў эканоміцы шляхам змяняльнасці кадраў і ўкаранення розных метадаў павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу ва ўмовах існавання савецкай эканамічнай сістэмы, не прынесла чаканага выніку. На адказных пасадах як у сферы

[1] Справка о составе и сменяемости руководителей промышленных предприятий и объединений БССР. 1984–1987 гг. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 156. Спр. 982. Арк. 1-2 (1984–1985); Спр. 406. Арк. 4-5 (1986–1987).

[2] Пояснительная записка отдела организационно-партийной работы ЦК КПБ. 20.07.1987 г. // Там жа. Спр. 406. Арк. 3.

дзяржаўнага кіравання, так і ў прамысловасці было мала жанчын, адчувалася праблема сталага ўзросту кіраўнікоў. Выразна прасочвалася нізкая змяняльнасць кіраўніцкіх кадраў, ды і то ў асноўным па гарызанталі, што істотна перашкаджала абнаўленню кадравага патэнцыялу і развіццю эканомікі БССР.

**Правядзенне атэстацыі і стажыровак кіраўнікоў і спецыялістаў**. У адпаведнасці з пастановаю СМ СССР ад 26.07.1973 г. і СМ БССР ад 10.10.1980 г. праводзілася перыядычная атэстацыя кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў згодна пераліку пасадаў для атэстацыі, які быў зацверджаны пастановаю СМ БССР ад 18.03.1980 г. Загадамі міністэрстваў і ведамстваў ствараліся і дзейнічалі атэстацыйныя камісіі[1]. Напрыклад, у 1984 г. была праведзена атэстацыя кіраўнікоў і спецыялістаў у шэрагу міністэрстваў і ведамстваў АПК (у яго склад уваходзілі, у тым ліку і прадпрыемствы харчовай, мяса-малочнай прамысловасці). Усяго атэставалі – 93 797 чал. Прайшлі атэстацыю 92,6 %, з іх прызналі адпаведнымі занятай пасадзе 98,03 %, вылучылі на кіраўніцкую або больш аплачаную пасаду 2,8 %, вызвалілі ад занятай пасады або перавялі на менш аплочаную пасаду 0,53 % ад агульнай колькасці тых, хто з'явіўся на атэстацыю[2].

У БССР з 01.01.1983 г. па 31.12.1985 г. было атэставана 248,6 тыс. кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў (гл. табл. 5) або 84,3 % ад агульнай колькасці працаўнікоў, якія павінны былі прайсці атэстацыю (не ўвайшлі тыя, хто адпрацавалі на сваёй пасадзе менш за год, маладыя спецыялісты, цяжарныя жанчыны і жанчыны, якія мелі дзяцей ва ўзросце да года). Вышэй, чым у цэлым па БССР, удзельная вага работнікаў, якія не прайшлі атэстацыю была на прамысловых прадпрыемствах (18,2 %) і падрадных будаўнічых арганізацыях (17,0 %). Прызналі адпаведнымі занятай пасадзе 239,5 тыс. чал. або 96,3 %, 3,1 % (7,7 тыс.) адпаведнымі пры ўмове паляпшэння працы, 0,6 % (1,4 тыс.) не адпаведнымі занятай пасадзе, з іх 323 чал. або 0,5 % кіраўнікоў і 1 050 (0,6 %) спецыялістаў. Па выніках атэстацыі 11,8 тыс. чалавек атрымалі больш адказныя пасады або былі заахвочаны, у тым ліку 2,8 тыс. кіраўнікоў і 9 тыс. спецыялістаў. Вызвалілі ад занятай пасады або перавялі на іншую працу – 1,4 тыс., з іх 0,3 тыс. кіраўнікоў і 1,1 тыс. спецыялістаў[3].

ЦК КПСС, Прэзідыум ВС СССР, СМ СССР, УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ 05.03.1987 г. прынялі пастанову "Аб увядзенні атэстацыі адказных работнікаў савецкіх і грамадскіх арганізацый". Адпаведна ЦК КПБ, Прэзідыум ВС БССР, СМ БССР, Беларуская рэспубліканская рада прафесійных саюзаў, ЦК ЛКСМБ 15.04.1987 г. зацвердзілі меры па выкананні агульнасаюзнай пастановы. Згодна ёй, на працягу 2 месяцаў пасля атэстацыі, органы кіравання маглі на падставе рэкамендацый атэстацыйнай камісіі прыняць рашэнні аб заахвочванні за

[1] Записка Управления делами СМ БССР № 13/147 от 24.04.1985 г. "О совершенствовании работы с кадрами". Январь 1986 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 14-15.
[2] Информация о аттестации и стажировке в министерствах и ведомствах АПК. 15.01.1985 г. // Там жа. Арк. 17.
[3] Письмо Центрального статистического управления БССР в СМ БССР № 01-11/44 от 15.05.1986 г. "О результатах аттестации работников, занятых в отраслях народного хозяйства БССР" // Там жа. Спр. 294. Арк. 13-16.

дасягнутыя поспехі, змене службовых акладаў, пераводзе на іншую больш адказную пасаду або вызваленне за недахопы ў працы[1].

Табліца 5 – Звесткі аб атэстацыі кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў[2]

| | Колькасць работнікаў, якія прайшлі атэстацыю (тыс. чал) | | | Удзельная вага прайшоўшых атэстацыю ў агульнай колькасці работнікаў, якія павінны былі прайсці атэстацыю (%) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | У тым ліку | | | | |
| | | кіраўнікоў | спецыялістаў | Усяго | кіраўнікоў | спецыялістаў |
| Усяго, у тым ліку: | 248,6 | 66,3 | 182,3 | 84,3 | 84,9 | 84,0 |
| Прамысловыя прадпрыемствы | 114,6 | 32,3 | 82,3 | 81,8 | 82,1 | 81,6 |
| Прадпрыемствы транспарту | 20,3 | 3,3 | 17,0 | 88,9 | 87,3 | 89,2 |
| Падрадныя будаўнічыя арганізацыі | 35,2 | 8,0 | 27,2 | 83,0 | 78,6 | 84,3 |
| Прадпрыемствы і арганізацыі дзяржаўнага гандлю | 13,0 | 7,7 | 5,3 | 84,5 | 90,0 | 77,1 |
| Арганізацыі мат.-тэхн. забеспячэння | 4,8 | 0,8 | 4,0 | 85,2 | 84,6 | 85,3 |
| Прадпрыемствы і арганізацыі ЖКГ і бытавога абслугоўвання | 9,4 | 2,6 | 6,8 | 93,2 | 93,7 | 93,0 |
| Праектныя, праектна-вышуковыя, канструктарскія арганізацыі | 25,6 | 4,9 | 20,7 | 86,1 | 90,1 | 85,2 |

У прамысловасці БССР таксама праводзілася атэстацыя працоўных месцаў і вытворчасці ў адпаведнасці з “Галіновымі метадычнымі ўказаннямі па planаванні, атэстацыі і рацыяналізацыі працоўных месцаў на прадпрыемствах”. Так, напрыклад, на Аршанскай доследна-эксперыментальнай швейнай фабрыцы (1985) з 767 не атэставалі 33 працоўныя месцы, якія не адпавядалі

[1] Постановление ЦК КПБ, Президиум ВС БССР, СМ БССР, БРСПС, ЦК ЛКСМБ № 147 от 15.04.1987 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 270-273.

[2] Письмо Центрального статистического управления БССР в СМ БССР № 01-11/44 от 15.05.1986 г. “О результатах аттестации работников, занятых в отраслях народного хозяйства БССР” // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 294. Арк. 14.

патрабаванням, на малочным камбінаце з 195 атэставалі толькі 182 працоўныя месцы[1]. На Аршанскім інструментальным заводзе (1986) у выніку атэстацыі ліквідавалі 86 працоўных месцаў, выведзена з эксплуатацыі 109 адзінак састарэлага абсталявання[2].

У мэтах выканання пастановы сакратарыята ЦК КПБ ад 18.07.1985 г. на прамысловых прадпрыемствах у жніўні 1985 – пачатку 1986 г. праводзілася атэстацыя арганізацыйна-тэхнічнага ўзроўню вытворчасці на прамысловых прадпрыемствах гарадоў (раёнаў). Яна праводзілася згодна распрацаваных метадычных указанняў (але не на ўсе віды абсталявання), дзе ацэньваліся ўзроўні якасці абсталявання і прадукцыі, тэхналогіі і арганізацыі вытворчасці. Трэба адзначыць, што не па ўсіх паказчыках і відах вытворчасці былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па правядзенню атэстацыі, таму не ўсе прадпрыемствы былі атэставаныя, на некаторых толькі асобныя вытворчасці.

У Магілёўскай вобласці да прадпрыемстваў вышэйшай катэгорыі аднеслі Магілёўскі металургічны завод імя А. Мяснікава і Асіповіцкі кардонна-рубероідавы завод, да першай катэгорыі 66 прадпрыемстваў (у тым ліку 6 саюзнага падпарадкавання), Магілёўскія мясакамбінат і піўзавод атэставалі на першую катэгорыю, але асобныя вытворчасці на вышэйшую. На некаторых прадпрыемствах, што атэставалі на першую катэгорыю, па шэрагу паказчыкаў атэставалі на другую (па ўзроўню механізацыі, вазе занятых ручной працай, вытворчасці працы). Атэставалі па асобных паказчыках “Бабруйскшыну”, “Беларусьгуматэхніку”. Магілёўскія заводы “Зеніт”, гарбарны, тэхналагічных металаканструкцый былі прызнаны не адпаведнымі тагачасным патрабаванням[3]. Па выніках аналізу матэрыялаў атэстацыі, праведзенай у 1986 г. у г. Орша Віцебскай вобласці арганізацыйна-тэхнічны ўзровень Аршанскага інструментальнага завода характарызаваўся наступнымі паказчыкамі: па якасці прадукцыі адпавядаў вышэйшай катэгорыі, тэхналогіі вытворчасці і арганізацыйна-тэхнічнага ўзроўню адпавядаў першай катэгорыі[4].

Для кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў, якія былі толькі прызначаны на пасады, арганізоўваліся стажыроўкі. Міністэрствы і ведамствы БССР вызначалі пералікі найлепшых прадпрыемстваў і арганізацый для стажыроўкі кадраў. Да такіх прадпрыемстваў Міністэрства дарожнага будаўніцтва БССР, напрыклад, адносіліся: дарожна-будаўнічы трэст № 1 г. Віцебска, дарожна-будаўнічы трэст № 6 г. Гродна і Гродзенскі аблдарбуд; Міністэрства аўтамібільнага транспарту БССР: аўтапарк № 1 Мінскага гарадскога ўпраўлення аўтамабільнага транспарту, аўтакамбінаты № 3 і 6 Мінскага

---

[1] Протокол заседания постоянной комиссии по промышленноети Оршанского городского Совета народных депутатов от 16 мая 1985 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 961. Арк. 1-3.

[2] Справка о проведенной работе по ускорению внедрения научно-технического прогресса на Оршанском инструментальном заводе (1986) // Там жа. Спр. 1050. Арк. 18.

[3] Информации РК и ГК КПБ в Могилёвский АК КПБ о проведении аттестации организационно-технического уровня производства на промышленных предприятиях города (района) // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 181. Спр. 115. Арк. 5-8, 12, 13-17, 75-78, 83-86, 120-122, 125-126.

[4] Справка о проведенной работе по ускорению внедрения научно-технического прогресса на Оршанском инструментальном заводе (1986) // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1050. Арк. 17.

гарадскога ўпраўлення грузавога аўтатранспарту[1]. У г. Гомелі базавымі прадпрыемствамі, на якіх сістэматычна праводзілася вучоба кіраўніцкіх кадраў былі: швейная фабрыка "Камінтэрн", заводы "Гомсельмаш" і вымяральных прыбораў, Гомельскае вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне, станкабудаўнічы завод імя Кірава, завод "Гідрапрывад", завод сантэхнічнага абсталявання[2].

Варта адзначыць, што часта стажыроўка пераўтваралася ў фармальнасць. Спецыялісты (асабліва кіраўнікі) з'яўляліся толькі ў пачатку стажыроўкі, каб скласці і зацвердзіць план яе праходжання, і напрыканцы, каб забраць станоўчы водгук і пасведчанне.

Напрыканцы 1980-х гг. рэгіянальныя органы выканаўчай улады БССР распрацоўвалі розныя шляхі і метады па ўдасканаленні працы з кадрамі[3]. Прапаноўвалася стварыць на прадпрыемствах, у аб'яднаннях і ўстановах спецыяльныя сацыялагічныя службы. Праверка дзелавых і маральных якасцяў прэтэндэнтаў на пасады павінна была рэалізоўвацца групамі сацыёлагаў шляхам вывучэння адказаў прэтэндэнтаў на прапанаваныя тэсты. Рэкамендацыі сацыёлагаў павінны быць адной з асноў для прыняцця станоўчага або адмоўнага рашэнняў.

Асноўнымі метадамі падбору кадраў павінны былі стаць: галоснасць аб вакансіях, конкурснасць, выбарнасць і магчымасць самавылучэння. Выбранне кіраўнікоў на конкурснай аснове дазваляла забяспечыць паляпшэнне якаснага складу кіраўніцкіх кадраў і ўзмацніць іх адказнасць за вынікі дзейнасці. Для замяшчэння кіраўніцкіх пасад на кожную з іх рыхтавалі не менш за 2 кандыдатуры. Але гэты метад не знайшоў шырокага прымянення ў прамысловасці.

З залічанымі ў рэзерв асобамі планавалі праводзіць працу па выпрацоўцы ў іх арганізатарскіх якасцяў і далучэння да новай пасады. Складалі індывідуальныя планы падрыхтоўкі, дзе прадугледжваліся тэарэтычнае і практычнае вырашэнне пытанняў, якія тычыліся новай пасады; прахаджэнне курсавой падрыхтоўцы, стажыроўкі і абмен вопытам у іншай установе або прадпрыемстве. Імкнуліся да таго, каб кіраўнікі штогод рабілі справаздачу аб сваёй працы на канферэнцыях і сходах працоўных калектываў.

**Замежныя спецыялісты на прадпрыемствах усходняга рэгіёну БССР.** На працягу 1970-1980-х гг. на прамысловых прадпрыемствах зноў рэзка павялічылася колькасць замежных спецыялістаў. У адпаведнасці з падпісанымі кантрактамі на шэрагу прадпрыемстваў БССР шэфмантажныя[4] і пусканаладачныя работы ажыццяўлялі замежныя спецыялісты з ГДР, ФРГ, Англіі, Галандыі, Японіі, Італіі, Югаславіі і іншых краін. Згодна кантрактаў з замежнымі фірмамі агульны кошт работ па будаўніцтве і рэканструкцыі

[1] Письмо Управления делами СМ БССР № 04/31 от 14.03.1986 г. в ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 48.
[2] Протокол заседания III пленума Гомельского АК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 142. Спр. 8. Арк. 98.
[3] Письмо Гомельского облисполкома в СМ БССР от 24.05.1989 с предложениями по совершенствованию работы с кадрами // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2222. Арк. 97-100.
[4] Шэфмантажныя работы – выкананне работ па мантажы, падключэнню і наладцы абсталявання персаналам заказчыка пад кіраўніцтвам персаналу пастаўшчыка.

вытворчасцей хімічнай, шыннай і тэкстыльнай прамысловасці толькі для Магілёўскай вобласці складаў каля 1 млрд. заходнегерманскіх марак[1].

На Магілёўскім ВА "Хімвалакно" і ВА "Бабруйскшына" ў мантажы і пуску асобных вытворчасцей, прымалі ўдзел прадстаўнікі фірмаў ФРГ "Хэхст", "Круп-Коперс", "Фр. Удэ" і "Бюлер-Міаг", японскай "Міцуі-Торэ", англійскай "Сайман-Карлз", італьянскіх "Фата" і "Пірэлі". Мантаж і наладку імпартнага абсталявання на КШТ рабілі спецыялісты галандскіх фірмаў "Шторк" і "Сайтэкс", японскай "Вакаяма-Тэко", заходнегерманскіх "Хэхст" і "Унан Матэкс". Так, на шэфмантажных работах штапельнай вытворчасці бесперапынным спосабам Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна імя Леніна з чэрвеня 1972 г. знаходзілася 20 спецыялістаў ГДР фірмы "Інвест-Экспарт", з іх 8 з жонкамі і дзецьмі. На заводзе "Электрарухавік" у мантажы аўтаматычнай лініі прымалі ўдзел 4 спецыялісты з ГДР[2]; у 1981–1982 гг. на ВА "Хімвалакно" з дапамогай замежных фірмаў ажыццяўляліся шэфмантажныя і пуска-наладачныя працы на трох вытворчасцях: атрыманне дэметылтэрэфталату-4 (фірма "Круп-Коперс", ФРГ), поліэтылентэрэфталату (фірмы "Фр. Удэ" і "Хэхст", ФРГ), поліэфірных тэкстыльных нітак (фірма "Міцуі-Торэ", Японія).

У 1975–1980 гг. у Магілёўскай вобласці працавала звыш 700 замежных спецыялістаў з 26 фірмаў 10 капіталістычных краін тэрмінам ад некалькіх дзён да 2–3 гадоў. У 1979 г. знешнегандлёвае аб'яднанне (ЗГА) "Тэхмашімпарт" падпісала кантракт з японскімі фірмамі "Макаява", "Міцубісі" і "Тае Рабер" аб будаўніцтве ў г. Бабруйску завода звышбуйнагабарытных шын. Пастаўка абсталявання рабілася ў другім паўгоддзі 1981 г., мантаж ў 1982 г. Штогод колькасць шэфмантажнікаў з ФРГ і Японіі склала ў сярэднім 120 чалавек[3].

Агульная колькасць прадстаўнікоў фірмаў, якія знаходзіліся на шэфмантажы, у цэлым адпавядала аб'ёмам выкананых імі па кантрактах работ. Часам колькасць замежных спецыялістаў перавышала планавае з-за павялічэння тэрмінаў мантажу і пуску, наяўнасці асобных непаладак як з боку субпадрадных арганізацый СССР і БССР, так і пастаўшчыкоў.

Замежныя спецыялісты, у сваёй большасці, валодалі дастатковай кваліфікацыяй і ведамі па яго ўсталёўцы і наладцы, але і былі асобы з нізкім узроўнем прафесійнай падрыхтоўкі. Падчас правядзення работ былі выяўлены і задакументаваны факты парушэнняў тэхнічных умоў і якасці ўстаноўкі імпартнага абсталявання з боку шэфмантажнікаў. На падставе прадстаўленых кіраўніцтву замежных фірмаў рэкламацый былі прад'яўлены патрабаванні аб кампенсацыі дадатковых выдаткаў, звязаных з выпраўленнем допушчанага браку. Толькі за памылкі пры мантажы абсталявання на вытворчасцях "Дэметылтэрэфталата-4" і "Штапель-3" (ВА "Хімвалакно") фірмы "Круп" і "Фр. Удэ" выдаткавалі 300 тыс. заходнегерманскіх марак. Прычынай названых

---

[1] 1 долар ЗША – 2 маркі ФРГ (1978 г.), 1,82 маркі (1980 г.), 2,55 маркі (1983 г.); у сярэдзіне 1980-х гг. адзін савецкі рубель – тры маркі ФРГ, курс 1986 г.: 100 марак ФРГ – 33,92 руб.

[2] Записка Управления КГБ по Могилёвской области секретарю Могилёвского областного комитета КПБ от 02.08.1973 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 151. Спр. 58. Арк. 20.

[3] Сообщение Управления КГБ по Могилёвской области от 17.12.1980 г. "Об эффективности использования иноспециалистов на промышленных объектах области" // Там жа. Воп. 165. Спр. 73. Арк. 34, 44.

недахопаў нароўні са слабай кваліфікацыяй замежных спецыялістаў з'яўляліся недакладнасці ў праектнай дакументацыі[1].

На прадпрыемствы БССР у значных памерах паступала камплектнае імпартнае абсталяванне[2]. Упраўленнем КДБ па Магілёўскай вобласці было ўстаноўлена, што з боку заходніх фірмаў "Круп-Коперс", "Хэхст-Удэ", "Бюлер-Міаг", "Шторк" і іншых мелі месца выпадкі паставак на ВА "Хімвалакно", "Бабруйсшына" і КШТ дэфектнага і маральна састарэлага імпартнага абсталявання і тэхналогій. Эксплуатацыя і ўжыванне іх была эканамічна не выгадная, прыводзіла да забруджвання навакольнага асяроддзя. Часам адсутнічалі рабочыя чарцяжы і схемы асобных вузлоў і апаратаў. Для ліквідацыі дэфектаў заходнія фірмы дадаткова паставілі за свой кошт імпартнае абсталяванне і запчасткі на суму амаль 2,5 млн марак ФРГ[3].

У пэўных выпадках адбывалася зацягванне тэрмінаў здачы ў эксплуатацыю вытворчых магутнасцей. Замежныя спецыялісты абгрунтоўвалі гэта неабходнасцю замены дэфектных вузлоў і пастаўкі запчастак, якія выйшлі са строю падчас мантажу, правядзеннем дадатковых выпрабаванняў абсталявання. Прычым гэта супадала па часе з перыядамі ўскладнення міжнароднай абстаноўкі. Так, для асвятлення пульта аўтаматызаванага гумазмешвання, электронныя блокі пастаўляліся кансорцыуму "Дэкорфа" амерыканскай фірмай "Дыжыталь". Мантаж не пачынаўся ў сувязі з тым, што амерыканцы не дазволілі прадстаўнікам "Дэкорфы" ўсталяваць камп'ютар, матывуючы забарону падзеямі ў Афганістане. У той жа час з савецкага боку парушаліся тэрміны гатоўнасці будаўнічых пляцовак на 8–10 месяцаў[4]. Гэта давала падставу кіраўніцтву замежных фірмаў таксама затрымліваць мантаж, здымаць гарантыйныя абавязацельствы.

Яшчэ адна прычына затрымак – несвоечасовае прадастаўленне неабходнай колькасці айчынных спецыялістаў у распараджэнне прадстаўнікоў фірмаў, якія кіравалі мантажом. У выніку будаўніцтва аб'ектаў па вытворчасці поліэфірных тэхнічных нітак на імпартным абсталяванні ў ВА "Хімвалакно" ажыццяўлялася вельмі нізкімі тэмпамі. Будоўля не была ўкамплектавана неабходнымі працоўнымі і мантажна-тэхнічнымі рэсурсамі. У студзені 1985 г. на аб'ектах працавала 220 чалавек пры патрэбнасці 1 200–1 300. Для выпраўлення становішча з працоўнымі кадрамі МУС СССР да 01.06.1985 г. на будаўніцтва накіравала 400 чалавек з ліку ўмоўна асуджаных асоб, а затым дадаткова вылучыла яшчэ 600 умоўна асуджаных[5].

Пад час знаходжання ў БССР асобныя замежныя спецыялісты ўсхвалялі лад жыцця за мяжой, уцягвалі пэўных савецкіх грамадзян у валютныя і

[1] Сообщение Управления КГБ по Могилёвской области от 17.12.1980 г. "Об эффективности использования иноспециалистов на промышленных объектах области" // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 73. Арк. 35.
[2] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 416; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 527.
[3] Сообщение Управления КГБ по Могилёвской области от 17.07.1980 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 73. Арк. 24-25.
[4] Сообщение Управления КГБ по Могилёвской области от 17.12.1980 г. "Об эффективности использования иноспециалистов на промышленных объектах области" // Там жа. Арк. 37.
[5] Выписка из протокола заседания комиссии президиума СМ СССР по внешнеэкономическим вопросам от 15.02.1985 г. // Там жа. Воп. 178. Спр. 81. Арк. 2, 4.

спекулятыўныя здзелкі, былі выпадкі распаўсюджвання парнаграфічнай і рэлігійнай літаратуры сярод моладзі. Паводле інфармацыі КДБ: “Большую частку вольнага ад працы часу спецыялісты ГДР праводзяць у рэстаранах, дзе захапляюцца спіртнымі напоямі, а таксама жанчынамі лёгкіх паводзінаў”[1]. Некаторыя спрабавалі збіраць інфармацыю разведвальнага характару: заходнегерманскія шэфмантажнікі спрабавалі высветліць прызначэнне і характар выпускаемай прадукцыі асобарэжымнага завода “Зеніт” у Магілёве. Бразільскія спецыялісты спрабавалі атрымаць звесткі аб колькасці і магутнасцях гідролізных заводаў, размяшчэнне іх на тэрыторыі СССР, тэхналогію атрымання спірту з драўніны. Югаславы праяўлялі павышаную цікавасць да методыкі разліку радыяльных шын, рэцэптуры гум, распрацаванай ў СССР і г. д. Адзначаліся факты засылання ў кантэйнерах з імпартным абсталяваннем ідэалагічна шкоднай літаратуры, правозу кантрабандных тавараў. За варожыя і правакацыйныя дзеянні, хуліганскія учынкі былі датэрмінова адкамандзіравалі з СССР 11 замежных спецыялістаў, якія працавалі ў Магілёўскай вобласці[2].

З іншага боку ад прадстаўнікоў фірмаў з ФРГ і Галандыі была атрымана каштоўная навукова-тэхнічная інфармацыя: інструкцыі па вытворчасці і эксплуатацыі прамысловых кандыцыянераў, распрацаваныя фірмай “Кранц”, па хімічным складзе зварачных стрыжняў для зваркі экструдзерных шнэкаў, па абслугоўванню абсталявання на фірме “Хэхст”; рабочыя чарцяжы гумазмяшальнікаў для струмянёвай лініі фірмы “Бюлер-Міаг”, аўтаклава і выпускной фільеры; схемы высокапрадукцыйнай машыны для нанясення фарбавальнікаў на тканіну метадам плоскага друку галандскай фірмы “Шторк”; тэхнічныя рэкамендацыі фірмы “Круп” па праблемах павелічэння даўгавечнасці і трываласці шын; разгорнутыя тэхналагічныя схемы вытворчасці бутандыёла з расшыфроўкай скарачэнняў па КІПіА; рэцэптура некаторых прадуктаў, якія выкарыстоўваліся пры вытворчасці магнітафонных стужак, тонкіх плёнак і сінтэтычных нітак; матэрыялы сімпозіума па зварцы ў Манхайме (ФРГ); вынікі выпрабаванняў гумазмяшальнікаў, праведзеных кансорцыумам “Дэкорфа”; дакументацыя па прыборах сродкаў аўтаматыкі ў хімічнай прамысловасці амерыканскай фірмы “Фоксбара” і іншае[3]. Па заключэнні аўтарытэтных спецыялістаў, атрыманая інфармацыя ўяўляла цікавасць не толькі для прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці, але і для савецкай прамысловасці ў цэлым. Здабытыя матэрыялы былі перададзеныя для рэалізацыі на прадпрыемствах СССР і БССР.

Рэспубліканскія і рэгіянальныя ўлады, адміністрацыі прадпрыемстваў для замежных спецыялістаў імкнуліся стварыць належныя культурна-побытавыя ўмовы, арганізоўваліся паездкі ў Маскву, Ленінград, Мінск, Кіеў, наведванне святочных дэманстрацый, школ, дзіцячых устаноў, найлепшых калгасаў. У

---

[1] Записка Управления КГБ по Могилёвской области секретарю Могилёвского областного комитета КПБ от 02.08.1973 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 151. Спр. 58. Арк. 22.

[2] Сообщение Управления КГБ по Могилёвской области от 17.12.1980 г. “Об эффективности использования иноспециалистов на промышленных объектах области” // Там жа. Воп. 165. Спр. 73. Арк. 39, 43.

[3] Там жа. Арк. 42–43; Сообщение Управления КГБ по Могилёвской области от 17.07.1980 г. // Там жа. Арк. 25–26.

Магілёве для замежнікаў у цэнтры горада была пабудавана гасцініца з басейнам. У той жа час былі праблемы з забеспячэннем транспартам, прадуктамі харчавання.

Выказванні нямецкіх спецыялістаў з ГДР, зафіксаваныя органамі КДБ, дазваляюць нам пазнаёміцца з тым, як яны ўспрымалі савецкую рэчаіснасць. Непрыемнае ўражанне на замежнікаў зрабілі бруд і захламленасць працоўных пляцовак, месцаў захоўвання абсталявання, шматлікія спазненні беларускіх працаўнікоў на працу, працяглыя перакуры. Тыя, хто працаваў на "Электрарухавіку", зрабілі выснову, што "падрыхтоўка савецкіх спецыялістаў не адпавядае патрабаванням, умовы працы дрэнныя". Адзначаліся частыя выпадкі крадзяжоў мясцовымі работнікамі ў замежных спецыялістаў некаторых дэталей кантрольна-вымяральных прыбораў, інструменту, насільных рэчаў, нават канцылярскіх прыналежнасцей. Да таго ж: "ва ўсіх прадуктовых крамах, нават агародніннных, уладкована сігналізацыя", "у крамах самаабслугоўвання падвойны кантроль – у касы і на выхадзе, гэта ж абраза, няма даверу да людзей" – адсюль высновы: "значыцца ў гэтым ёсць неабходнасць" і "Магілёў – сталіца крадзяжоў"[1].

Параўноўвалі ўмовы жыцця савецкага Магілёва і гарадоў усходняй Германіі, дзе таксама будаваўся сацыялістычны лад: "Умовы жыцця цяжкія. Купіць няма чаго, нават зараз улетку мала гародніны і садавіны", "Харчовыя крамы выглядаюць найгоршым чынам, ёсць толькі асобныя прадукты: як хлеб, тлушч, маргарын, гарэлка і чыста рускай нацыянальнай вытворчасці – крупы, кашы. Такія прадукты, як каўбаса, яйкі, масла, гародніна, узвары бываюць вельмі рэдка і ў такія дні дзяжурыць міліцыя. У прамтаварных крамах лепш, але на ўзроўні, як у нас [у ГДР] у 1945 г. Ва ўсякім разе гэтай краінай я расчараваны". Уражваў недастаткова высокі ўзровень культуры савецкага гандлю: "За ўвесь час нашага знаходжання ў Магілёве, ніводная прадаўшчыца не звярнулася да нас са словамі "дзякуй", "калі ласка". У крамах няма абгорткавай паперы, газеты выкарыстоўваюць для пакавання тавараў"[2]. Безумоўна, у выказваннях адчувалася пэўная тэндэнцыйнасць. Але сапраўды ў савецкі час была нізкая якасць тавараў, у магазінах адсутнічалі некаторыя прадукты.

Стварэнне ва ўсходніх рэгіёнах БССР буйнога прамысловага комплексу адбывалася з выкарыстаннем тэхналагічнага вопыту вядучых краін свету і імпартнага абсталявання, якое на той час з'яўлялася інавацыйным для айчыннай вытворчасці. Сумесная праца з замежнымі спецыялістамі дазволіла беларускім рабочым і інжынерна-тэхнічным работнікам глыбей пазнаёміцца з перадавымі тэхналогіямі, павысіць сваю кваліфікацыю, умацаваць кадравы патэнцыял савецкай Беларусі. Шэраг прамысловых прадпрыемстваў выйшлі на ўзровень, які адпавядаў тагачасным дасягненням навукі і тэхнікі, і занялі вядучыя пазіцыі ў эканоміцы рэспублікі, а таксама СССР і Еўропы. На эфектыўнасць выкарыстання імпартнага абсталявання і замежных спецыялістаў

---

[1] Записка Управления КГБ по Могилёвской области секретарю Могилёвского областного комитета КПБ от 02.08.1973 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 151. Спр. 58. Арк. 20адв, 21.

[2] Там жа. Арк. 21, 21адв.

уплывала не толькі эканамічная кан’юктура, але і знешнепалітычныя фактары, а таксама наяўнасць вялікай колькасці непаладак і недахопаў, характэрных для савецкага перыяду айчыннай гісторыі.

Такім чынам, ва ўсходнебеларускіх рэгіёнах праводзілася пэўная праца па ўдасканаленню кадравага складу прамысловасці БССР. Выкарыстоўваліся розныя шляхі і метады: абмеркаванне на сходах працоўных калектываў справаздач гаспадарчых кіраўнікоў аб выкананні імі службовых і грамадскіх абавязкаў; арганізацыя і правядзенне атэстацыі кіраўнікоў і спецыялістаў у міністэрствах, ведамствах БССР і іх падраздзяленняў; стажыроўкі кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў на найлепшых прадпрыемствах прамысловасці. У выніку заводы і фабрыкі, аб’яднанні і ўстановы ўзначальвалі, у большасці сваёй, добрыя арганізатары, якія мелі інжынерна-тэхнічную падрыхтоўку і практычны вопыт.

Заміналі і перашкаджалі павышэнню якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу прамысловых прадпрыемстваў і яб’яднанняў, існаваўшыя палітычная і эканамічная мадэлі развіцця ў СССР (БССР), залежнасць фарміравання кадравага патэнцыялу БССР у значнай ступені ад палітыкі органаў кіравання СССР, фарміраванне складу кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў адміністрацыйным шляхам і арыентацыя на колькасныя паказчыкі, што прыводзіла да фармалізму і шматлікіх пралікаў у кадравай працы.

У перыяд, які разглядаецца, адбылося зліццё партыйнага і гаспадарчага кіраўніцтва краіны. Усе сацыяльна-эканамічныя задачы, якія ставіліся перад грамадствам, вырашала КПСС. Кампартыя займалася кадравай працай не толькі ў сваім складзе, але і ў сферы гаспадаркі. У наменклатуру кадраў абкамаў уваходзілі кіраўнікі прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сувязі, будаўнічых арганізацый, СМІ, народнай адукацыі, навуковых устаноў і г. д.

Аналіз падбору, складу і змяняльнасці кіруючых работнікаў прамысловых прадпрыемстваў і яб’яднанняў БССР у 1970–1980-я гг. дазваляе адзначыць, што кіраўніцтва краіны абапіралася ў асноўным на пазаэканамічныя, адміністрацыйна-камандныя метады. Пасля 1985 г. у сувязі з правядзеннем палітыкі “паскарэння і перабудовы” спрабавалі выправіць становішча ў эканоміцы шляхам вылучэння на кіраўніцкія пасады новых работнікаў, правесці працэс “амаладжэння” кадравага патэнцыялу краіны, але гэтага не адбылося таму, што сістэма рэалізацыі кадравай палітыкі заставалася ранейшай.

## 1.4 Нацыянальны склад і фактары міжэтнічнага ўзаемадзеяння ў працэсе фарміравання кадравага патэнцыялу прамысловых прадпрыемстваў у 1945–1991 гг.

Для дэмаграфіі Савецкай Беларусі пасляваенных дзесяцігоддзяў было характэрна, па-першае, змяншэнне колькасці беларусаў. Гэта адбылося ў выніку таго, што: шмат беларусаў загінула на вайне, пэўная частка была

дэпартавана ў Германію і не вярнуліся на радзіму; з-за ўрэгулявання мяжы паміж СССР і Польшчай да 1947 г. з беларускіх земляў выехала на захад ад "лініі Керзана" 120 тыс. палякаў, 85 тыс. яўрэяў, 469 тыс. беларусаў, а з Польшчы ў СССР пераехала ўсяго толькі 30 тыс. беларусаў. Да таго ж толькі з 1950 г. па 1960 г. з Беларусі ва ўсходнія раёны СССР (Сібір, Казахстан і інш.) па арганізаванаму набору рабочай сілы выехала прыкладна 900 тыс. чалавек. Тысячы высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў з Беларусі пасля заканчэння вучобы ў ВНУ па размеркаванні былі накіраваны на прадпрыемствы, будоўлі, у арганізацыі і ўстановы за межы рэспублікі. Сярод іх большасць складалі беларусы. Па-другое, у БССР павялічылася колькасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, перш за ўсё рускіх, палякаў, украінцаў (рускіх прыкладна ў два разы і дасягнула амаль 1 млн чал., ці 10,4 %)[1].

Фактары міжэтнічнага і канфесійнага ўзаемадзеяння ігралі важную ролю ў фарміраванні кадравага складу прамысловасці БССР. Разгляд пытання ўдзелу і ролі нацыянальных супольнасцяў у прамысловым развіцці рэспублікі, у складзе спецыялістаў і кіраўніцкіх работнікаў у 1945–1991 гг. падцвердзіў, што прадстаўнікі розных народаў унеслі істотны ўклад у развіццё прамысловасці рэспублікі. Асабліва істотным, як відаць з дакументаў, гэты ўклад быў у працэсе стварэння новых для Беларусі галін прамысловасці: машынабудаўнічай, электратэхнічнай, хімічнай і г. д. На першым этапе працы новых прадпрыемстваў многія з іх у кіраўніцкім складзе мелі значную частку, а нярэдка і пераважную большасць запрошаных спецыялістаў з іншых рэгіёнаў СССР.

Тым не менш, з самага пачатку аднаўлення народнай гаспадаркі асноўнае папаўненне кадраў рабочых, ІТР і служачых ішло ў асноўным за кошт беларускага насельніцтва. Па дадзеных за 1948 г., з 168 849 рабочых, занятых на прамысловых прадпрыемствах БССР, 82 % былі беларусы. У асобных галінах прамысловасці гэты адсотак быў яшчэ вышэйшым. Так, напрыклад, на торфаздабываючых прадпрыемствах рабочыя-беларусы складалі 95 %, папяровых – 92 %, на лесанарыхтоўках – 89 %. А вось нацыянальны склад кіраўнікоў, ІТР і спецыялістаў меў некалькі іншую структуру. Напрыклад, на 01.01.1948 г. нацыянальны склад ІТР прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі меў наступны выгляд: беларусаў – 48 %, рускіх – 29 %, габрэяў – 15,5 %, украінцаў – 6 %, іншых нацыянальнасцяў – 1,5 %[2].

І далей, нягледзячы на інтэрнацыяналізацыю кадравага складу прамысловых прадпрыемстваў, пераважнае месца ў ім займалі беларусы. На 01.04.1957 г. з 385,6 тыс. прамысловых рабочых беларусы складалі 274,2 тыс. Сярод ІТР і служачых удзельная вага беларусаў складала 57,6 % супраць 48 % на 01.01.1948 г. Разам з прадстаўнікамі карэннай нацыянальнасці ў складзе рабочага класа БССР было нямала рускіх, украінцаў, літоўцаў, яўрэяў, палякаў, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Асабліва шматнацыянальнымі былі

[1] Багровіч А. Жыхарства Беларускае ССР у сьвятле перапісу 1959 г. Нью-Ёрк, Мюнхен, 1962. С. 351–352.
[2] Марченко И. Е. Рабочий класс БССР в послевоенные годы (1945–1950). С.107–108, 143.

калектывы буйных прадпрыемстваў БССР. Напрыклад, да канца 1950-х гг. на Віцебскім дывановым камбінаце калектыў работнікаў па нацыянальнаму складу размяркоўваўся наступным чынам: беларусаў – 76 %, рускіх – 12 %, украінцаў – 5 %, літоўцаў – 3 %[1].

З другой паловы 1950-х гг. вядучыя пазіцыі сярод кіраўніцтва прамысловых прадпрыемстваў займалі прадстаўнікі народаў, якія традыцыйна пражывалі на тэрыторыі Беларусі. Сярод якіх большасць складалі беларусы, украінцы і яўрэі. Радзей прадпрыемствамі кіравалі палякі. Ва многіх галінах прамысловасці значную, а часам і пераважную частку кіраўніцкага складу складалі прадстаўнікі рускай нацыянальнасці. У большасці галін прамысловай вытворчасці найчасцей сустракаюцца прадстаўнікі тытульнага этнасу – беларусы. Але так было не паўсюль і не заўжды. Сітуацыя не была аднолькавай, яна была хутчэй стракатай і рухомай.

Табліца 6 – Звесткі аб нацыянальнасці дырэктараў прадпрыемстваў па Упраўленню машынабудавання і станкабудавання СНГ БССР у 1960 г.[2]

| Пасады | усяго | белар. | руск. | укр. | яўр. | Паляк. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| дырэктароў | 32 | 8 | 18 | 3 | 2 | 1 |
| Галоўных інжынераў | 29 | 4 | 12 | 4 | 8 | 1 |
| Спецыялістаў ва Упраўленні | 84 | 31 | 34 | 4 | 13 | 2 (інш.) |
| Усяго | 145 | 43 | 64 | 11 | 23 | 4 |
| Сярэдні працэнт | 100 | 29,6 | 44,1 | 7,6 | 15,9 | 2,7 |

Як бачна з дадзеных табліцы 6 у кіраўніцкую эліту Упраўлення машынабудавання і станкабудавання СНГ БССР у канцы 1950 – пачатку 1960 гг. уваходзілі прадстаўнікі ўсіх галоўных этнасаў, якія пражывалі на тэрыторыі краіны, але ў розных долях. Перш-наперш кідаецца ў вочы малая доля дырэктараў і галоўных інжынераў беларусаў. Па нацыянальнасці сярод дырэктараў прадпрыемстваў пераважалі рускія, якія складалі 56,25 %. Дастаткова вялікай была доля яўрэяў, асабліва сярод галоўных інжынераў вытворчасці (27,6 %).

Калі ў перадавых і новых для Беларусі галінах вытворчасці наяўнасць такой вялікай долі рускіх кіраўнікоў можна патлумачыць тым, што многія рэгіёны РСФСР раней уступілі ў працэс індустрыялізацыі і мелі больш профільных спецыялістаў, якіх пры будаўніцтве новых прадпрыемстваў запрашалі ў БССР, то значна цяжэй падобную сітуацыю патлумачыць у менш навукаёмкіх і традыцыйных для Беларусі галінах вытворчасці: лёгкай,

[1] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 363–364.
[2] Отчет за 1960 г. о работе с кадрами в системе Управления машиностроения и станкостроения СНХ БССР // НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 2508. Арк. 119-122.

харчовай, дрэваапрацоўчай і г. д. Тут доля рускіх па паходжанні кадраў можа быць патлумачана толькі мэтанакіраванай нацыянальнай палітыкай КПСС.

Так, па Упраўленню лёгкай прамысловасці СНГ БССР у 1959–1962 г. нацыянальны склад кіраўніцтва прадпрыемстваў можна прасачыць у пэўнай дынаміцы, якую характаразуюць лічбы, якія размешчаны ў табл. 7.

Звяртае на сябе ўвагу, што нават у лёгкай прамысловасці доля рускіх дырэктароў самая высокая, і яна нават перавышае агульнабеларускі працэнт рускіх у дырэктарскім корпусе СНГ БССР. На прадпрыемствах лёгкай парамысловасці таксама адзначаецца большая доля яўрэяў і меншая беларусаў, у параўнанні з сярэднерэспубліканскімі лічбамі.

Табліца 7 – Звесткі аб нацыянальнасці дырэктараў прадпрыемстваў па Упраўленню легкай прамысловасці СНГ БССР у 1959–1962 г.[1]

| Пасада | Год на 01.01 | усяго | белар. | руск. | укр. | яўр. | інш. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| дырэктароў | 1959 | 51 | 18 | 21 | 3 | 8 | 1 |
| | 1960 | 62 | 23 | 24 | 6 | 8 | 1 |
| | 1961 (на канец года | 61 | 23 | 25 | 7 | 5 | 1 |
| сярэдні працэнт | За тры гады | 100 | 36,7 | 39,7 | 9,2 | 12,7 | 1,7 |

Сярод галоўных інжынераў (гл. табл. 8) беларусаў было яшчэ меней, чым сярод дырэктараў, што натуральна зніжала магчымасць для іх у будычым займаць пасады дырэктараў прадпрыемстваў. А вось доля рускіх, якія складалі амаль 2/5 ад усіх галоўных інжынераў, і яўрэяў была значна большая, чым увогуле па рэспубліцы. Можна таксама меркаваць, што, нягледзячы на дастаткова высокі адукацыйны ўзровень яўрэяў сярод ІТР прадпрыемстваў, існавалі механізмы па пэўнаму абмежаванню іх кар’ернага росту.

Табліца 8 – Звесткі аб нацыянальнасці галоўных інжынераў прадпрыемстваў па Упраўленню лёгкай прамысловасці СНГ БССР у 1959–1962 г. [2]

| Пасада | Год на 01.01 | усяго | белар. | руск. | укр. | яўр. | інш. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Галоўных інжынераў | 1959 | 46 | 12 | 18 | 4 | 12 | - |
| | 1960 | 52 | 11 | 21 | 5 | 15 | - |
| | 1961 | 51 | 9 | 23 | 6 | 13 | - |
| Сярэдні працэнт | За тры гады | 100 | 21,5 | 41,6 | 10,1 | 26,8 | |

[1] Справка по выполнению постановления Совета народного хозяйства БССР от 31 июля 1961 г. «О работе с кадрами в системе Совнархоза БССР» по Управлению лёгкой промышленности СНХ. 20 декабря 1961 г. // НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 2521. Арк. 42; Отчет за 1960 г. по Управлению легкой промышленности СНХ БССР за 1960 г. // Там жа. Спр. 2508. Арк. 191.

[2] Там жа.

Агульнае ўяўленне аб нацыянальным складзе прамысловай эліты на 01.01.1962 г. даюць статыстычныя звесткі па прадпрыемствах Савета народнай гаспадарцы БССР (гл. табл. 9). Яны прадастаўляюць нацыянальную характарыстыку дырэктароў і галоўных інжынераў на большасці прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі.

Табліца 9 – Звесткі аб нацыянальнасці дырэктараў і галоўных інжынераў прадпрыемстваў Саўнаргаса БССР на 01.01.1962 г.[1]

| Пасады (частка не занята) | усяго | белар. | руск. | укр. | яўр. | інш. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| дырэктараў | 688 | 333 | 225 | 62 | 66 | 2 |
| У працэнтах | 100 | 48,4 | 32,7 | 9 | 9,6 | - |
| Галоўных інжынераў | 602 | 255 | 219 | 58 | 63 | 7 |
| У працэнтах | 100 | 42,4 | 36,4 | 9,6 | 10,5 | - |

З табліцы 9 бачна, што беларусы складалі абсалютную большасць як дырэктараў, так і галоўных інжынераў прадпрыемстваў. Тым не менш, яны займалі значна меншую долю кіраўніцкіх пасад у параўнанні з іх доляй у насельніцтве БССР. Яўрэі і ўкраінцы з’яўляліся аднымі з карэнных этнасаў Беларусі. Яны складалі значную долю гарадскога насельніцтва і займалі некалькі большую долю кіраўніцкіх пасад у параўнанні з іх доляй у насельніцтве рэспублікі. Найбольшы дысбаланс назіраўся сярод рускіх па нацыянальнасці дырэктараў і галоўных інжынераў прадпрыемстваў. Выкліканы ён быў як натуральнымі працэсамі запрашэння патрэбных спецыялістаў з профільнай для прадпрыемстваў адукацыяй, якія мелі з-за гэтага перавагу ў кар’ерным росце, так і мэтанакіраванай палітыкай КПСС па змешванню насельніцтва розных рэгіёнаў СССР і імкнення да стварэння новай надэтнічнай супольнасці – савецкага народа.

Сітуацыя з меншай колькасцю прадстаўнікоў тытульнага і самага вялікага па колькасці этнаса Беларусі, тлумачыцца не толькі вясковым паходжаннем і пражываннем значнай частцы беларусаў у сельскай мясцовасці, але і адсутнасцю профільных навучальных установаў, перш-наперш вышэйшых, па многіх галінах вытворчасці. Прысланыя ж пасля заканчэння вышэйшых навучальных установаў па размеркаванні маладыя спецыялісты з Масквы, Ленінграда і Кіева хаця і не заўжды замацоўваліся на рабочых месцах у БССР, але займалі значную частку пасад кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў.

Працэс падрыхтоўкі мясцовых кадраў пашыраўся, дзякуючы стварэнню на тэрыторыі рэспублікі спецыяльных адукацыйных установаў. Так, важную ролю ў падрыхтоўцы кадраў для машынабудавання аказаў створаны ў 1961 г. Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут. Інстытут быў адкрыты 01.09.1961 г. у

[1] Сведения о директорах и главных инженерах предприятий Совнархоза БССР на 1 января 1962 г. // НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 2521. Арк. 248-249.

адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў СССР ад 10.08.1961 г. і Пастановай Савета Міністраў БССР ад 22.08.1961 г. і стаў адзінай у Беларусі вышэйшай навучальнай установай такога профілю. На базе інстытута ў сувязі з уводам у Магілёве ў эксплуатацыю найбуйнейшага ў Еўропе ВА "Хімвалакно" на ўзроўні ўрада СССР было прынята рашэнне аб пачатку падрыхтоўкі з 1968 г. інжынераў-хімікаў-тэхнолагаў па спецыяльнасці "Тэхналогія хімічных валокнаў". А ўлічваючы важнасць кадравага забеспячэння для сферы грамадскага харчавання, якая інтэнсіўна развівалася ў той час, у 1970 г. быў зроблены набор студэнтаў па спецыяльнасцях "Тэхналогія і арганізацыя грамадскага харчавання" і "Машыны і апараты харчовых вытворчасцяў".

З 01.01.1973 г. на базе тэхналагічнага факультэта Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута пачаў працаваць Магілёўскі тэхналагічны інстытут (сёння Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій). Ён стаў адзінай у рэспубліцы вышэйшай установай, якая разгарнула падрыхтоўку спецыялістаў для харчовай і перапрацоўчай галін АПК і хімічнай прамысловасці[1]. На базе філіяла Беларускага тэхналагічнага інстытута з 1974 г. шматпрофільную падрыхтоўку інжынераў разгарнуў Наваполацкі політэхнічны інстытут. Толькі за 1981–1985 гг. гэтая маладая навучальная ўстанова падрыхтавала 4 200 спецыялістаў, 80 % з якіх працавалі на прадпрыемствах і арганізацыях Беларускай ССР. У выніку прынятых мер у 1985/1986 навучальным годзе колькасць вышэйшых навучальных устаноў у Беларускай ССР дасягнула 33, а кантынгент студэнтаў склаў 181,9 тыс. чалавек[2].

Па меры станаўлення прамысловых прадпрыемстваў узрастала доля мясцовых кадраў, а прыезджыя спецыялісты і кіраўніцкія работнікі розных нацыянальнасцяў паступова замяшчаліся беларусамі і іншымі прадстаўнікамі карэнных народаў Беларусі. Тым не менш, адчувальным заставаўся ўдзел нацыянальных меншасцей у гаспадарцы Беларусі і ў 1980-я гг. Аб чым сведчыць нацыянальны склад пасадавых асобаў у эканоміцы рэспублікі (гл. табл. 10).

Табліца 10 – Нацыянальны склад кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і яб'яднанняў БССР у 1984–1987 гг.[3]

| | 01.07.1984 | | 01.07.1985 | | 01.07.1986 | | 01.07.1987 | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % |
| Усяго пасад,<br>замешчаны работнікамі | 204<br>203 | <br>99,5 | 205<br>205 | <br>100 | 168<br>167 | <br>99,4 | 229<br>225 | <br>98,3 |
| Беларусаў | 98 | 48,2 | 105 | 51,2 | 91 | 54,5 | 127 | 56,4 |

[1] Пушкин И. А. Исторический очерк создания и деятельности Могилёвского государственного университета продовольствия. С. 2-53; Яго ж. Гісторыя падрыхтоўкі кадраў для грамадскага харчавання ў Савецкай Беларусі. С. 312-313.
[2] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 469–470.
[3] Справка о составе и сменяемости руководителей промышленных предприятий и объединений БССР. 1984–1987 гг. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 982. Арк. 1-2 (1984–1985); Спр. 406. Арк. 4-5 (1986–1987).

У 1984–1985 гг. прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей сярод кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў было: рускіх – 67 (32,7 %), украінцаў – 24 (11,7 %), палякаў – 3 (1,5 %), яўрэяў – 3 (1,5 %), па 1 (0,5 %) – армянін, немец, мардвін[1].

На 01.07.1984 г. з агульнай колькасці дырэктараў (у тым ліку і генеральных) прадпрыемстваў і аб'яднанняў, кіраўнікоў будаўнічых трэстаў, начальнікаў домабудаўнічых і вясковых будаўнічых камбінатаў БССР былі прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей Беларусі: генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання Міністэрства будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання БССР (рускі), два (з трох, што складала 66 %) генеральныя дырэктары вытворчых аб'яднанняў Міністэрства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання (рускі і украінец), генеральны дырэктар Магілёўскага вытворчага аб'яднання шоўкавых тканін (рускі), два генеральныя дырэктары (33 % ад агульнай колькасці) вытворчых аб'яднанняў малочнай прамысловасці БССР (рускія), трынаццаць (59,1 %) дырэктараў мясакамбінатаў БССР (11 рускія і 2 украінцы), восем (72,7 %) дырэктараў прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці БССР (рускія), шэсць (што складае 66 % ад агульнай колькасці кіраўнікоў прадпрыемстваў у гэтай галіне вытворчасці) дырэктараў прадпрыемстваў тэкстыльнай прамысловасці БССР (рускія), дырэктар Гродзенскага вытворчага абутковага аб'яднання "Нёман" (рускі), чацвёра (57,1 %) дырэктараў прадпрыемстваў мікрабіялагічнай прамысловасці БССР (2 рускія, 1 эстонец, 1 татарын), чатыры (80 %) дырэктары абутковых фабрык (рускі, яўрэй, 2 украінцы), чатыры (50 %) начальнікі домабудаўнічых камбінатаў БССР (рускія), сямнаццаць (39,5 %) упраўляючых будаўнічымі трэстамі ў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай вобласцях (8 рускія, 2 палякі, 6 украінцаў, 1 яўрэй), два (25 %) дырэктары прадпрыемстваў трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання (рускі і ўкраінец), дырэктар Магілёўскага завода "Строммашына" (рускі), дырэктар Ваўкавыскага завода кровельных і будаўніча–аздабленчых машын Гродзенскай вобласці (яўрэй), пяць (71,4 %) дырэктараў прадпрыемстваў будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання (усе рускія), дырэктар вытворчага аб'яднання "Магілёўліфтмаш" (рускі), пяць (71,4 %) начальнікаў геафізічных, геолагавыведачных і пашукова–здымачных экспедыцый БССР (рускі і 4 украінцы), два (66 %) начальнікі буравых работ (рускія), два (100 %) начальнікі нафтагазаздабыўных упраўленняў БССР (украінцы) і інш.[2]

Аналіз нацыянальнага складу гаспадарчага кіраўніцтва Магілёўскай вобласці засведчыў, што ў 1988 г. рускімі па нацыянальнасці былі: загадчыкі аддзелаў прамыслова-транспартнага, гандлю і бытавога абслугоўвання, сельскагаспадарчага і харчовай прамысловасці абкама КПБ[3]; генеральны дырэктар Магілёўскага навукова-вытворчага аб'яднання па сельскай

---

[1] Справка о составе и сменяемости руководителей промышленных предприятий и объединений БССР. 1984–1987 гг. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 982. Арк. 1-2 (1984–1985).

[2] Пушкін І. А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.). С. 207.

[3] Статистические отчёты // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 14-15.

гаспадарцы, дырэктар Бабруйскага маслабойнага завода, генеральны дырэктар Магілёўскага вытворчага аб’яднання хлебапрадуктаў, дырэктар Магілёўскага металургічнага завода імя А. Мяснікова, генеральны дырэктар Магілёўскага ВА “Страмаўталінія”, генеральны дырэктар Магілёўскага ВА “Хімвалакно”, упраўляючы раённым упраўленнем энергетыкі і электрыфікацыі “Магілёўэнерга”, дырэктары двух прадпрыемстваў нафтаперапрацоўваючай прамысловасці, дырэктар Шклоўскай папяровай фабрыкі “Спартак”, генеральны дырэктар Магілёўскага ВА шаўковых тканін, упраўляючы будаўнічым трэстам. Украінцы працавалі на пасадах: старшыні Магілёўскага абласнога вытворчага аб’яднання па аграхімічнаму абслугоўванню сельскай гаспадаркі, дырэктара Бабруйскага машынабудаўнічага завода, дырэктара аднаго з прадпрыемстваў нафтаперапрацоўчай прамысловасці, дырэктара абутковай фабрыкі, начальніка домабудаўнічага камбіната. Упраўляючым аднаго з будаўнічых трэстаў быў яўрэй, з татар паходзіў дырэктар гідролізнага завода[1]. Пералік можна было б працягваць, але і прыведзеныя лічбы дазваляюць казаць аб значнай ролі ў гаспадарчым развіцці БССР прадстаўнікоў нетытульнага этнасу і іх высокім сацыяльным статусе.

На 01.01.1989 г. прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 33,4 % наменклатуры кадраў абкамаў КПБ, у якой налічваўся 981 кіраўнік прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту і сувязі, будаўнічых арганізацый. Сярод іх было 241 чал. (24,6 %) рускай нацыянальнасці, 53 (5,5 %) украінцы, 14 (1,4 %) яўрэяў, 12 (1,2 %) палякаў, 2 (0,2 %) татарыны, па 1 (0,1 %) немцу, бурату, адыгейцу, 3 (0,2 %) – іншых нацыянальнасцей[2].

Нацыянальныя меншасці мелі трывалыя пазіцыі ў органах дзяржаўнага кіравання (22,6 %), у кіраўніцтве прадпрыемстваў і арганізацый (28,4 %). Сярод інжынерна-тэхнічных спецыялістаў яны складалі 35,4 %; аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынарных работнікаў і ляснічых – 15,8 %; медыцынскіх работнікаў – 30 %; навуковых работнікаў, выкладчыкаў і выхавальнікаў – 30,9 %; работнікаў літаратуры і друку – 33,3 %; культурна–асветніцкіх работнікаў – 29,3 %; работнікаў мастацтва – 44 %; юрыдычнага персаналу – 30,1 % [3].

Крыху больш шырокае прадстаўніцтва нацыянальных меншасцей адбылося з канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. Гэта было выклікана, у некаторай ступені, працэсамі адноснай дэмакратызацыі ў краіне, адраджэння нацыянальнай самасвядомасці і актывізацыяй грамадска-палітычнай дзейнасці нацыянальных меншасцей Беларусі. Аналіз прыведзенай статыстыкі і прыкладаў занятых пасадаў дазваляе зрабіць выснову аб высокім сацыяльным статусе нацыянальных меншасцей у гаспадарчым жыцці БССР.

Такім чынам, на фарміраванне кадравага патэнцыялу БССР, асабліва кіраўніцкага апарату ўплывалі змяненні ў нацыянальным складзе гарадскога насельніцтва, павышэнне адукацыйнага ўзроўню беларусаў, правядзенне ў справе фарміравання партыйна-дзяржаўнага апарату палітыкі адміністратыўнага рэгулявання долі тытульнай нацыі, аргнаборы працоўнай

[1] Статистические отчёты // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 97–107 адв., 144 адв.-178 адв.
[2] Статистические отчёты // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 966. Арк. 12,14, 15-63.
[3] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 303.

сілы на буйныя будоўлі СССР, перасяленне беларускага насельніцтва ў раёны Далёкага Усходу, Сібіры, Карэліі і адпаведныя запрашэнні насельніцтва з іншых рэспублік (пераважна з РСФСР) на працу ў БССР. Беларусы паступова склалі абсалютную большасць сярод дырэктараў і галоўных інжынераў прамысловых прадпрыемстваў. Тым не менш, тытульная нацыя займала значна меншую долю кіраўніцкіх пасад у параўнанні з яе доляй у насельніцтве БССР. Таму варта адзначыць істотны ўклад розных нацыянальных супольнасцяў у фарміраванне і развіццё кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР у 1945–1991 гг.

Вялікую ролю пры прызначэнні на пасаду адыгрывалі анкетныя дадзеныя: сацыяльнае паходжанне, узровень адукацыі, членства ў КПСС і нацыянальнасць. Гэта дазваляла пэўным чынам фарміраваць склад гаспадарчага кіраўніцтва. Перавага аддавалася прадстаўнікам рускай, беларускай і ўкраінскай нацыянальнасці. Улічваючы высокі ўзровень адукацыі сярод яўрэйскага насельніцтва, можна казаць аб пэўных адміністратыўных перашкодах пры прызначэнні іх на пасады. У той жа час трэба мець на ўвазе, што гаворка ідзе пра тых асоб, якія паказвалі ў анкетах сваю нацыянальнасць як яўрэй (некаторыя ў анкетах пазначалі сябе ў якасці рускіх ці беларусаў). Падобныя абмежаванні існавалі і ў адносінах да палякаў. У апошнія дзесяцігоддзі існавання БССР нацыянальнасць улічвалася ў анкетах і пры назначэнні на пасаду, але большасць грамадзян не надавала ёй вялікага значэння, усведамляючы сябе савецкімі людзьмі.

## Глава 2
## ФАКТАРЫ І ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ КАДРАВАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР У 1945–1991 ГГ.

На развіццё прамысловасці БССР у другой палове XX ст. уплывалі самыя разнастайныя геапалітычныя, дэмаграфічныя, грамадска-палітычныя, аксіялагічныя, сацыякультурныя, гендэрныя, навукова-тэхнічныя, эканамічныя і вытворчыя фактары, якія стымулявалі або тармазілі развіццё прамысловасці рэспублікі, мелі істотнае значэнне для фарміравання яе кадравага патэнцыялу. Эканоміка рэспублікі развівалася ва ўмовах панавання камуністычнай ідэалогіі ва ўсіх сферах жыцця грамадства, яе пастулаты і праз паўстагоддзя пасля Кастрычніцкага перавароту ігралі першасную ролю пры правядзенні кадравай палітыкі на прамысловых прадпрыемствах.

Палітыка паскоранай індустрыялізацыі БССР у другой палове XX ст. з'яўлялася адной з галоўных прычын хуткай урбанізацыі краіны. Разам індустрыялізацыя і ўрбанізацыя БССР, як было паказана ў першай главе, з'яўляліся аднымі з найбольш важных фактараў, якія ўплывалі на грамадска-палітычнае і сацыяльнае жыццё, на стан народнай гаспадаркі, на сацыяльную і дэмаграфічную сітуацыю ў БССР. Шпаркая індустрыялізацыя і ўрбанізацыя ў БССР праводзіліся ў адпаведнасці з марксісцкімі ўяўленнямі пра шляхі развіцця грамадства і ролю рабочага класа ў гісторыі класавага грамадства. Меры па паскарэнню індустрыялізацыі і ўрбанізацыі прывялі да істотных змен у сацыяльнай і дэмаграфічнай структуры грамадства.

### 2.1 Уплыў рэформ і змен умоў жыцця грамадства на развіццё прамысловасці і фарміраванне яе кадравага патэнцыялу ў другой палове 1940–1960-х гг.

**Геапалітычныя фактары.** Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны практычна адразу пачалося геапалітычнае процістаянне паміж ЗША і СССР. Пераможцам у канчатковым выніку мог стаць толькі эканамічна больш моцны сапернік. Вырашыць гэтую задачу СССР на фоне значнага эканамічнага адставання ад ЗША было вельмі складана. Кіраўніцтва краіны лічыла найбольш аптымальнай адміністрацыйна-камандную мадэль развіцця, якая паказала сваю эфектыўнасць у гады вайны. Дасягненні альтэрнатыўнай эканамічнай мадэлі, па якой развівалася заходняя цывілізацыя, маглі ацаніць і супаставіць з савецкімі мільёны савецкіх грамадзян, якія ўпершыню пабывалі за мяжой (больш за 6 млн чалавек у складзе дзеючай арміі і яшчэ 5,5 млн рэпатрыянтаў). Многія з тыя, хто заставаўся ў краіне, спадзяваліся, што пасля вайны адбудуцца перамены да лепшага. Напрыклад, пагалоскі і чуткі пра адмену калгаснай сістэмы былі вельмі распаўсюджаны яшчэ ў час акупацыі на тэрыторыі ўсходніх рэгіёнаў БССР.

Рэфармісцкія настроі часткі партыйна-савецкага кіраўніцтва, накіраваныя на змякчэнне ці змяненне тых ці іншых аспектаў савецкай эканамічнай

палітыкі, не спраўдзіліся, а пачатак “халоднай вайны” канчаткова пахаваў гэтыя надзеі. Распад антыгітлераўскай кааліцыі, барацьба з заходнімі дзяржавамі за падзел Еўропы, абвастрэнне адносін з капіталістычнымі краінамі і перш за ўсё са ЗША і пачатак “халоднай вайны” сталі аднымі з вырашальных фактараў таго, што сталінская мадэль эканомікі стала яшчэ больш жорсткай. Адным з галоўных атрыбутаў гэтай мадэлі, як і раней, было цэнтралізаванае кіраванне ўсімі эканамічнымі працэсамі ў форме дырэктыўнага планавання.

Пасля Другой сусветнай вайны геаграфічнае становішча БССР не змянілася, але рэспубліка стала ўнутраным рэгіёнам сусветнай сацыялістычнай садружнасці, заходняя мяжа якой праходзіла па тэрыторыі Заходняй Еўропы. У сувязі са зменай геапалітычнага становішча ў ёй разгарнулася будаўніцтва аб'ектаў цяжкай прамысловасці, у тым ліку і ВПК. Так, прыняты ў верасні 1946 г. першы пасляваенны пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946–1950 гг.распаўсюджваўся на тэрыторыю ў тых жа межах, што і ў 1939 г., за выключэннем 17 раёнаў Беластоцкай вобласці разам з горадам Беластокам і трыма раёнамі Брэсцкай вобласці, якія паводле дагавора паміж СССР і Польшчай аб савецка-польскай мяжы былі перададзены ад БССР да Польшчы. Шырокі размах будаўніча-аднаўленчых работ выклікаў вялікую патрэбнасць у масавых, тэхнічна падрыхтаваных кадрах.

У сувязі з неабходнасцю канчатковай перабудовы на сацыялістычны лад гаспадаркі Заходняй Беларусі, якая да 1939 г. развівалася па іншай мадэлі, асноўныя задачы гэтай пяцігодкі заключаліся не толькі ў тым, каб дасягнуць даваеннага ўзроўню вытворчасці і перавысіць яго, але і ў пераадоленні “эканамічнай і тэхнічнай адсталасці” заходніх абласцей Беларусі[1]. Паскораныя ў параўнанні са ўсходнімі абласцямі тэмпы прамысловага будаўніцтва прадугледжваліся і ў наступных пяцігадовых планах развіцця эканомікі.

Кіраўніцтва СССР праводзіла палітыку самаізаляцыі ад сусветнай капіталістычнай эканомікі, апоры на ўласныя сілы і крыніцы аднаўлення і развіцця эканомікі краіны. Адным з самых негатыўных момантаў гэтай палітыкі была адмова ў 1947 г. ад удзелу ў плане Маршала, у адпаведнасці з якім краінам Заходняй Еўропы Злучанымі Штатамі была аказана дапамога на тэрмін чатыры гады (1948–1951) у выглядзе пазык і крэдытаў, якая адыграла вельмі значную ролю ў аднаўленні і развіцці іх эканомік. У выніку доля капіталістычных краін у знешнеэканамічных сувязях СССР скарацілася з 38,3 % у 1946 г. да 15 % у 1950 г., у тым ліку па імпарту з 47,9 да 12,6 %[2].

Адсутнасць такога магутнага рычага развіцця эканомікі, як замежныя крэдыты, спыненне паставак па ленд-лізе СССР у нейкай ступені кампенсаваў міжнароднай гуманітарнай дапамогай, вывазам прамысловага абсталявання і іншых матэрыяльных каштоўнасцей з Германіі па рэпарацыях.

---

[1] Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946–1950 гг. Мінск, 1946. С. 9.

[2] История социалистической экономики СССР: В 7 т. Т. 6 : Восстановление народного хозяйства СССР. Создание экономики развитого социализма, 1946 – нач. 1960-х гг. / И. А. Гладков, А. Д. Курский, А. И. Коссой [и др.]. М, 1980. С. 560.

Па рашэнні Ялцінскай канферэнцыі рэпарацыі павінны былі спаганяцца з Германіі ў трох формах: а) аднаразовыя канфіскацыі на працягу двух гадоў па капітуляцыі Германіі з яе нацыянальнага багацця (прамысловае абсталяванне, караблі, цягнікі, акцыі прадпрыемстваў і г. д.) дзеля знішчэння ваеннага патэнцыялу краіны; б) штогадовыя таварныя пастаўкі з бягучай прадукцыі пасля заканчэння вайны на працягу перыяду, працягласць якога меркавалася ўсталяваць пазней; в) выкарыстоўванне германскай працы. Саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі планавалі атрымаць ад Германіі рэпарацыйных паставак на суму 20 млрд долараў, палова з якіх павінна была належыць Савецкаму Саюзу. Пры гэтым толькі прамыя страты СССР на акупаванай тэрыторыі складалі 128 млрд долараў.

Міжнародныя рашэнні прадугледжвалі дэмантаж тэхналагічнага абсталявання з часткі нямецкіх прамысловых прадпрыемстваў і далейшае яго выкарыстоўванне ў розных галінах народнай гаспадаркі СССР, у тым ліку і на заводах БССР. Па дадзеных фінансавых органаў за 1945 – першы квартал 1947 гг., было ўлічана і ацэнена абсталявання і тавараматэрыяльных каштоўнасцяў, якія паступілі ў рэспубліку па рэпарацыях, на суму ў 201 млн. руб. Рэпарацыйнае прамысловае абсталяванне атрымлівалі практычна ўсе адноўленыя прадпрыемствы БССР, аднак найбуйнейшымі атрымальнікамі дадзенай катэгорыі абсталявання з'яўляліся Мінскі аўтамабільны і Мінскі трактарны заводы. Эфектыўнасць выкарыстоўвання рэпарацыйнага абсталявання ў шэрагу выпадкаў была невысокай. Часцяком тэхналагічныя лініі аднаго нямецкага прадпрыемства размяркоўваліся па некалькіх савецкіх заводах, а частка абсталявання выкарыстоўвалася не па прызначэнні. Не хапала складскіх памяшканняў, абсталяванне захоўвалася на адкрытых пляцоўках, іржавела і прыходзіла ў нягоднасць Напрыклад, Магілёўскі завод № 511 у другім квартале 1946 г. у парадку пераразмеркавання атрымаў 92 вагоны з абсталяваннем з Калінінскага завода № 513. Дадзенае абсталяванне было адпраўлена без ацэнкі, некамплектнае, незапакаванае, пагружанае навалам, некаторыя агрэгаты былі зламаны пры пагрузцы[1].

На працягу 1945–1947 гг. Беларусь атрымлівала пастаўкі харчавання, адзення, медыкаментаў, прамысловага і сельскагаспадарчага абсталявання па лініі ЮНРРА – спецыяльнага ведамства пры ААН, аб’ём якіх склаў 142 тыс. т на суму каля 61 млн долараў. У аднаўленні народнай гаспадаркі БССР шырока выкарыстоўвалася праца нямецкіх ваеннапалонных, якіх была значная колькасць на тэрыторыі рэспублікі. Па стане на 01.08.1945 г. на тэрыторыі БССР налічвалася 98 237 ваеннапалонных і інтэрніраваных. Да студзеня 1949 г. колькасць такіх асоб зменшылася да 21 007. Цалкам працэс перадачы ваеннапалонных і інтэрніраваных нямецкаму боку быў завершаны ў 1951 г[2]. Праца ваеннапалонных і інтэрніраваных выкарыстоўвалася на найважнейшых гаспадарчых аб'ектах БССР, але ізноў найперш у сталіцы. Напрыклад, на будаўніцтве Мінскага аўтамабільнага завода працавалі 3 700 ваеннапалонных;

[1] Концевой П. А. Германские репарации в восстановлении и дальнейшем развитии экономики БССР (1945 – начало 1950 гг.) // Романовские чтения – 10. Могилев, 2015. С. 159-160.
[2] Костюк М. П. Большевистская система власти в Беларуси. С. 254.

на ўзвядзенні Мінскага трактарнага завода працавалі 4 500 ваеннапалонных; а да работ на Гомсельмашы – адным з найбуйнейшых заводаў усходу краіны прыцягвалася 800 ваеннапалонных[1].

За адносна кароткі час Беларусь была пераўтворана ў адзіны народна-гаспадарчы комплекс, у развіццё якога былі прыцягнутыя значныя фінансавыя рэсурсы. У выніку, у Беларусі быў створаны адзін з буйнешых ва Усходняй Еўропе індустрыяльных раёнаў з уласнай сістэмай політэхнічнай адукацыі і даследчых інстытутаў, пераважна ў галіне дакладных навук. Стратэгія пабудовы такога індустрыяльнага раёна ў 40–70-я гг. XX ст. уключала ў сябе стварэнне некалькіх дзясяткаў прадпрыемстваў-гігантаў, якія структурна і арганізацыйна адпавядалі тагачасным заходнім транснацыянальным карпарацыям, з вялікай колькасцю прадпрыемстваў-партнёраў і пастаўшчыкоў.

Экспансія ў Азію, стратэгічна важная для СССР, патрабавала сістэматычнага асваення сыравінных рэсурсаў, радовішчы якіх знаходзіліся за Уралам, за кошт прамысловых цэнтраў еўрапейскай часткі краіны. Беларусь, як адзін з гэтых цэнтраў, павінна была да таго ж забяспечваць усю тылавую інфраструктуру зоны адказнасці вайсковай групоўкі СССР на паўночна-заходнім кірунку.

На развіццё прамысловасці БССР уплывала і тое, што тэрыторыя Беларусі мела стратэгічнае значэнне, праз яе праходзілі геапалітычна значныя транспартныя і энергетычныя сістэмы: аўтамабільныя дарогі і чыгункі Берлін – Мінск – Масква; Ленінград – Адэса; Львоў – Мінск. З 1960-х гг. важную ролю сталі іграць лініі трубаправоднага транспарту. Нафтаправод "Дружба" пачалі будаваць у 1960 г., а "Дружба-2" у 1969 г. і завяршылі ў 1974 г. Яго траса праходзіла праз Мазыр, а далей дзялілася на паўночны (на Польшчу, Германію) і паўднёвы (на Украіну, Славакію, Чэхію, Венгрыю і Харватыю) участкі.

З прычыны знаходжання БССР у складзе СССР частка рабочых кадраў БССР накіроўвалася на ўсесаюзныя аб'екты народнай гаспадаркі. Так, у 1950 гг. заставалася актуальнай аднаўленне прамысловасці Данецкага басейна. Выконваючы пастанову ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР аб пасылцы "рабочай сілы" на вугальныя шахты Данбаса Выканкам Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных і Віцебскі абкам КПСС ад 03.08.1956 г. прынялі супольную пастанову аб выкананні рашэння рэспубліканскіх органаў. Планавалася "на добраахвотных пачатках у парадку грамадскага прызыву" адабраць і накіраваць з вобласці да 15 верасня 1 180 рабочых, якія выявілі жаданне працаваць на вугальных шахтах Данбаса. У пастанове падкрэслівалася, што камплектаванне рабочай сілы для Данбаса з'уляецца першачарговай справай[2].

Надалей пераразмеркаванне рабочай сілы здзяйснялася ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР "Аб грамадскім прызыве ў

---

[1] Шарков А. В. Военнопленные и интернированные на территории Беларуси: Роль органов внутренних дел в их содержании и трудовом использовании (1944–1955 гг.). Минск, 1997. С. 74, 77, 78.

[2] Постановление Исполкома Витебского Областного Совета депутатов трудящихся и Витебского обкома КПСС от 03.08.1956 г. О мероприятиях по выполнению постановления ЦК КПБ и Совета Министров БССР о посылке рабочей силы на угольные шахты Донбасса // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 168. Арк. 69-70.

1957 г. моладзі для работ на важных будоўлях, якія размешчаны ва ўсходніх і паўночных раёнах СССР і ў Данбасе”. Набор маладых рабочых прадугледжваўся перш-наперш з ліку скарочаных на прамысловых прадпрыемствах і арганізацыях работнікаў[1]. Гэта і наступныя пастановы партыі і ўрада прадвызначылі пераразмеркаванне значнай частцы працоўных рэсурсаў з Беларусі ў іншыя рэгіёны СССР і міграцыйныя патокі беларусаў за межы рэспублікі.

**Грамадска-палітычныя фактары** ігралі першасную ролю пры правядзенні кадравай палітыкі на прамысловых прадпрыемствах. Ва ўмовах панавання планавай цэнтралізаванай каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай развіццё прамысловасці вызначалася дырэктывамі партыйных і савецкіх органаў, а не аб’ектыўнымі патрабаваннямі эканомікі і спажывецкага рынку.

У другой палове 1950 гг. адбылося пашырэнне правоў саюзных рэспублік СССР. З 1957 г. уводзілася самастойнасць рэспубліканскіх органаў улады ў вызначэнні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання, прыняцця грамадзянскага, крымінальнага і працэсуальнага кодэксаў і г.д. У 1956–1965 гг. першым сакратаром ЦК КПБ быў К. Мазураў. У БССР у 1962 г. завяршылася адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа на абласным узроўні. Адбылося ўзбуйненне абласцей, у выніку чаго БССР была падзелена на шэсць абласцей: Брэсцкую, Віцебскую, Гомельскую, Гродзенскую, Магілёўскую і Мінскую. У кантэксце дадзенай работы важна, што ў падпарадкаванне рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў пераходзілі многія прамысловыя прадпрыемствы і арганізацыі, якія раней кіраваліся саюзнымі ўладамі.

У БССР у 1953–1964 гг. дзяржавай рабіліся спробы частковай дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця краіны, што аказала неадназначны ўплыў на развіццё не толькі палітычнага рэжыму дзяржавы, яго інстытутаў, грамадскіх арганізацый, але і культуры, эканомікі, у тым ліку прамысловасці. Гістарычныя даследаванні паказваюць моцныя змены дэмакратызацыі па-савецку практычна ва ўсіх сферах. Напрыклад, даследаванні музейнай справы выявіла таксама падобны ўплыў на сферу музейнай справы[2]. Равіццё “савецкай дэмакратыі” ўспрымалася кіраўніцтвам краіны адным са шляхоў актывізацыі грамадска-палітычнай, сацыяльнай і працоўнай актыўнасці мас. Яе можна разглядаць як фактар, які ўплываў на самыя розныя грамадскія інстытуты і сферы, у тым ліку на развіццё прамысловасці і на кадравую палітыку.

Саветы дэпутатаў працоўных у другой палове 1950 гг. атрымалі большыя правы і магчымасці. У другой палове 1950 гг. адбылося некаторае пашырэнне правоў саюзных рэспублік СССР і мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных.

---

[1] Постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР “Об общественном призыве в 1957 г. молодежи для работы на важнейших сооружениях, расположенных в восточных и северных районах СССР и в Донбассе”. 14 июня 1957 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 181–183.

[2] Лесная О. Ю. Партийно-государственная политика в области музейного дела БССР в 1953–1964 гг. // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гум. навукі. Гісторыя. Філасофія. Філалогія. 2017. № 2 (50). С. 30–37.

Павышэнне ролі Саветаў у той час звязвалася з далейшым развіццём самадзейных арганізацый, якія, па тагачасных уяўленнях, дазвалялі працоўным прымаць удзел у дзяржаўных і грамадскіх справах, а гэта ў сваю чаргу павінна было спрыяць іх працоўнай дзейнасці.

У пастанове ЦК КПСС аб паляпшэнні дзейнасці Саветаў дэпутатаў працоўных і ўзмацненні іх сувязяў з масамі ад 22.01.1957 г. нагадвалася, што Саветы дэпутатаў працоўных з'яўляюцца вялікай заваёвай савецкага народа, але тут жа адзначалася, што ў іх практычнай дзейнасці маюцца буйныя недахопы, што многія Саветы не выконваюць сваю функцыю арганізатараў мас у гаспадарчым і культурным будаўніцтве, што многія Саветы абмяжоўваюцца абмеркаваннем дробных пытанняў бягучага характару, а іх выканкамы і кіраўнікі гаспадарчых арганізацый не робяць справаздачы перад Саветамі. Пастанова нацэльвала на ўздым ролі Саветаў шляхам рэалізацыі мер арганізацыйнага і практычнага характару, на выкараненне непатрэбнай апекі і ўмяшальніцтва партыйных органаў у дзейнасць Саветаў, але адначасова павышала ролю партыі за вынікі дзейнасці савецкіх органаў. Прызнавалася ненармальнай сітуацыя, калі ў папярэднія гады ў Саветы абіралася мала рабочых і калгаснікаў, а многія дэпутаты вылучаліся па службоваму прынцыпу[1]. XXI з'езд у 1959 г. канстатаваў узмацненне ролі Саветаў дэпутатаў працоўных і неабходнасць таго, каб Саветы ўсіх узроўняў штодзённа займаліся важнымі пытаннямі работы прамысловых мерапрыемстваў, будоўляў, калгасаў і саўгасаў[2].

Падобныя досыць рытуальныя адсылкі да ролі Саветаў дэпутатаў сустракаюцца і надалей. XXII з'езд КПСС у 1961 г. у рэзалюцыі па справаздачнаму дакладу сціслa нагадаў пра неабходнасць "яшчэ вышэй узняць ролю Саветаў", а вось у новай праграме на дзвюх старонках маляваў светлыя перспектывы павышэння ролі Саветаў у будучыні[3].

Нягледзячы на тое, што фармальна ўлада знаходзілася ў руках Саветаў, прадстаўнічыя органы савецкай улады мелі абмежаваную магчымасць кантролю і ўплыву на дзейнасць прамысловых прадпрыемстваў. Так, ім перадаваліся правы накіравання фінансавых сродкаў за кошт звышпланавых накапленняў прадпрыемстваў на жыллёвае будаўніцтва, камунальную гаспадарку, сацыяльную сферу. У мясцовых Саветах з'явіліся камісіі па народнай адукацыі, культурна-асветніцкай працы, ахове здароўя, сацыяльнаму забеспячэнню, жыллёваму будаўніцтву. Такім чынам, мясцовыя Саветы дэпутатаў атрымалі абмежаваную магчымасць інвеставання сродкаў найперш у мясцовую інфраструктуру.

---

[1] Постановление ЦК КПСС "Об улучшении деятельности Советов депутатов трудящихся и усилении их связей с массами". 22 января 1957 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 156–166.

[2]XXI съезд КПСС. 1959 г. Резолюции и постановления съезда Коммунистическая партия Советского Союза // Там жа. С. 320.

[3] XXII съезд КПСС. 1961 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 78, 159–160.

Органы савецкай улады атрымалі пэўную магчымасць кантролю і ўплыву на дзейнасць прамысловых прадпрыемстваў. Кантроль Саветаў над прадпрыемствамі, як правіла, абмяжоўваўся разглядам на сесіях ці ў камісіях Саветаў пытанняў умоў працы, бяспекі і прамысловай санітарыі, укладу прадпрыемстваў у добраўпарадкаванне тэрыторыі, стану захаванасці сацыялістычнай уласнасці на прадпрыемствах і г. д.

Красамоўна паказваюць тыповую працу Саветаў па кантролю над прадпрыемствамі даведкі і інфармацыі аб працы выканкамаў райсаветаў у 1964 г. Так, члены пастаяннай камісіі па камунальнай гаспадарцы Ленінскага райсавета г. Магілёва на працягу года праверылі ўсе прамысловыя прадпрыемствы раёна па пытанні добраўпарадкавання горада і працу некаторых з іх разгледзілі на пасяджэнні выканкама. Пастаянная камісія Савета па сацыяльнаму забеспячэнню ў гэтым жа годзе правярала стан уліку і ўвядзення працоўных кніжак на Ложкавым заводзе, заводзе "Элетрарухавік", абласной друкарні і вынесла пытанне на пасяджэнне выканкама раёна[1]. Пастаянная камісія па ахове здароўя Кастрычніцкага райсавета г. Магілёва правярала ўмовы працы, бяспекі і прамысловай санітарыі на заводзе Пад'ёмна-транспартнага абсталявання[2].

На сесіях Бабруйскага гарадскога Савета ў сакавіку 1964 г. абмяркоўвалі пытанне: "Аб стане аховы працы, тэхніцы бяспекі і медыцынскім абслугоўванні рабочых прамысловых прадпрыемстваў", а ў верасні: "Аб стане захаванасці сацыялістычнай уласнасці на прадпрыемствах, будаўнічых і гандлёвых арганізацыях горада"[3].

Органы савецкай улады разглядалі, хаця і радзей, пытанні, якія тычыліся эканамічных пытанняў развіцця вытворчасці. Яны мелі камісіі, якія спецыялізавана займаліся пытаннямі развіцця прамысловасці. Напрыклад, план працы пастаяннай камісіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных (10 склікання) па прамысловасці, транспарту і сувязі на 1965 г. прадугледжваў праверку якасці прадукцыі, якую выпускалі прадпрыемствы ўпраўлення бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці. Была запланавана праверка васьмі прадпрыемстваў вобласці па давядзенню якасці прадукцыі "да найлепшых айчынных і замежных узораў"[4].

Праблема была ў тым, што рычагі ўздзеяння на кадравы склад работнікаў і кіраўніцтва суб'ектаў гаспадарання знаходзіліся ў руках галіновага кіраўніцтва і ў руках партыйных органаў. Значна меншыя магчымасці ўплыву мелі мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Органы савецкай улады дэ факта былі адхілены ад вырашэння кадравых пытанняў. Так, у рашэннях Выканкама

---

[1] Справка о работе проделанной Исполкомом Райсовета, постоянными комисиями, нештатными отделами и общественными организациями Ленинского района города Могилева за 1964 год // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1009. Арк. 17-19.

[2] Справка о деятельности Окстябрьского районного Совета депутатов трцудящихся города Могилева за 1964 г. // Там жа. Арк. 29.

[3] Информация о проведении организационной работы Бобруйского Городского Совета депутатов трцудящихся и исполкома Горсовета за 1964 г. // Там жа. Арк. 38.

[4] Протоколы № 1 і № 2 заседаний постоянной комиссии Могилевского областного Совета депутатов трудящихся (10 созыва) по промышленности, транспорту и связи на 1965 год // Там жа. Спр. 1031. Арк. 19-24, 36.

Полацкага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных практычна няма рашэнняў па кадрах з сярэдзіны 1950 гг. да пачатку 1960 гг. Большасць пытанняў тычыліся адводу зямельных участкаў, гаспадарчых і бюджэтных пытанняў, сацыяльных пытанняў, у тым ліку апекі над дзецьмі, дапамогі інвалідам, матэрыяльнай дапамозе, лячэнню ад алкагалізму і г. д. З пачатку 1960 гг. павялічваецца колькасць пытанняў аб разглядзе лістоў, скаргаў і зваротаў грамадзян ("працоўных" у тэрміналогіі таго часу). Падобная сітуацыя склалася і ў іншых гарадскіх Саветах.

Яшчэ меншую магчымасць уплыву мелі мясцовыя Саветы на кадравы склад кіраўніцтва прадпрыемстваў. У іх не было непасрэдных рычагоў уздзеяння на кадравы склад работнікаў і кіраўніцтва суб'ектаў гаспадарання. Тым не менш, Саветы дэпутатаў працоўных мелі апасродкавыя магчымасці для ўплыву і на кадравую палітыку. Адбывалася гэта з дапамогай дэпутатаў мясцовых Саветаў, якія нярэдка самі былі дастаткова ўплывовымі чыноўнікамі ў партыйных органах або мелі мажлівасць уплываць на фарміраванне іміджу кіраўнікоў прадпрыемстваў.

Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў працоўных 19.03.1965 г. прыняў рашэнне аб утварэнні 15 пастаянных камісій. Сярод іх была камісія па прамысловасці, транспарту і сувязі, якую ўзначальваў В.П. Панкоў – "па сумяшчальніцтву" загадчык аддзела прамысловасці і транспарту абкама КПБ. У камісію ўваходзілі яшчэ восем дeпутатаў: майстар змены Быхаўскага кансервавага і для сушкі агародніны камбіната, майстар Магілёўскай фабрыкі "Індпашыву адзення", дырэктар Магілёўскага завода "Электрарухавік", старшыня Ленінскага райвыканкама г. Магілёва, начальнік Асіповіцкага паравознага дэпо, рольшчыца Шклоўскай папяровай фабрыцы "Спартак", якая прадстаўляла адначасова рабочых і жанчын, машыніст Крычаўскага цэментна-шыфернага камбіната, галоўны інжынер Бабруйскага машынабудаўнічага завода імя Леніна. Склад камісіі быў тыповым для таго часу. У ім сімвалічна былі прадстаўлены ўсе пласты работнікаў прамысловых прадпрыемстваў: рабочыя і жанчыны, спецыялісты сярэдняга звяна, інжынеры, а галоўную ролю ігралі партыйныя і савецкія чыноўнікі, кіраўнікі прадпрыемстваў[1].

У Магілёўскім гарадскім Савеце пятага скліканняў 1955 г. з 275 дэпутатаў было 90 рабочых, а ў 1957 г. – ужо 104. У 1957 г. 45 дэпутатаў (16 %) з'яўляліся работнікамі прамысловасці і транспарту. Пастаянную камісію гарсавета па прамысловасці і транспарту ў 1955–1963 гг. узначальваў работнік магілёўскай чыгункі В. Сямёнаў, а ў 1963–1965 гг. – дырэктар Магілёўскай стужкаткацкай фабрыкі Б. Шчамякін. У павестцы пасяджэнняў камісіі былі пераважна вытворчыя пытанні, праблемы ўкаранення новай тэхнікі. Нярэдка пасяджэнні праходзілі на прамысловых прадпрыемствах[2].

---

[1] Решение № 5 Могилевского областного Совета депутатов трудящихся от 19 марта 1965 г. Об образовании постоянных комиссий Могилевского областного Совета депутатов трудящихся // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1031. Арк. 2-4.

[2] Рыськов М. А. История Могилевского городского Совета депутатов (1917–2014 гг.) : к 100-летию со дня образования. Могилев, 2014. С. 106–110.

У маі 1963 г. у Магілёве па ініцыятыве пастаяннай камісіі гарсавета па прамысловасці і транспарту прайшоў месячнік здароўя. У ходзе акцыі ачышчаліся ад хламу завадскія тэрыторыі, мыліся аконныя праёмы, паляпшалася асвятленне, абсталёўваліся пакоі адпачынку, месцы для курэння і г. д.[1]

**Аксіялагічны фактар.** Атмасфера пасляваеннага беларускага грамадства фарміравалася не толькі поспехамі ў аднаўленні народнай гаспадаркі, энтузіязмам перамогі, але і ўсеагульным страхам, знявагай да чалавечай асобы, беззаконнасцю, дагматызацыяй грамадскай думкі. Магчымасць аўтарытарнага вырашэння любых пытанняў нараджала адчуванне безадказнасці ў адных і пасіўнасць у другіх, стрымлівала ініцыятыву працоўных. Быў працягнуты курс на нарошчванне эканамічнай магутнасці дзяржавы і яе ваеннга патэнцыялу, замаскіраваны пад пабудову камуністычнага грамадства. Каркасам гэтага курсу з'яўлялася грамадска-палітычная сістэма сталінізму.

Беларуская савецкая гістарыяграфія слушна падкрэслівала гераічны аспект пасляваеннага гаспадарчага аднаўлення[2]. Калі да вайны галоўнай крыніцай эканамічнага росту было прыцягненне ў вытворчасць новых мас людзей, дык пасля таго, як рэспубліка згубіла найбольш працаздольных і таленавітых грамадзян, трэба было шукаць новыя шляхі ўзмацнення эканамічнага патэнцыялу. Гісторыя мае нямала прыкладаў, якія сведчаць аб высокай арганізацыі і працоўным энтузіязме ў калектывах БССР у перыяд рэканструкцыі сваіх прадпрыемстваў.

Аднак у пасляваенны час у савецкім грамадстве назіраўся працэс вяртання да старых, даваенных каштоўнасцяў. Да "спадчыны" 1930-х гг. вайна дадала яшчэ шэраг пунктаў, якія былі зачэпкай да праследавання грамадзян з боку ўлад, абмежавання іх правоў і магчымасцей. Першымі сярод падазроных сталі тыя, хто пабываў у нямецкім палоне альбо пражываў на акупаванай тэрыторыі, а такіх налічвалася мільёны. Сваякі, якія апынуліся ў акупацыі, таксама сталі крыніцай праблем для многіх, асабліва для тых, хто меў перспектывы прасоўвання па службовай лесвіцы ці ўжо займаў высокае месца ў савецкай іерархіі. Нягледзячы на тое, што пасля вайны рэпрэсіі не афішаваліся, спецправеркі, якія праводзіліся міністэрствам дзяржаўнай бяспекі СССР на працягу доўгага часу, часта прыводзілі да пераследу, асабістых трагедый і буйных непрыемнасцяў[3].

Сярод актуальных праблем аднаўлення і развіцця прамысловасці БССР важнае месца займалі пытанні павышэння працоўнай актыўнасці народа ў спалучэнні са стымуламі асабістай і калектыўнай зацікаўленасці. Сацыялістычнае спаборніцтва працоўных калектываў уяўлялася эфектыўным метадам уздыму прадукцыйных сіл і ўдасканалення вытворчых адносін. Яго арганізацыі надавалася вялікая значэнне і ўвага.

[1] Рыськов М. А. История Могилевского городского Совета депутатов (1917–2014 гг.). С. 110.
[2] Марченко И. Е. Трудовой подвиг рабочего класса Белорусской ССР (1943–1950). Минск, 1977.
[3] Гужалоўскі А. А. «…Міласці Вашай просім», альбо Адзін год у навейшай гісторыі Беларусі, адлюстраваны ў лістах, заявах, скаргах і іншых формах звароту грамадзян. Зборнік дакументаў. Мінск, 2006. С. 4–5.

Ад самага пачатку аднаўлення народнай гаспадаркі меліся факты “скажэння сацыялістычнага спаборніцтва і шкоднай штурмаўшчыны”[1]. Да такога вычварэння, як на шахтах Кузбаса, дзе ў 1947–1948 гг. рабочых прымушалі падпісваць клятвенную прысягу прыняцця на сябе павышаных абавязацельстваў па звышпланавай здабычы вугалю, парушалі прынцып добраахвотнасці, а потым разгарнулі барацьбу з “клятвазлачынцамі”[2], на прадпрыемствах БССР не дайшло. Тым не менш, фармалізм і паказуха на прамысловых прадпрыемствах БССР пры арганізацыі сацспаборніцтва былі паўсюднай і нават звыклай з’явай як у першыя пасляваенныя, так і ў наступныя дзесяцігоддзі.

Улады і надалей спрабавалі павышаць ролю сацыялістычнага спаборніцтва, руху рацыяналізатараў і вынаходнікаў у вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач. Так, да канца 1951 г. сацыялістычным спаборніцтвам было ахоплена ўжо каля 95 % рабочых і служачых БССР[3]. Ліквідацыі недахопаў і большай сістэмнасці ў арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва паспрыяла спецыяльная Пастанова ЦК УсеКП(б) “Аб сацыялістычным спаборніцтве ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы” ад 04.01.1952 г. У ёй была падкрэслена яго важнасць для мабілізацыі працоўных, але адзначаны істотныя недахопы – накіраванасць на колькасныя, а не якасныя паказчыкі, фармалізм пры падвядзенні вынікаў і г. д. Было прапанавана ў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, хімічнай і лесанарыхтоўчай галоўным накірункам спаборніцтва разглядаць прадукцыйнасць кожнага агрэгата і сабекошт прадукцыі, а ў машынабудаванні, лёгкай і харчовай – павелічэнне выпуску прадукцыі высокай якасці, зніжэнне сабекошту, забеспячэнне рытмічнай працы прадпрыемстваў і г. д.[4] Пастанова на гады вызначала прынцыпы і схему арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на вытворчасці.

У гады 5-й пяцігодкі (1951–1955) у СССР назіраецца паскоранае разгортванне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. У БССР, як і ў папярэдняй пяцігодцы, апераджальнымі тэмпамі вялося развіццё тых галін прамысловасці, якія забяспечвалі ў найбольшай меры навукова-тэхнічны прагрэс усёй народнай гаспадаркі: машынабудавання, металаапрацоўкі, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Адбываецца значнае ўдасканаленне тэхнікі і тэхналогіі, механізуецца вытворчасць. У асобных галінах пачынае выкарыстоўвацца аўтаматыка.

Сярод працоўных у 1950-х гг. пад націскам органаў кіравання набіраў сілу рух за высокую культуру вытворчасці, выпуск прадукцыі выдатнай якасці і зніжэнне браку. Пачалося спаборніцтва за ганаровае званне прадпрыемства

---

[1] Постановление ЦК ВКП(б) “О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Донбаса”. 28.02.1948 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 169.

[2] Постановление ЦК ВКП(б) “О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Кузбаса”. 06.03.1948 г. // Там жа. С. 172.

[3] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 306.

[4] Постановление ЦК ВКП(б) “О социалистическом соревновании в промышленности и сельском хозяйстве”. 04.01.1952 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 250–254.

выдатнай якасці прадукцыі. Актывізаваўся і пашырыўся ўдзел працоўных у руху наватараў вытворчасці, рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Толькі за 1952–1953 гг. рабочыя, ІТР прамысловасці, транспарту і будаўнічых арганізацый рэспублікі ўнеслі 38 тыс. рацыяналізатарскіх прапаноў. Большасць з іх была ўкаранёна ў вытворчасць, што дало больш за 90 млн руб. эканоміі. Добры прыклад масавай тэхнічнай творчасці паказвалі калектывы станкабудаўнічых заводаў Віцебска. Напрыклад, на заводзе імя Камінтэрна за 1951–1954 гг. была пададзена 431 рацыяналізатарская прапанова, ад укаранёнай 191 прапановы было атрымана 330,5 тыс. руб. эканоміі[1].

Найбольш маштабнай спробай стымуляваць працоўную актыўнасць работнікаў прамысловасці з'явілася рэформа па ўпарадкаванню нармавання і аплаты працы, рашэнне аб правядзенні якой было прынята ў 1956 г. Планавалася ажыццявіць перавод работнікаў на пагадзінную аплату працы і падняць ролю прэміравання за перавыкананне планавых заданняў. Аднак спробы ўвесці эканамічныя метады стымулявання працы ва ўмовах цэнтралізаванага кіравання ўсімі эканамічнымі працэсамі ў форме дырэктыўнага планавання не атрымалі шырокага распаўсюджвання ў перыяд[2], які разглядаецца. Менавіта ў гэты час набірае сілу фармалізм, шырока практыкуюцца прыпіскі. Галоўным становіцца не сам рух і яго выніковасць, а справаздачы партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых органаў перад вышэйшымі інстанцыямі. З цягам часу гэта выхаласціла саму сутнасць спаборніцтва і прывяло ў канчатковым выніку да яго фармалізацыі.

Самадзейныя арганізацыі на вытворчасці па тагачасных уяўленнях дазвалялі працоўным прымаць удзел у дзяржаўных і грамадскіх справах. Павышэнне ролі Саветаў у той час непарыўна звязвалася з далейшым развіццём самадзейных арганізацый. Невыпадкова сярэдзіна 1950 гг. характарызавалася не толькі спробай кіраўніцтва СССР трансфармаваць палітычную сістэму, якая дасталася ў спадчыну ад сталінскай эпохі, але і трансфармацыяй сацыякультурных фактараў, якія стымулявалі або тармазілі развіццё прамысловасці рэспублікі. Курс на пабудову камуністычнага грамадства ў СССР, непасрэдны этап будаўніцтва якога быў абвешчаны на XXII з’ездзе КПСС (1961) у якасці афіцыйнай праграмы партыі да 1980 г., прадугледжваў развіццё “сапраўднай дэмакратыі”, у тым ліку і ў вытворчай сферы, дзе ствараліся шматлікія грамадскія арганізацыі.

Адной з самых масавых форм далучэння работнікаў да кіравання вытворчасцю ў 1950–1960-я гг. лічыліся вытворчыя нарады. Паралельна ствараліся грамадскія канструктарскія бюро, грамадскія бюро эканамічнага аналізу, саветы наватараў, грамадскія аддзелы і інстытуты, творчыя комплексныя брыгады, групы грамадскіх інспектараў і г. д. Час узнікнення большасці з іх – канец 1950 – першая палова 1960 гг. Большасць падобных арганізацый імітавала дзейнасць, у якой адсутнічала сапраўдная самадзейнасць і самарэгуляцыя.

[1] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 310–314.
[2] Сасим А. М. Промышленность Беларуси в условиях реформирования и стагнации (1953–1985 гг.). С. 52–55.

Для паспяховага развіцця прамысловасці неабходна наяўнасць у работнікаў адпаведнай працоўнай этыкі. Адсутнасць устойлівай гарадской працоўнай этыкі з’яўлялася праблемай у аграрных грамадствах, якія станавіліся на шлях індустрыялізацыі. Існавала такая праблема і ў СССР. Яе ўзмацняла тое, што большасць работнікаў беларускіх прамысловых прадпрыемстваў былі гараджанамі ў першым-другім пакаленнях. Выхадцы з вёскі былі выдатна адаптаваны да жыцця ў вёсцы, але завадскія парадкі і гарадскі рытм жыцця былі зусім іншымі. У гарадскіх умовах вяскоўцы часцяком губляліся, не былі прыстасаваны да зусім іншага ладу жыцця, не ведалі, як арганізаваць свой побыт, вольны час, схіляліся да featureзнага роду правапарушэнняў, парушалі працоўную двсцыпліну і г. д.

Прычыны гэтых праблем партыйныя органы як заўжды бачылі ў тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі “слаба праводзяць работу па выхаванню новых кадраў рабочых, якія прыйшлі на работу ў прамысловасць, у духе сацыялістычных адносін да працы і грамадскай уласнасці”, а выйсце бачылі ў прыняцці рашэння пра ўзмацненне масава-палітычнай работы[1].

У дадатак да праблем адаптацыі новых кадраў прамысловасці ўжо ў другой палове 1950 гг. з-за хуткай інтэнсіўнай індустрыялізацыі і ўрбанізацыі назіраліся першыя прыкметы недахопу рабочых кадраў нават невысокай кваліфікацыі. Аслабленне сталінскай рэпрэсіўнай машыны таксама выклікала аслабленне дысцыпліны і нават спрыяла адтоку работнікаў са сферы калектыўнай вытворчасці. Да таго ж, у адпаведнасці з камуністычнай ідэалогіяй, якая панавала ў грамадстве, працаздольныя грамадзяне, якія не жадалі выконваць свой канстытуцыйны абавязак – сумленна працаваць, якія ўхіляліся ад грамадска карыснай працы, вялі па тэрміналогіі таго часу “паразітычны лад жыцця”. Савецкая сістэмы абароны правоў працоўных не ўлічвала індывідуальных патрэб чалавека, разглядала работніка вінтыкам працоўнага калектыву і вялізнай дзяржаўнай машыны, часцей за ўсё не станавілася на яго бок у выпадку канфліктнай сітуацыі і ставіла яго інтарэсы ніжэй за патрэбы органаў кіравання, якія прыкрываліся інтарэсамі калектыву і савецкага грамадства.

**Дэмаграфічная сітуацыя.** У першыя пасляваенныя гады працэсы індустрыялізацыі і ўрбанізацыі БССР у значнай ступені фарміраваліся пад уплывам Вялікай Айчыннай вайны, дэмаграфічныя вынікі якой для рэспублікі былі выключна цяжкімі.

Колькасць насельніцтва рэзка скарацілася. У гады вайны рэспубліка страціла кожнага трэцяга (кожнага чацвёртага па іншых падліках) жыхара. Вайна аслабіла адну з галоўных крыніц нарошчвання аб’ёмаў вытворчасці ў сферы прамысловасці – мужчынскую працоўную сілу. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тысячы беларускіх жанчын прыйшлі на прадпрыемствы і ў будаўніцтва. На многіх прадпрыемствах жанчыны, якія атрымалі належную прафесійную падрыхтоўку, выконвалі

[1] Постановление ЦК КП(б)Б “О недостатках в деле организации промышленного производства и о мерах по их устранению”. 7-12.07.1945 г. // Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов, и пленумов ЦК. Т. 4. С. 30–39.

складаную высокакваліфікаваную працу. Менавіта таму склад працоўных БССР характарызаваўся даволі высокай удзельнай вагай жанчын. Аднак у наступныя гады іх удзельная вага некалькі знізілася. Такое становішча тлумачылася галоўным чынам вялікім прытокам на вытворчасць мужчын з Савецкай Арміі, а таксама памяншэннем колькасці жанчын у тых галінах прамысловасці, для якіх уласцівая мужчынская праца.

Аднаўленне прамысловасці суправаджалася прыцягваннем у вытворчасць новых работнікаў, пераважна з ліку моладзі і аграрнага сектару. За 1947–1951 гг. павялічылася колькасць рабочых і служачых сярэдняга, найбольш прадукцыйнага ў працы ўзросту – ад 26 да 35 гадоў: у цэлым па народнай гаспадарцы БССР на 3,9 % (з 26,3 да 30,2 %), у тым ліку ў прамысловасці на 3,5 % (з 22,3 да 25,8 %) і ў будаўніцтве на 3 % (з 21,4 да 24,4 %). За гэтыя гады значна павялічылася ўдзельная вага маладых рабочых ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў, што тлумачылася ўсё той жа прычынай – масавым прытокам на прадпрыемствы моладзі ў сувязі з вялікімі маштабамі будаўніча-аднаўленчых работ у рэспубліцы. За 1947–1951 гг. гэтая катэгорыя работнікаў у прамысловасці БССР узрасла з 33,2 да 41 %[1].

У 1950 гг. сярод працоўных і служачых БССР прыкметна ўзрасла ўдзельная вага кадраў, якія доўгі час працавалі на адным і тым жа прадпрыемстве. У прамысловасці доля рабочых і служачых з бесперапынным вытворчым стажам звыш 4 гадоў павялічылася з 19,2 % у 1950 г. да 45 % у 1957 г., у тым ліку са стажам больш за 5 гадоў – з 11,5 % да 36 %. У 1957 г. 33 % рабочых і служачых прамысловасці мелі вытворчы стаж да 2 гадоў.

Колькасныя і якасныя змены істотна закранулі ўзроставую структуру кадраў. У гады, якія разглядаюцца, у прамысловасці практычна знікла катэгорыя падлеткаў ва ўзросце да 16 гадоў і рэзка скарацілася колькасць рабочых і служачых ва ўзросце 16–17 гадоў – з 3,3 % у 1951 г. да 1 % у 1957 г. Адну з найбольш значных груп складалі рабочыя і служачыя ва ўзросце 18–25 гадоў, але іх удзельная вага таксама некалькі знізілася. Па дадзеных на 1957 г. у прамысловасці яны складалі 29 %. Самай буйной узроставай групай сталі рабочыя і служачыя ад 26 да 35 гадоў. Іх удзельная вага ўзрасла з 24 % у 1950 г. да 39 % у 1957 г[2].

У сувязі з працэсам амаладжэння рабочага класа БССР у яго складзе некалькі знізілася ўдзельная вага рабочых і служачых ва ўзросце звыш 36 гадоў. У 1957 г. яны складалі 31 %. У асноўным гэта былі стабільныя працоўныя кадры, якім належала важная роля ў вытворчай падрыхтоўцы моладзі, паспяховым выкананні пяцігадовых планаў і сацыялістычным спаборніцтве. Такім чынам, у гістарычны перыяд, які разглядаецца, кадравы патэнцыял прамысловасці папаўняўся вялікай колькасцю моладзі. Асабліва рэльефна гэтая тэндэнцыя назіралася на буйных прамысловых навабудоўлях, дзе пераважную частку рабочых кадраў складала моладзь.

[1] Марченко И. Е. Рабочий класс БССР в послевоенные годы (1945–1950). С. 147-148.
[2] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 361–362.

Аднавілася насельніцтва Беларусі толькі ў 1970-х гг. За гэты час у рэспубліцы адбыўся хуткі рост гарадоў і гарадскога насельніцтва, які выклікаў пэўны дысбаланс у грамадстве ў самых розных сферах. За 1950–1990 гг. удзельная вага гарадскога насельніцтва БССР павялічылася з 21 % да 66 % – вырасла больш чым у тры разы (гл. табл. 11). Такі хуткі рост гарадскога насельніцтва выклікаў многа праблем, многія выявіліся адразу, а іншыя - у наступныя дзесяцігоддзі.

Табліца 11 – Дынаміка колькасці насельніцтва БССР[1]

| Дата | Усё насельніцтва (тыс. чал.) | У % да ўсяго насельніцтва | |
|---|---|---|---|
| | | гарадское | вясковае |
| 1950 г. – ацэнка | 7 709 | 21 | 79 |
| 1959 г – па перапісу | 8 056 | 31 | 66 |
| 1970 г. – па перапісу | 9 002 | 43 | 57 |
| 1980 г. – ацэнка | 9 591 | 56 | 44 |
| 1990 г. – ацэнка | 10 189 | 66 | 34 |

Дэмаграфічныя змены характарызаваліся хуткім ростам гарадоў і гарадскога насельніцтва, які выклікаў пэўны дысбаланс у грамадстве ў самых розных сферах. Гарады раслі за кошт росту рабочага класа і служачых, значная частка з якіх працавала ў прамысловасці і на транспарце. Доля рабочых сярод усяго занятага насельніцтва за 1960–1985 гг. павялічылася з 45 % да 60 %, служачых – з 14,6 % да 25,4 %. У той жа час удзельная вага калгаснікаў зменшылася за гэты перыяд з 40,4 % да 14,6 %. Адначасова расло грамадскае значэнне і магчымасці партыйна-дзяржаўнай наменклатуры, якая на думку многіх заходніх даследчыкаў, стала ў СССР асобным класам кіраўніцтва, уплываць на развіццё грамадства ўвогуле і прамысловасці ў прыватнасці.

**Сацыякультурныя фактары.** Ужо напрыканцы 1940 – пачатку 1950-х гг. у беларускіх гарадах рабіліся першыя крокі па наладжванні мірнага жыцця. Быў узноўлены 8-гадзінны працоўны дзень, адменены абавязковыя звышурочныя работы, рабочыя і служачыя зноў атрымалі штогадовы аплачваемы адпачынак, наладжваў работу транспарт. Тым не менш, матэрыяльнае становішча большасці людзей было крайне бядотным.

Умовы працы на прадпрыемствах заставаліся цяжкімі. Так, удзельная вага ручной працы ў прамысловасці Беларусі складала 60–70 %[2]. Ахова працы рабочых, па дадзеных праверак, што праводзіліся партыйнымі органамі на прадпрыемствах Мінска, Віцебска, Магілёва і іншых гарадоў рэспублікі, знаходзілася у незадавальняючым стане. У справаздачах правяраючых у прыватнасці ўказвалася, што на многіх заводах адсутнічае пітная вада, спецадзенне не выдаецца, частка рабочых працуе басанож. Поспехам у

[1] Табліца складзена па: Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г.: стат. ежегод. С. 11; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. Стат. ежегод. С. 7; Беларуская энцыклапедыя : У 18 т. Т. 18. Кн. 2.Мінск, 2004. С. 92–93.

[2] Шыбека З. В. Нарыс гісторыі Беларусі, 1795–2002. Мінск, 2003. С. 351.

аднаўленні і развіцці савецкай індустрыі спрыялі не толькі самаадданая праца людзей і "эканомія" на іх жыццёвым узроўні, але і пазаэканамічны прымус працы, які ўсё больш пашыраўся. Працягвала дзейнічаць судовая адказнасць рабочых за прагулы, якую сталінскі ўрад скасаваў толькі ў 1951 г.[1]

Шырокія абагульненні аб узроўні жыцця розных груп савецкага грамадства пасляваеннага часу рабіць складана. Невялікая кватрплата, бясплатная медыцына і адукацыя дазвалялі жыць на мяжы неабходнага. Для большасці людзей падобнае становішча было звыклым – яшчэ не сцерліся з памяці ўспаміны пра ваенны час і голад 1946–1947 гг. Так, адразу пасля вайны афіцыйная сума неабкладаемых падаткамі прыбыткаў была ўзнята з 150 да 280 руб. у месяц, што можа даць уяўленне пра мінімальныя заробкі. Студэнцкая стыпендыя складала 280 руб., сталінская стыпендыя – 400 руб., аспірантам плацілі 800 руб. Ёсць звесткі, што заробкі рабочых у 200–300 руб. у месяц выклікалі рэзкае незадавальненне. Старшыні сельсавета плацілі 200 руб. Міністр дзяржбяспекі СССР В. Абакумаў атрымліваў у месяц 25 тыс. руб[2].

Вялікай праблемай пасляваеннага часу стала маргіналізацыя гараджан. Прычынамі гэтай з'явы былі праблемы дэмабілізацыі, працаўладкавання, пенсійнага забеспячэння. Гарадскім уладам трэба было клапаціцца, каб многія людзі знайшлі сябе ва ўмовах мірнага часу. Гэта было няпроста, нягледзячы на тое, што ў сувязі з гіганцкімі чалавечымі стратамі востра паўстала пытанне недахопу працоўных рэсурсаў. Мільёны франтавікоў, эвукуіраваных, перамешчаных асоб, былых палонных, сваякоў, якія шукалі адзін аднаго, не адразу перайшлі на аселы лад жыцця. Амаль кожнаму давялося жыць на картკі альбо пайкі. Жабракі, бяздомныя, сіроты, калекі напаўнялі гарады, чыгуначныя станцыі, рынкі ў пошуках міласціны альбо аб'екта крадзяжу як галоўнай крыніцы харчавання.

Падобная маргіналізацыя грамадзян, дапоўненая пакутамі і звычкай да гвалту і смерці, рабіла дэвіянтныя паводзіны паўсядзённасцю. Злачыннасць у пасляваенны перыяд ахапіла ўвесь СССР і найперш былыя акупаваныя тэрыторыі. Адной з галоўных яе прычын была беднасць. Для набыцця самага неабходнага – ежы, адзення і г. д. людзі ішлі на крадзеж, рабаўніцтва і нават на забойства. Бандытызм і злачыннасць, нягледзячы на меры па барацьбе з імі, заставаліся шырока распаўсюджанай з'явай у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

У такіх абставінах кіраўніцтва краіны ўзмацніла карныя функцыі дзяржавы. Указы Прэзідыума ВС СССР ад 04.06.1947 г. "Аб крымінальнай адказнасці за крадзеж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці" і "Аб узмацненні аховы асабістай уласнасці грамадзян" пераўзышлі па сваёй жорсткасці Закон ад 07.08.1932 г., празваны ў народзе "законам аб пяці каласках". У адпаведнасці з указамі 1947 г. мінімальны тэрмін за крадзеж, прысваенне альбо растрату дзяржаўнай маёмасці складаў ад 7 да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў, а за паўторнае альбо здзейсненае ў групе падобнае злачынства – да 25 г. з

[1] Шыбека З. В. Нарыс гісторыі Беларусі, 1795–2002. С. 351.
[2] Костюкевич В. Ф., Романовский Н. В. Грани позднего сталинизма (1945–1953 гг.). Мурманск, 1994. С. 40.

канфіскацыяй маёмасці. Паводле сакрэтнага распараджэння Савета Міністраў СССР, дзеянне ўказаў ад 04.06.1947 г. было распаўсюджана і на дробныя крадзяжы на вытворчасці, у выніку чаго рабочыя, калгаснікі, служачыя асуджаліся за дробны крадзеж не да аднаго года пазбаўлення волі, як гэта было раней, а да 7–10 гг. Указам Вярхоўнага Савета СССР ад 23.07.1951 г. "За ўхіленне ад грамадска карыснай працы і за вядзенне паразітычнага ладу жыцця" ўводзілася крымінальная адказнасць[1].

У сярэдзіне 1950 гг. былі адменены многія рэпрэсіўныя пастановы. За прагулы без уважлівых прычын цяпер былі прадугледжаны меры дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння. Мерапрыемствы партыйных і дзяржаўных органаў былі накіраваны на тое, каб зменшыць прагназаваны ўсплёск цякучасці кадраў і пагаршэнне працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах. Тым не менш, цалкам прадухіліць рост цякучасці кадраў і парушэнняў працоўнай дысцыпліны не ўдалося. Толькі цягам наступнага дзесяцігоддзя сітуацыя паступова пачала стабілізавацца. Цякучасць кадраў і надалей заставалася адной з істотных іх характарыстык і адначасова важнай з'явай, якая ўплывала на кадравы патэнцыял прамысловасці.

Жыллёвая праблема заставалася адной з самых вострых сацыяльных праблем у гарадах. Пад кантролем было перасяленне людзей з зямлянак і падвалаў. Праз два гады пасля вайны на 01.12.1946 г. афіцыйна ў зямлянках усё яшчэ пражывала 27 тыс. і на падсяленні 33 тыс. сям'яў калгаснікаў[2]. Агульны лік падобных жыльцоў складаў не менш за 300 тыс. чалавек. Да іх трэба дадаць работнікаў прамысловых прадпрыемстваў у сельскай мясцовасці. Вялізная маса гараджан таксама пражывала ў нездавальняючых умовах – прыстасаваных памяшканнях і падвалах. Трэба адзначыць, што падобная сітуацыя хаця і не ўспрымалася як норма, то спісвалася на цяжкасці перыяду. Так, на шахтах Кузбаса, дзе не было разбурэнняў у гады вайны, частка насельніцтва таксама жыла ў зямлянках і не прыстасаваных для жылля памяшканнях, у інтэрнатах было халодна, брудна, не было свету і вады[3]. Пра вырашэнне праблемы пражывання ў зямлянках у БССР было адрапартавана ў сярэдзіне 1950 гг. Але насамрэч факты пражывання ў зямлянках сустракаюцца і надалей. Аднак цяпер яны былі хутчэй выключэннем, чым правілам.

Меры па паляпшэнні жыллёвых умоў насельніцтва давалі пэўныя вынікі. Толькі за пяць пасляваенных гадоў у гарадах і гарадскіх пасёлках БССР былі пабудаваны жылыя дамы агульнай плошчай 4,3 млн кв. м. Амаль нанова была адбудавана сталіца БССР. Узнаўляліся іншыя гарады рэспублікі. У выніку, многія спецыялісты і ІТР, якім вылучаліся кватэры ў першую чаргу, перасяліліся ў добраўпарадкаваныя дамы, карэнным чынам палепшылі свае жыллёва-бытавыя ўмовы. Усё гэта спрыяла замацаванню рабочых і

[1] Сборник законов СССР и Указов Президиума Верховного Совета СССР (1938 – июль 1956 гг.). М., 1956. С. 398.
[2] Постановление ЦК ВКП(б) "О работе ЦК КП(б) Белоруссии". 25.01.1947 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 82.
[3] Постановление ЦК ВКП(б) "О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Кузбаса". 06.03.1948 г. // Там жа. С. 173–174.

інжынерных кадраў на вытворчасці. Аднак для вялікай колькасці рабочых жыллёвае пытанне заставалася вострым. Патрэба ў жыллі была асабліва вялікай у гарадах, насельніцтва якіх хутка павялічвалася ў сувязі з прамысловым будаўніцтвам[1]. Праграма буйнапанэльнага будаўніцтва вялікіх мікраараёнаў, рэалізацыя якой на ўсходзе Беларусі пачала здзяйсняцца ў 1960 гг., бачылася выйсцем з жыллёвага крызісу, і насамрэч дапамагла тысячам сем'яў палепшыць свае жыллёвыя ўмовы. Хаця будаўніцтва так званых "хрушчовак" не вырашыла праблему цалкам, але перавяла яе ў іншую якасць.

Гарадскія работнікі з'яўляліся другой па колькасці, пасля калгаснікаў, групай насельніцтва. Невялікі слой узорных работнікаў (стаханаўцаў, перадавікоў і актывістаў), а таксама работнікі стратэгічных галін прамысловасці прыкметна адрозніваліся ўзроўнем жыцця ад асноўнай масы працоўных. Вялікую і няпростую па свайму складу групу ўтваралі служачыя. Яна складалася з многіх падгруп з розным доступам да тавараў і паслуг, якія па-рознаму аплочваліся і якімі па-рознаму кіравалі. Многія з гэтых людзей амаль не адрозніваліся ад простых рабочых, але некаторыя належалі да субэліт па доступу да ўлады і матэрыяльных выгод.

Для развіцця прамысловасці патрэбны былі кваліфікаваныя кадры. Сярод насельніцтва БССР на працягу ўсяго перыяду даследавання, як бачна з ніжэй прыведзенай табліцы, узрастала доля кваліфікаваных і адукаваных работнікаў. У 1958 г. была ўведзена абавязковая васьмігадовая адукацыя, ствараліся прафэсійна-тэхнічныя вучылішчы, да 99 % павялічылася колькасць пісьменнага насельніцтва.

Табліца 12 – Узровень адукацыі гарадскога і вясковага насельніцтва БССР па дадзеных перапісу насельніцтва[2]

| Дата | На 1 000 чал. прыходзіцца асоб з адукацыяй | | |
|---|---|---|---|
| | вышэйшай і сярэдняй (поўнай і няпоўнай) | У тым ліку | |
| | | з вышэйшай | з сярэдняй (поўнай і няпоўнай) |
| 1959 г. | 304 | 15 | 289 |
| 1970 г. | 440 | 35 | 405 |
| 1979 г. | 594 | 63 | 531 |

За 20 гадоў колькасць асоб з вышэйшай і сярэдняй (поўнай і няпоўнай) адукацыяй з разліку на 1 000 чал. насельніцтва вырасла амаль у два разы. Пры гэтым колькасць асоб з вышэйшай адукацыяй вырасла больш чым у 4 разы з 15 да 63 чалавек. Колькасць асоб з сярэдняй (поўнай і няпоўнай) адукацыяй вырасла больш чым у 1,8 разы з 289 да 531 чалавека на 1 000 чал. Гэта стала

[1] История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. С. 277.
[2] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. Стат. ежегод. С. 10.

пазітыўным спрыяльным фактарам для развіцця самых передавых галін прамысловасці Беларусі, спрыяла набору кваліфікаваных работнікаў.

Па рэгіёнах сітуацыя не была аднолькавай. Самай адукаванай была сталіца БССР, якая ў 1959 г. у два разы апераджала сярэднерэспубліканскі ўзровень адукаванасці, а ў 1970-м – у 1,7 раза. Сярод абласцей найвышэйшы ўзровень адукацыі назіраўся ў Магілёўскай вобласці. Ён адпавядаў сярэднебеларускаму ці ў іншыя гады нязначна перавышаў яго. Надалей ішлі Віцебская і Гомельская вобласці. Даволі істотна адставалі Брэсцкая і Гродзенская вобласці, у якіх да 1939 г. структура адукацыі было зусім іншай[1].

Сярод сацыякультурных інстытутаў, якія стымулявалі развіццё прамысловасці, важнае значэнне як для павышэння агульнатэхнічага ўзроўню спецыялістаў і кіраўнікоў, для правядзення прыкладных навуковых распрацовак, так і для сістэмы павышэння кваліфікацыі работнікаў прамысловасці мела пастанова СМ СССР ад 29.11.1966 г. "Аб агульнадзяржаўнай сістэме навукова-тэхнічнай інфармацыі". Яе рэалізацыя таксама не ішла лёгка. Тэрміны распрацоўкі адпаведных пастаноў на рэспублікаскім узроўні зацягваліся, не ішлі гладка ўзгадненні з саюзнымі органамі[2]. Тым не менш, да канца 1960-х гг сістэма запрацавала, а ў наступныя дзясяцігоддзі была адладжана.

**Навукова-тэхнічныя і вытворчыя фактары, эканамічная кан'юнктура, рацыяналізацыя і вынаходніцтвы.** Навукова-тэхнічныя і вытворчыя фактары, эканамічная кан'юнктура моцна ўплывалі на структуру кадраў у прамысловасці. Ва ўмовах пачатай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі перад эканомікай увогуле, і перад прамысловасцю ў прыватнасці, востра стаялі пытанні ўнядрэння новай тэхнікі і тэхналогій. Кіраўніцтва краіны шмат увагі ўдзяляла развіццю навуковых даследаванняў, а на канкрэтных прадпрыемствах – руху рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Лічылася, што не толькі навукоўцы і спецыялісты навукова-даследчых інстытутаў, але і простыя работнікі – рабочыя, калгаснікі, інжынеры і служачыя прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў здольныя ўнесці значны ўклад у паскарэнне тэмпаў навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы краіны.

У пасляваенны час з'яўляецца мноства працоўных ініцыятыў і рухаў, накіраваных на пераадоленне цяжкасцяў у развіцці эканомікі, якія ішлі знізу, ад саміх працоўных. Так, токар завода імя "Камінтэрна" Пасанаў выступіў з ініцыятывай – арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва за павелічэнне міжрамонтнага перыяду станкоў. Ініцыятыва была падтрымана на ўсіх прамысловых прадпрыемствах Віцебскай вобласці. Калектыў завода заточных станкоў падтрымаў пачын макееўскіх станкабудаўнікоў аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за датэрміновае выкананне першага пасляваеннага пяцігадовага плана. Токар завода Клімаў на аснове ўласнай рацыяналізатарскай прапановы дамогся рэкорднага выніку. Ужыўшы хуткаснае рэзанне пры апрацоўцы дэталяў, ён пры норме 2 гадзіны 45 хвілін выдаткаваў

[1] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. Стат. ежегод. С. 13.
[2] Перечень документов ЦК КПСС, Совета Министров и центральных учреждений СССР по которым истекли сроки исполнения постановлений // НАРБ. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2075. Арк. 28.

на дадзеную аперацыю толькі 15 хвілін. У цэхах і на ўчастках завода разгарнулася спаборніцтва за права мець асабістае таўро якасці вырабаў. У працэсе спаборніцтва ў рабочых з'вілася пачуццё асабістай адказнасці за эканомнае выкарыстанне матэрыялаў і электрычнай энергіі. У асяродку ІТР завода заточных станкоў нарадзілася ініцыятыва арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва за ўкараненне перадавой тэхнікі[1].

У кастрычніку 1959 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР устанавіў ганаровае званне "Заслужаны вынаходнік Беларускай ССР". У ліку першых у 1960 г. яго атрымаў дэпутат Магілёўскага гарадскога Савета брыгадзір Магілёўскага завода Д. Калеснікаў[2].

Адносна невялікі працэнт укаранення рацыяналізатарскіх прапаноў было цяжка павялічыць выключна адміністрацыйным шляхам. Неабходна было зацікавіць у гэтым і кіраўнікоў вытворчасці. У 1963 г. Дзяржаўны камітэт па справах вынаходстваў і адкрыццяў СССР разаслаў на месцы тлумачэнні, якія павінны былі сістэматызаваць працу, дапамагчы спецыялістам на месцах разабрацца ў тонкасцях гэтай сферы дзейнасці, актывізаваць і стандартызаваць выплату прэміяльных заахвочанняў і г.д.

На падставе пастановы савета Міністраў СССР ад 24.04.1959 г. № 435 Тлумачэнне № 1 ад 16.07.1963 г. "Аб парадку ўтварэння фонда і выплаты прэмій за садзейнічанне ўкараненню вынаходстваў і рацыяналізатарскіх прапаноў" дапамагала навесці парадак у сферы выплаты прэміяльных узнагароджванняў за ўкараненне прапаноў[3]. Тлумачэнне № 2 ад 2.10.1963 г. "Аб прызнанні рацыяналізатарскіх прапаноў і парадку аднясення прапаноў да катэгорыі рацыяналізатарскіх" павінна было садзейнічаць выяўленню такіх прапаноў і тлумачыла іх крытэрыі[4].

У дакладзе на сесіі Гомельскага абласнога (прамысловага) Савета дэпутатаў працоўных 16.03.1963 г. было агучана, што 8 894 рацыяналізатараў вобласці прапанавалі за 1962 г. 14 368 прапаноў і вынаходніцтваў, з якіх было ўкаранена 9 422, што дазволіла зэканоміць 4 млн.руб. Найбольшы ўнёсак зрабілі рацыяналізатары Гомсельмаша, якія далі эканомію 515,6 тыс. руб., і Гомельскага ДБКа (эканомія 245 тыс. руб.)[5].

Павышэнню агульнатэхнічага ўзроўню спецыялістаў і кіраўнікоў спрыяла развіццё сістэмы павышэння кваліфікацыі работнікаў прамысловасці, што мела важнае значэнне для правядзення прыкладных навуковых распрацовак.

Аналіз архіўных дакументаў і літаратурных крыніц паказвае, што задачы сацыялістычнага будаўніцтва і пачатак "халоднай вайны" выклікаў неабходнасць адраджэння прамысловага патэнцыялу краіны. Паколькі

---

[1] Мандрык І. У. БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе: цяжкія вынікі з-за гітлераўскай акупацыі і складанасці ў ходзе аднаўлення гаспадарчага комплексу (на прыкладзе Віцебскай вобласці). С. 11.

[2] Рыськов М.А. История Могилевского городского Совета депутатов (1917–2014 гг.) : к 100-летию со дня образования. С. 109.

[3] Разъяснение № 1 от 16 июля 1963 г. «О порядке образования Ф.а и выплаты премий за содействие внедрению изобретений и рационализаторских предложений" // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8А. Спр. 28. Арк. 312-317.

[4] Разъяснение № 2 от 2 октября 1963 г. "О признании рационализаторских предложений и порядка отнесения предложений к категории рационализаторских" // Там жа. Арк. 318-321.

[5] Пратакол № 1 Сессии Гомельского областного (промышленного) Совета депутатов трудящихся 16 марта 1963 г. // Там жа. Спр. 2. Арк. 9-10.

тэрыторыя Беларусі мела стратэгічнае значэнне, а пасля Вялікай Айчыннай вайны яна стала ўнутраным рэгіёнам сусветнай сацыялістычнай садружнасці, то ў рэспубліцы разгарнулася будаўніцтва аб'ектаў цяжкай прамысловасці, у тым ліку і ВПК. Адбылася другая індустрыялізацыя. БССР сталаператварацца ва ўсесаюзны зборачны цэх машынабудаўнічай індустрыі. Шырокі размах будаўніча-аднаўленчых работ выклікаў вялікую патрэбнасць у масавых, тэхнічна падрыхтаваных кадрах.

Як сведчаць дакументы, у другой палове XX ст. развіццё прамысловасці рэспублікі стымулявалі або тармазілі разнастайныя фактары, якія мелі істотнае значэнне для фарміравання яе кадравага патэнцыялу. Індустрыялізацыя, урбанізацыя краіны, дэмаграфічныя і сацыяльныя змены, узровень адукаванасці насельніцтва былі важнымі чыннікамі, якія ўплывалі на кадравы патэнцыял прамысловасці. Змены ў геапалітычным становішчы БССР выклікалі структурныя змены ў прамысловасці, што найперш выявілася ў развіцці цяжкай прамысловасці. Павольнае аднаўленне колькасці насельніцтва прыводзіла да паскарэння адтоку кадраў з аграрнага сектару. Па-ранейшаму кадравая палітыка на прамысловых прадпрыемствах вызначалася партыйнымі органамі, але адначасова прадпрымалася спроба павысіць ролю Саветаў працоўных, самадзейных арганізацый, шараговых работнікаў на вытворчасць і падрыхтоўку кадраў для яе, разгарнуць рух рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Але для фактычнага, а не фармальнага далучэння работнікаў да кіравання вытворчасцю неабходна было як мінімум адладзіць механізм адбору і ўкаранення прапаноў, павысіць інфармаванасць і асабістую зацікаўленасць работнікаў у справах вытворчасці. А для гэтага патрэбны быў бы пераход ад камандных спосабаў кіравання эканомікай да больш дэмакратычных метадаў, ломка ўжо звыклай псіхалогіі кіравання, адпрацоўка механізмаў зваротнай сувязі. Аднак падобныя меры падарвалі б асновы кіравання савецкай дзяржавай і не былі рэалізаваны. Так, пэўная адмова ад мабілізацыйных мер пры вырашэнні гаспадарчых праблем, стымуляванне працы эканамічнымі метадамі напачатку далі станоўчыя вынікі, аднак неўзабаве стала ясна, што без мабілізацыйных мер пры сістэме вытворчых адносін, якая існавала, абысціся немагчыма. Найважнейшай прыкметай працоўнага суперніцтва становіцца стымуляванне працоўнага энтузіязму ў форме грамадскіх заклікаў з выкарыстаннем маральных стымулаў. Разам з пашырэннем сацыялістычнага спаборніцтва і дзейнасці самадзейных арганізацый на вытворчасці набірае сілу фармалізм і паказуха.

## 2.2 Меры фарміравання і ўдасканалення кадраў прамысловасці як фактара ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця БССР у 1955–1970 гг.

**Кіраванне прамысловасцю** ўплывала як на развіццё прамысловасці, склад персаналу прадпрыемстваў, так і на характарыстыку яе кадравага патэнцыялу. У сярэдзіне 1950-х гг. пачаўся перыяд рэформ сістэмы кіравання. Пастанова Пленума ЦК КПСС 13–14.02.1957 г. “Аб далейшым удасканаленні

арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам" прадугледжвала "набліжэнне кіраўніцтва да эканамічных раёнаў, перадачу часткі паўнамоцтваў саюзных міністэрстваў кіраўніцтву эканамічных раёнаў, саюзным і аўтаномным рэспублікам. Было прынята рашэнне ўтварыць Саветы народнай гаспадаркі як інструменту тэрытарыяльнага кіравання народнай гаспадаркай СССР.[1].

Тэрыторыя СССР была падзелена на эканамічныя адміністрацыйныя раёны, у якіх ствараліся Советы народнай гаспадаркі (саўнаргасы). Раёны ўтвараліся вярхоўнымі Саветамі саюзных рэспублік, якія зацвярджалі структуру і персанальны склад сістемы кіравання. Галоўным перавагай тэрытарыяльнай сістэмы кіравання лічылася набліжэнне кіраўніцтва прамысловасцю і будаўніцтвам да прадпрыемстваў і аб'яднанняў. Таксама меркавалася, што саўнаргасы забяспечаць комплексны падыход да развіцця тэрыторый. У падпарадкаванне рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў пераходзілі многія прамысловыя прадпрыемствы і арганізацыі, якія раней кіраваліся саюзнымі ўладамі.

БССР стаў адным цэльным раёнам, у якім быў утвораны свой Совет народнай гаспадаркі (СНГ БССР). Саўнаргас падпарадкоўваўся Савету міністраў БССР, пры гэтым яго старшыня карыстаўся правамі міністра і ўваходзіў ў склад Савета міністраў рэспублікі. Саўнаргас быў калегіяльным органам. Першапачаткова яго апарат быў невялікі, што ў першыя гады правядзення рэформы дазволіла часткова скараціць кіраўнічы апарат.

Чарговы XXII з'езд камуністычнай партыі ў 1961 г. цалкам адобрыў перабудову кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам. У рэзалюцыі было адзначана, што гэтая "рэвалюцыйная жыццёва неабходная мера зламала ведамасныя перагародкі, якія сталі тормазам далейшага развіцця вытворчых сіл краіны, павысіла ролю саюзных рэспублік, мясцовых партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў у эканамічным і культурным будаўніцтве, развязала творчую ініцыятыву мас[2].

На прыкладзе мясцовай прамысловасці БССР бачны змены ў структуры кіравання самай вялікай колькасці прадпрыемстваў краіны. Кіраванне мясцовай прамысловасцю прайшло пракруцісты шлях рэарганізацый. Так, у 1944 г. аднавілі дзейнасць аддзел мясцовай прамысловасці і аддзел мясцовай паліўнай прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. Яны былі 16.07.1953 г. скасаваны шляхам аб'яднання з аддзелам мясцовай прамысловасці і стварэння на іх базе ўпраўлення мясцовай і паліўнай прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. 10.05.1957 г. шляхам зліцця кіравання мясцовай і паліўнай прамысловасці і кіравання прамысловасці харчовых тавараў створана кіраванне прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў

---

[1] Постановление ЦК КПСС "О дальнейшем совершенствовании управления промышленностью и строительством". 13–14 февраля 1957 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 167–174

[2] XXII съезд КПСС. 1961 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 59–204.

працоўных. У снежні 1962 г. ліквідавана, і на яго базе створана кіраванне прамысловасці (з лютага 1963 г. – упраўленне бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці) Віцебскага прамысловага аблвыканкама. Адноўлена ў снежні 1964 г. як кіраванне бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці Віцебскага аблвыканкама. Пераўтворана: 29.10.1965 г. – у кіраванне мясцовай прамысловасці.

Аддзел харчовай прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных быў адноўлены ў 1944 г. Перайменаваны: 23.03.1954 г. – у аддзел прамысловасці харчовых тавараў; 3 студзеня 1957 г. – ва ўпраўленне прамысловасці харчовых тавараў; 10.05.1957 г. ліквідавана ў ходзе аб'яднання з кіраваннем мясцовай і паліўнай прамысловасці з утварэннем на іх аснове ўпраўлення прамысловасці Віцебскага аблвыканкама. Адноўлена 06.08.1966 г. як кіраванне харчовай прамысловасці выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. Скасавана 10.04.1972 г.

Як уяўляецца, выразнай праграмы рэформаў у савецкага кіраўніцтва ў другой палове 1950 – першай палове 1960 гг. не было, а галоўным метадам дзейнасці была ліквідацыя найбольш відавочных дыспрапорцый і праблем. Многія рэформы былі павярхоўнымі, у іх асноўная роля адводзілася арганізацыйнаму фактару, у тым ліку мерам па спрашчэнню кіраўнічага апарата і яго патанненню.

Адной з характарыстычных рысаў 1950–1960 гг. з'яўлялася няспынная барацьба з бюракратызмам. Гэта барацьба ішла, нягледзячы на тое, што бюракратыя не прызнавалася асобнай сацыяльнай групай, Асабліва гучна такую барацьбу з выявамі бюракратызму дэкларавала партыя і ўрад за часам кіравання краінай М. С. Хрушчовым.

XX з'езд КПСС у 1956 г. звярнуў увагу на неабходнасць скарачэння адміністрацыйна-кіраўнічага апарату і працягу непрымірымай барацьбы з бюракратызмам. У дырэктывах з'езда па шостаму пяцігадоваму плану прапаноўвалася "працягнуць работу па далейшаму ўдасканаленню і патанненню кіраўнічага апарату, ліквідацыі залішніх і паралельна дзеючых звенняў апарату і па ліквідацыі празмернасці ў штатах"[1].

XXI з'езд КПСС у 1959 г. працягнуў гэтую лінію і нават канкрэтызаваў кірункі скарачэння непатрэбных звенняў апарату і яго спрашчэння, падкрэсліў, што гэта не толькі скароціць выдаткі на яго ўтрыманне, але і наблізіць кіраўніцтва да вытворчасці[2]. Нарэшце, на чарговым XXII з'ездзе камуністычнай партыі ў 1961 г. былі агучаны прынцыпы работы партыйнага і савецкага апарату. Дзяржаўны апарат павінен быў быць "простым, кваліфікаваным,

[1] XX съезд КПСС. 1956 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 22, 67.
[2]XXI съезд КПСС. 1959 г. Резолюции и постановления съезда Коммунистическая партия Советского Союза // Там жа. С. 320.

танным, і аператыўным, без якіх-небудзь выяўленняў бюракратызму, фармалізму і цяганіны”[1].

Меркавалася за кошт скарачэння апарату кіравання сканцэнтраваць спецыялістаў у найбольш адказных звеннях улады і вытворчасці, скараціць адміністрацыйна-эканамічныя выдаткі. Такая лінія правядзення рэформаў назіралася пры рэфармаванні грамадска-палітычных інстытутаў, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, прамысловасці і сельскай гаспадаркі[2]. Як правіла, эфект ад іх правядзення быў хуткім, але кароткачасовым.

Аднак па меры разгортвання рэформы структура і апарат беларускага саўнаргаса пачаў павялічвацца, з'явіліся галіновыя і функцыянальныя ўпраўленні і аддзелы. Пасля змены кіраўніцтва СССР вышэйшым партыйным кіраўніцтвам краіны у кастрычніку 1965 г. было прынята рашэнне аб адмове ад тэрытарыяльнай сістэмы кіравання прамысловасцю і вяртанні да галіновай сістэмы кіравання. Створаныя ў ходзе рэформы эканамічныя раёны і саветы народнай гаспадаркі ўсіх узроўняў былі скасаваныя і адноўлены прамысловыя міністэрствы.

Для 1950–1960 гг. уласціва паступовае ўдасканальванне сталінскай сістэмы падбору кіраўніцкіх кадраў і кантролю за імі, якая функцыянавала і паказала ў папярэдні час з аднаго боку сваю надзейнасць, а з іншага – не вельмі высокую эфектыўнасць. Асаблівасці механізма яе фукцыянавання ў сувязі з адсутнасцю прынцыповых адрозніванняў будуць падрабязна разгледжаны і паказаны далей на матэрыялах наступных дзесяцігоддзяў.

**Падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў** вызначалася высокімі тэмпамі прамысловага развіцця. А хуткія тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу яшчэ больш абвастрылі ў 1950 гг. фактар пэўнай нявызначанасці пры падрыхтоўцы спецыялістаў, асабліва з вышэйшай адукацыяй. Пастаянна ўзнікалі структурныя дыспрапорцыі паміж наяўнымі і патрэбнымі кадрамі спецыялістаў[3].

У СССР планаванню падрыхтоўкі спецыялістаў надавалася вялікая ўвага. Упершыню, зыходзячы з патрэб эканомікі, паспрабавалі вызначыць колькасць спецыялістаў для падрыхтоўкі ў трохгадовым плане на 1928/29 – 1932/33 вучэбных гадах. Доўгія гады асноўным метадам абліку быў так званы штатны метад вылічэння патрэбы ў спецыялістах. Яго праблема ў цяжкасці вызначэння колькасці спецыялістаў на перспектыву. Да таго ж планаванне эканомікі моцна адрозніваюцца ад планавання падрыхтоўкі спецыялістаў. Апошняе з’яўляецца даўгачасным, бо патрабуе некалькіх гадоў падрытоўкі, звязаны з сацыяльна-палітычнымі і соцыякультурнымі фактарамі, сацыяльна-дэмаграфічнымі працэсамі, якія не падпадаюць пад непасрэднае дырэктыўнае

[1] XXII съезд КПСС. 1961 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 157.

[2] Елизаров С.А. Трансформация областного деления БССР (1944–1969 гг.). С. 40.

[3] Быстров И. Е. Управление кадровым обеспечением регионов на основе прогнозирования потребности в специалистах с высшим профессиональным образованием: автореф. дис. … канд. экон. наук: 05.13.10 / И. Е. Быстров. – Воронеж, 2003.

планаванне. Усё гэта стварала пагрозу структурнай (прафесійна-галіновай і рэгіянальнай) дыспрапарцыянальнасці ў занятасці кадраў[1].

Апрацоўка і аналіз апублікаваных і архіўных матэрыялаў, якія характарызуюць метады фарміравання і ўдасканалення кадравага патэнцыялу прамысловасці ў 1956–1970 гг як фактара ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця БССР, дазволілі пабачыць асноўныя шляхі і крыніцы падрыхтоўкі кадраў у перыяд, які вывучаецца.

Адной з важных крыніц папаўнення кадраў рабочых заставалася іх падрыхтоўка на вытворчасці. Актуальнымі і запатрабаванымі былі традыцыйныя формы падрыхтоўкі работнікаў: праз індывідуальнае навучанне, шляхам прымацавання пачаткоўцаў да дасведчаных рабочых, так і праз спецыяльныя курсы.

Найбольшым рэзервам папаўнення рабочых вакансій патэнцыйна былі калгаснікі. Умовы вясковай працы, сітуацыя ў сельскай гаспадарцы рабілі імкненне калгаснікаў пераехаць у горад вельмі моцным. Некалькі стрымлівалі непадкантрольны адток рабочай сілы з сяла пастанова СМ СССР ад 23.11.1951 г. “Аб парадку прыёму на работу калгаснікаў”. Адпаведна пастанове прымаць на працу калгаснікаў без даведкі пра водпуск іх калгасамі было забаронена. Тым не менш, гэтае палажэнне нярэдка парушалася.

У рашэнні выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад 16.09.1957 г. адзначалася нярэдкае камплектаванне рабочых кадраў на прамысловых прадпрыемствах вобласці калгаснікамі без прадастаўлення імі даведак пра водпуск іх калгасамі. Паколькі падобная практыка груба парушала заканадаўства, члены выканкаму патрабавалі ад кіраўнікоў прадпрыемстваў няўхільнага выканання парадку прыёма калгаснікаў на працу, звярнуліся да пракурора з просьбай узмацніць нагляд за выкананнем парадку, а вінаватых у парушэнні Закону прыцягваць да крымінальнай адказнасці[2].

Падрыхтоўка кадраў праз спецыяльныя прафесійныя навучальныя ўстановы ўдзялялася ўсё большая ўвага, дзеля чаго, пачынаючы з канца 1950, і асабліва ў 1960 гг. павялічваецца колькасць прафесійных вучылішчаў, тэхнікумаў, вышэйшых навучальных устаноў з вочнай, вячэрняй і завочнай формамі навучання. Прадпрымаліся меры па матэрыяльнай стымуляцыі навучання рабочых і малодшых спецыялістаў на завочнай, вячэрняй і вочнай формах навучання. Пры планаванні будаўніцтва буйных прамысловых прадпрыемстваў, як правіла, прадугледжвалася адкрыццё ўласных прафесійных школ. Стварэнне ў 1969 г. сярэдніх прафесійна-тэхнічных вучэльняў, якія ў наступныя дзесяцігоддзі сталі асноўнай формай прафесійнай падрыхтоўкі маладых рабочых, паказала сваю эфектыўнасць.

---

[1] Ганчарэнка У. П., Міронаў Д. М., Рыжанкоў І. А. Методыка вызначэння прагнознай патрэбнасці ў кваліфікаваных кадрах на прадпрыемстве // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2010. № 2. С. 48.

[2] Решение Исполнительного комитета Витебского областного Совета депутатов трудящихся от 16.09.1957 г. «Представление прокурора области «О фактах нарушений Закона о труде, трудовой дициплины и технике безопастности в ряде предприятий области». // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 169. Арк. 126-127.

У 1960 гг. вялікая ўвага надавалася вытворчаму навучанню ў школах. Вялікую ролю ў падрыхтоўцы настаўнікаў іграла Аршанскае педагагічнае вучылішча, якое яшчэ ў 1956 г. было рэарганізавана ў індустрыяльна – педагагічную навучальную ўстанову па падрыхтоўцы настаўнікаў для вядзення заняткаў у вучэбных майстэрнях.

Выконваючы Закон “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР” і пастанову ЦК КПБ ад 18.03.1961 г. “Аб удзеле прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў у камплектаванні ВНУ і тэхнікумаў і ў падрыхтоўцы спецыялістаў для сваіх прадпрыемстваў” ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ў 1960–1961 гг. камплектаваліся ў асноўным за кошт моладзі, якая прыйшла на вучобу з вытворчасці[1].

Адной з крыніц запаўнення вакансій спецыялістаў і арганізатараў вытворчасці было размеркаванне маладых спецыялістаў – выпускнікоў сталічных (Масква і Ленінград) і іншых профільных рэгіянальных ВНУ краіны на беларускія прамысловыя прадпрыемствы, якое паказала сваю нізкую эфектыўнасць з-за слабага замацавання маладых спецыялістаў з іншых рэспублік СССР на беларускіх прадпрыемствах. Асабліва невялікім было замацаванне спецыялістаў у харчовай і мясцовай прамысловасцях, прадпрыемствы якіх часцяком знаходзіліся ў невялікіх гарадах і пасёлках гарадскога тыпу.

Галіновыя органы кіравання БССР імкнуліся арганізоўваць беларускія навучальныя ўстановы адпаведнага профілю або філіялы профільных навучальных устаноў, заключаць дамовы на падрыхтоўку спецыялістаў для гаспадарчых суб’ектаў з навучальнымі ўстановамі ў сувязі з цяжкасцю папаўнення кадрамі праз саюзныя міністэрствы.

Пры будаўніцтве новых прадпрыемстваў дазвалялася запрашаць спецыялістаў з аналагічных прамысловых прадпрыемстваў з іншых рэгёнаў СССР, якое было дастаткова эфектыўным, у сувязі з магчымасцямі кар'ернага росту і са стварэннем лепшых матэрыяльных умоў для новых кадраў, перш-наперш шляхам прадастаўлення добраўпарадкаванага жылля.

Змяншаецца значэнне вылучэння на кіраўніцкія пасады “практыкаў”, што падтрымлівалася шматлікімі галіновымі і рэспубліканскімі пастановамі. Колькасць спецыялістаў “практыкаў” нават спецыяльна адзначалася ў статыстычных дадзеных, а неабходнасць іх змяншэння – у шматлікіх пастановах партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў. У выніку, доля практыкаў сярод спецыялістаў і кіраўнікоў на прадпрыемствах паступова, хаця і не вельмі хутка змяншалася.

**Перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў.** Неабходнасць бесперапыннай адукацыі кадраў, а таксама наяўнасць вялікай долі “практыкаў” на вытворчасці вызначыла вялікае значэнне перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў. Хрушчоўскія рэарганізацыі закранулі таксама і сістэму

[1] Протокол № 18 заседания бюро Витебского обкома КПБ от 26 мая 1962 года. Вопрос «О подготовке к очередному набору в вузы и техникумы и участии промышленных предприятий, совхозов и колхозов в кадровом обеспечении образовательных учреждений» // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 5. Спр. 588. Арк. 183-184.

перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў для прамысловасці. Пастанова СМ СССР ад 03.06.1960 г. "Аб сістэме павышэння кваліфікацыі кіруючых і інжынерна-тэхнічных работнікаў галін народнай гаспадаркі і работнікаў дзяржаўнага апарату" прадугледжвала рэарганізацыю ўсёй сістэмы, новыя формы павышэння кваліфікацыі работнікаў. З гэтага часу адладжваецца сістэма павышэння кваліфікацыі спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў.

Для выканання ўказанай пастановы ад 03.06.1960 г. Міністэрства вышэйшай, сярэдне-спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР запрасіла інфармацыю ўсіх зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў аб спецыяльнасцях, па якіх патрэбна здзяйсняць павышэнне кваліфікацыі кіраўніцкіх і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Была праведзена нарада дырэктараў ВНУ і вядучых сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў аб іх магчымасцях арганізаваць працу па павышэнню кваліфікацыі кіраўніцкіх і ІТР работнікаў. Даведка аб выкананні пастановы таксама сведчыць аб невыкананні яе ў запланаваныя тэрміны. Праблема абмяркоўвалася на пасяджэннях калегіі міністэрства і Бюро Савета Міністраў[1]. У гэтым жа годдзе 20 чэрвеня Савет народнай гаспадаркі БССР выдаў распараджэнне № 677 аб давядзенні ўказанай пастановы да ведама і выканання галіновым упраўленням і прамысловым прадпрыемствам і прапанаваў да 1 жніўня распрацаваць мерапрыемствы па павышэнню кваліфікацыі ў адпаведнасці з новымі формамі павышэння кваліфікацыі. Ход выканання пастановы быў разгледжаны 31 кастрычніка на Бюро Савета Міністраў БССР, а Саўнаргас восенню правяраў выкананне пастановы СМ СССР на прадпрыемствах лёгкай прамысловасці[2].

Ход правядзення разнастайных рэарганізацый першымі пад скарачэнні часцяком траплялі менавіта ўстановы па павышэнню кваліфікацыі. Але разгляд дакументаў паказвае, што неўзабаве гэтыя рашэнні выклікалі праблемы павышэння кадравага патэнцыялу прадпрыемстваў і цэлых галін прамысловасці. 22.11.1962 г. пастановай Урада СССР за № 195 прадугледжвалася захаванне курсаў павышэння кваліфікацыі работнікаў з адрывам ад працы па некаторых спецыяльнасцях. Але рэалізацыя і гэтага рашэння ішла з прабуксоўкай[3].

Практычна кожная пастанова ЦК КПСС і СМ па развіццю той ці іншай галіны прамысловасці прадугледжвала ў тым ліку і меры па падрыхтоўцы кадраў для прамысловых прадпрыемстваў: рабочых, сярэднетэхнічных і інжынерна-тэхнічных спецыялістаў. Паколькі валавыя параметры і паказчыкі ў першую чаргу вызначалі адзнакі дзейнасці прадпрыемстваў і ведамстваў, то менавіта на іх і звярталі ўвагу, за іх пыталі і іх фінансавалі ў першую чаргу. Практычна хранічным стала затрымка рэалізацыі пунктаў рашэнняў па развіццю навучальных устаноў па падрыхтоўцы кадраў, перш-наперш тых, якія тычыліся ўводу аб'ектаў будаўніцтва.

[1] Справка о выполнении постановления Совета Министров СССР от 03.06.1960 г. «О системе повышения квалификации руководящих и инженерно-технических работников отраслей народно хозяйства и работников государственного аппарата» // НАРБ. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 266. Арк. 82.
[2] Письмо в Совет Министров БССР от 2 декабря 60 г. по п. 5 выписки из протокола заседания Бюро Совета Министров БССР от 31 октября 1960 г. // Там жа. Арк. 90.
[3] Постановление Совета Министров СССР от 22.11.1962 г. за № 195 // Там жа. Арк. 152.

Органы кіравання прамысловасцю разумелі праблему невыканання многіх рашэнняў і адсочвалі своечасовасць і эфектыўнасць выканання пастаноў на месцах. Так, у Савеце Міністраў БССР штомесячна складаліся даведкі па стане на пачатак месяца "…аб невыкананні рашэнняў Урада СССР і БССР ва ўстаноўленыя тэрміны". Сістэмна ў такіх пастановах адзначаецца затрымка ўводу тых ці іншых аб'ектаў адукацыйных устаноў па падрыхтоўцы кадраў.

Так, спецыяльная пастанова ЦК КПБ і СМ БССР ад 19.11.1959 г. абавязвала Дзяржплан БССР, Саўнаргас БССР унесці прапановы аб завяршэнні будаўніцтва вучэбна-вытворчых майстэрань Мінскага вечаровага і Магілёўскага машынабудаўнічых тэхнікумаў за кошт капітальных укладанняў, якія былі вылучаны на вытворчае будаўніцтва, але даведка ад 02.02.1960 г. канстатуе яе невыкананне[1].

Несвоечасовасць выканання пастаноў Ураду хвалявала кіраўніцтва Савета Міністраў. Асабліва "сістэматычна затрымлівалі распрацоўку мерапрыемстваў і прыняцце рашэнняў па выкананню пастаноў" Савета Міністраў выканаўчыя камітэты Гомельскага і Магілёўскага абласных саветаў. У выніку сітуацыю разглядалі на рэспубліканскім і абласным узроўнях. На пасяджэнні Магілёўскага выканкама была разгледжана запіска выканкама ў Савет Міністраў БССР ад 09.11.1960 г. аб фактах несвоечасовага прыняцця рашэнняў і прынята абавязваючая рэзалюцыя аб выпраўленні сітуацыі[2].

Сітуацыя з рабочымі кадрамі хранічна хвалявала кіраўніцтва краіны. Напрыканцы 1962 г. за дзесяць дзён да новага года СМ СССР прыняў пастанову № 1303 "Аб мерах па паляпшэнні падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых і забеспячэнні імі прадпрыемстваў і будоўляў. Савет Міністраў сумесна з Саветам народнай гаспадаркі, Мінпрамам і іншымі ведамствамі павінен быў падрыхтаваць канкрэтныя прапановы ўжо да 03.01.1963 г. Тэрміны былі сарваныя. Па выніках першага месяца года толькі рыхтаваўся праект пастановы СМ БССР[3].

Важнае значэнне ў справе павышэння патэнцыялу прамысловасці, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, а таксама ўмацавання адукацыйнага і прафесійнага складу і ўзроўню кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР павінна была мець пастанова чэрвеньскага 1959 г. Пленума ЦК КПСС, якая абавязвала саюзныя рэспублікі стварaць Навукова-даследчыя інстытуты (НДІ) – самастойныя ўстановы, спецыяльна прызначаныя для арганізацыі навуковых даследаванняў і правядзення даследча-канструктарскіх распрацовак[4]. Да сярэдзіны XX ст. НДІ сталі асноўнай формай арганізацыі калектыўнай навуковай дзейнасці ў большасці краін з перадавой прамысловасцю.

---

[1] Справка о невыполнении решений Правительства СССР и БССР в установленные сроки по сотоянию на 2 февраля 1960 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 266. Арк. 12.

[2] Записка исполкома Могилевского областного совета в Совет Министров БССР от 9 ноября 1960 года о фактах несвоевременного принятия решений // Там жа. Арк. 64-65, 97.

[3] Справка об использовании документов, поступающих в отделы Совета Министров БССР за январь месяц 1963 года // Там жа. Арк. 163.

[4] Справка о невыполнении решений Правительства СССР и БССР в установленные сроки по сотоянию на 2 февраля 1960 г. // Там жа. Арк. 1.

Галіновыя навукова-даследчыя інстытуты былі адной з дадатковых крыніц папаўнення кадраў прамысловых прадпрыемстваў. Саюзныя і рэспубліканскія навукова-даследчыя інстытуты, якія дзейнічалі на тэрыторыі БССР, сыгралі сваю станоўчую ролю ў павышэнні кваліфікацыі кіраўніцкіх кадраў прамысловасці, павысілі іх мабільнасць. Вопыт працы ў НДІ у далейшым дапамагаў кіраўнікам прадпрыемстваў бачыць перспектывы і паспяхова кіраваць імі. Размеркаванне выпускнікоў ВНУ тэхнічных спецыяльнасцяў у НДІ да таго ж адкрывала для іх магчымасці больш хуткага, чым у ВНУ, кар'ернага росту. Саюзныя і рэспубліканскія навукова-даследчыя інстытуты, якія дзейнічалі на тэрыторыі БССР, сыгралі сваю станоўчую ролю ў павышэнні кваліфікацыі кіраўніцкіх кадраў прамысловасці, павысілі іх мабільнасць.

Назіралася таксама ратацыя кадраў паміж партыйнымі, савецкімі органамі і прамысловымі прадпрыемствамі і аб'яднаннямі. Значна часцей на партыйную, савецкую і камсамольскую работу пачалі рэкрутавацца спецыялісты з вытворчасці. Пасля некалькіх гадоў "абкаткі" – работы ў партыйных, савецкіх, камсамольскіх органах, многіх з іх вярталі на працу ў нізавыя арганізацыі на прамысловых прадпрыемствах або на кіраўніцкія пасады ў іх, часцей за ўсё з павышэннем у пасадзе ў параўнанні з часам работы на прадпрыемстве да працы ў "органах".

Канчаткова сістэма перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў склалася ў наступныя дзесяцігоддзі.

**Замацаванне кадраў на вытворчасці, фарміраванне стабільных калектываў** былі адной з галоўных задач на прадпрыествах у гэты час. Вялікая ўвага ў параўнанні з папярэднім часам пачала ўдзяляцца паляпшэнню ўмоў працы работнікаў прамысловасці. На сесіях Саветаў дэпутатаў працоўных, пасяджэннях партыйных камітэтаў адзначалася правядзенне пэўных мерапрыемстваў у гэтай галіне. Тым не менш, работа ў гэтым кірунку, які непасрэдна ўплываў на замацаванне кадраў на прадпрыемствах, яшчэ патрабавала значных высілкаў, нават з улікам адносна невысокіх стандартаў і патрабаванняў таго часу. Рашэнні партыйных органаў на некаторы час прыцягвалі ўвагу да праблемы і паляпшалі сітуацыю, але сістэмныя фактары ўплыву спрацоўвалі не заўжды.

Праблемы нізкай працоўнай дысцыпліны, цякучасці кадраў, кепскага санітарнага стану рабочых месц, культурна-побытавага абслугоўвання работнікаў прамысловасці былі відавочнымі на працягу ўсіх 1940 гг. Але ў пасляваенны час многае спісвалася на наступствы вялікай вайны і неабходнасць канцэнтрацыі намаганняў на аднаўленні народнай гаспадаркі і на неабходнасць ваенна-тэхнічнага спаборніцтва са ЗША і іншымі капіталістычнымі краінамі. Нарэшце на гэтыя праблемы ў розных рэгіёнах СССР звярнулі ўвагу цэнтральныя партыйныя органы[1]. У пастанове ЦК УсеКП(б) "Аб рабоце ЦК

[1] Постановление ЦК ВКП(б) "О работе партийных комитетов Ивановского меланжевого, Глуховского хлопчатобумажного и Ташкетского текстильного комбинатов". 30 сентября 1946 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 62–70.

КП(б) Беларусі” у 1947 г. таксама прапаноўвалася “прыняць рашучыя меры да паляпшэння умоў працы і побыту рабочых”, звярталася ўвага на неабходнасць паляпшэння работы магазінаў, сталовых, рамонтна-пашывачных майстэрань[1].

“Бяздушна-бюракратычныя адносіны работнікаў партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных органаў да патрэб рабочых” не былі ўнікальнай асаблівасцю пасляваеннага стылю кіравання кіраўніцкіх работнікаў БССР. Падобная сітуацыя была выяўлена пры праверцы партыйна-палітычнай работы на вугальных шахтах Данбаса. Сталінскі абкам абавязалі “павесці рашучую барацьбу” з падобнымі адносінамі, “павярнуць увагу” ўсіх органаў кіравання да пытанняў матэрыяльна-побытавага абслугоўвання рабочых. Партыйныя камітэты абавязалі сачыць за своечасовай выплатай заробкаў, выдачай спецадзення і мыла, забеспячэннем вадой і палівам шахцёрскіх пасёлкаў, медыцынскім і культурна-побытавым абслугоўваннем шахцёраў[2]. Амаль тая самая сітуацыя была і шахтах Кузбаса, дзе ў дадатак частка насельніцтва жыла ў зямлянках, у шахцёрскіх лазнях і душавых шахцёрам прыходзілася гадзінамі стаяць у чэргах, а потым мыцца халоднай вадой[3].

Санітарныя нормы і правілы тэхнікі бяспекі на большасці беларускіх прадпрыемстваў працягвалі масава парушацца і ў 1950-я гг. Так праверка прамысловых прадпрыемстваў Мазырскага раёна паказала, што на большасці прадпрыемстваў дагэтуль не ўсталяваны нават вентыляцыйныя ўстаноўкі[4]. Гэта выклікала заканамернае незадавальненне работнікаў.

Падобнай была санітарная сітуацыя і ў геаграфічна супрацьлеглай паўночнай Віцебскай вобласці. У рашэнні Выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад 14.11.1956 г. “Аб паляпшэнні аховы працы і медыцынскага абслугоўвання рабочых прамысловых прадпрыемстваў” адзначалася нездавальняючае выкананне на многіх прамысловых прадпрыемствах вобласці пастановы Савета Міністраў БССР ад 09.12.1953 г. “Аб сур’ёзных недахопах у ахове працы і тэхніцы бяспекі на прадпрыемствах БССР”. Практычна на ўсіх правераных прадпрыемствах былі выяўлены сур’ёзныя парушэнні. У цэхах завода заточных станкоў, імя Кірава, Камінтэрна, Аршанскага льнокамбіната неэфектыўна працавалі або ўвогуле бяздзейнічалі вентыляцыйныя ўстаноўкі, назіралася загазаванасць паветра і запыленасць памяшканняў. На заводах назіралася забруджанасць рабочых мест, праходаў, праездаў і рабочых двароў. Рабочыя былі кепска забяспечаны спецадзеннем, індывідуальнымі сродкамі абароны. Кепскае асвятленне рабочых месцаў

[1] Постановление ЦК ВКП(б) “О работе ЦК КП(б) Белоруссии”. 25.01.1947 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 87.

[2] Постановление ЦК ВКП(б) “О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Донбаса”. 28.02.1948 г. // Там жа. С. 168.

[3] Постановление ЦК ВКП(б) “О состоянии партыйна-политической работы на угольных шахтах Кузбаса”. 06.03.1948 г. // Там жа. С. 173–174.

[4] Справка «О руководстве Мозырьского горкома КП Белоруссии промышленностью города и района» // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 241. Арк. 84.

назіралася на Аршанскім заводзе швейных машын, Аршанскім камбінаце, Віцебскай шпагатнай фабрыцы[1].

Вынікі праверкі пэўных прамысловых прадпрыемстваў дазвалялі рабіць вывад пра сістэматычныя парушэнні норм аховы працы і медыцынскага абслугоўвання ў прамысловасці вобласці. Было асобна адзначана, што органы Дзяржаўнай санітарнай інспекцыі не выяўляюць належнай патрабавальнасці да кіраўніцтва прамысловых прадпрыемстваў за выкананне санітарных нормаў і тэхніцы бяспекі. Дыспансерызацыя работнікаў праводзіцца фармальна, а вынікі дыспансерызацыі не аналізуюцца. Асобныя дырэктары прамысловых прадпрыемстваў не выконваюць патрабаванні прафсаюзных органаў, калектыўных дамоў. У выніку гэтых парушэнняў на прадпрыемствах павялічыўся вытворчы траўматызм, захворванні рабочых.

У якасці прыкладу прыводзілася захворваемасць і траўматызм на Аршанскім ільнокамбінаце. На прадпрыемстве захворванні на грып павялічыліся з 3 на 100 працаўнікоў у 1951 г. да 18,1 выпадкаў у 1956 г., а вытворчы траўматызм вырас з 0,4 у 1951 г. да 1,4 у 1955 г. на 100 працаўнікоў. Аналагічная сітуацыя была адзначана на Аршанскім заводзе швейных машын, Віцебскіх заводах заточных станкоў і прамбудматэрыялаў. Высокая колькасць хвароб жаночымі захворваннямі была адзначана на заводзе імя Кірава, фабрыцы “Знамя індустрыялізацыі” . Усё гэта, на думку работнікаў выканкама, сведчыла пра тое, што асобныя кіраўнікі не клапоцяцца пра “паляпшэнне ўмоў працы і побыту рабочых”, недаацэньваюць “дзяржаўнай важнасці барацьбы з хваробамі і траўматызмам на вытворчасці”[2].

Рашэнне Выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных прадпісвала “пакончыць з недаацэнкай пытанняў тэхнікі бяспекі і аховы працы рабочых” і намеціла шэраг мер па выпраўленні выяўленых недахопаў і канкрэтных парушэнняў. Асобна прадпісвалася абмеркаваць гэтыя пытанні на пасяджэннях выканкамаў гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных[3].

Праз год Выканаўчы камітэт Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных зноў вярнуўся да разгляду гэтага пытання. Пракуратура вобласці выявіла нездавальняючы ход выканання рашэння выканкама Віцебскага абласнога Савета ад 14.11.1956 г. “Аб паляпшэнні аховы працы і медыцынскага абслугоўвання рабочых прамысловых прадпрыемстваў”. Пракурорская праверка зноў зафіксавала шматлікія грубыя парушэнні Закона аб працы, працоўнай дысцыпліны і тэхніцы бяспекі на шэрагу прадпрыемстваў вобласці. У выніку, у рашэнні высокі вытворчы траўматызм адзначаны на будоўлях вобласці, на домабудаўнічым камбінаце, Полацкім ліцейна-механічным заводзе, Віцебскай швейнай фабрыцы “Знамя індустрыялізацыі”, станка-будаўнічым заводзе, цагляных заводах і іншых прадпрыемствах абласнога Упраўлення

---

[1] Решение Исполнительного комитета Витебского областного Совета депутатов трудящихся от 14.11.1956 г. «Об улучшении охраны труда и медицинского обслужтвания рабочих промышленных предприятий». // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 168. Арк. 217-220.

[2] Там жа. Арк. 218.

[3] Там жа. Арк. 218-220.

прамысловасці. Прычынамі высокага траўматызму былі названы няведанне рабочымі правіл тэхніцы бяспекі, няспраўнасці абсталявання, адсутнасцю ахоўных прыстасаванняў і агульнай засмечанасці рабочых месцаў і праходаў[1].

Былі выяўлены таксама нярэдкія выпадкі парушэння заканадаўства пры прыёме і звальненні работнікаў, неадпаведныя заканадаўству дысцыплінарныя пакаранні і нават накладанне штрафаў. Народныя суды вобласці толькі за першае паўгоддзе 1957 г. разгледзелі 199 грамадзянскіх іскаў аб аднаўленні на працы, з якіх 108 (54,8 %) былі задаволены, а незаконна звольненыя работнікі адноўлены на працы[2].

Рашэнне Выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад 16.09.1957 г. абавязала кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў неадкладна ўстраніць выяўленыя парушэнні, а выканкамам гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных праверыць у верасні-кастрычніку стан спраў з аховай працы, працоўнай дысцыплінай, тэхнікай бяспекі і медыцынскім абслугоўваннем рабочых і разгледзець на пасяджэннях сваіх выканкамаў[3].

Такая ўвага дзяржаўных і партыйных органаў да пытанняў тэхнікі бяспекі і аховы працы рабочых дапамагала выяўляць і выпраўляць асобныя парушэнні і недахопы. Але ўвогуле, увага да гэтых пытанняў па-ранейшаму была эпізадычнай. Толькі катастрофа магла разбурыць другаснасць гэтых пытанняў у галовах прамысловых кіраўнікоў вытворчасці.

Вялікі рэзананс выклікала катастрофа 06.08.1958 г. на Гомельскім кандытарскім камбінаце “Спартак”, якая прывяла да гібелі работнікаў фабрыкі і вялізных матэрыяльных страт. Катастрофа адбылася ў 13 гадзін 32 мінуты. У выніку выбуху воданагравальнага катла адбылося разбурэнне трох паверхаў будынка, дзе размяшчаліся бісквітны і кандытарскі цахі, што прывяло да гібелі 15 работнікаў фабрыкі, 22 параненых і вялізных матэрыяльных страт. Бюро Гомельскага абкама КП Беларусі адзначыла, што яшчэ 4 чэрвеня на камбінаце было атручана генератарным газам сем чалавек, з якіх загінула два чалавекі. Але нават гэты выпадак не прымусіў праверыць тэхніку бяспекі на прадпрыемстве. Пастановай бюро Гомельскага абкама партыі дырэктару камбіната была абвешчана строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картку, а галоўны інжынер і галоўны механік былі выключаны з шэрагаў камуністычнай партыі[4].

У ходзе праверкі выявілася, што на камбінаце не выконваліся “элементарныя” правілы тэхнікі бяспекі і эксплуатацыі катлоў. Увогуле, бяспецы персаналу не ўдзялялася належнай увагі. У 1953 г. быў са звычайнай цыстэрны ўсталяваны воданагравальны бак для душавой. Ён нікім не абслугоўваўся і награваўся парам. У выніку перагрэву да 150 °С празмерным ціскам было вырвана дно бака, а затым сам бак выкінуты на вуліцу. Па шляху

---

[1] Решение Исполнительного комитета Витебского областного Совета депутатов трудящихся от 16.09.1957 г. «Представление прокурора области «О фактах нарушений Закона о труде, трудовой дициплины и технике безопастности в ряде предприятий области». // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 169. Арк. 125-127.
[2] Там жа. Арк. 127.
[3] Там жа.
[4] Протокол №17 заседания бюро Гомельского обкома КП Белоруссии от 6 августа 1958 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 242. Арк. 76, 115.

бак пашкодзіў апорныя канструкцыі першага паверха будынку галоўнага вытворчага корпуса, які абваліўся, а за ім абваліўся другі і трэці паверхі. У выніку загінулі людзі, камбінату былі нанесены матэрыяльныя страты памерам 700 тыс. руб.[1] Кіраўніцтва горада прыняла меры па аднаўленні галоўнага вытворчага корпуса і рэканструкцыі камбіната ”Спартак”[2].

Катастрофа 1958 г. на Гомельскім кандытарскім камбінаце “Спартак” выклікала больш пільную ўвагу і масавыя праверкі выканання правіл тэхнікі бяспекі на прамысловых прадпрыемствах рэспублікі. Паўсюдна праводзіліся смотры выканання правіл тэхнікі бяспекі, разлядаўся ход выканання пастановы ЦК КПБ “Аб катастрофе на Гомельском камбінаце “Спартак” ад 03.10.1958 г. Праверкі прадпрыемстваў выявілі шматлікія парушэнні правіл тэхнікі бяспекі на прамысловых прадпрыемствах рэспублікі, нездавальняючы стан выканання закона аб наглядзе за санітарным станам прамысловых, харчовых і камунальных прадпрыемстваў на многіх заводах і фабрыках, падштурхнулі распрацоўку тэрміновых мер па выпраўленню сітуацыі[3].

На прамысловых прадпрыемствах вобласці пачалася масавая праверка выканання правіл тэхнікі бяспекі і санітарнага стану. Праверка паказала нездавальняючае выкананне закона аб наглядзе за санітарным станам прамысловых, харчовых і камунальных прадпрыемстваў горада Гомеля з боку санітарнай інспекцыі аддзела аховы здароўя. Было выяўлена, што санітарная інспекцыя рэгулярна складала акты аб нездавальняючым санітарным стане прадпрыемстваў, але мер да ліквідацыі парушэнняў і паляпшэнні сітуацыі не прымалася. Канстатаваўся кепскі стан вентыляцыі на многіх прадпрыемствах[4].

Прыцягненню ўвагі да ўмоў працы на прамысловых прадпрыемствах мела пастанова ЦК КПБ ад 29.10.1958 г. “Аб бяздушна-бюракратычных адносінах да вытворчых і бытавых патрэб працоўных на Магілёўскім заводзе штучнага валакна імя Куйбышава”[5].

Праблемы з забяспечэннем харчовымі і прамысловымі таварамі, побытавым забяспячэннем таксама з’яяляліся істотнымі фактарамі, якія ўплывалі на самаадчуванне працоўных калектываў.

З аднаго боку сфера побытавага забеспячэння не задавальняла патрэбы насельніцтва, а з іншага боку работнікі гэтай галіны працавалі нярэдка ў нездавальняючых умовах. Невыпадкова напачатку гэтага перыяду ў рэзалюцыі ХХ з’езда прадугледжвалася магчымасць больш хуткіх тэмпаў развіцця

---

[1] Справка об аварии на Гомельском кондитерском комбинате «Спартак» в 1958 г. ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 241. Арк. 234-237.

[2] Протокол №18 заседания бюро Гомельского обкома КП Белоруссии от 13 августа 1958 г. “О мерах по восстановлению главного производственного корпуса и реконструкции комбината "Спартак" // Там жа. Спр. 242. Арк. 266.

[3] Докладные «О выполнении постановления ЦК КПБ от 2 августа 1958 г. «О катастрофе на Гомельском комбинате «Спартак» // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 18. Спр. 270. Арк. 83-150.

[4] Письмо секретарю Гомельского ОК КПБ тов. Полякову И.Е. о неудовлетворительном исполнении закона о надзоре за санитарным состоянии промышленных,пищевыхи камунальных прдприятии гор. Гомеля со стороны санитарной инспекции отдела здравоохранения в 1958 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 242. Арк. 238.

[5] Справка Могилевскогообкома КПБ от 7 февраля 1959 г. “О выполнении постановление ЦК КП Белоруссии от 29 октября 1958 г. «О бездушно-бюрократическом отношении к производственным и бытовым нуждам трудящихся на Могилевском заводе искусственного волокна имени Куйбышева" // НАРБ. Ф. 4П. Воп. 18. Спр. 267. Арк. 1-5.

вытворчасці прадметаў народнага спажывання, павелічэнне аб’ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў два разы, развіццё сеткі грамадскага харчавання, павелічэння рэальнай заработнай платы ў сярэднім на 30 %, а рознічнага таваразавароту на 50 %[1]. У першай палове 1960 гг. Саветы дэпутатаў працоўных г. Гомеля разглядалі пытанне “Аб стане і мерах паляпшэння бытавога абслугоўвання насельніцтва”[2].

Праблема пабытавага аслугоўвання насельніцтва стаяла настолькі востра, што жніўня 1962 г. ЦК КПСС і СМ СССР ад 10 жніўня 1962 г. прынялі пастанову “Аб далейшым паляпшэнні бытавога абслугоўвання насельніцтва"[3]. Былі прадугледжаны не толькі аператыўныя меры дапамогі галіне, але і закладзена вытворчасць новай камунальнай прадукцыі і машын. Тым не менш, да праблемы ЦК КПСС вымушаны быў вярнуцца праз пяць гадоў у 1967 г. і распрацаваць новыя планы развіцці гэтай сферы, бо ўзровень работы галіны па-ранейшаму не задавальняў патрэбы насельніцтва[4].

Большая ўвага ў параўнанні з папярэдним часам пачала ўдзяляцца паляпшэнню ўмоў працы рабонікаў на прамысловых прадпрыемствах у 1960-я гг. Так, на пасяджэннях органаў улады і кантролю Гомельшчыны адзначалася правядзенне пэўных мерапрыемстваў у гэтай галіне. Тым не менш, іх выкананне зацягвалася, а сітуацыя на многіх прадпрыемствах яшчэ заставалася нездавальняючай.

Так, праверка ў сакавіку 1963 г. выявіла на гомельскіх заводах дахавых матэрыялаў і Сантэхдэталей шматлікія праблемы ў гэтай сферы. У пастанове Гомельскага Савета дэпутатаў працоўных ад 3 красавіка адзначалася, што на дахавым заводзе ў кепскім стане знаходзіліся побытавыя памяшканні, у якіх не хапала шафаў для рэчаў, душавыя былі няспраўныя, гардэробныя знаходзіліся ў нездавальняючым стане, тэрыторыя завода была захламлена, многія працаёмкія працэсы не былі механізаваны, у некаторых цэхах адсутнічала прытокавая вентыляцыя, не былі вырашаны пытанні тэхнікі бяспекі. На заводзе Сантэхдэталей былі падобныя праблемы з вентыляцыяй, з санітарным станам памяшканняў і побытавых памяшканняў, да таго ж многія памяшканні не ацяпляліся, што выклікала праступы і кішэчныя захворванні. Усе выяўленыя недахопы было прадпісана ліквідаваць да чэрвеня 1963 г.[5]

---

[1] XX съезд КПСС. 1956 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 16, 20, 68–71.

[2] Решение Гомельского Совета депутатов трудящихся «О состоянии и мерах улучшения бытового обслуживания населения гор. Гомеля». 21 мая 1963 г. // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8А. Спр. 28. Арк. 175.

[3] Постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР «О дальнейшем улучшении бытового обслуживания населения”. 10 августа 1962 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 270–281.

[4] Постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР “О мерах по дальнейшему развитию бытового обслуживания населения”. 26 августа 1967 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 252–262.

[5] Решение № 76 Гомельского Совета депутатов трудящихся «Об организации производства и состоянии условий труда завода кровельных материалов и Сантехдеталей». 3 апреля 1963 г. // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8А. Спр. 28. Арк. 71-72.

Для вырашэння праблем з побытавым забяспячэннем Гомельскі гарадскі Савет дэпутатаў 21.05.1963 г. прыняў спецыяльную пастанову “Аб стане і мерах паляпшэння бытавога абслугоўвання насельніцтва горада Гомеля”. Падрыхтоўка рашэння выявіла, што не ўсе бытавыя прадпрыемствы размешчаны ў добраўпарадкаваных памяшканнях, не наладжаны працэс іх матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, рад прадпрыемстваў абсталяваны састарэлымі станкамі і абсталяваннем, з-за чаго на іх вялікі аб’ём ручной працы і г. д.[1]

Сесія Гомельскага абласнога (прамысловага) Савета дэпутатаў працоўных абмяркоўвала стан і меры паляпшэння бытавога абслугоўвання насельніцтва 11.07.1963 г. Было канстатавана, што бытавым абслугоўваннем у вобласці займаюцца 79 прадпрыемстваў Упраўлення бытавага абслугоўвання з колькасцю работнікаў 17 735 чалавек, што аб’ёмы паслуг растуць, але былі вызначаны і тыповыя недахопы: нізкая якасць прадукцыі, брак прадукцыі ў працэсе яе вырабкі, растраты і раскраданне, якіх толькі за 1962 г. было зафіксавана 125 выпадкаў з сумай растрат і раскраданняў у 44 тыс. руб.[2] Існаванне падобных праблем у бытавой прамысловасці пры абмеркаванні іншых пытанняў падцвердзілі і наступныя чацвёртая і пятая сесіі абласнога Савета[3], XXIII з’езд камуністычнай партыі[4].

**Маральнае заахвочванне да працы** работнікаў прамысловасці**.** традыцыйна заставаліся адным са стымулаў павышэння працоўнага ўкладу работнікаў. Да маральных заахвочанняў адносіліся: падзякі, граматы, вымпелы, медалі і ордэны і г. д. Так, прадзільшчыца завода штучнага валакна імя Куйбышава Е. Белавусава ў 1960 г. за датэрміновае выкананне вытворчых заданняў шостай пяцігодцы была ўзнагароджана званнем Героя Сацыялістычнай Працы[5].

У пачатку 1960-х гг. на Магілёўскім металургічным заводзе імя Мяснікава ўпершыню ў СССР прымянілі арыгінальную тэхналогію паўнепарыўнай адліўкі труб, што павялічыла вытворчасць працы ў 5 разоў, дало эканомію ў 9 млн руб. Магілёўскія трубы сталі самымі таннымі ў СССР. Камітэт па навуцы і тэхніцы пры Савеце Міністраў СССР правёў на прадпрыемстве Усесаюзную канферэнцыю. Каб адзначыць поспехі работнікаў у 1966 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР група работнікаў Магілёўскага металургічнага завода была ўзнагароджана дзяржаўнымі ўзнагародамі: ардэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга былі ўзнагароджаны дырэктар А. Падабедаў і галоўны інжынер Г. Архіпаў, ордэнам Леніна – аператар заліўшчык А. Пашкевіч, ордэнам “Знак Пашаны” – старэйшы

---

[1] Решение Гомельского Совета депутатов трудящихся «О состоянии и мерах улучшения бытового обслуживания населения гор. Гомеля». 21 мая 1963 г. // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8А. Спр. 28. Арк. 175-176.

[2] Пратакол № 2 Сессии Гомельского областного (промышленного) Совета депутатов трудящихся 11 июля 1963 г. // Там жа. Спр. 3. Арк. 1-20.

[3] Пратакол № 4 Сессии Гомельского областного (промышленного) Совета депутатов трудящихся 21 декабря 1963 г. // Спр. 5. Арк. 7-21; Пратакол № 5 Сессии Гомельского областного (промышленного) Совета депутатов трудящихся 15 января 1963 г. // Там жа. Спр. 40. Арк. 6.

[4] XXIII съезд КПСС. 1966 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 16.

[5] Рыськов М. А. История Могилевского городского Совета депутатов (1917–2014 гг.). С. 108.

вальцоўшчык А. Віталёў, начальнікі цэхоў І. Ціхаміраў і М. Шульга. Тым жа ўказам быў узнагароджаны старшыня Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Г. Мануйла[1].

Вытворчае самакіраванне разглядалася не толькі як сродак рашэння вытворчых праблем, развіцця актыўнасці працоўных, але і як форма павышэння кадравага патэнцыялу прамысловасці. Нягледзячы на вялікія праблемы з функцыянаваннем творчых аб'яднанняў, наяўнасць вялікай колькасці грамадскіх фарміраванняў падавалася сведчаннем пашырэння дэмакратызацыі кіравання вытворчасцю, сродкам пошуку і падрыхтоўкі новых кадраў. Было пашырана перакананне, што чым болей работнікаў будзе ўдзельнічаць у разнастайных формах кіравання вытворчасцю, тым больш яно паспяховае. Лічылася, у тым ліку, што тым больш новых кіраўнікоў сацыялістычнай вытворчасцю будзе падрыхтавана.

Праблемы з выкарыстаннем кадраў у прамысловасці былі застарэлымі, а жаданне палепшыць ступень эфектыўнасці іх выкарыстання перманентнымі. З мэтай паляпшэння выкарыстання кадравага патэнцыялу прамысловасці партыйныя і гаспадарчыя органы імкнуліся палепшыць сістэму арганізацыі працы ў прамысловасці, прыдумаць новыя інавацыйныя формы арганізацыі працы. У другой палове 1960 гг. савецкае кіраўніцтва паспрабавала паставіць справу на навуковыя рэйкі. У пастанове ЦК КПСС “Аб рабоце Свярдлоўскай абласной і Рыбінскай гарадской партыйных арганізацый па ўкараненні навуковай арганізацыі працы ў прамысловасці і павышэнню культуры вытворчасці” ад 29.08.1967 г. рэкамендавалася распаўсюдзіць перадавой вопыт на іншых прадпрыемствах і ў іншых рэгіёнах[2].

Наяўнасць у работнікаў адпаведнай працоўнай этыкі з'яўляецца адной з умоў паспяховага развіцця прамысловасці. Адсутнасць устойлівай гарадской працоўнай этыкі ў былых вяскоўцаў з'яўлялася праблемай як для падтрымання працоўнай дысцыпліны, арганізацыі рытмічнага вытворчага працэсу, так нават і для санітарнага стану прадпрыемстваў. Прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі калектываў спрабавалі дапамагчы работнікам адаптавацца на вытворчасці, маральна заахвочвалі будаўнікоў сацыялізму, але соцыякультурныя праблемы недаацэньваліся, хаця і былі вельмі складанымі. Недысцыпліванасць, прагулы, п'янства, злачыннасць былі шырока распаўсюджаны сярод усіх катэгорый работнікаў прамысловасці.

У адпаведнасці з пануючай камуністычнай ідэалогіяй працаздольныя грамадзяне, якія ўхіляліся ад грамадска карыснай працы, вялі па тэрміналогіі таго часу “паразітычны лад жыцця” – былі дармаедамі. Адной з асаблівасцяў 1950–1980 гг. і спосабам барацьбы з “дармаедствам” стала кампанія па барацьбе з “абібокамі”. Яна праводзілася ў некалькі этапаў да самага канца існавання першай у свеце сацыялістычнай краіны. Яшчэ ў першай палове

[1] Рыськов М. А. История Могилевского городского Совета депутатов (1917–2014 гг.). С. 107–108.
[2] Постановление ЦК КПСС “О работе Свердловской областной и Рыбинской городской партийных организаций по внедрению научной организации труда в промышленности и повышению культуры производства”. 29 августа 1967 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 263–265.

1950 гг. пасля выхаду Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР "Аб мерах барацьбы з антыграмадскімі, паразітычнымі элементамі" (1951) распачалася барацьба з бадзягамі. Надалей пачаў абмяркоўвацца праект прыняцця спецыяльнага Закона, які б рэгуляваў гэтую сферу. У газетах ён быў апублікаваны ў 1957 г. Адпаведна інфармацыйнай запісцы аб выніках абмеркавання праекта Закона "аб узмацненні барацьбы з антыграмадскімі, паразітычнымі элементамі" у гарадах і раёнах Магілёўскай вобласці на сходах у 1958 г. прысутнічала больш за 450 тыс. працоўных, з якіх каля 10 тыс. прынялі ўдзел у абмеркаванні праекта. Усе выступоўцы "горача падтрымалі" праект Закона і палічылі, што ён будзе садзейнічаць умацаванню працоўнай дысцыпліны на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах і на прадпрыемствах[1].

У 1961 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў указ "Аб узмацненні барацьбы з асобамі, якія ўхіляюцца ад грамадска карыснай працы і вядуць антыграмадскі паразітычны лад жыцця". Дармаеды падвяргаліся высяленню ў спецыяльна адведзеныя мясцовасці на тэрмін ад двух да пяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці, нажытай непрацоўнымі шляхам, і абавязковым прыцягненнем да працы. У 1965 г. указ адкарэктавалі, каб "дармаеды" мелі магчымасць працаваць па месцы жыхарства. У такім выглядзе гэтае заканадаўства праіснавала амаль тры дзесяцігоддзі да прыняцця ў красавіку 1991 г. закона "Аб занятасці насельніцтва", які адмяніў крымінальную адказнасць за дармаедства і легалізаваў тэрмін "беспрацоўе".

**Спробы развіцця вытворчага самакіравання як формы павышэння кадравага патэнцыялу прамысловасці.** Адпаведна тэарэтычным абгрунтаванням класікаў марксізму-ленінізму будаўніцтва новага грамадства проста залежала ад ступені актыўнасці і ініцыятывы працоўных, а таксама іх уключанасці ў кіраванне вытворчасцю. Праўда, ужо ў міжваенны перыяд тэрмін "самакіраванне" паступова ў СССР быў выцеснены слоганам "далучэнне працоўных да кіравання вытворчасцю", паколькі ён пачаў супярэчыць сістэме камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання эканомікай, якая ўмацоўвалася ў гэты час. Па меры росту складанасці вытворчасці, узроўню адукацыі і кваліфікацыі ўсіх удзельнікаў прамысловай вытворчасці ўзрастала важнасць зацікаўленасці і ініцыятывы работніка. Гэтую праблему рознымі сродкамі спрабавалі вырашыць усе індустрыяльныя краіны ў другой палове XX стагоддзя. Асабліва актуальная яна была ў краінах, якія ўзялі курс на пабудову сацыялізму. Яе рашэнне арганічна ўпісвалася ў тэарэтычныя мадэлі сацыялізму, у якіх абвяшчалася, што кіраванне народнай гаспадаркай здзяйсняецца ў інтарэсах народа і пры яго непасрэдным удзеле.

Пытанні далучэння працоўных да кіравання вытворчасцю знаходзілі адлюстраванне ў рашэннях КПСС, але слаба рэалізоўваліся на практыцы. Новы этап намеціўся пасля правядзення XX з'езда КПСС, які прайшоў у 1956 г. У рэзалюцыі па справаздачнаму дакладу Цэнтральнага камітэта ставілася задача

[1] Информационная записка об итогах обсуждения проекта Закона «Об усилении борьбы с антиобщественными, паразитическими элементами» в городах и районах Могилевской области // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 508. Арк. 1.

“павышэння творчай актыўнасці і ініцыятывы працоўных, яшчэ больш шырокага ўдзелу мас у кіраванні дзяржавай, ва ўсёй яе арганізацыйна-гаспадарчай дзейнасці”, для чаго прадугледжвалася развіваць “савецкі дэмакратызм”[1].

У межах уяўленняў таго часу быў здзейснены шэраг мер, накіраваных на “ўдасканаленне дэмакратычных прынцыпаў кіравання эканомікай”, у тым ліку і далучэнне працоўных да яе кіравання. Апошняе сярод іншага павінна было павысіць і кадравы патэнцыял прамысловасці шляхам рэкрутавання маладых кіраўнікоў з таленавітых работнікаў з нізавых прыступак прамысловай іерархічнай лесвіцы.

Невыпадкова другая палова 1950–1960 гг. характарызуюцца росквітам утварэння разнастайных грамадскіх аб’яднанняў на прадпрыемствах рэспублікі. Паколькі адпаведна марксісцкім уяўленням найбольш прагрэсіўнай сілай грамадства з’яўляўся рабочы клас, то яму і адводзілася рашаючая роля ў органах самакіравання на вытворчасці. Як падкрэсліваў У. І. Ленін, – неабходна “орабочить нашы аппараты, – привлечь ещё больше рабочих и трудящихся крестьян к управлению промышленностью и народным хозяйством вообще…”[2]. Далучэнне нізавых работнікаў, у першую чаргу рабочых, да кіравання прадпрыемствамі, розныя формы іх навучання, перш-наперш завочныя, разглядаліся, кажучы сучаснаю мовай, як сродак павышэння кадравага патэнцыялу прамысловасці.

Адной з самых масавых форм далучэння работнікаў да кіравання вытворчасцю ў 1950–1960 гг. лічыліся вытворчыя нарады. Яны ствараліся на ўсіх узроўнях арганізацыі вытворчасці: у брыгадах, на ўчастках, у цэхах і на прадпрыемствах. На іх павінны былі абмяркоўвацца ўсе асноўныя вытворчыя пытанні. Вытворчыя нарады, якія ўзніклі яшчэ ў 1920 гг., у канцы 1950 гг. перажывалі рэнесанс. Партыйныя і прафсаюзныя органы зноў пачалі пільна сачыць за іх функцыянаваннем, расла іх колькасць. У свеце рашэнняў XX з’езда партыі ЦК КПБ патрабаваў павысіць ролю вытворчых нарад і выносіць на іх самыя важныя пытані вытворчасці.

Нягледзячы на спробы рэанімацыі, дзейнасць вытворчых нарад не задавальняла ні нізавых работнікаў, ні вышэйшыя эшалоны ўлады. Многія камуністы адзначалі, што толькі на асобных прадпрыемствах нарады работалі няблага. Агульнае незадавальненне лідараў прафсаюзаў у 1956 г. выклікала тое, што ва многіх выпадках вытворчыя нарады функцыянавалі фармальна, скліkаліся нерэгулярна і мала адрозніваліся ад планёрак, на іх прымалася вельмі мала прапаноў. На месцах былі праведзены пленумы, сходы і нарады, накіраваныя на паляпшэнне іх дзейнасці. Спрабуючы рэанімаваць дзейнасць вытворчых нарад снежаньскі (1957) пленум ЦК КПСС, а затым студзеньскі (1958) пленум ВЦСПС прынялі рашэнне аб пераўтварэнні іх на буйных і

[1] XX съезд КПСС. 1956 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 22.
[2] Ленин В. И. Письмо к организациям РКП о подготовке к партийному съезду // Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 40. С. 143.

сярэдніх прадпрыемствах у "пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады" пад кантролем прафсаюзаў. Цэнтр цяжару працы нарадаў быў перанесены на цэхі і прадпрыемствы. Яны абіраліся на прадпрыемствах з колькасцю работнікаў звыш 100 чалавек. Адначасова адбылося некаторае пашырэнне правоў прафсаюзаў на прамысловых прадпрыемствах. Прафсаюзы сталі ўдзельнічаць у размеркаванні жылля, пуцёвак і г. д.

Са студзеня 1958 г. пачаўся хуткі колькасны рост пастаянна дзеючых вытворчых нарадаў. Ужо праз паўгода ў БССР іх было створана 1 757, а да 1965 г. іх колькасць вырасла да 3 971. У іх было абрана 165 тыс. чалавек, у тым ліку 67,5 % рабочых. Напачатку дзейнасць пастаянна дзеючых вытворчых нарадаў мела станоўчыя вынікі на некаторых прадпрыемствах, будзіла ініцыятыву рабочых і служачых. Але адначасова з самага пачатку іх утварэнне і дзейнасць набылі ўсе характарыстычныя рысы масавай кампаніі з паспешнымі выбарамі, неразуменнем задач і функцый, разрывам паміж выбарамі і пачаткам дзейнасці, ліпавымі справаздачамі і нават прамымі фальсіфікацыямі. Назіралася фармальная прысутнасць на нарадах рабочых, рэальны ўдзел толькі кіраўніцкіх работнікаў. Прычым іх дзейнасць з гадамі не толькі не паляпшалася, а мела тэндэнцыю да пагаршэння. Калі ў 1960 г. статыстыка зафіксавала 30 тыс. прапаноў на такіх нарадах, то ў 1963 г. – толькі 25 тыс. Як толькі ўвага партыйных органаў да дзейнасці вытворчых нарадаў знізілася, іх дзейнасць пачала ўсё больш фармалізавацца. Увогуле, вытворчыя нарады паказалі сваю нізкую эфектыўнасць у выкананні галоўнай задачы – далучэнні работнікаў да кіравання прадпрыемствамі[1]. Падобнай была сітуацыя і ў рэгіёнах Беларусі, напрыклад на Магілёўшчыне[2]. Уплыў гэтай формы рэкрутавання работнікаў у сферу кіравання прамысловасцю быў нізкім, але і адмаўляць яго цалкам нельга. Работнікі мелі шанс паказаць сябе ў працэсе іх дзейнасці і стаць прэтэндэнтам на больш высокія пасады, і частка з іх карысталася такой магчымасцю.

У перыяд, які вывучаецца, існавалі і іншыя формы прыцягнення рабочых і служачых да кіравання вытворчасцю: заключэнне калектыўных дамоў, правядзенне рабочых сходаў, дзейнасць на прадпрыемствах разнастайных творчых аб'яднанняў. Вынаходніцтва і стварэнне апошніх стала характэрнай рысай часу кіравання краінай М. Хрушчовым. Яны лічыліся адным са сродкаў прыцягнення і падрыхтоўкі новых кадраў. У гэтыя гады ўзніклі і хутка распаўсюдзіліся на прамысловых прадпрыемствах Беларусі грамадскія канструктарскія бюро, грамадскія бюро эканамічнага аналізу, саветы наватараў, грамадскія аддзелы і інстытуты, творчыя комплексныя брыгады, групы грамадскіх інспектароў і г. д. Час узнікнення большасці з іх – канец 1950 – першая палова 1960 гг. Па-ранейшаму працягвалі дзейнасць Усесаюзнае таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў, навукова-тэхнічныя таварыствы, пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады. У іх былі шырока прадстаўлены рабочыя і служачыя прамысловых прадпрыемстваў. Тым не менш, найбольш

---

[1] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат дис… к. и. н. Минск, 1992. С. 12–13.
[2] Агеев А. Г. Производственные совещания на предприятиях Могилевской области в 1956–1965 гг. // Могилевщина. 1991. С. 60–63.

актыўна ўдзельнічалі ў іх дзейнасці не шырокія масы работнікаў, а грамадскі актыў. Актывістаў і передавікоў нярэдка літаральна цягалі па разнастайных сходах і нарадах.

На 1965 г. на заводах і фабрыках БССР дзейнічала каля 6 тыс "творчых арганізацый", у якіх удзельнічала больш за 52 тыс. рабочых і служачых[1]. Для параўнання варта прывезці колькасць грамадскіх самадзейных арганізацый у сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці, якіх на пачатак гэтага года было створана больш за 12 тыс. з колькасцю ўдзельнікаў 83 тыс. чалавек, у тым ліку на прамысловых прадпрыемствах гэтых раёнаў[2]. Дзейнасць "творчых арганізацый" праходзіла дастаткова падобныя стадыі развіцця. Яны ўзнікалі як адлюстраванне патрэбы ў паляпшэнні працы на канкрэтным участку работы, "вузкім месцы" вытворчасці ці з прычыны жадання выслужыцца, паказаць сябе з найлепшага боку ў вачах вышэйстаячага начальства. Узнікненне ішло або па ініцыятыве знізу, або па ўдалай прапанове зверху. Ініцыятыва ў хрушчоўскі час падтрымлівалася, бо быць рэтраградам і кансерватарам было непрастыжна і небяспечна. Вобразы наватараў і кансерватараў тыражыраваліся ў сродках масавай інфармацыі, неабходнасць прагрэсу усяляк маральна заахвочвалася. Новая ініцыятыва прыцягвала да сябе ўвагу і часцей за ўсё падтрымлівалася, пасля чаго пачыналася кампанія па яе пашырэнні. Пад ціскам зверху вопыт абагульняўся і прапагандаваўся, а новыя аб'яднанні пачыналі ствaрацца на іншых заводах і фабрыках, установах без уліку іх неабходнасці, наяўнасці лідараў і без неабходнай падрыхтоўкі. Такая звышаператыўнасць і кампанейшчына нярэдка дыскрэдытавала пачынанне. Мноства аб'яднанняў існавалі фармальна, ніякай канкрэтных пытанняў не рашалі, працы не праводзілі. З цягам часу фармальная, а не рэальная актыўнасць работнікаў стала характэрнай для многіх грамадскіх арганізацый на прамысловых прадпрыемствах.

Нягледзячы на вялікія праблемы з функцыянаваннем творчых аб'яднанняў, наяўнасць вялікай колькасці грамадскіх фарміраванняў падавалася сведчаннем пашырэння дэмакратызацыі кіравання вытворчасцю, сродкам пошуку і падрыхтоўкі новых кадраў. Было пашырана перакананне, што чым болей работнікаў будзе ўдзельнічаць у разнастайных формах кіравання вытворчасцю, тым больш яно паспяховае, у тым ліку лічылася, што тым больш новых кіраўнікоў сацыялістычнай вытворчасцю будзе падрыхтавана.

Па сутнасці гэта было вульгарнае ўяўленне аб "пераходзе колькасці ў якасць", якім падмянялі гегелеўскі закон аб пераходзе колькасных зменаў у якасныя. На некаторых прадпрыемствах БССР колькасць грамадскіх аб'яднанняў пераходзіла мяжу мэтазгоднасці. Так, на Мінскай тытунёвай фабрыцы ў 1965 г. пры колькасці 260 работнікаў дзейнічала 21 грамадская арганізацыя, у якіх было задзейнічана 611 чалавек[3]. Лічбавыя паказчыкі і

[1] Агеев, А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат. С. 13.

[2] Справка об опыте привлечения трудящихся к участию в работе местных Советов Могилевской области. 15.11.1964 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1007. Арк. 5.

[3] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат. С. 14.

выдумванне ўсё новых арганізацый нярэдка станавіліся самамэтай. Удзел большасці работнікаў у кіраванні вытворчасцю быў фармальным, меў дарадчы характар. У большасці арганізацый адсутнічала самадзейнасць і самарэгуляцыя. Дэкларатыўнасць далучэння работнікаў да кіравання вытворчасцю падрывала давер і кампраментавала саму ідэю.

Для фактычнага, а не фармальнага далучэння работнікаў да кіравання вытворчасцю неабходна было як мінімум адладзіць механізм адбору і ўкаранення паступаўшых прапаноў, павысіць інфармаванасць і асабістую зацікаўленасць работнікаў у справах вытворчасці. А для гэтага патрэбны быў бы пераход ад камандных спосабаў кіравання эканомікай да больш дэмакратычных метадаў, ломка ўжо звычнай псіхалогіі кіравання, адпрацоўка механізмаў зваротнай сувязі. Нарэшце для гэтага неабходна была і агульная дэмакратызацыя грамадства. У 1950 – першай палове 1980-х гг. такіх зменаў не адбылося.

Аналіз архіўных крыніц і навуковых публікацый паказвае, што рэфармаванне сістэмы кіравання, барацьба з бюракратызмам, правядзенне арганізацыйных мерапрыемстваў, узмацненне кантролю па рашэнні выяўленых праблем у кадравай палітыцы ў прамысловасці БССР давала кароткатэрміновы станоўчы эфект, але не прыводзіла ў стратэгічным плане да іх вырашэння або выкараненні. Так, спробы зменшыць цякучасць кадраў у прамысловасці паказала, што наяўнасць або адсутнасць рэпрэсіўнага заканадаўства непасрэдна не ўплывае на рухомасць кадраў і іх замацаванне на прадпрыемствах. Больш эфектыўнымі аказаліся меры па паляпшэнні ўмоў працы на вытворчасці, клопат пра сацыяльна-побытавыя ўмовы жыцця работнікаў. Больш эфектыўнымі для павышэння кадравага патэнцыялу паказалі сябе арганізацыйныя і адукацыйныя мерапрыемствы, адлажванне сістэмы падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў, паляпшэнне ўмоў працы работнікаў прамысловасці, якое пачало назірацца на прадпрыемствах рэспублікі ў гэты час. Вытворчае самакіраванне разглядалася кіраўніцтвам СССР не толькі як сродак рашэння вытворчых праблем, развіцця актыўнасці працоўных, але і як форма павышэння кадравага патэнцыялу прамысловасці. Аднак многія праблемы і недахопы мелі ўнутрана ўласцівыя савецкай сістэме кіравання прычыны, а іх рашэнне дырэктыўнымі метадамі насіла ярка выражаны кампанейскі характар.

### 2.3 Уплыў грамадска-палітычных, эканамічных і сацыякультурных фактараў на змест і фарміраванне кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР у 1970–1991 гг.

Палітычнае і эканамічнае спаборніцтва з ідэалагічным праціўнікам – капіталістычнымі краінамі, грандыёзныя планы сацыяльна-эканамічнага развіцця, выклікі новага часу, найперш звязаныя з навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй, запавольванне тэмпаў росту вытворчасці і нарастанне іншых негатыўных з’яў і эканамічных праблем выклікала ў 1970-х гг. імкненне іх вырашэння традыцыйнымі для савецкай краіны адміністрацыйна-каманднымі

метадамі кіравання, узмоцненым ідэалагічным уздзеяннем. Гэты працэс быў сістэмны, ахапіў не толькі эканоміку, а закрануў у той ці іншай ступені ўсе бакі грамадскіх адносін, у тым ліку працу з кадрамі. Як адзначаюць даследчыкі К. Барвінок і І. Саракавік, працэс "быў выкліканы як прыходам да ўлады Л. Брэжнева і яго каманды, так і наступствамі "пражскай вясны" 1968 г. Страх распаўсюджвання чэхаславацкіх падзей 1968 г., якія разглядаліся кіраўніцтвам Савецкага Саюза як падрыў асноў сацыялізму, прымусіў яго хіснуцца ўправа, па сутнасці, перайсці да неасталінізму, узмацніць націскныя, адміністрацыйныя меры кіравання"[1].

У пэўнай ступені гэта адбілася і на кадравай палітыцы ў прамысловасці. Для Л. Брэжнева і яго акружэння неабходна была стабільнасць у грамадстве і дзяржаве, але найперш гарантыя стабільнасці яго ўладнага становішча. Меркавалася, што яго можна дасягнуць у тым ліку і за кошт падабраных кадраў. Такі падыход прыводзіў да таго, што ўсякі начальнік, капіруючы вышэйшых, стараўся не толькі стварыць сваю "каманду", але і распаўсюдзіць уплыў усюды, дзе толькі магчыма, праз вылучэнне сваіх надзейных людзей на ўсіх ступенях іерархічнай лесвіцы ўлады і кіравання. Пры гэтым, як слушна зазначае акадэмік М. Касцюк, "кіраўнікі розных узроўняў, пачынаючы з генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. Брэжнева, падбіралі сабе акружэнне не столькі па прафесійных якасцях работнікаў, колькі па іх асабістай адданасці"[2]. У БССР пры першым сакратары ЦК КПБ П. Машэраве (1965–1980) гэта тэндэнцыя хаця і мела месца, але не была так яскрава выяўлена, як у іншых рэгіёнах СССР.

Вядома, што найбольшая аддача ад працы на адной пасадзе прыходзіцца на чацвёрты-пяты гады, затым эфектыўнасць працы паступова пачынае зніжацца. Таму неабходна праз пяць-шэсць гадоў пераводзіць работніка ці на раўназначную па гарызанталі іншую ці на больш высокую пасаду па вертыкалі. Але многія кіраўніцкія работнікі працавалі ў міністэрствах БССР па 10–20 гадоў на адной пасадзе, падобная сітуацыя была і ў сферы кіравання ўстановамі і прамысловымі прадпрыемствамі. Такая "стабільнасць" выклікала тое, што многія кіраўнікі розных узроўняў па вертыкалі лічылі сябе незаменнымі, прытрымліваліся правіла "ўгадаць", "дагадзіць" толькі свайму начальніку. Назначэнцы вышэйстаячых кіраўнікоў адразу апыналіся па-за зонай крытыкі і набывалі неафіцыйны статус недатыкальных. У такіх асоб на першае месца ставілася не праца, а яе імітацыя, імкненне ўтрымацца і вылучыцца на больш высокую пасаду. У выніку, такая пазіцыя прыводзіла да застою ва ўсіх сферах жыццядзейнасці дзяржавы.

**Прамысловае і сацыяльнае развіццё** непасрэдна ўплывае на фарміраванне кадравага патэнцыялу. На ўсходзе Савецкай Беларусі ў выніку эканамічнага развіцця шэраг гарадоў пераўтварыліся ў буйныя прамысловыя цэнтры не толькі рэспублікі, але і ўсяго СССР. Варта асабліва адзначыць абласныя цэнтры – Віцебск, Гомель, Магілёў і раённыя: Бабруйск, Полацк

[1] Барвінок К. І., Саракавік І. А. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах XX ст. С. 69–70.
[2] Касцюк М. П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. С. 278.

(Новаполацк), Орша, Светлагорск і іншыя. Некаторыя прадпрыемствы, што існавалі ў іх, былі на той час найбуйнейшымі ў Еўропе.

Павялічылася колькасць насельніцтва Віцебска, Гомеля, Магілёва, Бабруйска, Оршы, Наваполацка, Крычава, Рэчыцы і шэрагу іншых гарадоў, Далейшае развіццё атрымалі транспарт і сувязь. Палепшалася якасць і добраўпарадкаванне жыллёвага фонду, значна ўзрос узровень газіфікацыі кватэр. Пэўная ўвага надавалася далейшаму развіццю асветы, культуры, аховы здароўя, паляпшэнню ўмоў працы і адпачынку працаўнікоў. Толькі за IX пяцігодку ў Магілёўскай вобласці пабудавалі і ўвялі ў эксплуатацыю 97 дзіцячых дашкольных устаноў, 3 кінатэатры на 1 200 месцаў, чатыры бальніцы на 1 792 ложкі і 6 паліклінік. Атрымалі новыя кватэры і палепшылі жыллёвыя ўмовы каля 275 тысяч чал.[1] Сістэматычна праводзіліся работы па развіцці камунальнай гаспадаркі і добраўпарадкаванне гарадоў. Пры гэтым актыўна руйнаваліся гістарычныя цэнтры, напрыклад, забудова вуліцы Першамайскай у Магілёве, і знішчаліся помнікі архітэктуры.

За 1971–1975 гг. аб’ём прамысловай вытворчасці прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці павялічыўся на 86 %. Выпрацоўка электраэнергіі ў параўнанні з 1970 г. узрасла ў 2,6 разы, вытворчасць сельскагаспадарчых машын – у 2,4 разы, канструкцый і дэталяў зборных жалезабетонных – на 85 %, хімічных валокнаў – у 2,8 разы. Прадукцыйнасць працы павысілася на 46,3 %[2]. Выпуск прадукцыі ў Гомельскай вобласці за 5 год павялічыўся на 58 %, рост вытворчасці працы склаў каля 36 %. Асноўныя вытворчыя фонды павялічыліся ў 1,6 разы, фондаўзброенасць у 1,4 раза. Аб’ём станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці павялічыўся больш чым у 2,5 разы, прыборабудаўніцтва ў 3,5 раза. Створана новая галіна прамысловасці – нафтаперапрацоўчая[3].

Грашовыя даходы насельніцтва павялічыліся ў параўнанні з 1970 г. на 39,6 %, а ў разліку на душу насельніцтва – на 38,2 %. Заробак рабочых і служачых узрос на 17,5 %, даходы калгаснікаў на 28,6 %, пенсіі і пасобія на 52,7 %. У 1975 г. завяршыўся працэс увядзення мінімуму заробку – 70 руб. у месяц і павышэння ставак і акладаў сярэднеаплочваемым рабочым і служачым вытворчых галін. Павялічыліся памеры даплат рабочым прамысловасці за працу ў начны час. З 1974 г. праводзілася пагашэнне дзяржаўных пазык, раней размешчаных па падпісцы сярод насельніцтва[4].

У той жа час на працягу шэрагу гадоў партыйнае і гаспадарчае кіраўніцтва не магло дамагчыся паляпшэння выкарыстання асноўных вытворчых фондаў. Сотні мільёнаў рублёў, укладзеных дзяржавай у развіццё шэрагу прадпрыемстваў, не давалі належнай аддачы. Асноўная прычына падзення фондааддачы заключалася ў павольным засваенні вытворчых

[1] Доклад “Основные итоги развития народного хозяйства Могилевской области за 1971–1975 годы” // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 2. Арк. 4-6.
[2] Там жа. Арк. 1-2.
[3] Пратакол XIX Гомельскай абласной партыйнай канферэнцыі (1975) // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 12.
[4] Доклад “Основные итоги развития народного хозяйства Могилевской области за 1971–1975 годы” // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 2. Арк. 5.

магутнасцей, нізкім каэфіцыенце зменнасці, вялікіх простоях машын і абсталявання. Недахопы ў планаванні прыводзілі да таго, што 67 % аб’ектаў будоаўніцтва прадугледжваліся да здачы ў чацвёртым квартале, а гэта азначала штурмаўшчыну, перарасход матэрыялаў, масу недаробак, нізкую якасць, дэфіцыт працоўнай сілы. На частцы прадпрыемстваў стабільна не выконвалі план па аб’ёму рэалізацыі прадукцыі і прадукцыйнасці працы, узровень механізаванасці дапаможных працэсаў складаў 20–40 %, т. ч. ручная праца 60–80 %[1].

Недахопы ў рабоце прамысловых прадпрыемстваў шмат у чым былі выкліканы пралікамі ў кіраўніцтве імі, няўменні на поўную сілу выкарыстоўваць велізарны патэнцыял інжынернай думкі і дасягненняў навукі. Не надавалася дастаткова ўвагі ўмацаванню вытворчасці кваліфікаванымі і дасведчанымі спецыялістамі, павольна вырашаліся пытанні замены работнікаў, якія не спраўляліся са сваімі абавязкамі, дапускалася прызначэнне на інжынерна-тэхнічныя пасады асоб, якія не мелі спецыяльных ведаў. Заўважалася схільнасць кадраў да састарэлых форм і метадаў працы. Павярхоўны падыход не дазваляў знаходзіць аптымальныя рашэнні складаных праблем, ліквідацыі прычын, якія спараджалі недахопы.

Рэспубліка адставала ад іншых рэгіёнаў краіны па колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя, увядзенне новых прамысловых прадпрыемстваў стварала дэфіцыт інжынерных кадраў, асабліва ў галіне машынабудавання, вылічальнай тэхнікі, аўтаматызаваных сістэм кіравання.

**Тэхнічны ўзровень прамысловасці і падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў.** Партыйна-савецкае кіраўніцтва БССР патрабавала ад рэгіянальных уладаў павышэння тэхнічнага ўзроўню прамысловай вытворчасці, скарачэння тэрмінаў укаранення дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць, стымулявання творчага пошуку, узмацнення сувязі навукі з вытворчасцю. Для гэтага прапаноўвалася вылучаць ў кіраўніцтва прадпрыемствамі маладых і здольных спецыялістаў, якія валодалі ўменнямі паспяхова вырашаць складаныя задачы навукова-тэхнічнага прагрэсу і працаваць з перспектывай; павышаць веды рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў у галіне сучаснай тэхнікі, арганізацыі і эканомікі вытворчасці; наладзіць на кожным прадпрыемстве дакладную і аператыўную сістэму навукова-тэхнічнай інфармацыі; дамагчыся, каб кожны спецыяліст удзельнічаў ва ўдасканаленні вытворчасці, быў прыхільнікам новага і перадавога, непрымірыма ставіўся да праяў тэхнічнага кансерватызму і коснасці[2].

У адказ абласное кіраўніцтва рапартавала, што імі праводзілася пэўная праца з кадрамі па авалоданні імі перадавымі метадамі гаспадарання, укараненні новай тэхнікі, павышэнні якасных паказчыкаў. Адбыліся шэраг навукова-тэхнічных і практычных канферэнцый, семінараў з кіраўнікамі, спецыялістамі, сакратарамі партыйных арганізацый па праблемах навуковага кіравання вытворчым калектывам, якасці прадукцыі, росту прадукцыйнасці

[1] Протокол заседания бюро Могилёвского ОК КПБ от 10.06.75 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 37. Арк. 8-9.
[2] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. С. 286.

працы і культуры вытворчасці, удасканаленню арганізацыі дапаможнай вытворчасці і г. д.

На кожным прадпрыемстве, у кожнай арганізацыі былі распрацаваны перспектыўныя планы тэхнічнага пераўзбраення вытворчасці на аснове дасягненняў навукі і тэхнікі, праграмы мер па далейшаму развіццю навукова-тэхнічнага прагрэсу і эканамічнай адукацыі рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, якія прадугледжвалі рэканструкцыю вытворчасці, распрацоўку і ўкараненне новых тэхналогій, комплекснае механізаванне і аўтаматызацыю вытворчасці[1]. Замінала паспяховай рэалізацыі тое, што яны збольшага заставаліся на паперы або рэалізоўваліся неахайна і ў недастатковым аб'ёме. Аб чым сведчаць факты аб неэфектыўным выкарыстанні сучаснага на той час абсталявання, нават набытага за мяжой. Так, на пачатак 1971 г. на прадпрыемствах г. Орша мелася неўстаноўленага абсталявання – 928 адзінкі на суму 1,3 млн руб., у тым ліку на льнокамбінаце 294 адзінкі на суму 227,8 тыс. руб., заводзе "Легмаш" 114 адзінак на суму 327,3 тыс. руб.[2] У 1980-я гг. вялікая колькасць неўстаноўленага імпартнага абсталявання знаходзілася на складах ВА "Бабруйскшына"[3], Аршанскіх заводаў: прыбораў аўтаматычнага кантролю, "Чырвоны барацьбіт", інструментальнага, "Металіст", ільно і мясакамбінатаў[4]. У Магілёўскай вобласці (1984) пераважная большасць неўстаноўленага імпартнага абсталявання на суму 77,2 млн. руб. знаходзілася на складах ВА "Хімвалакно" (на суму 13 млн 809 тыс. руб.) і "Бабруйскшына" (61 млн 869 тыс. 700 руб.)[5]. Прычыны – несвоечасовая здача аб'ектаў у эксплуатацыю і нізкія тэмпы мадэрнізацыі прадпрыемстваў.

Адсутнасць або недахоп складскіх памяшканняў на прадпрыемствах прыводзілі да таго, што значная частка абсталявання доўгі час захоўвалася на адкрытых пляцоўках. Там абсталяванне прыходзіла ў непрыдатнасць і псавалася. У 1980 г. на адкрытых пляцоўках ВА "Хімвалакно" захоўвалася імпартнае абсталяванне фірмы "Удэ" на агульную суму 175 млн 500 тыс. марак ФРГ[6]. Месцы складзіравання практычна не ахоўваліся. У выніку, былі шматлікія выпадкі крадзяжоў, асабліва электроннай апаратуры. Так, на ВА

---

[1] Отчётный доклад Могилёвского обкома КПБ XIX областной партийной конференции (23–24.12.1975 г.) за период с февраля 1974 по декабрь 1975 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 1. Арк. 6-64; Пратакол XVII Гомельскай абласной партыйнай канферэнцыі. 1971 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 137. Спр. 55. Арк. 18; Пратакол XIX Гомельскай абласной партыйнай канферэнцыі (1975) // Там жа. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 39; Справка о проведенной работе по ускорению внедрения научно-технического прогресса на Оршанском инструментальном заводе (1986) // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1050. Арк. 15.

[2] Резервы и возможности для успешного выполения пятилетнего плана на 1971-1975 гг. промышленностью г. Орша Витебской области // ЗДАОрш. Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23. Арк. 22.

[3] Справка о рассмотрении Бобруйским горкомом КПБ докладной записки УВД Могилёвского облисполкома от 17.06.1980 г. "О состоянии сохранности социалистичекой собственности в ПО "Бобруйскшина" // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 178. Спр. 121. Арк. 18.

[4] Об итогах переписи неустановленного оборудования на предприятиях и в организациях г. Орша // ЗДАОрш. Ф. 86. Воп. 7. Спр. 120. Арк. 117, 120.

[5] Информация о неустановленном импортном оборудовании на предприятиях Могилёвской области от 21.03.1984 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 175. Спр. 72. Арк. 51,52.

[6] 1 долар ЗША – 2 маркі ФРГ (1978 г.), 1,82 маркі (1980 г.), 2,55 маркі (1983 г.); у сярэдзіне 1980-х гг. адзін савецкі рубель – тры маркі ФРГ, курс 1986 г.: 100 марак ФРГ – 33,92 руб.

“Бабруйскшына” у 1979 г. былі разукамплектаваны і скрадзены электронныя блокі трох камп’ютараў на агульную суму звыш 500 тыс. руб.[1]

Развіццё навукаёмкай вытворчасці запатрабавала актывізаваць у 1981–1985 гг. падрыхтоўку інжынерных кадраў па кірунках: “Сістэмы аўтаматызаванага праектавання”, “Аўтаматызацыя і комплексная механізацыя хіміка-тэхналагічных працэсаў”, “Робататэхнічныя сістэмы”, “Будаўніцтва цеплавых і атамных электрастанцый”, “Паўправадніковыя і мікраэлектронныя прыборы” і інш. Калі ў 1971 г. кадры рыхтаваліся па 165 спецыяльнасцях, то ў 1985 г. – па 2 056. За 1981–1984 гг. выпуск спецыялістаў у галіне электроннай тэхнікі і аўтаматызацыі вырас на 27,5 %, комплекснай механізацыі, машынабудавання – на 45 %, аўтаматызаваных сістэм кіравання на – 66 %. Колькасць спецыялістаў па эксплуатацыі і наладцы станкоў з праграмным кіраваннем павялічылася ў 2,4 раза, рамонту і абслугоўванню бытавой радыёэлектроннай тэхнікі – у 5,5 разоў і г. д.[2]

У адпаведнасці з Пастановаю СМ БССР № 335 ад 12.11.1985 г. Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і падведамаснымі ўстановамі адукацыі рэалізоўвалася Комплексная праграма па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў у вобласці стварэння і эксплуатацыі робататэхнічных комплексаў (РТ), гнуткіх вытворчых сістэм (ГВС) і сістэм аўтаматызаванага праектавання (САПР). У 8 ВНУ (БПІ, БДУ, МРТІ, ММІ, ВТІЛП, БТІ, НПІ і МТІ) падрыхтавалі спецыялістаў, атрымаўшых падрыхтоўку ў галіне РТ, ГВС, САПР у колькасці 1 274 чал. Акрамя таго: у Мінскім палітэхнічным тэхнікуме ў 1987 г. адбыўся першы выпуск тэхнікаў па спецыяльнасці 0663 “Эксплуатацыя прамысловых робатаў” у колькасці 27 чал., у 1988 г. – 820, у 1989 г. – 846, у 1990 г. – 1 108 спецыялістаў[3].

Павышэнню ўзроўню падрыхтоўкі інжынерных кадраў спрыяла навукова-даследчая работа, якая вялася ў вышэйшай школе. Дзейнічалі студэнцкія канструктарскія бюро, навуковыя гурткі, расла папулярнасць навукова-тэхнічных канферэнцый, студэнцкія навуковыя даследаванні садзейнічалі папаўненню творчых калектываў вучоных інстытутаў. У БССР колькасць студэнтаў, прыцягнутых да выканання дзяржбюджэтных навукова-даследчых прац кафедр, дасягнула 34,7 % у 1985 г. супраць 23,1 % у 1981 г.[4]

Патрабаванні тэхнічнага прагрэсу ў вытворчасці спрыялі стварэнню вучэбных кафедр на вядучых прадпрыемствах БССР. Так, у пачатку 1970-х гг. на Мінскім трактарным заводзе была створана кафедра калёсных трактароў Беларускага політэхнічнага інстытута. 03.09.1975 г. на Беларускім аўтамабільным заводзе пачала дзейнічаць кафедра вялікагрузных аўтамабіляў, якую ўзначаліў галоўны канструктар доктар тэхнічных навук М. Высоцкі. У сярэдзіне 1980-х гг. на Магілёўскім ВА “Хімвалакно” быў створаны філіял

[1] Сообщение Управления КГБ по Могилёвской области от 17.12.1980 г. “Об эффективности использования иноспециалистов на промышленных объектах области” // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 73. Арк. 37-38.
[2] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 470.
[3] Письмо Министерства высшего и среднего специального образования БССР в СМ БССР № 21-05-708 от 30.12.1987 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1039. Арк. 132, 133.
[4] 35 лет Могилёвскому государственному университету продовольствия. С. 23, 27–28; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 471.

кафедры “Хімічнай тэхналогіі высокамалекулярных злучэнняў” Магілёўскага тэхналагічнага інстытута (загадчых кафедры доктар тэхнічных навук, прафесар Б. Геллер). Арганізацыя такіх вучэбных структур садзейнічала найбольш эфектыўнаму выкарыстанню кваліфікаваных завадскіх кадраў для навучання і выхавання будучых спецыялістаў, збліжэнню вучэбнага працэсу з вытворчасцю, найбольш шырокаму выкарыстанню ў вучэбных мэтах вытворчай базы прадпрыемстваў[1].

На падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі негатыўна ўплывала недастатковае фінансаванне. Складанасці ў арганізацыі вучэбнага працэсу, нізкая зарплата выпускнікоў ВНУ зніжалі зацікаўленасць моладзі ў набыцці вышэйшай адукацыі. Калі ў 1975 г. у БССР дакументы на паступленне ў ВНУ падаваў кожны дзесяты выпускнік, то ў 1981 г. – толькі дваццаты, што на чвэрць зменшыла колькасць абітурыентаў. За 1970–1980 гг. колькасць выпускнікоў, якія здавалі экзамены на дзённыя аддзяленні вышэйшай школы, скарацілася з 42 да 32 %, а па ўсіх формах навучання з 48 да 36% [2].

На працягу 1970–1980-х гг. стабільна адчуваўся недахоп спецыялістаў. Нават у 1985 г. на прадпрыемствах БССР кожны другі кіраўнік цэха і яго намеснік, кожны трэці галоўны спецыяліст (канструктар, тэхнолаг, механік і інш.), палова эканамістаў, каля 70 % галоўных і старшых бухгалтараў не мелі вышэйшай адукацыі. У той жа час шмат дыпламаваных кадраў выкарыстоўваліся не па спецыяльнасці. На канец 1984 г. больш за 111 тыс. з іх працавалі на пасадах, якія не патрабавалі ні вышэйшай, ні сярэдняй адукацыі[3]. Прамысловы комплекс рэспублікі не быў забяспечаны кадрамі вышэйшай кваліфікацыі ў поўным аб’ёме. Так, толькі для прамысловасці Гомельскай вобласці ў 1990–1991 гг. дадаткова патрабавалася 2 919 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і 1 452 з сярэдняй спецыяльнай[4].

Такім чынам, у 1980-х гг. у БССР праводзілася значная работа па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў. Але праблема забеспячэння спецыялістамі прамысловасці рэспублікі заставалася да канца не вырашанай. Адной з прычын з’яўлялася першапачатковае забеспячэнне кадрамі саюзных міністэрстваў і ведамстваў, асабліва Міністэрства абароны СССР. Такое становішча патрабавала далейшага ўдасканалення сістэмы набору і размеркавання. Пастановай СМ СССР ад 19.12.1990 г. “Аб мерах па развіцці дагаворных адносін па падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй”[5] было ўстаноўлена, што ўрады рэспублік,

---

[1] 35 лет Могилёвскому государственному университету продовольствия. С. 214–215; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 471.
[2] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 473.
[3] Протокол заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 29.04.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15. Арк. 25, 26; Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8. Арк. 13, 15; Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 11.04.1979 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 162. Спр. 12. арк. 14-15; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 471; Протокол заседания бюро Витебского областного комитета КПБ от 28.04.1984 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 161. Спр. 28. Арк. 65.
[4]Падлічана па: Расчет дополнительной потребности в специалистах Гомельской области на 1990–2000 гг. // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2222. Арк. 101–131.
[5] Постановление Совета Министров СССР от 19.12.1990 № 4311 “О мерах по развитию договорных отношений по подготовке специалистов с высшим и средним специальным образованием” // Там жа. Спр. 2449. Арк. 8.

міністэрствы і ведамствы СССР, якія маюць у сваім падпарадкаванні вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, пачынаючы з 1991 г. самастойна вызначаюць аб'ём і структуру парыхтоўкі і парадак размеркавання маладых спецыялістаў, зыходзячы са складзеных сувязей і заключаных дамоў паміж навучальнымі ўстановамі і прадпрыемствамі, арганізацыямі з улікам агульнадзяржаўных патрэб і перспектыў развіцця рэгіёнаў і галін.

**Перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі.** У 1970-я гг. рабочыя прамысловых прадпрыемстваў павышалі кваліфікацыю на: вытворча-тэхнічных курсах; курсах мэтавага прызначэння ў школах па вывучэнню перадавых метадаў працы, на курсах брыгадзіраў, у народных універсітэтах; у парадку абучэння другім і сумежным прафесіям. Інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя павышалі кваліфікацыю: у інстытутах павышэння кваліфікацыі міністэрстваў (ведамстваў); на факультэтах павышэння кваліфікацыі пры ВНУ; курсах павышэння кваліфікацыі пры прадпрыемствах, арганізацыях і вучэбных установах[1]. Дырэктары прадпрыемстваў, галоўныя інжынеры, начальнікі цэхаў, старшыя майстры павышалі кваліфікацыю з адрывам ад вытворчасці пры Рэспубліканскім міжгаліновым інстытуце павышэння кваліфікацыі ў г. Мінску (тэрмін навучання адзін месяц)[2].

У выніку прамысловага развіцця ўсходнебеларускія гарады БССР становяцца буйнымі цэнтрамі павышэння кваліфікацыі непасрэдна на працоўных месцах шляхам правядзення рэгіянальных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных канферэнцый. Напрыклад, у 1972 г. у Гомелі была праведзена навукова-тэхнічная канферэнцыя "Роля інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў прамысловасці і транспарту вобласці па павышэнні эфектыўнасці вытворчасці"[3]; больш за дзесяць вытворчых нарад, семінараў і навукова-тэхнічных канферэнцый усесаюзнага і рэспубліканскага ўзроўню былі праведзены ў Магілёве і Бабруйску ў 1976 г.[4] Варта асобна адзначыць правядзенне ў 1977 г. на базе ВА "Бабруйскшына" нарады рабочай групы па шыннай і гумавай прамысловасці Пастаяннай камісіі Савета эканамічнай

[1] Отчёт о подготовке и повышении квалификации рабочих, ИТР и служащих // ДАМаг. Ф. 2827. Воп. 1. Спр. 525. Арк. 1–5.
[2] План повышения квалификации кадров с отрывом от производства // Там жа. Спр. 524. Арк. 2.
[3] Протоколы заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 137. Спр. 8. Арк. 14.
[4] Вытворчая нарада актыва работнікаў лёгкай прамысловасці БССР, кансультацыі савецкіх і чэхаславацкіх спецыялістаў (на заводзе "Электрарухавік"), Усесаюзны семінар-нарада работнікаў мясной і малочнай прамысловасці, Усесаюзны семінар-нарада па далейшаму ўдасканаленню арганізацыі працы, заробкаў і нарміравання, Рэспубліканская канферэнцыя рацыяналізатараў, арганізаваная Міністэрствам харчовай прамысловасці, Усесаюзны семінар-нарада актыва работнікаў прамысловасці будаўніцтва СССР на базе будаўнічых трэстаў № 12, 17 і ДБК на тэму "Удасканаленне вытворча-тэхналагічнай камплектацыі ў Мінпрамбудзе СССР", вытворчы семінар па ўдасканаленню рамонтнага абслугоўвання электрастанцый, Рэспубліканскі семінар "Тэхнічны прагрэс – аснова павышэння якасці электрычных сетак", куставы семінар эканамічных службаў арганізацый Міністэрства сельскага будаўніцтва СССР, Рэспубліканская навукова-тэхнічная канферэнцыя, нарада дырэктароў прадпрыемстваў Усесаюзнага прамысловага аб'яднання "Саюзтэхпрамаўтаматызацыя" Міністэрства машынабудавання для жывёлагадоўлі і кормавытворчасці СССР. Протоколы заседаний бюро Могилевского ОК КПБ ад 17.02.1976 г., 24.05.1976 г., 26.03.1976 г., 30.04.1976 г., 13.07.1976 г., 27.07.1976 г., 17.02.1976 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 158. Спр. 17. Арк. 22; Спр. 43. Арк. 3; Спр. 19. Арк. 31; Спр. 24. Арк. 13; Спр. 26. Арк. 8, 9; Спр. 28. Арк. 26; Спр. 43. Арк. 5, 7.

узаемадапамогі[1] па хімічнай прамысловасці[2] і ў 1978 г. Усесаюзнай нарады па ліфтабудаўніцтву на Магілёўскім ліфтабудаўнічым заводзе[3]. Прамысловыя прадпрыемствы БССР станавіліся базай для абагульнення Усесаюзнага вопыту ў сферы эканомікі.

Пастановай СМ БССР ад 15.06.1981 г. былі вызначаны асноўныя кірункі ўдасканалення дзейнасці вучэбных падраздзяленняў павышэння кваліфікацыі па арганізацыі сістэматычнага абнаўлення і паглыблення ведаў кіраўніцкіх кадраў і спецыялістаў народнай гаспадаркі[4].

У БССР сетка павышэння кваліфікацыі кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі ўключала на 1985 год 136 вучэбных цэнтраў, створаных пры 34 міністэрствах і ведамствах БССР, у тым ліку 12 інстытутаў, 13 факультэтаў, 19 вучэбна-курсавых камбінатаў, 59 курсаў і 33 іншыя вучэбныя цэнтры, у якіх штогод праходзілі навучанне каля 70 тыс. чалавек. Акрамя таго, у БССР былі вучэбныя цэнтры павышэння кваліфікацыі саюзнага падпарадкавання[5].

СМ БССР паведамляў, што ў рэспубліцы асноўнай формай падрыхтоўкі (павышэння кваліфікацыі) кадраў вышэйшага звяна кіравання[6], з'яўлялася іх абучэнне ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў вышэйшага звяна дзяржаўнага кіравання Акадэміі народнай гаспадаркі пры СМ СССР, Рэспубліканскім міжгаліновым інстытуце павышэння кваліфікацыі кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў галін народнай гаспадаркі (РМІПК) Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР[7] і факультэце павышэння кваліфікацыі кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў пры Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава Міністэрства

---

[1] Міжурадавая эканамічная арганізацыя, якая дзейнічала ў 1949–1991 гг. Была створана па рашэнні эканамічнай нарады прадстаўнікоў Албаніі, Балгарыі, Венгрыі, Польшчы, Румыніі, СССР і Чэхаславакіі. Штаб-кватэра СЭУ знаходзілася ў Маскве.

[2] Протокол заседания секретариата Могилевского ОК КПБ от 25.04.1977 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 159. Спр. 46. Арк. 6.

[3] Протокол № 29 заседания секретариата Могилевского ОК КПБ от 28.08.1978 г. // Там жа. Спр. 175. Арк. 3.

[4] Информация отдела управленческих кадров и подготовки научно-педагогических работников Министерства высшего и среднего специального образования БССР в СМ БССР от 25.12.1981 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 7765. Арк. 149; Записка Управления делами СМ БССР № 13/147 от 24.04.1985 г. "О совершенствовании работы с кадрами". Январь 1986 г. // Там жа. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 14.

[5] Докладная записка начальника отдела науки и техники Управления делами СМ БССР № 13/147 от 24.04.1985 г. "О дальнейшем совершенствовании системы повышения квалификации руководящих работников и специалистов народного хозяйства республики" // Там жа. Спр. 575. Арк. 2-3.

[6] Да кіруючых кадраў вышэйшага звяна кіравання адносіліся: кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў і іх намеснікі, намеснікі, начальнікі самастойных упраўленняў і аддзелаў цэнтральнага апарата міністэрств і ведамстваў і іх намеснікі, генеральныя дырэктары прамысловых аб'яднанняў і іх намеснікі. У БССР да іх таксама адносіліся: генеральныя дырэктары навукова-вытворчых аб'яднанняў, кіраўнікі самастойных прадпрыемстваў, трэстаў, камбінатаў і іх намеснікі. Письмо заместителя Председателя Государственного комитета СССР по науке и технике № 7-25/297 от 01.07.1987 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1039. Арк. 20.

[7] Рэспубліканскі міжгаліновы інстытут павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў галін народнай гаспадаркі быў створаны ў 1968 г., перад ім была пастаўлена задача: мэтавая падрыхтоўка кадраў розных галін гаспадаркі (транспарт, будаўніцтва, жылкамгас, бытавое абслугоўванне, гандль, энэргетыка і інш.). Да 1990 г. інстытут стаў буйным навучальным цэнтрам, у якім штогод вучыліся звыш 10 тыс. прадстаўнікоў розных міністэрстваў і ведамстваў на 4 факультэтах, 13 кафедрах, больш чым па 100 спецыяльнасцям. Усяго за час дзейнасці у РМІПК павысілі кваліфікацыю больш за 101,2 тыс. кіраўнікоў і спецыялістаў. Письмо Республиканского межотраслевого института повышения квалификации руководящих работников и специалистов отраслей народного хозяйства № 01-1715 от 18.09.1990 г. на имя председателя СМ БССР// НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 2274. Арк. 36-37.

вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР [1]. За 1986 год прайшлі падрыхтоўку 313 (35,45 %) асоб вышэйшага звяна кіравання (гл. табл. 13).

Пасля завяршэння павышэння кваліфікацыі кіраўніцкія работнікі і спецыялісты выконвалі выпускныя работы, рэфераты, здавалі экзамены і залікі. Выпускныя работы павінны былі мець прыкладны характар, і іх неабходна было ўкараніць па месцы асноўнай працы – практычная рэалізацыя прапаноў, якія ўтрымліваліся ў выпускной рабоце[2].

Табліца 13 – Падрыхтоўка кадраў вышэйшага звяна кіравання (1986)[3]

| Катэгорыі кіраўнікоў, якія праходзілі абучэнне | Колькасць кіраўнікоў | Прайшлі падрыхтоўку | Тэрмін навучання |
|---|---|---|---|
| Кіраўнікі міністэрстваў і іх намеснікі | 36 | 9 | ад тыдня да 3 мес. |
| Начальнікі самастойных упраўленняў і аддзелаў цэнтральнага апарату міністэрстваў і ведамстваў і іх намеснікі | 187 | 52 | ад тыдня да 3 мес. |
| Генеральныя дырэктары прамысловых і навукова-вытворчых аб’яднанняў, кіраўнікі самастойных прадпрыемстваў, трэстаў, камбінатаў і іх намеснікі | 660 | 253 | ад 1,5 да 3 мес. |
| У выніку | 883 | 313 | |

У другой палове 1980-х гг. шэраг міністэрстваў, ведамстваў, арганізацый і прадпрыемстваў СССР (БССР) з 01.01.1987 г. пераходзілі на новыя ўмовы гаспадарання. У адпаведнасці з пастановаю ЦК КПСС і СМ СССР ад 12.07.1985 г. № 669 “Аб шырокім распаўсюджванні новых метадаў гаспадарання і ўзмацненні іх уздзеяння на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу” Дзяржплан СССР арганізаваў восенню 1986 г. вучобу кіраўніцкіх кадраў міністэрстваў (ведамстваў), аб’яднанняў і прадпрыемстваў, якія пераходзілі на новыя ўмовы гаспадарання, на базе Акадэміі народнай гаспадаркі пры СМ СССР для намеснікаў старшынь СМ саюзных рэспублік, міністраў і кіраўнікоў ведамстваў, на базе Вышэйшых эканамічных курсаў пры Дзяржплане СССР для начальнікаў планава-эканамічных упраўленняў міністэрстваў, на базе рэспубліканскіх галіновых і міжгаліновых інстытутаў

[1] Письмо СМ БССР № 13/135-87 от 08.05.1987 г. “О сведениях по подготовке кадров высшего звена управления” // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1039. Арк. 22.
[2] Письмо Академии народного хозяйства СССР № 82/10-15 от 11.03.1980 г. на имя Председателя СМ БССР // Там жа. Воп. 5. Спр. 7229. Арк. 75.
[3] Информация о подготовке высшего звена управления за 1986 год // Там жа. Воп. 10. Спр. 1039. Арк. 23-24.

павышэння кваліфікацыі для кіраўнікоў кадраў прадпрыемстваў жыллёвай і камунальнай гаспадаркі, рачнога флоту[1].

У адпаведнасці з Указам Прэзыдыума Вярхоўнага Савета БССР ад 11.05.1988 г. у БССР былі аб'яднаны тры адукацыйныя структуры (вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, агульнай сярэдняй і сярэдняй прафесійнай адукацыі) у адзіную сістэму народнай адукацыі, у якой працавала больш за 250 тыс. кіраўніцкіх, навуковых, прафесарска-выкладчыцкіх, педагагічных кадраў і спецыялістаў.

Пастановаю ЦК КПБ і СМ БССР ад 11.05.1988 г. РМІПК стаў галаўной навучальнай установай павышэння кваліфікацыі работнікаў сістэмы рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў. Праводзілася абучэнне па наступных кірунках: удасканаленне гаспадарчага механізма ва ўмовах пераходу да рынкавай эканомікі, арганізацыя гаспадарчага разліку на прынцыпах арэнды і падраду, прымяненне вылічальнай тэхнікі і новай інфармацыйнай тэхналогіі ў гаспадарчай дзейнасці. У 1990–1991 гг. арганізавалі навучанне па новых кірунках: дзяржаўна-прававая падрыхтоўка народных дэпутатаў усіх узроўняў і кіраўніцкіх кадраў для працы ў новых умовах; радыяцыйная і прамысловая экалогія; знешнеэканамічная дзейнасць міністэрстваў і ведамстваў; праблемы менеджменту і маркетынгу; стварэнне сумесных прадпрыемстваў[2].

За 1988–1989 гг. пры ВНУ Міністэрства адукацыі БССР былі арганізаваны 2 міжгаліновыя інстытуты, 11 факультэтаў і курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў у галіне новай тэхнікі і прагрэсіўных тэхналогій, удасканалення гаспадарчага механізму, знешнеэканамічных сувязей. У 1989 г. у БССР павысілі кваліфікацыю больш за 180 тыс. кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў, з іх у інстытутах – 44 %, на факультэтах – 8 %, на курсах – 48 %[3].

Дзяржаўная сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, пачынаючы з 1988 г., адчувала вялікія цяжкасці з камплектаваннем. Выявілася тэндэнцыя памяншэння колькасці навучэнцаў у сістэме павышэння кваліфікацыі. У 1987 г. прайшлі абучэнне 182,6 тыс. чал., у 1989 г. – 140,4 тыс.[4]

У пачатку 1990 г. перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі БССР праводзілася па галіноваму прынцыпу ў 110 навучальных установах, у тым ліку ў 16 інстытутах павышэння кваліфікацыі, 15 факультэтах і спецфакультэтах пры ВНУ, 79 курсах пры міністэрствах (ведамствах), прадпрыемствах і арганізацыях[5].

---

[1] Письмо Госплана СССР в СМ БССР № АП-351/65-386 от 30.07.1986 г. "Об организации учёбы руководящих кадров министерств (ведомств), объединений и предприятий, переводимых с 1987 г. на новые условия хозяйствования" // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 575. Арк. 116-117.

[2] Письмо Республиканского межотраслевого института повышения квалификации руководящих работников и специалистов отраслей народного хозяйства № 01-1715 от 18.09.1990 г. на имя председателя СМ БССР// Там жа. Спр. 2274. Арк. 36–37.

[3] Письмо Министерства образования БССР № 13/21 от 28.02.1990 г. у СМ БССР "О ходе выполнения постановления ЦК КПБ и СМ БССР от 11.05.1988 г. № 131 "О перестройке системы повышения квалификации и переподготовки руководящих работников и специалистов народного хозяйства республики" // Там жа. Арк. 2.

[4] Ліст Міністэрства народнай адукацыі БССР от 23.01.1991 г. на имя председателя СМ БССР // Там жа. Арк. 75.

[5] Письмо Министерства образования БССР от 28.02.1990 г. в СМ БССР "О ходе выполнения постановления ЦК КПБ и СМ БССР от 11.05.1988 г. № 131 "О перестройке системы повышения квалификации и переподготовки руководящих работников и специалистов народного хозяйства республики" // Там жа. Арк. 3, 4.

У адпаведнасці з пастановай СМ БССР ад 29.01.1991 г. № 33 "Аб першачарговых мерах па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў органаў дзяржаўнага кіравання, кіраўнікоў і спецыялістаў народнай гаспадаркі для работы ва ўмовах рыначнай эканомікі" ў Магілёўскай вобласці Упраўленнем па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва аблвыканкама сумесна з дырэкцыяй Магілёўскага палітэхнікума да 01.06.1991 г. праводзілася арганізацыя сумеснага вучэбнага гаспадарчага разліковага цэнтра па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў кіраўніцкіх структур сярэдняга звяна і высокакваліфікаваных рабочых, занятых у прамысловасці. Для ІТР і служачых на базе Магілёўскай бухгалтарскай школы прапаноўвалася стварыць міжрэгіянальны цэнтр па перападрыхтоўцы спецыялістаў народнай гаспадаркі[1].

Падчас перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі адбывалася вывучэнне, абагульненне і абмен перадавым вопытам, што садзейнічала павышэнню якасці кадравага патэнцыялу. Але існавалі недахопы і невырашаныя праблемы. Павышэнне кваліфікацыі вельмі часта падмянялася нарадамі, семінарамі, тэхнічнай вучобай. Тэарэтычны курс часам меў агульны, пазнавальны характар, бракавала матэрыялу аб эканамічным развіцці вытвочых калектываў і адміністрацыйных адзінак, не хапала курсаў аб рацыянальных метадах кіравання, прамысловай і бытавой эстэтыцы, псіхалогіі. Не забяспечвалася ўстаноўленая перыядычнасць абучэння кадраў, якая складала 10 гадоў (норма – 5 гадоў), а для кіраўнікоў прадпрыемстваў (арганізацый), работнікаў органаў кіравання больш за 15–20 гадоў. Недасканалай была структура сеткі навучальных устаноў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

**Эканамічную падрыхтоўку** разглядалі як абавязковы бок кваліфікацыі кожнага работніка. Спрабавалі ўвесці ў практыку работы правядзенне аглядаў-конкурсаў на найлепшую пастаноўку эканамічнай вучобы на прадпрыемствах, дзе стварылі, прынамсі на паперы, пастаянна дзеючыя эканамічныя лекторыі[2]. Кіраўнікоў і спецыялістаў перыядычна знаёмілі з асновамі марксісцка-ленінскай эканамічнай тэорыі і эканамічнай палітыкі КПСС, практыкай кіравання вытворчасцю, удасканалення метадаў выхавання і арганізацыі людзей; рабочых і служачых – з эканамічнай палітыкай КПСС, асновамі эканамічных ведаў, навуковай арганізацыяй працы і вытворчасці, практыкай эканамічнай дзейнасці прадпрыемстваў[3].

Пры Міністэрствах БССР ствараліся саветы па эканамічнай адукацыі (навучанню) працоўных і прафесійнаму абучэнню кадраў на вытворчасці, звычайна іх узначальвалі намеснікі міністраў[4]. У абласцях стваралiся метадычныя саветы па эканамічнай вучобе, з сакавіка 1986 г. – саветы па

---

[1] Информация Могилевского облисполкома в СМ БССР от 01.04.1991 г. "О выполнении постановления СМ БССР от 29.01.1991 г. № 33 "О первоочередных мерах по подготовке, переподготовке и повышению квалификации кадров органов государственного управления, руководителей и специалистов народного хозяйства для работы в условиях рыночной экономики" // НАРБ. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 4065. Арк. 688, 689.
[2] Протокол заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 26.05.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15. Арк. 165–166.
[3] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. С. 315.
[4] Информационная записка от 20.06.1987 г. // ДАВц. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 54. Арк. 90.

эканамічнай адукацыі працоўных і прафесійнаму навучанню кадраў[1]. Рашэннем бюро Гомельскага АК КПБ 25.05.1973 г. быў арганізаваны абласны грамадскі савет па эканамічнай адукацыі[2] ў складзе 23 асоб (старшыня савета – сакратар АК КПБ). Савет павінен быў выконваць наступныя функцыі: а) каардынацыя дзейнасці абласных гаспадарчых ведамстваў і арганізацый, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый па выкананні пастановы ЦК КПСС "Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі працоўных", б) вывучэнне стану эканамічнай вучобы кадраў, прыняцце рэкамендацый па яе далейшым паляпшэнні, в) абагульненне вопыту працы па эканамічнай адукацыі, г) кіраўніцтва метадычнымі саветамі па эканамічнай адукацыі пры РК і ГК КПБ, д) кантроль за выкананнем перспектыўнага плана эканамічнай адукацыі працоўных, е) заслухоўванне справаздач абласных упраўленняў, ведамстваў, прадпрыемстваў, саветаў па эканамічнай адукацыі пры РК і ГК КПБ і прыняцце адпаведных рэкамендацый, ж) штогадовае падвядзенне вынікаў па эканамічнай адукацыі працоўных[3].

Адпаведныя саветы ствараліся на ўзроўні раёнаў, гарадаў, асобных прадпрыемстваў. Так, пры Асіповіцкім гаркаме КПБ дзейнічаў тэхніка-эканамічны савет. У яго склад уваходзілі 54 кіраўнікі і галоўныя спецыялісты прадпрыемстваў і арганізацый. Савет павінен быў аказваць метадычную і практычную дапамогу кіраўнікам ў павышэнні эфектыўнасці работы прадпрыемстваў і якасці выпускаемай прадукцыі, абагульняць і распаўсюджваць перадавы вопыт тэхніка-эканамічнай і гаспадарчай дзейнасці, прагрэсіўныя формы кіравання[4]. Пры парткоме Аршанскага інструментальнага завода існаваў савет садзейнічання навукова-тэхнічнаму прагрэсу, які ўзначальваў дырэктар завода[5].

Для выканання рашэнняў вышэйстаячага кіраўніцтва стваралася вялікая колькасць грамадскіх курсаў і школ па эканоміцы, у якія масава запісвалі слухачамі рабочых і спецыялістаў. Напрыклад, у 1985/1986 н. г. на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці былі створаны і павінны былі распачаць працу з 1 кастрычніка 88 школ камуністычнай працы, 18 школ канкрэтнай эканомікі. У іх павінны былі вывучацца наступныя курсы: 1) "Рэзервы эканоміі і ашчаднасць у дзеянні" – 73 школы, 1529 слухачоў; 2) "Працоўны калектыў: кіраванне, дысцыпліна, выхаванне" – 13 школ, 322 слухачы; 3) "Інтэнсіфікацыя вытворчасці" – 2 школы, 59 слухачоў. У школах канкрэтнай эканомікі праводзілася абучэнне па тэматыцы: 1) "Ад эксперыменту

[1] Протокол № 2 заседания методического совета производственно-экономического образования и профессиональному обучению кадров на производстве управления местной промышленности Витебского облисполкома от 04.05.1989 г. // ДАВц. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 194. Арк. 83.
[2] Протоколы заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 140. Спр. 11. Арк. 19-20.
[3] Протокол XIX Гомельскай областной партийной конференции (1975) // Там жа. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 43.
[4] Справка от 15.02.1980 г. о работе с кадрами в Могилёвской областной партийной организации за период после XXV съезда КПСС // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 71. Арк. 109-116.
[5] Справка о проведенной работе по ускорению внедрения научно-технического прогресса на Оршанском инструментальном заводе (1986) // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1050. Арк. 14.

да новай сістэмы гаспадарання” – 17 школ, 320 слухачоў; 2) “Інтэсіфікацыя вытворчасці” – 1 школа, 20 слухачоў[1].

Масавы эканамічны “усевобуч” прыводзіў да фармалізму ў правядзенні эканамічнай адукацыі. Заняткі праводзіліся фармальна, у значнай большасці дзейнасць заставалася на паперы, прыведзеныя лічбы аб вялікай колькасці слухачоў не сведчаць аб якасным засваенні прапанаванага на курсах матэрыялу. Эфектыўнасць падобнай формы працы была вельмі нізкай.

Найважнейшай перадумовай паспяховага вырашэння задач навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з’яўлялася павышэнне агульнаадукацыйнага і культурна-тэхнічнага ўзроўню насельніцтва. Станоўчым у гэтым кірунку было далейшае развіццё ў рэспубліцы вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі, падрыхтоўка кадраў па новых спецыяльнасцях, абумоўленых запытамі навукова-тэхнічнага прагрэсу. Адмоўным тое, што дзейнасць Акадэміі навук БССР, навукова-даследчых, праектна-канструктарскіх і тэхналагічных арганізацый, навуковых падраздзяленняў вышэйшых навучальных устаноў, падрыхтоўка кадраў спецыялістаў не былі ў поўнай меры сканцэнтраваны на вырашэнні найважнейшых навукова-тэхнічных і гаспадарчых праблем. Пры ўсіх недахопах перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі сталі адным з важных шляхоў забеспячэння вытворчасці якаснымі кадрамі і паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу.

**Эканамічныя, дэмаграфічныя і сацыяльна-побытавыя наступствы ўрбанізацыі.** Хуткая індустрыялізацыя 1950–1970 гг. пераўтварыла Савецкую Беларусь у індустрыяльна-аграрную рэспубліку, а ў наступнае дзесяцігоддзе ў індустрыяльную, кіраванне якой ажыццяўлялася цэнтралізавана ў межах каманднa-адміністрацыйнай сістэмы. Паскораная індустрыялізацыя і ўрбанізацыя БССР з’яўляліся аднымі з найбольш важных фактараў, якія ўплывалі на кадравы патэнцыял рэспублікі. Дзякуючы ім, адбыліся істотныя змены ў сацыяльнай і дэмаграфічнай структуры грамадства, у прыватнасці хуткі рост гарадскога насельніцтва, які выклікаў пэўны дысбаланс у грамадстве у самых розных сферах. Дынаміка сацыяльнай структуры грамадства ў гэтыя дзесяцігоддзі характарызавалася хуткім ростам рабочага класа і служачых, пераважная частка з якіх працавала ў прамысловасці і на транспарце.

Павышаўся ўзровень жыцця насельніцтва і адначасова абвастраліся праблемы, якія істотна ўплывалі на маральна-псіхалагічны настрой працаўнікоў і выкананне імі сваіх службовых абавязкаў: недахоп добраўладкаванага жылля, дэфіцыт тавараў, нізкі ўзровень бытавога абслугоўвання і г.д. Аб чым сведчаць шматлікія скаргі, заявы ў СМ СССР і ЦК КПБ ад грамадзян Беларусі з просьбамі аб паляпшэнні жыллёвых умоў, працы камунальных прадпрыемстваў і якасці гандлёвага абслугоўвання; перасяленні з баракаў і падвалаў, старых і аварыйных дамоў; паскарэнні будаўніцтва кааператыўных дамоў, новых

[1] Протокол № 1 заседания методического совета по экономическому образованию управления местной промышленности Витебского облисполкома от 30.10.1985 г. // ДАВц. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 54. Арк. 1-2.

дзіцячых садкоў, школ і бальніц; добраўпарадкаванні гарадоў; дэфіцыце тавараў і інш.[1]

Прамысловае развіццё гарадоў прыводзіла да канцэнтрацыі насельніцтва. Так, на пачатак 1980-х гг. на тэрыторыі горада Бабруйска жыло каля 212 тыс. чал. і размяшчаліся 220 прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў[2], у Наваполацку гарадское насельніцтва складала 44 тыс. жыхароў, з іх 23381 чал. працавалі толькі на 5 прамысловых прадпрыемствах[3], у г. Орша налічвалася 121795 чал. (1979), з якіх больш за 70 тыс. працавалі на 30 прамысловых прадпрыемствах[4]. У 1970-я – першай палове 1980-х гг. штогод на працу і жыхарства ў гэтыя гарады прыбывала ад 10 да 15 тыс. чалавек, у тым ліку да 500 чалавек з месцаў пазбаўлення волі. Абвастрыліся экалагічныя праблемы і павялічвалася злачыннасць. Гарады станавіліся не толькі месцам працы і жыцця кваліфікаваных кадраў прамысловасці, але і крымінагеннымі цэнтрамі.

На працягу 1970–1980-х гг. нерытмічна, з вялікімі намаганнямі асвойваліся капітальныя ўкладанні на жыллёвае будаўніцтва. Па гэтай прычыне прымаліся аб’екты ў эксплуатацыю з парушэннямі тэрміну здачы ў эксплуатацыю і вялікімі недаробкамі, з нізкай якасцю работ. Такая заганная практыка паўтаралася з году ў год. Пабудаваныя ў 1974 г. у Оршы 14 жылых дамоў з-за недаробак працяглы час не засяляліся. Санітарна-тэхнічнае абсталяванне ўсталёўвалася пасля засялення, газ пускаўся праз 1,5–2 месяцы, ліфты не працавалі. Каля 50 % жылля здавалася з адзнакай “здавальняюча” пры нізкай якасці малярных і сталярных прац. Улетку быў здадзены ў эксплуатацыю і заселены 100- кватэрны дом у Задняпроўі, а ў студзені 1975 г. у ім патрэскаліся перагародкі і патрабаваўся капітальны рамонт[5]. У 1976 г. увялі ў эксплуатацыю тры дамы – у двух з іх не працавалі ліфты, не падключылі газ, навасёлы не маглі карыстацца вадой, у адным доме  працякала столь[6]. Два жылыя дамы ў пачатку 1986 г. здалі з адзнакай “добра”, але навасёлы пачалі рамонт і даводку кватэр адразу пасля засялення[7]. Характэрным было перавышэнне тэрмінаў будаўніцтва і рамонту жылля. У Бабруйску дом па вул. Мінскай замест 8 месяцаў будаваўся 16. Капітальны рамонт жыллёвага фонду ў горадзе перавышаў нарматыўную працягласць рамонта ў 2–2,5 разы. У 1986 г. Упраўленне капітальнага будаўніцтва г. Бабруйска адчыталася, што ўвялі ў

[1] Выписка из протокола заседания президиума СМ БССР от 02.03.1971 // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1951. Арк. 54–54адв.; Информация о содержании наказов, просьб и предложений от 09.06.1974 // Там жа. Спр. 2228а. Арк. 53–54; Решение № 47 от 30 марта 1977 года Могилевского областного Совета депутатов «О работе исполкома областного Совета за 1975–1976 годы» // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2228а. Арк. 288.

[2] Письмо Могилёвского ОК КПБ от 03.01.1980 г. Министру МВД СССР “О создании при Бобруйском городском отделе внутренних дел двух отделений милиции” // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 71. Арк. 8.

[3] Доклад о работе инспектуры статистики г. Новополоцка // ЗДАПол. Ф. 1220. Воп. 1. Спр. 59. Арк. 57, 63; Выполнение плана по реализации, валовой продукции и производительности труда промышленными предприятиями г. Новополоцка за 1980 г.  // Там жа. Воп. 2. Спр. 216. Арк. 1.

[4] Резервы и возможности для успешного выполения пятилетнего плана на 1971–1975 гг. промышленностью города Орша Витебской области // ЗДАОрш. Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23. Арк. 15,17, 18-19.

[5] Доклад «О государственном плане развития народного хозяйства города Орши на 1975 год» на 11-й сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 23 января 1975 года // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 40.

[6] Протокол пятой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 26.02.1976 г. // Там жа. Спр. 457. Арк. 4.

[7] Протокол № 5 сессии Оршанского городскогоо совета депутатов от 28.03.1986 г. // Там жа. Спр. 1043. Арк. 7.

эксплуатацыю ў Бабруйску інтэрнат на 232 месцы. Але фактычна будаўніцтва не было скончана[1].

Адзначалася дрэнная праца гарадскога камунальнага аўтобуснага транспарту, што прыводзіла да шматлікіх выпадкаў спазнення на працу. Праверка руху аўтобусаў на гарадскіх маршрутах у Магілёве засведчыла шэраг грубых парушэнняў графіка руху. На лініі не выходзілі па 20–25 аўтобусаў. Прычынамі былі: недахоп шафёраў, нізкая працоўная дысцыпліна, нездавальняюча арганізаваны рамонт аўтобусаў, вялікая цякучасць кадраў[2]. Падобная сітуацыя была ў г. Орша і Барані[3]. Не найлепшым чынам выкарыстоўваўся і ведамасны транспарт. Напрыклад, у 1972 г. 16 службовых аўтобусаў Бабруйска на заводзе РТІ, шынным і гарбарным камбінатах не заўсёды выкарыстоўваліся для перавозкі рабочых і служачых[4]. Безумоўна, праводзіліся пэўныя мерапрыемствы па паляпшэнні аўтобуснага руху. Так, у г. Магілёве ўкаранілі аўтаматызаваную сістэму дыспетчарскага кіравання рухам гарадскіх аўтобусаў[5] і інш.

Выгляд гарадоў залежыць ад чысціні іх вуліц, плошчаў і дваровых тэрыторый. Штогод выдзеленыя сродкі на добраўпарадкаванне, азеляненне і санітарнае ўтрыманне гарадоў асвойваліся на 180–200 %[6]. Паляпшаўся стан праязных частак вуліц і дарог, павялічвалася даўжыня тратуараў з асфальтавым пакрыццём, вялікі аб’ём работ быў выкананы па жвірова-пясчанай падсыпцы вуліц у сектары індывідуальнай забудовы. Але якасць выкананых работ была нізкай. Гэта неузнятыя вечкі калодзежаў пасля асфальтавання на праязных частках вуліц або заасфальтаванне калодзежаў усіх інжынерных камунікацый, а потым разборка асфальту на гэтых месцах, падсыпка вуліц жвірова-пясчанай сумессю без кладкі труб для пропуску талых і дажджавых вод і інш. Адбывалася гэта таму, што не было дзейснага кантролю за выкананнем і прыёмкай работ. Вялікая колькасць прэтэнзій была ў жыхароў да санітарнай уборцы гарадоў. Шмат бруду было на праязных частках вуліц. Працэс ачысткі горадоў пасля раставання снегу доўжыўся часам каля месяца. Мелі месца стыхійныя звалкі. Пастаянна паступалі скаргі ад насельніцтва, што па некалькі дзён не вывозіцца смецце. Нягледзячы на тое, што кожны год вясной і восенню праводзіліся месячнікі і суботнікі па ўборцы горадоў, што давала, безумоўна,

[1] Материалы по проверке стиля и методов работы Бобруйского горисполкома по управлению хозяйственным и социально-культурным строительством за 1969 год и первую половину 1970 года // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1769. Арк. 101, 157–158; Информация статистического управления Могилёвской области в Могилёвский ОК КПБ от 08.01.1986 г. № 1-16-7 “О работе органов государственной статистики Могилёвской области по выполнению указаний директивных органов по решительному пресечению и искоренению фактов очковтирательства и приписок” // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 181. Спр. 115. Арк. 28.

[2] Информация об организационно-массовой работе исполкома Могилевского городского Совета депутатов трудящихся в 1972 году // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Арк. 237.

[3] Справка об итогах выполнения плана экономического и социального развития города Орши за 1984 год // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 985. Арк. 177.

[4] Информационная записка Могилевского облисполкома об организационно-массовой работе местных Советов депутатов трудящихся Могилевской области за 1972 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Арк. 9.

[5] Справка о состоянии и мерах по усилению безопасности движения на автомобильном транспорте Могилёвской области от 12.12.1983 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 175. Спр. 72. Арк. 1-3.

[6] Протокол первой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 01.03.1985 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 454. Арк. 5; Протокол № 6 сессии Оршанского городскогоо совета депутатов от 18.04.1986 г. // Там жа. Спр. 1043. Арк. 96.

свае вынікі, санітарны стан вуліц і тэрыторый двароў жадаў быць нашмат лепшым.

Экалагічныя праблемы былі выкліканы тым, што на першым месцы стаяў выпуск прадукцыі і ачышчальныя збудаванні не былі на прамысловых прадпрыемствах прыярытэтнымі. Будаўніцтва інжынерных камунікацый не паспявала за хуткім павялічэннем колькасці насельніцтва.

У пачатку 1970-х гг. 20 тыс. бабруйчан карысталіся вадой з шахтавых калодзежаў. Пры праверках выявілася, што ў 20 % выпадкаў вада забруджаная. 8 тыс. куб. м. недастаткова ачышчаных стокаў штогод выкідвалі ў раку Бабруйку прадпрыемствы паўднёва-заходняга раёна горада. Паветра горада Бабруйска забруджвалі шкодныя выкіды вытворчых цэхаў машынабудаўнічага завода імя Леніна, мебельнай фабрыкі, камбіната другаснай сыравіны і інш.[1] Дэпутаты Бабруйскага гарадскога савета прааналізавалі (1973) як рэалізоўваўся Закон аб ахове прыроды і прызналі, што стан ачышчальных збудаванняў каналізацыі вызывае сур’езную заклапочанасць за захаванне чысціні вадаёмаў і атмасферы[2]. Фіксавалася вялікая колькасць выпадкаў запыленасці падчас выкідаў з халадзільных печаў на цэментна-шыферным камбінаце ў Крычаве[3].

Віцебскі аблвыканкам 20.08.1980 г. зафіксаваў нездавальняючае выкананне прыродаахоўных мерапрыемстваў прадпрыемствамі г. Віцебска: мясакамбінатам, холадакамбінатам, вагонным дэпо, ВА “Даламіт”, камбінат сілікатных вырабаў, ВА “Віцебскдрэў”, упраўленнем хлебапрадуктаў, аб’яднаннем Віцебскпіваправа, рыбазаводам, дзяржплемпрадпрыемствам, аўтабазамі і інш.[4] Шкодныя выкіды г. Наваполацка складалі 37,3 % ад агульнай агульнай колькасці па Віцебскай вобласці. Прамысловымі прадпрыемствамі горада за 9 месяцаў 1990 г. было выкінута ў атмасферу 112 846 тон шкодных рэчываў. Прычым паступова скарачалася колькасць выкінутых газападобных і вадкіх рэчываў, але колькасць цвёрдых павялічвалася[5].

У Магілёве гідраметэрэалагічнай службай горада ў раёне вуліцы Чалюскінцаў, дзе размяшчаліся завод штучнага валакна імя В. Куйбышава, жэлацінавы, гарбарны і рэгенератарны заводы, стан атмасфернага паветра характарызаваўся як вельмі нездавальняючы. Сярэднія канцэнтрацыі шкодных прымешак па некаторых інгрэдыентах значна перавышалі гранічна дапушчальныя (ГДК). У 1983 і 1984 гг. неаднаразова адзначаліся небяспечныя ўзроўні забруджвання прыземнага слоя паветра серавугляродам і

[1] Материалы по проверке стиля и методов работы Бобруйского горисполкома по управлению хозяйственным и социально-культурным строительством за 1969 год и первую половину 1970 года // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1769. Арк. 142-143.

[2] Информационная записка Могилевского облисполкома об организационно-массовой работе местных Советов Белиничеського, Бобруйского, Глусского, Кировского районов и г. Бобруйска за 1973 г. // Там жа. Спр. 2223. Арк. 37.

[3] Информационная записка об организационно-массовой работе Кричевского городского Совета депутатов трудящихся за 1972 г. // Там жа. Спр. 2222. Арк. 203.

[4] Решение Витебского облисполкома от 20.08.1980 г. “О ходе выполнения постановления ЦК КПБ и Совмина БССР № 234-14с от 28.07.1978 г. “О дополнительных мерах по усилению охраны природы и улучшению использования природных ресурсов в г. Витебске”. // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 199. Арк. 62.

[5] Об охране природных ресурсов и окружающей среды по г. Новополоцку. 20.12.1990 г. // ЗДАПол. Ф. 1220. Воп. 2. Спр. 497. Арк. 81.

серавадародам, канцэнтрацыі якіх перавышалі ГДК у 10–40 разоў. На прадпрыемствах Магілёва рабіліся захады па рэканструкцыі вентыляцыйных сістэм і газаачышчальных установак. Але недастаткова. Прычынай высокай загазаванасці паўднёва-заходняга раёна Магілёва з'яўлялася тое, што галіновыя міністэрствы (Міннафтахімпрам СССР, Мінхімпрам СССР, Мінлегпрам БССР) зацягвалі будаўніцтва прыродаахоўных аб'ектаў на ўзгаданых прадпрыемствах, нягледзячы на неаднаразовыя звароты кіраўніцтва горада і вобласці[1]. У 1990 г. па выніках праверак экалагічнай абстаноўкі ў Магілёўскай вобласці прад'явілі іскаў на 365 тыс. руб., да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 832 службовыя асобы і асобных грамадзян. Але будаўніцтва ачышчальных збудаванняў па-ранейшаму вялося марудна, з выдзеленых сродкаў асвойвалася менш за палову[2].

У БССР назіралася масавае злоўжыванне алкагольнымі напоямі. Дзелавыя сустрэчы, нават злёты перадавікоў, узаемаправерка ходу спаборніцтва суправаджаліся калектыўнымі выпіўкамі, у якіх актыўна ўдзельнічалі і кіраўніцкія кадры[3].

П'янства прыводзіла да складанай сітуацыі ў сям'і, на вытворчасці, у прыватнасці, прагулаў, зніжэння якасці прадукцыі, парушэнняў тэхналагічных працэсаў і вытворчага траўматызму. У Магілёўскай вобласці асабліва небяспечнай была сітуацыя ў абласным цэнтры, Бабруйске, Быхаўскім, Горацкім, Магілёўскім, Шклоўскім, Чавускім і Мсціслаўскім раёнах[4]. У Віцебскай вобласці за 9 месяцаў 1976 г. 55,1 % злачынстваў здзейснілі асобы ў п'яным стане. У гарадах Орша, Полацк, Докшыцкім, Бешанковіцкім, Гарадоцкім, Міёрскім, Чашніцкім, Шаркаўшчыцкім раёнах удзельная вага падобных злачынстваў склала 60–75 %[5]. Толькі за восем месяцаў 1984 г. у г. Крычаве (насельніцтва каля 30 тыс. чал.) Магілёўскай вобласці было прыцягнута да адказнасці за з'яўленне ў п'яным выглядзе ў грамадскіх месцах – 1 300 чал., складзена пратаколаў за распіццё спіртных напояў у неўстаноўленых месцах – 41 чал., утрымоўвалася у медвыцвярэзніку – 1 225 чал., выяўлена ачагоў самагонаварэння – 9. Работнікамі дзяржаўнай аўтаінспекцыі, участковымі інспектарамі выяўлена 1 724 парушэнняў правілаў дарожнага руху, у тым ліку 166 за кіраванне транспартам у нецвярозым стане. Гэта пры наяўнасці невялікай колькасці транспарту ў асабістым карыстанні[6]. У 1988 г. у БССР на вытворчасці загінулі 443 работнікі, з іх кожны чацвёрты знаходзіўся ў

---

[1] Справка о состоянии воздушного бассейна в районе улицы Челюскинцев города Могилёва и мерах по его оздоровлению от 29.04.1984 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 175. Спр. 72. Арк. 55-56.
[2] Протокол шестой сессии Могилевского областного совета народных депутатов двадцать первого созыва от 03.10.1991 г. Доклад председателя Могилевского облисполкома // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 4023. Арк. 76.
[3] Протокол № 8 заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 201
[4] Протокол № 41 заседания бюро Могилёвского обкома КПБ от 07.07.1975 г. // Там жа. Воп. 155. Спр. 37. Арк. 140-141.
[5] Справка о состоянии общественного порядка за 9 месяцев 1976 г. (Витебская область) // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 176. Арк. 55-57.
[6] Письмо УВД Могилёвского облисполкома от 04.09.1984 г. № 19/392 // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 175. Спр. 74. Арк. 13-14.

стане алкагольнага ап’янення. У студзені-сакавіку 1989 г. органы міліцыі выявілі на працоўных месцах 5,7 тыс. чалавек у нецвярозым стане[1].

Працэсы канцэнтрацыі насельніцтва ў гарадах прыводзілі да ўзрастання злачыннасці, як скіраванай супраць асобы, так і эканамічнай (крадзяжы дзяржаўнай маёмасці). У Оршы і Барані рост крадзяжоў дзяржаўнай маёмасці за два гады склаў 40,6 %: 1970 г. – 32 выпадкі, 1972 г. – 45[2]. У 1974 г. у Віцебскай вобласці выявілі 1 572 выпадкі нястач і крадзяжоў дзяржаўнай уласнасці, што на 11,8 % больш чым у 1973 г. Толькі пазаведамаснай аховай было затрымана на прадпрыемствах за дробныя крадзяжы 1 426 чал. За здзейсненыя злачынствы прыцягнулі да крымінальнай адказнасці 1 147 чал.[3] Асабліва складана было з забяспячэннем захаванасці дзяржаўнай уласнасці ў гг. Орша, Полацк, Наваполацк, Віцебск, дзе назіраўся рост крадзяжоў[4]. У гг. Орша і Барань за 1985 г. узрасла колькасць дробных крадзяжоў на піўзаводзе – на 45 %, трактарарамонтным заводзе ў 1,9 раза, заводзе “Металіст” у 2,5 разы, мясакансервавым камбінаце 114 выпадкаў за год[5].

З году ў год пастаянна расла колькасць злачынстваў, звязаных з крадзяжом дзяржаўнай маёмасці ў Бабруйску. Асабліва на ВА “Бабруйскшына”, дзе штогод ўзрастала колькасць злачынстваў. У 1979 г. затрымалі за дробныя крадзяжы на 41 % больш чым у 1977 г. Шырокі размах набылі крадзяжы аўтапакрышак і аўтакамер да легкавых аўтамабіляў[6]. У крадзяжах дзяржаўнай маёмасці ўдзельнічалі нават работнікі адміністрацыйна-кіраўнічага апарату вытворчага аб’яднання. За 1979 і 1980 гг. асобныя работнікі прадпрыемства здзейснілі крадзёж аўтапакрышак і аўтакамер на 68,7 тыс. руб.[7] У 1983 г. на ВА “Бабруйскшына” была ўстаноўлена нястача розных шын на суму больш за 366 тыс.руб.[8] За восем месяцаў 1984 г. у г. Крычаве работнікамі пазаведамаснай аховы на прадпрыемствах горада затрымалі 171 чал., што здзейснілі дробныя крадзяжы: мясакамбінат – 96 чал., ВА

---

[1] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 548.

[2] Докладная записка о состоянии общественного порядка и борьбы о преступностью в г. Орше, г. Барань и результатах служебной деятельности отдела внутренних дел Оршанского горисполкома за 1972 год // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 6а. Спр. 88. Арк. 28-29.

[3] Постановление бюро Витебского обкома КПБ и исполкома областного совета депутатов от 10.06.1975 г. «О мерах по усилению борьбы с хищениями и разбазариванием социалистической собственности» // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 169. Арк. 43-44.

[4] Справка о состоянии общественного порядка за 9 месяцев 1976 г. (Витебская область) // Там жа. Спр. 176. Арк. 55-57.

[5] Доклад “О задачах Оршанского городского Совета народных депутатов по выполнению решений XXVII съезда КПСС и XXX съезда компартии Белоруссии” от 28.03.1986 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1043. Арк. 54.

[6] Информационная записка о дополнительно принятых мерах по борьбе с правонарушениями в ПО “Бобруйскшина” от 23.03.1984 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 178. Спр. 121. Арк. 6.

[7] Справка о рассмотрении Бобруйским горкомом КПБ докладной записки УВД Могилёвского облисполкома от 17.06.1980 г. “О состоянии сохранности социалистичекой собственности в ПО “Бобруйскшина” // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 178. Спр. 121. Арк. 18.

[8] Решение КПК при ЦК КПСС протокол № 430 от 20.04.1984 “О серьёзных недостатках в хозяйственной деятельности ПО “Бобруйскшина” и фактах безответственного отношения руководителей этого объединения к вопросам повышения качества выпускаемой продукции, снижения непроизводительных расходов и обеспечения сохранности социалистической собственности” // Там жа. Спр. 65. Арк. 4.

“Крычаўцэментнашыфер” – 14, завод гумовых вырабаў – 9, маслазавод – 8, хлебазавод – 18, піўзавод – 6, іншыя – 20[1].

Асабліва хвалявала грамадства праблема падлеткавай злачыннасці і п’янства сярод непаўналетніх. Аналіз злачыннасці паказвае, што 50 % усіх злачынстваў падлеткі здзейснялі ў нецвярозым стане. На гэта звярталі ўвагу прадстаўнічыя і выканаўчыя органы ўлады. Так, дэпутаты Асіповіцкага гарадскога савета ў 1972 г. разглядалі пытанне “Аб стане і мерах па паляпшэнні барацьбы з п’янствам сярод непаўналетніх у горадзе”. На пасяджэннях камісіі па справах непаўналетніх пры Асіповіцкім гарвыканкаме па пытанні выхаваўчай працы сярод падлеткаў заслухоўваліся кіраўнікі і старшыні прафкамаў кардонна-рубероўдавага завода, механазборачнага цэха № 5 Мінскага аўтазавода, гандлёва-тарнай базы і інш., дзе колькасць правапарушэнняў сярод працаваўшых там падлеткаў значна павялічылася[2].

На працягу 1975 г. крадзяжы дзяржаўнай маёмасці непаўналетнімі Оршы і Барані павялічыліся на 28,6 % у параўнанні з 1974 г. За п’янства і дробнае хуліганства дастаўляліся ў медвыцвярэзнік і аддзел унутраных спраў, працаваўшыя на прадпрыемствах: “Легмаш” – 17 непаўналетніх, ільнокамбінат – 11, “Чырвоны барацьбіт” – 6, інструментальны завод – 5. Падлеткамі-працаўнікамі было здзейснена 18 крымінальных злачынстваў: па тры злачынствы на заводах “Легмаш”, трактарарамонтным і “Чырвоны Кастрычнік”, чатыры на льнокамбінаце. Значная колькасць злачынстваў і правапарушэнняў было здзейснена камсамольцамі. Іх колькасць за згаданы перыяд узрасла: за дробнае хуліганства з 35 чалавек да 98, за п’янства з 69 да 106 чал. Акрамя таго, 29 камсамольцаў у 1975 г. прыцягнулі да крымінальнай адказнасці[3].

У шэрагу гарадоў БССР рашэннямі гарвыканкамаў былі зацверджаны “Правілы паводзін дзяцей і падлеткаў у гарадах”. У іх дзецям да 16 гадоў забаранялася: наведваць тэатры, кіно і іншыя відовішчныя мерапрыемствы пасля 20 гадзін і знаходзіцца на вуліцы без суправаджэння бацькоў або асоб, якія іх замяшчаюць, пасля 22-й гадзіны. Правілы пасля іх прыняцця выдаваліся спецыяльнай улёткай і рассылаліся літаральна па ўсіх адрасатах горада, публікаваліся на старонках мясцовых газет[4]. Але сітуацыя не палепшылася і ў наступнае дзесяцігоддзе. Аналіз узроўню злачыннасці сярод падлеткаў г. Оршы засведчыў, што непаўналетнімі ў 1984 г. было здзейснена на 22 % больш крымінальных злачынстваў, чым ў 1983 г.[5]

Дзіцячы пакой міліцыі і камісія па справах непаўналетніх неаднаразова даводзіла да ведама кіраўнікоў прадпрыемстваў аб ухіленні бацькоў ад выканання сваіх абавязкаў у выхаванні дзяцей, накіроўвала адпаведныя лісты

[1] Письмо УВД Могилёвского облисполкома от 04.09.1984 г. // Там жа. Воп. 175. Спр. 74. Арк. 13-14.
[2] Информационная записка об организационно-массовой работе Осиповичского городского Совета депутатов трудящихся за 1972 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Арк. 309, 313.
[3] Протокол шестой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 22.04.1976 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 457. Арк. 124-129, 135.
[4] Протокол шестой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 22.04.1976 г. // Там жа. Арк. 142.
[5] Протокол первой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 01.03.1985 г. // Там жа. Спр. 454. Арк. 20.

для абмеркавання іх у калектывах. Але на гэтыя звароты або зусім не рэагавалі, або адказвалі фармальнымі адпіскамі. А сярод гэтай кагорты бацькоў былі тыя, што працавалі кіраўнікамі на вытворчасці і самі з'яўляліся выхавальнікамі. Напрыклад, у г. Орша сярод іх былі начальнік аддзела забеспячэння камбіната сілікатных вырабаў, завуч школы, майстар змены завода "Сельбуд" і іншыя[1].

Удзельная вага крадзяжоў дзяржаўнай маёмасці была высокай у агульнай структуры злачыннасці. Прычынамі высокага ўзроўню крадзяжоў дзяржаўнай і грамадскай уласнасці з'яўляліся: умовы пражывання і матэрыяльны стан асобных катэгорый насельніцтва, не спрацоўвалі ідэалагічныя ўстаноўкі кіруючай КПСС, неналежныя ахова і захоўванне дзяржаўнай маёмасці, неэфектыўнасць прафілактычных мерапрыемстваў і інш. Складанай і напружанай была дарожна-транспартная абстаноўка ў гарадах.

У прамысловых цэнтрах праводзілася пэўная праца па паляпшэнні гандлёвага абслугоўвання насельніцтва. За 1971–1975 гг. у г. Орша пабудавалі і ўвялі ў эксплуатацыю 12 крамаў, 29 сталовых і буфетаў. Агульная гандлёвая плошча павялічылася ў гархарчгандлі на 20 %, у прамгандлі на 22 %, у 1,6 разы ў трэсце сталовых і рэстаранаў і ў 2,7 разы ў аддзяленні рабочага забеспячэння (АРЗ) Беларускай чыгункі. За гэты час былі пераведзены на самаабслугоўванне 8 крам гарпрамгандлю і 16 гархарчгандлю, 21 магазін АРЗ. Па стане на 01.01.1975 г. удзельная вага самаабслугоўвання ў агульным тавараабароце складала 80,4 % у гарпрамгандлі; 59,7 % у гархарчгандлі і 41,8 % у АРЗ. 11 крамаў гархарчгандлю, 4 крамы АРЗ і 3 крамы гарпрамгандлю ажыццяўлялі дастаўку тавараў на дом пакупнікам[2]. У Магілёве (1980) было 250 крам, 280 прадпрыемстваў харчавання. У пачатку 1982 г. у г. Крычаве забяспечанасць гандлёвымі плошчамі і крамамі складала 82 %, пасадкавымі месцамі ў агульнадаступнай сетцы грамадскага харчавання – 93 %, на вытворчых прадпрыемствах – 86 % да нарматыву. Да 1989 г. пабудавалі 5 крам і забяспечанасць гандлёвымі плошчамі ўзрасла да 99 %, пасадкавымі месцамі грамадскага харчавання на вытворчых прадпрыемствах да 99 %, у агульнадаступнай сетцы – 93 %. За кошт арганізацый і прадпрыемстваў горада і раёна быў уведзены рынак [3]і г. д.

У той жа час марудна развіваліся галіны прамысловасці, якія выраблялі тавары шырокага ўжытку. Таму стабільна не вырашалася праблема рытмічнага забеспячэння насельніцтва харчовымі і спажывецкімі таварамі. Нягледзячы на тое, што гандлёвыя арганізацыі рэгулярна выконвалі план тавараабароту на 101 %, праверкамі выяўляліся істотныя недахопы ў арганізацыі гандлю. Са слоў дэпутатаў і адказных работнікаў КПБ у 1973 г. адчуваўся недахоп хлеба-булачнай і малочнай прадукцыі ў крамах Магілёва, у Оршы і Барані, пакупнік не мог свабодна купіць мукі вышэйшага гатунку, рысу, перцу (1975). Не хапала нават абгортачнай паперы. Вельмі шмат скаргаў і нараканняў даводзілася

[1] Протокол шестой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 22.04.1976 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 457. Арк. 134.
[2] Информация «О ходе выполнения плана экономического и социального развития города Орши на 1971–1975 годы» от 22.03.1975 г. // Там жа. Спр. 406. Арк. 153.
[3] Данные о ходе выполнения постановления бюро Могилёвского ОК КПБ от 29.02.1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 213. Арк. 33-35

выслухоўваць работнікам гандлю на недахопы ў забеспячэнні малакапрадуктаў, асабліва кефірам і бутэлькавым малаком. Асартымент булачных вырабаў быў вельмі невялікім. Праблему дэфіцыту хавалі за зацверджаны мінімум асартыменту, асабліва кіраўнікі мясакансервавага камбіната. Таму практычна немагчыма было купіць у крамах напалову вэнджаныя і цвёрда вэнджаныя каўбасныя вырабы, сыравэнджаныя. У гандлёвую сетку, як правіла, паступалі каўбасы вараныя толькі 2–3 найменняў, якія імгненна знікалі з прылаўкаў. Пры гэтым несвоечасова завозіліся ў крамы тавары, якія меліся ў дастатку на базах[1].

Сітуацыя не палепшылася і ў наступныя гады. У 1980 г. прадпрыемствы "Магілёўхлебпрама" недастаткова выпякалі тартоў, піражных, кексаў і іншых кандытарскіх вырабаў, пастаўлялі ў гандлёвую сетку хлебабулачныя вырабы нізкай якасці. Толькі ў 1 паўгоддзі 1980 г. прадпрыемствы гандлю г. Магілёва забракавалі і вярнулі хлебазаводам 23,9 т хлебабулачных вырабаў. Цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва каўбасой, хлебам і хлебабулачнымі вырабамі былі ў Слаўгарадскім і Краснапольскім раёнах. У крамах Бабруйска адсутнічалі тавары паўсядзённага попыту: крупы, безалкагольныя напоі і інш. Не выраблялася ў дастатковай колькасці кефіру, сыркоў тварожных, смятаны расфасаванай і іншай прадукцыі. За сем месяцаў 1980 г. Магілёўскаму гармалзаводу было вернута 12,1 т няякаснай прадукцыі[2]. У лістападзе 1984 г. у гандлёвых крамах Оршы і Барані адсутнічалі ў продажы кававы напой, жэлацін, булачныя і абаранчачныя вырабы, сухары. Не хапала ў продажы гародніны, якая псавалася на базах. Гарсадгародгандль нёс вялікія страты ў сувязі з рэалізацыяй прадукцыі нізкай якасці. За 1984 г. спісалі і перадалі на корм скаціне 564,3 тон садавіны і гародніны[3]. Як адзначалася ў афіцыйных дакументах, у 1985–1986 гг. вельмі павольна нарошчваліся аб'ёмы выпуску спажывецкіх тавараў, таму гандлёвымі арганізацыямі горада Магілёва не выконваўся план рознічнага тавараабароту[4]. На сесіі Аршанскага гарадскога савета дэпутатаў 28.03.1986 г. адзначалі праблемы асартыменту і нізкай якасці тавараў, наяўнасці парушэнняў працоўнай дысцыпліны, правілаў гандлю, крадзяжоў і нястач, аблікаў пакупнікоў, грубасці з боку прадаўцоў, продажу спіртных напояў па завышаных цэнах[5]. За 1986–1989 гг. прадпрыемствамі Магілёва аб'ём вытворчасці тавараў народнага спажывання павялічыўся ў 1,2 разы, нехарчовых тавараў у 1,3 разы, у тым ліку на прадпрыемствах саюзнага падпарадкавання ў

[1] Протокол заседания бюро Могилевского ОК КПБ от 25.10.1973 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 151. Спр. 30. Арк. 3-4; Протокол одиннадцатой сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 23.01.1975 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 13, 14; Записка Управления КГБ по Могилевской области от 02.08.1973 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 151. Спр. 58. Арк. 21.

[2] Критические замечания, просьбы и предложения, высказанные депутатами Могилевского областного совета народных депутатов семнадцатого созыва за 1980–1981 гг. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3091. Арк. 91, 106, 111, 123, 130.

[3] Справка об итогах выполнения плана экономического и социального развития города Орши за 1984 год // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 985. Арк. 178-179.

[4] Справка от 17.09.1986 г. о серьёзных недостатках в работе партийных, советских органов г. Могилёва по выполнению заданий 1986 г. по производству и поставке товаров народного потребления и оказанию платных услуг населению // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 213. Арк. 47.

[5] Протокол сессии Оршанского городскогоо совета депутатов от 28.03.1986 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1043. Арк. 8.

2,6 разы[1]. Але ўсё роўна назіраўся дэфіцыт тавараў. У Магілёўскім гархарчгандлі (1988) у 75 % правераных прадпрыемстваў адсутнічалі тавары, прадугледжаныя асартыментным пералікам, падобнае было ў гандлёвай сетцы спажыўкааперацыі і камбінаце грамадскага харчавання[2].

У 1970-х гг. для належнага абслугоўвання насельніцтва ў гарадах не хапала атэлье, пунктаў рамонту абутку, цырульняў, хімчыстак, лазняў і г. д. На сесіі Бабруйскага гарадскога савета 29.10.1973 г. пры абмеркаванні пытання "Аб стане і мерах па далейшым паляпшэнні бытавога абслугоўвання насельніцтва" як дасягненне падавалася набыццё аб'яднаннем хімчысткі і лазнева-пральнага абслугоўвання 300 тазоў для лазняў горада[3]. Сітуацыю ў гарадах спрабавалі вырашыць сумеснымі намаганнямі выканаўчых уладаў і прамысловых прадпрыемстваў. Аб'ём бытавых паслуг увесь час павялічваўся.

Звярталася ўвага і на ахову здароўя. Так, на працягу 1971–1974 гг. ў Оршы былі адкрыты аптэкі па вул. Леніна і Савецкай, магазін "Оптыка". У 1975 г. былі пабудаваны будынкі дзіцячай малочнай кухні і стаматалагічнай паліклінікі. Пры гарадскім радзільным доме і медсанчастцы льнокамбіната адкрылі аддзяленне пералівання крыві, усталявалі стацыянарны флюараграф, распачаў працу дзённы стацыянар для лячэння хворых з гліснымі захворваннямі, рэканструявалі процітуберкулёзны дыспансер і інш.[4] Тым не менш, нягледзячы на развіццё аховы здароўя, у 1986 г. у Оршы і Барані дыспансерызацыя насельніцтва, дыягностыка і лячэнне ажыццяўляліся нездавальняюча. Матэрыяльная база цэнтральнай раённай бальніцы не адпавядала патрабаванням таго часу, на лячэнне хворых уплывала адсутнасць спецыялістаў педыятраў, неўрапатолага, стаматолагаў[5].

У пэўных рэгіёнах усходу БССР не вырашаліся належным чынам пытанні, звязаныя з далейшым развіццём устаноў культуры, умацаваннем іх матэрыяльнай базы. Напрыклад, задужа павольнымі тэмпамі ажыццяўлялася будаўніцтва ў гарадах новых кінатэатраў. Забяспечанасць гарадскога насельніцтва месцамі ў глядзельных залах складала ўсяго толькі 10,7 месцы ў сярэднім на 1 000 гарадскіх жыхароў супраць 14 месцаў сярэдне-рэспубліканскага паказчыка. У Магілёве і Бабруйску гэты паказчык быў значна ніжэйшым. На працягу 20 гадоў у гэтых гарадах не пабудавалі ніводнага кінатэатра, а большасць існаваўшых не адпавядалі патрабаванням. Кінатэатры "Кастрычнік", "Радзіма" (Магілёў), "Таварыш" (Бабруйск) перавялі ў вышэйшы разрад, але яны не адпавядалі ўстаноўленым стандартам. Установы культуры размяшчаліся нераўнамерна. У Бабруйску значная частка клубаў, бібліятэк і кінатэатраў былі сканцэнтраваны ў цэнтральным Ленінскім раёне горада і

[1] Справки о ходе выполнения постановления бюро Могилёвского ОК КПБ от 23.09.1986 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 213. Арк. 44.
[2] Данные о ходе выполнения постановления бюро Могилёвского ОК КПБ от 29.02.1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 213. Арк. 29.
[3] Информационная записка об организационно-массовой работе Бобруйского городского Совета депутатов трудящихся за 1973 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2223. Арк. 112.
[4] Информация «О ходе выполнения плана экономического и социального развития города Орши на 1971–1975 годы» на 12-й сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 22 марта 1975 года // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 157.
[5] Протокол сессии Оршанского городскогоо совета депутатов от 28.03.1986 г. // Там жа. Спр. 1043. Арк. 8.

нярэдка перашкаджалі адзін аднаму ў рабоце. У той жа час у Першамайскім раёне іх бракавала. У жылым масіве мікрараёнаў № 1, 2, 3, 4 гэтага раёна, дзе пражывалі каля 30 тыс чалавек, практычна не мелася ніводной установы культуры, дзе можна было б праводзіць масавыя мерапрыемствы[1].

Такім чынам, у 1970–1990 гг. павялічвалася колькасць насельніцтва, дынамічна і паспяхова развіваліся прамысловасць. Узрасла роля гарадоў у эканамічным і культурным развіцці БССР. Прамысловае развіццё і ўрбанізацыя ў савецкай краіне суправаджаліся даволі нізкім узроўнем жыцця, якасці паслуг і быту, не спрыялі захаванасці традыцыйнай культуры. Для перыяду, які разглядаецца, былі характэрнымі шматлікія недахопы ў арганізацыі гандлю і нізкая культура абслугоўвання насельніцтва. Адміністрацыйна-камандная сістэма планавання і размеркавання прывялі да бязладдзіцы і пралікаў у арганізацыі забеспячэння насельніцтва таварамі, спарадзілі дэфіцыт, нормай грамадскага жыцця стала такое паняцце як “блат”. Спробы выправіць становішча шляхам змяняльнасці кадраў і павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу ва ўмовах існавання савецкай эканамічнай сістэмы не прыносілі чаканага выніку. У кіраўнікоў і спецыялістаў не існавала магчымасцяў для самастойнай дзейнасці, творчыя памкненні кадраў скоўваліся жорсткімі рамкамі адміністрацыйнай распарадчасці і кантролю, не забяспечвалася неабходная ступень эканамічнай свабоды, дапушчальнай рызыкі.

[1] Информация КПК при ЦК КПСС о выполнении в Могилёвской области БССР директив партии и правительства по вопросам культурного обслуживания населения. 03.06.1985 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 178. Спр. 65. Арк. 13-15.

## Глава 3
## КАДРАВАЯ ПАЛІТЫКА Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Ва ўмовах панавання ў СССР аднапартыйнага камуністычнага рэжыму ўсе бакі жыцця грамадства вызначаліся і кантраляваліся КПСС[1]. Развіццё БССР у 1956–1970 гг. вызначалася рашэннямі з'ездаў і пленумаў ЦК КПСС. А агульны кантроль за развіццём прамысловасці, падрыхтоўкай, зменай і ратацыяй кадраў здзяйсняўся ў савецкія часы партыйнымі органамі. Калі Цэнтральны Камітэт КПСС вызначаў агульныя мэты і задачы, кірунак развіцця, прынцыпы кадравай палітыкі, то ЦК КПБ канкрэтызаваў іх у дачыненні да прамысловасці рэспублікі, прымаў удзел у распрацоўцы канкрэтных праграм развіцця прамысловасці, здзяйсняў агульную кадравую палітыку на тэрыторыі Беларусі. Партыйныя органы пільна адсочвалі і накіроўвалі працу па падборы, расстаноўцы і выхаванні кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў.

Нягледзячы на вядомасць і шырокую публічнасць прынятых на ўзроўні ЦК КПСС і ЦК КПБ рашэнняў, з вышыні нашага часу ўяўляецца не толькі гістарычна цікавым, але і практычна важным нанава паглядзець на храналогію і змест прынятых у другой палове мінулага стагоддзя рашэнняў, якія тычацца кадравай палітыцы ў галіне прамысловасці. Гэта важна не толькі з пункту гледжання разгляду вытокаў сучаснай сітуацыі, але і з гледзішча эфектыўнасці тагачаснай кадравай палітыцы. Пра актуальнасць тэмы сведчыць і рост публіцыстычнай актыўнасці аўтараў, якія даследуюць кадравы патэнцыял прамысловасці БССР.

Аналіз рашэнняў і пастаноў цэнтральных і рэспубліканскіх структур КПСС (КПБ), выканаўчых і прадстаўнічых органаў, пратаколаў пасяджэнняў абласных партыйных канферэнцый, пленумаў, бюро і сакратарыятаў абласных камітэтаў дазваляе зразумець працэсы фарміравання кадравага патэнцыялу Савецкай Беларусі на прыкладзе Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

### 3.1 Партыйнае кіраўніцтва і кантроль за фарміраваннем кадраў прамысловых прадпрыемстваў у 1944–1970 гг.

Усесаюзная камуністычная партыя бальшавікоў іграла рашаючую ролю ў жыцці савецкага грамадства, але яе роля пасля вайны аказалася некалькі

[1] Фармальна вышэйшым органам улады лічыліся з'езды КПСС. Паміж з'ездамі – Цэнтральны камітэт, які выбіраўся з'ездам. Падчас іх пасяджэнняў вызначаліся асноўныя напрамкі палітыкі партыі і фарміраваліся склады яе вышэйшых органаў. Пленумы ЦК – пленарнае пасяджэнне членаў і кандыдатаў у члены ЦК, вышэйшага партыйнага органа, праводзіліся ў перыяд паміж з'ездамі КПСС і дзе абмяркоўваліся найбольш важныя пытанні ўнутрыпартыйнай працы, палітычныя і эканамічныя праблемы. Згодна са Статутам КПСС (1971) пленум ЦК павінен быў праводзіцца не менш за адно пленарнае пасяджэнне за паўгоддзе. Адпаведна вышэйшымі органамі КПБ былі з'езды, якія выбіраліся абласнымі канферэнцыямі, паміж з'ездамі – ЦК КПБ, паміж пасяджэннямі цэнтральных камітэтаў – бюро ЦК. Вышэйшыя органы абласных арганізацый – абласныя канферэнцыі, паміж абласнымі канферэнцыямі – абласныя камітэты, якія праводзілі абласныя пленумы, паміж пасяджэннямі абласныя камітэтаў – бюро абласных камітэтаў, выканаўчыя органы – сакратарыяты абласных камітэтаў.

двухсэнсоўнай. Нярэдка функцыі партыйных і дзяржаўных органаў змешваліся. Многія важныя рашэнні прымаліся не партыйнымі, а дзяржаўнымі органамі кіравання. Прынцыпы так званай савецкай і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі груба парушаліся ў пасляваенныя гады. Нерэгулярнасць з'ездаў і пленумаў ЦК партыі, як і абласных канферэнцый і пленумаў, стала нормай. Часта пры прыняцці рашэнняў выкарыстоўваўся "метад апытання" без абмеркавання сутнасці пытання.

Праца прамысловасці была ў цэнтры ўвагі як маскоўскага, так і мінскага партыйнага кіраўніцва. На пленуме ЦК КП(б)Б у ліпені 1945 г. абмяркоўвалася пытанне "Аб недахопах у справе арганізацыі прамысловай вытворчасці і аб мерах па іх устараненні". Прычынамі шматлікіх недахопаў у дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў ЦК беларускіх камуністаў вызначыў недапушчальную адсутнасць клопату па падрыхтоўцы кадраў масавых прафесій і нагадаў, што далейшае развіццё прамысловасці будзе залежыць ад падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў, палічыў недапушчальным адсутнасць неабходнага клопату з боку кіраўніцтва прадпрыемстваў, партыйных і грамадскіх арганізацый пра паляпшэнне жылёва-побытавых умоў рабочых і ІТР, што вядзе да вялікай цякучасці кадраў[1]. Так, адразу ж пасля вайны былі вызначаны некалькі асноўных праблем і кірункі кадравай палітыкі ў прамысловасці.

Чацвёртая пяцігодка была адзінай пасляваеннай пяцігодкай, дырэктывы якой не абмяркоўваў з'езд КПСС, а зацвярджаў Закон, які быў прыняты ВС СССР 18.03.1946 г. Перад эканомікай краіны ставілася задача аднавіць пацярпелыя ад вайны раёны краіны, аднавіць даваенны ўзровень прамысловасці і сельскай гаспадаркі і затым перасягнуць гэты ўзровень у больш-менш значных памерах. ЦК УсеКП(б) у сакавіку 1946 г. прыняў на сябе толькі арганізацыю агітацыйна-прапагандысцкай работы ў сувязі з прыняццем гэтага Закона[2] і ў маі 1946 г. зацвердзіў пастанову аб арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне і перавыкананне пяцігадавога плана[3]. Такога роду дзейнасць і надалей арганізоўвалася пасля пачатку чарговай пяцігодкі саюзнымі, рэспубліканскімі, абласнымі партыйнымі арганізацыямі і стала традыцыйнай формай працы.

У 1947 г. у пастанове ЦК УсеКП(б) "Аб рабоце ЦК КП(б) Беларусі" вялікая ўвага была нададзена рабоце з кадрамі. Была адзначана нездавальняючая праца з кадрамі мясцовых партыйных арганізацый, якая прывяла да высокай змяняльнасці і перамяшчэння кіроўчага складу органаў кіравання рэспублікай і рэгіёнаў. Быў адзначаны парадны нерабочы характар многіх пленумаў і канферэнцый, што замінала крытыцы і самакрытыцы,

---

[1] Постановление ЦК КП(б)Б "О недостатках в деле организации промышленного производства и о мерах по их устранению". 7–12.07.1945 г. // Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов, и пленумов ЦК. Т. 4. С. 30–39.

[2] Постановление ЦК ВКП(б) "Об агитационно-пропагандистскай работе партийных организаций в связи с принятием Закона о пятилетнем плане восстонавления и развития народного хозяйства СССР на 1946–1950 годы". 27 марта 1946 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 17–20.

[3] Постановление ЦК ВКП(б) "Об организации всесозного социалистического соревнования за выполение и перевыполнение пятилетнего плана восстановления и развития народного хозяйства СССР". 18 мая 1946 г. // Там жа. С. 21–23.

дзелавому разгляду пытанняў. У выніку ў рэспубліцы мелася "нямала фактаў парушэння савецкіх законаў, маральна-побытавага разлажэння, разбэшчанасці і недысцыплінаванасці", дробнабуржуазных праяў сярод кіраўніцкіх работнікаў. Усе гэтыя недахопы і злачынныя праявы, меры па іх выпраўленні тычыліся не толькі партыйнай і савецкай эліты, але і ўсіх іншых прыступак сістэмы кіравання, у тым ліку і прамысловасці, пра што сведчыць адсылка да ўзмацнення кантролю за дзейнасцю гаспадарчых арганізацый. Пастанова прадугледжвала канцэнтрацыю ўвагі на паляпшэнні працы прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, завяршэнні будаўніцтва шэрагу прамысловых прадпрыемстваў, разгортванні падрыхтоўкі рабочых з мясцовага насельніцтва, прыняцці рашучых мер па паляпшэнні ўмоў працы і побыту рабочых, а таксама работы сферы гандлю і побытавага абслугоўвання, барацьбе з дробнабуржуазнымі праявамі. ЦК КП(б)Б абавязалі "карэнным чынам палепшыць работу з кадрамі і іх бальшавісцкае выхаванне"[1].

Першы пасля 1939 г. XIX з'езд камуністычнай партыі ў кастрычніку 1952 г., нарэшце, напрыканцы другога года чарговай пяцігодкі зацвердзіў дырэктывы пятага пяцігадовага плана развіцця СССР на 1951–1955 гг. і перайменаваў УсеКП(б) у КПСС (Камуністычную партыю Савецкага Саюза). Кадравая палітыка ў дырэктывах практычна не разглядалася. Былі прапісаны толькі задачы павелічэння за пяцігодку ў адпаведнасці з планам развіцця народнай гаспадаркі выпуску спецыялістаў з вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў на 30–35 %, а для галоўных галін прамысловасці і будаўніцтва ў 1955 г. у 2 разы ў параўнанні з 1950-м, і падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі рабочых. Планавалася таксама ўзняць масавы рух рацыяналізатараў і вынаходнікаў з інжынераў, тэхнікаў і рабочых"[2].

А вось XX з'езд КПСС, які прайшоў у 1956 г., быў ва многіх сэнсах гістарычным і на дзесяцігоддзе вызначыў шляхі развіцця краіны. У рэзалюцыі па справаздачнаму дакладу Цэнтральнага камітэта быў у чарговы раз запланаваны апераджальны рост цяжкай прамысловасці, але гэтым разам было акцэнтавана ўказана і на магчымасць хуткіх тэмпаў развіцця вытворчасці прадметаў народнага спажывання. Прадугледжвалася больш цесная сувязь школы з вытворчасцю, развіццё прафесійнай адукацыі, ставілася задача развіцця творчай актыўнасці і ініцыятывы працоўных, планавалася павялічэнне правоў рэспубліканскіх органаў, зафіксавана рашучая неабходнасць узняцця ролі Саветаў і прафсаюзаў у гаспадарчым і культурным будаўніцтве. З'езд таксама звярнуў увагу на неабходнасць скарачэння адміністрацыйна-кіроўчага апарату і працягу непрымірымай барацьбы з бюракратызмам[3].

Кадравай палітыцы ў прамысловасці ў рэзалюцыі з'езда ўдзялася няшмат увагі, у адрозненні ад неабходнасці ўмацоўвання кадравага патэнцыялу

---

[1] Постановление ЦК ВКП(б) "О работе ЦК КП(б) Белоруссии". 25.01.1947 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 80–93.

[2] XIX съезд КПСС. 1952 г. Резолюции и постановления съезда // Там жа. С. 281–283.

[3] XX съезд КПСС. 1956 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 16, 18–19, 21–22, 25.

сельскай гаспадаркі. Але ў дырэктывых XX з'езда КПСС прадпісвалася паляпшэнне якасці вытворчага навучання моладзі ў школах і вучылішчах дзяржаўных працоўных рэзерваў, а таксама непасрэдна на вытворчасці. Дырэктавалася і пераразмеркаванне працоўных рэсурсаў паміж галінамі народнай гаспадаркі і паміж рэгіёнамі, пры асаблівай увазе забеспячэння ўсходніх і паўночных раёнаў СССР[1].

Многія іншыя пастановы ЦК КПСС у той ці іншай ступені таксама тычыліся развіцця і кіравання прамысловасцю, кадравай палітыкі. Пастанова "Аб паляпшэнні дзейнасці Саветаў дэпутатаў працоўных і ўзмацненні іх сувязей з масамі" ад 22.01.1957 г. нацэльвала на ўздым ролі Саветаў як арганізатараў мас ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве[2]. Пастанова Пленума ЦК КПСС 13–14.02.1957 г. "Аб далейшым ўдасканаленні арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам" намячала "набліжэнне кіраўніцтва да эканамічных раёнаў, перадачу часткі паўнамоцтваў саюзных міністэрстваў кіраўніцтву эканамічных раёнаў, саюзных і аўтаномных рэспублік[3].

Нават пераразмеркаванне рабочай сілы здзейснялася ў адпаведнасці з дырэктывамі партыйных органаў і Савета Міністраў СССР. Так, у 1957 г. была прынята пастанова "Аб грамадскім прызыве ў 1957 г. моладзі для работ на важных будоўлях, якія размешчаны ва ўсходніх і паўночных раёнах СССР і ў Данбасе"[4]. Падобныя дырэктывы прымаліся і надалей. У адпаведнасці з рашэннямі партыі і ўрада фарміраваліся міграцыйныя патокі беларусаў за межы рэспублікі і сустрэчная міграцыя ў БССР з іншых рэгіёнаў СССР.

Закраналі кадравую палітыку і спецыяльныя пастановы пра развіццё асобных галін прамысловасці. Пастанова Пленума ЦК КПСС 1958 г. пра паскоранае развіццё хімічнай прамысловасці і асабліва вытворчасці сінтэтычных матэрыялаў і вырабаў з іх для задавальнення патрэб насельніцтва і патрэб народнай гаспадаркі давала дырэктывы не толькі паскоранага развіцця "перадавой" галіны вытворчасці, што пераўтварыла праз дзесяць гадоў БССР у рэспубліку вялікай хіміі, але і прадугледжвала падрыхтоўку спецыялістаў і рабочых кадраў для гэтай галіны[5].

Партыйныя органы БССР па-ранейшаму здзяйснялі кантроль над органамі галіновага і мясцовага кіравання прамысловасцю, у тым ліку ў вобласці кадравай палітыкі. Асноўнымі прынцыпамі кантролю былі "сталасць кантролю" і здзяйсненне "неабходнай патрабавальнасці". Так, 12.07.1958 г. на пасяджэнні Бюро Віцебскага абкама КПБ разбіралася пытанне "Аб

---

[1] XX съезд КПСС. 1956 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 67.

[2] Постановление ЦК КПСС "Об улучшении деятельности Советов депутатов трудящихся и усилении их связей с массами". 22 января 1957 г. // Там жа. С. 156-166.

[3] Постановление ЦК КПСС "О дальнейшем совершенствовании управления промышленностью и строительством". 13–14 февраля 1957 г. // Там жа. С. 167–174.

[4] Постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР "Об общественном призыве в 1957 г. молодежи для работы на важнейших сооружениях, расположенных в восточных и северных районах СССР и в Донбассе". 14 июня 1957 г. // Там жа. С. 181–183.

[5] Постановление Пленума ЦК КПСС "Об ускоренном развитии химической промышленности и особенно производства синтетических материалов и изделий из них для удовлетворения потребностей населения и нужд народного хозяйства". 6–7 мая 1958 г. // Там жа. С. 236–242.

нездавальняючай рабоце абласнога ўпраўлення прамысловасцю”. Ужо ў першым абзацы члены Бюро канстантавалі, што “кіраўніцкія работнікі ўпраўлення крайне нездавальняюча здзяйсняюць кантроль за работай прамысловасці, не выяўляюць неабходнай патрабавальнасці да кіраўнікоў прадпрыемстваў і не аказваюць ім практычнай дапамогі ў арганізацыі вытворчасці…” Бюро Віцебскага АК КПБ лічыла, што менавіта ў выніку нездавальняючага кіравання прамысловасцю з боку абласнога ўпраўлення план 1957 г. па ўсіх паказчыках не выкананы. Не выканалі план па валавай прадукцыі 32 прадпрыемствы. У пастанове бюро ўказваецца начальніку абласнога Упраўлення прамысловасці т. Ткачову на няправільны стыль у рабоце па кіраванні прамысловымі прадпрыемствамі, які скоўвае ініцыятыву работнікаў апарату і прыніжае ролю і адказнасць галіновых аддзелаў за стан спраў на месцах[1].

Важную ролю для ўсіх рэгіёнаў і рэспублік СССР мела пастанова ЦК КПСС “Аб рабоце з кадрамі ў партыйнай арганізацыі Кіргізіі” ад 21.10.1958 г. У пастанове падкрэслівалася, што ўзровень работы з кадрамі ў рэспубліцы не адпавядаў тым задачам, якія стаялі перад партарганізацыямі рэспублікі, указваліся тыповыя недахопы ў кадравай рабоце: партарганізацыі слаба вывучалі кадры і часцяком не ведалі маладых работнікаў, якія былі вартыя вылучэння; мірыліся са знаходжаннем на кіраўніцкіх пасадах дрэнных арганізатараў, бесперспектыўных кіраўнікоў; партарганізацыі не здзяйснялі належны кантроль за работай з кадрамі ў міністэрствах і на прадпрыемствах і не аказвалі неабходнай дапамогі кадрам ў павышэнні дзелавой кваліфікацыі; падрыхтоўка спецыялістаў і кваліфікаваных рабочых у рэспубліцы вялася нездавальняюча; пятая частка кіраўніцкіх кадраў і ІТР саўнаргаса была замешчана работнікамі, якія не мелі тэхнічнай адукацыі; на многіх заводах, шахтах, будоўлях не былі створаны неабходныя культурна-побытавыя і жыллёвыя ўмовы, з-за чаго назіралася вялікая цякучаць кадраў і г. д. [2]

На прыкладзе адной саюзнай рэспублiцы ўсім партыйным арганізацыям краіны былі ўказаны прынцыпы работы з кадрамі і шляхі паляпшэння работы ва ўсіх рэспубліках і галінах народнай гаспадаркі СССР. Найперш, звярталася ўвага на неабходнасць паляпшэння эканамічнай вучобы кіраўніцкіх кадраў, арганізацыі іх завочнага навучання. Па-другое, прапаноўвалася смялей вылучаць на кіраўніцкія пасады маладых падрыхтаваных работнікаў, якія валодаюць арганізатарскімі здольнасцямі, але пры гэтым забяспечыць спалучэнне у рабоце “старых, вопытных і маладых кадраў”. Звярталася ўвага на неабходнасць правільнай расстаноўкі кадраў і пераразмеркавання спецыялістаў з абласных устаноў, “дзе яны аселі”, на практычную работу па спецыяльнасці. Звярталася ўвага, што ва многіх абкамах і гаркамах кантроль над прамысловасцю ўскладзены на работнікаў, якія не маюць спецыяльных ведаў, і

[1] Протокол № 10 заседания бюро Витебского обкома КПБ от 12 июля 1958 г. Вопрос “О неудовлетворительной работе областного муправления промышленностью” // ДАВіц. Ф. 1-п. Воп. 4. Спр. 637. Арк. 46-50.
[2] Постановление ЦК КПСС «О работе с кадрами в партийной организации Киргизии». 21 октября 1958 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 264–270.

прапаноўвалася замяніць іх на спецыялістаў, якія ведаюць прамысловую вытворчасць. Асобна звярталася ўвага на неабходнасць гадаваць свае нацыянальныя кадры[1].

Некаторыя акцэнты кадравай палітыкі былі ўзмоцнены на XXI з’ездзе КПСС у 1959 г. У рэзалюцыі з’езда па дакладу М. Хрушчова “Аб кантрольных лічбах развіцця народнай гаспадрцы СССР на 1959–1965 гг.” была падкрэслена неабходнасць паляпшэння справы  расстаноўкі і выхавання кадраў шляхам вылучэння на кіраўніцкую работу людзей “падрыхтаваных, прынцыповых, якія валодаюць пачуццём новага”…, неабходнасць найсмялейшага вылучэння маладых кадраў[2].

Пастанова ЦК КПСС ад 26.06.1959 г. “Аб утварэнні ў першасных партыйных арганізацыях вытворчых і гандлёвых прадпрыемствах камісій па ажыццяўленні партарганізацыямі права кантролю дзейнасці адміністрацый прадпрыемстваў" была накіравана на ўзмацненне кантролю партыйных камітэтаў над кадрамі прамысловасці[3].

Пастанова ЦК КПСС “Аб рабоце партыйнага камітэта Уральскага завода цяжкага машынабудавання імя С. Арджанікідзе” ад 26.06.1959 г. адлюстравала наспеласць неабходнасць зменаў ва ўзаемаадносінах партыйных арганізацый і адміністрацый прамысловых прадпрыемстваў. У дакуменце адзначалася, што стварэнне партыйнай камісіі па ажыццяўленні партарганізацыямі права кантролю дзейнасці адміністрацый на вядучым прадпрыемстве СССР дазволіла расшырыць сферу партыйнага кантролю, зрабіла яго больш кваліфікаваным, далучыла да яго частку рабочых, але, замест павышэння патрабавальнасці да кіраўніцкіх работнікаў прадпрыемства і павышэння іх адказнасці, партком “дапускае перанос метадаў гаспадарчага кіраўніцтва на партыйную работу”, бярэ на сябе разгляд шматлікіх гаспадарчых пытанняў[4]. Цэнтральны камітэт звяртаў на гэта ўвагу, бо падобныя метады былі тыповымі ў рабоце многіх партыйных арганізацыяй.

Непрапарцыянальнае выдаткоўванне сродкаў, прадугледжаных па смеце на прэміраванне і аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам, размеркаванне кватэр і іншыя парушэнні заканадаўства знаходзіліся ў сферы кантролю парткомаў. Але фактычна эфектыўнасць такога кантролю была нізкай. Паказальным можна лічыць пасяджэнне Бюро Віцебскага абкама КПБ 25.12.1961 г., на якім разглядалася пытанне “Аб няправільных паводзінах кіраўніцкіх работнікаў завода радыёдэталяў”. Члены Бюро канстатавалі, што праверка заяў рабочых завода ў адрас ЦК і абкама партыі паказала, што на

---

[1] Постановление ЦК КПСС «О работе с кадрами в партийной организации Киргизии». 21 октября 1958 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 264–270.

[2] XXI съезд КПСС. 1959 г. Резолюции и постановления съезда // Там жа. С. 319–320.

[3] Постановление ЦК КПСС «Об образовании в первичных партийных организациях производственных и торговых предприятий комиссий по осуществлению парторганизациями права контроля деятельности администраций предприятий”. 26 июня 1959 г. // Там жа. С. 467–472.

[4] Постановление ЦК КПСС “О работе партийного комитета Уральского завода тяжелого машиностроения имени С. Ордоникидзе”. 7 лютага 1961 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 31–36.

заводзе маюцца парушэнні працоўнага заканадаўства, пераносы выхадных дзён, "празмернае захапленне" звышурочнымі працамі; што дырэктар завода "акружыў сябе падхалімамі, адарваўся ад калектыву, дапускае ў адносінах да падначаленых грубасць, бюракратызм, паводзіць сябе фанабэрыста, ігнаруе меркаванні спецыялістаў, абражае і глушыць іх ініцыятыву". Было прызнана, што дырэктар незаконна набыў тэлевізар, будаўнічыя матэрыялы, бясплатна карыстаўся маёмасцю завадскога камітэта ДТСААФ. Па прыкладзе дырэктара і іншыя кіраўнікі завода (галоўны інжынер, галоўны тэхнолаг, начальнік аддзела забеспячэння) пачалі незаконна набываць тэлевізары. Усё гэта стала магчымым ва ўмовах адсутнасці партыйнага кантролю і беспрынцыповасці з боку партбюро завода, сакратар якога таксама "набыў тэлевізар незаконным шляхам". "За злоўжыванне службовым становішчам, адрыў ад калектыву, парушэнні працоўнага заканадаўства" дырэктара завода радыёдэталяў пастанавілі зняць з працы. Віцебскаму гаркаму партыі даручылі прыцягнуць да адказнасці іншых кіраўнікоў прадпрыемства, узмацніць кантроль за працай завода, палепшыць работу па падборы і выхаванні кіраўніцкіх кадраў завода[1]. Паказальна, што падставай для праверкі завода сталі заявы рабочых у адрас ЦК і абкама партыі, а не кантроль партыйнай арганізацыі прадпрыемства.

Чарговы XXII з'езд камуністычнай партыі ў 1961 г. прыняў рэзалюцыю па справаздачнаму дакладу, новыя Праграму і Статут арганізацыі, што мела важныя наступствы, у тым ліку для арганізацыі работы з кадрамі. Так, на з'ездзе была цалкам адобрана перабудова кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, агучаны прынцыпы работы партыйнага і савецкага апарату. Дзяржаўны апарат павінен быў быць "простым, кваліфікаваным, танным, і аператыўным, без якіх-небудзь выяўленняў бюракратызму, фармалізму і цяганіны"[2]. На падобных прынцыпах партыя спрабавала пабудаваць працу і апарату кіравання прамысловасцю.

На з'ездзе быў зацверджаны маральны кодэкс будаўніка, які сярод іншых замацаваў такі прынцып, як "непрымірымасць да несправядлівасці, дармаедства, нячэснасці, кар'ерызму, скнарнасці". КПСС менавіта за партыйнымі органамі замацавала функцыю "падбору і расстаноўкі кіраўніцкіх кадраў, выхаванне іх у духу камуністычнай ідэйнасці, чэснасці і праўдзівасці, высокай адказнасці перад партыяй і народам за даручаную справу"[3].

Пастанова ЦК КПСС ад 20.03.1962 г. "Аб рабоце партыйнай арганізацыі Ташкенцкага тэкстыльнага камбіната па выкананні рашэнняў XXII з'езда КПСС аб пашырэнні вытворчасці і паляпшэнні якасці выпускаемай прадукцыі" сярод вытворчых пытанняў закранала і кадравыя праблемы. Партком камбіната і гаспадарчае кіраўніцтва камбіната абавязалі прыняць меры па паляпшэнні работы з кадрамі, дабівацца таго, каб кожны ўчастак узначальваў высокакваліфікаваны спецыяліст, смялей вылучаць на кіраўніцкую работу

[1] Протокол заседания бюро Витебского обкома КПБ от 25 декабря 1961 года "О неправильном поведении руководящих работников завода радиодеталей"// ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 5. Спр. 402. Арк. 118-119.
[2] XXII съезд КПСС. 1961 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 68, 157.
[3] XXII съезд КПСС. 1961 г. Резолюции и постановления съезда // Там жа. С. 168–169, 196, 200–201.

жанчын і маладых спецыялістаў, а таксама рабочых з ліку мясцовых нацыянальнасцяў[1]. Гэтыя важныя падыходы прапаноўвалася рэалізоўваць і іншым партыйным арганізацыям саюзных рэспублік.

Спробы новага кіраўніцтва СССР у другой палове 1950 гг. метадамі ўдасканалення і рэарганізацыі сістэмы кіравання народнай гаспадаркай вырашыць наспелыя эканамічныя праблемы краіны не далі такіх хуткіх станоўчых вынікаў, на якія яно разлічвала. Таму ў лістападзе 1962 г. Пленум ЦК КПСС прыняў пастанову “Аб развіцці эканомікі СССР і перабудове партыйного кіраўніцтва народнай гаспадаркай”. Перабудова партыйных органаў і арганізацый пайшла па так званаму вытворчаму прынцыпу, адначасова было прынята рашэнне аб стварэнні адзінага органа партыйнага і дзяржаўнага кантролю[2]. У кастрычніку 1964 г. Пленум ЦК КПСС вызваліў М. Хрушчова і абраў Л. Брэжнева першым сакратаром ЦК КПСС[3]. Ужо праз месяц была адноўлена адміністрацыйная вертыкаль улады – прамысловыя і сельскія партыйныя арганізацыі былі аб’яднаны[4].

XXIII з’езд камуністычнай партыі ў 1966 г. канстатаваў шматлікія станоўчыя змены ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, у тым ліку тых фактараў, якія ўплывалі на самаадчуванне працоўных калектываў, стабілізацыю іх кадравага складу. За гады сямігодкі была павышана зарплата ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, уведзены сямігаддзінны рабочы дзень, пабудавана жылля амаль столькі ж, колькі за ўсе гады Савецкай улады да 1958 г.[5]

Паколькі XXIII з’езд адбываўся пасля змены кіраўніцтва краіны, то ў рэзалюцыях форуму больш казалася аб невыкананні паказчыкаў сямігадовага плана. Прычынамі “адмоўных фактаў” назвалі ў першую чаргу недахопы кіравання народнай гаспадаркай і недаацэнку эканамічных метадаў кіраўніцтва, што закранала і кадравую палітыку. З’езд адобрыў новыя падыходы да кіраўніцтва прамысловасцю – спалучэнне цэнтралізаванага галіновага кіравання з пашырэннем правоў саюзных рэспублік, узмацненнем эканамічных метадаў кіраўніцтва гаспадаркай, пашырэнне гаспадарчай самастойнасці і ініцыятывы калектываў прадпрыемстваў, павышэннем іх матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках сваёй дзейнасці. Звярталася ўвага і на ўзмацненне ўвагі да маральных стымулаў да працы. А ў дырэктывах з’езда патрабавалася расшырыць “дэмакратычныя асновы кіравання”[6].

---

[1] Постановление ЦК КПСС «О работе партийной организации ташкентского текстильного комбината по выполненнию решений XXII съезда КПСС о расширении производства и улучшении качества выпускаемой продукции”. 20 марта 1962 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 234.

[2] Постановление пленума ЦК КПСС “О развитии экономики СССР и перестройке партыйного руководство народным хозяйством». 19-23 ноября 1962 г. // Там жа. С. 288–296.

[3] Постановление Пленума ЦК КПСС. 14 октября 1964 г. // Там жа. С. 418.

[4] Постановление ЦК КПСС “Об объединении промышленнях и сельских областных, краевых партийныъ организаций». 16 ноября 1964 г. // Там жа. С. 418.

[5] XXIII съезд КПСС. 1966 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 16.

[6] XXIII съезд КПСС. 1966 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 17–18, 38.

Нягледзячы на недапушчальнасць пераносу метадаў гаспадарчага кіраўніцтва на партыйную, савецкую і грамадскую работу XXIII з’езд КПСС зноўку замацаваў палажэнне, адпаведна якому найважнейшымі задачамі партыйных і гаспадарчых органаў, у тым ліку “ўсіх работнікаў прамысловасці”, з’яўляліся забеспячэнне высокіх тэмпаў росту вытворчасці працы работнікаў, комплексная механізацыя вытворчых працэсаў, унядрэнне навуковай арганізацыі працы. З’езд палічыў, што не толькі гападарчыя, але і партыйныя, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія органы “павінны засяродзіць ўвагу на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці…”[1] Гэтыя рашэнні фактычна супярэчылі прапанаванай эканамічнай рэформе, зноўку вярталі канцэнтрацыю ўвагі ўсіх галін улады на эканамічных пытаннях, акцэнты ў рабоце засталіся традыцыйнымі для большай частцы часу функцыянавання савецкай эканамічнай мадэлі. У рэзалюцыі з’езда было падкрэслена, што на кіраўніцкую работу павінны вылучацца работнікі, “адданыя ідэям камунізму, якія добра ведаюць сваю справу, стала звязаныя з масамі, якія ўмеюць арганізаваць іх…”, што трэба “смялей вылучаць маладых, энергічных работнікаў, правільна спалучаючы іх энергію з вопытам старых кадраў”[2]. Відавочна, што неабходнасць забяспечыць прыток маладых кіраўнікоў разумелася кіраўніцтвам краіны.

Партыйныя пастановы і дырэктывы прыцягвалі ўвагу да праблем у рабоце з кадрамі, але сітуацыя да лепшага мянялася вельмі павольна. Пастанова ЦК КПСС “Аб рабоце ЦК кампартыі Эстоніі з кіраўніцкімі кадрамі” ад 30.01.1967 г. канстатавала, што пытанні падбору, вылучэння і выхавання кадраў не сталі галоўнымі ў дзейнасці партыйных камітэтаў. Партыйныя і дзяржаўныя органы былі не заўжды патрабавальныя пры адборы кадраў, дапускалі ў гэтай справе паспешлівасць і неразборлівасць, на адказныя пасады вылучаліся малападрыхтаваныя і безыніцыятыўныя работнікі, слабыя арганізатары, назіралася высокая зменлівасць кадраў. Таксама партыйная арганізацыя рэспублікі не выяўляла дастатковага клопату па вылучэнні жанчын на кіраўніцкія пасады. Сярод кіраўнікоў па-ранейшаму было шмат практыкаў[3].

Праблема мела саюзнае значэнне. Аналіз работы Омскага абкама КПСС таксама выявіў істотныя недахопы і памылкі ў падборы і выхаванні кадраў. Слабая праца вялася з рэзервам кадраў, вылучэнне на кіраўніцкія пасады абмяжоўвалася вузкім кругам асобаў” [4]. У 1967 г. ЦК КПСС рэкамендаваў распаўсюдзіць па іншых прадпрыемствах прамысловасці вопыт Свярдлоўскай абласной і Рыбінскай гарадской партыйных арганізацый па ўкараненні

[1] XXIII съезд КПСС. 1966 г. Резолюции и постановления съезда // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 20–21.
[2] XXIII съезд КПСС. 1966 г. Резолюции и постановления съезда // Там жа. С. 24.
[3] Постановление ЦК КПСС “О работе ЦК компартии Эстонии с руководящими кадрами”. 30 января 1967 г. // Там жа. С. 141.
[4] Постановление ЦК КПСС “О работе Омского обкома КПСС. 11 мая 1967 г. // Там жа. С. 169.

навуковай арганізацыі працы ў прамысловасці і павышэнні культуры вытворчасці[1]...

Найбольш комплексна пытанні падбору, расстаноўкі і выхавання кіраўніцкіх кадраў у прамысловасці разглядалася ў ЦК КПСС 11.09.1968 г. на прыкладзе Валгаградскай вобласці. У пастанове адзначана наяўнасць кваліфікаваных, палітычна спелых кадраў на многіх прамысловых прадпрыемствах вобласці. Але зноўку адзначана, што ўзровень работы з кадрамі не задавальняе вышэйшыя партыйныя органы. У чарговы раз было ўказана, што гаркамы, райкамы партыі мірацца з тым, што многія ўчасткі вытворчасці ўзначальваюць людзі, якія не маюць дастатковай тэхнічнай адукацыі і эканамічных ведаў. Як і ў БССР, асабліва часта не мелі спецыяльнай адукацыі і нават вышэйшай адукацыі дырэктары і галоўныя інжынеры прадпрыемстваў харчовай, лёгкай, мясцовай прамысловасці і промбудматэрыялаў. Як і ў ранейшых пастановах, звярталася ўвага на слабую работу з рэзервам кадраў, малае вылучэнне перадавых рабочых. Звярталася ўвага на недапушчальнасць такой сітуацыі ва ўмовах правядзення гаспадарчай рэформы. У выніку, за два гады змянілася чвэрць дырэктараў і галоўных інжынераў прадпрыемстваў, якія ўваходзілі ў наменклатуру Валгаградскага абкама партыі[2].

Партыйныя органы ў канцы 1960 гг. звярталі ўвагу не толькі на неабходнасць удасканалення работы кіраўнікоў прамысловай вытворчасці, але і на работу інжынерна-тэхнічных работнікаў. Адзначалася, што, нягледзячы на арганізацыю вучобы, ІТР слаба ўдзельнічалі ў ажыццяўленні тэхнічнага прагрэсу, а кіраўніцтва многіх прадпрыемстваў слаба падтрымлівала ініцыятыву спецыялістаў і іх актыўнасць. Значная частка і рабочага часу ІТР займалі нарады і пасяджэнні, шмат увагі адымалі канцылярскія абавязкі па забеспячэнні вытворчасці, якія не патрабавалі інжынернай кваліфікацыі. Многія пасады займалі людзі без спецыяльнай падрыхтоўкі. Увага партыйных арганізацый краіны накіроўвалася на паляпшэнне умоў і павышэнне эфектыўнасці працы спецыялістаў, паляпшэнне іх ідэйна-палітычнага выхавання і ўзроўню навукова-тэхнічнай інфармацыі[3].

У абласных, гарадскіх камітэтах партыі існавалі аддзелы, якія курыравалі партыйныя арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў, а фактычна і самі прадпрыемствы. Назвы аддзелаў, якія "адказвалі" за прамысловасць, мяняліся разам са зменамі ў палітыцы партыі і са структурнымі пераўтварэннямі ў сістэме партыйнага і дзяржаўнага кіравання. Так, у Магілёўскім абкаме КПБ на працягу перыяду вывучэння назвы аддзелаў мяняліся каля дзясятка разоў.

---

[1] Постановление ЦК КПСС "О работе Свердловской областной и Рыбинской городской партийных организаций по внедрению научной организации труда в промышленности и повышению культуры производства". 29 августа 1967 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 264.

[2] Постановление ЦК КПСС "О работе Волгоградского обкома по подбору, расстановке и воспитанию руководящих кадров в промышленности". 11 сентября 1968 г. // Там жа. С. 350–354.

[3] Постановление ЦК КПСС "О работе Иркутского обкома по повышению роли инжинерно-технических работников в ускорении технического прогреса на предприятиях и стройках области". 9 октября 1969 г. // Там жа. С. 429–434.

Партыйныя арганізацыі адсочвалі таксама сацыяльную і палітычную сітуацыю на месцах. На прамысловых прадпрыемствах склаўся так званы “трохкутнік”: адміністрацыя, партыйная і прафсаюзная арганізацыя, якую ў рэальнасці ўвасаблялі дырэктар, парторг і прафорг, якія вырашалі галоўныя пытанні і фармальна неслі салідарную адказнасць за поспехі і няўдачы ў кіраванні прадпрыемствамі. Прычым ў кожнага боку была свая доля і сфера адказнасці, якія не былі жорстка і адназначна рэгламентаваны. Адносіны паміж арганізацыямі і адміністрацыямі складваліся па-рознаму не толькі ў залежнасці ад асабістых якасцяў іх лідараў, але і ад кірунку ўнутранай палітыкі ў СССР. Пры ўсёй разнастайнасці канкрэтных узаемаадносін трэба прызнаць, што менавіта адміністрацыя на прадпрыемствах найчасцей адчувала сябе рэальным кіраўніком і гаспадаром суб’екта гаспадарання.

Дзейнасць органаў кіравання ў галіне кадравай палітыкі грунтавалася на двух асноўных прынцыпах падбору кадраў: па іх дзелавых і палітычных якасцях. Праца па павышэнні дзелавой кваліфікацыі і палітычнага ўзроўню работнікаў планавалася і правяралася, аналізаваўся якасны склад кадраў, перш-наперш палітычная пісьменнасць, але таксама адукаванасць, профільнасць адукацыі, кваліфікацыя, вопыт працы і г. д. На пасяджэннях раённых, гарадскіх і абласных камітэтаў усходняй Беларусі рэгулярна заслухоўваліся пытанні “Аб працы з кадрамі…” ў розных галінах народнай гаспадаркі, асабліва часта ў сферы гандлю, дзе было асабліва многа парушэнняў.

Прычым вядучай ў сферы прызначэння кадраў была менавіта роля партыйных камітэтаў вышэйстаячых органаў, а роля партарганізацый саміх прадпрыемстваў паступова і прыкметна зніжалася. Дырэктараў і галоўных спецыялістаў буйных прадпрыемстваў узгоднена зацвярджалі галіновыя органы кіравання прамысловасцю і вышэйстаячыя партыйныя камітэты. Унутры прадпрыемстваў асноўныя рычагі пры прызначэнні кадраў былі ў руках адміністрацый прадпрыемстваў. Ад шэраговых камуністаў на прадпрымстве і нават ад сакратароў партыйных ячэек залежала з кожным дзесяцігоддзем усё меней. Хаця трэба прызнаць, што меркаванні камуністаў на месцах у пэўнай ступені фарміравалі імідж адміністрацый у вачах вышэйстачага кіраўніцтва. Зняць з працы дырэктара маглі таксама толькі вышэйстаячыя органы кантролю.

### 3.2 Кадравая палітыка кіраўніцтва СССР і БССР у 1970–1980-я гг.

У 1970 г. завяршалася восьмая пяцігодка, партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва падводзіла вынікі развіцця краіны і фарміравала планы на 1971–1975 гг. Асаблівая ўвага звярталася на якасны склад кадравага патэнцыялу прамысловасці.

У матэрыялах цэнтральных і рэспубліканскіх органаў улады адзначалася, што ў Савецкай Беларусі апераджальнымі тэмпамі развіваліся галіны прамысловасці, якія вызначалі навукова-тэхнічны прагрэс, калектывы многіх прадпрыемстваў, навукова-даследчых і праектна-канструктарскіх арганізацый актыўна распрацоўвалі і ўкаранялі ў вытворчасць новую тэхніку, прагрэсіўныя тэхналогіі і больш дасканалую арганізацыю працы. Значнай перашкодай пры

ўкараненні новай тэхнікі і тэхналогій з'яўлялася недастатковая тэхнічная падрыхтоўка рабочых і спецыялістаў, узровень павышэння іх кваліфікацыі; непрыняцце належных мер да ўмацавання працоўнай і вытворчай дысцыпліны, удасканалення стылю і метадаў кіравання; павольнае ўкараненне новых форм арганізацыі прадпрыемстваў, асабліва вытворчых аб'яднанняў[1].

Прапановы па паскарэнні тэхнічнага прагрэсу ў прамысловасці, будаўніцтве і на транспарце рэспублікі, выкараненні недахопаў прагучалі пад час двух пленумаў ЦК КПБ. На першым з іх (08.04.1970) пастанавілі абавязаць міністэрствы і ведамствы, прэзідыум Акадэміі навук БССР, абкамы, гаркамы і райкамы партыі, партыйныя арганізацыі значна палепшыць працу з навуковымі, інжынерна-тэхнічнымі і кіраўніцкімі кадрамі, выхоўваць іх у духу творчасці і наватарства, дзелавітасці і адказнасці. Патрабавалася смялей вылучаць у кіраўніцтва навукова-даследчымі інстытутамі і праектна-канструктарскімі арганізацыямі, прадпрыемствамі і будоўлямі маладых і здольных спецыялістаў[2].

На пленуме 17.11.1970 г. звярнулі ўвагу на паляпшэнне каардынацыі дзейнасці па павышэнні адказнасці ўсіх арганізацый, міністэрстваў і ведамстваў за змест і эфектыўнасць масавай прапаганды эканамічных ведаў. Вывучэнне пытанняў эканамічнай палітыкі КПСС павінна было стаць неад'емнай часткай вытворчай вучобы работнікаў, элементам павышэння іх дзелавой кваліфікацыі[3]. У адпаведнасці з пастановаю ЦК КПСС "Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі працоўных", пачынаючы з 1972/1973 н.г. пашырыць эканамічную адукацыю розных катэгорыяў работнікаў без адрыву ад вытворчасці, выкарыстоўваючы школы камуністычнай працы, народныя ўніверсітэты і двухгадовыя эканамічныя школы на прадпрыемствах. Кіраўніцтва эканамічнай адукацыяй было даручана партыйным органам. Планавалася за 5 год ахапіць эканамічнай адукацыяй усіх работнікаў[4].

У рэзалюцыях XXVII з'езда КПБ, які адбыўся 22–24.02.1971 г. патрабавалася пастаянна развіваць творчую актыўнасць і ініцыятыву спецыялістаў народнай гаспадаркі, выхоўваць у іх імкненне да наватарства, праяўляць клопат пра тое, каб кожны спецыяліст быў заняты творчай працай, садзейнічаў навукова-тэхнічнаму прагрэсу, удзельнічаў у рацыяналізацыі і вынаходніцтве. Прадугледжвалася перападрыхтоўка арганізатараў вытворчасці на ўсіх узроўнях. Звярталася ўвага на неабходнасць далейшага пашырэння і ўдасканалення зместу і форм навучання ва ўсіх тыпах навучальных устаноў, павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Планавалася ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах павялічыць прыём па спецыяльнасцях, абумоўленых запытамі навукова-тэхнічнага прагрэсу; удасканаліць сістэму вячэрняга і завочнага навучання[5].

---

[1] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. С. 282.
[2] Там жа. С. 286.
[3] Там жа. С. 315.
[4] Рекомендации по подготовке к 1972/1973 уч. году в системе экономического образования // ДАМаг. Ф. 2827. Воп. 1. Спр. 526. Арк. 130-131.
[5] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. С. 333, 335.

Далейшаму развіццю вытворчасці, уздыму яе эфектыўнасці, паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу, росту прадукцыйнасці працы і павышэнню матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа вялікая ўвага надавалася на XXIV з’ездзе КПСС (30.03–09.04.1971). На ім прагучала, што ў гісторыі СССР наступіў этап развітога сацыялізму.

У рэзалюцыях і пастановах з’езда зафіксаваны асноўныя кірункі кадравай палітыкі на той час. У савецкай краіне неабходна было весці рашучую барацьбу з безгаспадарчасцю, марнатраўствам і празмернасцямі, удасканальваць арганізацыю працы, прымаць меры да павышэння кваліфікацыі і замацавання кадраў, прадукцыйна выкарыстоўваць кожную хвіліну працоўнага часу. Прызнавалася неабходным удасканаленне кіравання народнай гаспадаркай, павышэнне адказнасці кадраў за выкананне планаў і заданняў; прапаноўвалася паўней выкарыстоўваць матэрыяльныя і маральныя стымулы для развіцця вытворчасці, ажыццявіць канцэнтрацыю вытворчасці шляхам стварэння вытворчых, навукова-вытворчых аб’яднанняў і камбінатаў, якія ў перспектыве павінны стаць асноўнымі гасразліковымі звёнамі вытворчасці, удасканальваць структуру і скарачаць залішнія падраздзяленні адміністрацыйна-кіраўнічага апарату. Прапаноўвалася пашыраць фундаментальныя навуковыя даследаванні, паўней выкарыстоўваць дасягненні навукі і тэхнікі[1].

Першараднае значэнне набывала эканамічная адукацыя ўсіх кадраў і поўны пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі, развіццё прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У галіне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі патрабавалася шырэй разгарнуць падрыхтоўку кадраў па новых і перспектыўных напрамках навукі і тэхнікі[2]. Планавалася ў 1971–1975 гг. палепшыць якасць падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі рабочых непасрэдна на вытворчасці[3] і кіраўнікоў праз пашырэнне сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў. Патрабавалася ўзмацніць адказнасць кожнага гаспадарчага кіраўніка за своечасовае выкананне планаў і заданняў, якасць прадукцыі, беражлівае выкарыстанне сродкаў і матэрыяльных рэсурсаў, абсталявання і сыравіны, захаванне тэхналагічнай дысцыпліны[4].

У выкананне рашэнняў цэнтральнага кіраўніцтва КПСС у БССР былі прыняты шэраг пастаноў ЦК КПБ і рашэнняў Вярхоўнага Савету, якія рэалізоўваліся непасрэдна абласнымі, гарадскімі і раённымі партыйнымі і савецкімі органамі ўлады і істотна паўплывалі на працэс фарміравання кадравага патэнцыялу прамысловасці як на рэспубліканскім, так і рэгіянальным узроўні.

Так, палітбюро ЦК КПСС упарадкоўвала сістэму падбору кіраўніцкіх кадраў і кантролю за імі на ўсіх узроўнях уладнай лесвіцы, якая сфарміравалася яшчэ ў сталінскія часы і функцыянавала ўжо амаль чатыры дзесяцігоддзі, прыняўшы пастанову “Аб наменклатуры пасад ЦК КПСС” (29.07.1971). Бюро

[1] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. С. 28–29.
[2] Там жа. С. 32.
[3] Там жа. С. 80-81.
[4] Там жа. С. 100.

ЦК КПБ 14.01.1972 г. прыняла адпаведную пастанову на рэспубліканскім узроўні. Была зацверджана наменклатура пасад на абласным, гарадскім і раённым узроўнях. Існаваў наступны парадак разгляду кадравых пытанняў у абласных камітэтах КПБ: а) кандыдатуры на пасады, якія ўваходзілі ў асноўную і ўліковую наменклатуру ЦК КПБ, прапаноўваліся загадчыкамі адпаведных аддзелаў абкамаў сакратарыяту АК КПБ, пасля адабрэння сакратарыятам пытанне выносілася на абмеркаванне бюро АК, далей у абкам запрашаліся кандыдаты на пасаду для размовы, пасля гэтага аддзелы рыхтавалі паперы для разгляду ў ЦК КПБ; б) кандыдатуры на пасады, якія ўваходзілі ў асноўную і ўліковую наменклатуру АК КПБ (кадры, што не зацвярджаліся ў ЦК КПБ), падбіраліся ГК і РК або абласнымі ведамствамі і арганізацыямі, затым падаваліся прапановы ў АК КПБ, загадчыкі аддзелаў АК вывучалі матэрыялы і дакладалі свае высновы сакратарам АК, пры станоўчым рашэнні ў абкаме, загадчыкі аддзелаў перадавалі ўказанні ГК і РК весці размовы з кандыдатамі і афіцыйна выходзіць з прапановамі ў АК КПБ[1]. Такім чынам, падбор кіраўніцкіх кадраў ажыццяўляўся на аснове так званых “аб’ектывак” і “гутарак” па інстанцыі. У выніку, калі кандыдат аказваўся не на сваім месцы, ніхто персанальна не нёс за гэта адказнасць, бо была калектыўная думка. У кандыдата найперш вызначалася такая якасць, як адданасць, вернасць справе партыі, а, па сутнасці, таму, хто запрашаў на службу. Прафесіяналізм таксама быў патрэбны, але ён адыходзіў на другі план[2].

Адметнасцю кадравай палітыкі ў прамысловасці стала тое, што яе вызначала кіраўніцтва КПСС, рэалізоўвала на практыцы кіраўніцтва міністэрстваў СССР, якое кантралявала колькасны склад кадраў у рэспубліцы; устанаўлівала пэўныя пасады і ліквідавала іх; зацвярджала наменклатуру кадраў. Палітыка цэнтральных уладаў СССР была накіравана на ўмацаванне кадравага патэнцыялу БССР асобамі залежнымі ад іх. Найбольш паслухмяныя тыя, хто не мае ўласных каранёў на гэтай тэрыторыі і зробяць тое, што кажа начальства. Вялікую ролю адыгрывалі анкетныя дадзеныя. Гэта дазваляла пэўным чынам фарміраваць склад кіраўніцтва. Пры прызначэнні на пасаду значэнне мела сацыяльнае паходжанне і членства ў КПСС.

Падбор, расстаноўку і выхаванне кадраў у БССР прааналізавалі на прыкладзе Брэсцкага абкама КПБ на пленуме ЦК КПБ, які адбыўся 01–02.06.1972 г. Асаблівая ўвага надавалася ўмацаванню кадраў гарадскога і раённага звяна. Таксама абмеркавалі інфармацыю сакратарыята ЦК КПБ аб выніках праверкі ўдасканалення кіравання ў міністэрствах і ведамствах рэспублікі.

У выніку, удзельнікі пленума прыйшлі да высновы, што нярэдка пры вылучэнні работнікаў на адказную працу не ўлічваліся іх палітычныя і дзелавыя якасці, прафесійная падрыхтоўка, уменне працаваць з людзьмі. На кіраўніцкія пасады траплялі маральна няўстойлівыя людзі, а часам і скампраметаваўшыя сябе асобы. Не была выкаранена заганная практыка перастаноўкі з месца на месца непрыдатных работнікаў. Усё гэта аб’яўлялася

[1] Записка отдела организационно-партийной работы Гомельского обкома партии // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 140. Спр. 8. Арк. 58-59.
[2] Барвінок К. І., Саракавік І. А. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах ХХ ст. С. 70.

недапушчальным і разглядалася як буйныя памылкі і пралікі ў працы па падборы і расстаноўцы кадраў. Як і раней, сур'ёзнымі недахопамі прызнавалася тое, што на кіраўніцкую працу мала вылучалася маладых, перспектыўных работнікаў, жанчын, а таксама рабочых, якія добра зарэкамендавалі сябе на вытворчасці і ў грамадскім жыцці. Фармалізмам у падрыхтоўцы рэзерву кадраў тлумачылі знаходжанне на пасадах намеснікаў кіраўнікоў бесперспектыўных работнікаў, якія па сваіх якасцях не маглі быць вылучаны на больш адказную кіраўніцкую працу[1]. На пленуме запатрабавалі палепшыць падрыхтоўку і перападрыхтоўку гаспадарчых кадраў. Асаблівая ўвага звярталася на падрыхтоўку ў сістэме завочнай і вячэрняй адукацыі кіраўнікоў-практыкаў. Прапаноўвалася больш накіроўваць моладзі на вучобу ў ВНУ і тэхнікумы ў якасці стыпендыятаў прадпрыемстваў.

Трэцяй сесіяй (22–23.06.1972) ВС Беларускай ССР восьмага склікання быў разгледжаны праект і прыняты Кодэкс законаў аб працы БССР (уведзены ў дзеянне з 01.10.1972), які быў падрыхтаваны ў поўнай апаведнасці з Асновамі заканадаўства СССР і саюзных рэспублік аб працы, прынятымі ў ліпені 1970 г. ВС СССР.

Кодэкс адыграў значную ролю ў развіцці кадравага патэнцыялу Савецкай Беларусі, у ім замацоўвалася правіла, што пры павышэнні кваліфікацыйных разрадаў або пры прызначэнні на пасады рознага ўзроўню павінны ўлічвацца: паспяховае праходжанне рабочымі і служачымі вытворчага навучання, агульнаадукацыйная і прафесійная падрыхтоўка, а таксама атрыманне імі вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Назначэнне работнікаў на кіраўніцкія гаспадарчыя пасады прадпрыемства, установы або арганізацыі, павінна было ажыццяўляцца адміністрацыяй з улікам думкі прафсаюзнага камітэта.

У Кодэксе прадугледжваўся шырокі пералік ільгот для рабочых і служачых, якія сумяшчалі працу з навучаннем[2]. Найбольш важныя льготы былі ў наступных артыкулах:

Артыкул 112 гарантаваў, што пры накіраванні рабочых і служачых для павышэння кваліфікацыі з адрывам ад вытворчасці за імі захоўвалася месца працы (пасада) і праводзіліся выплаты, прадугледжаныя заканадаўствам.

Арт. 187 патрабаваў каб адміністрацыя прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў для прафесійнай падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі рабочых і служачых, асабліва моладзі, арганізоўвала індывідуальнае, брыгаднае, курсавое і іншае вытворчае навучанне за кошт прадпрыемства, арганізацыі, установы.

Арт. 189 прадугледжваў, што пасля заканчэння вытворчага навучання рабочаму прысвойвалася кваліфікацыя згодна з тарыфна-кваліфікацыйным даведнікам і давалася праца ў адпаведнасці з атрыманай кваліфікацыяй і прысвоеным яму разрадам.

Артыкул 190 гарантаваў рабочым і служачым, якія праходзілі вытворчае навучанне або вучыліся ў навучальных установах без адрыву ад вытворчасці,

---

[1] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. С. 383, 388–389.

[2] Трэцяя сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР восьмага склікання 22–23 чэрвеня 1972 года. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1972. С. 135.

што адміністрацыя абавязана стварыць ім неабходныя ўмовы для сумяшчэння работы з навучаннем.

Арт. 191 закранаў пытанні заахвочвання рабочых і служачых, якія сумяшчалі працу з навучаннем.

Арт. 192 разглядаў ільготы для рабочых і служачых, якія вучыліся без адрыву ад вытворчасці ў агульнаадукацыйных і прафесійна-тэхнічных навучальных установах. У прыватнасці, устанаўліваўся скарочаны працоўны тыдзень або скарочаная працягласць штодзённай працы з захаваннем заробку ва ўстаноўленым парадку.

Арт. 193 забяспечваў скарачэнне працоўнага часу для навучэнцаў агульнаадукацыйных школ. Для рабочых і служачых, якія паспяхова вучыліся без адрыву ад вытворчасці ў IX–XI класах школ рабочай моладзі – вячэрніх (зменных) і завочных сярэдніх агульнаадукацыйных школ, у перыяд навучальнага года ўстанаўліваўся працоўны тыдзень, скарочаны на адзін працоўны дзень або на адпаведную яму колькасць працоўных гадзін[1].

На трэцяй сесіі ВС БССР восьмага склікання таксама было разгледжана пытанне "Аб поўным пераходзе да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі ў Беларускай ССР", дзе засяроджвалася ўвага на далейшым няўхільным росце агульнаадукацыйнага ўзроўню і кваліфікацыі працоўных[2].

ЦК КПБ і СМ БССР 06.10.1972 г. прынялі пастанову "Аб далейшым удасканаленні сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі"[3]. Адбывалася паступовае пераўтварэнне ўсіх прафесійна-тэхнічных вучылішч у адзін тып – сярэднія прафесійна-тэхнічныя вучылішчы (СПТВ)[4], працэс рэарганізацыі быў завершаны ў 1984 г. Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых кадраў у прафесійна-тэхнічных навучальных установах БССР зацвярджалася на кожную пяцігодку ў адпаведнасці з пастановамі Савета Міністраў БССР "Аб дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі БССР"[5].

Працэс стварэння ў прамысловасці буйных вытворчых аб'яднанняў распачаўся 02.03.1973 г., калі ЦК КПСС і СМ СССР прынялі пастанову "Аб некаторых мерапрыемствах па далейшым удасканаленні кіравання прамысловасцю"[6]. Ліквідоўвалася шматступеньчатасць у кіраванні галінамі (падгалінамі) прамысловасці, што стварала магчымасці для павышэння эфектыўнасці вытворчасці на аснове яе канцэнтрацыі і спецыялізацыі, укаранення дасягненняў навукі і тэхнікі, рацыянальнага выкарыстання ўсіх рэсурсаў, павышэння аператыўнасці кіравання вытворчасцю. У мэтах

[1] Трэцяя сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР восьмага склікання 22-23 чэрвеня 1972 года. С. 232–233, 248.
[2] Там жа. С. 6–7.
[3] Постановление ЦК КПБ и СМ БССР от 06.10.1972 г. № 314 "О дальнейшем совершенствовании системы профессионально-технического образования" // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 142. Спр. 51. Арк. 133-136.
[4] Мероприятия обкома КПБ и облисполкома по выполнению постановления ЦК КПБ и СМ БССР от 06.10.1972 г. "О дальнейшем совершенствовании системы профессионально-технического образования" // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 127. Спр. 22. Арк. 41.
[5] Приложение № 7 к постановлению СМ БССР «О государственном пятилетнем плане развития народного хозяйства БССР на 1971–1975 гг.» // НАРБ. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3107. Арк. 72-76; Приложение к постановлению СМ БССР "О Государственном плане экономического и социального развития БССР на 1986–1990-е гг." // Там жа. Воп. 10. Спр. 41. Арк. 11-12.
[6] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. С. 332.

набліжэння органаў гаспадарчага кіраўніцтва да вытворчасці, павышэння аператыўнасці і гнуткасці ў працы кіраўнічага апарата ўводзілася двух- і трохзвенная сістэма кіравання[1]. Кіраванне прамысловасцю магло ажыццяўляцца міністэрствам (ведамствам) адначасова па двух-і трохзвеннай сістэмах. У выглядзе выключэння, з дазволу СМ СССР, для некаторых галін прамысловасці магла быць прадугледжана чатырохзвенная сістэма кіравання[2]: У асобных выпадках захоўваліся галоўныя вытворчыя (галіновыя) упраўленні, пераведзеныя на гаспадарчы разлік, у якасці сярэдняга звяна кіравання.

У склад вытворчага аб'яднання (камбіната) уваходзілі фабрыкі, заводы, навукова-даследчыя, канструктарскія, праектна-канструктарскія, тэхналагічныя і іншыя вытворчыя адзінкі. Вытворчае аб'яднанне (камбінат) узначальваў генеральны дырэктар (дырэктар), кіраўніцтва ажыццяўлялася апаратам галаўнога завода (галаўной фабрыкі). Завод, фабрыка, навукова-даследчая арганізацыя, вытворчасць, філіял або іншая вытворчая адзінка, якая ўваходзіла ў склад вытворчага аб'яднання (камбіната), узначальвалася дырэктарам (начальнікам вытворчасці). Дырэктар (начальнік вытворчасці) арганізоўваў усю працу вытворчай адзінкі і нёс адказнасць за яе дзейнасць[3].

Пленум ЦК КПБ, які адбыўся 26.03.1973 г. запатрабаваў глыбока вывучаць перадавы вопыт, шырока выкарыстоўваць курсы перападрыхтоўкі кадраў, навукова-практычныя канферэнцыі і семінары. З мэтай выяўлення асабістых якасцяў работнікаў, ступені падрыхтаванасці іх да выканання даручанай работы, а таксама патэнцыйных магчымасцяў і здольнасцяў, шырока выкарыстоўваць атэстацыю кадраў. Пры ацэнцы дзейнасці кіраўніцкіх і інжынерна-тэхнічных работнікаў асноўным крытэрыем павінна было стаць іх уменне прымяняць на практыцы метады інтэнсіўнага росту эканомікі і дамагацца на гэтай аснове павышэння прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытворчасці[4].

У агульнай сістэме народнай адукацыі СССР сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы займалі важнае месца ў справе падрыхтоўкі спецыялістаў для ўсіх галін эканомікі. 22.08.1974 г. была прынята пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР "Аб мерах па далейшым удасканаленні

---

[1] У 1973–1975 гг. адбываўся пераход у прамысловасці на наступныя сістэмы кіравання: а) двухзвенную: агульнасаюзнае або саюзна-рэспубліканскае міністэрства (ведамства) СССР – вытворчае аб'яднанне (камбінат) прадпрыемства; рэспубліканскае міністэрства (ведамства) саюзнай рэспублікі – вытворчае аб'яднанне (камбінат), прадпрыемства; б) трехзвенную: агульнасаюзнае або саюзна-рэспубліканскае міністэрства (ведамства) СССР – усесаюзнае прамысловае аб'яднанне – вытворчае аб'яднанне (камбінат), прадпрыемства; саюзна-рэспубліканскае міністэрства (ведамства) СССР – саюзна-рэспубліканскае міністэрства (ведамства) саюзнай рэспублікі – вытворчае аб'яднанне (камбінат), прадпрыемства; рэспубліканскае міністэрства (ведамства) саюзнай рэспублікі – рэспубліканскае прамысловае аб'яднанне – вытворчае аб'яднанне (камбінат), прадпрыемства; рэспубліканскае міністэрства (ведамства) саюзнай рэспублікі – міністэрства аўтаномнай рэспублікі, упраўленні выканкама абласнога (краявога) савета дэпутатаў працоўных – вытворчае аб'яднанне (камбінат), прадпрыемства.

[2] Чатырохзвенная сістэма кіравання: саюзна-рэспубліканскае міністэрства (ведамства) СССР – саюзна-рэспубліканскае міністэрства (ведамства) саюзнай рэспублікі – рэспубліканскае прамысловае аб'яднанне (міністэрства аўтаномнай рэспублікі, упраўленні выканкама абласнога (краявога) савета дэпутатаў) – вытворчае аб'яднанне (камбінат), прадпрыемства.

[3] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. С. 335–336.

[4] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. С. 447.

кіравання сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі установамі і аб паляпшэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй”, у якой асаблівая ўвага звярталася на павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, больш шырокае і эфектыўнае выкарыстанне кадраў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй[1]. Вырашылі далейшую спецыялізацыю сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў праводзіць па галіноваму прынцыпу з улікам неабходнай кааперацыі пры падрыхтоўцы спецыялістаў.

Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР арганізавала Савет па сярэдняй спецыяльнай адукацыі[2]. У БССР міністэрства па ўзгадненні з СМ БССР стварыла ў Мінску Савет дырэктараў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, які займаўся распрацоўкай прапаноў па далейшым развіцці сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў рэспубліцы, рацыянальным размяшчэнні падрыхтоўкі спецыялістаў розных спецыяльнасцяў у тэхнікумах і вучылішчах, абагульненню і распаўсюджванню перадавога вопыту арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах і па арганізацыі павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў навучальных устаноў. СМ БССР па ўзгадненні з Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, Дзяржаўным камітэтам СМ СССР па пытаннях працы і заробку, Дзяржаўным камітэтам СМ СССР па прафесійна-тэхнічнай адукацыі і УсеЦСПС вызначыў функцыі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у адпаведных галінах і зацвердзіў пералікі прафесій і пасад, па якіх патрабавалася сярэдняя спецыяльная адукацыя. Уводзілася сістэматычная, не радзей аднаго раза ў 5 гадоў, атэстацыя выкладчыкаў і кіраўніцкіх работнікаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў[3].

XXV з’езд КПСС, які праходзіў 24.02–05.03.1976 г.разгледзеў і зацвердзіў асноўныя напрамкі развіцця гаспадаркі СССР на 1976–1980 гг. Наконт падрыхтоўкі кадраў адзначалася, што была праведзена значная праца па павышэнні іх кваліфікацыі. У рэзалюцыях і пастановах з’езда адны і тыя ж агульныя фразы, як і ў пастановах тагачасных пленумаў, канферэнцый: ажыццявіць меры па далейшым скарачэнні цякучасці кадраў, павысіць працоўную і вытворчую дысцыпліну, забяспечыць больш поўнае і рацыянальнае выкарыстанне працоўнага часу, ліквідацыю прастояў і непрадукцыйных выдаткаў працы, палепшыць працу па падрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі і перакваліфікацыі кадраў у адпаведнасці з патрабаваннямі навукова-тэхнічнага прагрэсу, палепшыць якасць усіх відаў выпускаемай прадукцыі, удасканальваць арганізацыйную структуру кіравання, завяршыць стварэнне аб’яднанняў, працягнуць працу па канцэнтрацыі і

[1] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. С. 455.

[2] У яго склад уваходзілі: кіруючыя работнікі шэрагу міністэрстваў і ведамстваў СССР, Дзяржплана СССР, УсеЦСПС, ЦК УсеЛКСМ, міністэрстваў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (міністэрстваў народнай адукацыі) саюзных рэспублік. Савет дзейнічаў пры Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і распрацоўваў навукова абгрунтаваныя рэкамендацыі па пытаннях развіцця сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў СССР, паляпшэння вучэбна-выхаваўчай работы і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у сярэдніх спецыяльных навучальных установах, арганізацыі працы педагагічных работнікаў і павышэння іх кваліфікацыі.

[3] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. С. 458, 459.

спецыялізацыі вытворчасці, паляпшэнні структуры і скарачэнні колькасці звёнаў кіравання, удасканаліць падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі гаспадарчых кадраў[1] і г. д.

Ва ўмовах захавання стабільнасці і барацьбы з цякучасцю кадраў усё больш сталі праяўляцця такія тэндэнцыі, як фармальна-бюракратычны стыль у працы, памяркоўныя адносіны да работнікаў, якія скампраментавалі сябе, хаванне фактаў прыпісак і падману дзяржавы і інш. Гэта знайшло адлюстраванне ў пастанове бюро ЦК КПБ "Аб працы Магілёўскага абкама КПБ з кадрамі ў святле XXV з'езда КПСС" (1979)[2].

На павышэнне зацікаўленасці вытворчых калектываў прамысловых прадпрыемстваў у паскарэнні росту прадукцыйнасці працы і скарачэнні цякучасці кадраў былі скіраваны пастановы ЦК КПСС "Аб далейшым удасканаленні гаспадарчага механізму і задачах партыйных і дзяржаўных органаў" і сумесная ЦК КПСС і СМ СССР "Аб паляпшэнні планавання і ўзмацнення ўздзеяння гаспадарчага механізму на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці працы" (1979). У адпаведнасці з імі павышалася роля перспектыўнага планавання, адказнасць мясцовых планавых органаў за развіццё гаспадаркі на падведамасных тэрыторыях, удакладнялася сістэма планавых паказчыкаў. Уводзіўся асноўны паказчык эфектыўнасці вытворчасці – канечная прадукцыя. Яе памеры вызначалі ўклад канкрэтнага прадпрыемства ў вытворчасць тавару, які ствараўся намаганнямі шэрагу калектываў[3]. Прапаноўвалася даць вытворчым аб'яднанням (прадпрыемствам) права выплочваць за кошт эканоміі па фонду заробку надбаўкі да тарыфных ставак і акладаў: рабочым за сумяшчэнне прафесій і выкананне ўстаноўленага аб'ёму работ з меншай колькасцю работнікаў – у памеры да 50 % стаўкі (акладу); кваліфікаваным рабочым, занятым на асабліва адказных працах, за высокае прафесійнае майстэрства – паэтапна (з улікам бесперапыннага стажу працы на прадпрыемстве) у памеры 4, 8 і 12 % тарыфнай стаўкі прысвоенага разраду; інжынерна-тэхнічным работнікам, і перш за ўсё майстрам, а таксама служачым за высокую кваліфікацыю – у памеры да 30 %, а канструктарам і тэхнолагам – у памеры да 50 % акладу, у межах да аднаго працэнта фонду заробку вытворчага аб'яднання (прадпрыемства). Названыя надбаўкі адмяняліся пры пагаршэнні паказчыкаў працы[4].

XXVI з'езд КПСС праходзіў 23.02–03.03.1981 г., дзе былі падведзены вынікі дзейнасці за пяць папярэдніх гадоў і прыняты асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981–1985 гг. і на перыяд да 1990 г.[5] У выступленнях і рэзалюцыях з'езда, сярод іншага, прагучалі

---

[1] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 13. С. 16, 20, 25.

[2] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 11.04.1979 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 162. Спр. 12. Арк. 9.

[3] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 387.

[4] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 13. С. 391.

[5] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 14. С. 41.

патрабаванні больш актыўна ўкараняць прагрэсіўныя метады і перадавы вопыт у кіраванні, усяляк развіваць ў працаўнікоў ініцыятыву і сацыялістычную прадпрымальнасць, уменне бачыць перспектыву і мабілізоўваць калектывы працоўных на рашэнне актуальных задач; ажыццявіць меры па замацаванні кадраў і зніжэнні цякучасці рабочай сілы і інш.[1]

Актывізацыі працы камісій першасных партыйных арганізацый па ажыццяўленні кантролю за дзейнасцю адміністрацый прамысловых прадпрыемстваў па выкананні дырэктыў партыі і ўрада, забеспячэнні выканання савецкіх законаў садзейнічала пастанова ЦК КПСС “Аб камісіях партыйных арганізацый па ажыццяўленні кантролю дзейнасці адміністрацыі і за працай апарату”, якая была прынята 16.02.1982 г. Камісіі, падкрэслівалася ў пастанове, павінны забяспечыць яшчэ большае выхаванне ў кіраўніцкіх кадраў і працаўнікоў высокай адказнасці за справы ў сваіх калектывах, захаванне дзяржаўных інтарэсаў. Згодна палажэнню, камісіі дапамагалі аператыўна выяўляць недахопы, развіваць ініцыятыву і прынцыповасць, крытыку і самакрытыку, правільна выхоўваць кадры, унікаць у пытанні расстаноўкі і выхавання кадраў, паляпшэння ўмоў працы і быту людзей, сачыць за строгім захаваннем дзяржаўнай, планавай і тэхналагічнай дысцыпліны, павышаць адказнасць работнікаў за даручаную справу, рашуча выступаць супраць расхлябанасці, безгаспадарчасці, марнатраўства, ірвацтва, нажывы за дзяржаўны кошт, весці бескампрамісную барацьбу з фактамі недобрасумленных адносін да выканання службовых абавязкаў, бюракратызму і валакіты, ашуканства, месніцтва і вузкаведамаснага падыходу[2].

Камісіі працавалі пад кіраўніцтвам партыйных камітэтаў (партыйных бюро) і сакратароў пярвічных партарганізацый, што, як паказала практыка наступных гадоў, звяла на нішто ўсе спадзяванні на яе плённую дзейнасць. Камісіі не маглі ўмешвацца ў аператыўную дзейнасць адміністрацыі, адмяняць ці аддаваць якія-небудзь адміністрацыйныя распараджэнні. Сваёй дзейнасцю яны толькі садзейнічалі найлепшаму выкананню загадаў і распараджэнняў кіраўнікоў, умацаванню працоўнай і вытворчай дысцыпліны.

З прыходам да ўлады ў лістападзе 1982 г. Ю. Андропава актывізавалася праца па ўмацаванні дысцыпліны і пэўных змен у кадравай палітыцы, што знайшло сваё адлюстраванне ў Законе СССР ад 17.06.1983 г. “Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі”[3].

Новае кіраўніцтва краіны паспрабавала змяніць эканамічную сітуацыю. Удасканаленню цэнтралізаванага кіраўніцтва эканомікай у спалучэнні з павышэннем ролі працоўных калектываў у кіраванні вытворчасцю, шырокаму ўкараненню гаспадарчага разліку павінна была пасадзейнічаць сумесная пастанова ЦК КПСС і СМ СССР “Аб дадатковых мерах па пашырэнні правоў

[1] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 14. С. 108.

[2] Там жа. С. 241–244.

[3] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. С. 332–343; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 С. 231.

вытворчых аб'яднанняў (прадпрыемстваў) прамысловасці ў планаванні і гаспадарчай дзейнасці і па ўзмацненні іх адказнасці за вынікі працы" (14.07.1983). Яна вызначыла шэраг міністэрстваў, дзе планавалася правесці эканамічны эксперымент па пашырэнні правоў прадпрыемстваў. Прадугледжвалася выплачваць прэміі кіраўніцкім работнікам вытворчых аб'яднанняў (прадпрыемстваў), кіраўнікам навукова-даследчых, канструктарскіх, праектных, праектна-канструктарскіх і тэхналагічных арганізацый, навуковым работнікам, канструктарам, тэхнолагам, праекціроўшчыкам, інжынерам і іншым спецыялістам за распрацоўку і выпуск прадукцыі, якая па якасных паказчыках адпавядала найлепшым сусветным і айчынным узорам або перавышала іх і адказвала перспектыўным патрабаванням спажыўцоў. Таксама спрабавалі ўкараняць прагрэсіўныя сістэмы матэрыяльнага стымулявання канструктараў і тэхнолагаў за павышэнне тэхнічнага ўзроўню і якасці распрацовак, выкананне большага аб'ёму работ з меншай колькасцю працаўнікоў[1].

ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС у сумеснай пастанове ад 28.07.1983 г. "Аб узмацненні работы па ўмацаванні сацыялістычнай дысцыпліны працы"[2]. запатрабавалі ад Міністэрстваў і ведамстваў СССР, Саветаў міністраў саюзных і аўтаномных рэспублік, выканкамаў мясцовых саветаў павысіць адказнасць кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў і іх падраздзяленняў за стан працоўнай дысцыпліны і цякучасць кадраў. За непрыняцце мер па ўмацаванні парадку і дысцыпліны, скарачэнні цякучасці кадраў, арганізацыі дакладнага ўліку страт працоўнага часу, пазбаўляць адпаведных кіраўнікоў прэмій за асноўныя вынікі працы, прыцягваць да дысцыплінарнай ці іншай устаноўленай заканадаўствам адказнасці. Няздольнасць кіраўніка забяспечыць належную дысцыпліну працы на даручаным участку працы расцэньвалася як яго неадпаведнасць займаемай пасадзе.

Аднак зробленая чыста адміністрацыйнымі метадамі пры дапамозе службаў правапарадку і бяспекі чарговая спроба "ўдасканалення сацыялізму" дазволіла толькі часова стрымаць развіццё негатыўных тэндэнцый, некалькі замарудзіла, але не спыніла набліжэнне крызісу.

На пленуме ЦК КПСС 10.04.1984 г. адбылося абмеркаванне асноўных напрамкаў рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы[3]. Планавалася, што ажыццяўленне рэформы дазволіць карэнным чынам палепшыць працоўнае выхаванне і прафесійную арыентацыю школьнікаў на аснове злучэння навучання з прадукцыйнай працай, падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых кадраў у прафесійна-тэхнічных вучылішчах, дапоўніць сярэднюю адукацыю моладзі усеагульнай прафесійнай адукацыяй. Праз два дні была прынята пастанова ЦК КПСС і СМ СССР "Аб далейшым развіцці сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі і павышэнні яе ролі ў падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых кадраў". У адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі рэформы

---

[1] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 14. С. 442, 446.
[2] Там жа. С. 452–455.
[3] Там жа. С. 507–509.

агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы, прафесійна-тэхнічная адукацыя станавілася асноўнай формай планамернай падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў. Прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы пераўтвараліся ў адзіны тып – сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча з адпаведнымі аддзяленнямі па прафесіях[1].

У 1985 г. адбыўся XII Пленум ЦК КПБ, на якім было прынята рашэнне "Аб задачах партыйных арганізацый рэспублікі па далейшым удасканаленні работы з кадрамі ў святле патрабаванняў ЦК КПСС". Бюро ЦК КПБ зацвердзіла план мерапрыемстваў па выкананні першачарговых арганізацыйна-палітычных мерапрыемстваў, якія былі ў запісцы Генеральнага сакратара ЦК КПСС К. Чарненкі "Аб некаторых пытаннях сучаснай кадравай палітыкі"[2].

Красавіцкі (1985) пленум ЦК КПСС, XXVII з'езд КПСС (1986) вызначылі новы палітычны курс, які атрымаў назву "перабудова" і быў скіраваны на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця, галоснасць і дэмакратызацыю грамадства. Затым гэты курс канкрэтызаваўся ў рашэннях XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі (1988), дзе дэлегаты адобрылі прапанову М. Гарбачова ажыццявіць рэформу палітычнай сістэмы, XXVIII з'езда КПСС (1990) і шэрагу пленумаў ЦК[3]. Але гэтыя рашэнні недастаткова ўлічвалі супярэчнасці савецкага грамадства, з большага насілі дэкларатыўны характар і абапіраліся на дагматызаваныя падыходы ў вызначэнні перспектыў развіцця краіны, шляхоў іх дасягнення. На гэты час прыпадае правядзенне XXX з'езда КПБ (30–31.01.1986).

Пастанова ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС ад 17.09.1986 г. "Аб удасканаленні арганізацыі заробкаў і ўвядзенні новых тарыфных ставак і службовых акладаў работнікаў вытворчых галін народнай гаспадаркі" была скіравана на якасную перабудову механізму аплаты працы, які накіравалі на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і ўзмацненне стымулявання працоўных за канчатковыя вынікі працы. На працягу 1987 г. у БССР адбылося ўвядзенне новых умоў аплаты працы на 3,1 тыс. прадпрыемстваў і арганізацый з колькасцю больш за 1,4 млн. чал. (50,7 %). На прадпрыемствах і ў арганізацыях міністэрстваў і ведамстваў БССР на павышаныя тарыфныя стаўкі і аклады перавялі 59,5 % працаўнікоў, саюзнага падпарадкавання – 30,1 %. Найбольшых вынікаў пры ўвядзенні новых умоў аплаты працы дабіваліся калектывы, якія працавалі ва ўмовах поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання. Сярэдні заробак працаўнікоў, для якіх устанавілі новыя тарыфныя стаўкі і аклады павялічыўся ад 2 да 13 % і больш. Пры гэтым заробак спецыялістаў і служачых павышаўся ў большай ступені, чым у рабочых (10–35 %), памяншаючы дыспрапорцыю, якая склалася за папярэднія дзесяцігоддзі. Але шмат дзе сталі на шлях "пошуку" іншых сродкаў на павышэнне фонду даплат, – за кошт

---

[1] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 14. С. 554.

[2] План мероприятий от 08.02.1985 г. по реализации пунктов 8 и 10 первоочередных организационно-политических мероприятий по реализации поручения и предложений, содержащихся в записке Генерального секретаря ЦК КПСС К. Черненко "О некоторых вопросах современной кадровой политики" // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 1-2.

[3] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 420; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 С. 337-338.

памяншэння памераў прэмій і разрадаў, надбавак за прафесійнае майстэрства і высокую кваліфікацыю, сумяшчэнне прафесій[1].

На прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія перайшлі на новыя ўмовы аплаты працы, адзначалася істотнае скарачэнне колькасці працоўных (ад 2 да 11 %). На прадпрыемствах і ў арганізацыях Мінаўтатранса БССР за 9 месяцаў 1986 г. было вызвалена 7,6 % работнікаў, Мінсувязі БССР – 7,9 %, Мінвадгаса БССР – 11,4 %, Мінлясгаса БССР – 10 %, Галоўрэчфлота БССР – 8,3 %, Дзяржаграпрама БССР – 7,7 %, Мінтоппрама БССР – 6,4 %, Мінжылкамгаса БССР – 6,1 %; у ВА "Палімір" – 6,8 %, Гомельскім кансервавым заводзе – 8,3 %, Магілёўскім КШТ – 9,4 %, трэсце "Мінскводбуд" – 7,3 %[2]. Спачатку гэта мела станоўчы вынік – ліквідоўваўся дэфіцыт кадраў, але пазней прывяло да беспрацоўя.

На пашырэнне выкарыстання патэнцыялу грамадства ў новых умовах гаспадарання былі скіраваны некалькі заканадаўчых актаў. Вярхоўны Савет СССР 19.11.1986 г. прыняў Закон "Аб індывідуальнай працоўнай дзейнасці грамадзян СССР", які даваў магчымасць для прыватнай дзейнасці больш як у 30 відах вытворчасці тавараў і паслуг. Прыватная ініцыятыва грамадзян раней адносілася да незаконных або непажаданых відаў дзейнасці і часта падлягала адміністрацыйнаму або крымінальнаму пакаранню. Па новым законе "індывідуальная працоўная дзейнасць у СССР выкарыстоўвалася для больш поўнага задавальнення грамадскіх патрэб у таварах і паслугах, павышэння занятасці грамадзян грамадска карыснай дзейнасцю, прадастаўлення ім магчымасці атрымання дадатковых даходаў у адпаведнасці з затратамі сваёй працы". З гэтага часу індывідуальная працоўная дзейнасць савецкім грамадзянам была афіцыйна дазволена, але толькі ў вольны ад асноўнай працы час і ў строга вызначаных сферах. Пры гэтым катэгарычна забаранялася выкарыстанне наёмнай працы. Падатак на даходы прыватных прадпрымальнікаў дасягаў 65%. Законам прадугледжвалася аказанне падтрымкі грамадзянам, якія займаліся індывідуальнай працоўнай дзейнасцю. Выканаўчым камітэтам мясцовых саветаў прадпісвалася аказваць ім садзейнічанне ў набыцці сыравіны, матэрыялаў, інструментаў і іншай маёмасці, неабходнай для працы. Закон "Аб індывідуальнай працоўнай дзейнасці" стаў пачаткам у гісторыі фарміравання і развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў краіне. Фактычна ўпершыню за шэсцьдзесят гадоў у СССР была легалізаваная прадпрымальніцкая дзейнасць.

Закон СССР "Аб індывідуальнай працоўнай дзейнасці" пачынаў дзейнічаць з 01.05.1987 г., але ў БССР не былі своечасова прыведзены ў адпаведнасць з ім усе прававыя і нарматыўныя дакументы[3]. Гэта адмоўна

---

[1] Письмо в СМ БССР о ходе реализации в республике Постановления ЦК КПСС, СМ СССР и ВЦСПС от 17.09.1986 г. № 1115 «О совершенствовании организации заработной платы и введении новых тарифных ставок и должностных окладов работников производственных отраслей народного хозяйства» // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3784. Арк. 94-98 адв.
[2] Там жа. Арк. 94 адв.-95.
[3] Докладная записка СМ БССР от 27.02.1987 г. // Там жа. Спр. 3737. Арк. 183-184.

паўплывала на яго рэалізацыю. На 01.05.1987 г. у БССР індывідуальнай працоўнай дзейнасцю займаліся 9,2 тыс. чал., на 01.01.1988 г. – 14,9 тыс. чал.[1]

Савет Міністраў СССР 05.02.1987 г. прыняў пастанову "Аб стварэнні кааператываў па вытворчасці тавараў народнага спажывання". Вярхоўны Савет СССР 26.05.1988 г. прыняў Закон "Аб кааперацыі ў СССР", які дазволіў кааператывам займацца любымі не забароненымі законам відамі дзейнасці, у тым ліку і гандлем. Новы заканадаўчы акт разглядаў кааператывы нараўне з дзяржаўнымі прадпрыемствамі (аб'яднаннямі) як частку адзінага народнагаспадарчага комплексу і садзейнічаў разняволенню чалавечай актыўнасці, павышэнню творчасці і майстэрства людзей. Важным паказчыкам дзейнасці з'яўлялася нарошчванне аб'ёмаў прадукцыі і паслуг[2]. Аднак спадзяванні на тое, што кааператывы хутка ліквідуюць таварны дэфіцыт, прывядуць да паляпшэння якасці абслугоўвання, аказаліся не апраўданымі.

У БССР на 01.08.1988 г. было 1 211 зарэгістраваных кааператываў, функцыянавалі 791 (65,3 %), дзе працавалі 8,4 тыс. чал. З агульнай колькасці зарэгістраваных кааператываў у Мінску дзейнічалі – 209 (63,1 % ад зарэгістраваных), Магілёўскай вобласці – 110 (52,4 %), Гомельскай – 98 (63,2 %), Мінскай – 96 (64,4 %), Брэсцкай – 95 (68,8 %), Віцебскай – 92 (80,7 %), Гродзенскай – 91 (78,5 %). Цікавая акалічнасць: за 1987 г. па БССР у даход дзяржавы з грамадзян, якія займаліся індывідуальнай працоўнай дзейнасцю, паступіла больш за 1 млн руб., ад дзейнасці кааператываў – 114 тыс. руб.[3] Пры гэтым у кааператывах працавалі 8,4 тыс. чалавек, а індывідуальнай працоўнай дзейнасцю займаліся 14,9 тыс. чал. Такім чынам, амаль удвая большая колькасць асоб прынесла карысці рэспубліцы больш за 9 разоў.

Даволі вялікая колькасць высокакваліфікаваных спецыялістаў занялася індывідуальнай працоўнай дзейнасцю або перайшла працаваць (цалкам і часткова па сумяшчальніцтву) у кааператывы. Што, безумоўна, сказалася на складзе кадравага патэнцыялу прамысловых прадпрыемстваў БССР. Не адзінкавымі былі выпадкі, калі кіраўнікі асобных прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў па сумяшчальніцтву працавалі ў кааператывах і малых прадпрыемствах[4], што дазваляла выкарыстоўваць службовае становішча для неправамерных дзеянняў і незаконнага ўзбагачэння.

Важным рэзервам паскарэння развіцця народнай гаспадаркі лічылася мабілізацыя радыяналізатараў і вынаходнікаў на павышэнне механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці. На павышэнне эфектыўнасці рацыяналізацыі і вынаходніцтва накіроўвалася пастанова ЦК КПСС, СМ СССР, УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ "Аб мерах па далейшым развіцці самадзейнай тэхнічнай творчасці" (05.02.1987)[5].

---

[1] Письмо Министерства финансов БССР в СМ БССР от 19.01.1988 г. «О развитии в республике кооперативной и индивидуальной трудовой деятельности граждан» // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3784. Арк. 54.

[2] Закон СССР «О кооперации в СССР» // Там жа. Спр. 3737. Арк. 753-775.

[3] Письмо Министерства финансов БССР в СМ БССР от 19.01.1988 г. О развитии в республике кооперативной и индивидуальной трудовой деятельности граждан // Там жа. Спр. 3784. Арк. 54адв.

[4] Решение исполкома Могилевского областного совета от 26.08.1991 г. № 9-3 «О мерах по защите потребительского рынка области и пресечению незаконного обогащения» // Там жа. Спр. 4035. Арк. 17.

[5] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 546.

Перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі працаўнікоў для далейшага выкарыстання іх на працоўных месцах з прагрэсіўнай тэхнікай і ў новаарганізуемых вытворчасцях, а таксама меры маральнага і матэрыяльнага стымулявання працоўных і служачых за працу ў шматзменным рэжыме (падвышаны заробак, рост даплат, павелічэнне водпуску і г. д.) прадугледжвала пастанова ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС ад 12.02.1987 г. “Аб пераходзе аб’яднанняў, прадпрыемстваў і арганізацый прамысловасці і іншых галін народнай гаспадаркі на шматзменны рэжым працы з мэтай павышэння эфектыўнасці вытворчасці”[1].

ЦК КПСС і СМ СССР 13.03.1987 г. прынялі пастанову “Аб мерах па карэнным паляпшэнні якасці падрыхтоўкі і выкарыстоўвання спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у народнай гаспадарцы”[2]. У яе выкананне Дзяржаўны камітэт СССР па навуцы і тэхніцы сумесна з шэрагам міністэрстваў і ведамстваў распрацаваў прапановы па ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшага звяна кіравання народнай гаспадаркі[3]. СМ БССР 29.01.1991 г. прыняў пастанову “Аб першачарговых мерах па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў органаў дзяржаўнага кіравання, кіраўнікоў і спецыялістаў народнай гаспадаркі для работы ва ўмовах рыначнай эканомікі”[4].

Змест эканамічных пераўтварэнняў абмеркаваў червеньскі (1987) Пленум ЦК КПСС. Ставілася задача пераходу прадпрыемстваў на поўны гаспадарчы разлік, ад надзвычай цэнтралізаванай каманднай сістэмы да дэмакратычнай, дэклараваліся “партнёрскія”, а не камандныя адносіны паміж міністэрствамі і прадпрыемствамі. Адным з асноўных шляхоў дэмакратызацыі грамадства павінна было стаць развіццё дэмакратыі на вытворчасці, увядзенне выбарнасці кіраўніцкіх работнікаў у працоўных калектывах. Імкнуліся да таго, каб выбранне кіраўнікоў усіх катэгорый адбывалася на конкурснай аснове, што забяспечвала паляпшэнне якаснага складу кіраўніцкіх кадраў і ўзмацненне іх адказнасці за вынікі дзейнасці. Усяго па стану на 24.04.1987 г. у БССР такім шляхам былі выбраны 142 кіраўнікі эканамічных службаў, 1412 майстроў і брыгадзіраў[5]. Аднак разгорнутая кампанія паказала, што на кіраўніцкія пасады не заўсёды траплялі найлепшыя спецыялісты, арганізатары вытворчасці. Не існавала канкрэтнай сістэмы адказнасці, пры яе распрацоўцы абмяжоўваліся агульнымі і незмястоўнымі фразамі. Напрыклад, Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў, прааналізаваўшы працу выканкама за 1990 – першае паўгоддзе 1991 гг., вырашыў: распрацаваць сістэму працы з кіраўніцкімі кадрамі народнай гаспадаркі

[1] Постановление ЦК КПСС, СМ СССР и ВЦСПС № 194 от 12.02.1987 г. «О переходе объединений, предприятий и организаций промышленности и других отраслей народного хозяйства на многосменный режим работы с целью повышения эффективности производства» // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 172-176.
[2] Перечень решений Правительства СССР // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2449. Арк. 11.
[3] Письмо заместителя Председателя Государственного комитета СССР по науке и технике № 7-25/297 от 01.07.1987 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1039. Арк. 20.
[4] Информация Могилевского облисполкома в СМ БССР от 01.04.1991 г. “О выполнении постановления СМ БССР от 29.01.1991 г. № 33 “О первоочередных мерах по подготовке, переподготовке и повышению квалификации кадров органов государственного управления, руководителей и специалистов народного хозяйства для работы в условиях рыночной экономики” // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 4065. Арк. 688, 689.
[5] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 549–550.

вобласці, прадугледзеўшы механізм павышэння іх адказнасці за даручаны ўчастак працы[1] і толькі, больш нічога канкрэтнага.

Права выбарнасці калектывамі кіраўнікоў розных узроўняў адлюстравана ў Законе "Аб дзяржаўным прадпрыемстве (аб'яднанні)", які дзейнічаў з 01.01.1988 г. Ён дазваляў прадпрыемству самому вызначаць план вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі. За кошт даходу ўтвараліся фонды заробкаў і матэрыяльнага заахвочвання, якія размяркоўваліся з улікам думкі працоўнага калектыву.

СМ СССР пастановай ад 29.12.1989 г. "Аб інавацыйным фондзе пры Дзяржаўным камітэце СССР па навуцы і тэхніцы" ў мэтах больш эфектыўнага выкарыстання існуючага навукова-вытворчага патэнцыялу прыняў прапанову Дзяржаўнага камітэта СССР па навуцы і тэхніцы аб стварэнні Інавацыйнага фонду[2]. Ён з'яўляўся дзяржаўнай арганізацыяй, створанай для садзейнічання паскоранай распрацоўцы і асваенню наваўвядзенняў у галіне навукі і тэхнікі; ажыццяўляў фінансаванне навукова-тэхнічных распрацовак і праектаў; аказваў інжынерна-тэхнічныя, кансультатыўныя, патэнтныя, пасрэдніцкія паслугі прадпрыемствам і арганізацыям, вышэйшым навучальным установам, творчым калектывам, даследчым групам, асобным вучоным, вынаходнікам і рацыяналізатарам[3].

Значны ўплыў на працу прадпрыемстваў, памер заробку, эфектыўнасць працы і адпаведна на эканоміку ў цэлым, асабліва на замацаванне і стымуляванне працы, аказалі пастановы Кабінета Міністраў СССР ад 19.03.1991 г. "Аб рэформе рознічных цэн і сацыяльнай абароне насельніцтва" і Савета Міністраў БССР ад 22.03.1991 г. "Аб рэформе рознічных цэн і сацыяльнай абароне насельніцтва БССР". Згодна якіх з 02.04.1991 г. уводзіліся новыя адзіныя для гарадоў і сельскай мясцовасці дзяржаўныя рознічныя цэны на харчовыя і нехарчовыя тавары. У адпаведнасці з гэтымі пастановамі быў перагледжаны памер і абмежаваны лімітавы ўзровень. Шэраг тавараў рэалізоўваліся па рэгуляваных цэнах. Замацоўвалася непазбежнасць эканамічных санкцый да прадпрыемстваў за неабгрунтаванае павышэнне цэн[4].

На рэформу неадназначна адрэагавала грамадства. У пастанове прэзідыума ВС БССР ад 10.04.1991 г. "Аб звароце працоўных калектываў у сувязі з рэформай рознічных цэнаў і забеспячэннем сацыяльнай абароны насельніцтва" гаварылася: "У адказ на звароты працоўных калектываў прымаліся дадатковыя меры па абароне насельніцтва БССР у сувязі з павышэннем рознічных цэнаў"[5]. Зноў замест увядзення эканамічных мер кіраўніцтва рэспублікі рабіла стаўку на адміністратыўныя метады, прычым

---

[1] Решение № 6-14 от 03.10.1991 г. Могилевского областного совета «О работе исполнительного комитета областного совета народных депутатов за 1990 год и первое полугодие 1991 гг.» // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 4023. Арк. 160.

[2] Письмо Управления делами СМ БССР «Об инновационном фонде при Государственном комитете СССР по науке и технике» от 15.01.1990 г. // Там жа. Спр. 3970. Арк. 47.

[3] Основные начала деятельности Инновационного фонда при Государственном комитете СССР по науке и технике, одобренные постановлением СМ СССР от 29.12.1989 г. № 1174 // Там жа. Арк. 49-50.

[4] Информационное письмо // Там жа. Спр. 4124. Арк. 41.

[5] Постановление президиума ВС БССР от 10.04.1991 г. "Об обращении трудовых коллективов в связи с реформой розничных цен и обеспечением социальной защиты населения" // Там жа. Спр. 4065. Арк. 20.

прынятыя нарматыўныя акты ігнараваліся камандна-размеркавальнай сістэмай. У выніку ўскладнялася сітуацыя ў гаспадарчым комплексе. Дзеянні ўладаў выклікалі абурэнне насельніцтва. Гэта праявілася ў дэманстрацыях, мітынгах, забастоўках у Мінску, Віцебску, Оршы, Салігорску, Магілёве і іншых гарадах рэспублікі. У красавіку 1991 г. адбыліся 43 мітынгі і іншыя масавыя мерапрыемствы. Узрастала колькасць удзельнікаў з ліку працаўнікоў буйных прамысловых прадпрыемстваў[1]. У 1990 і першай палове 1991 г. у Беларускай ССР адбыліся 247 акцый пратэсту[2].

XXXI з’езд КПБ (28–30.11.1990 г.) прайшоў ва ўмовах дэмакратызацыі і развалу СССР, калі кампартыя згубіла свой аўтарытэт. Прынятыя рэзалюцыі з’езда ўжо нічога не вырашалі – пачаўся новы перыяд у гісторыі Беларусі. Надышла эпоха суверэнітэтаў і спынення існавання СССР.

Такім чынам, на працягу многіх дзесяцігоддзяў дзяржаўная палітыка савецкай улады, побач са станоўчымі (гаспадарчае развіццё, фарміраванне нацыянальных кадраў, дружба народаў, верацярпімасць і іншае), была прасякнута палітычным і эканамічным дагматызмам, татальным кантролем за дзейнасцю гаспадарчых прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый. Усё непадпарадкаванае камуністычнай партыі забаранялася і знішчалася.

Аналіз матэрыялаў з’ездаў, пленумаў КПСС і КПБ, агульнасаюзных і рэспубліканскіх органаў улады ў перыяд 1945–1991 гг. дазваляе сцвярджаць, што на гэтых форумах фармуляваліся агульныя кірункі сацыяльна-эканамічнай палітыкі, абавязковым элементам якой з’ўляліся падрыхтоўка і перападрыхтоўка спецыялістаў для прамысловасці, падбор і прызначэнне на кіраўніцкія пасады. Канкрэтная праца па ўвасабленні кадравай палітыкі ў жыццё і яе спецыфіка аддаваліся на водкуп наменклатуры. Прычым рэальную ўладу ў краіне мела партыйна-савецкая наменклатура агульнасаюзнага ўзроўню.

Рашэнні і прапановы, якія гучалі ў розных пастановах партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва наконт кадравага патэнцыялу, з большага мелі дэкларатыўны характар і паўтараліся з года ў год: “… палепшыць працу па падборы і падрыхтоўцы кадраў, павышэнню іх кваліфікацыі, … арганізаваць эканамічную вучобу кадраў па вывучэнні новых метадаў гаспадарання, …павысіць асабістую адказнасць кіраўнікоў, … прыняць меры, накіраваныя на выхаванне работнікаў у духу высокай грамадзянскай адказнасці і прынцыповасці, … разглядаць факты прыпісак і іншых скажэнняў справаздачнасці як цяжкія правіннасці перад дзяржаваю і народам, ствараць вакол асоб, якія іх дапускалі, абстаноўку нецярпімасці і грамадскай пагарды… не дапускаць выпадкаў знаходжання ашуканцаў на займаемых пасадах…” і падобнае.

Кадравая палітыка партыйна-савецкага кіраўніцтва была скіравана на падпарадкаванне чалавека дзяржаве. Гэта перашкаджала свабодным праявам грамадскіх сіл. У выніку празмернага мэтанакіраванага кіраўніцтва – асобы адмаўляліся ад істотнай часткі самастойнасці і адказнасці, з’ўлялася сацыяльная

[1] Письмо Управления делами СМ БССР от 06.05.1991 г. “О соблюдении законности при проведении массовых мероприятий” // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 4065. Арк. 32-37.
[2] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 553–554.

апатыя і іншыя негатыўныя з’явы, якія не дазволілі кадрам прамысловасці Савецкай Беларусі ў перыяд эканамічных рэформ і трансфармацыі палітычнай сістэмы стабілізаваць становішча ў эканоміцы.

### 3.3 Кадравы патэнцыял па матэрыялах рэгіянальных органаў КПБ (1970–1991)

Выконваючы рашэнні і пастановы з’ездаў, пленумаў КПСС і КПБ, пытанні падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў, умацавання дысцыпліны, павышэння арганізаванасці і персанальнай адказнасці кожнага работніка за даручаную справу перыядычна разглядаліся на пленумах, пасяджэннях сакратарыятаў, бюро АК, ГК і РК КПБ, на сходах у першасных партыйных арганізацыях прамысловых прадпрыемстваў, семінарах і навукова-практычных канферэнцыях.

Напрыклад, у Магілёўскай вобласці за 1971–1972 гг. бюро АК КПБ разгледзела працу з кадрамі ў Быхаўскай, Бялыніцкай, Клімавіцкай, Крычаўскай, Касцюковіцкай і Хоцімскай раённых партарганізацыях, шэрагу ўпраўленняў і аддзелаў аблвыканкама. На Магілёўскім заводзе штучнага валакна мясцовыя камуністы абмеркавалі пытанні: “Кіраўнік – арганізатар і выхавальнік свайго калектыву”, “Падбор, выхаванне і расстаноўка кадраў у калектывах завода і задачы партарганізацыі па выкананні рашэнняў XXIV з’езда КПСС”, “Задачы партарганізацыі завода па далейшым паляпшэнні работы інжынерна-тэхнічных работнікаў у ідэйна-палітычным выхаванні членаў свайго калектыву ў святле пастановы ЦК КПСС”[1].

Распрацоўвалі і ажыццяўлялі мерапрыемствы па ўмацаванні найбольш важных участкаў вытворчасці кваліфікаванымі спецыялістамі і арганізоўвалі іх вучобу структуры АК КПБ. Яны таксама каардынавалі працу і арганізоўвалі вучобу сакратароў, загадчыкаў аддзелаў і інструктараў ГК, РК КПБ, якія займаліся пытаннямі прамысловасці, транспарту і сувязі[2].

XVII Гомельская абласная партыйная канферэнцыя адбылася 21–22.01.1971 г. Стан кадравага патэнцыялу на ўсходзе Савецкай Беларусі знайшоў сваё адлюстраванне ў пастанове, дзе адзначалася, што на пачатак дзевятай пяцігодкі: “Абкамы, гаркамы і райкамы КПБ не пазбеглі недахопаў у працы з кадрамі. Мелі месца факты вылучэння на кіраўніцкія пасады слабых і безыніцыятыўных работнікаў. Асобныя кіраўнікі некрытычна ацэньваюць сваю дзейнасць, парушаюць партыйную і дзяржаўную дысцыпліну, не праяўляюць настойлівасці па ўкараненні ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту. Асабліва шмат недахопаў у працы з кадрамі сярэдняга звяна”[3].

[1] Протокол пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 170, 76.
[2] Протокол № 4 заседания секретариата Витебского областного комитета КПБ от 31.03.1981 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 151. Спр. 80. Арк. 112.
[3] Протокол XVII Гомельской областной партийной конференции. 1971 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 137. Спр. 55. Арк. 18.

Існаваўшыя пралікі і недахопы ў кадравай працы прымушалі рэгіянальныя партыйна-савецкія ўлады аналізаваць сітуацыю для абагульнення станоўчага вопыту і распрацоўкі рэкамендацый па паляпшэнні кадравага складу ў гаспадарцы. На пасяджэнні бюро Віцебскага АК КПБ 21.12.1971 г. разглядаліся меры па паляпшэнні падрыхтоўкі рабочых у прафесійна-тэхнічных вучылішчах вобласці і запіска аддзела арганізацыйна-партыйнай работы АК КПБ "Аб працы Пастаўскага райкама партыі па падборы, расстаноўцы і выхаванні кіраўніцкіх кадраў, стварэнні іх рэзерву"[1]. У тым жа годзе на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ аналізавалі працу Калінкавіцкага РК КПБ з кіраўніцкімі кадрамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў святле патрабаванняў XXIV з’езда КПСС і XXVII з’езда КПБ[2]. Бюро Магілёўскага абкама КПБ 29.04.1972 г. абмяркавала дзейнасць па падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў першаснай партыйнай арганізацыі і адміністрацыі ліфтабудаўнічага завода[3].

У выніку, сярод іншага, бюро АК КПБ пастанавілі ўказаць партыйным арганізацыям і адміністрацыям прамысловых прадпрыемстваў на наяўнасць сур’ёзных недахопаў у працы па падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і спецыялістаў. Абавязалі ліквідаваць недахопы, прыняць неабходныя меры па паляпшэнні працы з кіраўніцкімі кадрамі сярэдняга звяна, дамагчыся такога становішча, каб на пасады майстроў, старэйшых майстроў, начальнікаў цэхаў, участкаў, аддзелаў і іх намеснікаў вылучаліся работнікі, якія мелі высокую тэарэтычную падрыхтоўку і досвед працы з людзьмі, неабходныя арганізатарскія здольнасці; не дапускаць фактаў прызначэння на кіраўніцкія пасады асобаў, якія раней скампраметавалі сябе на практычнай працы. Патрабавалі палепшыць працу саветаў майстроў і савета маладых спецыялістаў, пастаянна аказваць ім дапамогу ў планаванні і правядзенні мерапрыемстваў; звярнуць асаблівую ўвагу на якасць правадзімай атэстацыі ІТР, дамагчыся высокай патрабавальнасці атэстацыйных камісій і рэалізацыі на практыцы вынікаў атэстацыі. Заклікалі спыніць практыку адміністравання, забяспечыць неабходнае спалучэнне мер дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны і грамадскага парадку, больш поўна выкарыстоўваць у гэтай працы сходаў калектываў, а таксама вопыт іншых прадпрыемстваў, якія прымянялі да злосных парушальнікаў дысцыпліны абмежаванні ў атрыманні ільготных пуцёвак на курортна-санаторнае лячэнне, прадастаўленні адпачынкаў у летні час, перанос чарговасці на атрыманне жылля і іншыя. Прапаноўвалі пастаянна весці працу па скарачэнні цякучасці кадраў, замацаванні іх на вытворчасці; павысіць актыўнасць інжынераў і тэхнікаў ў далейшым паскарэнні тэмпаў навукова-тэхнічнага прагрэсу.

---

[1] Протокол заседания бюро Витебского ОК КПБ от 21.12.1971 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 122. Спр. 39. Арк. 8-17, 24-25.

[2] Протоколы заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 134. Спр. 89. Арк. 44; Информация о работе Калинковического РК КПБ с руководящими кадрами промышленности и сельского хозяйства с учетом требований XXIV съеда КПСС и XXVII съезда КПБ // Там жа. Спр. 88. Арк. 132.

[3] Протокол заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 29.04.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15. Арк. 25-29.

Даручылі ГК і РК КПБ разгледзець факты прыпісак у справаздачах аб выкананні прадпрыемствамі і ўстановамі бягучых планаў вытворчасці і прыцягнуць датычных да гэтага асоб да строгай адказнасці[1].

У выступленннях на пленуме Магілёўскага АК КПБ (04.07.1972) падчас абмеркавання пытання "Аб далейшым удасканаленні працы партыйных арганізацый вобласці з кадрамі ў святле патрабаванняў XXIV з'езда КПСС" было адзначана, што на прадпрыемствах і ва ўстановах сістэматычна абмяркоўвалі падбор і расстаноўку кадраў, стан іх эканамічнай і палітычнай падрыхтаванасці, заслухоўвалі кіраўнікоў аддзелаў, цэхаў, груп і майстроў аб іх практычнай дзейнасці; у калектывах існавалі курсы і школы мэтавага прызначэння па павышэнні вытворчай кваліфікацыі кадраў. Вясной 1972 г. ГК КПБ правёў семінар сакратароў партыйных арганізацый прадпрыемстваў прамысловасці, будаўніцтва і транспарту, прысвечаны працы з кадрамі сярэдняга звяна. Вынікам кадравай працы палічылі тое, што па выніках восьмай пяцігодкі 3908 працаўнікоў Магілёўскай вобласці былі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі СССР[2].

У той жа час у г. Магілёве па-ранейшаму не лепшым чынам праводзілася праца з падборам кадраў на пасады намеснікаў кіраўнікоў шэрагу прадпрыемстваў, упраўленняў і арганізацый. Па ўзроўні сваёй падрыхтоўкі толькі некаторыя з іх маглі ўзначаліць калектывы, у якіх працавалі, частка з іх мела невысокія "маральныя якасці". Каб выправіць становішча, адбыўся пленум ГК КПБ, на якім былі сфармуляваны дзеянні па паляпшэнні падбору, расстаноўцы і выхаванні кіраўніцкіх кадраў і матэрыяльна-адказных асоб[3].

Аналіз стану эканамічнай вучобы кадраў на прадпрыемствах прамысловасці, будаўніцтва, транспарту і гандлю Крычаўскага раёна быў зроблены 26.05.1972 г. на пасяджэнні бюро Магілёўскага АК КПБ, які засведчыў, што ўзровень эканамічнай падрыхтоўкі кадраў раёна не адпавядаў належным патрабаванням. Бюро АК КПБ палічыла, што недахопы ў арганізацыі эканамічнай адукацыі працоўных з'яўляліся вынікам недастаковай патрабавальнасці за стан эканамічнай адукацыі з боку райкамаў КПБ да кіраўнікоў прадпрыемстваў; адсутнасцю кантролю з боку першасных партыйных арганізацый за правядзенне эканамічнай вучобы кадраў. РК КПБ абавязалі распрацаваць у адпаведнасці з рэкамендацыямі ЦК КПСС сістэму абучэння кадраў; скласці перспектыўны план эканамічнай вучобы на 1972–1975 гг., якую праводзіць дыферэнцавана, з улікам спецыфікі прадпрыемстваў, галін гаспадаркі, характару працы розных катэгорый работнікаў. Пры камплектаванні эканамічных школ і семінараў ўлічваць ўзровень эканамічнай падрыхтоўкі працаўнікоў. Прапаноўвалася падабраць прапагандыстаў і лектараў з ліку эканамістаў, галоўных спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў, забяспечыць павышэнне іх эканамічнай і

[1] Протокол заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 29.04.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15. Арк. 27-29.
[2] Протокол пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // Там жа. Спр. 3. Арк. 51, 140.
[3] Там жа. Арк. 53–54.

метадычнай падрыхтоўкі на курсах і спецыяльных семінарах[1]. Па матэрыялах пасяджэння бюро можна заўважыць, што ўсе прапановы і рэкамендацыі абапіраліся на адміністрацыйныя рэсурсы, а не на інтарэсы прадпрыемстваў і зацікаўленасць працаўнікоў.

Нягледзячы на тое, што кадравая палітыка з’яўлялася прэрагатывай КПСС, у рэгіёнах сутыкаліся інтарэсы партыі, выканаўчых органаў савецкай улады і гаспадарчых ведамстваў. Каб пазбегнуць канфліктаў, 16.06.1972 г. на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ пры абмеркаванні наменклатуры пасадаў абкама КПБ вырашылі, што назначэннем і перасоўваннем кадраў кіраўніцкіх работнікаў прадпрыемстваў, установаў і арганізацый займаюцца аддзелы АК, ГК і РК КПБ разам з абласнымі ведамствамі[2].

Тым не менш, ГК і РК КПБ, часам вырашалі кадравыя пытанні і прымалі рашэнні, не звяртаючы ўвагі на ведамсты і арганізацыі. Так, 16.04.1974 г. на пасяджэнні сакратарыята Віцебскага АК КПБ разглядалася запіска аддзела аргпартработы “Аб фактах перастаноўкі кадраў і спецыялістаў, якія ўваходзяць у наменклатуру абласных ведамстваў і арганізацый без ўзгаднення з імі” і было прынята рашэнне катэгарычна забараніць ГК і РК КПБ надалей рабіць перастаноўку кадраў кіраўнікоў і спецыялістаў без узгаднення з абласнымі ведамствамі і арганізацыямі[3].

Уся праца партыйных арганізацый прадпрыемстваў і ўстаноў з кадрамі рэспубліканскім і рэгіянальным партыйна-савецкім кіраўніцтвам ацэньвалася тым, якіх вынікаў дамогся калектыў завода ў выкананні дзяржаўнага плана. У дакладзе “Аб стане і мерах далейшага паляпшэння працы з кадрамі ў святле рашэнняў XXIV з’езда КПСС” на XI пленуме Віцебскага АК КПБ (28–29.11.1972) [4] было адзначана, што сярод іншага, менавіта з-за кадравых праблем у Віцебскай вобласці за 10 месяцаў 1972 г. 40 прамысловых прадпрыемстваў (14,7 %) не выканалі план па рэалізацыі прадукцыі, 62 прадпрыемствы па прадукцыйнасці працы. На 45 прамысловых прадпрыемствах прадукцыйнасць працы значна зменшылася ў параўнанні з 1971 г. Падобны падыход тлумачэння спаду вытворчасці прагучаў і на XIII пленуме Віцебскага АК КПБ (09.01.1973), дзе разглядалася пытанне аб паляпшэнні сістэмы мер па ўдасканаленні кіравання вытворчасцю і метадаў гаспадарання, падбору і выхаванню кадраў[5].

Удасканаленне працы з кадрамі і выбарным партыйным актывам у абласной партарганізацыі ў святле патрабаванняў XXIV з’езда КПСС стала прадметам абмеркавання на XII пленуме Гомельскага АК КПБ (12.06.1973)[6].

З году ў год, незалежна ад вобласці, пастановы і рэкамендацыі ўтрымліваюць адно і тое ж, што дазваляе казаць аб тэндэнцыях не вырашанасці якаснага складу кадравага патэнцыялу. Напрыклад, 03.12.1973 г. бюро

[1] Протокол заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 26.05.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15. Арк. 163-166.
[2] Протокол № 8 заседания бюро Гомельскага ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 137. Спр. 10. Арк. 153-154.
[3] Протокол № 13 заседания секретариата Витебского областного комитета КПБ от 16.04.1974 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 130. Спр. 76. Арк. 121-152.
[4] Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // Там жа. Воп. 124. Спр. 8. Арк. 7-63.
[5] Постановление XIII пленума Витебского ОК КПБ 9.01.1973 г. // Там жа. Воп. 127. Спр. 5. Арк. 105-106.
[6] Протокол заседаний пленума Гомельского ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 140. Спр. 2. Арк. 3.

Гомельскага АК КПБ пастанавіла: павысіць патрабаванні і адказнасць кіраўнікоў, палепшыць працу па падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў, дамагчыся, каб усе ўчасткі гаспадарчай працы ўзначальвалі палітычна адукаваныя, ініцыятыўныя і аўтарытэтныя працаўнікі, здольныя арганізатары і выхавальнікі, якія валодалі сучаснымі метадамі кіравання, здольныя бачыць перспектыву і знаходзіць найбольш эфектыўныя шляхі рашэння ўзніклых праблем[1]. Бюро Магілёўскага АК КПБ 29.10.1974 г., аналізуючы стварэнне рэзерву кадраў і працу з ім, прыняла пастанову: праводзіць падбор і расстаноўку кадраў згодна з іх палітычнымі і дзелавымі якасцямі (палітычныя на першым месцы – ад аўт.), залічваць у рэзерв для вылучэння на кіраўніцкую працу здольных арганізатараў, якія адрозніваліся высокімі маральнымі якасцямі, спецыяльнымі ведамі, добрай практычнай падрыхтоўкай; арганізаваць сістэматычнае павышэнне дзелавой кваліфікацыі кадраў[2].

Працу Рэчыцкага РК КПБ з рэзервам кадраў разгледзелі на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ 13.12.1974 г.[3] З матэрыялаў абкама можна даведацца, што, нягледзячы на абмеркаванне на пленумах Рэчыцкага РК КПБ пытанняў “Аб стане і мерах далейшага паляпшэння працы з кадрамі сярэдняга звяна”, “Аб далейшым удасканаленні працы раённай партыйнай арганізацыі з кадрамі ў святле патрабаванняў XXVI з’езда КПСС”, у раёне не выпрацавалі сістэмны комплексны падыход да працы з кадрамі. У большасці партыйных арганізацый мерапрыемствы па працы з кадрамі складаліся фармальна (у наяўнасці былі толькі спісы рэзерву); не існавала сістэма інфармавання асоб, якія ўваходзілі ў рэзерв, аб тэхнічных наваўвядзеннях, дасягненнях тэорыі і практыкі кіравання; адсутнічала атэстацыя кіраўніцкіх кадраў і спецыялістаў[4].

У 1975 г. на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ разглядаўся падбор, расстаноўка і выхаванне кадраў у трэсце “Гомсельбуд” і абласным вытворчым аўтатранспартным упраўленні; павышэнне ролі кіраўніцкіх кадраў і ІТР у “камуністычным выхаванні працоўных” завода “Гомсельмаш”[5]. У тым жа годзе годзе Гомельскім АК КПБ быў праведзены абласны семінар кіраўніцкіх кадраў[6].

Першы сакратар Гомельскага АК КПБ у сваім дакладзе на XIX абласной партыйнай канферэнцыі (18–19.12.1975) засведчыў, што ў вобласці была праведзена значная праца па падрыхтоўцы і абучэнні кадраў сярэдняга звяна і кадраў масавых прафесій, тым не менш: “Для стылю працы асобных РК КПБ характэрны павярхоўны падыход да вырашэння кадравых пытанняў … бюро, сакратарыят АК, шэраг РК і ГК КПБ дапускалі пралікі ў падборы і выхаванні кіраўніцкіх кадраў”. Важнасць дысцыпліны, патрабавальнасці і асабістай

[1] Протокол заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 140. Спр. 14. Арк. 22.
[2] Протокол заседания бюро Могилёвского обкома КПБ от 29.10.1974 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 153. Спр. 40. Арк. 33.
[3] Протокол заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 142. Спр. 20. Арк. 194–201.
[4] Даведка ад 13.12.1974 г. “Аб працы Рэчыцкага РК КПБ з рэзервам кадраў” // Там жа. Спр. 36. Арк. 314, 317, 319.
[5] Протоколы заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // Там жа. Спр. 22. Арк. 9-12; Спр. 24. Арк. 181-187; Материалы к заседанию бюро Гомельского ОК КПБ // Там жа. Спр. 35. Арк. 2-9; Спр. 38. Арк. 209-215.
[6] Протокол № 14 заседания секретариата Гомельского ОК КПБ // Там жа. Спр. 40. Арк. 54-55.

адказнасці кадраў за даручаную справу падкрэслівалася і ў выступленні на канферэнцыі першага сакратара Гомельскага ГК КПБ[1].

Кадравая палітыка і яе вынікі разглядаліся 23–24.12.1975 г. на XIX Магілёўскай абласной партыйнай канферэнцыі, прысвечанай вынікам працы абласнога камітэта КПБ і развіццю народнай гаспадаркі Магілёўскай вобласці ў 1971–1975 гг.[2] У справаздачным дакладзе АК КПБ прагучала, што была праведзена пэўная праца, каб кадры сталі імкнуцца да авалодання перадавымі метадамі гаспадарання, па абуджэнні ў іх клопату па ўкараненні новай тэхнікі, барацьбы за высокія якасныя паказчыкі. Разам з тым выразна прасочваліся і недахопы ў рабоце шматлікіх прамысловых прадпрыемстваў, а значыцца ў кіраўніцтве імі. Не была пераадоленая заганная практыка распылення матэрыяльных і людскіх рэсурсаў па шматлікіх аб’ектах і прадпрыемствах, якія адначасова будаваліся. Работнікі аддзелаў АК КПБ слаба кантралявалі і накіроўвалі працу партыйных камітэтаў, часта захапляліся рознага роду планёркамі, паседжаннямі штабоў, чым падмянялі аддзелы і ўпраўленні аблвыканкама[3]. У пастанове партыйнай канферэнцыі[4] было адзначана, што недастаткова павышалася адказнасць гаспадарчых кіраўнікоў, ІТР, калектываў працоўных за выкананне вытворчых планаў, умацаванне дысцыпліны і парадку на вытворчасці, у барацьбе з безгаспадарчасцю і марнатраўствам.

У чарговы раз кадравая палітыка на пленуме Магілёўскага абкама КПБ разглядалася 19.04.1978 г. Наогул, за 1976–1977 гг. на пленумах і бюро АК, ГК і РК КПБ было разгледжана больш 230 пытанняў, якія тычыліся паляпшэння працы кадраў[5]. Тым не менш, на асобных прадпрыемствах не змаглі дамагчыся карэннага паляпшэння падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў, асобныя ўчасткі вытворчасці ўзначальвалі асобы, якія не валодалі глыбокімі тэхнічнымі і эканамічнымі ведамі, вопытам арганізацыйнай працы.

На XX Магілёўскай абласной партыйнай канферэнцыі (26.01.1979), дзе падводзіліся вынікі працы за 1976–1978 гг., прагучала: “Найважнейшым участкам нашай працы, як і ўсёй партыі, была і застаецца кадравая палітыка ... Кадравыя пытанні не сталі галоўнымі ў дзейнасці шэрагу партыйных камітэтаў і арганізацый”[6]. Са справаздачнага даклада аб працы АК КПБ бачна, што ў Магілёўскай вобласці былі не рэдкімі факты маральнай глухаты і чэрствасці, бюракратызму і фармальных адносін да справы. Актуальнай праблемай заставалася барацьба з п’янствам, крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці,

[1] Протокол XIX Гомельской областной партийной конференции (1975 г.) // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 39, 54.
[2] Доклад “Основные итоги развития народного хозяйства Могилевской области за 1971–1975 годы” // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 2. Арк. 1-7.
[3] Отчётный доклад Могилёвского обкома КПБ XIX областной партийной конференции (23–24.12.1975 г.) за период с февраля 1974 по декабрь 1975 г. // Там жа. Спр. 1. Арк. 21.
[4] Постановление XIX областной партийной конференции (23–24.12.1975 г.) // Там жа. Спр. 1. Арк. 223-242.
[5] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // Там жа. Воп. 159. Спр. 109. Арк. 39.
[6] Протокол XX Могилевской областной партийной конференции от 26.01.1979 г. // Там жа. Воп. 162. Спр. 2. Арк. 55.

растратамі. Падобнае назіралася і ў Гомельскай вобласці, што прагучала на пасяджэнні абласной партыйнай канферэнцыі 30.01.1979 г.[1].

Першы сакратар Магілёўскага АК КПБ В. Прышчэпчык 11.04.1979 г. на пасяджэнні пленума ў сваім дакладзе, прысвечаным працы з кадрамі, заявіў: "Задача ўмацавання паўнавартаснымі кадрамі ключавых пазіцый індустрыяльнага сектара вырашаецца ў вобласці нездавальняюча"[2].

Для 1970-х – першай паловы 1980-хх гг. характэрна нізкая працоўная дысцыпліна ва ўстановах і на прадпрыемствах, распаўсюджванне п'янства, крадзяжоў дзяржаўнай і грамадскай уласнасці. Каб прыняць эфектыўныя меры па навядзенні парадку, было вырашана ўзмацніць меры ідэалагічнага, выхаваўчага ўздзеяння на ўсе сацыяльныя слаі насельніцтва. На гэта была накіравана пастанова ЦК КПСС "Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы" (25.04.1979). Яна патрабавала "рашуча весці барацьбу за выкараненне такіх варожых сацыялізму пачварных перажыткаў мінулага, як скнарнасць і хабарніцтва, імкненне вырваць больш ад грамадства, нічога не даючы яму, безгаспадарнасць і неашчаднасць, п'янства і хуліганства, бюракратызм і бяздушныя адносіны да людзей, парушэнне працоўнай дысцыпліны і працоўнага парадку"[3]. На гэта адразу адрэагавалі рэгіянальныя ўладныя структуры. Як прыклад, у 1979 г. на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ разглядалася запіска партыйнай камісіі пры ЦК КПБ аб злоўжываннях некаторых кіраўніцкіх работнікаў Гомельскай вобласці[4].

На пасяджэнні сакратарыяту Віцебскага АК КПБ 13.01.1981 г. разглядалася выкананне пастановы бюро АК КПБ ад 27.06.1978 г. "Аб рабоце партыйных арганізацый Чыгуначнага раёна г. Віцебска з кадрамі майстроў". Справаздачы аб працы з кадрамі сярэдняга звяна зрабілі сакратары партыйных арганізацый і кіраўнікі заводаў электравямяральных прыбораў імя Кірава, ВА "Даламіт", будаўнічага трэста № 9, лакаматыўнага дэпо, дыстанцыі пуці і інш. Было адзначана, што працаваў раённы савет майстроў, дзе разглядаліся справаздачы завадскіх саветаў майстроў (ствараліся на прадпрыемствах і ў арганізацыях, у якіх налічвалася больш за 10 майстроў); узрасла колькасць прадпрыемстваў, дзе былі створаны спецыяльныя фонды майстра для заахвочвання найлепшых рабочых за дасягненне высокіх якасных і колькасных паказчыкаў; палепшыўся якасны склад майстроў. Але меліся недахопы і недагляды: не на належным узроўні была арганізавана прафесійная вучоба майстроў, недастаткова эфектыўна працавалі саветы майстроў шэрагу прадпрыемстваў[5].

---

[1] Протокол XX Гомельской областной партийной конференции (1979 г.) // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 153. Спр. 78. Арк. 11-49.

[2] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 11.04.1979 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 162. Спр. 12. Арк. 9, 14.

[3] Барвінок, К. І., Саракавік І. А. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі. С. 71.

[4] Протокол заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 153. Спр. 104. Арк. 119-120; Записка партийной комиссии при ЦК КПБ о злоупотреблениях некоторых руководящих работников Гомельской области // Там жа. Спр. 111. Арк. 2-7.

[5] Справка о выполнении постановления бюро Витебского обкома КПБ от 27.06.1978 г. "О работе партийных организаций Железнодорожного района г. Витебска с кадрами мастеров" // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 151. Спр. 80. Арк. 7, 9.

У 1984–1985 гг. у выкананне мерапрыемстваў па рэалізацыі рашэнняў Пленума ЦК КПБ “Аб задачах партыйных арганізацый рэспублікі па далейшым удасканаленні працы з кадрамі ў святле патрабаванняў ЦК КПСС” была вывучана практыка работы з рэзервам кадраў на прадпрыемствах шэрагу міністэрстваў. Станоўчым было тое, што паўсюль меўся рэзерв кадраў на кіраўніцкія пасады (старшыні, намеснікаў, начальнікаў упраўленняў і аддзелаў, дырэктароў і галоўных інжынераў і г. д.), склад рэзерву кадраў абавязкова ўзгадняўся з грамадскімі арганізацыямі (прафкамамі)[1].

Ва ўсіх усходнебеларускіх абласцях на пасяджэннях бюро АК КПБ разглядаліся арганізацыйна-палітычныя мерапрыемствы па ўмацаванні працоўнай дысцыпліны і скарачэнні цякучасці кадраў[2]. Напрыклад, 28.04.1984 г. на пасяджэнні бюро Віцебскага АК КПБ аналізавалася праца парткама Віцебскага завода гадзінных дэталяў па павышэнні адказнасці гаспадарчых кіраўнікоў і ІТР за ўдасканаленне арганізацыі кіравання вытворчасцю, умацаванне дзяржаўнай і планавай дысцыпліны, дзе запатрабавалі рэалізаваць меры па стварэнні якаснага рэзерву кадраў, узмацніць увагу да маладых спецыялістаў, стварыць ім умовы для творчай працы, павысіць адказнасць кадраў кіраўнікоў і ІТР за якаснае выкананне службовых абавязкаў і дасягненне высокіх вынікаў на кожным участку працы[3].

Партыйнае і гаспадарчае кіраўніцтва сістэматычна разглядалі эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў прамысловасці. Прымалі пастановы і прапановы па выпраўленні недахопаў, асабліва ў кадравай сферы. Вясною 1985 г. на бюро Магілёўскага АК КПБ вывучаўся вопыт Кастрычніцкага РК КПБ г. Магілёва па падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў кіраўнікоў[4]. У студзені 1986 г. на пасяджэнні сакратарыяту Магілёўскага АК КПБ абмеркавалі вынікі выканання пастановы бюро абкама КПБ ад 26.05.1981 г. “Аб рабоце Кастрычніцкага РК КПБ г. Магілёва па выкананні пастановы ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС ад 13.12.1979 г. “Аб далейшым умацаванні працоўнай дысцыпліны і скарачэнні цякучасці кадраў у народнай гаспадарцы”; у лютым выкананне пастановы бюро абкама КПБ ад 19.03.1984 г. “Аб праграме ўкаранення робататэхнікі на прамысловых прадпрыемствах вобласці ў 1984–1985 гг.”; у сакавіку выкананне пастановы бюро абкама КПБ ад 30.11.1983 г. “Аб мерапрыемствах Магілёўскага АК КПБ па выкананні пастановы ЦК КПСС і СМ СССР ад 18.08.1983 г. “Аб мерах па паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы”; у маі працу Кастрычніцкага РК КПБ г. Магілёва па павышэнні ролі і адказнасці ІТР прамысловых прадпрыемстваў раёна за паскарэнне НТП. На пасяджэнні прамыслова-транспартнага аддзела Магілёўскага АК КПБ у 1986 г. прааналізавалі працу прамысловых

---

[1] Записка Управления делами СМ БССР № 13/147 от 24.04.1985 г. “О совершенствовании работы с кадрами”. Январь 1986 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 256. Арк. 12.
[2] Протокол заседания бюро Витебского областного комитета КПБ от 25.01.1983 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 158. Спр. 8. Арк. 39.
[3] Протокол № 10 заседания бюро Витебского областного комитета КПБ от 28.04.1984 г. // Там жа. Воп. 161. Спр. 28. Арк. 63, 66.
[4] План работы отдела химической промышленности Могилёвского обкома КПБ на 1985 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 178. Спр. 121. Арк. 1-3.

прадпрыемстваў вобласці па забеспячэнні высокага тэхнічнага ўзроўню і якасці экспартнай прадукцыі; у 1987 г. разгледзелі працу калектыву аўтамабільнага завода імя С. Кірава па павышэнні тэхнічнага ўзроўню і якасці выпускаемай прадукцыі. 29.02.1988 г. была прынята пастанова бюро Магілёўскага АК КПБ "Аб рабоце Крычаўскага гаркама КПБ, гарвыканкама і райвыканкама па выкананні пастаноў партыйных і савецкіх органаў аб умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы, паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу ў дзяржаўным і кааператыўным гандлі"[1].

Такім чынам, кадравая палітыка ў прамысловасці знаходзіліся пад кантролем органаў кіравання КПСС (КПБ), на рэгіянальным узроўні курыравалася першымі сакратарамі АК КПБ. У святле патрабаванняў цэнтральных органаў улады рэгіянальнае партыйна-савецкае кіраўніцтва рабіла пэўныя захады па паляпшэнні падрыхтоўкі кадраў і якасці кадравага патэнцыялу рэспублікі.

Пытанні аб кадрах рэгулярна разглядаліся на з'ездах, пленумах і партыйных канферэнцыях, на пасяджэннях бюро ЦК КПБ, пленумаў, бюро і сакратарыятаў АК, ГК і РК КПБ, абмяркоўваліся на сходах у першасных партыйных арганізацыях. Прымаліся адпаведныя пастановы, дзе пераважалі аднатыпныя, шаблонныя словы – клішэ. Пры гэтым варта адзначыць, што ў пратаколах пасяджэнняў і справаздачах 1970-х гг. прысутнічалі факты крытыкі і самакрытыкі, у першай палове 1980-х яны паступова знікаюць, асноўная частка інфармацыі прысвечана дасягненням і поспехам, пераконванням, што ў рэспубліцы (вобласці) усё добра.

Згодна з афіцыйнымі матэрыяламі кадравая палітыка была накіравана на тое, каб кіраўніцкія работнікі ўсіх рангаў спалучалі ў сабе высокую палітычную свядомасць і добрую прафесійную падрыхтоўку. Але ў шэрагу гарадоў і раёнаў не заўважаліся факты прыпісак і падману дзяржавы, памяркоўна адносіліся да тых работнікаў, якія скампраментавалі сябе, і ім вельмі часта знаходзілі новыя пасады кіраўнікоў. Нярэдка на кіраўніцкія пасады вылучалі безыніцыятыўных і малапісьменных работнікаў, не праяўлялі належнага клопату аб стварэнні рэзерву кадраў. Мелі месца недахопы ў расстаноўцы і выкарыстанні спецыялістаў народнай гаспадаркі. Часам гаспадарчыя кіраўнікі няўважліва ставіліся да маладых спецыялістаў, не стваралі ім неабходных умоў, мала вылучалі на кіраўніцкія пасады маладых і здольных інжынераў, эканамістаў. Павольна вырашаліся пытанні замены работнікаў, якія не спраўляліся са сваімі абавязкамі, дапускалася прызначэнне на інжынерна-тэхнічныя пасады асоб, якія не мелі спецыяльных ведаў. Шмат кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў затулялі расхлябанасць, прастоі і прагулы. Аддзелы АК, ГК і РК КПБ не бачылі ў такой вытворча-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў "сур'ёзных недахопаў".

---

[1] План работы промышленно-транспортного отдела Могилёвского обкома КПБ на 1987 г. и 1 кв. 1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 184. Спр. 72. Арк. 1-2.

У 1970–1980-я гг. кадравая палітыка, якая праводзілася партыйна-савецкім кіраўніцтвам, далёка не заўсёды адпавядала тым палітычным і сацыяльна-эканамічным працэсам, якія адбываліся ў СССР, што прыводзіла да адмоўных з'яў у развіцці савецкай гаспадарчай сістэмы і дзяржавы ў цэлым. У той жа час аб'ектыўная неабходнасць, звязаная з далейшым развіццём савецкай эканомікі, прымушала ўсесаюзную палітычную эліту перадаваць значныя паўнамоцтвы ў вырашэнні кадравых пытанняў у рэгіянальныя ўладныя структуры, што аслабляла кантроль цэнтра над палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі працэсамі. Да пачатку 1980-х гг. дзяржаўныя і гаспадарчыя структуры БССР фактычна сталі забяспечвацца кіраўнікамі, падрыхтаванымі ў саміх рэгіёнах. Расійскі даследчык А. Фёдараў сцвярджае, што кадравая палітыка КПСС і савецкага ўрада пастунова перастала адказваць патрэбам не толькі эканомікі і грамадства, але і інтарэсам самой наменклатуры ў рэгіёнах. Мясцовыя кіраўнікі ў 1970–1980-я гг. фактычна засяродзілі ў сваіх руках уладу ва ўстановах, якія ўзначальвалі[1]. Прынцып "стабільнасці кадраў" прыводзіў да таго, што мясцовыя кіраўнікі з часам сталі паўнаўладнымі гаспадарамі ва ўстановах і на аб'ектах гаспадаркі, якімі кіравалі. Стварэнне цесных сувязяў ўнутры наменклатуры, з аднаго боку, прыводзіла да фактычнай беспакаранасці мясцовых кіраўнікоў, з другога – уваходзіла ў супярэчнасць з аб'ектыўнымі заканамернасцямі развіцця савецкага грамадства і руйнавала і без таго хісткі аўтарытэт партыі ў шырокіх народных масах.

У выніку кадравай палітыкі да сярэдзіны 1980-х гг. у БССР склаўся ўстойлівы тып савецкай палітычнай і гаспадарчай эліты, які характарызуецца стабільнымі прапорцыямі асноўных яе кампанентаў. Фактар адукацыі стаў адным з найважнейшых пры фарміраванні аблічча эліты і кадравай палітыкі КПСС (КПБ) і савецкага ўрада ў цэлым. У эвалюцыі эліты прысутнічала пэўная скіраванасць да павелічэння ў яе складзе долі выхадцаў з вобласці пражывання, з сем'яў рабочых і служачых, з гарадскіх паселішчаў. Асаблівасці палітычнай сітуацыі ў краіне спрыялі штучнаму захаванню такога тыпу кіраўнікоў, які страчваў сваю актуальнасць. Склад кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў фарміраваўся адміністрацыйным шляхам (адміністрацыяй і органамі кіравання КПБ) пры мінімальным (фармальным) удзеле грамадскасці ў выглядзе прафсаюзаў. Выразна прасочваецца нізкая змяняльнасць кіраўніцкіх кадраў, што істотна перашкаджала абнаўленню кадравага патэнцыялу і развіццю эканомікі БССР.

[1] Федоров А. В. Кадровая политика СССР на завершающем этапе индустриальной модернизации (конец 1950–1980-е гг.): автореферат диссертации на соискание учёной степени к.ист.н. М., 2005.

# Глава 4
# МЕРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫХ І РЭГІЯНАЛЬНЫХ УЛАД ПА ПЕРААДОЛЕННЮ ЭКАНАМІЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ У ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Поспехі ў развіцці эканомікі, і перш-наперш у развіцці індустрыі, некалькі прыкрывалі шматлікія дыспрапорцыі і сацыяльныя праблемы, якія былі ўласцівы тагачаснаму савецкаму грамадству. Адной з праблем, якая ў той час лічылася характэрнай рысай капіталістычнага ладу, а ў новым сацыялістычным грамадстве называлася "перажыткам" буржуазнага ладу, была злачыннасць, у тым ліку такі яе складальнік, як карупцыя. Карупцыйныя праявы, па ўяўленнях камуністычных ідэолагаў, у новым грамадстве павінны былі натуральна знікаць, зжывацца, а пры неабходнасці выкараняцца, але і праз 40–60 гадоў пасля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі аказаліся надзвычай жывучымі. Натуральна, што ў савецкіх дакументах тэрмін карупцыя ў дачыненні да савецкага грамадства практычна не ўжываўся, а прымяняліся адсылкі да "злоўжывання службовым становішчам", "выкарыстання службовай пасады ў карысных мэтах", "дробнабуржуазных праяў" і г. д. Гэта была своеасаблівая савецкая эзопава мова – тайнапіс у дакументах, які наўмысна маскіраваў сутнасць справы.

## 4.1 Антыкарупцыйныя аспекты кадравай палітыкі ў прамысловасці і рашучае навядзенне парадку ў кадравай сферы і народнай гаспадарцы БССР у 1944–1970 гг.

Сацыяльны статус кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў у канцы 1940–1960-х гг. быў дастаткова высокім, а зарплата падтрымлівала яго прэстыжнасць. Дырэктары, галоўныя інжынеры заводаў і фабрык з'яўляліся прадстаўнікамі мясцовай, а буйных прадпрыемствах – рэспубліканскай эліты. Такая сітуацыя з'ўлялася моцным стымулам для атрымання адукацыі і для прыкладання спецыялістамі намаганняў з мэтай руху па службовай кар'ернай лесвіцы.

Кадры кіраўніцтва прамысловымі прадпрыемствамі і аб'яднаннямі, як і партыйныя, савецкія кадры, павінны былі быць ідэйнымі, самаахвярнымі, прынцыповымі, па-савецку партыйна дысцыплінаванымі, добраахвотна аскетычнымі і мець, пажадана, сацыяльна чыстую біяграфію. Адпавядаць ідэалам камуністычнага кіраўніка і адначасова добраахвотна абмяжоўваць у сабе "капіталістычныя перажыткі" было для многіх кіраўнікоў нялёгкай задачай.

**Барацьба са злоўжываннямі на заводах і фабрыках** у другой палове ХХ ст. вялася перманентна з лакальнымі поспехамі і без надзеі на канчатковую перамогу.

У першыя пасляваенныя гады ў рэспубліцы назіраўся ўсплёск злачыннасці. Не абышліся злачынствы і карупцыйныя праявы і партыйную, і

савецкую эліту тагачаснага савецкага грамадства, кіраўнікоў беларускай прамысловасці. У пастанове ЦК УсеКП(б) 1947 г. "Аб рабоце ЦК КП(б) Беларусі" вялікая ўвага была нададзена рабоце з кадрамі. У выніку разгляду дзейнасці цэнтральнага камітэта кампартыі Беларусі цэнтральныя органы прыйшлі да высновы, што ў рэспубліцы мелася "нямала фактаў парушэння савецкіх законаў, маральна-побытавага разлажэння, разбэшчанасці і недысцыплінаванасці сярод кіраўніцкіх работнікаў", дробнабуржуазных праяў, якія выражаліся ў будаўніцтве ўласных дамоў за кошт дзяржаўных сродкаў і матэрыялаў, набыцці ва ўласнасць трафейных аўтамабіляў. У частцы пастанаўлення ЦК КП(б)Б абавязалі пакончыць са шкоднай практыкай прэміравання кіраўніцкіх партыйных і савецкіх работнікаў гаспадарчымі органамі і дробнабуржуазнымі праявамі з боку асобных некаторых кіраўніцкіх работнікаў рэспублікі, якія выкарыстоўваюць дзяржаўныя сродкі для ўладкавання асабістага дабрабыту". ЦК КП(б)Б абавязалі "карэнным чынам палепшыць работу з кадрамі і іх бальшавіцкае выхаванне"[1]. Органы рэспубліканскага кіравання не былі выключэннем з правіл. Усе гэтыя недахопы і злачынныя праявы тычылася не толькі партыйнай і савецкай эліты, але і кіраўніцтва прамысловасці.

У сталінскі час абмежаванню "мяшчанскіх" апетытаў дапамагаў энтузіязм першых гадоў сацыялістычнага будаўніцтва і рэальная пагроза брутальнага пакарання з боку карных органаў. Паступовае памяншэнне страху сталінскіх рэпрэсій пасля смерці "павадыра ўсіх прагрэсіўных сіл чалавецтва" прывяла да павелічэння выпадкаў злоўжывання службовым становішчам кіраўніцтва шэрагу прадпрыемстваў рэспублікі.

Факты злоўжыванняў найчасцей выяўляліся пры размеркаванні прэмій, матэрыяльнай дапамогі, кватэр, санаторных пуцёвак і г. д. Праведзеныя ў другой палове 1950-х гг. праверкі паказалі, што на большасці прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў БССР непрапарцыянальна размяркоўваліся сродкі, якія былі прадугледжаны па сметах на прэміраванне і аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам. Нярэдка прэміі рабочым мелі сімвалічны характар, на некаторых прадпрыемствах былі да таго малымі, што ўспрымаліся як насмешка. Нават памеры матэрыяльнай дапамогі, якая ў першую чаргу прызначалася малазабяспечаным работнікам, вызначаліся найчасцей у залежнасці ад пасады асобы. Правы рабочых і "нізавых" служачых у той ці іншай ступені ўшчэмліваліся.

Пры размеркаванні прэмій і матэрыяльнай дапамогі адсутнічала галоснасць. Гэтыя пытанні практычна не абмяркоўваліся на сходах калектываў, вытворчых нарадах. Нягледзячы на тое, што ў сярэдзіне 1950-х гг. былі зацверджаны новыя палажэнні аб прэміраванні, аб размеркаванні жылля, а "фонд дырэктара" з 1955 г. стаў "фондам прадпрыемства", звычка аднаасобна рашаць гэтыя пытанні яшчэ доўгія гады вызначала стыль паводзін многіх

[1] Постановление ЦК ВКП(б) "О работе ЦК КП(б) Белоруссии", 25.01.1947 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 8. С. 85, 89, 93.

кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў. Ва ўмовах слабога грамадскага кантролю праблема набыла агульнарэспубліканскі і агульнасаюзны характар.

У выніку практыкі, якая склалася, нярэдка сумы прыбыткаў кіраўнікоў зоводаў і фабрык на фоне зарплат шэраговых работнікаў выглядалі проста фантастычнымі, асабліва на буйных прадпрыемствах саюзнага падпарадкавання. Толькі за першае паўгоддзе 1958 г. дырэктар Мінскага трактарнага завода атрымаў 46 706 руб., галоўны бухгалтар – 25 446 руб., дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода – 40 351 руб., галоўны бухгалтар – 20 239 руб., дырэктар Мінскага мотавелазавода атрымаў 38 046 руб. Для параўнання дастаткова ўказаць, што прэстыжны легкавы аўтамабіль "Волга" тады каштаваў 40 000 руб., а "Масквіч" – 15 000 руб. [1]

Нават пры размеркаванні участкаў садовых таварыстваў правы шэраговых работнікаў, у першую чаргу рабочых, парушаліся. Пры аналізе ў 1982 г. ўдзелу розных сацыяльных слаёў насельніцтва ў таварыствах, якія ствараліся ў 1950–1960 гг. і наступныя дзесяцігоддзі, высветлілася тэндэнцыя атрымання садовых участкаў пераважна служачымі, работнікамі апарату кіравання, у выніку, рабочыя складалі па Беларусі толькі 40 % ад колькасці садаводаў. Яшчэ больш відавочная дыспрапорцыя была ў Магілёўскай вобласці, дзе рабочыя склалі чверць садаводаў (25,7 %) і ў Мінску (30,2 %). У той самы час чарга атрымаць садовы ўчастак толькі ў Брэсцкай вобласці склала 5 тыс. рабочых[2].

У канцы 1950 гг. сітуацыя стала падавацца кіраўніцтву краіны непрымальнай. Камуністычныя ідэалы і практыка вымагалі большай роўнасці ў матэрыяльным становішчы, што ў нейкай ступені супярэчыла прэстыжнасці гэтага статусу і высокай зарплаце кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў. У жніўні 1959 г. ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР вымушаны былі прыняць сумесную пастанову "Аб мерах па рашучым навядзенні парадку ў прэміраванні кіраўнікоў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых, якія занятыя ў народнай гаспадарцы БССР"[3].

Кампанія па рэалізацыі пастановы прывяла да змяншэння фактаў відавочных парушэнняў палажэння аб прэміраванні на прадпрыемствах, але сацыяльная справядлівасць (у савецкім яе разуменні) парушалася і надалей. Дырэктар Віцебскага завода імя Кірава, магілёўскіх заводаў "Электрарухавік" і Пад'ёмна-транспартнага абсталявання, Магілёўскага і Бабруйскага мясакамбінатаў і пачатку 1960-х гг. не ўзгаднялі з фабзавкамамі гэтыя пытанні. Аналагічная сістэма склалася і з размеркаваннем кватэр, якія на прадпрыемствах часцяком размяркоўваліся за "зачыненымі дзвярыма"[4]. На многіх прадпрыемствах існавала сістэма завуаляваных штрафаў.

[1] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат. С. 15.
[2] Лубінскі І.І. Характар парушэнняў у дачным будаўніцтве ў БССР // Романовские чтения – 14. Могилев, 2019. С. 36.
[3] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат. С. 14–15.
[4] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. : дыс. ... канд. гіст. навук : 15.03.92. Мінск, 1992. С. 73.

Падобныя праблемы адсутнасці публічнасці і празрыстасці склаліся з размеркаваннем кватэр. На многіх прадпрыемствах спісы чаргавікоў не складаліся, размеркаванне кватэр нярэдка ішло без удзелу заўкамаў. Увага цэнтральных органаў СССР да жыллёвай праблемы ў сярэдзіне 1950 г. спрыяла большай пільнасці да яе і на месцах.

Нават назва рашэння Выканкама Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад 14.11.1956 г. "Аб няправільнай практыцы размеркавання жылой плошчы Віцебскім гарвыканкамам, Кастрычніцкім і Чыгуначным райвыканкамамі" зафіксавала сур'езныя парушэнні ў гэтай сферы жыцця працоўных калектываў і мясцовых Саветаў. Найперш было адзначана, што, нягледзячы на значную працу па аднаўленні і новым будаўніцтве жылля, жыллёвыя ўмовы працоўных Віцебска працягвалі заставацца "зусім нездавальняючымі". У такіх умовах недаравальнымі, на думку членаў выканкама, былі сур'ёзныя памылкі ў справе размеркавання жыллёвай плошчы мясцовых саветаў, якія дапускаў Віцебскі гарвыканкам і райвыканкамы горада. Размеркаванне жыллёвай плошчы ў Кастрычніцкім і Чыгуначным райвыканкамах адбывалася "некалегіяльна", асобнымі рашэннямі старшыні або намесніка старшыні выканкама. Спісы грамадзян, якія мелі патрэбу ў жыллі, вяліся нядбайна, дапускаліся іх неабгрунтаваныя выпраўленні, спісы не вывяраліся і не адпавядалі рэальнаму становішчу. У выніку, меліся шматлікія факты, калі чарговасць парушалася, кватэры атрымоўвалі асобы, якіх не было ў спісах, а просьбы грамадзян, якія пражывалі ў "нязносных умовах", гадамі не задавальняліся. Такія недахопы ў размеркаванні жылой плошчы, як меркавалі члены абласнога выканкама, сталі вынікам бюракратычных, нячулых адносін да зваротаў грамадзян з боку кіраўнікоў гарадскога і раённых выканаўчых камітэтаў г. Віцебска. У рашэнні звярталася ўвага на "нездавальнячы разгляд скаргаў і заяў працоўных па задавальненні жылой плошчай", прадпісвалася пераправерыць спісы грамадзян, якія стаялі ў чэргах на атрыманне жылой плошчы, скласці акты абследавання іх умоў пражывання, улічваць працягласць уліку, стан здароўя, матэрыяльны стан членаў сям'і такіх грамадзян, у першую чаргу забяспечваць інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, сям'яў загінулых воінаў і дэмабілізаваных афіцэраў, а пытанні размеркавання жылля разглядаць калегіяльна і строга кантраляваць, а асоб, вінаватых у неабгрунтаваным выдзяленні жылля, "прыцягваць да строгай адказнасці"[1].

Падобнай была сітуацыя з размеркаваннем жылля і ў іншых рэгіёнах БССР. Такой самай склаліся сітуацыя і з размеркаваннем кватэр. На многіх прадпрыемствах спісы чаргавікоў не складаліся, размеркаванне кватэр нярэдка ішло без удзелу заўкамаў.

Прынятыя па фактах выяўленых парушэнняў пастановы фактычна не паляпшалі сітуацыю. Парушэнні сацыяльнай справядлівасці пры размеркаванні жылля не абмяжоўваліся асобнымі выпадкамі, можна сцвярджаць, што парушаліся правы рабочых як класа. У тыя ж часы інжынерна-тэхнічныя

[1] Решение Исполкома Витебского Областного Совета депутатов трудящихся от 14.11.1956 г. "О неправильной практике распределения жилой площади Витебским горисполкомом, Октябрьским и Железнодорожным райисполкомами" // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 168. Арк. 228-230.

работнікі прадпрыемстваў знаходзіліся ў прывеліяваным становішчы. Так, на Мінскім трактарным заводзе ў 1963–1965 гг. 35 % жылой плошчы атрымалі ІТР, хаця яны складалі 17,5 % ад агульнай колькасці работнікаў прадпрыемства. У 1965 г. рабочыя г. Бабруйска атрымалі 50 % выдзеленага жылля, хаця іх доля ў колькасці насельніцтва горада складала 65 %[1].

Бюракратычная сістэма кіравання і гаспадарання паказала сваю нядзольнасць дабіцца здзяйснення на практыцы абвешчаных нормаў сацыяльнай справядлівасці. Кантроль заўкомаў заставаўся малаэфектыўным. А пры праверках чыноўнікі, як правіла, абмяжоўваліся размовамі з начальствам і праверкай дакументацыі.

Такім чынам, у канцы 1950–1960 гг. сацыяльны статус кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў быў дастаткова высокім, а зарплата падтрымлівала яго прэстыжнасць. Дырэктары, галоўныя інжынеры заводаў і фабрык з’яўляліся прадстаўнікамі мясцовай, а буйных прадпрыемствах – рэспубліканскай эліты. Але выявіліся шматлікія факты злоўжыванняў імі сваім становішчам пры размеркаванні прэмій, матэрыяльнай дапамогі, кватэр, санаторных пуцёвак і г. д. У жніўні 1959 г. былі прыняты меры па навядзенні парадку ў прэміраванні кіраўнікоў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых. Рэалізацыя пастановы дала пэўныя станоўчыя вынікі, знізілася колькасць выяўленых фактаў відавочных парушэнняў.

Але і ў наступнае дзесяцігоддзе сацыяльная справядлівасць у межах тагачасных уяўленняў і зафіксаваная ў нарматыўных актах даволі часта парушалася. Парушэнні правоў рабочых і служачых, якія знаходзіліся на нізавых прыступках іерархічнай лесвіцы прадпрыемстваў, з’яўляліся хутчэй сістэмай, чым выключэннем з правіл. У той жа час кіраўніцтва прадпрыемстваў, у першую чаргу наменклатурныя работнікі, мелі незаслужаныя з пункту гледжання савецкай маралі прывілеі.

Архіўныя дакументы фіксуюць злачынныя, у тым ліку карупцыйныя праявы практычна ва ўсіх галінах прамысловасці. Адной з самых карумпаваных і злачынных у БССР была мяса-малочная прамысловасць. На прадпрыемствах рэспублікі ў 1956 г. прайшла кампанія абмеркавання пастановы Бюро ЦК КПБ ад 04.10.1956 г. “Аб нездавальняючым стане захаванасці сацыялістычнай уласнасці на прадпрыемствах Міністэрства мясных і малочных прадуктаў Беларускай ССР”. Рэвізіі на прадпрыемствах выявілі шматлікія парушэнні, злоўжыванні і злачынствы. Так, толькі ў 1956 г. рэвізіі на прадпрыемствах Гродзенскага абласнога трэста масларобча-сыраробчай прамысловасці выявілі крадзяжоў на суму 57 769 руб.[2] Карумпаванасць кадраў заставалася сістэмнай праблемай у мясной і малочнай прамысловасці. 26.12.1961 г. ЦК КПБ прыняў адмысловую пастанову “Аб мерах па прадухіленні крадзяжоў у сістэме мясной і малочнай прамысловасці СНК БССР”. Шматлікасць падобных пастаноў

---

[1] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат. С. 15.

[2] Письмо Гроденского областного треста Маслодельно-сыродельной промышленности от 9 февраля 1957 г. “О ходе выполнения постановления Бюро ЦК КПБ от 4 октября 1956 г. “О неудовлетворительном состоянии сохранности социалистической собственности на предприятиях Министерства мясных и молочных продуктов Белорусской ССР” // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 18. Спр. 250. Арк. 7.

паказвае на тое, што праблема насіла сістэмны характар, а кампаніі па навядзенні парадку не дасягалі доўгачасовага выніку.

По звестках Магілёўскага абкама партыі, на Магілёўскім і Бабруйскім мясакамбінатах, Крычаўскім птушкакамбінаце "меліся сур'ёзныя недахопы ў справе захаванасці сацыялістычнай уласнасці." Толькі на Магілёўскім мясакамбінаце на працягу 1956 г. было выяўлена 80 выпадкаў крадзяжоў мясапрадуктаў. У выніку, 16 чалавек было прыцягнута да крымінальнай адказнасці, 15 – звольнена, а на астатніх былі ўскладзены адміністрацыйныя спагнанні.[1]

Падобнай была сітуацыя і на іншых прадпрыемствах гэтай галіны прамысловасці. На прадпрыемствах праводзілася прафілактычная работа, рэгулярна праходзілі сустрэчы з прадстаўнікамі праваахоўчых органаў, лекцыі, партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія сходы, на якіх абмяркоўваліся пытанні захавання сацыялістычнай уласнасці, перадухілення злачыннасці ў гэтай сферы. Архіўныя дадзеныя не дазваляюць дакладна вызначыць долю карупцыйнага складніка ў агульнай злачыннасці на гэтых прадпрыемствах, адрозніць звычайныя крадзяжы ад злачынстваў з выкарыстаннем службовага становішча. Але тое, што частка крадзяжоў можа быць аднесена да карупцыі, пацвярджаецца архіўнымі дакументамі.

Увага да стану захаванасці сацыялістычнай уласнасці на прадпрыемствах іншых галін народнай гаспадаркі выявіла шматлікія парушэнні і нездавальняючую сістэму яе аховы. Карупцыйная сітуацыя на прамысловых, сельскагаспадарчых, гандлёвых прадпрыемствах настойліва патрабавала сістэмных мерапрыемстваў па яе выпраўленні. У выніку, Савет Міністраў БССР 29.10.1956 г. прыняў пастанову "Аб сур'ёзных недахопах у працы міністэрстваў і ведамстваў па забеспячэнні захаванасці сацыялістычнай уласнасці".

Выконваючы дырэктывы вышэйстаячых органаў, выканаўчы камітэт Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных 01.06.1957 г. зацвердзіў рашэнне "Аб сур'ёзных недахопах у працы па захаванасці сацыялістычнай уласнасці". Найперш у дакуменце канстатавалі нездавальняючае выкананне пастановы Савета Міністраў БССР ад 29.10.1956 г. у працы па забеспячэнні захаванасці сацыялістычнай уласнасці. Толькі за 1956 г. у Віцебскай вобласці было выяўлена растрат і крадзяжоў па сістэме дзяржгандлю 78 тыс. руб., спажывецкай кааперацыі 945 тыс. руб., прамысловай кааперацыі 159 тыс. руб., мясцовай і паліўнай прамысловасці 108 тыс. руб., прадпрыемствах харчовых тавараў 81 тыс. руб. і г. д.[2]

Асноўнай прычынай растрат і крадзяжоў была названа кадравая праблема – прызначэнне на матэрыяльна адказныя пасады людзей з крымінальным мінулым, судзімых за падобныя злачынствы, скампраметаваных

[1] Докладная заведующего промышленно-транспортным отделом Могилёвского ОК КПБ «О выполнении постановления Бюро ЦК КПБ от 4 октября 1956 г. "О неудовлетворительном состоянии сохранности социалистической собственности на предприятиях Министерства мясных и молочных продуктов Белорусской ССР" // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 18. Спр. 250. Арк. 11-14.

[2] Решение Исполнительного комитета Витебского областного Совета депутатов трудящихся от 1. 06. 1957 г. «О серьезных недостатках в работе по сохранности социалистической собственности» // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 169. Арк. 12-14.

сябе нячэснымі адносінамі да сацыялістычнай уласнасці. Другой прычынай быў названы слабы кантроль за работай матэрыяльна адказных работнікаў, няякасныя, несвоечасовыя і павярхоўныя праверкі, інвентарызацыі, рэвізіі. Былі выяўлены і тэхнічныя ўмовы, якія спрыялі магчымасці гэтых парушэнняў і злачынстваў:

Рашэнне выканкама абавязала ў двухтыднёвы тэрмін разгледзець пытанне захаванасці сацыялістычнай уласнасці, навесці парадак у падборы кадраў матэрыяльна адказных асобаў, а найбольш падрабязна пералічваліся меры па паляпшэнні эфектыўнасці правядзення рэвізій, планаваліся і меры паляпшэння аховы ўласнасці.

Праведзеныя праверкі на прадпрыемствах вобласці паказалі больш рэальную карціну эканамічнай злачыннасці і найбольш рызыкоўныя для карупцыі сферы эканомікі. Ужо напрыканцы года на пасяджэнні Выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад 10.12.1957 г. было разгледжана пытанне "Аб нездавальняючым выкананні законаў аб захаванасці сацыялістычнай уласнасці ў сістэме мяса-малочнай прамысловасці вобласці".

Члены аблвыканкама разгледзелі прадстаўленне пракуратуры і паведамленне аблупраўлення міліцыі, канстатавалі, што абласны трэст маслапрама і трэст мясаптушкаперапрацоўчай прамысловасці не прымаюць належных мер па ахове сацыялістычнай уласнасці, што колькасць страт дзяржавы, наадварот, павялічылася. Так, за 9 месяцаў 1956 г. у сістэме маслапрама было зафіксавана 15 выпадкаў растрат і недастач на суму 33 тыс. руб., а за такі самы перыяд 1957 г. было ўжо 37 выпадкаў са стратамі на суму 113 тыс. руб. (рост у 3,4 разы). Асабліва цяжкая сітуацыя склалася на Полацкім мясакамбінаце і Аршанскім мясакансервным камбінатах. Па трэсту за 1957 г. былі "абрэвізаваны" толькі 12 з 24 малаказаводаў, а матэрыялы па выяўленых недастачах не перадаваліся ў следчыя органы. Зноў была звернута ўвага на нездавальняючы кантроль і недастатковыя меры па падборы і выхаванні кадраў. Рашэнне прадпісвала ўзмацненне кантролю і барацьбы з раскрадальнікамі сацыялістычнай уласнасці, выкараненне прычын злачыннасці[1].

У студзені 1958 г. на бюро Гомельскага абкама КПБ разглядаліся "няправільныя паводзіны" дырэктара Гомельскага мясакамбіната, які незаконна атрымоўваў прэміі, атрымаў дазвол на набыццё легкавога аўтамабіля ў асабістае карыстанне па заніжанаму кошту, дапускаў у сваёй працы факты "очкаўціраццельства" і грубыя нетактоўныя паводзіны да ІТР, калгаснікаў, здатчыкаў скату, спрабаваў схіліць да пазашлюбных сувязей ветурачэй і г. д.[2]

Падобныя факты станавіліся дастаткова тыповымі. Бюро Гомельскага абкама КПБ 12.12.1959 г. зноў разглядала пытанне стану і паляпшэння работы з

[1] Решение Исполнительного комитета Витебского областного Совета депутатов трудящихся от 10.12.1957 г. «О неудовлетворительном исполнении законов об сохранности социалистической собственности в системе мясомолочной промышленности области» // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 169. Арк. 239-241.
[2] Протокол № 54 заседания бюро Гомельского обкома КП Белоруссии от 15 января 1958 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 236. Арк. 18, 91.

кадрамі ў сістэме абласнога мясакамбіната. У выніку абмеркавання праца па падборы і расстаноўцы кадраў была прызнана нездавальняючай. З 35 кіраўнікоў прадпрыемстваў, саўгасаў і кіраўнікоў раённых кантор толькі чатыры мелі сярэднетэхнічную або незавершаную вышэйшую адукацыю, толькі восем з іх вучыліся завочна. Трэст не меў рэзерву кадраў, не прадпрымаў мер да замацавання маладых спецыялістаў на рабочых месцах. Нязжытай аказалася практыка прызначэння на матэрыяльна адказныя пасады асоб, у мінулым судзімых, якія мелі спагнанні за недастачы, растраты і крадзяжы. Толькі ў гэтым годзе было выяўлена растрат на суму 291 тыс. руб.[1]

У жніўні 1959 г. былі прыняты меры па навядзенні парадку ў прэміраванні кіраўнікоў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых. Рэалізацыя пастановы дала пэўныя станоўчыя вынікі, знізілася колькасць выяўленых фактаў відавочных парушэнняў.

ЦК КПБ 26.12.1961 г. прыняў спецыяльную пастанову ад "Аб мерах прадухілення крадзяжоў у сістэме мяса-малочнай прамысловасці СНГ БССР". Пытанне было абмеркавана на пасяджэннях абласных, гарадскіх і раённых партыйных органаў. Аб яе выкананні далажылі ўсе абласныя партыйныя камітэты. На прадпрыемствах былі створаны партыйныя камітэты па кантролю над гаспадарчай дзейнасцю адміністрацыі, саветы па ахове сацыялістычнай уласнасці.

Гомельскі абласны камітэт каммуністычнай партыі далажыў аб вызваленні ад працы чатырох кіраўнікоў гэтай галіны вытворчасці. У наменклатуру абкама партыі былі ўведзены пасады 6 дырэктараў і 3 галоўныя інжынеры падобных прадпрыемстваў. У выніку праведзенай працы колькасць крадзяжоў зменшылася[2].

Не менш праблемнай, чым мяса-малочная, як па вытворчых паказчыках, так і па стану злачыннасці і колькасці злоўжыванняў, была ў той час харчовая прамысловасць. Аб няпростым стане гэтай галіны сведчыць даведка аб рабоце з кадрамі Ўпраўлення харчовай прамысловасці за 1958 г.[3] Перабудова кіравання прамысловасцю "ў святле рашэнняў партыі і ўраду" прывяла да ліквідацыі трэстаў, утварэння новых упраўленняў, перадачы значнай частцы прадпрыемстваў у падпарадкаванне мясцовай прамысловасці. У выніку, колькасць прамысловых прадпрыемстваў ва ўпраўленні скарацілася з 220 да 42.

На гэтых невялікіх прадпрыемствах была вялізная няўстойлівасць пастаяннага саставу кіраўніцкіх кадраў. За 1956–1958 гг. было зменена 20 дырэктараў і 9 галоўных інжынераў на 42 прадпрыемствах. Толькі 2 дырэктары сышлі па хваробе і 4 – на пенсію, затое 14 былі зняты, як не забяспечыўшыя кіраванне прадпрыемствам, а 3 – за п'янства і маральнае разлажэнне. Плюс на 31 прадпрыемстве, падпарадкаванаму Белрыбтрэсту, змянілася 7 дырэктараў і

---

[1] Протокол № 59 заседания бюро Гомельского обкома КП Белоруссии от 12 декабря 1959 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 295. Арк. 17-19.
[2] Докладная Секретарю ЦККПБ Филимонову Д.Ф. «О выполнении постановления ЦК КПБ от 26 декабря 1961 г. «О мерах предотвращения хищений в системе мясомолочной промышленности СНХ БССР» // Там жа. Спр. 350. Арк. 282-285.
[3] Справка о работе с кадрами за 1958 г. Управления пищевой промышленности СНХ БССР // НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 2502. Арк. 105-127.

9 галоўных інжынераў. Прычынамі замены кіраўніцтва нярэдка былі канфлікты, сваркі і іншыя праблемы ў калектывах, а пры перадачы справаў часцяком выяўляліся нястачы і злоўжыванні. Як адзначана ў даведцы, некаторыя кіраўнікі пераўтварылі свае заводы ў "вотчыны", прадукцыю забіралі ў лік зарплаты або проста "бралі яе для сваіх патрэб" і г. д. Толькі ў 1959 г. за службовыя злачынствы былі зняты з працы 3 дырэктары і 2 галоўныя інжынеры. На Хойніцкім кансервавым заводзе змянілася 6 кіраўнікоў прадпрыемства[1].

Назіраліся факты, калі "праваліўшых работу" работнікаў "перастаўлялі" з месца на месца. На Быхаўскім заводзе для сушкі агародніны за 1956–1959 гг. змянілася 3 дырэктары і 2 галоўныя інжынеры. На ролю дырэктара завода спрабавалі паставіць былога старшыню райвыканкама, старшыню калгаса, але ў выніку, яны "завальвалі працу" і сыходзілі па ўласнаму жаданню[2].

На матэрыяльна адказныя пасады па-ранейшаму прызначаліся асобы без праверкі іх папярэдняй працы. Начальнік забеспячэння гомельскага мясакамбіната пабудаваў сабе дом, набыў аўтамашыну "Пабеда", а папаўся на крадзяжы спірту. Яго ў 1960 г. асудзілі, перавялі на рабочую пасаду і тут жа зволілі па ўласнаму жаданню. Так, і не папрацаваўшы рабочым ніводнага дня, работнік уладкаваўся начальнікам забеспечэння трэста сталовых і рэстаранаў горада[3].

У канцы 1950 гг. былі зроблены меры па ўпарадкаванні ўліку таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў, узмоцнены кантроль за работай прадпрыемстваў і барацьба з раскрадальнікамі сацыялістычнай уласнасці. У 1957 г. падобныя факты раскраданняў былі выяўлены на 17 з 42 прадпрыемстваў харчовай прамысловасці, а ў 1958 г. зафіксавана 99 такіх выпадкаў на 20 прадпрыемствах на суму 1 662 тыс. руб. Так на Хойніцкім кансервавым заводзе раскрадзена маёмасці на 834 тыс. руб., на Быхаўскім заводзе для сушкі агародніны – на 361 тыс. руб.[4]

Рэвізія Буда-Кашалёўскага раённага камбіната мясцовай прамысловасці за 1955 і першую палову 1956 гг. выявіла "велізарную страту" у суме 1 515 811 руб., з якіх толькі недахоп каштоўнасцяў склаў 655 540 руб. 60 кап. Крадзяжы здзяйсняліся на працягу доўгага часу[5]. З дакладной следчага Гомельскай абласной пракуратуры ў ЦК КПБ і рашэння Выканаўчага камітэта Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў працоўных вынікае, што раскраданне

[1] Справка о работе с кадрами за 1958 г. Управления пищевой промышленности СНХ БССР // НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 2502. Арк. 110-111.
[2] Справка о работе с кадрами за 1958 г. Управления пищевой промышленности СНХ БССР // Там жа. Арк. 110.
[3] Справка о работе с кадрами в системе Управления мясо-молочной промышленности СНГ БССР за 1960 г. // Там жа. Спр. 2508. Арк. 138.
[4] Справка о работе с кадрами за 1958 г. Управления пищевой промышленности СНХ БССР // Там жа. Спр. 2502. Арк. 126.
[5] Докладная 23 октября 1956 г. "О результатах ревизии финансово-хозяйственной деятельности Буда-Кошелевского районного комбината местной промышленности за 1955-1/2 1956 г." // Там жа. Воп. 18. Спр. 250. Арк. 127-129.

сыравіны, паўфабрыкатаў і прадукцыі адбываліся сістэмна на працягу 1954–1956 гг., у тым ліку ў выніку “няправільнага вядзення касавай дысцыпліны”[1].

Злоўжыванні розных памераў адбываліся не толькі ў мяса-малочнай, харчовай, мясцовай, але і практычна ва ўсіх іншых галінах прамысловасці, на многіх прамысловых, сельскагаспадарчых і транспартных прадпрыемствах. А вось выкрываліся яны часцяком толькі тады, калі кіраўнік прадпрыемства ўступаў у канфлікт з мясцовымі органамі ўлады, перш-наперш з партыйнымі функцыянерамі, або калі адбывалася надзвычайная сітуацыя ці пачыналася чарговая кампанія па выкрыцці недахопаў, на якія ўказвала чарговая партыйная пастанова.

Так, у партыйных арганізацыях г. Крычава выспела меркаванне аб неабходнасці смяшчэння начальніка Крычаўскай аўтатранспартнай канторы. У віну яму ставілася адсутнасць рэагавання на скаргі насельніцтва і ўказанні райкома партыі, няправільныя паводзіны ў адносінах да кліентаў і падначаленых, “грубасць і вульгарнасць у абыходжанні”, звальненне за 1956 г. 105 з 350 работнікаў, 210 адміністрацыйных выгавараў за год, 25 выгавараў у адным загадзе і г. д. Супраць гэтага рашэння выступалі прадстаўнікі профільнага Міністэрства. У выніку, у даведцы партыйнага органа аб дзейнасці начальніка канторы апісваецца не толькі стыль кіравання кіраўніка, але і выкарыстанне ім свайго службовага становішча ў асабістых мэтах, указваецца на незаконнае атрыманне начальнікам канторы 350 лістоў шыферу[2].

Важную ролю да прыцягвання ўвагі партыйных, савецкіх, прафсаюзных органаў да кантролю над адміністрацыяй прамысловых прадпрыемстваў, найлепшай расстаноўцы і падрыхтоўцы кадраў мела выкананне пастановы Бюро ЦК КПБ ад 08.07.1961 г. “Аб рабоце з кадрамі ў сістэме Саўнаргаса БССР” і пастановы СНГ БССР ад 31.07.1961 г. “Аб рабоце з кадрамі ў сістэме Саўнаргаса БССР”. Пытанне кадравай палітыкі некалькі гадоў было пад кантролем вышэйстаячых галіновых і мясцовых партыйных органаў. Прадпрыемствы, прамысловыя аб’яднанні, упраўленні і міністэрствы дакладалі ад ходзе выканання пастановы. Увага ў першую чаргу прыцягвалася да якаснага паляпшэння кадравага патэнцыялу, у тым ліку не запэцканага карупцыйнымі праяўленнямі.

Кантроль Упраўлення мяса-малочнай прамысловасцю пры Саўнаргасе БССР за расстаноўкай і падрыхтоўкай кадраў фармальна некалькі палепшыў сітуацыю ў гэтай галіне. Тым не менш, як прызнавалі ва ўпраўленні, на прадпрыемствах яшчэ назіралася вялікая колькасць крадзяжоў і недастачаў. У 1961 г. было ўскрыта 643 выпадкі з крадзяжамі на суму 154 тыс. руб. (новымі грашыма). На матэрыяльна адказныя пасады Баранавіцкага і Магілёўскага мясакамбінатаў пранiклі жулікі. Так, “у выніку страты пачуцця адказнасці з

[1] Докладная следователя Гомельской областной прокуратуры Мироненко секретарю ЦК КПБ тов. Золову А. И. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 18. Спр. 250. Арк. 135-137; Решение № 234 от 15 августа 1956 г. Исполнительного комитета Буда-Кошелевского районного совета депутатов трудящихся “О хозяйственной и финансовой деятельности Буда-Кошелевского районного комбината местной промышленности по балансу на 1 июля 1956 г.” // Там жа. Арк. 150-151.
[2] Справка Кричевского РК КПБ “О неудовлетворительной работе Кричевской автотранспортной конторы и ее начальника т. Божко”. 6 февраля 1957 г. // Там жа. Спр. 256. Арк. 10.

боку былога ўпраўляючага Магілёўскага мясакамбіната” на матэрыяльна адказных пасадах працавалі нават раней судзімыя асобы. На Гомельскім мясакамбінаце работнік аддзела кадраў падбіраў кадры па “прыяцельскіх адносінах”. Выкрыццё злачыннай сістэмы прывяло да прыцягнення да крымінальнай адказнасці 13 чалавек, 77 – было адхілена ад працы, 5 – паніжана ў пасадзе, 161 – прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці[1].

Упраўленне харчовай прамысловасцю пры Саўнаргасе таксама рапартавала аб мерах па паляпшэнні работы з кадрамі. Адной з мер было вызваленне ад пасады 7 дырэктараў “адсталых” прадпрыемстваў і іншых спецыялістаў, у тым ліку “за п’янкі і побытавае разлажэнне” зволілі 7 галоўных бухгалтароў. Па ўпраўленні было адрэвізавана 64 прадпрыемствы. Калі ў 1958 г. крадзяжы і недастачы склалі 251 тыс. руб новымі грашыма, то за 9 месяцаў 1961 г. толькі 18 тыс. руб. Але па-ранейшаму на матэрыяльна адказныя пасады прызначаліся людзі з “плямамі” ў біяграфіях. На Бабруйскім маслабойным заводзе загадчыкам склада працаваў раней выключаны з партыі за “дрэнныя справы” работнік. У выніку, скрадзена было звыш 100 тон ільносемені. І такіх прыкладаў у дакуменце прыводзіцца некалькі[2].

У 1962 г. быў вызвалены ад пасады дырэктар Гомельскай птушкафабрыкі, які, як было высветлена, карыстаючыся службовым становішчам, груба парушаў прынцыпы падбору і расстаноўкі кадраў, пры прызначэнні асоб на матэрыяльна-адказныя пасады кіраваўся асабістымі прыяцельскімі адносінамі і сваяцкімі сувязямі. З яго ведама здзяйсняўся продаж мяса на тэрыторыі камбіната. Работнікам аблмясатрэста было прададзена 297 кг мясных прадуктаў. Адпаведна дакладной Гомельскага абкама партыі, у выніку разбору справы ў наменклатуру абкама партыі былі ўведзены пасады шасці дырэктароў і трох галоўных інжынераў падобных прадпрыемстваў. Пытанне было абмеркавана на пасяджэннях гарадскіх і раённых партыйных органаў. У гэты жа час быў вызвалены ад пасады начальнік халадзільніка Гомельскага мясакамбіната. А ўсяго абкам валодаў інфармацыяй аб чатырох вызваленых ад працы кіраўніках гэтай галіны вытворчасці. На прадпрыемствах былі створаны партыйныя камітэты па кантролю над гаспадарчай дзейнасцю адміністрацыі, саветы па ахове сацыялістычнай уласнасці. У ЦК кампартыі Беларусі было дакладзена, што ў выніку праведзенай працы колькасць крадзяжоў зменшылася. На Гомельскім мясакамбінаце іх было ў 1962 г. зафіксавана на 40 % менш, чым у папярэдні год[3].

Выяўленне карупцыі і злачынстваў на прадпрыемствах і ўстановах нярэдка насіла выпадковы характар. Сістэматычнае невыкананне планавых паказчыкаў ці надзвычайныя здарэнні на прадпрыемствах, аварыі і іншыя аказіі

---

[1] Отчет о работе с кадрами за 1961 год по Управлению мясо-молочной промышленности Совнархоза БССР // НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 2512. Арк. 120-122.

[2] Справка Управления пищевой промышленности о выполнении постановления Бюро ЦК КПБ от 8 июля 1961 г. “О работе с кадрами в системе Совнархоза БССР” и постановления СНГ БССР от 31 июля 1961 г. “О работе с кадрами в системе Совнархоза БССР” по сотоянию на 15.12.1961 г. // Там жа. Спр. 2521. Арк. 94-96, 89-125.

[3] Докладная Секретарю ЦККПБ Филимонову Д.Ф. «О выполнении постановления ЦК КПБ от 26 декабря 1961 г. «О мерах предотвращения хищений в системе мясомолочной промышленности СНХ БССР». // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 350. Арк. 282-285.

прыводзілі да больш уважлівых праверак дзейнасці адміністрацыі прадпрыемстваў, а затым нярэдка выяўлялі карупцыйныя злоўжыванні. Так, злоўжыванні службовым становішчам і злачынствы былі зафіксаваны і на заводах машынабудавання.

Канфлікт у калектыве Віцебскага завода радыёдэталяў выклікаў праверкі, якія, як звычайна, знайшлі карупцыйныя складнікі ў дзейнасці адміністрацыі, ці на мове таго часу – "злоўжыванне службовым становішчам". У 1961 г. Бюро Віцебскага абкама партыі разгледзела пытанне "Аб няправільных паводзінах кіраўнікоў Віцебскага завода радыёдэталяў". "За злоўжыванне службовым становішчам, грубыя адносіны да падначаленых, адрыў ад калектыву" дырэктара завода П. Д. Іванова знялі з пасады.[1] Такіх прыкладаў дастаткова, каб сцвярджаць, што не толькі абмежаванасць рэсурсаў спрыяла нараджэнню канфліктаў на вытворчасці, але і структура кіравання і кантролю.

Яшчэ ў канцы 1950 гг. стала відавочным, што кіраўніцтва партыйных, дзяржаўных органаў, прамысловых прадпрыемстваў ва многім страціла зваротную сувязь з нізавымі работнікамі. Пастанова ЦК КПСС "Аб сур'ёзных недахопах у разглядзе лістоў, скаргаў і заяў працоўных" ад 02.08.1958 г. канстатавала, што значна вырасла колькасць зваротаў працоўных у мясцовыя і цэнтральныя органы, якія пранікнуты "клопатам пра росквіт савецкай дзяржавы", у якіх ускрываюцца недахопы, крытыкуюцца кіраўнікі, прапануюцца меры па паляпшэнні работы і г. д. Было адзначана, што да разгляду скаргаў і прапаноў працоўных на месцах нярэдка адносяцца фармальна, бюракратычна, павярхоўна, не прыдаюць гэтай працы належнага "палітычнага значэння". У пастанове адзначана нездавальняючая праца па прыёму грамадзян, указана, што да выяўленых фактаў нярэдка адносяцца "ліберальна", не тлумачаць грамадзянам заканадаўства, што толькі павялічвае паток лістоў. Былі прадугледжаны канкрэтныя меры па навядзенні парадку[2].

Трэба адзначыць, што ў БССР увага да скаргаў і прапаноў грамадзян пасля пастановы ЦК КПСС павялічылася. Пытанне было пастаўлена пад кантроль. Так, па Упраўленню харчовай прамысловасцю пры Саўнаргасе БССР за 9 месяцаў 1961 г. паступіла 486 скарг і лістоў: на незаконнае звальненне, незабеспячэнне жылплошчай, ненармальныя ўзаемаадносіны паміж асобнымі кіраўнікамі і рабочымі. Большасць фактаў і праблем, якія прыводзілася ў лістах, пацвердзілася. Пры праверках былі выяўлены злоўжыванні кіраўнікоў прадпрыемстваў не толькі ўсходняй, але і іншых рэгіёнаў Беларусі: на Урэчанскім спіртовым заводзе, Гальшанскім крухмальным заводзе, на Баранавіцкай макароннай фабрыцы, Кобрынскім кансервавым заводзе і г. д.[3]

---

[1] Информация Витебского ОК КПБ о выполнении постановления Бюро ЦК КПБ от 8 июля 1961 г. «О работе с кадрами в системе Совнархоза». 30 декабря 1961 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 18. Спр. 300. Арк. 1.

[2] Постановление ЦК КПСС "О серьезных недостатках в рассмотрении писем, жалоб и заявлений трудящихся". 2 августа 1958 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 251-255.

[3] Справка Управления пищевой промышленности о выполнении постановления Бюро ЦК КПБ от 8 июля 1961 г. «О работе с кадрами в системе Совнархоза БССР» и постановления СНГ БССР от 31 июля 1961 г. «О работе с

Нягледзячы на шматлікія пастановы і рашэнні, накіраваныя на захаванасць сацыялістычнай уласнасці, перадухіленне злачыннасці, выкананне нормаў сацыяльнай справядлівасці на прадпрыемствах сітуацыя мянялася да лепшага вельмі павольна і ў 1960 гг. Так, у даведцы аб выкананні распараджэння СНГ БССР № 1060-р ад 13.08.1963 г. "Аб стане работы з кадрамі ў сістэме мясной прамысловасці" на Магілёўскім мясакамбінаце, Крычаўскім птушкакамбінаце, Магілёўскім клеявым заводзе выяўлены шматлікія парушэнні і недахопы. У даведцы прама ўказваецца, што падбор кадраў на матэрыяльна-адказныя пасады на Магілёўскім мясакамбінаце здзяйсняецца "несур'ёзна", пры прыёме на працу вераць работніку на слова, ні на аднаго работніка няма характарыстыкі з апошняга месца працы. Пры такой пастаноўцы работы на камбінат пранікалі выпадковыя людзі і асобы, якія "не выклікалі даверу". Не дзіўна, што толькі ў 1963 г. дырэктар абвясціў загадам 282 вымовы (44 % работнікаў), з іх 121 за крадзяжы мясапрадуктаў. Амаль усе майстры, начальнікі цэхоў, кладаўшчыкі мелі адміністрацыйныя спагнанні, а некаторыя з іх – па некалькі разоў. За 1962 г. было зафіксавана 209 выпадкаў крадзяжоў мясных прадуктаў з агульнай вагой 927,4 кг, а ў 1963 г. – 299 выпадкаў з вагой 1 565 кг. Інвентарызацыя выявіла на 1 студзеня 1964 г. па халадзільніку № 2 недастачу 26 450 кг мясных прадуктаў на суму 35 115 руб. і лішак прадукцыі 19 538 кг на суму 27 112 руб.[1]

Упраўленне мясной прамысловасці пачало больш крытычна ацэньваць дзейнасць прадпрыемстваў. За 1963 г. работа 21 з 31 прадпрыемства прызнана нездавальняючай. З мэтай "узмацнення кантролю за захаваннем сацыялістычнай уласнасці і закрыцця шляхоў крадзяжоў" Упраўленне павысіла нормы выхаду мясных прадуктаў пры перапрацоўцы ската, перагледзела ў бок зніжэння нормы страты мясапрадуктаў пры захоўванні і тэрмічнай апрацоўцы і прыняла іншыя меры. Тым не менш, крадзяжы прадукцыі парцягваліся на многіх прадпрыемствах. Сярод іншага было адзначана, што "нягледзячы на тое, што Магілёўскі мясакамбінат апошнія гады займае ўсе рэспубліканскія органы, стан спраў на ім змяняецца ў лепшы бок вельмі павольна"[2].

Хаця афіцыйная гісторыя Магілёўскага мясакамбіната сарамліва абыходзіла пытанні злачыннасці на прадпрыемстве, але яго калектыў у канцы 1950–1960 гг. стаў сімвалам бязладдзя і злачыннасці ў мяса-малочнай прамысловасці БССР. Толькі напрыканцы 1960 гг. намаганнямі ўсёй рэспублікі на камбінаце былі ўсталяваны новыя тэхналагічныя лініі, пабудаваны новы халадзільнік на 2 300 т аднаразовага захоўвання, новы скура-прасолачны цэх, прыняты ў эксплуатацыю адміністрацыйна-побытавы корпус, пачата будаўніцтва каўбаснага цэха. Калектыў змог некалькі разоў вылучыцца ў сацыялістычным спаборніцтве і ,у выніку, у лютым 1971 г. быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Тым не менш, нават у перыяд росквіту

---

кадрами в системе Совнархоза БССР» по сотоянию на 15.12.1961 г. // НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 2521. Арк. 98-99, 89-125.

[1] Справка о выполнению распоряжения СНХ БССР №1060-р от 13 августа 1963 г. "О состоянии работы с кадрами в системе мясной промышленности" на Могилевском мясокомбинате, Кричевском птицекомбинате, Могилевском клеевом заводе. // НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 2509. Арк. 252-261.

[2] Там жа. Арк. 225-227.

на прадпрыемстве назіралася “небяспечная тэндэнцыя – учасціліся выпадкі крадзяжоў”[1].

Сітуацыя са зваротамі работнікаў, іх скаргамі сістэмна не паляпшалася, нягледзячы на шматлікія пастановы і кантроль партыйных і дзяржаўных органаў. З гэтай прычыны ў красавіку 1963 г. на прыкладзе ташкенцкай гарадской партыйнай арганзацыі ЦК КПСС разглядаў ідэйна-выхаваўчую працу з кіраўніцкімі кадрамі. Было зноў канстатавана, што асобныя кіраўнікі метад пераканання і арганізацыі мас падмяняюць грубым адміністрыраваннем, не клапоцяцца аб задавальненні патрэб насельніцтва, нядбайныя адносіны да скаргаў, крытычных заўваг і прапаноў, ухіляюцца ад сустрэч з падначаленымі, дапушчаюць грубасць і ганарыстасць у адносінах да працоўных[2]. Падобную сітуацыю ЦК КПСС у больш мяккай форме адзначыў у трэсце № 3 на будаўніцтве Салігорскіх калійных камбінатаў[3].

Лісты працоўных лічыліся адной з форм умацавання і пашырэння сувязі партыі і народа. У жніўні 1967 г. а ЦК КПСС прыняў чарговую пастанову "Аб паляпшэнні работы па разгляду лістоў і арганізацыі прыёму працоўных”. Яе прыняцце было выклікана тым, што стан работы з лістамі працоўных не адпавядаў патрабаванням партыі. У пастанове адзначана, што многія партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і гаспадарчыя органы “не аналізуюць сутнасць і характар лістоў, не прымаюць дзейных мер па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія іх выклікаюць…” Няўважлівыя адносіны да законных патрабаванняў вызываюць незадавальненне аўтараў лістоў. Кіраўнікі прадпрыемстваў і ведамстваў не заўжды прымаюць непасрэдны ўдзел у іх разглядзе, не ва ўсіх прадпрыемсвах ёсць парадак прыёму наведвальнікаў. Тэрміны адказаў на звароты часцяком былі вельмі доўгія. ЦК патрабаваў стварэння атмасферы аб’ектыўных, прынцыповых адносін да прапаноў і просьбаў працоўных, нецярпімасці да любых праяў фармалізму. Быў усталяваны месячны тэрмін разгляду большасці лістоў працоўных. Асаблівая ўвага была звернута на паўторныя звароты і іх прычыны. Было прызнана правільным, каб пытаннямі прыёму працоўных займаліся кіраўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў[4]. Праверкі і разгляд гэтых пытанняў зноўку на нейкі час палепшылі працу з лістамі, зваротамі і скаргамі.

Для барацьбы са злачыннасцю ў населеных пунктах і на прадпрыемствах кіраўніцтва СССР у канцы 1950 гг. вырашыла шырэй далучыць грамадскасць. У сувязі са спробамі актывізацыі грамадскага жыцця напрыканцы 1950-х гг. на прамысловых прадпрыемствах БССР узніклі добраахвотныя народныя дружыны, якія падтрымлівалі дзейнасць праваахоўных органаў. Падобныя

[1] Сидоренко Б.И. Могилевский мясокомбинат (исторический очерк). Могилев, 2000. С. 46–49.

[2] Постановление ЦК КПСС “Об идейно-воспитательной работе с руководящими кадрами в ташкентскай гарадской партийной арганизации”. 9 апреля 1963 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 319.

[3] Постановление ЦК КПСС “О работе парткома трэста № 3 на строительстве солигорских калийных комбинатов Белорусской ССР”. 2 июля 1963 г. // Там жа. С. 371.

[4] Постановление ЦК КПСС “Об улучшении работы по рассмотрению писем и организации приема трудящихся”. 29 августа 1967 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 266–269.

дружыны існавалі ў царскай Расіі напярэдадні Першай сусветнай вайны, а ў гады рэвалюцыі 1917 г. былі сфарміраваны рабоча-сялянскія дружыны, якія сыгралі важную ролю ў Кастрычніцкім перавароце. У часы кіравання краінай Сталіна іх роля напачатку зменшылася, а потым і дзейнасць фактычна сышла на нішто. І толькі ў часы кіравання СССР Хрушчовым аб старой ідэі зноў узгадалі.

Звязана гэта было з пэўнай лібералізацыяй крымінальнага заканадаўства СССР у 1958 г. Многія крымінальныя пакаранні сталі мякчэйшымі, а некаторыя адменены, у абвінавачаных з’явіліся дадатковыя працэсуальныя магчымасці. Саступкі палохалі саміх аўтараў новаўвядзенняў і рэгіянальныя эліты, якія не былі ўпэўнены ў наступствах такой лібералізацыі заканадаўства, баяліся рэзкага росту рухомасці кадраў на прамысловых прадпрыемствах і росту злачыннасці. Каб пазбегнуць гэтага, былі арганізаваны прэвентыўныя меры грамадскага кантролю. На XXI з’ездзе КПСС у 1958 г. было агучана аднаўленне дзейнасці народных дружын, добрахвотных атрадаў міліцыі, а 02.03.1959 г. ЦК КПСС і Савет міністраў СССР зацвердзілі пастанову “Аб удзеле рабочых у падтрымцы грамадскага парадку ў краіне”, які легалізаваў адраджэнне дружын і вызначыў іх задачы, паўнамоцтвы і формы арганізацыі.

Дружыннікі належалі да актыву прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў, былі членамі прафсаюзаў, камсамольцамі, членамі вытворчых грамадскіх арганізацый. Яны не толькі патрулявалі вуліцы, але і змагаліся з п’янствам, падтрымлівалі працоўную дысцыпліну на заводах і фабрыках, Такая актыўнасць заахвочвалася, стымулявалася і магла спрыяць адбору актыўных кадраў.

Народныя дружыны ў часы “адлігі” ствараліся з надзеяй, што яны заменяць рэпрэсіўныя формы кантролю над грамадствам сталінскіх часоў, заснаваных на празмерных пакараннях за самыя малыя правіны. Гэта давала надзею на пераўтварэння жорсткага татлітарнага рэжыму ў больш мяккі аўтарытарны ражым. Дружыны і таварыскія суды, якія прымалі больш мяккія прэвентыўныя меры, былі ў пэўнай ступені сімваламі змякчэння палітычнага ладу ў СССР.

Агульную накіраванасць на ўзмацненне кантролю над кадрамі прамысловасці мела пастанова ЦК КПСС ад 26.06.1959 г. “Аб утварэнні ў першасных партыйных арганізацыях вытворчых і гандлёвых прадпрыемстваў камісій па ажыццяўленні партарганізацыямі права кантролю дзейнасці адміністрацый прадпрыемстваў". У адпаведнасці з гэтай пастановай пры партарганізацыях тэрмінам на адзін год на агульным партыйным сходзе ствараліся падобныя камісіі. З усёй разнастайнасці дзейнасці адміністрацый камісіі маглі быць рознай накіраванасці кантролю: за выкананнем дзяржаўных паставак; асобых экспартных паставак; якасцю прадукцыі; рацыянальным выкарыстаннем транспартных сродкаў; выкананнем планаў унядрэння новай тэхнікі. Аддаваць адміністрацыйныя распараджэнні або адмяняць іх камісіі не

мелі права. Іх галоўнай задачай было выяўленне недахопаў у працы адміністрацыі[1].

На прамысловых прадпрыемствах стваралися камісіі па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі і саветы па ахове сацыялістычнай уласнасці.

Карупцыйныя праявы запэцканых у злачынствах і злоўжыванннях кіраўнікоў і адказных работнікаў вельмі часта, як было бачна і ў прыведзеных вышэй прыкладах, перапляталіся з бяздушнымі адносінамі да жыллёвых і вытворчых патрэб шэраговых работнікаў прадпрыемстваў.

На пленуме ЦК КПСС 1962 г. была ўскрыта і праблема якасці партыйнага, дзяржаўнага і грамадскага кантролю. Было канстатавана, што, нягледзячы на паляпшэнне працы кантрольных органаў, на меры па пераадоленні наступстваў культа асобы іх арганізацыйная структура не цалкам аднаўлена. Органы дзяржкантролю кепска вядуць барацьбу з ашуканствам, крадзяжамі, хабарніцтвам, бюракратызмам, валакітай і інш. адмоўнымі з’явамі. У выніку, было прынята рашэнне аб стварэнні адзінага органа партыйнага і дзяржаўнага кантролю[2].

**Барацьба з бюракратызмам.** Неабходнасць абмежавання ўлады бюракратыі ва ўмовах афіцыйнага дэкларавання ўлады рабочых, калгаснага сялянства разумелася ў вышэйшых эшалонах улады. Нягледзячы на тое, што бюракратыя не прызнавалася асобнай сацыяльнай групай, адной з характарыстычных рысаў 1950–1960 гг. з’яўлялася няспынная барацьба з бюракратызмам. Асабліва гучна такую барацьбу з выявамі бюракратызму дэкларавала партыя і ўрад за часам кіравання краінай М. Хрушчовым.

У адпаведнасці з дырэктывамі ЦК КПСС па ўсіх рэгіёнах СССР пачалі выкараняць бюракратызм і правяраць склад апарату кіравання. Так, у рашэнні Выканаўчага камітэта Полацкага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных ад 17.10.1958 г. “Аб фактах грубых парушэнняў у штатна-каштарыснай дысцыпліне на прадпрыемствах горада і мерах па ўзмацненні кантролю за выдаткаваннем сродкаў на ўтрыманне кіраўнічага апарату” зафіксаваны грубыя парушэнні штатнай дысцыпліны на шэрагу прамысловых прадпрыемстваў г. Полацка. Звышштатнымі адзінкамі аказваліся агенты па забеспячэнні, планавікі, нарміроўшчыкі, работнікі ўліку і вартаўнікі. Асабліва былі вылучаны парушэнні на металафарнітурным заводзе, гарпрамкамбінаце, ліцейна-механічным заводзе. Хаця агульная колькасць парушэнняў і не была надта вялікай (было выяўлена за 1957 г. утрыманне 13,5 звышштатных адзінкі, якім незаконна было выплачана 32,5 тыс. руб, 15 завышаных акладаў і надбавак на суму 7,5 тыс. руб., пераплаты па камандзіроўках і іншых артыкулах на

[1] Постановление ЦК КПСС “Об образовании в первичных партийных организациях производственных и торговых предприятий комиссий по осуществлению парторганизациями права контроля деятельности администраций предприятий”. 26 июня 1959 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 467–472.

[2] Постановление пленума ЦК КПСС “О развитии экономики СССР и перестройке партийного руководство народным хозяйством”. 19-23 ноября 1962 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 288–296.

агульную суму каля 150 тыс. руб.) усім кіраўнікам прадпрыемстваў горада было прадпісана строга трымацца зацверджаных штатаў, а гарфінаддзелу ўзмацніць кантроль за штатна-каштарыснай дысцыплінай на прадпрыемствах[1].

Курс на скарачэнне бюракратычнага апарату, абмежаванне права на займанне вышэйшых партыйных пасад трыма тэрмінамі і г. д. урэшце ва многім і прывёў да аслаблення яго пазіцый і аўтарытэту ў наменклатурных колах. Асабліва насцярожана быў успрыняты курс на ратацыю кадраў і абмежаванне па тэрмінах знаходжання партыйных кіраўнікоў усіх узроўняў на сваіх пасадах, якое было замацавана ў праграме партыі. Яно непасрэдна закранала лёсы як партыйнай, савецкай, так і прамысловай наменклатуры.

"Барацьба з бюракратызмам" шырока разгарнулася і ў органах кіравання прамысловасцю з верхніх да самых ніжніх прыступак прадпрыемстваў і ведамстваў. Неаднаразова самымі рознымі органамі кіравання прымаліся аднатыпныя амаль даслоўныя пастановы "Аб паляпшэнні кантролю за своечасовым выкананнем пастаноў Партыі і Урада і ўзмацненнем барацьбы з праявамі валакіты і бюракратызму ў рэспубліканскіх установах і арганізацыях". Чарговы этап такой кампаніі разгарнуўся ў 1963–1964 гг.

Фактаў валакіты і бюракратызму сапраўды хапала. Так, у пастанове Калегіі рэспубліканскага аб'яднання Савета Міністраў БССР "Сельгастэхніка" калектыўны зварот трактарыстаў і экскаватаршчыкаў Столінскага раённага аддзялення "Сяльгастэхнікі" ад 28.01.1963 г. "аб ненармальнасцях у майстэрнях" у Глаўку рамонту разглядаліся 45 дзён[2].

Вельмі складаная сістэма кіравання насамрэч патрабавала аптымізацыі. Па гэтай прычыне нават пасля змены кіраўніцтва СССР у 1964 г. мерапрыемствы па скарачэнні звеньеў кіравання і колькаснага складу апарату кіравання працягваліся. Знешне нібыта захоўваліся традыцыі "хрушчоўскай адлігі". Праўда, праводзіліся яны цяпер не так настойліва, нібыта па інерцыі і мелі нярэдка фармальны і паказны характар. Па справаздачах барацьба ішла, а насамрэч справа рухалася ледзь-ледзь.

У 1967 г. у Савеце Міністраў БССР разглядаліся чарговыя прапановы па далейшым "удасканаленні, скарачэнні і патаненні" апарату кіравання на 1968 г. У іх адзначалася правядзенне вялікай працы ў справе рэалізацыі пастановы СМ БССР ад 22.12.1966 г. за № 461 па скарачэнні колькасці адміністрацыйна-кіраўнічага, цэхавага/лінейнага персаналу і аховы. Згодна са справаздачамі ў бягучым годдзе ў рэспубліцы скарачалася ў гэтых сферах 6 100 адзінак і змяншаліся выдаткі на іх утрыманне на суму 7 241 тыс руб. Разам з тым колькасць адміністрацыйна-кіраўнічага, цэхавага і лінейнага персаналу з 15.09.1965 г. па 15.09.1966 г. узрасла на 5,8 тыс. чалавек і склала па рэспубліцы 175 тыс. чалавек, а колькасць аховы на 01.01.1966 г. павялічылася на 4,5 тыс. чалавек і склала 30,9 тыс чалавек. Такі рост тлумачыўся ростам народнай

---

[1] Решение Исполнительного комитета Полоцкого городского Совета депутатов трудящихся от 17.10.1958 г. «О фактах грубых нарушений в штатно-сметной дисциплине в предприятиях города и мерах по усилению контроля за расходаванием средств на содержание управленческого аппарата» // ЗДАПол. Ф. 658. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 227-229.

[2] Постановление Коллегии Республиканского объединения Совета Министров БССР «Сельхозтехника» // НАРБ. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 266. Арк. 315.

гаспадаркі і ўводам новых прадпрыемстваў. У прамысловасці на 15 верасня 1966 г. у апараце заводаўпраўленняў і цэхаў прамысловасці рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання (без уліку саюзнага падпарадкавання – аўт.) працавала 21,4 тыс. спецыялістаў, без уліку канструктароў, тэхнолагаў і работнікаў лабараторый, што складала 11,6 % ад агульнай колькасці работнікаў прамысловасці. Штогод на іх выдаткоўвалася звыш 22 млн руб. Такая доля і рост колькасці персаналу прызнаваліся залішнімі і маглі бы быць, на думку складальнікаў прапаноў, меншымі, калі б "не дапускаліся празмернасці".[1] Далей разглядаліся канкрэтныя прыклады такой празмернасці і шляхі аптымізацыі адміністрацыйна-кіраўнічага, цэхавага і лінейнага персаналу.

Табліца 14 – Колькасць работнікаў апарату кіравання гасразліковых прадпрыемстваў і арганізацый Магілёўскай вобласці за 1970 г.[2]

| | Колькасць прадпрыемстваў і арганізацый па вобласці | Сярэднеспісачная колькасць работнікаў апарату кіравання | У тым ліку | |
|---|---|---|---|---|
| | | | У цэхах | Аховы |
| Усяго па вобласці | 740 | 35 774 | 12 988 | 2 799 |
| З іх прамысловых | 230 | 13 655 | 5 943 | 703 |

Як паказала сістэмачычнасць разгляду гэтага пытання, праблема заставалася нявырашанай і ў наступныя дзесяцігоддзі. Дадзеныя аб выдатках на ўтрыманне апарату кіравання гасразліковых прадпрыемстваў і арганізацый Магілёўскай вобласці за 1970 г. адлюстроўваюць сітуацыю на канец даследаванага перыяду (гл. табл. 14, 15).

Пры дастаткова сістэмным кантролі ў канцы 1960 – пачатку 1970 гг. толькі за 1970 г. перавыдатак на апарат кіравання гасразліковымі прамысловымі прадпрыемствамі Магілёўскай вобласці склаў 247,9 тыс. руб. і 17,1 тыс. на камандзіроўкі работнікаў. Лідарамі ў залішнім выдаткаванні сродкаў з'яўляліся Магілёўскі і Бабруйскі мясакамбінаты, заводы: "Строммашына", Ліфтабудаўнічы, Машынабудаўнічы імя Леніна (кожны перавыдаткаваў больш за 20 тыс. руб.). А ўсяго ў спісе фігуравала 48 прадпрыемстваў вобласці[3].

[1] Предложения по дальнейшему совершенствованию, сокращению и удешевлению аппарата управления на 1968 г. // НАРБ. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1910. Арк. 23-24.
[2] Данные о расходах на содержание аппарата управления хозрасчетных предприятий и организаций Могилевской области за 1970 год // ДАМаг. Ф. 2729. Воп. 1. Спр. 3274. Арк. 276-277.
[3] Там жа. Арк. 278-281.

Табліца 15 – Выдаткі на ўтрыманне работнікаў апарату кіравання гасразліковых прадпрыемстваў і арганізацый Магілёўскай вобласці за 1970 г.[1] (тыс. руб.)

| | Па справаздачы | У тым ліку на апарат кіравання | У тым ліку ў цэхах |
|---|---|---|---|
| Усяго па вобласці | 60 252,2 | 54 942,2 | 5 310 |
| З іх прамысловых | 22 509,8 | 20 214,1 | 2 296,7 |

Недахопы камандна-адміністрацыйнай сістэмы гэтай сістэмы падштурхоўвалі партыю і ўрад некалькі разоў праводзіць рэформы і контррэформы, накіраваныя на ўдасканаленне дадзенай сістэмы кіравання эканомікай. Адной з характарыстычных рысаў перыяду з’яўлялася няспынная барацьба з бюракратызмам, мерапрыемствы па скарачэнні звеньяў кіравання і колькаснага складу апарату кіравання. Разам з тым колькасць адміністрацыйна-кіраўнічага, цэхавага і лінейнага персаналу павялічылася ў сувязі з уводам новых прадпрыемстваў. Сістэматычнасць разгляду гэтага пытання паказвае, што праблема заставалася нявырашанай і ў наступныя дзесяцігоддзі.

Такім чынам, у 1944–1970 гг. назіралі карупцыйныя праявы на прамысловых прадпрыемствах усходніх рэгіёнаў БССР. Найбольш відавочна злачыннасць і карупцыя выяўлялася на прадпрыемствах харчовай і мяса-малочнай прамысловасці. Безумоўна, яе памеры нельга параўноўваць з карупцыяй на постсавецкай прасторы сёння. І тым не менш, бюракратычная сістэма кіравання і гаспадарання паказала сваю няздольнасць дабіцца здзяйснення на практыцы абвешчаных нормаў сацыяльнай справядлівасці. Выявіліся шматлікія факты злоўжыванняў кіраўнікамі прадпрыемстваў сваім становішчам пры размеркаванні прэмій, матэрыяльнай дапамогі, кватэр, санаторных пуцёвак і г. д. Парушэнні правоў рабочых і служачых, якія знаходзіліся на нізавых прыступках іерархічнай лесвіцы прадпрыемстваў, з’яўляліся хутчэй сістэмнымі, чым выпадковымі. З мэтай ліквідацыі выяўленых парушэнняў, паляпшэння работы прамысловых прадпрыемстваў з канца 1950 гг. партыйныя і савецкія органы прымалі меры па “рашучым навядзенні парадку” ў кадравай сферы і народнай гаспадарцы БССР. Кантроль заўкомаў заставаўся малаэфектыўным. У той час кіраўніцтва прадпрыемстваў, у першую чаргу наменклатурныя работнікі, мелі незаслужаныя з пункту гледжання савецкай маралі і заканадаўства прывілеі. Адной з характарыстычных рысаў часу кіравання краінай М. Хрушчавым з’яўлялася няспыная барацьба з бюракратызмам. Пасля змены кіраўніцтва краіны ў 1964 г. мерапрыемствы па скарачэнню звеньяў кіравання і колькаснага складу апарату кіравання працягваліся. Разам з тым колькасць адміністрацыйна-кіраўнічага, цэхавага і лінейнага персаналу павялічылася ў сувязі з уводам новых прадпрыемстваў.

[1] Данные о расходах на содержание аппарата управления хозрасчетных предприятий и организаций Могилевской области за 1970 год // ДАМаг. Ф. 2729. Воп. 1. Спр. 3274. Арк. 278-279.

Праблема заставалася нявырашанай і ў наступныя дзесяцігоддзі. Прынятыя меры, барацьба з бюракратызмам, антыкарупцыйныя аспекты кадравай палітыкі, шырокае прыцягненне работнікаў прадпрыемстваў да вырашэння вытворчых пытанняў хаця і насілі кампанейскі характар, але прыносілі кароткатэрміновы эфект. Аднак доўгачасовага станоўчага эфекту на прадпрыемствах усходніх абласцей БССР не назіралася.

## 4.2 Вытворчыя канфлікты на прамысловых прадпрыемствах, спосабы іх урэгулявання і ўплыў на кадравую палітыку ў 1950–1970 гг.

Гістарычныя перадумовы многіх сучасных канфліктаў у постсавецкіх краінах сваімі каранямі сыходзяць у часы існавання СССР. У савецкай гістарыяграфіі сацыяльных канфліктаў на прамысловых прадпрыемствах Савецкага Саюза нібыта не было ды і быць не магло ў сілу агульнанароднага характару ўласнасці на сродкі вытворчасці. Парадаксальна, але ў сваю чаргу такія ўяўленні супярэчылі самім асновам марксісцка-ленінскай тэорыі, якая не толькі абапіралася на гегелеўскую тэорыю антаганістычных і неантаганістычных супярэчнасцяў, дыялектычны закон адзінства і барацьбы супрацьлегласцяў, але менавіта пастаянную барацьбу супрацьлегласцяў лічыла рухавіком развіцця і прагрэсу. Марксізм прапанаваў вельмі дэталёвую канцэпцыю сацыяльных канфліктаў, якія ўласцівы ўсім узроўням сацыяльнага жыцця, а прычынай якіх называў прыватную ўласнасць. Тым не менш, працуючы ў адносінах да капіталістычных краін, пастулат у марксісцкай літаратуры казуістычна абвяргаўся пры разглядзе сацыялістычнай гаспадаркі, дзе рабочыя і кіраўнікі павінны былі ўяўляць адзіную палітычную і вытворчую сілу, якая мела агульную мэту – пабудову камунізму. Нядзіўна, што канфлікты на вытворчасці ў сталінскі час як у палітыцы, так і ў навуцы, і ў мастацтве зводзіліся да супраціўлення былых пануючых класаў, ворагаў народа, а ў паслясталінскі перыяд – да індывідуальнай барацьбы кансерватараў і наватараў.

Пры тым, што агульная канфліктагогія ў свеце паступова развівалася, назваць у беларускай гістарыяграфіі гістарычныя працы, у якіх бы аналізаваліся вытворчыя канфлікты на савецкіх прамысловых прадпрыемствах, вельмі праблематычна да перыяду “перабудовы”. Нашы даследаванні на матэрыялах БССР паказалі наяўнасць шматлікіх вытворчых канфліктаў на беларускіх прамысловых прадпрыемствах, нават забастовачнага руху ў паслясталінскі час. Як сведчаць дакументы, партыйныя і гаспадарчыя органы кіравання спрабавалі рэагаваць на “пагаршэнне дысцыпліны” на прадпрыемствах і ўстановах, на ўсё больш частыя факты карумпаванасці кіраўніцтва прадпрыемстваў, прымалі пастановы і рашэнні, якія павінны былі перадухіляць канфлікты на вытворчасці, вельмі рэдка дазвалялі канфліктным сітуацыям выйсці з-пад

кантролю. Першасная спроба аналізу канфліктаў і спосабаў іх урэгулявання на прамысловых прадпрыемствах была тэзісна прадпрынята намі ў 2018 г.[1]

Ва ўмовах хуткіх тэмпаў індустрыялізацыі і ўрбанізацыі ўзніклі шматлікія дыспрапорцыі, абвастрыліся многія сацыяльныя і вытворчыя праблемы, якія ў другой палове 1950–1960 гг. на прамысловых прадпрыемствах БССР пачалі выяўляцца ў канфліктах: барацьбе кіраўнічых кланаў і прафесійнай груп, працоўных спрэчках і забастоўках рабочых.

Пад канфліктамі традыцыйна разумеюць супрацьстаянне, сутыкненне, супрацьборства інтарэсаў, поглядаў, пазіцый па меншай меры двух бакоў. Вывучэнне гістарычных крыніц паказвае, што на прамысловых прадпрыемствах БССР абмежаванасць рэсурсаў, якія падлягалі размеркаванню, найчасцей выклікала падобнае супрацьстаянне і нават супрацьборства. Прычынамі канфліктных сітуацый на прамысловых прадпрыемствах БССР у другой палове 1950–1960 гг. былі факты карупцыі, зніжэння зарплаты, парушэнні правіл нармавання і ўмоў працы, неэфектыўная сістэма кіравання прадпрыемствамі. Канфлікты найчасцей выяўляліся пры змене сістэм аплаты працы, падзеле прэмій, матэрыяльнай дапамогі, санаторных пуцёвак, кватэр. Паступовае памяншэнне страху сталінскіх рэпрэсій прывяла да павелічэння фактаў злоўжывання кіраўніцтвам прадпрыемстваў сваім службовым становішчам. Ва ўмовах слабога грамадскага кантролю праблема набыла агульнарэспубліканскі характар.

У другой палове 1950–1960 гг. намі ў архівах Беларусі выяўлены шматлікія факты злоўжыванняў кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў сваім службовым становішчам пры размеркаванні прэмій, матэрыяльнай дапамогі, санаторных пуцёвак, кватэр і г. д. Бюракратычная сістэма кіравання і гаспадарання паказала сваю няздольнасць дабіцца здзяйснення на практыцы абвешчаных нормаў сацыяльнай справядлівасці. Кантроль парткамаў і заўкомаў быў неэфектыўным. Рашэнні партыйных органаў другой паловы 1950 гг. стварылі ўмовы для дэмакратызацыі па-савецку, але рабочыя кадры імі скарысталіся нечаканым спосабам: павялічылася колькасць скаргаў, выступленняў, хваляванняў і нават забастовак на прадпрыемствах рэспублікі.

Вытворчыя канфлікты, што нярэдка перарасталі ў барацьбу работнікаў за свае правы, у тым ліку забастоўкі рабочых на прадпрыемствах БССР, сталі адным з важных фактараў, які быў нечаканым для партыйных і гаспадарчых органаў кіравання і меў істотнае значэнне для павышэння ўвагі да кадравай палітыкі ў прамысловасці ў канцы 1950 – першай палове 1960-х гг.

Прычыны стачак былі самыя разнастайныя: сацыяльная несправядлівасць пры размеркаванні прэміяльных фондаў, змены нормаў нармавання на прадпрыемствах, цяжкія, у тым ліку санітарна-гігіенічныя, умовы працы і г. д. У пастановах партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных і іншых органаў кіравання па выніках разгляду фактаў прыпынення рабочымі работы ўсяляк

[1] Агееў А. Р. Вытворчыя канфлікты на прамысловых прадпрыемствах БССР у 1956–1970 гг. Спосабы іх урэгулявання і ўплыў на кадравую палітыку // Итоги научных исследований учёных МГУ имени А. А. Кулешова 2017 г. : материалы научно-исследовательской конференции, 25 января – 8 февраля 2018 г. Могилёв, 2018. С. 4–6.

падкрэслівалася, што прычына забастовак – канкрэтныя памылкі непасрэдных кіраўнікоў прадпрыемстваў, слабая кадравая і грамадска-палітычная работа, а не сістэмныя і сацыяльна-эканамічныя фактары. Кіраўнікі прадпрыемстваў, дзе адбываліся канфлікты, як правіла, мелі адносна лёгкія пакаранні па партыйнай лініі, кіраўнікі партыйных і прафсаюзных арганізацый прадпрыемстваў таксама атрымоўвалі спагнанні, праца ўсіх кіраўнікоў прадпрыемстваў ставілася пад пільны кантроль партыйных органаў на гарадскім і абласным узроўнях.

У лісце ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС аб умацаванні працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах і будоўлях прамысловасці і транспарту, у МТС, саўгасах і ўстановах ад 16.05.1956 г. прызнавалася, што “вырашальную ролю ў барацьбе за высокую дысцыпліну працы прыналежыць эканамічным стымулам, стварэнню добрых вытворчых і культурна-побытавых умоў, што на прадпрыемсвах дапускаюцца сур’ёзныя парушэнні ў нармаванні працы і сістэмы ўсталявання зарабатнай платы, што кіраўнікі некаторых міністэрстваў і прадпрыемстваў не прымаюць мер па стварэнні здаровых і бяспечных умоў працы і побытавых умоў. Зварот вышэйшых органаў СССР звяртаў увагу і на неабходнасць узмацнення выхаваўчай працы партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый, актывізацыю работы таварыскіх судоў, на тое, што на многіх прадпрыемствах кіраўніцтва перабольшвае ролю мерапрыемстваў адміністрацыйнага характару[1].

Пасля прыпынення эпохі масавых рэпрэсій рабочыя і служачыя прамысловасці ўсё часцей сталі рашацца на розныя формы пратэсту і адстойванне сваіх правоў. З канца 1950-х гг. павялічваецца паток скаргаў і заяў у вышэйстаячыя інстанцыі. Пасля адмены сталінскага заканадаўства, якое фактычна замацавала работнікаў за сваімі заводамі і фабрыкамі, пачынаецца хуткі рост рухомасці кадраў, што нярэдка з’яўлялася адной з формаў пасіўнага пратэсту рабочых і служачых. Паступова работнікі прамысловасці пераходзілі да больш актыўных формаў пратэсту.

Пошук матэрыялаў у архівах Беларусі дазволіў знайсці толькі за перыяд 1956–1965 гг. больш за 60 прыкладаў адмовы рабочых ад працы на прамысловых, транспартных прадпрыемствах і будоўлях БССР, якія трапляюць пад вызначэнне забастоўка[2]. Прычым ёсць усе падставы меркаваць, што ў сапраўднасці колькасць такіх выпадкаў была значна вышэйшай, бо прыпыненне працы падрывала аўтарытэт кіраўніцкіх кадраў прамысловасці, партыйных органаў, якія адказвалі за грамадска-палітычную і агітацыйна-масавую работу, і пры магчымасці факты стачак на прадпрыемствах ўсяляк прыхоўваліся, прымяншаліся іх памеры, называлі іншымі словамі.

Мноства пытанняў выклікала сістэма нарміравання і спробы перагляду старых норм выпрацоўкі. Так, сакратару ЦК КПБ Мазураву 02.08.1957 г. была складзена даведка “Аб сур’ёзных недахопах у практыцы правядзення перагляду

[1] Письмо ЦК КПСС, Совета Министров СССР и ВЦСПС «Об укреплении трудовой дисциплины на предприятиях и стройках промышленности и транспорта, в МТС, совхозах и учреждениях». 16 мая 1956 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 9. С. 98–104.
[2] Агеев А. Г. Бастовали ли рабочие до перестройки? // Человек и экономика. 1991. № 5. С. 25–27.

нормаў выпрацоўкі на шэрагу прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі”. У ёй прызнавалася, што ў бягучым годзе мелі месца факты грубага парушэння пастановы Савета міністраў СССР ад 15.08.1956 г. “Аб змяненні парадку перагляду норм выпрацоўкі” і ў пытаннях арганізацыі працы і зарплаты[1].

На Мінскай абутковай фабрыцы ў пяці цэхах былі праведзены арганізацыйна-тэхнічныя мерапрыемствы, але нормы не пераглядаліся на працягу пяці месяцаў. Рост сярэдняй зарплаты апяраджаў рост вытворчасці працы на 5–6 %, што прывяло да адноснага перавыдатку фонду зарплаты на 500 тыс. руб. Толькі асэнсаваўшы гэта, кіраўніцтва прадпрыемства пачало паспешлівую падрыхтоўку да перагляду норм. Без тлумачальнай работы з рабочымі 15.06.1957 г. новыя нормы былі ўведзены. У выніку чаго 19 чэрвеня рабочыя цэха № 3, якія не атрымалі зразумелых адказаў на свае пытанні, у дзевяць гадзін ранку прыпынілі працу і папрасілі кіраўніцтва прадпрыемства даць тлумачэнне. Толькі пасля перамоваў, атрымаўшы абяцанне перагляду загада дырэктара, рабочыя зноўку прыступілі да працы. Аналагічны факт меў месца ў першай і другой зменах цэха № 5. Партбюро прадпрыемства вырашыла адкласці ўвядзенне новых норм. Фрунзенскі райкам толькі 12 ліпеня абмеркаваў здарэнне на пасяджэнні бюро РК, а калегія Міністэрства лёгкай прамысловасці сумесна з БРК прафсаюзаў 29 ліпеня[2].

На заводзе Гомсельмаш новыя нормы не даводзіліся да брыгад, участкаў і асобных рабочых, што выклікала незадаволенасць рабочых зборачнага цэха прадпрыемства, якія 01.07.1957 г. прыпынілі работу галоўнага канвеера завода. Канвеер адстаяў тры змены, і цэх недадаў 150 машын. Толькі пасля правядзення тлумачальнай работы рабочыя на наступны дзень прыступілі да працы і перавыканалі нормы. Ужо 3 ліпеня пытанне было разгледжана на бюро Гомельскага гаркама КПБ. Дырэктару завода Дзянісаву і сакратару парткома Кнерцару былі абвешчаны вымовы, начальніку аддзела працы і заработнай платы Корабаву – строгая вымова[3].

Такія выпадкі не былі адзінкавымі. На бабруйскай фабрыцы імя Дзяржынскага у 1956–1957 гг. нормы пераглядаліся некалькі разоў для ліквідацыі розніцы ў аплаце рабочых розных цахоў, што выклікала справядлівыя пытанні рабочых. У лютым 1957 г. адміністрацыя шарыкападшыбнікавага завода ў цэхах шарыкападшыбнікаў без здзяйснення арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў абвясціла аб ўвядзенні новых норм. У выніку, рабочыя адмовіліся ад працы і шліфоўка калец не праводзілася на працягу двух з паловай сутак[4].

Канфліктныя сітуацыі, факты забастовак на прадпрыемствах здараліся з году ў год, што сведчыць аб тым, што сістэма абароны працоўных правоў чалавека не была адлажана. На многіх прадпрыемствах парушаліся самыя элементарныя правы працоўных. Рабочыя і служачыя часцяком заставаліся

[1] Справка секретарю ЦК КПБ Мазураву «О серьезных недостатках в практике проведения пересмотра норм выработки на ряде промышленных предприятий республики» от 2 августа 1957 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 18. Спр. 256. Арк. 86-92.
[2] Там жа. Арк. 87-88.
[3] Там жа. Арк. 88-89.
[4] Там жа. Арк. 89-90.

неабароненымі перад небесстароннасцю, свавольствам, перадузятасцю і прамымі парушэннямі заканадаўства з боку кіраўніцтва прадпрыемстваў і ўстаноў. Так, у 1958 г. усе работнікі растворнага вузла УНР-45 будтрэста № 10 у Гомелі прыпынілі работу і з'явіліся ў кантору, патрабуючы справядлівай аплаты. Толькі пасля напружаных перамоваў з адміністрацыяй "справядлівыя патрабаванні рабочых" былі задаволены[1].

У той жа час "у выніку несур'ёзных адносін асобных кіраўнікоў прадпрыемстваў да патрабаванняў рабочых і служачых" ствараліся "ненармальныя ўмовы, калі рабочых вымушаюць да парушэння працоўнай дысцыпліны". Так, у цэху № 1 Гомельскага дрэваапрацоўчага камбіната працяглы час аплата за распілоўку рабілася няправільна. У выніку няўвагі да праблемы "стварылася незадаволенасць супраць кіраўніцтва камбіната". Толькі пасля настойлівых патрабаванняў рабочых было дазволена разлічвацца з імі за вырабленыя кубаметры піламатэрыялаў. Падобныя факты "парушэння законапалажэнняў і няправільных адносін да рабочых" у 1958 г. меліся і на шэрагу іншых прадпрыемстваў вобласці. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, кіраўніцтва прадпрыемстваў "слаба праводзіла партыйна-палітычную работу" з працоўнымі[2].

Першыя выўленыя намі на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, як і ў іншых абласцях БССР, забастоўкі адбыліся ў 1957 г. У абласным цэнтры пачынальнікамі забастовачнага руху сталі будаўнікі. Першымі "паслясталінскімі" стачкамі па-савецку сталі падзеі шостага мая і трэцяга-чацвёртага снежня 1957 г. у структурах Будтрэста № 12 г. Магілёва. Шостага мая, у дзень закрыцця нарадаў за мінулы месяц, цэлы дзень не працавалі дзве брыгады муляроў, брыгада цесляроў і два звяна тынкоўшчыкаў Будтрэста. Пытанне разглядалася на пасяджэнні бюро Магілёўскага ГК КПБ ад 23.05.1957 г. Начальнік УНР-906 атрымаў вымову з занясеннем у асабістую справу. Тым не менш, трэцяга – чацвертага снежня 1957 г. грузчыкі будтрэста адмовіліся ад выхаду на працу ў начны час з-за зніжэння заробкаў. У выніку, начальніку пагрузачна-разгрузачных работ паставілі на від, а начальніка канторы забеспячэння папярэдзілі. Загадалі ўвесці практыку правядзення сходаў і вытворчых нарад рабочых і служачых. За канторай замацавалі камуністаў для правядзення размоў, дакладаў на палітычныя і вытворчыя тэмы. Пасля забастоўкі ў 1957–1958 гг. партыйная арганізацыя была на асаблівым кантролі і вымушана была пастаянна дакладваць аб правядзенні масава-палітычнай работы[3].

Наступныя забастоўкі ў Магілёве выяўлены намі ў 1961 г. Рабочыя механічных майстэрань і электрамайстэрні серавугляроднай вытворчасці завода № 511 трэцяга студзеня не працавалі да абеду, а рабочыя рамонтна-механічнага

---

[1] Справка промышленно-транспортного отдела Гомельскогообкома КПБ "О состоянии и мерах по улучшению трудовой дисциплины на промышленных предприятиях, транспорте и строительстве области". 1 декабря 1958 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 247. Арк. 84.

[2] Там жа. Арк. 84-85.

[3] Агееў А. Р. Паслясталінскія забастоўкі савецкіх рабочых у Магілеве і кадравая палітыка КПБ // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зборнік навуковых прац / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. Магілёў, 2017. С. 173–174.

ўчастка № 3 чацвёртага студзеня – увесь дзень. Прычынай прыпынення працы стала пазбаўленне прэміі за снежань без тлумачэнняў з боку адміністрацыі. Пытанне разглядалася на пасяджэнні бюро Магілёўскага ГК КПБ ад 09.02.1961 г. Сакратару партарганізацыі і дырэктару завода было строга ўказана на недахопы ў працы[1].

У наступным 1962 г. бюро Магілёўскага гаркома КПБ ад 20 верасня разглядала адразу два факты адмовы ад працы магілёўскіх рабочых: 27 жніўня шэсць рабочых электраматорнага цэха завода "Электрарухавік" прыпынілі працу з-за невыдадзенага своечасова без тлумачэнняў авансу, а трэцяга верасня 23 рабочыя цэха цесляроў завода Будаўнічых дэталяў – з-за змяншэння расцэнак. У пратаколе ўказваецца, што падобныя з'явы адмовы ад працы на іншых прадпрыемствах назіраліся і раней. Нягледзячы на прынятыя меры, у лістападзе 1962 г. падставай для чарговай размовы на бюро стала адмова ад працы 14 работнікаў Стужкаткацкай фабрыкі[2].

Трэба адзначыць, што праблемы з нармаваннем працы не былі выключна беларускай з'явай. У Кіргізіі ў 1963 г. больш за трэцюю частку норм на прамысловых прадпрыемствах з'яўляліся вопытна-статыстычнымі, а ў машынабудаванні яны складалі палову ўсіх нормаў[3].

У 1966 г. у Магілёве работнікі такарна-рэвальвернага ўчастка механа-зборнага цэха № 1 завода Пад'ёмна-транспартнага абсталявання імя С. Кірава 27 студзеня не прыступілі да працы з-за нязгоды з новымі нормамі выпрацоўкі. Пасля прыходу адміністрацыі і абяцання дырэктара завода разабрацца частка рабочых пачала працаваць, але 23 чалавекі баставалі ўвесь дзень. На бюро абкама КПБ было строга ўказана дырэктару на недахопы ў рабоце. А 25 красавіка 10 работнікаў друкарні імя Свердлава адмовіліся працаваць з-за санітарных умоў працы. Група з 9 наборшчыкаў адмовілася працаваць у другую змену і пайшла дамой з-за рамонту будынка і забруджванні яе асобных участкаў. У першую змену ў будынку праводзіліся малярныя працы і не было прыбрана. Пайшла дамоў член партыі Ханіна – работніца гэтай змены. Сышоў з працы і член партбюро, адначасова старшыня прафсаюзнага мясцовага камітэта Карасёў. Ён, а таксама выконваючы абавязкі дырэктара атрымалі вымовы з занясеннем. Было рэкамендавана "рашыць пытанне аб знаходжанні Карасёва членам прэзідыума абкама прафсаюзаў і старшынёй мясцовага камітэта"[4].

У 1969 г. 67 работнікаў змены № 5 прадзільнага цэха № 2 Магілёўскага завода штучнага валакна імя Куйбышава не працавалі больш за дзве гадзіны з-за нязгоды з эксперыментам па ўкараненні брыгадна-паточнага метаду

---

[1] Агееў А. Р. Паслясталінскія забастоўкі савецкіх рабочых у Магілеве і кадравая палітыка КПБ. С. 174–175.
[2] Там жа. С. 175.
[3] Постановление ЦК КПСС "О работе партийной організации Киргизии по выполнению заданий семилетнего плана в области промышленности, строительства и сельского хозяйства». 9 апреля 1963 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 10. С. 288–296.
[4] Постановление бюро Ленинского райкома КПБ г. Магілёва ад 29. 04. 1966 г. "О самовольном уходе с работы группы рабочих типографии им. Свердлова" // ДАГАМаг. Ф. 6009. Воп. 4. Спр. 24. Арк. 107-108.

абслугоўвання машын. Толькі пасля адмены эксперымента, якое паабяцаў асабіста дырэктар, рабочыя прыступілі да працы[1].

На прадпрыемствах Магілёва па нашых падліках рабочыя за 1956–1970 гг. як мінімум 10 разоў адмаўляліся ад працы. Для прыкладу: рабочыя Бабруйска прыпынялі працу і выстаўлялі свае патрабаванні восем разоў, Крычава – тры разы, што адпавядае тагачаснаму прамысловаму патэнцыялу гэтых гарадоў. Па гадах магілёўскія забастоўкі размяркоўваюцца наступным чынам: 1957 г. – 2, 1961 г. – 2, 1962 г. – 3, 1966 г. – 2, 1969 г. – 1. А на абшарах Магілёўскай вобласці па гадах факты адмовы ад працы рабочых размеркаваліся яшчэ больш выразна: 1957 – 2, 1961 – 3, 1962 – 6, 1966 – 2, 1967 – 2, 1968 – 2, 1969 – 2, 1970 – 1. Звяртае ўвагу на сябе вельмі вялікая колькасць адмоў ад працы ў 1962 г.[2]

Большая палова стачак здарылася ў найбуйнейшым прамысловым цэнтры БССР г. Мінска. Забастоўкі, хаця і меншыя па колькасці чым у сталіцы рэспублікі, адбываліся ў месцах высокай канцэнтрацыі рабочых – буйных прамысловых цэнтрах ўсходняй Беларусі. Факты адмовы ад працы меліся на заводах Бабруйска, Віцебска, Гомеля, Магілёва. Асобныя забастоўкі адбываліся і ў сярэдніх, невялікіх гарадах і мястэчках: у Крычаве, Оршы і г. д.[3]

Актыўнасць у барацьбе за свае правы выяўляў рабочы клас г. Віцебска, дзе адбылося 18 % усіх забастовак БССР. Адной з галоўных прычын прыпынення працы былі пытанні нарміравання. Так, 10.06.1958 г. дырэктар Віцебскага завода радыёдэталяў выдаў загад аб увядзенні норм з 2 чэрвеня, што натуральна абурыла рабочых і выклікала прыпыненне працы 17 чэрвеня. Канфлікт разбіраўся на бюро Віцебскага абкама КПБ 30.06.1958 г. Было канстатавана, што адміністрацыя ведала аб тым, што новыя нормы павінны быць абвешчаны калектыву за два тыдні да іх увядзення, але парушыла дзейнае заканадаўства. Дырэктару была абвешчана строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картку, галоўнаму інжынеру – вымова, сакратару партарганізацыі было ўказана на "запушчанасць" партыйна – палітычнай работы. Бюро абавязала не толькі кіраўніцтва прадпрыемства, але і гаркамы, райкамы партыі, абкамы прафсаюзаў, аблпрафсавет, фабрычна-завадскія камітэты прымаць больш актыўны ўдзел у распрацоўцы і здзяйсненні тэхнічных, гаспадарчых і арганізацыйных мерапрыемстваў на прадпрыемствах, тлумачыць працоўным іх змест і значэнне, усталяваць сістэматычны кантроль за працай па перагляду норм выпрацоўкі, не дапушчаць "паспешлівасці і фармалізму" ў гэтай справе. Камсамольскія органы таксама атрымалі заданне па паляпшэнні выхаваўчай працы сярод маладых рабочых[4].

Звышаператыўнасць у разборы факта адмовы ад працы рабочых выявілі віцебскія камуністы ў 1959 г. У ткацкім цэху Віцебскай шаўкаткацкай фабрыцы 13 і 14 красавіка 1959 г. быў дапушчаны "зрыў работы на працягу 2-х гадзін

[1]. Агееў А. Р. Паслясталінскія забастоўкі савецкіх рабочых у Магілеве і кадравая палітыка КПБ. С. 175.
[2] Агееў А. Р. Забастоўкі на прадпрыемствах Магілёўскай вобласці ў 50–60-х гг. ХХ ст. // Гістарычныя лёсы верхняга Падняпроўя. Ч II. Магілёў, 1995. С. 113.
[3] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. : дыс. С. 84.
[4] Пратакол № 9 пасяджэння Бюро Віцебскага абкама КПБ ад 30 чэрвеня 1958 г. Пытанне "Аб парушэнні працоўнага заканадаўства пры перaглядзе норм выпрацоўкі на заводзе радыёдэталей" // ДАВіц. Ф. 1-п. Воп. 4. Спр. 637. Арк. 27-29.

першай і другой змены гладзільнага ўчастка”. Ужо ў гэты жа дзень 14 красавіка пытанне “Аб недахопах пры пераглядзе норм выпрацоўкі на шаўкаткацкай фабрыцы” разглядалася на бюро АК КПБ. Было канстатавана, што “падрыхтоўчыя мерапрыемствы па перагляду норм выпрацоўкі былі праведзены на нізкім узроўні, без далучэння шырокага партыйнага, прафсаюзнага і камсамольскага актыву, без належнага тлумачэння рабочым мэт і задач перагляду састарэлых норм…”, што дырэктар фабрыкі Макарава і сакратар партарганізацыі Хрэсцін не арганізавалі штодзённай і глыбокай палітычнай работы ў калектыве і “востра не рэагуюць” на недахопы ў рабоце фабрыкі. Асобна было адзначана, што Віцебскі гаркам і Першамайскі райкам КПБ не прынялі належных мер і не зрабілі адпаведных вывадаў з пастановы Бюро абкама ад 30.06.1958 г. у сувязі з парушэннямі працоўнага заканадаўства на заводзе радыёдэталяў. “За нездавальняючае кіраўніцтва пераглядам норм выпрацоўкі, што прывяло да незадаволенасці рабочых і зрыву працы”, дырэктару фабрыцы была абвешчана строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картку, а сакратару партарганізацыі фабрыкі і сакратару Першамайскага РК КПБ былі абвешчаны вымовы. Бюро абкама зноў абавязала гаркамы, райкамы партыі, аблпрафсавет, абкамы прафсаюзаў, абкам камсамола строга выконваць працоўнае заканадаўства і ўсталяваны парадак перагляду састарэлых норм выпрацоўкі, арганізаваць глыбокае вывучэнне і тлумачэнне даклада М. Хрушчова на XXI з’ездзе КПСС “Аб кантрольных лічбах развіцця народнай гаспадрцы СССР на 1959–1965 гг.”[1] Падобныя рашэнні партыйны’х органаў былі тыповымі і пры адмове рабочых ад працы на іншых прамысловых прадпрыемствах БССР.

У Магілёўскай і Віцебскай абласцях намі зафіксавана ў 1956–1965 гг. па пятай частцы агульнарэспубліканскіх фактаў адмовы рабочых ад працы. У Гомельскай вобласці намі зафіксавана ўсяго пяць падобных выступленняў рабочых. Затое ў Гомелі адбылося найбуйнейшае выступленне: 1 ліпеня 1957 г. тры змены не працаваў галоўны канвеер аднаго з найбуйнейшых прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі – завода “Гомсельмаш”[2].

Пераважная колькасць забастовак адбылася на буйных і сярэдніх прамысловых прадпрыемствах БССР. Амаль усе забастоўкі мелі лакальны характар, цягнуліся менш за трое сутак. На металістаў і “машынабудаўнікоў прыйшлася адна траціна ўсіх стачак. Меліся факты і такіх форм пратэсту, як “забастоўкі наадварот”, “работа па правілах”, “запаволеная праца”. Звяртае на сябе ўвагу перыядычнасць забастовак. Калі ў 1956–1960 гг. выяўлена 20 такіх фактаў, то ў 1961–1965 г. – 42. Асабліва значным быў усплеск стачачнай барацьбы ў 1962–1963 гг. Яе ўзровень у гэтыя гады перавышаў сярэднегадавы за ўвесь перыяд у 2 разы. У гэтай сувязі трагічныя падзеі 1962 г. у Новачаркаску ўжо не выглядаюць выпадковымі. Менавіта ў гэты час на невысокі ўзровень матэрыяльнага становішча работнікаў наклаліся

[1] Пратакол № 32 пасяджэння Бюро Віцебскага абкама КПБ ад 14 красавіка 1959 г. Пытанне “Аб недахопах пры пераглядзе норм выпрацоўкі на шаўкаткацкай фабрыцы” // ДАВіц. Ф. 1-п. Воп. 5. Спр. 24. Арк. 135-137.

[2] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат. С. 16.

інфляцыйныя наступствы грашовай рэформы 1961 г., павышэнне коштаў на мяса-малочную прадукцыю ў 1962 г. А праведзенае ў 1958–1960 гг. упарадкаванне зарплаты рэзка зменшыла магчымасці экстэнсіўнага росту вытворчасці працы за кошт арганізацыйных мерапрыемстваў.

Праца па навядзенні санітарнага парадку, паляпшэнні побытавых і вытворчых умоў працы рабочых, пэўнае ўпарадкаванне нарміравання, павышэнне заробкаў сцішылі напружанне ў працоўных калектывах, якое назіралася ў першай палове 1960-х гг. У другой палове 1960-х гг. фактаў адмовы рабочых ад працы стала істотна меней. Тым не менш, яны здараліся. У 1969 г. ЦК КПБ вымушаны быў прыняць спецыяльную пастанову "Аб фактах групавой адмовы ад працы, якія мелі месца ў 1969 г. на асобных прадпрыемствах рэспублікі". Быў распрацаваны шэраг мерапрыемстваў, якія павінны былі прадухіліць такія выпадкі. Пастанова была на кантролі, аб яе выкананні дакладалі ніжэйстаячыя партыйныя арганізацыі[1].

У другой палове 1960-х гг. на прадпрыемствах Гомельскай вобласці былі праведзены мерапрыемствы, накіраваныя на змяншэнне напружання ў калектывах прамысловых прадпрыемстваў, па "выхаванні працоўных". Значных фактаў адмовы рабочых ад працы не зафіксавана. Выконваючы пастанову ЦК КПБ "Аб фактах групавой адмовы ад працы, якія мелі месца ў 1969 г. на асобных прадпрыемствах рэспублікі", быў рэалізаваны шэраг мерапрыемстваў па арганізацыі нарміравання і аплаты працы. Пастанова заставалася на кантролі, яе выкананне разглядаў Гомельскі абкам КПБ 12.10.1971 г. У яго пастанове было адзначана, што ў 1969 – пачатку 1971 г. была палепшана праца. Разам з тым указвалася на тое, што ў шэрагу калектываў не праводзіцца дадатковая работа па выкананні пастановы ЦК КПБ, маюцца выпадкі фармалізму ў арганізацыі нармавання і аплаты працы, парушаецца працоўнае заканадаўства, назіраюцца бюракратычныя адносіны гаспадарчых кіраўнікоў да патрэб і запытаў працоўных, кепска пастаўлена выхаваўчая праца. У пастанове партыйныя арганізацыі абавязваліся "рашуча пакончыць з фактамі, калі асобныя кіраўнікі несвоечасова рэагуюць на справядлівыя патрабаванні рабочых" па выкананні працоўнага заканадаўства і ўмоў калектыўных дамоў, паляпшэнні тэхнікі бяспекі, побыту і адпачынку працоўных. Гаспадарчыя кіраўнікі, сакратары партыйных арганізацый і прадстаўнікі мясцовых прафсаюзных камітэтаў былі папярэджаны, што за падобныя недахопы ў працы будуць прымацца самыя рашучыя меры спагнання, аж да вызвалення ад займаемых пасад[2].

Дастаткова рэзкі і патрабавальны тон фармулёвак пастановы абкама партыі была выклікана фактам адмовы 22.09.1971 г. рабочых ліцейнага цэха Гомельскага завода пускавых рухавікоў. Кіраўніцтва завода прыняла меры для

[1] Протокол заседания бюро Гомельского обкома КП Белоруссии от 12 октября 1971 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 134. Спр. 92. Арк. 135.
[2] Там жа. Арк. 135-136.

таго, каб ліквідаваць канфлікт, але не дало яму “вострай палітычнай ацэнкі” і не праінфармавала аб ім партыйныя органы[1].

Рабочы рух БССР у гэты час не выйшаў за межы эканамічных рамак, адкрыта палітычных патрабаванняў на прадпрыемствах Беларусі намі не выяўлена[2]. Аднак, “антысавецкія выказванні” і “факты “паклёпу на нашу савецкую рэчаіснасць” мелі месца ў 1963 г. на Магілёўскіх заводах імя Кірава і імя Куйбышава. Але адзначаныя выключэнні толькі пацвярджаюць агульную тэндэнцыю эканамічнай накіраванасці патрабаванняў рабочых[3].

Барацьба работнікаў за свае правы, у тым ліку забастоўкі рабочых на прадпрыемствах БССР, не ўяўлялі непасрэднай пагрозы палітычнаму рэжыму, які існаваў. Ты не менш, яна стала адным з важных непрадбачных фактараў, які быў нечаканым для савецкага кіраўніцтва, і мела істотнае значэнне для павышэння ўвагі партыйных і гаспадарчых органаў кіравання да сацыяльных пытанняў і кадравай палітыкі ў прамысловасці ў сярэдзіне 1950–1960-х гадах.

Некалькі ўзрасла актыўнасць работнікаў у барацьбе за свае правы і ў дзейнасці прафсаюзных арганізацый. Прафсаюзныя камітэты былі прызваныя дапамагаць партыйным органам і кіраўніцтву прамысловымі прадпрыемствамі кіраваць прадпрыемствамі. Іх лідары мелі магчымасць выступаць ад імя працоўных калектываў. У канцы 1950-х гг. павялічылася колькасць выпадкаў, калі прафсаюзныя камітэты, адстойваючы правы членаў прафсаюзаў, уступалі ў канфлікт з адміністрацыямі і нават партыйнымі камітэтамі асобных заводаў, прадпрыемстваў рэспублікі. Некаторыя прафсаюзныя лідары задужа прама ўспрынялі лозунгі і заклікі да іх з боку вышэйшага партыйнага кіраўніцтва і нават уступалі ў канфлікт з партыйнымі арганізацыямі.

Так, напрыканцы 1956 г. канфлікт паміж дырэкцыяй і партыйнай арганізацыяй з аднаго боку і прафсаюзным камітэтам торфапрадпрыемства “Асінторф” з другога выйшаў на ўзровень Віцебскага абкама КПБ, Бюро якога 26 снежня разглядала пытанне “Аб сур’ёзных недахопах у рабоце дырэкцыі, партыйнага бюро і прафсаюзнага камітэта торфапрадпрыемства “Асінторф”. Абмеркаваўшы матэрыялы праверкі, члены бюро абкама партыі прызналі наяўнасць сур’ёзных недахопаў у дзейнасці ўсіх трох структур. Было прызнана, што кіраўніцтва прадпрыемства “несамакрытычна адносіцца да сваёй працы, змірылася з недахопамі, не прыслухоўваецца да голасу мас”. Было адзначана, што дырэктар недаацэньвае ролю вытворчых нарадаў і рабочых сходаў, збірае іх рэдка, прадпрыемства працуе стратна, не выконаваецца калектыўная дамова аб паляпшэнні побыту рабочых, мала ўвагі надаецца пытанням аховы працы. Адначасова было прызнана, што партыйнае бюро павольна перабудоўвае сваю працу ў святле рашэнняў XX з’езда партыі, а прафсаюзны камітэт дрэнна працуе, ягоны старшыня скампраметаваў сябе выпіўкамі, выступае з “дэмагагічнымі заявамі” на прафсаюзных сходах і імкнецца застацца на сваёй

[1] Протокол заседания бюро Гомельского обкома КП Белоруссии от 12 октября 1971 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 134. Спр. 92. Арк. 136.
[2] Агеев А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат. С. 16–17.
[3] Агееў А. Р. Забастоўкі на прадпрыемствах Магілёўскай вобласці ў 50–60-х гг. XX ст. С. 114.

пасадзе, нягледзячы на тое, што не быў рэкамендаваны на сваю пасаду партыйным бюро. У выніку, прафсаюзныя сходы па цэхах праходзілі, на думку партыйных лідараў, без кантролю парарганізацыі, і на прафсаюзнай канферэнцыі рашэнне партбюро да ведама канферэнцыі "даведзена не было", затое на ёй "мелі месца асобныя дэмагагічныя выпады, накіраваныя на супрацьстаўленне рабочых і камітэта прафсаюзаў – адміністрацыі і партыйнай арганізацыі", а галасаванне па выбарах членаў тарфянога камітэта праводзіліся тройчы[1]. Шчыра прызнаць, у пратаколе, што старшыня прафсаюзнага камітэта быў абраны на новы тэрмін насуперак рэкамендацыі мясцовага партыйнага бюро, члены бюро Віцебскага абкама КПБ так і не рашыліся.

У пастанове бюро Віцебскага АК КПБ указала сакратару партбюро "на занадта нізкі ўзровень кіравання прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыяй…", дырэктару "за барскі – зняважлівыя адносіны" да стварэння вытворчых і жыллёвых умоў для работнікаў абвешчана вымова з занясеннем ва ўліковую картку, як і старшыні прафсаюзнага камітэта за няправільныя паводзіны ў побыце і парушэнне партыйнай дысцыпліны. Адзначана, што гэтыя парушэнні на выбарах адбыліся ў прысутнасці работніка ЦК прафсаюза электрастанцый, што было даведзена да ведама аддзела партыйных органаў ЦК КПСС па саюзных рэспубліках. Нягледзячы на факт відавочнага франдзёрства, адмяніць рашэнне нізавога прафсаюзнага органа ці настойваць на правядзенні новай канферэнцыі члены абкама партыі ва ўмовах хрушчоўскай "дэмакратызацыі" не рашыліся[2].

Падобных выпадкаў супрацьстаяння рабочых і камітэта прафсаюзаў – адміністрацыі і партыйнай арганізацыі, правядзенне сапраўдных канкурэнтных выбараў у прафсаюзныя камітэты ў савецкіх умовах зафіксавана небагата. І тым не менш, яны былі. І іх колькасць павялічылася пасля ХХ з'езда КПСС.

Сістэма абароны працоўных правоў чалавека праз прафсаюзныя арганізацыі не была адлажана. Старшыня Гомельскага абласнога суда вымушаны быў звярнуць увагу кіраўніцтва вобласці на факты парушэння самых элементарных правоў працоўных на некаторых прадпрыемствах[3]. А бюро Гомельскага абкама КПБ у снежні 1958 г. канстатавала, што ў рядзе выпадкаў камісіі па працоўных спрэчках і камітэты прафсаюзаў "беспадстаўна адмаўляюць рабочым і служачым у іх законных патрабаваннях". Толькі за дзевяць месяцаў былі парушаны правы 525 работнікаў, 208 з якіх былі незаконна звольнены[4].

Сітуацыя з прафсаюзным кантролем за дзейнасцю адміністрацый затавалася стабільна нездавальняючай. Цэнтральны камітэт КПСС у шматлікіх пастановах, якія тычыліся дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў, адзначаў сур'ёзныя недахопы ў рабоце. Так, у лістападзе 1966 г. адзначана, што

---

[1] Пратакол № 29 пасяджэння Бюро Віцебскага абкама КПБ ад 26 снежня 1956 г. пытанне "Аб сур'ёзных недахопах у рабоце дырэкцыі, партыйнага бюро і прафсаюзнага камітэта торфапрадпрыемства "Асінторф" // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 4. Спр. 600. Арк. 137-139.

[2] Там жа. Арк. 139-141.

[3] Справка гомельского областного суда о нарушениях трудовых прав граждан некоторыми руководителями предприятий и учреждений Гомельской области. 1958 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 247. Арк. 86-92.

[4] Пратакол № 30 пасяджэння бюро Гомельскага абкама КПБ ад 3 снежня 1958 г. // Там жа. Арк. 14.

партыйны і прафсаюзны камітэты Арэхаўскага баваўнянага камбіната імя К. І. Мікалаевай не прад'яўляюць належных патрабаванняў да гаспадарчых кіраўнікоў камбіната і фабрык па паляпшэнні вытворча-побытавых умоў тэкстыльшчыкаў, недастаткова кантралююць выкананне працоўнага заканадаўства, нярэдка міряцца з грубымі парушэннямі санітарнага рэжыму на рабочых месцах. Указвалася, што колькасць умывальнікаў, душавых, гадэробаў, пакояў гігіены не забяспечвае патрэбы рабочых[1]. Гэта быў сігнал для ўсіх партыйных і прафсаюзных арганізацый СССР.

А ў снежні 1966 г., разглядаючы працу прамысловых прадпрыемстваў і будоўлей Тульскай вобласці, ЦК зноўку адзначаў, што партыйныя арганізацыі і гаспадарчыя кіраўнікі шэрагу прадпрыемстваў "слаба забяспечваюць выкананне савецкага гаспадарчага заканадаўства", законаў аб працы рабочых і служачых, калектыўных дамоў[2].

У верасні 1967 г. у ЦК КПСС разглядалася пытанне пра кіраванне прафсоюзамі партыйнымі арганізацымі Пермскай вобласці. У чарговы раз было адзначана, што фабрычна-завадскія і мясцовыя камітэты прафсаюзаў не выяўляюць патрабавальнасці да гаспадарчых кіраўнікоў па выпраўленні недахопаў у арганізацыі працы, налічэння зарплаты, міряцца з фактамі няправільнага размеркавання жылля, парушэннямі правіл і норм аховы працы, прамысловай санітарыі і г. д.[3] Усім партарганізацыя СССР было яшчэ раз нагадана пра неабходнасць партыйнай падтрымкі ў павышэнні ролі прафсаюзаў.

Партыйныя дакументы сведчаць, што ва ўмовах паслаблення рэпрэсіўнага заканадаўства пасля смерці І. Сталіна рабочыя ўсё часцей рашаліся на розныя формы пратэсту і эскалацыі канфліктаў. Барацьба работнікаў за свае правы, у тым ліку забастоўкі рабочых, не ўяўлялі непасрэднай пагрозы існаваўшаму палітычнаму рэжыму, рабочы рух не выйшаў за межы эканамічных рамак, але стаў адным з непрадбачаных фактараў, які меў істотнае значэнне для павышэння ўвагі партыйных і гаспадарчых органаў кіравання да сітуацыі і кадравай палітыкі ў прамысловасці. Былі прадпрыняты адміністрацыйныя і арганізацыйныя спробы навядзення парадку ў прэміраванні кіраўнікоў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых.

Сістэма абароны працоўных правоў праз прафсаюзныя арганізацыі ці з дапамогай партыйных арганізацый як правіла не спрацоўвала. Савецкая сістэма абароны правоў працоўных рэдка станавілася на яго бок у выпадку канфлікту з адміністрацыяй, якая часта прыкрывала свае пралікі інтарэсамі калектыву і

---

[1] Постановление ЦК КПСС "О работе партийного комитета Ореховского хлопчатобумажного комбината имени К. И. Николаевой". 28 ноября 1966 г. // Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. С. 108.

[2] Постановление ЦК КПСС "О работе партийных организаций Тульской области по воспитанию социалистической дисциплины труда в коллективах промышленных предприятий и строек". 9 декабря 1966 г. // Там жа. С. 113.

[3] Постановление ЦК КПСС "О работе партийных организаций Пермской области по руководству профсоюзамі". 18 сентября 1967 г. // Там жа. С. 270–276.

сацыялістычнага будаўніцтва. Ва ўмовах панавання камандна-адміністрацыйнай сістэмы органы кіравання не былі гатовыя да партнёрскіх адносінаў з работнікамі. Фактычна работніка разглядалі вінтыкам прадпрыемства, а ў маштабах краіны – вялізнай дзяржаўнай машыны. Партыйныя і гаспадарчыя органы кіравання імкнуліся не рабіць канфлікты публічнымі. Канфлікты ў сацыялістычным грамадстве яны ўспрымалі як выпадковасць і выкарыстоўвалі ў канфліктных сітуацыях тактыку арганізацыйнага і псіхалагічнага ціску, патрабавалі ад работнікаў аднабаковых саступак. Па сутнасці такая тактыка з’яўлялася самападманам і ў стратэгічным плане не вяла да вырашэння канфліктаў.

## 4.3 Пралікі ў правядзенні кадравай палітыкі БССР на прыкладзе ўсходнебеларускіх абласцей

Правал эканамічнай палітыкі ў 1970–1980-я гг. быў выкліканы шэрагам аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў, у тым ліку недасканаласцю сістэмы падбору кадраў, іх закасцянеласцю, паслабленнем дзяржаўнай і працоўнай дысцыпліны, распаўсюджваннем п’янства і алкагалізму, крадзяжоў дзяржаўнай і грамадскай уласнасці. Асаблівасцю перыяду стала і тое, што ў СССР і Беларусі былі выяўлены факты арганізаванай і карумпаванай злачыннасці, якія атрымалі шырокі грамадскі рэзананс[1].

Варта ўзгадаць найбольш гучныя справы: шматлікія факты хабарніцтва сярод работнікаў кіравання Краснадарскага краю (1982), у гандлёвай арганізацыі “Гастраном” Галоўнага ўпраўлення гандлю Маскоўскага гарвыканкама (1983), у Дзяржаўным камітэце СССР па эканамічных сувязях, Міністэрстве знешняга гандлю СССР пры заключэнні здзелак з замежнымі фірмамі (1986), злоўжыванні і парушэнні законнасці ў органах унутраных спраў Іркуцкай вобласці (1986) і інш.[2] У БССР гэта так званыя “мінская” і

---

[1] Пушкін І.А. Кадравая палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2018. № 2. С. 2530; Яго ж. Пралікі ў кадравай палітыкі БССР у 1970-я гг // Современная молодёжь и общество: сб. науч. статей. Вып. 6 . Минск, 2018. С. 29–33; Злоўжыванні ўладаю і пралікі ў кадравай палітыцы БССР у 1970–1980-я гг. (на прыкладзе Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей) // Карупцыйныя рызыкі кадравага патэнцыяла Беларусі: зборнік навуковых артыкулаў / уклад. Ю. М. Бубнаў, І. А. Пушкін. Магілёў, 2019. С. 32–42; Вытокі карупцыі і злоўжыванняў уладай у савецкім мінулым (на прыкладзе Беларусі) // Українознавчий альманах. Випуск 24. Київ, 2019. С. 93–100; Коррупция и злоупотребления властью в восточных регионах БССР (1970–1980 гг.) // Молодежная Галактика № 16. 2019. СПб., 2019. С. 182–196.

[2] Записка от 16.03.1982 г. КПК при ЦК КПСС о многочисленных фактах взяточничества среди руководящих работников Краснодарского края // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 11. Спр. 134. Арк. 1; Выписка из протокола № 131/10с от 23.11.1983 г. заседания Секретариата ЦК КПСС о публикации в советской печати по согласованию с КГБ СССР сообщения о результатах рассмотрения Верховным судом РСФСР дела о крупных взяточниках из торга “Гастроном” Главного управления торговли Мосгорисполкома // Там жа. Спр. 135. Арк. 1; Записка от 02.01.1986 г. министра внутренних дел СССР В. В. Федорчука “О злоупотреблениях и нарушениях законности в органах внутренних дел Иркутской области” // Там жа. Спр. 136. Арк. 1; Записка председателя КГБ СССР В. М. Чебрикова в ЦК КПСС “О мерах по упорядочиванию контактов советских должностных лиц с иностранными гражданами” (1986 г.), в связи з массовыми фактами взяточничества в Госкомитете СССР по экономическим связям, Министерстве внешней торговли СССР и других организациях при заключении сделок с иностранными фирмами // Там жа. Воп. 18. Спр. 85. Арк. 1-4

“аршанская” справы, у якія былі ўцягнуты як гаспадарнікі, так і партыйныя, савецкія работнікі, а таксама супрацоўнікі праваахоўнай сістэмы[1].

У пачатку 1970 г. у БССР была ўзбуджана крымінальная справа па шматлікіх фактах хабарніцтва з боку чыноўнікаў жыллёвых аддзелаў райвыканкамаў горада Мінска. Вярхоўны Суд БССР 04.01.1973 г. разгледзеў справу аб групе злачынцаў на чале з былым старшынёй Аршанскай райспажыўкааперацыі М. Барадой, якая займалася крадзяжом народнага дабра ў асабліва буйных памерах. Варта ўзгадаць, што напрыканцы 1960-х гг. у СССР самай паспяховай была прызнана работа райспажыўсаюза, які менавіта ім узначальваўся. На момант свайго арышту Мацвей Барада – выдатнік савецкага гандлю, уладальнік Ганаровай граматы Вярхоўнага Савета СССР, будучы Герой Сацыялістычнай працы (былі падрыхтаваны дакументы на прадстаўленне яго да гэтага звання). Як было ўстаноўлена следствам, удзельнікамі групы раскрадальнікаў і іх саўдзельнікамі за перыяд злачыннай дзейнасці было выкрадзена дзяржаўных і грамадскіх сродкаў на суму 806 685 руб. 72 кап. Усяго ж у выніку крадзяжоў і злоўжыванняў абвінавачаныя нанеслі матэрыяльную шкоду на суму 824 423 руб. 99 кап.

Злачынцамі быў створаны “Фонд Барады” – вялікая колькасць дэфіцытных рэчаў і прадуктаў харчавання: андатравых (футравых) шапак, экспартнай гарэлкі, ікры, каўбасы, воблы. Прадукты былі прызначаныя для “патрэбных людзей” – чыноўнікаў з Віцебскага аблвыканкама і Аршанскага райвыканкама, супрацоўнікаў пракуратуры, работнікаў аддзела барацьбы з крадзяжамі сацыялістычнай маёмасці (ОБХСС) і Дзяржаўнай аўтаінспекцыі. Усяго ў крымінальнай справе названа больш за 20 уплывовых асоб вобласці і нават Мінска, якія на працягу доўгага часу атрымлівалі грашовыя сумы і бясплатныя прадуктовыя “наборы” за лабіраванне інтарэсаў Аршанскага райспажыўсаюза. Кошт падарункаў, якія былі, па падліках следства, “бясплатна раздадзеныя службовым асобам”, ацанілі ў 32 496 руб. 60 кап. Па словах жа саміх падсудных, “прыкрыццё”, якое на працягу многіх гадоў аказвалі “злачыннай групе” пракуроры, міліцыя і кіраўніцтва выканаўчых камітэтаў Віцебскай вобласці, абышлося значна даражэй. У рамках расследавання па “справе Барады” паказанні далі ўсе, каму абвінавачаныя дарылі падарункі. У якасці сведак значыліся старшыня камітэта па кінематаграфіі Савета Міністраў БССР, намеснікі старшынь Віцебскага аблвыканкама, старшыня Аршанскага райвыканкама, першы сакратар гаркама партыі Оршы, пракурор Віцебска і інш. Як склаўся іх далейшы лёс: першы сакратар Аршанскага райкама партыі (адзіны, хто спрабаваў абараніць Бараду) стаў дырэктарам ПТВ, пракурор Віцебска (у яго дома знайшлі бочку салёных агуркоў, якую ў якасці падарунка прывезлі нарыхтоўшчыкі райспажыўсаюза) быў адпраўлены кіраваць дробнай прафсаюзнай арганізацыяй, адзін з кіраўнікоў сярэдняга рангу, не чакаючы прад’яўлення абвінавачвання ў атрыманні хабараў, павесіўся[2].

---

[1] Барвінок, К. І., Саракавік І. А. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах XX ст. С. 71.

[2] Анкудо, Е. Фонд Бороды. Фонд Бороды – 2 / Е. Анкудо // БелГазета. 2003. № 4. 03 февр.; № 5. 10 февр. http://www.belgazeta.by/ru/2003_02_03/arhiv_bg/5244/; http://www.belgazeta.by/ru/2003_02_10/arhiv_bg/5275/. Дата доступа 18.08.2022.

Аналіз пратаколаў пасяджэнняў абласных партыйных канферэнцый, пленумаў, бюро і сакратарыятаў Віцебскага, Магілёўскага і Гомельскага абласных камітэтаў КПБ дазволіў выявіць негатыўныя аспекты ў змесце і фарміраванні кадравага патэнцыялу БССР у 1970–1980-я гг.

Прыпіскі, ашуканства, крадзеж дзяржаўных сродкаў мелі месца на прадпрыемствах транспарту, гандлю і побыту, у будаўнічых арганізацыях, калгасах і саўгасах, прамысловых прадпрыемствах. Асабліва шмат буйных крадзяжоў і злоўжыванняў было ў спажывецкай кааперацыі БССР. За 1969–1972 гг. зарэгістравана 343 выпадкі буйных растрат і крадзяжоў тавара-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму 465,5 тыс. руб. Толькі ў 1971 г. у Магілёўскай вобласці ў ходзе фінансава-гаспадарчых рэвізій і крымінальных следстваў выяўлена 178 розных адказных асоб, якія ўдзельнічалі ў крадзяжы дзяржаўнай і грамадскай уласнасці. За дапушчаныя злоўжыванні было прыцягнута да адказнасці 146 работнікаў спажыўкааперацыі. У першай палове 1972 г. было знята з пасадаў 14 кіраўніцкіх работнікаў, у тым ліку старшыня райспажыўсаюза[1].

Нездавальняюча забяспечвалася захаванасць сацыялістычнай уласнасцю ў Крычаўскім, Хоцімскім, Клімавіцкім, Краснапольскім, Бялыніцкім, Чавускім, Горацкім, Слаўгарадскім райспажыўсаюзах, Клічаўскім і Чэрыкаўскім райпа. У 1970–1972 гг. за незабеспячэнне даручанага ўчастка работы, дапушчаныя злоўжыванні і іншыя недахопы ў працы было вызвалена ад пасадаў 6 старшыняў праўленняў райспажыўсаюзаў, 10 намеснікаў старшыняў праўленняў па гандлі і 12 па кадрах, 12 дырэктараў аптовых баз, 12 дырэктараў райнарыхкантор, 11 галоўных бухгалтараў і 547 матэрыяльна-адказных работнікаў[2].

На пасяджэнні бюро Віцебскага АК КПБ 28.01.1974 г. прагучала, што ў Чашніцкім раёне Віцебскай вобласці буйныя растраты і нястачы ў райспажыўсаюзе ўзраслі з 5,4 тыс. руб. (1971) да 23,4 тыс. руб. (1973) ці больш чым у 4 разы; у Новалукомльскім гаркаапгандлі адпаведна з 6,1 тыс. руб да 15,8 тыс. руб ці больш чым у 2,5 разы. Былы кіраўнік гаркаапгандлем (член КПСС) прысвойваў кааператыўныя грашовыя сродкі, браў са склада харчовыя прадукты і не плаціў за іх. Набыў для ўласнага ўжытку легкавы аўтамабіль, які раней належыў гаркаапгандлю і быў прызначаны для продажу "ў сувязі са скарачэннем выдаткаў на ўтрыманне аўтатранспарту"[3].

Становішча год ад году не паляпшалася. Каардынацыйны савет па ўпарадкаванні праверак і павышэнні эфектыўнасці кантролю БССР 22.07.1987 г. разгледзеў пытанне "Аб працы Белкаапсаюза па ўдасканаленні кантролю за станам ўліку і справаздачнасці на падведамасных прадпрыемствах і арганізацыях, недапушчэнні прыпісак і ашуканства" і зафіксаваў, што ў Белкаапсаюзе не памяншылася колькасць прыпісак і фактаў ашуканства[4].

---

[1] Протокол заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 194-195

[2] Протокол заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 06.04.1973 г. // Там жа. Воп. 151. Спр. 15. Арк. 3.

[3] Протокол заседания бюро Витебского областного комитета КПБ от 28.01.1974 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 130. Спр. 22. Арк. 24-26

[4] Протокол № 2 Координационного совета по упорядочению проверок и повышению эффективности контроля от 22.07.1987 г. // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2022. Арк. 213.

У першай палове 1970-х гг. калектыўнымі крадзяжамі дзяржаўных сродкаў шляхам складання фіктыўных працоўных пагадненняў і іншых махінацый займаліся ў вытворчым аб'яднанні "Бабруйсксельмаш". У ліку ініцыятараў былі намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання, начальнікі планавага і вытворчага аддзелаў, выконваючы абавязкі галоўнага бухгалтара (усе члены КПСС). За два гады імі было скрадзена каля трох тысяч рублёў[1]. На Бабруйскім малочным заводзе было выкрадзена каштоўнасцяў больш чым на 100 тысяч рублёў. Доўгі час у будаўнічым упраўленні № 58 трэста "Лаўсанбуд" (Магілёў) дзейнічала група раскрадальнікаў. Яна займалася крадзяжом будаўнічых матэрыялаў, якія затым прадаваліся прыватным асобам, а атрыманыя грошы прысвойваліся. Адным з актыўных удзельнікаў групы раскрадальнікаў з'яўляўся сам начальнік гэтага ўпраўлення[2]. Тут і далей усе кіраўнікі – члены КПСС.

Гаспадарчыя кіраўнікі, каб атрымаць прэміі і славу станавіліся на шлях ашуканства і падману дзяржавы, завышаючы паказчыкі выканання планавых заданняў. Былі выяўлены факты прыпісак і адпаведна незаконных выплат прэмій на Магілёўскім мясакамбінаце і ліфтабудаўнічым заводзе. Прычым на апошнім ў справаздачах аб выкананні бягучых планаў за 1971 г. і 1978 г. (дырэктар быў той жа). Нягледзячы на гэта, завод рэгулярна значыўся на абласной Дошцы гонару[3]. Кіраўніцтва завода на працягу 2-х гадоў (1977–1978) уключала ў выкананне плана рэалізацыі неадгружаную прадукцыю. За гэта незаконна выплацілі 120 тыс. рублёў прэмій: амаль тысячу атрымаў дырэктар завода, а сакратар партыйнага камітэта завода – 1 103 руб.[4] На думку пракуратуры БССР, прыпіскі да дзяржаўнага плана здабычы нафты ў 1972 г. нафтаздабываючым упраўленнем "Рэчыцанафта" аб'яднання "Беларуснафта" былі арганізаваны начальнікам аб'яднання "Беларуснафта", выканаўцамі сталі начальнік і галоўны інжынер "Рэчыцанафта". У выніку прыпісак незаконна выплацілі рабочым і служачым "Беларуснафта" 184 311 руб. прэмій, у тым ліку адказным работнікам аб'яднання "Беларуснафта" і "Рэчыцанафта" 11 700 руб. Усе вінаватыя кіраўнікі (дарэчы раней за працоўныя заслугі ўзнагароджаныя дзяржаўнымі ордэнамі) былі амніставаны ў сувязі з 50-годдзем утварэння СССР[5].

У кастрычніку 1974 г. за хабар, спекуляцыю і злоўжыванне службовым становішчам быў арыштаваны і ў ліпені 1975 г. асуджаны на 6 гадоў пазбаўлення волі дырэктар аб'яднання па продажы мэблі Гомельскага

---

[1] Отчётный доклад Могилёвского обкома КПБ XIX областной партийной конференции (23–24.12.1975) // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 1. Арк. 44.

[2] Протокол заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // Там жа. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 183, 200.

[3] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // Там жа. Воп. 159. Спр. 109. Арк. 43–44; Постановление бюро Могилевского обкома КПБ, исполнительного комитета областного Совета депутатов и президиума областного совета профсоюзов от 29.10.1974 г. // Там жа. Воп. 153. Спр. 40. Арк. 68-75.

[4] Протокол XX Могилевской областной партийной конференции от 26.01.1979 г. // Там жа. Воп. 162. Спр. 2. Арк. 57.

[5] Письмо Прокуратуры БССР в Гомельский ОК КПБ от 30.08.1974 г. по результатам расследования дела о приписках к государственному плану добычи нефти в 1972 г. нефтедобывающим управлением "Речицанефть" объединения "Беларусьнефть" // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 142. Спр. 36. Арк. 18-20.

гарпрамгандлю, раней – інструктар Гомельскага ГК КПБ, намеснік дырэктара па кадрах Гомельскага гарпрамгандлю, загадчык аддзела гандлю Гомельскага гарвыканкама, дырэктар гандлёвай фірмы па продажы швейных тавараў, дырэктар аб'яднання па продажы мэблі Гомельскага гарпрамгандлю. Усё гэта, дзякуючы заступніцтву і сяброўскім сувязям з першым сакратаром Гомельскага ГК КПБ. Нягледзячы на тое, што была ўзбуджана крымінальная справа, дырэктара рэкамендавалі і выбралі дэпутатам гарадскога савета. Яму ўжо пасля прысуду пашырылі жыллёвую плошчу, выдзелілі новую кватэру. Жонкі дырэктара і першага сакратара сябравалі, менавіта праз сваю жонку арыштаваны перадаваў цыдулкі жонцы партыйнага кіраўніка, каб тая пахадатайнічала за яго перад мужам. На пасяджэнні бюро АК КПБ першаму сакратару ГК была аб'яўлена строгая вымова[1].

У 1983 г. былі выяўлены: наяўнасць прыпісак пры перавозцы грузаў у Калінкавіцкім мясакамбінаце, Калінкавіцкім філіяле Гомельскай масласырбазы, ПМК 18 трэста "Мазырсельбуд", Калінкавіцкім рознічным пладовагародніным прадпрыемстве, ПМК 111, будаўнічым упраўленні № 185 будтрэста № 27[2]; парушэнні дзяржаўнай і фінансавай дысцыпліны дырэкцыяй Беларускага металургічнага завода (1984) і інш.[3]

У першай палове 1984 г. праверылі 13 прадпрыемстваў Гомельскага вытворчага аб'яднання малочнай прамысловасці. Вынікі: выяўлены недахоп гатовай прадукцыі – Веткаўскі, Камарынскі, Нараўлянскі, Лельчыцкі маслазаводы, Гомельскі малочны камбінат (малако, вяршкі, тварог, сыраватка і інш.); на Лельчыцкім заводзе чатыры камеры з шынамі і кузаў для аўтамашыны "Масквіч", што належылі заводу, былі пастаўлены на асабісты аўтамабіль дырэктара завода; зафіксавана вялікая колькасць дробных крадзяжоў прадукцыі (160 выпадкаў): Гомельскі малочны камбінат, Добрушскі завод сухога абястлушчанага малака, Калінкавіцкі завод замяніцеля цэльнага малака, Мазырскі гармалзавод, Светлагорскі сыраробны завод[4].

Органы дзяржаўнай статыстыкі Магілёўскай вобласці ў другім паўгоддзі 1985 г. праверылі 442 прадпрыемствы і арганізацыі. Прыпіскі і скажэнні справаздачнасці выявілі на 33,7 % правераных прадпрыемствах і арганізацый, у тым ліку наўмысныя на 5 % (у другім паўгоддзі 1984 г. было адпаведна на 28,4 % і 4,4 %). За прыпіскі ў 2 паўгоддзі 1985 г. пакаралі 60 чалавек[5].

---

[1] Информация о фактах неправильных действий некоторых сотрудников от 15.08.1975 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 37. Арк. 132-134.

[2] Постановление Гомельского обкома народного контроля (протокол № 5 от 30.05.1984) «О результатах проверки сохранности социалистической собственности на предприятиях Гомельского производственного объединения молочной промышленности» // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 1682. Арк. 13.

[3] Письмо Стройбанка и ОблФО в адрес Гомельского ОК КПБ "О нарушениях государственной и финансовой дисциплины Дирекцией строящегося Белорусского металлургического завода (БМЗ)", 07.05.1984 г. // Там жа. Арк. 101-103.

[4] Постановление Гомельского областного комитета народного контроля (протокол № 1 от 25.01.1984 г.) // Там жа. Арк. 193-195.

[5] Информация статистического управления Могилёвской области в Могилёвский ОК КПБ от 08.01.1986 г. № 1-16-7 "О работе органов государственной статистики Могилёвской области по выполнению указаний директивных органов по решительному пресечению и искоренению фактов очковтирательства и приписок" // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 181. Спр. 115. Арк. 27-28.

Падобнае адбывалася і далей. У 1985 г. у Магілёўскай вобласці ведамасныя рэвізоры ўстанавілі факты прыпісак на 73 прадпрыемствах і арганізацыях, у 1986 г. на 137. У 1985 г. па выніках рэвізій і праверак прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці 1 545 чал., вінаватых у фінансавых парушэннях у 1986 г. – 1 814 чал., з іх 84 вызвалілі ад пасады[1]. За дапушчаныя парушэнні ў дакладнасці справаздачных звестак і прыпіскі да матэрыяльнай, адміністрацыйнай і партыйнай адказнасці сярод іншых прыцягнулі намеснікаў старшыняў Клічаўскага, Клімавіцкага райвыканкамаў і шэраг кіраўнікоў, галоўных бухгалтараў і іншых адказных асоб прадпрыемстваў і арганізацый вобласці[2]. У 2 паўгоддзі 1986 і студзені-лютым 1987 г. у Чэрыкаўскім раёне Магілёўскай вобласці раённым камітэтам народнага кантролю было праведзена 19 праверак. На 9 (47,4 %) прадпрыемствах і арганізацыях выявілі парушэнні[3]. З 124 прадпрыемстваў і арганізацый, якія былі правераны ў 1987 г. кантрольна-рэвізійным упраўленнем (КРУ) Мінфіна БССР прыпіскі і скажэнні справаздачнасці выяўлены на 68 (54,8 %). На 46 прадпрыемствах і арганізацыях (37,1 %) былі факты незаконнай выплаты прэмій[4].

Трэба адзначць, што падобнае было ўласціва не толькі для БССР. Прыпіскі і скажэнні справаздачнасці ў 1986 г. былі на кожным чацвёртым прадпрыемстве Каракалпакскай АССР, дзе за 1986 г. да крымінальнай адказнасці прыцягнуты 32 кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, 72 бухгалтары, асуджаныя 15 рэвізораў[5]. рэвізораў[5].

Не было належнага патрабавання і высокай прынцыповасці пры ацэнцы дзейнасці партыйных, савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў. Часта замена кіраўніцкіх работнікаў уяўляла простую механічную перастаноўку кадраў, што не давала жаданага выніку.

Дырэктар Магілёўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў з мэтай атрымання прэмій і іншага матэрыяльнага ўзнагароджання займаўся прыпіскамі і ашуканствам. Ленінскі райкам партыі прыцягнуў яго да партыйнай адказнасці, абласное ўпраўленне мясцовай прамысловасці вызваліла яго ад працы "па ўласным жаданні". Але ўпраўленне бытавога абслугоўвання тут жа прызначыла яго дырэктарам Магілёўскага аб'яднання па хімчыстцы і лазнева-пральнаму абслугоўванні. У трэсце "Магілёўсельбуд" у свой час за прыпіскі, крадзеж будаўнічых матэрыялаў і іншыя злоўжыванні быў зняты з працы начальнік ПМК-58. Вельмі хутка ён быў прызначаны начальнікам вытворчага аддзела, а потым і галоўным інжынерам ПМК-44[6]. Намеснік начальніка ўпраўлення

[1] Письмо Могилевского облисполкома «О состоянии контрольно-ревизорской работы в отделах и управлениях облисполкома» от 12.02.1987 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 43.
[2] Письмо Могилёвского облисполкома от 24.01.1987 г. // Там жа. Арк. 21–22.
[3] Информация Чериковского районного комитета народного контроля от 24.02.1987 г. "О работе проводимой контролирующими органами Чериковского района по выявлению и искоренению приписок, очковтирательства и искажения государственной отчётности" // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 184. Спр. 72. Арк. 4.
[4] Протокол № 2 Координационного совета по упорядочению проверок и повышению эффективности контроля от 22.07.1987 г. // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2022. Арк. 214.
[5] Постановление президиума ВС СССР от 24.07.1987 г. «О работе советов народных депутатов Каракалпакской АССР по обеспечению сохранности социалистической собственности» // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 388-390.
[6] Протокол заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 181, 185-186, 195, 202.

мяцовай прамысловасці Віцебскай вобласці быў вызвалены ад пасады за злоўжыванне службовым становішчам, але адразу быў прызначаны дырэктарам хімзавода. Затым намеснікам генеральнага дырэктара ВА "Хімпласт", а ў пачатку 1972 г. Чыгуначным РК КПБ г. Віцебска быў рэкамендаваны на пасаду дырэктара завода жалезабетонных вырабаў трэста "Віцебскаблсельбуд". Але ў лістападзе таго ж году вызвалены ад пасады, не справіўшыся з працаю[1]. У 1972 г. на пасаду дырэктара Магілёўскага райбыткамбіната быў прызначаны той, які раней растраціў чужыя грошы і не меў ніякага дачынення да службы быту. Доўгі час у г. Магілёве ставілі ў прыклад, як лепшага кіраўніка, дырэктара завода тэхналагічнага абсталявання або тады яшчэ ложкавага завода. А потым высветлілася, што на заводзе выпускалася няякасная прадукцыя, квітнела ашуканства, незаконна выдаваліся грашовыя прэміі[2].

Усе гэтыя з'явы былі магчымыя таму, што і сярод партыйнага кіраўніцтва назіраліся негатыўныя тэндэнцыі злоўжывання ўладаю. За ганебныя паводзіны і розныя правіны былі вызваленыя ад працы старшыні райвыканкамаў (1970–1971): Краснапольскага, Клічаўскага, Кіраўскага. За праяўленую нясціпласць пры вырашэнні жыллёва-кватэрных пытанняў былі пакараныя ў рознай меры старшыні Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Хоцімскага райвыканкамаў[3]. У 1972 г. сакратар Віцебскага АК КПБ, выступаючы на пленуме, адзначыў факты "гаспадарчага абрастання і выкарыстання службовага становішча ў асабістых мэтах"[4].

Замест таго, каб наводзіць парадак у раёнах, каб папярэджваць разнастайныя парушэнні, яны самі паказвалі дрэнны прыклад. Падобнае інспектарскай групай ЦК КПБ было выяўлена пры неабгрунтаванай замене кватэр адказнымі работнікамі Магілёўскага аблвыканкама і абкама КПБ.

На пасяджэнні сакратарыяту Магілёўскага АК КПБ 06.05.1975 г. разглядалася запіска інспектарскай групы ЦК КПБ аб фактах неабгрунтаванай замены кватэр асобнымі кіраўніцкімі работнікамі. Было адзначана, што некаторыя работнікі кіравання абкама КПБ (адзін з іх на той час старшыня партыйнай камісіі пры абкаме КПБ, другі загадчык аддзела АК КПБ) і аблвыканкама праявілі нясціпласць, якая праявілася ў тым, што яны без дастаткова абгрунтаваных прычын прасілі замену кватэр і атрыманне жыллёвай плошчы, якая перавышала санітарныя нормы на аднаго чалавека. Члены сакратарыяту спачатку былі за тое, каб выдзяліць "сваім" кватэры ў элітным на той час доме, а затым на словах асудзілі падобнае. Прызналі, што пры размеркаванні кватэр у жылом доме № 18 па зав. Юбілейнаму з боку сакратарыяту абкама КПБ не было праяўлена прынцыповасці да просьбаў аб паляпшэнні жыллёвых умоў асобных кіраўніцкіх партыйных і савецкіх

[1] Протокол XI пленума Витебского областного комитета КПБ 28–29.11.1972 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8. Арк. 14-15
[2] Протокол заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 181-186.
[3] Там жа. Арк. 184, 176-177.
[4] Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8. Арк. 17.

работнікаў[1]. Прычым асуджэнне факта адбылося толькі пасля ўмашальніцтва ЦК КПБ. Гэта прыклад таго, што мясцовае насельніцтва добра ведала становішча ў горадзе і аб злоўжываннях, усведамляла безвыніковасць зваротаў да абласных уладаў і таму звярталася ў ЦК КПБ.

У Гомельскай вобласці за злоўжыванні (1975) былі вызвалены ад пасады намеснік старшымі аблвыканкама, старшыня Гомельскага гарвыканкама, намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама, другі сакратар Мазырскага РК КПБ; два адказныя работнікі аблвыканкама і першы сакратар Гомельскага ГК КПБ атрымалі партыйныя пакаранні і інш.[2] У 1979 г. на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ у чарговы раз (падобнае было ў 1975, 1977) разглядалася пытанне "Аб Запісцы партыйнай камісіі пры ЦК КПБ аб злоўжываннях некаторых кіраўніцкіх работнікаў Гомельскай вобласці"[3].

Падчас пленума Магілёўскага АК КПБ 11.04.1979 г. у сваім дакладзе, прысвечанаму працы з кадрамі, першы сакратар абкама В. Прышчэпчык прывёў прыклады, "чужыя нашаму ладу жыцця": начальнік трубаліцейнага цэха металургічнага завода (член КПСС) на лецішчы пабудаваў сабе дом з верандаю, лазню, сарай, пограб, узвёў у мікрараёне "Мір" гараж. Пры гэтым выкарыстаў дэфіцытныя будаўнічыя матэрыялы, якія па дзяржаўнаму кошту набыў на заводзе. У будаўніцтве гэтых аб'ектаў бралі ўдзел (у працоўны час) падпарадкаваныя яму асобы. У 1975 г. прадаў аўтамабіль "Волга" і адразу набыў "Жыгулі" праз Бялыніцкі райспажыўсаюз. У 1978 г. прадаў свае "Жыгулі" і тут жа новыя набыла яго жонка па месцы сваёй працы на заводзе зборнага жалезабетона. Падобныя "дачы" пабудавалі члены КПСС: галоўны механік металургічнага завода, намеснік галоўнага механіка, энергетык трубаліцейнага цэха і іншыя[4].

Падводзячы вынікі працы бюро Магілёўскага АК КПБ, В. Прышчэпчык адзначыў, што за 1976–1977 гг. на пленумах і бюро абкама, гаркамаў і райкамаў КПБ разгледжана больш за 230 пытанняў, якія тычыліся паляпшэння працы кадраў: "Памылкі ў падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў – адна з галоўных прычын даволі вялікай змяняльнасці работнікаў, адставання шэрагу прадпрыемстваў прамысловасці, будаўнічых арганізацый, калгасаў і саўгасаў. За два гады вызвалена ад пасад 80 работнікаў наменклатуры абкама КПБ, якія страцілі аўтарытэт нявартымі паводзінамі і па сваіх дзелавых і маральных якасцях не маглі больш заставацца на адказных пасадах… Шмат фактаў, калі асобныя "гора-кіраўнікі" казалі адно, абвяшчалі з трыбуны аб высокіх маральных якасцях, а рабілі зусім іншае, па вушы залазілі ў бруд хцівасці, гублялі сумленне, запускалі руку ў дзяржаўную кішэню"[5].

---

[1] Протокол заседания секретариата Могилёвского обкома КПБ от 6.05.1975 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 48. Арк. 55-58.

[2] Протокол XIX Гомельской областной партийной конференции (1975) // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 55.

[3] Записка партийной комиссии при ЦК КПБ о злоупотреблениях некоторых руководящих работников Гомельской области // Там жа. Воп. 153. Спр. 111. Арк. 2–7.

[4] Протокол № 2 заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 11.04.1979 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 162. Спр. 12. Арк. 35.

[5] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // Там жа. Воп. 159. Спр. 109. Арк. 127-129.

За 1971–1975 гг. органамі народнага кантролю за прыпіскі і падман дзяржавы, праявы месцніцтва ў Магілёўскай вобласці былі прыцягнуты да адказнасці 644 пасадавыя асобы[1], што складала 4,47 % наменклатуры Магілёўскага абкама, гаркамаў і райкамаў КПБ вобласці, у склад якой ўваходзілі 14393 чал.[2] За 1976–1978 гг. змянілася 47 загадчыкаў аддзелаў і 135 інструктараў гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, і толькі 48 % з ліку работнікаў гаркамаў і райкамаў, якія змяніліся, былі вылучаны на больш адказную працу. Былі вымушаны (менавіта так адзначалася на ХХ Магілёўскай абласной партыйнай канферэнцыі) вызваліць ад пасад 110 чал. наменклатуры АК КПБ. За розныя парушэнні статута КПСС на 763 кіраўніцкіх работнікаў былі накладзены строгія партыйныя спагнанні. Да крымінальнай адказнасці прыцягнулі 2,5 тыс. раскрадальнікаў народнага дабра, больш за 40 тыс. чал. трапілі ў медвыцвярэзнік[3]. У Віцебскай вобласці за 1975–1980 гг. больш за 100 кіраўнікоў за розныя злоўжыванні атрымалі спагнанні па лініі КПСС, 27 былі вызвалены ад пасад. У наступны перыяд сітуацыя ў вобласці толькі пагаршалася. Так, толькі за 1981 г. былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 138 кіраўнікоў[4].

Партыйнай камісіяй пры Магілёўскім абкаме КПБ 18.08.1982 г. разглядалася персанальная справа былога генеральнага дырэктара ВА "Бабруйскшына" (са жніўня 1978 па люты 1982), 1936 года нараджэння, які меў вышэйшую адукацыю, члена КПСС з 1971 г. На момант разгляду справы, працаваў намеснікам дырэктара па капітальнаму будаўніцтву Бабруйскага скуркамбіната. У свой час (25.11.1981) бюро Бабруйскага гаркама КПБ аб'яўляла яму строгую вымову з занясеннем ва ўліковую картку "за непрыняцце належных мер па забеспячэнні захаванасці сацыялістычнай уласнасці, злоўжыванне службовым станам у карыслівых мэтах" і вызваліла ад пасады[5]. Бабруйскі гарвыканкам, разгледзеўшы на сваім пасяджэнні 16.04.1982 г. прадстаўленне пракуратуры БССР, даў згоду на прыцягненне яго да крымінальнай адказнасці (быў дэпутатам гарсавета)[6]. Пракуратура БССР абвінавачвала яго ў прысваенні камплектаў футбольнай формы, падараваных фірмай "Круп" футбольнай камандзе "Шыннік", крадзеж сумесна з іншымі асобамі 140 л спірту на суму 2 353 руб., прысваенне 20 кв.м паліраваных шчытоў коштам 170 руб., 15 кв.м абліцовачнай пліткі коштам 97 руб., атрыманне ад падначаленых асоб (незаконна прэміраваных) 600 руб. і інш. Вінаватасць у здзяйсненні названых злачынстваў пацвярджалася актамі дакументальных рэвізій, бухгалтарскімі і іншымі дакументамі, рэчавымі

[1] Доклад "Основные итоги развития народного хозяйства Могилевской области за 1971-1975 годы" // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 2. Арк. 10, 14–15.
[2] Протокол заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // Там жа. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 171.
[3] Протокол ХХ Могилевской областной партийной конференции от 26.01.1979 г. // Там жа. Воп. 162. Спр. 2. Арк. 41, 57.
[4] Протокол VII пленума Витебского областного комитета КПБ. 02.09.1982 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 154. Спр. 11. Арк. 86.
[5] Справка от 18.08.1982 г. партийной комиссии при Могилёвском обкоме КПБ // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 170. Спр. Спр. 80а. Арк. 74.
[6] Решение № 36-16 от 16.04.1982 Бобруйского горисполкома // Там жа. Арк. 77.

доказамі, паказаннямі сведак[1]. Быў выяўдены склад злачынства, прадугледжаны п. 4.3 арт. 91 Крымінальнага кодэкса БССР – крадзёж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці ў буйных памерах.

Па дадзеных пракуратуры БССР, у 1986 г. здзейснілі злачынствы 114 дэпутатаў мясцовых саветаў, а за першае паўгоддзе 1987 г. – 52 дэпутаты, у тым ліку: супраць сацыялістычнай уласнасці – 71, службовыя злачынствы – 23, злачынствы, звязаныя з парушэннем правілаў аховы працы і тэхнікі бяспекі – 16, аўтатранспартныя – 13, забойствы – 2, згвалтаванні – 2, хабарніцтва – 3, прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў – 3, самагонаварэнне – 12, прыпіскі – 7, хуліганства – 4, парушэнне правілаў гандлю – 5, іншыя – 5. У Гомельскай вобласці ўчынілі злачынствы 36 дэпутатаў, у Магілёўскай – 34, Брэсцкай – 32, Гродзенскай – 28, Віцебскай і Мінскай абласцях па 18 дэпутатаў. З агульнай колькасці за 1986 г. і першае паўгоддзе 1987 г. прыцягнулі да крымінальнай адказнасці і былі асуджаныя 76 дэпутатаў (45,6 %). У дачыненні да 39 дэпутатаў справы спынены праваахоўнымі органамі па розных падставах, у асноўным па амністыі. Мясцовыя саветы дэпутатаў або іх выканаўчыя камітэты адмовілі органам пракуратуры ў згодзе на прыцягненне да крымінальнай адказнасці 51 дэпутата, якія ўчынілі злачынствы. Падобнае мела месца ў мясцовых саветах Брэсцкага, Пружанскага і Івацэвіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці, Ушацкага і Талачынскага раёнаў Віцебскай вобласці, Рэчыцкага і Мазырскага раёнаў Гомельскай вобласці[2].

На пасяджэнні прэзідыума СМ БССР 28.07.1988 г. разглядалася пытанне "Аб стане працы ў Міністэрствах і ведамствах БССР, выканкамах Саветаў народных дэпутатаў, аб'яднаннях, на прадпрыемствах і ў арганізацыях рэспублікі па барацьбе з прыпіскамі і ашуканствам у святле патрабаванняў пастановы СМ БССР ад 31.08.1987 г. № 280", дзе было адзначана, што актыўна вядзецца барацьба з прыпіскамі і ашуканствам. Але ў 1987 г. рэвізіямі і праверкамі на 6 тыс. прадпрыемствах і арганізацыях выяўлены незаконныя выплаты, нястачы і крадзяжы грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцяў на суму 5,7 млн руб. Скажэнне справаздачных звестак выяўлена на 1 035 прадпрыемствах і ў арганізацыях БССР. У выніку службовыя асобы незаконна атрымалі 188 тыс. руб. прэмій[3].

Структурамі Камітэта народнага кантролю (КНК) за 1989 г. было выяўлена звыш 7,3 тыс. выпадкаў прыпісак, прыцягнута да адказнасці больш за 21 тыс. службовых асоб; за парушэнні і злоўжыванні атрымалі спагнанні 79 і па выніках праверак былі вызвалены ад працы 60 службовых асоб розных кантрольных органаў. У выніку праверак былі спынены незаконныя, спекулятыўныя дзеянні кааператываў у розных сферах. Шэраг кааператываў, якія груба парушалі патрабаванні Закона СССР "Аб кааперацыі ў СССР", былі

[1] Информация прокурора БССР А.И. Могильницкого в исполком Бобруйского городского совета народных депутатов // Там жа. Арк. 80.
[2] Письмо Президиума ВС БССР от 02.09.1987 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 825-827.
[3] Выписка из протокола № 14 заседания президиума СМ БССР от 28.07.1988 г. «О состоянии работы в Министерствах и ведомствах БССР, исполкомах Советов народных депутатов, объединениях, на предприятиях и в организациях республики по борьбе с приписками и очковтирательством в свете требований постановления СМ БССР от 31.08.1987 г. № 280» // Там жа. Спр. 3784. Арк. 154.

зачыненыя[1]. У 1990 г. у Магілёўскай вобласці было выяўлена за год 6 657 злачынстваў, звязаных з атрыманнем непрацоўных даходаў, з іх 25 фактаў хабарніцтва і звыш 500 спекулятыўных здзелак[2].

Такім чынам, аналіз матэрыялаў трох абласных камітэтаў кампартыі дазваляе выявіць пралікі і недахопы ў кадравай палітыцы. Варта падкрэсліць, што прааналізаваны толькі тыя прыклады, якія немагчыма было схаваць ад грамадскасці. Шматлікія факты па ідэалагічных прычынах замоўчваліся і не даводзіліся да ведама шэраговых партыйцаў.

Найбольшая колькасць фактаў злоўжыванняў уладаю ў прамысловасці адносілася да прыпісак (адбываўся падман дзяржавы), у выніку чаго кіраўніцтва прадпрыемстваў, а таксама шэраг адказных асоб у міністэрствах і рэгіянальных выканаўчых органах, незаконна атрымоўвалі грашовае ўзнагароджванне, паляпшалі свой матэрыяльны дабрабыт. Прыпіскі і ашуканства ставяць пад сумненне дакладнасць справаздачных лічбаў аб выкананні планаў і праграм гаспадарчага развіцця БССР.

Неабходна адзначыць, што ў 1970–1980-я гг. павялічвалася колькасць растрат і крадзяжоў, у выніку чаго народнай гаспадарцы наносіліся вялікія матэрыяльныя страты. За ўвесь час пабудовы сацыялізму і камунізму партыйна-савецкае кіраўніцтва так і не вырашыла, сярод іншых, праблему ашуканства і крадзяжоў нават у асяродку кіраўніцкіх кадраў. У шэрагу гарадоў і раёнаў “не заўважалі” факты прыпісак і падману дзяржавы, памяркоўна адносіліся да тых работнікаў, якія скампраментавалі сябе, і ім вельмі часта знаходзілі новыя кіраўніцкія пасады. Усё гэта выклікала сацыяльную напружанасць у грамадстве, незадавальненне насельніцтва дзейнасцю органаў улады і кіравання, міліцыяй рэспублікі. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва губляла аўтарытэт, што разам з эканамічнымі праблемамі стала адной з прычын распаду СССР.

### 4.4 Меры цэнтральных і рэгіянальных улад па пераадоленні эканамічных і сацыяльных праблем у прамысловасці (1970–1991)

Эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў прамысловасці БССР нічым не адрозніваліся ад агульнасаюзных. Аналіз найбольш характэрных пытанняў, якія задаваліся работнікамі прадпрыемстваў усходнебеларускіх абласцей у ходзе выступленняў лектараў і дакладчыкаў інфармацыйна-прапагандысцкіх груп абласных камітэтаў КПБ у 1979–1980 гг. паказаў, што сярод іншага працоўныя найбольш цікавіліся наступным: чаму мелі месца перабоі ў забеспячэнні і недахоп у крамах мясапрадуктаў, рыбы, баваўняных і льняных тканін, сметанковага масла, гаспадарчага і туалетнага мыла, іншых прадметаў штодзённага попыту; раней было заканамерным зніжэнне коштаў, а цяпер цэны часцей павышаліся. Адзначалася, што шмат казалася аб барацьбе з п’янствам і

[1] О работе Комитета народного контроля СССР в 1989 г. // Там жа. Спр. 3970. Арк. 177-178.
[2] Информация Могилевского облисполкома в СМ БССР от 22.03.1991 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 4065. Арк. 670.

пры гэтым адбывалася павелічэнне вытворчасці спіртных напояў[1]. Звярталася ўвага на экалагічныя праблемы, напрыклад, наколькі вялікая небяспека радыеактыўнага заражэння мясцовасці пры будаўніцтве і эксплуатацыі атамных электрастанцый[2]. Працоўныя калектывы хвалявалі: адсутнасць або недахоп неабходных сродкаў для рэканструкцыі прадпрыемстваў, недахоп жылля, несвоечасовыя пастаўкі будаўнічых матэрыялаў і запчастак, невыкананне паставак ад сумежнікаў, недастатковае і несвоечасовае фінансаванне, нерытмічнасць у працоўным працэсе, наяўнасць на вытворчасці прагулаў, парушэнняў працоўнай дысцыпліны, прастояў з-за невыканання сваіх абавязацельстваў іншымі прадпрыемствамі[3].

Як адзначаў прафесар У. Навіцкі, кіраўніцтва краіны разумела, што выйграць эканамічнае саперніцтва з развітымі краінамі, даказаць перавагу сацыялістычнага ладу немагчыма без пераводу гаспадарчага комплексу на інтэнсіўны шлях развіцця[4], таму сістэматычна на сваіх пасяджэннях разглядалі эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў прамысловасці і кадравай сферы, прымаліся пастановы і прапановы па выпраўленні недахопаў. Але пытанне ў тым, наколькі яны былі актульнымі і эфектыўнымі ў тагачасным грамадстве. Год ад году праблемы не вырашаліся цалкам, а абвастраліся.

У рэспубліцы, нягледзячы на прынятыя меры па павышэнні эфектыўнасці прамысловага комплексу, укладзеныя ў яго развіццё сродкі давалі нізкую канечную аддачу. За 1971–1985 гг. кошт асноўных фондаў у БССР павялічыўся ў 3,4 раза, а фондааддача знізілася на 29 %. Тэмпы павышэння вытворчасці працы адставалі ад прыросту яго фондаўзброенасці. Штогод 5–7 % прадпрыемстваў і аб’яднанняў не выконвалі планы рэалізацыі прадукцыі і вытворчасці працы, амаль кожнае шостае парушала дагаворную дысцыпліну. За кошт навукова-тэхнічных мерапрыемстваў забяспечвалася толькі 50 % прыросту вытворчасці працы[5]. Партыйнаму і гаспадарчаму кіраўніцтву не ўдалося ажыццявіць інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі рэспублікі.

На працягу 1970–1980-х гг. асаблівых мер цэнтральных і рэгіянальных уладаў патрабавала вырашэнне шэрагу сацыяльна-эканамічных праблем, якія аказвалі непасрэдны ўплыў на фарміраванне, змест і ўдасканаленне кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР.

**Тэхнічная рэканструкцыя прамысловых прадпрыемстваў і вытворчасці.** Для паляпшэння матэрыяльнага ўзроўню насельніцтва і вырашэння сацыяльных праблем прыкладаліся намаганні па павялічэнні колькасці і якасці выпускаемай прадукцыі як для забеспячэння ўнутранага

---

[1] Перечень характерных вопросов, поступивших от трудящихся области в ходе выступлений лекторов, докладчиков, информационно-пропагандистских групп в 4 квартале 1979 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 71. Арк.11-12.

[2] Перечень характерных вопросов, поступивших от трудящихся Могилёвской области в ходе выступлений лекторов, докладчиков, информационно-пропагандистских групп во 2 квартале 1980 г. // Там жа. Спр. 72. Арк. 5–6.

[3] Перечень критических замечаний, предложений и просьб, высказанных в адрес союзных министерств и производственных объединений на отчётных собраниях и конференциях первичных партийных организаций Могилёвской области в 1980 г. // Там жа. Арк. 113-118; 183-195.

[4] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 387.

[5] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 387; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 388.

рынку, так і атрымання фінансавых сродкаў шляхам вырабу прадукцыі, арыентаванай на экспарт. Для гэтага будаваліся новыя і праводзілася рэканструкцыя пабудаваных прамысловых прадпрыемстваў, якая рэалізоўвалася марудна і непаслядоўна. У БССР мелася шмат тэхнічна адсталых прадпрыемстваў, аснашчаных састарэлай тэхнікай, што адмоўна адбівалася на павышэнні прадукцыйнасці працы, выніках усёй вытворчай дзейнасці калектываў. Нягледзячы на вялікія намаганні працоўных калектываў, не быў забяспечаны дэклараваны выхад народнай гаспадаркі рэспублікі на якасна новы навукова-тэхнічны і эканамічны ўзровень. БССР не дабілася рашучага зруху ў інтэнсіфікацыі вытворчасці, павышэнні яе эфектыўнасці. Шматлікімі былі факты безгаспадарчасці. У 1972 г. 6,3 % прадпрыемстваў дапусцілі перарасход паліва, 7,1 – электраэнергіі, 6,5 % – цеплавой энергіі[1]. Падобнае было і ў наступнае дзесяцігоддзе. Напрыклад, на Аршанскім інструментальным заводзе назіралася павелічэнне вагі адходаў і страт у агульным спажыванні металу: у 1981 г. яны складалі 49 %, 1985г. – 52 %[2].

Шматлікія пастановы партыі і ўрада аб навукова-тэхнічным прагрэсе заставаліся ў асноўным заклікамі і па сутнасці не аказвалі істотнага ўплыву на паскарэнне вытворчага працэсу. З аднаго боку, развіццё навукі ў Беларусі, як і ў СССР у цэлым, стварала значныя магчымасці для яе дзейснага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з прамысловасцю і іншымі галінамі гаспадаркі. З другога боку, вынікі супрацоўніцтва былі недастатковымі, распрацоўкі вучоных нярэдка доўгі час заставаліся не ўкаранёнымі ў вытворчасць, страчвалі сваю каштоўнасць.

Не з поўнай аддачаю працавалі лабараторыі, вопытна-эксперыментальныя і канструктарскія падраздзяленні, у якіх налічвалася 5 755 высокакваліфікаваных спецыялістаў. Напрыклад, у Магілёўскім ВА “Хімвалакно” мелася 4 буйныя навукова-даследчыя лабараторыі, вопытная ўстаноўка, вопытны цэх, цэхавыя лабараторыі, на той час самае сучаснае навуковае абсталяванне, магутны парк ЭВМ, значныя грашовыя сродкі. У той жа час у аб’яднанні не праводзіліся буйныя навукова-даследчыя працы, недастаткова плённа выкарыстоўвалася абсталяванне, не вяліся ў шырокім маштабу навуковыя эксперыменты. За год укаранялася 8–10 заявак, публікацый было ўдвая менш, не рыхтаваліся ўласныя навуковыя кадры[3].

Былі станоўчыя і плённыя прыклады супрацоўніцтва прадпрыемстваў БССР з Усесаюзнымі НДІ і праектнымі інстытутамі, Акадэміяй навук БССР. Толькі Аршанскім інструментальным заводам у 1980-я гг. было заключана 53 дамовы, у тым ліку 32 дамовы з Украргстанкапрамам (Харкаў, Украіна), 9 дамоў з УсеНДІ вымярэнняў (Масква, РСФСР), 5 дамоў з Акадэміяй навук БССР і інш. Завод паспяхова супрацоўнічаў з Харкаўскі інстытутам “Украргстанкапрамам” па ўкараненні прагрэсіўных і тыпавых тэхналагічных працэсаў вырабу рэжучага

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 387.
[2] Рещение постоянной комиссии по промышленности Оршанского городского Совета народных депутатов от 26.06.1986 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1050. Арк. 30.
[3] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 159. Спр. 109. Арк. 18-19.

інструменту, з Акадэміяй навук БССР па ўкараненні тэхналагічнага працэсу гарачага выдушвання стружкавых канавак метчыкаў; з ЦНДІТК г. Мінска па стварэнні інтэграванай сістэмы вытворчасці; з ЦНДІТК, СКБС і СКТБІ (Масква,РСФСР) па ўкараненні ў цэху дапаможнай прылады гнуткага вытворчага ўчастка, з ЭНІМС (Вільнюс, Літва) па распрацоўцы тэхналагічных працэсаў оптыкі[1].

На прадпрыемствах укаранялася і дзейнічала "Палажэнне аб матэрыяльным заахвочванні экспертаў, тэхінфарматараў, рабочых, ІТР і служачых, якія прымалі актыўны ўдзел у падборы, вывучэнні і ўкараненні ў вытворчасць перадавога вопыту іншых прадпрыемстваў".

Шмат рэзерваў мелася ў тэхнічнай творчасці рабочых і спецыялістаў, дзейнасці вынаходнікаў і рацыяналізатараў. У 1972 г. толькі на прадпрыемствах і ў арганізацыях мясцовай прамысловасці БССР у тэхнічнай творчасці ўдзельнічалі 3 137 чал. За гэты час укаранілі ў вытворчасць 2 976 рацыяналізатарскіх прапаноў і 20 вынаходстваў з гадавым эканамічным эфектам 2 361,1 тыс. руб. Заданне па эканоміі ад укаранення вынаходстваў і рацпрапаноў выканалі на 113,3 %. Найлепшых вынікаў у пастаноўцы рацыяналізатарскай працы за 1971 г. дасягнулі: Гомельскі завод шклоабсталявання, Барысаўская фабрыка піяніна, Магілёўскі металургічны завод, Полацкі ліцейна-механічны завод, Ваўкавыскі завод металавырабаў[2].

У 1972 г. было прынята рашэнне праводзіць у Гомельскай вобласці абласны агляд-конкурс на лепшае прадпрыемства па ўкараненні вынаходстваў, рацыяналізатарскіх прапаноў і запазычаных наваўвядзенняў[3]. Як вынік, за 1974–1975 гг. у Гомельскай вобласці ўнеслі больш за 21 000 рацыяналізатарскіх прапаноў, якія былі накіраваны на паляпшэнне арганізацыі працы і вытворчасці. За 4,5 гады IX пяцігодкі ад укаранення ў вытворчасць 87 000 рацпрапаноў і больш за 1000 вынаходстваў атрымалі эканамічны эфект – 92 млн руб.[4] У Віцебскай вобласці за 1971–1974 гг. рацыяналізатарамі Оршы і Барані было пададзена і ўкаранёна 12 618 рацыяналізатарскіх прапаноў і 162 заяўкі на меркаваныя вынаходствы з эканамічным эфектам у суме 8,8 млн руб[5]. Прамысловыя прадпрыемствы Магілёўскай вобласці за 1975–1976 гг. укаранілі больш 150 мерапрыемстваў па механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці, перадавой тэхналогіі і выпуску новых відаў тавараў[6].

У 1976–1980 гг. у прамысловасці БССР было пададзена 542,8 тыс. рацпрапаноў і заявак на вынаходніцтвы, эканамічны эфект ад іх выкарыстання

---

[1] Справка о проведенной работе по ускорению внедрения научно-технического прогресса на Оршанском инструментальном заводе (1986 г.) // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1050. Арк. 26, 27.

[2] Приказ № 37 от 11.02.1972 г. Министерства местной промышленности БССР "Об итогах работы по рационализации и изобретательству за 1971 год и мерах по улучшению её в 1972 г. на предприятиях местной промышленности БССР" // ДАМаг. Ф. 2827. Воп. 1. Спр. 526. Арк. 50–53.

[3] Протоколы заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 137. Спр. 8. Арк. 92, 181-183.

[4] Протокол XIX Гомельской областной партийной конференции (1975) // Там жа. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 161.

[5] Протокол одиннадцатой сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 23 января 1975 года // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 18.

[6] Решение № 47 от 30.03.1977 г. Могилевского областного Совета депутатов «О работе исполкома областного Совета За 1975–1976 гг.» // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2228а. Арк. 285-286.

склаў 594,9 млн руб.[1] Па справаздачах за 1980 г., колькасць вынаходнікаў і рацыяналізатараў у рэспубліцы складала 158,8 тыс. чалавек, з іх 101 тыс. у прамысловасці. За 10 папярэдніх гадоў тут выкарысталі 792,3 тыс. вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў, эканомія ад іх склала 483,7 млн руб.[2]

Аднак вынікі рацыяналізатарскай дзейнасці наватараў маглі быць значна большымі і эфектыўнымі. Галоўнай перашкодай было тое, што, развіваючыся на экстэнсіўнай аснове, прадпрыемствы былі мала ўспрымальнымі да радыкальнай мадэрнізацыі вытворчасці, яе тэхнічнага пераўзбраення. У арганізацыі работы было шмат бюракратычнай валакіты. Адміністрацыя фабрык і заводаў не заўсёды аказвала належную дапамогу ў укараненне тэхнічных навін. Напрыклад, на Крычаўскім заводзе гумавых вырабаў, Магілёўскай мэблявай фабрыцы, Клімавіцкім камбінаце будаўнічых матэрыялаў, Горацкім машынабудаўнічым заводзе і іншых прадпрыемствах[3]. У 1978 г. на прамысловых прадпрыемствах рэспублікі і ў іншых арганізацыях не было выкарыстана звыш 20 тыс. прынятых рацпрапаноў. Да таго ж у тэхнічнай творчасці пераважалі дробныя распрацоўкі[4]. У 1986 г. на Аршанскім заводзе плаўленых сыроў было пададзена 17 рацыяналізатарскіх прапаноў з эканамічным эфектам толькі 2,1 тыс. руб.[5]

Праблемы навукова-тэхнічнага прагрэсу, тэхнічнай рэканструкцыі прадпрыемстваў краіны былі абмеркаваны на нарадзе ў ЦК КПСС 11.06.1985 г. У той жа месяц яе вынікі разгледзеў партыйна-гаспадарчы актыў БССР, які зацвердзіў мерапрыемствы па паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу. Прадугледжвалася аб'наўленне тэхнікі, асноўных вытворчых фондаў, укараненне сродкаў аўтаматызацыі і вылічальнай тэхнікі, паскоранае развіццё ва ўсіх галінах гаспадаркі цэхаў і ўчасткаў па выпуску сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі, мадэрнізацыі абсталявання, актывізацыі тэхнічнай вытворчасці працоўных. Рэалізаваць гэта ў БССР у поўным аб'ёме не атрымалася. У 1986 г. кожная шостая рацыяналізатарская прапанова не знаходзіла прымянення. Больш за палову вынаходстваў праходзілі ўкараненне ў тэрмін ад 3 да 10 гадоў[6]. Адбывалася нават такое. У 1986 г. на ВА "Гомсельмаш" распрацавалі 35 новых канструктыўных рашэнняў, а паскарэннем іх укаранення ў вытворчасць вымушана была займацца спецыяльная камісія ЦК КПБ[7].

Варта адзначыць, што дасягненнямі першага этапу навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, дзякуючы вялізнай канцэнтрацыі рэсурсаў на параўнальна нешматлікіх напрамках, СССР у цэлым скарыстаўся, але другі этап НТР, які пачаўся ў 1970-я гг. з вынаходства мікрапрацэсараў, масавай камп'ютарызацыі і

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 388.
[2] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 396.
[3] Протокол заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 159. Спр. 109. Арк. 18.
[4] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 388.
[5] Справка о работе администрации завода плавленых сыров по выполнению закона СССР "О трудовых коллективах и повышении их роли в управлении предприятиями и организациями" // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1050. Арк. 32.
[6] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 397, 546.
[7] Письмо СМ БССР от 13.02.1987 г. в ЦК КПБ "О положении дел на ПО "Гомсельмаш" // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2014. Арк. 70.

характарызаваўся рэзкім пашырэннем размаху і тэмпаў навуковых і тэхналагічных адкрыццяў, слаба закрануў савецкую эканоміку, чые экстэнсіўныя рэсурсы развіцця хутка вычэрпваліся (за выключэннем абаронных галін).

**Праблема працоўнай дысцыпліны** ў індустрыяльным комплексе Беларусі пачала абвастрацца з пачатку 1970 гг. У 1970 г. на прадпрыемствах г. Оршы здзейснілі прагул 1 619 чал. або ў 2,4 разы больш, чым у 1969 г. Прагулы склалі ў 1970 г. – 6 304 чалавека-дзён[1]. На прадпрыемствах г. Наваполацка за 1970 г. прагулы склалі 1 180 чалавека-дзён[2], за 1980 г. 701 чалавека-дзён[3]. На Магілёўскім ліфтабудаўнічым заводзе ў 1971 г. мела месца 752 чалавека-дні прагулаў. За год работнікам завода было аб'яўлена 279 дысцыплінарных спагнанняў, 45 работнікаў звольненыя за п'янства і прагулы[4]. За 1974 г. на прамысловых прадпрыемствах г. Орша страты працоўнага часу за год склалі 24 733 чалавека-дні. Гэта як больш за 100 чалавек не працавалі на працягу ўсяго года. Асабліва вялікія страты былі на мясакансервавым камбінаце, трыкатажнай і швейнай фабрыках – 1 388 рабочых здзейснілі 3 577 дзён прагулаў[5]. На заводзе "Легмаш" прагулы здзейснілі 410 рабочых, трактарарамонтным заводзе – 102, камбінаце ЖБВіК – 106, заводзе "Чырвоны барацьбіт" – 93 і мясакансервавым камбінаце – 59[6]. У 1987 г. на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці страты працоўнага часу з-за прагулаў склалі 673 чал. дні, у 1988 г. 777 чал. дзён, адбылося павялічэнне колькасці прагулаў на 15,5 %[7].

Працоўная дысцыпліна заставалася нізкай і сярод рабочай моладзі. У БССР за 1981–1985 гг. на працу былі накіраваны 92 % ад агульнай колькасці выпускнікоў, якія скончылі дзённыя прафесійна-тэхнічныя вучылішчы. Але толькі 63 % выпускнікоў замацаваліся на вытворчасці. На працягу 1983–1985 гг. ад агульнай колькасці ўсіх выбыўшых: 73 % былі прызваны ў войска, 11 % выбылі ў сувязі з пераменай месца жыхарства, 9 % звольнены за прагулы і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны[8]. У 1983 г. за прагулы і іншыя парушэнні ў БССР было звольнена 6 тыс. маладых рабочых. У студзені–верасні 1984 г.

---

[1] Резервы и возможности для успешного выполения пятилетнего плана на 1971–1975 гг. промышленностью города Орша Витебской области // ЗДАОрш. Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23. Арк. 20, 21.

[2] Использование времени промышленно-производственных рабочих на предприятиях г. Новополоцка за 1970 г. // ЗДАПол. Ф. 1220. Воп. 1. Спр. 62. Арк. 84, 86.

[3] Использование времени промышленно-производственными рабочими по г. Новополоцку за 1980 г. // Там жа. Спр. 216. Арк. 9.

[4] Протокол заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 29.04.1972 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15. Арк. 26-27.

[5] Отчётный доклад о работе исполкома Оршанского городского совета депутатов трудящихся и задачи по дальнейпему улучшению стиля и методов работы советских и хозяйственных органов на 13 сессии городского Совета (14 созыва). Май 1975 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 240.

[6] Доклад «О государственном плане развития народного хозяйства города Орши на 1975 год» на 11-й сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 23 января 1975 года // Там жа. Арк. 37.

[7] Справка о состоянии работы по подбору и расстановке кадров, исполнительской и трудовой дисциплины, совершенствованию организации труда в объединениях и на предприятиях Витебского облместпрома (1989) // ДАВц. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 189. Арк. 54.

[8] Письмо Центрального статистического управления БССР от 30.04.1986 г. в СМ БССР "О подготовке и повышении квалификации рабочих кадров в народном хозяйстве БССР" // НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 294. Арк. 9.

кожны трэці прагул, другое спазненне на працу былі дапушчаны юнакамі і дзяўчатамі[1]. З мэтай умацавання працоўнай дысцыпліны сярод моладзі праводзілася мэтанакіраваная праца. На прадпрыемствах з першых дзён знаходжання на працы маладыя людзі праходзілі ўрачысты рытуал пасвячэння ў рабочыя. Настаўнікі моладзі прадпрыемстваў прыкладвалі намаганні на тое, каб навічкі як мага хутчэй засвоілі вытворчасць, адаптаваліся да яе, выкарыстоўваліся разнастайныя формы працы з імі[2].

Партыйна-савецкае кіраўніцтва звязвала парушэнні працоўнай дысцыпліны не з вытворчымі і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі працы, а з недастатковым выкарыстаннем усяго арсенала выхаваўчых сродкаў для фарміравання ў шырокіх мас здаровых матэрыяльных патрабаванняў.

Перад працоўнымі калектывамі, партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі ставілася задача забяспечыць паляпшэнне работы па маральным выхаванні працоўных. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў пастановах бюро ЦК КПБ пры разглядзе пытання “Аб рабоце партыйных арганізацый Гомельскай вобласці па фарміраванні і развіцці здаровых матэрыяльных і духоўных запатрабаванняў працоўных” (29.03.1976)[3]; ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС “Аб далейшым умацаванні працоўнай дысцыпліны і скарачэнні цякучасці кадраў у народнай гаспадарцы” (снежань 1979). У лютым 1980 г. у БССР былі зацверджаны мерапрыемствы, скіраваныя на паляпшэнне выкарыстання рабочага часу, павышэнне арганізаванасці і дысцыпліны, стварэнне неабходных умоў для вытворчай працы[4]. У першай палове 1980 г. прайшоў грамадскі агляд выкарыстання рабочага часу ў БССР. На ўсіх узроўнях – ад прадпрыемстваў да абласцей і міністэрстваў функцыянавалі створаныя камісіі, якія садзейнічалі таму, што ў разліку на аднаго рабочага страты з-за прычыны прастояў, прагулаў і нявыхаду з дазволу адміністрацыі ў параўнанні з адпаведным перыядам

---

1 Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 392.

2 Нягледзячы на фармалізм і існаванне на паперы ў 1975–1980-я гг. з маладымі рабочымі праводзілася наступныя формы працы: абмеркаванне планаў і задач, якія стаялі перад калектывам, цэхам, брыгадай і перад кожным рабочым асабіста; распрацоўка памяткі з працоўнымі абавязкамі; кожнаму даваўся грамадскі абавязак (ад яго ўсяляк пазбаўляліся); за маладымі рабочымі замацоўваліся кадравыя рабочыя з мэтай аказання дапамогі ў арганізацыя працоўнага месца і перадачы прафесійнага майстэрства; накіраванне на вучобу ў вечаровыя школы, тэхнікумы, ВНУ за кошт сродкаў прадпрыемства; ахоплівалі ўсю працуючую моладзь эканамічнай адукацыяй; арганізацыя шэфства настаўнікаў над кожным маладым рабочым; прыцягвалі да правядзення рэйдаў па барацьбе за скарачэнне прастояў абсталявання; індывідуальнае спаборніцтва; спаборніцтва маладых рабочых за званне “Лепшы малады рабочы сваёй прафесіі”; удзел у спартовых мерапрыемствах; ахоплівалі падпіскай на газеты і часопісы; сустрэчы з ветэранамі працы; выдзяленне лепшым маладым рабочым ільготных пуцёвак у дамы адпачынку, турыстычных пуцёвак па СССР і за мяжу; паляпшэнне бытавых умоў (інтэрнат, жыллё для маладых сямей і спецыялістаў); стварэнне камсамольска-маладзёжных калектываў; удзел у руху “Ударнік камуністычнай працы”; уцягваліся ў школы перадавога вопыта лепшых маладых рабочых; стварэнне маладзёжных брыгад выдатнай якасці; далучалі да дзейнасці штабоў і пастоў якасці прадукцыі; удзел у конкурсах прафесійнага майстэрства па прафесіям; стварэнне комплексных творчых брыгад рацыяналізатараў; павышэнне кваліфікацыі, абучэнне другой прафесіі; удзел у аглядзе навукова-тэхнічнай творчасці; удзел у комплексных брыгадах, атрадах навукова-тэхнічнай творчасці моладзі, гуртках, школах маладога рацыяналізатара і вынаходніка; удзел у руху настаўніцтва.
Комплексный план работы по воспитанию молодёжи, работающей на предприятиях местной промышленности // ДАМаг. Ф. 2827. Воп. 1. Спр. 1085. Арк. 5-12.

3 Протокол заседания пленума Гомельского ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 155. Спр. 4. Арк. 1-155; Материалы к пленуму Гомельского ОК КПБ // Там жа. Воп. 155. Спр. 8. Арк. 51-54.

4 Протокол заседаний Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 24. Арк. 181-187; Материалы к заседанию бюро Гомельского ОК КПБ // Там жа. Воп. 155. Спр. 15. Арк. 84, 106-117.

папярэдняга года скараціліся ў прамысловасці на 17 %, будаўніцтве – 27, а цякучасць кадраў знізілася адпаведна на 13 і 15 %. У рэспубліцы разгарнулася індывідуальная работа з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны. У 1981 г. яе праводзілі каля 26 тыс. чалавек партыйнага і прафсаюзнага актыву. У ліпені 1983 г. з'явілася чарговая пастанова ЦК КПСС, СМ СССР і УсеЦСПС "Аб узмацненні работы па падняцці сацыялістычнай дысцыпліны працы". У мэтах выканання пастановы ў г. Наваполацку, напрыклад, была ўкаранёна сістэма ўліку руху працоўных рэсурсаў. У 1985 г. такая сістэма была ўведзена ў 24 гарадах рэспублікі[1].

Тым не менш, узровень працоўнай дысцыпліны не паўсюль адпавядаў патрабаванням вытворчасці, а гэта ўплывала на тое, што многія прадпрыемствы не выконвалі своечасова планавыя заданні, прыбягалі да штурмаўшчыны ў апошнія дні месяца.

**Рост заробкаў і ўмовы працы на прадпрыемствах.** Заробак, матэрыяльна-бытавыя ўмовы, захаванне заканадаўства аб працы і правіл тэхнікі бяспекі з'яўляюцца аднымі з асноўных паказчыкаў працы прадпрыемстваў.

Памер заробку ў разліку на аднаго працаўніка ў прамысловасці (як асноўнай крыніцы даходаў) стабільна павялічваўся. Напрыклад, у 1971 г. сярэдні заробак аднаго працоўнага, у цэлым па г. Орша, складаў 116 руб., што на 3 % вышэй, чым за адпаведны перыяд 1970 г. Самы высокі заробак быў на прадпрыемствах: завод ЖБВ "Сельбуд" – 149 руб.; драбільна-сартавальны завод, камбінат ЖБВіК – 140, завод "Чырвоны Барацьбіт", трактарарамонтны – 133 руб[2]. У студзені-верасні 1980 г. фактычная сярэднямесячная грашовая заработная плата аднаго працоўнага ў г. Орша склала 164,2 рублі і ў параўнанні з адпаведным перыядам 1979 г. узрасла на 1,3 %[3]. Адмоўным з'ўлялася тое, што на шэрагу прадпрыемстваў рост заробку апярэджваў рост прадукцыйнасці працы.

У пачатку 1970-х гг. аналіз матэрыяльна-бытавых умоў, захавання заканадаўства аб працы і правіл тэхнікі бяспекі засведчыў, што ў Савецкай Беларусі з-за шкодных умоў працы на прамысловых прадпрыемстах агульнае захворванне рабочых з часовай згубай працаздольнасці было даволі высокім. Напрыклад, у Бабруйску, асабліва на камбінаце другаснай сыравіны, вагавым і цагляным заводах; захворванне вышэй за сярэдні ўзровень быў на фабрыках імя Халтурына і імя Дзяржынскага. Высокі ўзровень траўматызму назіраўся на заводах імя Леніна, цагляным. Па нормах на прадпрыемствах Бабруйска павінны былі быць 64 пакоі гігіены для жанчын, а было – 27[4]. На Магілёўскім ліфтабудаўнічым заводзе толькі пасля дэпутацкіх праверак завяршылася будаўніцтва адміністрацыйна-бытавога корпуса, асвятленне ў цэхах і ўчастках

---

[1] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 391–393.
[2] Доклад об итогах выполнения плана развития народного хозяйства г. Орши за январь – сентябрь 1971 г. // ЗДАОрш. Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23. Арк. 252.
[3] Доклад об итогах выполнения государственного плана экономического и социального развития города Орши за январь-сентябрь 1980 года // Там жа. Воп. 5. Спр. 348. Арк. 28.
[4] Материалы по проверке стиля и методов работы Бобруйского горисполкома по управлению хозяйственным и социально-культурным строительством за 1969 год и первую половину 1970 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1769. Арк. 142.

стала адпавядаць норме, выдзелілі памяшканне пад здраўпункт, які забяспечылі сучасным на той час медыцынскім абсталяваннем, кожны цэх атрымаў санітарна-бытавыя памяшканні, была зроблена прамысловая наладка і выпрабаванні вентыляцыі завода[1]. На прадпрыемствах г. Орша ў 1974 г. адбыўся 221 выпадак вытворчага траўматызму з стратай 3 657 дзён працаздольнасці. Два выпадкі на заводзе “Чырвоны барацьбіт” і трактарарамонтным адбыліся са смяротным зыходам[2].

Нягледзячы на патрабаванні вытворчасці, працэс пераходу ад ручнай да механізаванай працы адбываўся марудна. Праведзены ў 1971–1974 гг. на прамысловых прадпрыемствах Оршы комплекс практычных мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці вытворчасці дазволіў давесці ўзровень механізацыі асноўнага вытворчасці да 67,2 %, у тым ліку ў машынабудаванні і металаапрацоўцы да 65,2 % (пры плане 70–75 %), лёгкай прамысловасці да 68 % (план 75–80 %), прадпрыемствах будаўнічай індустрыі да 71 % (план 80–85 %), на прадпрыемствах харчовай прамысловасці да 62,8 % (план 65–70 %). Павысіўся ўзровень механізацыі складскіх, пагрузачна-разгрузачных і транспартных работ да 78,9 % пры плане 50–55 %. 2 660 працоўных перавялі з цяжкай ручной працы на механізаваную[3]. У сярдзіне 1970-х гг. на прамысловых прадпрыемствах Гомельскай вобласці ступень ахопу механізаванай працай дапаможных рабочых складала толькі 30 % і за тры гады (1973–1975) яна павялічылася ў сярэднім усяго на 1 %. У аб’яднанні “Беларуснафта”, на прадпрыемствах лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці колькасць рабочых, занятых ручной працай, нават павялічылася. У Жлобінскім і Рэчыцкім раёнах на кожным трэцім прадпрыемстве, у Калінкавіцкім на кожным пятым больш за 80 % дапаможных рабочых выконвалі вытворчыя працэсы ўручную. У 1975 г. амаль палова ўсіх рабочых была занята ручной працай на прадпрыемствах Гомеля[4].

У 1977 г. удзельная вага работнікаў прамысловасці БССР, занятых ручной працай, дасягала 37,8 % ад усяго вытворчага персаналу. Нездавальняюча вялася работа па механізацыі працы на шэрагу прадпрыемстваў Брэста, Бабруйска, Гомеля, Оршы, Маладзечна, Барысава, дзе ручная праца ў прамысловасці складала ад 43 да 49 %[5]. У 1979 г. у Гомельскай вобласці на прадпрыемствах 35 % рабочых выконвалі тэхналагічныя аперацыі ўручную[6]. На пасяджэнні бюро Віцебскага АК КПБ 28.04.1984 г. было

[1] Сведения об организационно-массовой работе исполкома Могилевского городского Совета депутатов трудящихся в 1972 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Арк. 236-237.

[2] Отчётный доклад о работе исполкома Оршанского городского совета депутатов трудящихся и задачи по дальнейпему улучшению стиля и методов работы советских и хозяйственных органов на 13 сессии городского Совета (14 созыва). Май 1975 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 241; Доклад «О государственном плане развития народного хозяйства города Орши на 1975 год» на 11-й сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 23 января 1975 года // Там жа. Арк. 36-37.

[3] Информация «О ходе выполнения плана экономического и социального развития города Орши на 1971–1975 годы» на 12-й сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 22 марта 1975 года // Там жа. Арк. 147.

[4] Протокол XIX Гомельской областной партийной конференции (1975) // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 14.

[5] Протокол заседания Гомельского бюро ОК КПБ // Там жа. Воп. 140. Спр. 14. Арк. 20-21; Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 386–387.

[6] Протокол № 20 Гомельской областной партийной конференции (1979) // Там жа. Воп. 153. Спр. 78. Арк. 17-19. 19.

адзначана, што на Віцебскім заводзе гадзінкавых дэталяў з-за адсутнасці камплектнасці па ўкараненні сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі ўдзельная вага ручной працы складала 31,5 %[1]. Тым не менш, дзякуючы ўдасканаленню тэхнічнага ўзроўню вытворчасці, толькі ў 1976–1980 гг. з ручной на механізаваную працу перайшлі больш за 30 тыс. чалавек. Нягледзячы на гэта, у 1985 г. у прамысловасці БССР ручной працай быў заняты амаль кожны трэці рабочы[2].

Да сярэдзіны 1990 г. колькасць працоўных месцаў на прадпрыемствах і арганізацыях у Магілёўскай вобласці, дзе ўмовы працы прыведзены ў адпаведнасць з патрабаваннямі нормаў і правілаў аховы працы, склала каля 28 тыс., што дазволіла палепшыць умовы працы для 50,5 тыс. працоўных, у тым ліку для 21,7 тыс. жанчын, паменшыць колькасць занятых на цяжкіх фізічных работах на 4,6 тыс. чал., з якіх 1 400 жанчын. Абсталявалі дадаткова гардэробных памяшканняў на 52 тыс. месцаў, душавых на 5,2 тыс. У выніку прынятых мер знізіўся вытворчы траўматызм у параўнанні з 1988 г. у цэлым у такіх галінах: нафтахімічная, тэкстыльная і лёгкая прамысловасць, на прадпрыемствах і арганізацыях будаўніцтва, мясцовай прамысловасці, шэрагу прадпрыемстваў машынабудавання. Больш чым на 8 % павялічылася колькасць прадпрыемстваў і арганізацый, якія працавалі без выпадкаў вытворчага траўматызму. Скарацілася колькасць выпадкаў са смяротным канцом на 6,9 %[3].

У пачатку і на працягу 1970-х гг. шмат працоўнага часу страчвалася з-за дрэннай арганізацыі харчавання работнікаў. Праверкі сталовак у Магілёве і Оршы паказалі, што не вытрымліваўся неабходны асартымент блюд, парушалася тэхналогія прыгатавання ежы, у выніку была нізкая якасць ежы, мелі месца грубыя парушэнні санітарных норм і правілаў[4]. Кіраўніцтвам прадпрыемстваў і прафсаюзнымі камітэтамі прыкладаліся намаганні па выпраўленні недахопаў. У 1973 г. былі ўведзены ў эксплуатацыю сталоўкі на Магілёўскім заводзе "Сантэхнарыхтовак" і камбінаце сінтэтычнага валакна[5]. Да Да 1975 гг. у г. Орша пабудавалі і ўвялі ў эксплуатацыю сталовыя на льнокамбінаце і інструментальным заводзе, млынкамбінаце і заводзе "Чырвоны Кастрычнік". У дзвюх сталовых на інструментальным заводзе і заводзе "Легмаш" усталявалі лініі "Эфект" – найбольш прагрэсіўныя формы гандлёвага

---

[1] Протокол заседания бюро Витебского областного комитета КПБ от 28.04.1984 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 161. Спр. 28. Арк. 65.

[2] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 395–396; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 402.

[3] Справка от 14.05.1990 г. о ходе выполнения постановления бюро Могилёвского ОК КПБ от 26.09.1989 г. "О состоянии и мерах по улучшению условий труда и производственного быта в трудовых коллективах" // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 213. Арк. 73, 74.

[4] Сведения об организационно-массовой работе исполкома Могилевского городского Совета депутатов трудящихся в 1972 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Арк. 242; Протокол № 11 одиннадцатой сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 23 января 1975 года // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 11.

[5] Информационная записка об организационно-массовой работе Октябрьского районного Совета депутатов трудящихся г. Могилева за 1973 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2223. Арк. 346.

абслугоўвання ў грамадскім харчаванні[1]. Пры 27 рабочых сталоўках быў арганізаваны продаж паўфабрыкатаў, укаранёны комплексныя абеды, на 31 прадпрыемстве адкрылі прыёмныя пункты ад камбінатаў бытавога абслугоўвання і хімчысткі[2]. На 01.01.1990 г. у Магілёўскай вобласці забяспечанасць сеткай грамадскага харчавання складала 96 % да нарматыву[3], але забяспечанасць дыетычным харчаваннем па-мінуламу на прадпрыемствах не перавышала 50 %.

Прынятыя меры па паляпшэнні працы спрыялі зніжэнню колькасці прафесійных захворванняў. Так, у 1989 г. у Магілёўскай вобласці яны паменшыліся на 14,8 % і склалі 0,44 выпадку на 10 тыс. працоўных пры сярэднерэспубліканскім узроўні 0,53. У параўнанні з 1988 г. стабілізаваўся ўзровень прафзахворванняў у гарадах Магілёве і Бабруйску. Але па-ранейшаму да працы з ядахімікатамі ў Магілёўскай вобласці прыцягвалася да 3 000 чал., большасць з якіх складалі жанчыны[4]. Пры гэтым рэканструкцыя прадпрыемстваў з укараненнем новых прагрэсіўных тэхналогій і абсталявання, якія забяспечвалі здаровыя і бяспечныя ўмовы працы, ажыццяўлялася павольнымі тэмпамі. У сувязі з пераходам прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік і арэндны падрад выяўлялася няўважлівае стаўленне да пытанняў забеспячэння здаровых і бяспечных умоў працы.

**Цякучасць кадраў** была застарэлай і стабільнай праблемай, якая значна ўплывала на рост прадукцыйнасці працы, парушала рытмічнасць вытворчасці, параджала штурмаўшчыну, звышурочныя работы, адмоўна ўплывала на якасць прадукцыі.

У якасці прыкладу становішча з цякучасцю кадраў можна прывесці дадзеныя па г. Орша – буйнаму прамысловаму цэнтру ўсходняга рэгіёна БССР. За 1968–1969 гг. у сярэднім на прамысловых прадпрыемствах Оршы змяніўся кожны 4-й працаўнік[5]. У 1970 г. у г. Орша функцыянавала 27 прамысловых прадпрыемстваў. На працягу года на іх прынялі 5 172 чалавекі рабочых, што складала 23,1 % да ўсёй сярэдняспісачнай колькасці. Выбыла за год з прадпрыемстваў 5 489 чалавек, або 24,5 %[6]. Цякучасць рабочай сілы прамыслова-вытворчых рабочых г. Орша ў 1970 г. склала 15,9 %, супраць 18,3 % у 1969 г.[7] Для Для параўнання на прадпрыемствах г. Наваполацка ў 1970 г. цякучасць кадраў за

[1] Информация «О ходе выполнения плана экономического и социального развития города Орши на 1971–1975 годы» на 12-й сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 22 марта 1975 года // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 153.

[2] Информационная записка Могилевского облисполкома об организационно-массовой работе местных Советов депутатов трудящихся Могилевской области за 1972 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Арк. 10.

[3] Справка от 14.05.1990 г. о ходе выполнения постановления бюро Могилёвского ОК КПБ от 26.09.1989 г. “О состоянии и мерах по улучшению условий труда и производственного быта в трудовых коллективах” // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 213. Арк. 76.

[4] Там жа. Арк. 75.

[5] Резервы и возможности для успешного выполения пятилетнего плана на 1971–1975 гг. промышленностью города Орша Витебской области // ЗДАОрш. Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23. Арк. 21.

[6] Прычыны выбыцця: пераведзены на іншыя прадпрыемствы – 0,3 %, у сувязі з заканчэннем дамовы – 9,2 %, у сувязі з сыходам у войска, на вучобу і на пенсію – 25,3 %, па ўласным жаданні – 60,7 % (3332 чал.), звольнена за прагул – 4,5 % (239 чал.).

[7] Справка о движении численности промышленно-производственных рабочих города Орша за 1970 год // ЗДАОрш. Ф. 86. Воп. 3. Спр. 23. Арк. 25.

год склала 12,2 %[1]. Цякучасць рабочых кадраў г. Орша за 1974 г. склала 15,6 %, ці на 2,1 % вышэй, чым у 1973 г. Цякучасць рабочых узрасла на 10 прадпрыемствах. Асабліва на інструментальным заводзе – 29,8 %, піваварным заводзе – 26,7 %, камбінаце хлебапрадуктаў – 23,6 %, камбінаце ЗЖБВіК – 20,8 %[2]. За першае паўгоддзе 1976 г. цякучасць кадраў паменшылася на камбінаце хлебапрадуктаў і піўзаводзе адпаведна – 15,1 % і 20 %[3]. У 1984 г. цякучасць кадраў на прадпрыемствах горада склала 11,7 %. Узрасла цякучасць кадраў на заводзе плаўленых сыроў – 19,3 %, фабрыцы мастацкіх вырабаў – 11,8 %, камбінаце хлебапрадуктаў – 45 %, піўзаводзе – 28 %, трактарарамонтным заводзе – 14,7 %. На Аршанскай фабрыцы "Дынама" цякучасць кадраў склала – 13 %. На фабрыцы быў самы нізкі заробак з прадпрыемстваў горада, прычым у 1984 г. ён нават знізіўся на 3,5 %, у той час як па горадзе ўзрос на 3 %[4].

Высокая цякучасць кадраў адзначалася на прамысловых прадпрыемствах і іншых гарадоў усходняй Беларусі. У прыватнасці, на Бабруйскім, Клімавіцкім, Мсціслаўскім малочных заводах (1977)[5]. У першым паўгоддзі 1981 г. яна склала склала ў г. Бабруйску – 8,3 %, на вытворчым аб'яднанні "Бабруйскшына" – 9,7 % пры сярэднеабласной 7,9 %[6]. З другой паловы 1980-х гг. цякучасць кадраў паступова стала памяншацца. У 1987 г. на прадпрыемствах Віцебскай вобласці яна знізілася на 1,45 % (з 13,09 % да 11,64 %)[7], на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці ў 1986 г. яна складала 12,8 %, у 1987 – 11 %, 1988 – 9,3 %[8].

Прычынамі цякучасці з'яўляліся трохзменная праца, адсутнасць жылля, незадавальняючая работа і нізкая працоўная дысцыпліна. Для замацавання кадраў на прадпрыемствах ствараліся грамадскія аддзелы кадраў, якія разглядалі факты звальнення рабочых, ІТР і служачых па ўласным жаданні, вывучалі прычыны звальнення, дапамагалі рабочым у набыцці спецыяльнасці і павышэнні кваліфікацыі, даводзілі да ведама працаўнікоў задачы, пастаўленыя перад калектывам, і далейшыя перспектывы развіцця прадпрыемства. Аналіз лічбавых паказчыкаў дазваляе адзначыць у 1970–1980-х гг. высокую цякучасць кадраў пры перыядычных змяненнях па асобных прамысловых прадпрыемствах. Сітуацыя змянілася толькі напачатку 1990-х гг., калі ў

---

[1] Движение численности промышленно-производственных рабочих на предприятиях г. Новополоцка. 1970 г. // ЗДАПол. Ф. 1220. Воп. 1. Спр. 62. Арк. 84.

[2] Отчётный доклад о работе исполкома Оршанского городского совета депутатов трудящихся и задачи по дальнейпему улучшению стиля и методов работы советских и хозяйственных органов на 13 сессии городского Совета (14 созыва). Май 1975 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 241; Доклад «О государственном плане развития народного хозяйства города Орши на 1975 год» на 11-й сессии Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 23 января 1975 года // Там жа. Арк. 36-37.

[3] Справка по проверки работы Оршанского комбината хлебопродуктов по повышению производительности труда и улучшения качества выпускаемой продукции. 1 полугодие 1976г. // Там жа. Спр. 406. Арк. 11-13; Информация производственной деятельности Оршанского пивзавода (1976) // Там жа. Спр. 463. Арк. 24-25.

[4] Справка об итогах выполнения плана экономического и социального развития города Орши за 1984 год // Там жа. Спр. 985. Арк. 170-171, 172, 178.

[5] Протокол заседания бюро Могилёвского обкома КПБ от 29.12.1977 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 159. Спр. 34. Арк. 169–171.

[6] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 392.

[7] Отчёт на секретариате Витебского ОК КПБ 13.07.1987 г. секретаря ОК КПБ Н. Н. Гутникова // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 168. Спр. 90. Арк. 21-27.

[8] Справка о состоянии работы по подбору и расстановке кадров, исполнительской и трудовой дисциплины, совершенствованию организации труда в объединениях и на предприятиях Витебского облместпрома (1989) // Там жа. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 189. Арк. 53-54.

прамысловасці пачынаецца працэс скарачэння кадраў і ў рэспубліцы з’яўляецца беспрацоўе.

**Крадзяжы і злоўжыванні ўладай** закранулі практычна ўсе сферы эканомікі ў БССР. Каб выправіць становішча і паменшыць ўзровень злачыннасці, на прамысловых прадпрыемствах прыкладалія намаганні як з боку ўладных структур, так і кіраўніцтва прамысловых прадпрыемстваў. Але не паўсюль і не заўжды паслядоўна і сістэматычна праводзілася праца па папярэджанні і недапушчэнні правапарушэнняў работнікамі прадпрыемстваў. Прадстаўнічыя і выканаўчыя органы улады былі заклапочаны падобным становішчам і неаднаразова разглядалі прафілактычныя меры на адпаведных камісіях гар(рай)саветаў і пасяджэннях гар(рай)выканкамаў. На іх думку, аддзелы ўнутраных спраў мірыліся з тым, што кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў не праяўлялі належнага клопату аб ахове дзяржаўнай уласнасці. Праверкі паказвалі, што асобныя кіраўнікі слаба рэагавалі на факты правапарушэнняў, не давалі ім вострай прынцыповай ацэнкі, а аддзелы ўнутраных спраў і адміністрацыйныя органы не патрабавалі, каб такое рэагаванне ажыццяўлялася ў строгай адпаведнасці з законам[1].

Безумоўна, асноўны цяжар барацьбы са злачыннасцю наогул і на прадпрыемствах у прыватнасці неслі праваахоўныя структуры. Так, у г. Орша і Барані яны на працягу 1972 г. прыцягнулі да крымінальнай адказнасці 264 чал., з іх непаўналетніх – 38[2]; за 9 месяцаў 1976 г. у Віцебскай вобласці імі было ўзбуджана 294 справы супраць раскрадальнікаў дзяржаўнай і грамадскай маёмасці, прыцягнулі да адказнасці 1 147 чал.[3] З году ў год пастаянна расла колькасць злачынстваў у Бабруйску. Асабліва ўскладнілася сітуацыя ў 1979 г. Мясцовыя ўлады нават звярнуліся ў вышэйстаячыя органы з просьбамі аб стварэнні ў Бабруйску замест аднаго двух аддзяленняў міліцыі, структурна падначаленых гарадскому аддзелу ўнутраных спраў, і аб павелічэнні штатнай колькасці міліцыі[4].

Мясцовыя органы КПБ і савецкай улады прымалі пастановы і планы мерапрыемстваў па ўзмацненні барацьбы з крадзяжамі. У якіх патрабавалі, сярод іншага, умацаваць кадры прадпрыемстваў кваліфікаванымі спецыялістамі, павышаць адказнасць кіраўнікоў за падбор кадраў[5]. За 1976–1979 гг. у Магілёўскай вобласці да партыйнай адказнасці прыцягваліся 85 (36,5 %) з 233 дырэктароў прамысловых прадпрыемстваў і аб’яднанняў за пралікі ў кадравай

---

[1] Отчётный доклад о работе исполкома Оршанского городского совета депутатов трудящихся и задачи по дальнейпему улучшению стиля и методов работы советских и хозяйственных органов на 13 сессии городского Совета (14 созыва). Май 1975 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 406. Арк. 255.

[2] Докладная записка о состоянии общественного порядка и борьбы о преступностью в г. Орше, г. Барань и результатах служебной деятельности отдела внутренних дел Оршанского горисполкома за 1972 год // Там жа. Воп. 6а. Спр. 88. Арк. 28-29.

[3] Справка о состоянии общественного порядка за 9 месяцев 1976 г. (Витебская область) // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 176. Арк. 55-57.

[4] Письмо Могилёвского ОК КПБ от 03.01.1980 г. Министру МВД СССР “О создании при Бобруйском городском отделе внутренних дел двух отделений милиции” // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 71. Арк. 9.

[5] Мероприятия по усилению борьбы с хищениями и разбазариванием социалистической собственности (1975) // // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 169. Арк. 45-52.

працы[1]. Толькі за 1979 г. выключылі з партыі 267 членаў і кандыдатаў, з іх за крымінальныя злачынствы, растраты, крадзяжы, хабар і спекуляцыю (так зваўся раздзел статыстычнага ўліку) – 95. Наклалі партыйных спагнанняў – 834. З іх за крымінальныя злачынствы, растрату, крадзяжы, хабар і спекуляцыю – 36[2]. Назіраліся спробы павышэння партыйнай прынцыповасці. Так, у Магілёўскай абласной партарганізацыі ў 1980 г. зменшылася колькасць парушэнняў § 12 Статута КПСС[3]. Калі ў 1976 г. было пакінута ў партыі 31,2 % камуністаў, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці, то за 1979 г. з 124 членаў і кандыдатаў у члены КПСС, якія ўчынілі крымінальныя злачынствы, выключылі з КПСС – 90 або 72,6 %, пакінулі ў партыі 27,4 % (34 чал.)[4]. Але прынятыя меры мелі кароткачасовы поспех.

У 1981 г. за здзяйсненне крадзяжу прадукцыі і іншых матэрыяльных каштоўнасцяў на ВА "Бабруйскшына" да крымінальнай адказнасці прыцягнулі 63 чал. з ліку работнікаў аб'яднання, у 1982 – 50, 1983 – 68 чал. Сярод прыцягнутых да крымінальнай адказнасці было 15 кіраўніцкіх работнікаў і службовых асоб аб'яднання[5]. Генеральнаму дырэктару абвясцілі строгую вымову, а потым звольнілі. Але выпадкі злоўжыванняў, разбазарвання і раскрадання дзяржаўнай маёмасці службовымі асобамі аб'яднання працягваліся. 15.03.1984 г. за крадзеж будматэрыялаў узбудзілі крымінальную справу ў дачыненні да дырэктара механічнага завода ВА "Бабруйскшына". Супрацоўнікі Першамайскага РАУС г. Бабруйска толькі за тры першыя месяцы 1984 г. распачалі 16 крымінальных спраў у дачыненні да 24 чалавек па фактах крадзяжу прадукцыі з аб'яднання. У мэтах узмацнення барацьбы з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці ў ВА "Бабруйскшына" аддзел БКСУ (ОБХСС) Упраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама ў 1984 г. дадаткова ўвёў у штат Першамайскага РАУС спецыяльнага работніка для аператыўнага абслугоўвання толькі аднаго ВА "Бабруйскшына"[6]. Безадказныя адносіны кіраўнікоў аб'яднання да павышэння якасці выпускаемай прадукцыі, зніжэння невытворчых выдаткаў і забеспячэння захаванасці дзяржаўнай уласнасці 20.04.1984 г. разглядаў Камітэт партыйнага кантролю пры ЦК КПСС[7].

У сувязі з пагаршэннем сітуацыі са злачыннасцю ў другой палове 1980-х гг. (хуткі рост злачыннасці, у тым ліку арганізаванай, распаўсюджванне п'янства,

---

[1] Сведения о партийных взысканиях, наложенных на хозяйственных руководителей Могилёвской области в 1976–1979 гг. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 71. Арк. 129.

[2] Сведения о работе партийных комиссий при областном, городских и районных комитетах партии Могилёвской области за 1979 год // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 71. Арк. 41-45.

[3] Асобы, якія здзейснілі правіны, караемыя ў крымінальным парадку, выключаюцца з шэрагаў КПСС.

[4] Информация о выполнении требований § 12 Устава КПСС в Могилёвской областной парторганизации. 18.04.1980 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 71. Арк. 155-158.

[5] Решение КПК при ЦК КПСС от 20.04.1984 "О серьёзных недостатках в хозяйственной деятельности ПО "Бобруйскшина" и фактах безответственного отношения руководителей этого объединения к вопросам повышения качества выпускаемой продукции, снижения непроизводительных расходов и обеспечения сохранности социалистической собственности" // Там жа. Воп. 178. Спр. 65. Арк. 4.

[6] Информационная записка о дополнительно принятых мерах по борьбе с правонарушениями в ПО "Бобруйскшина". 23.03.1984 г. // Там жа. Спр. 121. Арк. 4, 6, 7.

[7] Решение КПК при ЦК КПСС от 20.04.1984 "О серьёзных недостатках в хозяйственной деятельности ПО "Бобруйскшина" и фактах безответственного отношения руководителей этого объединения к вопросам повышения качества выпускаемой продукции, снижения непроизводительных расходов и обеспечения сохранности социалистической собственности" // Там жа. Воп. 178. Спр. 65. Арк. 3-6.

наркаманіі, дармаедства, правапарушэнняў сярод непаўналетніх) ВС СССР 04.08.1989 г. прыняў пастанову “Аб рашучым узмацненні барацьбы са злачыннасцю”. Быў створаны Часовы камітэт па барацьбе са злачыннасцю ў Саюзе ССР[1]. Адпаведна, для каардынацыі дзеянняў праваахоўных і дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый у барацьбе са злачыннасцю Часовыя камітэты па барацьбе са злачыннасцю ствараліся ў абласцях і гарадах БССР[2].

**Барацьба з п’янствам**. У пачатку 1970-х гг. ЦК КПСС прыняў пастанову “Аб мерах па ўзмацненні барацьбы супраць п’янства і алкагалізму”. Органы ўлады, кіраўніцтва прадпрыемстваў і грамадскія арганізацыі выкарыстоўвалі розныя шляхі і метады барацьбы з паўсюдным п’янствам. Не толькі агітацыю, тлумачэнні, прапаганду здаровага ладу жыцця, але і меры адміністрацыйнага ўздзеяння: пазбаўленне прэміі, перанос чаргі на атрыманне кватэры на 50 чал., перавод працу з нізкай заработнай платай, заробак выдавалі праз асобнае акно касы са спецыяльнай рэкламаю (Асіповіцкі кардонна-руберойдавы завод)[3]. Членам сем’яў, у якіх з-за п’янства мужа (бацькі) склалася ненармальная абстаноўка, тлумачыўся судовы парадак прызнання асобы абмежавана дзеяздольнай з тым, каб зарплату за іх атрымлівалі сем’і. За 1970–1971 гг. з членаў партыі Магілёўскай вобласці было выключана 489 чалавек, з іх 209 – за п’янства і ганебныя паводзіны[4]. У Віцебскай вобласці за 1975 г. і дзевяць месяцаў 1976 г. прыцягнулі да адказнасці за п’янства 13 054 чал., з іх у Наваполацку – 1 087, Віцебску – 2 631[5]. Паступова, на кароткі час, памяншалася колькасць злачынстваў і дробных хуліганстваў, здзейсненых у п’яным стане, але праблема не вырашалася.

Чарговым крокам па выкараненні гэтага сацыяльнага зла павінна была стаць пастанова ЦК КПСС ад 07.05.1985 г. “Аб мерах па пераадоленні п’янства і алкагалізму”[6]. Праз месяц СМ БССР прыняў адпаведную пастанову “Аб мерах мерах па пераадоленні п’янства і алкагалізму, выкараненні самагонаварэння”. У Беларусі вытворчасць лікёра-гарэлачнай і вінаробнай прадукцыі скарацілася, але п’янства істотна не змяншалася.

Паводле інфармацыі Магілёўскага аблвыканкама, у вобласці на 01.01.1987 г. колькасць наркалагічных хворых пабольшыла на 64,1 % у параўнанні з 1981 г. і склала 28 950 чал., асоб пад прафілактычным назіраннем з нагоды злоўжывання алкаголем павялічылася ў 2,5 разы. За 1986 г. выявілі 1 410 ачагоў самагонаварэння[7]. На падставе дакументаў таго часу магчыма змадэляваць сацыяльны партрэт самагоншчыка. Гэта асобы рознага ўзросту і

---

[1] Письмо Президиума ВС СССР от 18.08.1989 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3861. Арк. 562.
[2] Письмо Могилевского облисполкома от 31.08.1989 г. в Президиум ВС СССР // Там жа. Арк. 565.
[3] Информационная справка об организационно-массовой работе Осиповичского горсовета депутатов трудящихся за 1973 г. // Там жа. Спр. 2223. Арк. 382.
[4] Протокол заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 201
[5] Сведения о состоянии преступности и охраны общественного порядка за 9 месяцев 1976 г. // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 176. Арк. 54.
[6] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 548.
[7] Информация Могилевского облисполкома о ходе выполнения в Могилевской области Постановления СМ БССР «О мерах по преодолению пьянства и алкоголизма, искоренению самогоноварения» № 179 от 07.06.1985 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 33.

сацыяльнага становішча. Сярод іх былі, напрыклад, дэпутат Машчаніцкага сельсавета, намеснік начальніка малочнатаварнага комплексу саўгаса "Каліноўскі", брыгадзір саўгаса "Падзевічы" Бялыніцкага раёна, загадчык фермы саўгаса "Цяцерына" Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці і іншыя[1]. Самагонаварэнне набыло ўстойлівы характар. Так, у першым паўгоддзі 1991 г. за выраб, захоўванне і збыт самагону прыцягнулі да адказнасці па БССР 10,7 тыс. чал., або на 10,4 % больш, чым за першае паўгоддзе 1990 г. Практыка паказвала, што значная колькасць самагонкі і самагонных апаратаў вырабляліся на вытворчасці[2].

У студзені – ліпені 1988 г. органы ўнутраных спраў выявілі каля 12 тыс. выпадкаў п'янства на працоўных месцах, у тым ліку: Віцебская вобласць – 2,6 тыс., Мінская – 2,3 тыс., Брэсцкая – 1,6 тыс., Магілёўская і Гродзенская па 1,4 тыс., Гомельская – 1,2 тыс., у горадзе Мінску – 1,1 тыс. выпадкаў. За распіццё спіртных напіткаў і непрыняцце мер аб іх спыненні прыцягнулі да адказнасці 340 службовых асоб. У ходзе правядзення ў жніўні 1988 г. рэспубліканскага рэйду практычна на кожным другім з правераных 3,6 тыс. прадпрыемстваў і арганізацый БССР выяўлены парушэнні антыалкагольнага заканадаўства[3].

Скарачэнне продажу алкагольных напіткаў нанесла балючы ўдар па фінансах, грошы ад продажу спіртных напіткаў традыцыйна былі адной са значных і стабільных крыніц напаўнення бюджэту і, адпаведна, падтрымання неабходнага ўзроўню жыцця ў краіне[4]. У 1990 г. адбылося павелічэнне вытворчасці спіртных напояў і пашырэнне правіл іх продажу. Адразу значна ўзрасла колькасць антыграмадскіх праяў і злачынстваў, звязаных з п'янствам. Практычна кожнае забойства, разбойны напад, цяжкае цялеснае пашкоджанне, згвалтаванне ў першым паўгоддзі 1991 г. здзяйснялася асобамі, якія знаходзіліся ў нецвярозым стане. П'янства зноў стала распаўсюджанай з'явай на вытворчасці. У першым паўгоддзі 1991 г. міліцыя зафіксавала амаль 12 тыс. такіх фактаў (+22 %), у тым ліку больш за 100 з удзелам службовых асоб. З тэрыторыі прадпрыемстваў у медвыцвярэзнікі даставілі звыш 900 чалавек (+49 %)[5].

**Праблемы рытмічнага забеспячэння насельніцтва харчовымі таварамі (дэфіцыту) і нізкай якасці спажывецкіх тавараў**, як паказвае аналіз крытычных заўваг, просьб і прапаноў, выказаных дэпутатамі абласных, гарадскіх і раённых саветаў БССР, а таксама грамадскасці, былі характэрнымі для тагачаснай палітычнай сістэмы на працягу ўсяго перыяду яе існавання. На рытмічнасць і прадукцыйнасць працы прамысловых прадпрыемстваў уплывалі не толькі вытворчыя, але і сацыяльныя фактары: забяспечанасць сацыяльнымі даброцамі, умовы жыцця і адпачынку рабочых і ІТР.

Кіраўніцтвам рэгулярна прымаліся пэўныя захады па вырашэнні праблемы дэфіцыту спажывецкіх тавараў. ЦК КПБ і СМ БССР 14.08.1981 г. прынялі сумесныя пастановы "Аб мерах па павелічэнні вытворчасці тавараў

[1] Справка СМ БССР от 02.10.1987 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 846-848.
[2] Информация МВД БССР в СМ БССР от 05.08.1991 г. // Там жа. Спр. 4065. Арк. 369.
[3] Выписка из протокола № 17 заседания президиума СМ БССР от 28.07.1988 г. «О мерах по активизации работы пор преодолению пьянства и алкоголизма» // Там жа. Спр. 3784. Арк. 199.
[4] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 С. 341–342.
[5] Информация МВД БССР в СМ БССР от 05.08.1991 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 4065. Арк. 369.

першай неабходнасці ў 1981–1985 гг. і больш поўнага задавальнення попыту насельніцтва на гэтыя тавары” і 02.10.1981 г. “Аб павелічэнні вытворчасці тавараў масавага попыту, павышэнні якасці і паляпшэнні іх асартыменту ў 1981–1985 гг.”[1] Адпаведныя намаганні прыкладала і мясцовае кіраўніцтва на ўсходзе Беларусі. Так, 23.09.1986 г. бюро Магілёўскага АК КПБ прыняло пастанову “Аб сур’ёзных недахопах у рабоце партыйных, савецкіх органаў г. Магілёва па выкананні заданняў 1986 г. па вытворчасці і пастаўцы тавараў народнага спажывання і аказанні платных паслуг насельніцтву”. У выніку, план па вытворчасці тавараў народнага спажывання па Магілёву ў 1989 г. выканалі на 102,7 %. Наогул, за 1986–1989 гг. прадпрыемствы горада павялічылі аб’ём вытворчасці тавараў для насельніцтва ў 1,2 разы, нехарчовых тавараў у 1,3 разы, у тым ліку на прадпрыемствах саюзнага падпарадкавання ў 2,6 разы[2]. Але ўсё роўна прысутнічаў дэфіцыт тавараў народнага спажывання. На гэта, безумоўна, паўплывалі ўзросшыя запатрабаванні насельніцтва і вываз тавараў за межы рэспублікі.

Найбольшыя нараканні з боку жыхароў гарадоў выклікала адсутнасць у крамах прадуктаў харчавання. Мясцовыя органы ўлады пры дапамозе прамысловых прадпрыемстваў сітуацыю імкнуліся выправіць, але поўнасцю праблему вырашыць не змаглі, нават са стварэннем дапаможных гаспадарак. ЦК КПСС і СМ СССР 04.12.1978 г. прынялі пастанову “Аб падсобных сельскіх гаспадарках прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў”. У рэгіёнах яна выконвалася недастаткова аператыўна і не ў поўным аб’ёме. Аб сур’ёзных недахопах у стварэнні падсобных гаспадаркак прадпрыемстваў казалася ў пастанове бюро ЦК КПБ ад 13.05.1983 г. У яе выкананне бюро Магілёўскага абкама КПБ адзначала, што на 1. 01. 1986 г. падсобныя сельскія гаспадаркі мелі 38 прадпрыемстваў і арганізацый горада Бабруйска, прычым 20 былі створаны за апошнія два гады. У той жа час сем прадпрыемстваў і арганізацый Бабруйска з колькасцю працоўных 500 і больш чалавек не мелі ўласных падсобных гаспадарак. Характэрным былі нізкія рэнтабельнасць і прадуктыўнасць большасці аграрных цэхаў і цяпліц[3]. За 1986 г. у БССР стварылі 177 дапаможных гаспадарак, на 19.03.1987 г. іх існавала 2045[4]. За 11 месяцаў 1988 г. у падсобных сельскіх гаспадарках прамысловых прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці атрымалі

[1] Информация от 15.02.1984 г. о ходе выполнения постановления ЦК КПБ и СМ БССР от 14.08.1981 г. № 278 “О мерах по увеличению производства товаров первой необходимости в 1981–1985 гг. и более полному удовлетворению спроса населения на эти товары” и от 02.10.1981 г. № 321 “Об увеличении производства товаров массового спроса, повышении качества и улучшении их ассортимента в 1981–1985 гг.” // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 175. Спр. 72. Арк. 32-38.

[2] Справки о ходе выполнения постановления бюро Могилёвского ОК КПБ от 23.09.1986 г. // Там жа. Воп. 187. Спр. 213. Арк. 41, 44.

[3] Информация Бобруйского ГК КПБ от 12.03.1986 г. по постановлению бюро обкома КПБ от 12.06.1984 г. «О ходе выполнения постановления бюро ЦК КПБ от 13.05.1983 г. «О серьёзных недостатках в выполнениии постановления ЦК КПСС и СМ СССР от 04.12.1978 г. «О подсобных сельских хозяйствах предприятий, организаций и учреждений и задачах по выполнению постановления бюро ЦК КПБ от 25.05.1984 г. по этому вопросу» // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 181. Спр. 115. Арк. 137-139.

[4] Решение комиссии по агропромышленному комплексу ВС БССР от 19.03.1987 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737. Арк. 248.

2000 т мяса і 1787 т малака, 839 т агародніны, што на 21,5 і 10 % вышэй за ўзровень 1987 г.[1] Але гэтага было недастаткова.

За ўвесь час пабудовы сацыялізму і камунізму партыйна-савецкае кіраўніцтва СССР і БССР не здолела вырашыць праблемы якасці тавараў народнага спажывання, укараненне пры іх стварэнні новых, перадавых тэхнічных распрацовак. Аб чым сведчаць дакументы тых часоў. У чацвёртым квартале 1969 г. была праведзена праверка якасці выпускаемай прадукцыі на 44 прадпрыемствах Магілёўскай вобласці. На Бабруйскім малочным заводзе было забракавана 23,8 % усёй цэльнамалочнай прадукцыі (малако, тварог, марозіва), на Асіповіцкім кансервава-харчовым камбінаце 7,9 % кандытарскіх вырабаў (пернікі) і 21,3 % кансерваванай гародніны, на Клічаўскім харчовым камбінаце 100 % ад наяўных кансерваў садавіны і гародніны, на Быхаўскім хлебазаводзе 6,1 % усіх хлебабулачных вырабаў – 2 454 кг (хлеб, батоны, абаранкі), 6,1 % хлебабулачных вырабаў на Крычаўскім заводзе, 6,3 % хлебабулачных вырабаў на Мсціслаўскім хлебазаводзе, на Чэрыкаўскім гароднінасушыльным заводзе 14,5 % плодагароднінных кансерваў, на Бабруйскім плодакансервавым камбінаце 40,7 % кансерваў ад агульнай колькасці праверaных (салянка), на Глускім хлебазаводзе 14,6 % хлебабулачных вырабаў[2]. За 1969–1971 гг. прадпрыемствы абласнога вытворчага аб'яднання малочнай прамысловасці недабраякаснай і нестандартнай прадукцыяй нанеслі страты дзяржаве ў памеры 412,6 тыс. рублёў. Магілёўскім заводам тэхнічнай аснасткі за выпуск і пастаўку гандлёвым арганізацыям няякаснай прадукцыі на працягу 1971 г. атрымана 18 рэкламацый на 6 815 вырабаў[3]. У 1972 г. 35 прадпрыемствам Магілёўскай вобласці забаранілі рэалізацыю 40 відаў прадукцыі[4].

У другім паўгоддзі 1971 г. Магілёўскай лабараторыяй дзяржнагляду за стандартамі і вымяральнай тэхнікай было праверана 68 прадпрыемстваў. У выніку на 10 (14,7 %) устаноўлена нізкая якасць прадукцыі і неадпаведнасць яе патрабаванням дзяржстандартаў і тэхнічных умоў. З-за нізкай якасці прад'явілі 43 рэкламацыі, выпісалі 24 прадпісанні, якія забаранялі пастаўку прадукцыі спажыўцам, з іх на кожным чацвёртым прадпрыемстве пастаўку прадукцыі забаранілі поўнасцю[5]. У першым паўгоддзі 1972 г. было праверана 45 прадпрыемстваў, адпаведна на 36 (80 %) устаноўлена нізкая якасць прадукцыі, выпісалі 43 прадпісанні, на 13 (30,3 %) прадпрыемствах пастаўку забаранілі

---

[1] Информация Могилевского облисполкома от 15.12.1988 г. о выполнении постановления ВС БССР от 02.02.1988 г. № 2009-XI «О задачах Советов народных депутатов республики по ускорению решения Продовольственной программы и социальному переустройству села» // Там жа. Спр. 3783. Арк. 573.

[2] Справка о качестве продукции, проинспектированной на промышленных предприятиях Могилевской области (1969) // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 145. Спр. 99. Арк. 3-8

[3] Приказ от 31.01.1972 г. Министерства местной промышленности БССР "О грубом нарушении государственной дисциплины руководством Могилевского завода технологической остнастки" // ДАМаг. Ф. 2827. Воп. 1. Спр. 526. Арк. 26-27.

[4] Протокол № 8 заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 181-183.

[5] Записка Могилёвской лабаратории госнадзора за стандартами и измерительной техникой от 17.01.1972 г. "О состоянии качества выпускаемой продукции на предприятиях Могилевской области во втором полугодии 1971 г." // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 87. Арк. 9-10.

цалкам, прадпрыемствам прад'явілі 97 рэкламацый[1]. З 22 прадпрыемстваў Віцебскай вобласці, абследаваных у III квартале 1972 г. па ўпраўленню мясцовай прамысловасці, 10 (45,45 %) выпускалі прадукцыю з парушэннем патрабаванняў стандартаў і тэхнічных умоў[2]. За 9 месяцаў 1973 г. прадпрыемствамі мясцовай прамысловасці Гомельскага аблвыканкама атрымана 68 рэкламацый. Лабараторыяй Дзяржстандарта на пяці прадпрыемствах было забракавана 100 % праверанай прадукцыі[3]. Праз два гады з 49 прадпрыемстваў горада Магілёва толькі 8 выпускалі прадукцыю, якая была ўганаравана Знакам якасці. Удзельная вага прадукцыі вышэйшай катэгорыі складала толькі 6,4 %, а неатэставанай наогул прадукцыі – 7,8 %[4]. У першым паўгоддзі 1980 г. вялікія сумы страт ад браку былі на Аршанскім заводзе "Легмаш", інструментальным заводзе, ВА "Оршабудматэрыялы"[5]. У 1976–1980 гг. страты ад браку ў прамысловасці БССР склалі 118 млн руб., або 2 % кошту ўсёй валавой прадукцыі[6].

Сітуацыя з якасцю тавараў не паляпшалася і ў наступнае дзесяцігоддзе. У 1982–1983 гг. на Віцебскім заводзе гадзінкавых дэталяў брак складаў 10 % ад агульнага аб'ёму выпускаемай прадукцыі[7]. У 1983 г. удзельная вага тавараў з дзяржаўным Знакам якасці ў агульным аб'ёме нехарчовых тавараў Магілёўскай вобласці склала толькі 20,8 %[8]. Безумоўна, такая сітуацыя не задавальняла кіраўніцтва рэспублікі. Рабіліся намаганні па паляпшэнні якасці прадукцыі. Пэўныя поспехі былі. У сярэдзіне 1980-х гг. у БССР прадукцыю вышэйшай катэгорыі якасці выпускала трэць прадпрыемстваў[9]. Але выправіць сітуацыю цалкам не атрымалася. У 1987 г. на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці наогул не было вырабаў, якія адпавядалі патрабаванням вышэйшай катэгорыі якасці. За 1986 г. 10 прадпрыемстваў з 13 атрымалі 111 рэкламацый за дрэнную якасць прадукцыі, па якіх было выплачана штрафаў на 37 тыс. руб. (1985 г. – 91 рэкламацыя і 28,2 тыс. руб. штрафа)[10]. У 1986 г. ВА "Гомсельмаш" атрымала рэкламацый на 290 камбайнаў КСК 100 (2,26 % ад

[1] Записка Могилёвской лабаратории госнадзора за стандартами и измерительной техникой от 18.07.1972 г. "О состоянии качества выпускаемой продукции на предприятиях Могилевской области в первом полугодии 1972 г." // Там жа. Арк. 122-123.

[2] Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8. Арк. 16.

[3] Протокол заседания Гомельского бюро ОК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 140. Спр. 14. Арк. 20-21.

[4] Протокол заседания бюро Могилёвского обкома КПБ от 10.06.1975 г. // ДАГАМАг. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 37. Арк. 8-9

[5] Доклад об итогах выполнения государственного плана экономического и социального развития города Орши за январь-сентябрь 1980 года // ЗДАОрш. Ф. 86. Воп. 5. Спр. 348. Арк. 28.

[6] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 387.

[7] Протокол заседания бюро Витебского областного комитета КПБ от 28.04.1984 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 161. Спр. 28. Арк. 64.

[8] Информация от 15.02.1984 г. о ходе выполнения постановления ЦК КПБ и СМ БССР от 14.08.1981 г. № 278 "О мерах по увеличению производства товаров первой необходимости в 1981-1985 гг. и более полному удовлетворению спроса населения на эти товары" и от 02.10.1981 г. № 321 "Об увеличении производства товаров массового спроса, повышении качества и улучшении их ассортимента в 1981-1985 гг." // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 175. Спр. 72. Арк. 34.

[9] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 387; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 396.

[10] Справка о работе руководства и производственных объединений управления местной промышленности по повышению качества товаров народного потребления и более полному удовлетворению потребностей населения (1987) // ДАВц. Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 119. Арк. 57-61.

агульнага аб'ёму іх выпуска)[1]. У Магілёўскай вобласці на дзяржаўных прадпрыемствах хлебапякарнай галіны ў студзені – сакавіку 1987 г. забракавалі 25,4 % абследаванай прадукцыі[2].

У гады перабудовы для ажыццяўлення прыёмкі выраблены х вырабаў і кантролю за дзейнасцю аб'яднанняў і прадпрыемстваў па пытаннях якасці стварaўся спецыяльны орган ведамаснага кантролю – дзяржаўная прыёмка. Гэты орган быў падпарадкаваны Дзяржаўнаму камітэту СССР па стандартах. Замест спажыўца, кантраляванне якасці прадукцыі ўскладвалася на чыноўнікаў. З студзеня 1988 г. ва ўмовах дзяржпрыёмкі ў БССР працавалі 115 прадпрыемстваў і аб'яднанняў, якія выпускалі больш за 40 % прадукцыі. Службы дзяржпрыёмкі БССР толькі ў чэрвені таго ж года з першага прад'яўлення адхілілі 12,3 % прадукцыі. У выніку, дзяржпрыёмку пачалі абвінавачваць у зрыве планавых заданняў, што прывяло да яе адмены ў БССР з 01.09.1990 г.[3]

На прадпрыемствах і ўстановах прымаліся меры па барацьбе з нізкай якасцю прадукцыі: асобы вінаватыя ў вырабе і выпуску прадукцыі, якая не адпавядае нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі, прыцягваліся да матэрыяльнай і дысцыплінарнай адказнасці, праводзілася атэстацыя работнікаў і працоўных месцаў, звязаных з праверкай якасці прадукцыі і інш.

**Вырашэнне праблемы забеспячэння працоўных жыллём.** Агульнарэспубліканскім і рэгіянальным органам улады найбольш дакучалі скаргі і заявы ад грамадзян рэспублікі наконт паляпшэння жыллёвых умоў, перасялення з баракаў і падвалаў, старых і аварыйных дамоў, аб паскарэнні будаўніцтва кааператыўных дамоў, дрэннай якасці будаўніцтва і рамонту жыллёвага фонду[4]. Першым крокам па вырашэнні праблемы стала прыняцце 03.09.1970 г. СМ БССР пастановы "Аб перасяленні сямей, якія пражываюць у бараках і аварыйных жылых дамах, у добраўладкаваныя кватэры".

У БССР вялося жыллёвае будаўніцтва як камунальнае, так і на прамысловых прадпрыемствах. Так, за 1971–1975 гг. толькі ў г. Орша пабудавалі і здалі ў эксплуатацыю 61 шматпавярховы жылы дом на 4 675 кватэр, дзе мелася цэнтральнае ацяпленне, каналізацыя, газ, халоднае і гарачае водазабеспячэнне. Акрамя таго, за кошт індывідуальнага будаўніцтва пабудавалі 497 жылых дамоў[5]. За 1982–1984 гг. з дапамогаю і за кошт прамысловых прадпрыемстваў горада пабудавалі 32 жылыя дамы і 5 інтэрнатаў[6]. Штогод у Барані пры непасрэдным удзеле завода "Чырвоны Кастрычнік" будаваліся па два жылыя 90-кватэрныя дамы[7].

[1] Письмо СМ БССР от 13.02.1987 г. в ЦК КПБ "О положении дел на ПО "Гомсельмаш" // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2014. Арк. 70.
[2] Записка КНК БССР от 15.04.1987 г. «О результатах проверки обеспечения качества хлеба и хлебобулочных изделий в хлебопекарной отрасли БССР» // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 184. Спр. 58. Арк. 26.
[3] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 546–547.
[4] Выписка из протокола заседания президиума СМ БССР от 02.03.1971г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 1951. Арк. Арк. 54-54адв.
[5] Протокол пятой сессии Оршанского городского Совета народных депутатов от 26.02.1976 г. // ЗДАОрш. Ф. 27. 27. Воп. 4. Спр. 457. Арк. 21.
[6] Доклад на сессии городского Совета "О задачах предприятий, организаций и учреждений по дальнейшему улучшению жилищно-коммунального обслуживания населения, рациональному использованию и усилению режима экономии топливно-энергетических ресурсов", 1985. // Там жа. Спр. 454. Арк. 44.
[7] Протокол № 5 сессии Оршанского городскогоо совета депутатов от 28.03.1986 г. // Там жа. Спр. 1043. Арк. 7.

Тым не менш, пытанне забяспечанасці жыллём па-ранейшаму з'яўлялася асноўнай праблемай, якая хвалявала пры ўладкаванні на працу. Для прыкладу, у 1980 г. на Магілёўскім аўтазаводзе імя Кірава чарга на атрыманне жылля налічвала 1 420 чал., што складала 23 % ад колькасці працоўных на заводзе[1]. Пры гэтым, кантрольнымі лічбамі на XI пяцігодку Магілёўскай вобласці прадугледжваўся ўвод толькі 39 % агульнай плошчы жылля ад уведзенай за 1976–1980 гг.[2] У г. Бабруйску ў 1979 г. згодна плану уводзілася агульнай жылой плошчы – 7,0 тыс. кв. м, у 1980 г. менш – 5,0 тыс. кв. м, на 1981 г. прадугледжвалася 3,8 тыс. кв. м. Як вынік, у 1981 г. забяспечвалі жыллём чаргу 1962 г.[3] Не ў поўным аб'ёме рэалізоўвалася будаўніцтва жылля гаспадарчым спосабам, у Бабруйску за 1986–1988 гг. гаспадарчым спосабам было пабудавана толькі 249 кватэр, або 43 % ад прынятых у Праграме жыллёвага будаўніцтва[4].

Чэргі жадаючых атрымаць добраўпарадкаванае жыллё не памяншаліся на працягу ўсіх 1970–1980-х гг., некаторыя грамадзяне лічыліся ў спісах на паляпшэнне жыллёвых умоў па 15–20 гадоў (гл. табліца 16).

Жыллёвы фонд БССР на 01.01.1987 г. складаў 163,5 млн кв. м. агульнай плошчы. У сярэднім на аднаго жыхара прыходзілася 16,3 кв. м, у гарадах – 14, у вёсцы – 20[5] Колькасць тых, хто меў патрэбу ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, на 01.01.1987 г. складала 593,1 тыс. чал.

На прамысловых прадпрыемствах і ўстановах рэгулярна складаліся і абнаўляліся спісы тых, хто меў патрэбу ў атрыманні жылля. Пры здачы пабудаванага ведамаснага жылога фонду ўсе спісы работнікаў, што атрымоўвалі ордэры на кватэры, зацвярджаліся на пасяджэннях жыллёвых камісій пры гар і райвыканкамах. Тым не менш, недахоп жылля спараджаў і суправаджаўся шматлікімі злоўжываннямі пры атрыманні кватэр. СМ БССР і БРСП 22.01.1988 г. прынялі пастанову № 14 "Аб сур'ёзных недахопах ва ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і парушэннях прынцыпу сацыяльнай справядлівасці пры размеркаванні жылля". Гэта было выклікана вынікамі праверак у 1987 г. Камітэтам народнага кантролю ўстаноўленага парадку размеркавання жылля ў арганізацыях і на прадпрыемствах рэспублікі.

---

[1] Перечень критических замечаний, предложений и просьб, высказанных в адрес союзных министерств и производственных объединений на отчётных собраниях и конференциях первичных партийных организаций Могилёвской области в 1980 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 165. Спр. 72. Арк. 116.

[2] Письмо Могилёвской областной плановой комиссии // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3091. Арк. 204.

[3] Критические замечания, просьбы и предложения, высказанные депутатами Могилевского областного совета народных депутатов семнадцатого созыва за 1980–1981 гг. // Там жа. Арк. 226-227.

[4] Справка от 05.10.1989 г. о ходе выполнения постановления бюро Могилёвского ОК КПБ от 26.01.1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 213. Арк. 57–58.

[5] Письмо КНК БССР в СМ БССР от 08.12.1987 г. О результатах проверки соблюдения установленного порядка порядка распределения жилья в организациях и на предприятиях республики // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3784. Арк. 12.

Табліца 16 – Звесткі аб колькасці сямей, якія стаялі на ўліку для атрымання жылля ў выканкамах і на прадпрыемствах Віцебскай вобласці на 01.01.1985 г.[1]

| | Састаяла на ўліку на 01.01.1984 | Атрымалі кватэры ў 1984 | Састаяла на ўліку на 01.01.1985 | У тым ліку па тэрмінах знаходжання ў чарзе | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | да 3 год | ад 3 да 5 | ад 5 да 10 | звыш 10 год |
| Усяго па Віцебскай вобласці без ЖБК[2] | 69329 | 6644 | 712231 | 29859 | 16926 | 17078 | 7360 |
| Усяго на ўліку для атрымання жылля праз ЖБК. У тым ліку: | 14991 | 949 | 15495 | 5544 | 4051 | 4826 | 1074 |
| Рабочых | 8698 | 408 | 8463 | 2997 | 1942 | 2947 | 577 |
| ІТР і служачых | 4316 | 378 | 4900 | 1742 | 1469 | 1366 | 323 |
| Іншых | 1977 | 163 | 2132 | 805 | 640 | 513 | 174 |
| Усяго на ўліку ў выканкамах, на прадпрыемствах і ЖБК | 84320 | 7593 | 86726 | 35401 | 20977 | 21904 | 8444 |

Праверкі КНК выявілі грубыя парушэнні прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці пры размеркаванні жылля, што выклікала негатыўную рэакцыю насельніцтва, шматлікія скаргі. Выканкамы БССР перавышалі свае паўнамоцтвы, прымалі рашэнні, якія супярэчылі заканадаўству. Віцебскі гарвыканкам у 1976 г. зацвердзіў пералік асоб, якія мелі права на дадатковае жытло. У яго ўключыў 42 катэгорыі кіраўнікоў рознага рангу, а ў 1980 г. пашырыў яшчэ на 17. У час праверкі было выяўлена, што 589 сем'ям неабгрунтавана выдзелелі кватэры, многія пражывалі ў добрых умовах, мелі жыллё са значным перавышэннем устаноўленай нормы і не лічыліся на ўліку. Нямала кіраўнікоў атрымалі кватэры па-за чаргой, прычым у дамах з павышаным камфортам, размешчаных як мага бліжэй да працы, а свае ранейшыя пакідалі дзецям. Пры гэтым на прадпрыемствах не хапала

[1] Сведения о количестве семей, состоящих на учёте для получения жилья в исполкомах райсоветов и на предприятиях Витебской области на 01.01.1985 г. // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 232. Арк. 11.
[2] Жыллёва-будаўнічыя кааператывы.

кваліфікаваных кадраў або яны там не затрымліваліся з-за адсутнасці магчымасці атрымаць жыллё. Пры разглядзе жыллёвых пытанняў часцяком прымалася аднаасобнае рашэнне партыйна-савецкіх і гаспадарчых кіраўніцкіх работнікаў, а часам з санкцыі або па ўказанні вышэйстаячых органаў. Магілёўскі аблвыканкам для забеспячэння свайго апарату і запрошанага кіраўніцкага складу абласнога звяна штогод замацоўваў 2 тыс. кв. м жылой плошчы. У Бабруйску на працягу 5 гадоў на агульную чаргу не выдзялялі ніводнай кватэры ў новых дамах. Факты парушэння заканадаўства пры размеркаванні жылля КНК выявіў ва ўсіх без выключэння правераных 15 гарадах, 5 сельскіх раёнах, 107 прамысловых прадпрыемствах і арганізацый усіх абласцей БССР[1].

Цэнтральныя і рэгіянальныя ўлады Савецкай Беларусі прымалі розныя і, часам, вельмі дзейныя меры па пераадоленні эканамічных і сацыяльных праблем у прамысловасці. Акрамя арганізацыйна-адміністрацыйных, што непасрэдна ўздзейнічалі на якасць кадравага патэнцыялу прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў, вылучаюцца эканамічныя і грамадскія.

**Метады эканамічнага стымулявання**. У пачатку 1970-х гг. на Волжскім аўтамабільным заводзе пачаўся эксперымент па ажыццяўленні брыгаднай формы арганізацыі працы. Яе навізна заключалася ў тым, што ўсе ў калектыве працавалі па адзінаму нараду. Новая арганізацыя працы дапускала асваенне сумежных прафесій і аперацый, гэта дазваляла захаваць у брыгадзе ўстойлівы вытворчы рэжым, стабільнасць. Цэнтральныя ўлады рэкамендавалі міністэрствам, аб'яднанням шырэй развіваць брыгадную форму арганізацыі і стымулявання працы. У БССР аднымі з першых новую форму арганізацыі працы пачалі асвойваць калектывы аб'яднанняў Гомсельмаш і Наваполацкага "Палімір", Барысаўскага завода пластмасавых вырабаў і інш.[2] Так, на Аршанскім заводзе плаўленых сыроў, дзе працавала 190 чал., былі створаны 6 брыгад (138 работнікаў), і ўсе яны працавалі рытмічна і плённа[3].

Да 1986 г. у прамысловасці рэспублікі колькасць працаўнікоў, занятых у брыгадах, складала 78,3 % супраць 66,5 % у 1983 г. Ахопленасць брыгаднай формай працы за гэты час павялічылася на 143 тыс. чал., альбо на 20,7 %. У комплексных брыгадах працавалі 66,6 % рабочых, у брыгадах з аплатай па канечнаму выніку – 81,1 %; размяркоўвалі калектыўны заработак з прымяненнем каэфіцыента працоўнага ўдзелу 80,5 % работнікаў, аб'яднаных у брыгадах. Колькасць занятых у гасразліковых брыгадах, павялічылася ў 2,2 разы і складала 62 %[4]. Пераход на брыгадную арганізацыю працы спрыяў значнаму паляпшэнню гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў. Аднак у развіцці гэтых форм арганізацыі працы меліся сур'ёзныя недахопы. Прафесар У. Навіцкі вылучае наступныя. На прамысловых прадпрыемствах БССР амаль чацвёртая

[1] Письмо КНК БССР в СМ БССР от 08.12.1987 г. О результатах проверки соблюдения установленного порядка распределения жилья в организациях и на предприятиях республики // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3784. Арк. 12-15адв.
[2] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 388, 389.
[3] Справка о работе администрации завода плавленых сыров по выполнению закона СССР "О трудовых коллективах и повышении их роли в управлении предприятиями и организациями" // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1050. Арк. 32.
[4] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 390.

частка калектываў працавала без гадавых заданняў, хаця ў большасць абавязацельстваў членаў брыгад уключаліся пункты аб датэрміновым іх выкананні, эканоміі сыравіны і электраэнергіі. У многіх калектывах не заўсёды ажыццяўляўся строгі ўлік рэальнага ўкладу кожнага працаўніка ў агульныя вынікі працы. Для размерказання паасобнага заработку і прэміі толькі 40,9 % брыгад прымянялі каэфіцыент працоўнага ўдзелу. У шэрагу выпадкаў ён вызначаўся фармальна, вузкім колам кіраўніцкіх асоб, без шырокага прыцягнення саветаў брыгад, прадстаўнікоў грамадскіх фарміраванняў. Такі падыход прыводзіў да ўраўнілаўкі, канфліктных сітуацый, стрымліваў развіццё ініцыятывы. Эфектыўнасць брыгаднага падраду ў многіх выпадках зніжалася недахопамі ў арганізацыі вытворчасці, планава-эканамічнай працы і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні[1]. Брыгады пераўтвараліся ў цэнтры выхавання, а не арганізацыі працы.

У 1983 г. у парадку эксперыменту вытворчым аб'яднанням (прадпрыемствам) далі больш шырокія правы ў планаванні і гаспадарчай дзейнасці, што павінна было спрыяць павышэнню іх зацікаўленасці ў высокапрадукцыйнай працы, паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу[2].

Сталі выплочваць кіраўніцкім работнікам вытворчых аб'яднанняў (прадпрыемстваў) па выніках працы за год прэміі за распрацоўку і выпуск прадукцыі, якая па якасных паказчыках адпавядала лепшым сусветным і айчынным узорам або перавышала іх і адказвала перспектыўным патрабаванням спажыўцоў, пры ўмове поўнага выканання планавых заданняў па аб'ёму рэалізацыі прадукцыі з улікам абавязацельстваў па пастаўках у адпаведнасці з заключанымі дамовамі. Прэміі выплочваліся з фонду матэрыяльнага заахвочвання ў памеры да трох службовых акладаў. Міністэрствамі ў гэтых выпадках вызначаўся памер названых прэмій па вытворчых аб'яднаннях (прадпрыемствах) у залежнасці ад тэхнічнай складанасці і эфектыўнасці выпускаемых вырабаў і аб'ёмаў прадукцыі, якая пастаўлялася на экспарт. Пры невыкананні планаў і заданняў па стварэнні і засваенні новай тэхнікі, укараненні прагрэсіўнай тэхналогіі і перадавога вопыту агульная сума прэмій кіраўніцкім работнікам вытворчых аб'яднанняў (прадпрыемстваў) за асноўныя вынікі гаспадарчай дзейнасці памяншалася не менш чым на 25 %.

Кіраўнікам навукова-даследчых, канструктарскіх, праектных, праектна-канструктарскіх і тэхналагічных арганізацый давалася права выплочваць з дазволу вышэйстаячай арганізацыі прэміі навуковым работнікам, канструктарам, тэхнолагам, праекціроўшчыкам, інжынерам і іншым спецыялістам, якія забяспечылі распрацоўку і выпуск прадукцыі, якая па якасных паказчыках адпавядала лепшым сусветным і айчынным узорам або перавышала іх і адказвала перспектыўным патрабаванням спажыўцоў, звыш прэмій, прадугледжаных палажэннямі аб прэміраванні, якія ўжо дзейнічалі, але не больш за тры аклады ў год. Рабіліся спробы ўкараніць прагрэсіўныя сістэмы

[1] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. С. 389–390.
[2] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 14. С. 446.

матэрыяльнага стымулявання канструктараў і тэхнолагаў за павышэнне тэхнічнага ўзроўню і якасці распрацовак, выкананне большага аб’ёму работ з меншай колькасцю работнікаў.

Створаныя зверху метады эканамічнага стымулявання не спрацоўвалі. Яны былі часовымі і супярэчылі абвешчаным мэтам і прынцыпам пабудовы сацыялістычнага грамадства. Эканамічныя меры насілі незавершаны характар і марудна ўкараняліся на вытворчасці, у прыватнасці брыгадны і арэндны падрады.

Вырашэнне праблем праз **дзейнасць пастаянных камісіі па прамысловасці, транспарту і сувязі.** Пры органах мясцовай улады дзейнічалі камісіі: па сацыялістычнай законнасці і грамадскаму парадку; па справах непаўналетніх; па барацьбе з п’янствам; назіральнай; бюджэтнай; бытавога абслугоўвання; па прамысловасці, транспарту і сувязі, якая ў 1980-х гг. была рэарганізавана ў пастаянную камісію па прамысловасці.

Пастаянныя камісіі па прамысловасці, транспарту і сувязі ў сваёй практычнай працы кіраваліся Палажэннем аб пастаянных камісіях абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў працоўных Беларускай ССР. На пасяджэннях выпрацоўваліся рэкамендацыі і прапановы для органаў прадстаўнічай і выканаўчай улады. Так, у 1972 г. пастаянная камісія па прамысловасці, транспарту і сувязі Магілёўскага абласнога Савета за год правяла чатыры пасяджэнні, дзе разгледзелі пяць пытанняў: аб выкананні планаў механізацыяі пагрузачна-разгрузачных работ на Магілёўскім аддзяленні чыгункі; аб ходзе выканання рашэння Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў ад 17.09.1971 г. “Аб мерах па далейшым выкарыстоўванні ўнутраных рэзерваў прамысловасці вобласці для павелічэння вытворчасці, павышэння якасці і пашырэння асартыменту тавараў народнага ўжытку”; аб максімальным выкарыстанні вытворчых магутнасцей, абсталявання і эканомным выдаткованні сыравіны і матэрыялаў на Магілёўскім заводзе тэхналагічнай аснасткі і Крычаўскім заводзе гумавых вырабаў імя 50-годдзя БССР; аб праектах плана і бюджэта вобласці на 1973 г.[1] У 1974–1976 гг. камісія Аршанскага гарадскога Савета займалася пытаннямі арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, эфектыўнасці выкарыстання працоўнага часу, бяспекі руху цягнікоў, паляпшэння работы гарадскога аўтатранспарту і іншыя[2]. За 1985 г. было праведзена пяць пасяджэнняў камісіі, на якіх былі разгледжаны пытанні работы адміністрацыі доследна-эксперыментальнай швейнай фабрыкі і малочнага камбіната па атэстацыі і рацыяналізацыі працоўных месцаў, аб рабоце адміністрацыі завода “Чырвоны барацьбіт”, ільнокамбіната і камбіната зборных

---

[1] Информационная записка Могилевского облисполкома об организационно-массовой работе местных Советов депутатов трудящихся Могилевской области за 1972 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Арк. 17.

[2] Справка о работе постоянной комиссии по промышленности, транспорту и связи Оршанского городского Совета депутатов трудящихся с июля 1975 года по июнь 1976г. // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 413. Арк. 25; План работы постоянной комиссии: по промышленности, транспорту и связи Оршанского городского Совета депутатов трудящихся на 4 квартал 1975 года // Там жа. Арк. 20; Решение постоянной комиссии по промышленности, транспорту и связи, планов бюджетной комиссии и комиссии по бытовому обслуживанию Оршанского городского совета депутатов от 17.01.1975 г. // Там жа. Арк. 2; Протокол заседания постоянной комиссии по промышленности, транспорту, связи Оршанского городского Совета депутатов трудящихся от 16 января 1976 года // Там жа. Спр. 463. Арк. 2.

жалезабетонных вырабаў і канструкцый па выкарыстанні сыравінных і матэрыяльных рэсурсаў, аб працы заводаў інструментальнага, піваварнага, ЖБВ "Сельбуд" па мабілізацыі калектываў на выкананне планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў, аб рабоце працоўных калектываў завода ЖБВ і вытворчага аб'яднання "Оршабудматэрыялы" (сумесна з камітэтам народнага кантролю па эканоміі сыравіны і матэрыяльных рэсурсаў) [1] і інш.

На пасяджэнні камісіі запрашаліся кіраўнікі прадпрыемстваў, праца якіх абмяркоўвалася на пасяджэннях. Камісіі практыкавалі сумесную падрыхтоўку і абмеркаванне пытанняў з іншымі грамадскімі фарміраваннямі, напрыклад, з гарадскім камітэтам народнага кантролю, планава-бюджэтнай камісіяй. Падрыхтоўку матэрыялаў для абмеркавання на пасяджэннях камісіі ажыццяўлялі дэпутаты, якія ўваходзілі ў яе склад, а таксама прыцягваліся спецыялісты адпаведных галін і грамадскі актыў. Імкнуліся, каб больш шырокае кола дэпутатаў прымала ўдзел у падрыхтоўцы і абмеркаванні пытанняў. Перад праверкай прадпрыемстваў у дапамогу дэпутатам распрацоўвалася памятка. Гэта дазваляла засяродзіць увагу правяраючых на галоўных пытаннях.

Пры існаваўшым у 1970-я – першай палове 1980-х гг. фармалізме ў працы мясцовых прадстаўнічых органаў большасць членаў камісій добрасумленна ставіліся да выканання сваіх дэпутацкіх абавязкаў і актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы да пасяджэнняў і абмеркаванні эканамічных праблем.

**Удзел грамадства ў барацьбе з негатыўнымі праявамі.** Вялікая ўвага надавалася прапагандзе дасягненняў прамысловасці БССР, ролі кадраў у сацыялістычным будаўніцтве, правядзенню мерапрыемстваў па прадухіленні правапарушэнняў, барацьбе з недахопамі праз сродкі масавай інфармацыі і ўзаемадзеянне з грамадскасцю. У мясцовым друку ўвесь час публікаваліся матэрыялы аб тэхнічнай рэканструкцыі прадпрыемстваў, выніках гаспадарчага развіцця рэспублікі і рэгіёнаў, ахове дзяржаўнай уласнасці, барацьбе з п'янствам і алкагалізмам і г. д. Рэгулярна гучалі выступленні партыйна-савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў, прадстаўнікоў праваахоўных органаў па мясцовым радыёвяшчанні перад работнікамі працоўных калектываў.

У савецкі час было шырока распаўсюджана меркаванне, што ў барацьбе са злачыннасцю і правапарушэннямі вялікую ролю адыграе грамадскасць шляхам далучэння працоўных у дзейнасць розных кантралюючых структур. Паўсюдна ствараліся добраахвотныя народныя дружыны, грамадскія суды, саветы прафілактыкі па месцы працы і жыхарства, народны кантроль і інш.

У 1970-я гг. у Бабруйску налічвалася больш за 80 народных дружын, якія згуртавалі каля 4 тыс. дружыннікаў. Яны ўдзельнічалі ў мерапрыемствах па захаванні грамадскага парадку на вуліцах, у рэйдах па выяўленні, ліквідацыі месц самагонаварэння і недапушчэння крадзяжоў дзяржаўнай уласнасці. Народныя дружыны былі створаны на 70 прамысловых прадпрыемствах, сярод іх лепшымі

[1] Отчёт о работе постоянной комисси по промышленности Оршанского городского Совета народных депутатов (1986) // ЗДАОрш. Ф. 27. Воп. 4. Спр. 1043. Арк. 115.

былі: вагавага завода (за 1972 год затрымалі 100 правапарушальнікаў), завода імя Леніна (143 правапарушальнікі), мясакамбіната, вопытна-механічнага завода[1].

Народныя кантралёры (НК) ажыццяўлялі пастаянны кантроль за выкананнем дзяржаўных планаў і заданняў прадпрыемствамі прамысловасці, будаўніцтва, транспарту і сувязі, гандлю і бытавога абслуговання насельніцтва, за захаваннем законнасці, вялі барацьбу з бюракратызмам, магчымым ашуканствам дзяржавы, дапамагалі ўмацоўваць дзяржаўную і працоўную дысцыпліну ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі. За 1972 г. НК толькі ў Бабруйску правялі 106 праверак. За недахопы і праступкі прыцягнулі да адказнасці 61 пасадавую асобу, у тым ліку: за безгаспадарлівасць і марнатраўства – 13 чал.; за зрыў выканання рашэнняў партыі і ўрада – 14 чал.; за прыпіскі і ашуканства дзяржавы – 10 чал.; за іншыя парушэнні партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны – 14 чал. На іх былі накладзена спагнанняў – 37; зроблена грашовых налічэнняў на 24 чал. на агульную суму 2 395 руб. [2]

Пэўны ўплыў аказвалі таварыскія (грамадскія) суды. Толькі на тэрыторыі Кастрычніцкага раёна горада Магілёва існавалі 115 таварыскіх судоў, прычым шэраг з іх дзейнічалі фармальна. Шмат спраў разгледзелі суды мясакамбіната і хлебакамбіната (за крадзяжы, здзейсненыя “несунамі”)[3]. Прынцыповасцю адзначаліся таварыскія суды: Бабруйскага гарбарнага завода, ФанДока, які разгледзеў 102 справы, з іх 98 на адкрытых пасяджэннях[4].

Аналіз тагачасных дакументаў дазваляе зрабіць выснову, што ў савецкай краіне самай лепшай своеасаблівай формай зваротнай сувязі паміж уладаю і грамадскасцю з’яўляліся скаргі. Толькі за 1983 г. у Магілёўскі АК КПБ паступіла 2 654 лісты-звароты грамадзян (гэта на 96 больш, чым ў 1982), з іх 376 наконт злоўжыванняў і няправільных (неправавых і супярэчыўшых нормам тагачаснай маралі) паводзінаў кіраўніцкіх кадраў[5]. У перыяд падрыхтоўкі да выбараў у ВС СССР падчас справаздач перад насельніцтвам кіраўнікоў Магілёўскай вобласці за студзень – люты 1984 г. паступіла ад жыхароў Магілёўшчыны 689 крытычных заўваг і прапаноў, з іх 428 былі выкананы або рэалізаваны да 01.04.1984 г. У табл. 17 прадстаўлены звесткі аб змесце тых, што былі накіраваны ў Магілёўскі аблвыканкам[6].

---

[1] Информационная записка об организационно-массовой работе Бобруйского городского Совета депутатов трудящихся за 1972 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 2222. Арк. 60-61.
[2] Там жа. Арк. 63-64.
[3] Информационная записка об организационно-массовой работе исполкома Октябрьского районного Совета депутатов трудящихся г. Могилева за 1972 г. // Там жа. Арк. 277.
[4] Информационная записка об организационно-массовой работе Бобруйского городского Совета депутатов трудящихся за 1972 г. // Там жа. Арк. 63-64.
[5] Информация о работе с письмами трудящихся и приёме граждан в партийных комитетах и других организациях Могилёвской области от 09.01.1984 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 175. Спр. 72. Арк. 9.
[6] Сведения о поступлении и реализации критических замечаний и предложений в период подготовки к выборам в ВС СССР, на основании отчётов перед населением и информации руководителей учреждений Могилёвской области за январь – февраль 1984 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3439. Арк. 1-2.

Табліца 17 – Звесткі аб змесце крытычных заўваг і прапаноў, якія паступілі ў Магілёўскі аблвыканкам за студзень – люты 1984 г.

| Змест прапаноў і заўваг, якія тычыліся працы і трапілі ў аддзелы Магілёўскага аблвыканкама | Паступіла прапаноў і заўваг | | |
|---|---|---|---|
| | Усяго | Рэалізавана | У стадыі выканання |
| Паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы друкарняў | 1 | – | 1 |
| Па пытаннях сельскай гаспадаркі | 9 | 4 | 5 |
| Аб правядзенні меліярацыйных прац | 1 | – | 1 |
| Паляпшэнне працы прадпрыемстваў грамадскага харчавання | 2 | 1 | 1 |
| Аб паляпшэнні жыллёвых умоў | 6 | – | 6 |
| Аб забеспячэнні дзяцей працоўных яслямі і дзіцячымі садкамі | 1 | – | 1 |
| Праца транспарту | 1 | – | 1 |
| Аб спагнанні аліментаў | 3 | 3 | – |
| Праца аўтатранспарту | 5 | 3 | 2 |
| Праца прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання насельніцтва | 5 | 3 | 2 |
| Забеспячэнне запаснымі часткамі | 5 | – | 5 |
| Усяго: | 39 | 14 | 25 |

У 1988 г. на адрас ЦК КПБ паступіла 13 412 лістоў, звярнуліся ў прыёмную ЦК 3 500 чалавек. Кожны дзясяты ліст быў калектыўны. Да канца студзеня наступнага года паспелі разгледзець толькі 4 439 лістоў, з іх 1 114 (25 %) прызналі абгрунтаванымі. Асаблівую заклапочанасць у грамадзян выклікалі праблемы ўдасканалення практыкі гаспадарання, рашэнні сацыяльна-бытавых пытанняў. Звароты сведчылі аб тым, што шэраг працоўных калектываў не спраўляліся з планамі і дагаворнымі пастаўкамі, не на належным узроўні была вытворчая і працоўная дысцыпліна. У 932 лістах паведамлялася аб розных парушэннях і злоўжываннях кіраўніцкіх работнікаў, усе яны былі разгледжаны, у 110 (12 %) утрымлівалася ў асноўным дакладная інфармацыя. Павялічвалася колькасць скаргаў на недахопы ў гандлёвым абслугоўванні насельніцтва, дэфіцыт тавараў у магазінах, дрэнны стан навакольнага асяроддзя. У 20 % скаргаў змяшчаліся просьбы аб паляпшэнні жыллёвых умоў, выкрываліся недахопы ва ўліку і размеркаванні жылой плошчы[1].

Узрастала колькасць зваротаў па працоўных спрэчках. У 1985 г. – яны складалі 7,8 % агульнай колькасці лістоў, якія паступілі ў ЦК, у 1988 г. – 15 %. На падставе зваротаў і праверак было ўстаноўлена, што парушэнні працоўнага заканадаўства ў БССР насілі распаўсюджаны характар[2]. Падобнае назіралася і ў

[1] Записка общего отдела ЦК КПБ от 27.01.1989 г. о характере и результатах рассмотрения писем и устных заявлений трудящихся, поступивших в ЦК КПБ в 1988 г. // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3861. Арк. 68-71.
[2] Записка общего отдела ЦК КПБ от 27.01.1989 г. о характере и результатах рассмотрения писем и устных заявлений трудящихся, поступивших в ЦК КПБ в 1988 г. // Там жа. Арк. 68-71.

ранейшы час. Так, за 1974 г. і 9 месяцаў 1975 г. народнымі судамі Гомельскай вобласці было адноўлена на працы незаконна звольненых 388 чалавек, ці 54 % ад асоб, якія звярнуліся ў суд. У той жа час суды спаганялі страты на карысць адноўленых на працы з прадпрыемстваў, а не канкрэтных вінаватых. У 1974 г. для незаконна звольненых (згублена 6634 працоўныя дні) спагналі з прадпрыемстваў 21 860 руб., а з канкрэтных вінаватых толькі 495 руб. Народным судом Калінкавіцкага раёна за 10 мес. 1975 г. адноўлены на працы 13 чалавек, ім выплацілі за кошт прадпрыемстваў 2 160 руб., а з вінаватых у гэтым – 57 руб[1].

Такім чынам, асноўнымі эканамічнымі і сацыяльнымі праблемамі ў прамысловасці, якія аказвалі непасрэдны ўплыў на фарміраванне, змест і ўдасканаленне кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР, з'яўляліся неўкамплектаванасць прадпрыемстваў кадрамі, састарэлае абсталяванне і недахоп магутнасцей, абмежаванасць сыравінных рэсурсаў, дэфіцыт тавараў і існаваўшая ў савецкі час сістэма размеркавання, не была створана ва ўсіх працоўных калектывах абстаноўка асуджэння і нецярпімасці да раскрадальнікаў дзяржаўнай уласнасці, праяў прыватнаўласніцкай псіхалогіі, скнарнасці. Недахоп кваліфікаваных кадраў і высокая цякучасць былі выкліканы найперш праблемамі забеспячэння працоўных жыллём і належнымі ўмовамі працы. Прычым сітуацыя не мянялася на працягу дзесяцігоддзяў.

Партыйна-савецкае і гаспадарчае кіраўніцтва БССР спрабавала вырашыць праблемы пераважна шляхамі прапаганды і прыняцця ў асноўным адміністрацыйных мер. Узмацненне кантролю з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва не прыводзіла да доўгатэрміновага вырашэння праблем або выкаранення недахопаў. Іх рашэнне насіла ярка выражаны кампанейскі характар. Спробы эканамічнага стымулявання не давалі чаканага выніку з-за існаваўшых ідэалагічных абмежаванняў і сістэмы размеркавання, адсутнасці шырокага выбару сацыяльных даброт і прадметаў шырокага спажывання.

---

[1] Протокол XIX Гомельской областной партийной конференции (1975) // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1. Арк. 163.

## Высновы і заключэнне

Завяршэнне Другой сусветнай вайны і пачатак “халоднай вайны”, задачы аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі выклікалі неабходнасць адраджэння і паскоранага павелічэння прамысловых магчымасцяў краіны. Тэрыторыя Беларусі мела стратэгічнае значэнне. Пасля Вялікай Айчыннай вайны БССР стала ўнутраным рэгіёнам сусветнай сацыялістычнай садружнасці. Адсоўванне межавання з верагодным ваенным праціўнікам далёка на захад дазволіла разгарнуць будаўніцтва аб’ектаў цяжкай прамысловасці, у тым ліку і ВПК. Згодна з афіцыйнымі звесткамі, апераджальнымі тэмпамі развіваліся галіны, якія вызначалі тэхнічны прагрэс. Павялічваўся аб’ём прамысловай вытворчасці.

Хуткая індустрыялізацыя ў 1950–1970 гг. ператварыла БССР у індустрыяльна-аграрную рэспубліку, кіраванне якой ажыццяўлялася цэнтралізавана ў межах каманднa-адміністрацыйнай сістэмы. Недахопы гэтай сістэмы падштурхоўвалі партыю і ўрад некалькі разоў праводзіць рэформы і контррэформы, накіраваныя на ўдасканаленне дадзенай сістэмы кіравання эканомікай. Спроба дэцэнтралізацыі сістэмы кіравання эканомікай, распачатая ў 1957 г., у ходзе якой былі сфармаваныя Саветы народнай гаспадаркі, актывізацыя сацыялістычнай дэмакратыі на вытворчасці паказала пэўную эфектыўнасць на ўзроўні прамысловых прадпрыемстваў усходніх абласцей БССР. Аднак у кастрычніку 1965 г. было прынята рашэнне адмовіцца ад тэрытарыяльнай сістэмы кіравання вытворчасцю і вярнуцца да галіновай сістэмы кіравання.

У 1944–1991 гг. павялічвалася колькасць насельніцтва гарадоў усходніх рэгіёнаў БССР. У выніку працэсаў урбанізацыі ўзрасла роля буйных гарадоў у эканамічным і культурным развіцці БССР. Аналіз працэсаў фарміравання значных прамысловых цэнтраў Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей паказаў, што ў БССР працэс урбанізацыі і інтэнсіўнае прамысловае будаўніцтва спрыялі няўхільнаму росту колькасці вытворчых кадраў не толькі ў традыцыйных для Беларусі галінах харчовай, тэкстыльнай, будаўнічых матэрыялаў, лесаперапрацоўчай прамысловасці, але і ў машынабудаванні, хімічнай, нафтаперапрацоўчай і электратэхнічнай галінах прамысловасці.

У выніку дынамічнай індустрыялізацыі і ўрбанізацыі БССР доля рабочых і служачых у канцы 1960-х гг. дасягнула, а ў 1970-х перавысіла палову ад агульнай колькасці занятых у народнай гаспадарцы рэспублікі. Стварэнне новых і тэхнічнае пераабсталяванне існаваўшых галін прамысловасці (хімічнай, нафтаперапрацоўчай, машынабудаванне і металаапрацоўка, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, лёгкая прамысловасць) заканамерна прадугледжвала значнае паляпшэнне прафесійна-кваліфікацыйнага складу рабочых і інжынерна-тэхнічных кадраў. Адбылося павелічэнне ўдзельнай вагі інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Важнае значэнне для характарыстыкі кадравага патэнцыялу мела галіновая структура кадраў прамысловасці. Найбольшым атрадам рабочых і служачых прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў Беларусі былі металісты. Другімі па колькасці работнікаў былі працаўнікі лёгкай прамысловасці. Далей ішлі

работнікі харчовай прамысловасці, лясной, дрэвaапрацоўчай і цэлюлоза-папяровай галіны. Вырасла колькасць работнікаў хімічнай прамысловасці і будаўнічых матэрыялаў. Колькасць занятых у паліўнай прамысловасці зменшылася, але павялічылася колькасць рабочых і служачых на прадпрыемствах электраэнергетыкі. Комплекс арганізацыйна-тэхнічных і сацыяльных мерапрыемстваў дазволіў на працягу 1960-х гг. у значнай ступені замацаваць кадры на многіх передавых прадпрыемствах БССР. Але праблема цякучасці кадраў заставалася сур’ёзнай і ў 1970–1980-х гг.

Дзякуючы развіццю “вялікай” хіміі на ўсходзе рэспублікі, утварылася некалькі буйных монагарадоў: Наваполацк і Мазыр з градаўтваральнымі прадпрыемствамі – нафтаперапрацоўчымі заводамі; Светлагорск утварыўся вакол пабудаванага завода “Хімвалакно”; будаўніцтва буйных хімічных прадпрыемстваў значна змяніла дэмаграфічную сітуацыю і сацыяльную інфраструктуру нават буйных індустрыяльных цэнтраў усходняй Беларусі Магілёва і Бабруйска.

На развіццё прамысловасці БССР у другой палове XX стагоддзя аказвалі эканамічныя, сацыякультурныя і грамадска-палітычныя фактары, якія выклікалі вялікую патрэбнасць у масавых, тэхнічна падрыхтаваных кадрах і мелі велізарнае значэнне для фарміравання кадравага патэнцыялу.

Непасрэдна на кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР у 1944–1991 гг. уплывалі самыя разнастайныя фактары, сярод якіх найбольш важнымі былі наступныя: а) грамадска-палітычны – вызначальная роля КПСС і КПБ, падпарадкаваная роля дзяржаўных, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый у вызначэнні кірункаў развіцця прамысловасці; б) геапалітычны – БССР у стратэгічным плане перастала быць памежным рэгіёнам, стала ўнутраным раёнам сусветнай сацыялістычнай садружнасці, што дазволіла ў рэспубліцы разгарнуць будаўніцтва аб’ектаў цяжкай прамысловасці, у тым ліку і ВПК; в) аксіялагічны – уздымам творчай актыўнасці мас, які быў выкліканы перамогай у вайне і абвешчаным пераходам да будаўніцтва камунізму, павышэннем ролі сацыялістычнага спаборніцтва, руху рацыяналізатараў і вынаходнікаў у вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач і г. д., што спалучалася з адсутнасцю ўстойлівай гарадской працоўнай этыкі і ўвагі да індывідуальных патрэб чалавека і ставіла яго інтарэсы ніжэй за патрэбы органаў кіравання, якія прыкрываліся інтарэсамі дзяржавы і сацыялістычнага будаўніцтва; г) дэмаграфічны – павольнае аднаўленне колькасці насельніцтва суправаджалася ўцягваннем у прамысловую вытворчасць новых работнікаў, пераважна з ліку моладзі і аграрнага сектара; д) сацыякультурны – паскоранае аднаўленне і развіццё прамысловасці было немагчыма без росту адукаванасці насельніцтва, падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў, сістэматычнага ўдасканалення вытворчай кваліфікацыі кадраў, авалодання найнавейшымі тэхнічнымі дасягненнямі, пашырэння агульнакультурнага далягляду, паляпшэння ўмоў працы і жыцця і г. д.; е) этнічны – беларусы складалі большасць работнікаў вытворчай сферы, пры гэтым назіралася перасяленне беларускага насельніцтва ў раёны Далёкага Усходу, Сібіры, Карэліі шляхам аргнабораў працоўнай сілы на буйныя будоўлі СССР, а таксама наборы

насельніцтва з іншых рэспублік (пераважна з РСФСР) на працу ў БССР аказалі істотны ўплыў на нацыянальны, сацыяльны і адукацыйны ўзровень кадравага патэнцыялу БССР; ж) гендэрны – жанчыны канчаткова былі ўцягнуты ў сферу вытворчасці і складалі каля паловы персаналу прамысловых прадпрыемстваў; з) эканамічныя, навукова-тэхнічныя і вытворчыя фактары і іншыя.

Аналіз працы буйных і вядомых прадпрыемстваў выявіў, што метады фарміравання кадравага складу прамысловасці і фактары, якія ўплывалі на кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходнебеларускіх рэгіёнаў у цэлым не адрозніваюцца ад іншых абласцей БССР. У той жа час выяўлена пэўная спецыфіка ўсходніх рэгіёнаў краіны. Асноўнымі метадамі фарміравання кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР у 1944–1991 гг., а таксама крыніцамі яго папаўнення былі: падрыхтоўка кадраў рабочых на вытворчасці; усё большая ўвага надавалася падрыхтоўцы кадраў праз адмысловыя прафесійныя навучальныя ўстановы; меры па матэрыяльнай стымуляцыі навучання рабочых і малодшых спецыялістаў, спецыялістаў-“практыкаў” на завочнай, вячэрняй і вочнай формах навучання; запаўненне вакансій спецыялістаў і арганізатараў вытворчасці праз размеркаванне маладых спецыялістаў – выпускнікоў сталічных і іншых рэгіянальных ВНУ на беларускія прамысловыя прадпрыемствы, якое паказала сваю нізкую эфектыўнасць; арганізацыя беларускіх навучальных устаноў адпаведнага профілю або філіялаў профільных навучальных устаноў, заключэнне дамоў на падрыхтоўку спецыялістаў для гаспадарчых суб’ектаў з навучальнымі ўстановамі ў сувязі з цяжкасцю папаўнення кадрамі праз саюзныя міністэрствы; змяншэнне значэння вылучэння на пасады спецыялістаў і кіраўніцкія пасады “практыкаў”, доля якіх на прадпрыемствах паступова зніжалася; пры будаўніцтве новых прадпрыемстваў запрашэнне спецыялістаў з аналагічных прамысловых прадпрыемстваў з іншых рэгіёнаў СССР было досыць эфектыўным; вытворчае самакіраванне разглядалася не толькі як сродак рашэння вытворчых праблем, развіцця актыўнасці працоўных, але і як форма павышэння кадравага патэнцыялу прамысловасці; ратацыя кадраў паміж партыйнымі, савецкімі органамі і прамысловымі прадпрыемствамі і аб’яднаннямі; замацаванне кадраў на вытворчасці шляхам паляпшэння ўмоў працы работнікаў.

Партыйна-савецкае кіраўніцтва СССР і БССР прымала захады па паляпшэнні падрыхтоўкі кадраў і якасці фарміравання кадравага патэнцыялу рэспублікі. Развіццё ў рэспубліцы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі забяспечвала падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях, абумоўленых запытамі навукова-тэхнічнага прагрэсу. Нягледзячы на няўхільны рост ўдзельнай вагі асоб з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў і скарачэнне долі “практыкаў”, у 1950–1970 гг. па-ранейшаму назіралася расслаенне кіраўніцкіх кадраў прамысловасці і прадпрыемстваў на групы “практыкаў” і спецыялістаў з высокай профільнай адукацыяй. Пачынаючы з другой паловы 1970-х гг., на прамысловых прадпрыемствах усходу Беларусі паступова забяспечваецца дастатковая колькасць кваліфікаваных спецыялістаў.

Адмоўным было тое, што спецыялісты рыхтаваліся без арыентацыі на канкрэтную дзейнасць.

Сістэматычныя рэарганізацыі сістэмы кіравання краінай закраналі і сістэму падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў для прамысловасці. Прадугледжваліся новыя формы павышэння кваліфікацыі работнікаў, але існаваўшая палітычная сістэма не дазваляла пры гэтым кіраўнікам і спецыялістам прадпрыемстваў атрымоўваць інфармацыю аб прагрэсіўных тэхналогіях вытворчасці прадукцыі і аб альтэрнатыўных эканамічных метадах гаспадарання. Формы адбору і перападрыхтоўкі кадраў усё часцей увязваліся з характарыстыкай гэтых груп кіраўніцкіх работнікаў: наяўнасцю прафесійнай адукацыі, кар’ерным патэнцыялам, тэрытарыяльнай і сацыяльнай мабільнасцю, вопытам работы і сацыяльнымі сувязямі.

Склад працоўных БССР у пасляваенныя гады характарызаваўся даволі высокай удзельнай вагой жанчын, якая ў наступныя гады знізілася, што звязана з паступовай ліквідацыяй дэмаграфічнага дысбалансу, які склаўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а потым зноў павысілася. Доля жанчын сярод спецыялістаў народнай гаспадаркі заставалася вельмі высокай. Назіралася тэндэнцыя павольнага павелічэння жанчын сярод кіраўнікоў вытворчасці. На адказных пасадах як у сферы дзяржаўнага кіравання, так і ў прамысловасці, пераважалі мужчыны, было мала жанчын, нягледзячы на павелічэнне іх колькасці на нізавым і сярэднім узроўнях кіраўнічай лесвіцы.

Правядзенне палітыкі размеркавання выпускнікоў ПТВ, ССНУ і ВНУ, оргнаборы працоўнай сілы на буйныя будоўлі СССР, перасяленне беларускага насельніцтва ў раёны Далёкага Усходу, Сібіры, Карэліі аказала істотны ўплыў на нацыянальны, сацыяльны і адукацыйны ўзровень кадравага патэнцыялу БССР. Прадстаўнікі розных народаў істотна паўплывалі на развіццё прамысловасці рэспублікі, асабліва ў працэсе стварэння новых для Беларусі галін прамысловасці: машынабудаўнічай, электратэхнічнай, хімічнай і г. д. На першым этапе працы новых прадпрыемстваў многія з іх у кіраўніцкім складзе мелі значную, а нярэдка і пераважную частку запрошаных спецыялістаў з іншых рэгіёнаў БССР і СССР. Але па меры станаўлення прамысловых прадпрыемстваў узрастала доля мясцовых кадраў, а прыезджыя спецыялісты і кіраўніцкія работнікі розных нацыянальнасцяў паступова замяшчаліся беларусамі.

Фарміраванне кадравага патэнцыялу БССР цалкам залежыла ад палітыкі органаў кіравання СССР. Пытанням работы з кадрамі ўвесь час надавалі вялікую ўвагу ЦК КПСС і КПБ. Яны шырока разглядаліся на з’ездзах і пленумах, бюро ЦК. Пленумы, прысвечаныя працы з кадрамі, рэгулярна адбываліся ў абласных, гарадскіх і раённых арганізацыях. Гэтыя пытанні абмяркоўваліся на сходах у першасных партыйных арганізацыях. Прынцыпы падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў, кадравая палітыка на рэгіянальным узроўні знаходзіліся пад кантролем і курыраваліся першымі сакратарамі абкамаў КПБ. Рэгіянальным партыйным камітэтам па вертыкалі, разам з абласнымі, гарадскімі і раённымі выканкамамі на сваім узроўні, адводзілася роля падбору кадраў для прамысловасці і абавязковае іх узгадненне з

вышэйстаячымі органамі. Вялікую ролю адыгрывалі анкетныя дадзеныя. Гэта дазваляла пэўным чынам фарміраваць склад кіраўніцтва.

Склад кіраўніцкіх работнікаў і спецыялістаў фарміраваўся не толькі ў залежнасці ад прафесіяналізму і кампетэнтнасці асобы, але і адміністрацыйным шляхам (адміністрацыяй і органамі кіравання КПБ) пры мінімальным (фармальным) удзеле грамадскасці ў выглядзе прафсаюзаў, у залежнасці ад сацыяльнага паходжання і сяброўства ў КПСС. Усе сацыяльна-эканамічныя задачы, якія ставіліся перад грамадствам, устанаўлівала і вырашала КПСС. Кампартыя займалася кадравай працай не толькі ў сваім складзе, але і ў сферы гаспадаркі, Саветах і грамадскіх арганізацыях. Адбылося зліццё партыйнага і гаспадарчага кіраўніцтва краіны.

Рэгіянальныя партыйныя органы ўсходнебеларускіх абласцей у асноўным сур'ёзна і паспяхова займаліся падборам кадраў. Аднак былі нярэдкія выпадкі, калі пры вылучэнні работнікаў не прымаліся да ўвагі іх палітычныя і дзелавыя якасці. У выніку, у ролі кіраўнікоў з'яўляліся работнікі, якія не карысталіся аўтарытэтам, палітычна няспелыя, а часам і відавочна скампраметаваўшыя сябе ў мінулым. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва як на рэспубліканскім, так і рэгіянальным узроўнях не пазбавілася ад фармальна-бюракратычнага стылю ў працы.

У структурах рэспубліканскай улады і мясцовых выканкамаў існавалі ўпраўленні і аддзелы, якія займаліся кантролем і каардынацыяй выканання эканамічных праграм і дырэктыў партыйных і вышэйстаячых органаў улады па развіцці прамысловасці. Іх уплыў на дзейнасць і фарміраванне кіраўніцкага складу работнікаў прамысловых прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання быў нязначным, так як гэтыя прадпрыемствы ім не падпарадкоўваліся. Гэта пры тым, што менавіта гэтыя прадпрыемствы з'яўляліся градаўтваральнымі і менавіта яны аказвалі асноўны ўплыў на працэсы ўрбанізацыі ва ўсходняй частцы БССР.

У сацыяльным абліччы кіраўніцкіх кадраў у 1960–1980-я гг. адзначаецца тэндэнцыя рэгіяналізацыі працэсаў сацыяльнага рэкрутавання адказных работнікаў, а таксама тэндэнцыя да ўзмацнення самадастатковасці мясцовых кадравых рэсурсаў для папаўнення складу супрацоўнікаў органаў кіравання і іншых спецыялістаў. Калі ў 1940–1950-х гг. працэс узнаўлення кадраў істотна карэктаваўся цэнтрам, цяпер працэсы іх станаўлення набылі пэўную аўтаномнасць. У 1970-я гг. адукацыя, а не класавая прыналежнасць, стала адыгрываць вырашальную ролю пры занятасці адказных пасад. Таму ў 1980-я гг. менавіта прадстаўнікі інтэлігенцыі, у большасці сваёй тэхнічнай, сталі пераважаць у складзе кіраўніцкіх кадраў дзяржаўных і гаспадарчых структур.

У выніку праведзенай кадравай палітыкі да 1980-х гг. у БССР склаўся ўстойлівы тып савецкай гаспадарчай эліты, які характарызуецца стабільнымі прапорцыямі асноўных яе кампанентаў. У эвалюцыі эліты прысутнічала пэўная скіраванасць да павелічэння ў яе складзе долі выхадцаў з вобласці пражывання, з сем'яў рабочых і служачых, з гарадскіх паселішчаў. Гэтая тэндэнцыя засталася незавершанай, патэнцыял яе эвалюцыі не быў вычарпаны, паколькі працэсы ўрбанізацыі хоць і замарудзіліся, але не завяршыліся. Фактар

адукаванасці стаў адным з найважнейшых пры фарміраванні аблічча эліты і кадравай палітыкі КПСС (КПБ) і савецкага ўрада ў цэлым.

Сацыяльны статус кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў быў высокім, а зарплата падтрымлівала яго прэстыжнасць. Яны з’яўляліся прадстаўнікамі мясцовай, а буйных прадпрыемствах – рэспубліканскай эліты. Але выявіліся шматлікія факты злоўжыванняў імі сваім становішчам пры размеркаванні прэмій, матэрыяльнай дапамогі, санаторных пуцёвак і г. д. У 1980-я гг. асаблівы акцэнт зноў рабіўся на сацыяльным паходжанні (кім былі раней – рабочымі або калгаснікамі) кіраўніцкіх работнікаў. Гэта было выклікана тым, што сфарміравалася партыйна-савецкая і партыйна-гаспадарчая наменклатура, якая стала складаць асобную частку савецкага грамадства, адарваную ад астатняга народа. Каб падкрэсліць сваю сувязь з рабочымі і сялянамі, што адпавядала сутнасці камуністычнай ідэалогіі, сталі падкрэсліваць такія звесткі ў справаздачах. Эпохі “застою” уласціва з’яўленне “сацыяльнай іржы”, якая стала раз’ядаць грамадства, падзяляючы яго на дзве часткі: наменклатуру (лепш забяспечвалася ўсім неабходным) і астатніх (жылі ў адпаведнасці з магчымасцямі ва ўмовах недахопу якасных тавараў і паслуг).

Існавалі разнастайныя формы прыцягнення рабочых і служачых да кіравання вытворчасцю, сродкаў пошуку і падрыхтоўкі новых кадраў: заключэнне калектыўных дамоў, правядзенне рабочых сходаў, пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады, дзейнасць на прадпрыемствах шматлікіх творчых аб’яднанняў. Вынаходніцтва і стварэнне апошніх стала характэрнай рысай часу кіравання краінай М. Хрушчовым. Кампанейшчына нярэдка дыскрэдытавала пачынанні, мноства аб’яднанняў існавалі фармальна, ніякіх канкрэтных пытанняў не вырашала. Яны паказалі сваю нізкую эфектыўнасць у далучэнні работнікаў да кіравання прадпрыемствамі.

Рысы кампанейшчыны назіраліся не толькі ў грамадска-палітычным жыцці краіны, грамадскім жыцці на прадпрыемствах усходняй Беларусі, але і выяўлены пры правядзенні арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў на вытворчасці, у працэсе падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў. Выяўлена залежнасць паміж сістэматычнымі рэарганізацыямі сістэмы кіраўніцтва краінай, кіравання прамысловасцю, метадамі палітычных кампаній у грамадска-палітычным жыцці краіны і рэарганізацыямі ў сістэме падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэнні кваліфікацыі кадраў для прамысловасці і метадах правядзення арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў на вытворчасці, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў.

Ва ўмовах хуткіх тэмпаў індустрыялізацыі і ўрбанізацыі ўзніклі шматлікія дыспрапорцыі, абвастрыліся многія сацыяльныя і вытворчыя праблемы, у тым ліку карупцыйныя праявы на прамысловых прадпрыемствах БССР. Яны ў другой палове 1950–1960 гг. на прамысловых прадпрыемствах пачалі выяўляцца ў канфліктах: працоўных спрэчках і забастоўках. Барацьба работнікаў за свае правы, у тым ліку забастоўкі рабочых на прадпрыемствах БССР сталі адным з фактараў, які меў істотнае значэнне для павышэння ўвагі партыйных і гаспадарчых органаў кіравання да кадравай палітыцы ў

прамысловасці. Рабочы рух не выйшаў за межы эканамічных рамак, адкрыта палітычных патрабаванняў на прадпрыемствах Беларусі намі не выяўлена.

Недахопы ў рабоце прамысловых прадпрыемстваў шмат у чым былі выкліканы пралікамі ў кіраўніцтве імі з боку КПСС-КПБ. Заўважалася схільнасць да састарэлых форм і метадаў працы, няўменне на поўную сілу выкарыстаць велізарны патэнцыял перадавой інжынернай думкі, дасягненні навукі і перадавога вопыту. Павярхоўны падыход не дазваляў знаходзіць аптымальныя рашэнні складаных праблем, ліквідацыі прычын, якія спараджалі недахопы. На працягу шэрагу гадоў партыйнае і гаспадарчае кіраўніцтва не магло дамагчыся паляпшэння выкарыстання асноўных вытворчых фондаў. Не было належнага патрабавання і высокай прынцыповасці ў ацэнцы дзейнасці кіраўнікоў. Часта замена работнікаў уяўляла простую механічную перастаноўку кадраў, што не давала жаданага выніку. Гаспадарчыя кіраўнікі, каб атрымаць прэміі і славу, часам станавіліся на шлях ашуканства і падману дзяржавы, завышаючы паказчыкі выканання планавых заданняў. У шэрагу гарадоў і раёнаў не заўважаліся факты прыпісак і падману дзяржавы, памяркоўна адносіліся да тых работнікаў, якія скампраментавалі сябе, і ім вельмі часта знаходзілі новыя кіраўніцкія пасады. Шматлікія факты прыпісак і ашуканства ставяць пад сумненне дакладнасць справаздачных лічбаў аб выкананні планаў і праграм гаспадарчага развіцця БССР.

Кіраўніцтва краіны, каб спыніць зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту, абапіралася ў асноўным на пазаэканамічныя, адміністрацыйна-камандныя метады. Комплекс матэрыяльных мер слаба заахвочваў спецыялістаў. У прыватнасці не існавала дзейнага механізма, які ўвязваў фінансавую ўзнагароду кіраўнікоў і спецыялістаў з эканамічнымі паказчыкамі прадпрыемстваў, што прыводзіла да іх слабай асабістай зацікаўленасці ў паляпшэнні эканамічных вынікаў. У кіраўнікоў і спецыялістаў прадпрыемстваў не існавала магчымасцяў для самастойнай дзейнасці, эксперыментаў, прымянення нестандартных падыходыў у арганізацыі вытворчасці; скоўваліся творчыя памкненні кадраў жорсткімі рамкамі адміністрацыйнай распарадчасці і кантролю; не забяспечвалася неабходная ступень эканамічнай свабоды, дапушчальная ступень рызыкі. Таму набірае сілу фармалізм, шырока практыкуюцца прыпіскі.

Спробы выправіць становішча ў эканоміцы шляхам змяняльнасці кадраў і ўкаранення розных метадаў павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу ва ўмовах існавання савецкай эканамічнай сістэмы не прынеслі чаканага выніку. На адказных пасадах як у сферы дзяржаўнага кіравання, так і ў прамысловасці паступова сталі пераважаць асобы сталага веку. Калі ў першыя пасляваенныя гады назіралася звышвысокая змяняльнасць кіраўнікоў усіх рангаў, якую прыпынялі дырэктыўымі сродкамі, то ў 1970–1980 гг. выразна прасочвалася нізкая змяняльнасць кіраўніцкіх кадраў, у асноўным па гарызанталі, што істотна перашкаджала абнаўленню кадравага патэнцыялу і развіццю эканомікі БССР. Прынцып “стабільнасці кадраў” прыводзіў да таго, што мясцовыя кіраўнікі з часам сталі паўнаўладнымі гаспадарамі ва ўстановах і аб’ектах гаспадаркі, якімі кіравалі. Стварэнне цесных сувязяў унутры наменклатуры, з аднаго боку, прыводзіла да фактычнай беспакаранасці

мясцовых кіраўнікоў, з другога – уваходзіла ў супярэчнасць з аб’ектыўнымі заканамернасцямі развіцця савецкага грамадства. З 1985 г. у сувязі з правядзеннем палітыкі “паскарэння і перабудовы” спрабавалі шляхам вылучэння на кіраўніцкія пасады новых работнікаў правесці працэс “амаладжэння” кадравага патэнцыялу краіны, але гэтага не адбылося таму, што сістэма рэалізацыі кадравай палітыкі заставалася ранейшай.

Ва ўмовах хуткіх тэмпаў індустрыялізацыі і ўрбанізацыі ўзніклі шматлікія дыспрапорцыі, абвастрыліся многія сацыяльныя і вытворчыя праблемы, у тым ліку карупцыйныя праявы на прамысловых прадпрыемствах БССР. Органы кіравання не былі гатовы да партнёрскіх адносінаў з работнікамі, выкарыстоўвалі ў канфліктных сітуацыях тактыку арганізацыйнага і псіхалагічнага ціску, патрабавалі ад работнікаў аднабаковых саступак.

Эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў прамысловасці ўсходніх раёнаў БССР мала адрозніваліся ад рэспубліканскіх і агульнасаюзных. Цэнтральную і рэгіянальную партыйна-дзяржаўную ўладу хвалявалі праблемы ў прамысловасці, якія залежылі і адначасова ўплывалі на кадравы патэнцыял прадпрыемстваў і краіны: маруднае і не паслядоўнае развіццё НТП, дэфіцыт і нізкая якасць тавараў, злоўжыванні ўладнымі паўнамоцтвамі, злачыннасць і крадзяжы дзяржаўнай маёмасці на вытворчасці, ужыванне алкаголю на працоўных месцах, парушэнні працоўнай дысцыпліны, цякучасць, узровень кваліфікацыі і падрыхтоўка кадраў, недахоп жылля, несвоечасовыя пастаўкі будаўнічых матэрыялаў і запчастак, невыкананне паставак ад сумежнікаў, недастатковае і несвоечасовае фінансаванне, нерытмічнасць у працоўным працэсе, прастоі праз невыкананне сваіх абавязацельстваў іншымі прадпрыемствамі і іншыя.

Прымаліся меры або адбывалася іх імітацыя, але негатыўныя праявы не знікалі. Агульнасаюзнае, рэспубліканскае і мясцовае партыйна-савецкае кіраўніцтва спрабавала шляхам прапаганды і прыняцця адміністрацыйных мер вырашыць эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў грамадстве. Адміністрацыйна-рэпрэсіўныя меры не давалі эфекту, а эканамічных механізмаў не існавала, яны не маглі быць створаны ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы кіравання і размеркавання.

Нягледзячы на імкненне ўзмацнення адміністрацыйных мер у працы з кадрамі, чаканых вынікаў дасягнута не было. Наадварот, развіваліся негатыўныя тэндэнцыі. Па-першае, павялічвалася цякучасць кадраў. Па-другое, тармазіўся працэс фарміравання кіраўнікоў сярэдняга звяна, зменшыўся патэнцыяльны рэзэрв на больш высокую пасаду. Па-трэцяе, склалася становішча, калі кіраўнікі імкнуліся ўзгадніць з вышэйстаячым органам кожны крок, перакладваючы часткова сваю адказнасць на іншых, баяліся праявіць ініцыятыву і самастойнасць. Усё гэта садзейнічала росту бюракратызму, няўпэўненасці кіраўнікоў у сваім становішчы, выклікала нежаданне працаваць з улікам перспектывы, прымушала дабівацца станоўчых вынікаў у службовай дзейнасці любымі, нават і супрацьпраўнымі, сродкамі.

Узмацненне кантролю па рашэнні выяўленых праблем у сацыяльнай сферы і кадравай палітыцы ў прамысловасці ўсходніх рэгёнаў БССР давала

кароткатэрміновы станоўчы эфект, не прыводзіла ў стратэгічным плане да іх вырашэння або выкараненні, паколькі недахопы нярэдка мелі ўнутрана ўласцівыя савецкай сістэме кіравання прычыны, а іх рашэнне насіла ярка выражаны кампанейскі характар. Больш эфектыўнымі для павышэння кадравага патэнцыялу паказалі сябе арганізацыйныя і адукацыйныя мерапрыемствы, адлажванне сістэмы павышэння кваліфікацыі спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў, паляпшэнне ўмоў працы работнікаў прамысловасці.

Кадравы патэнцыял прамысловасці Беларусі ва ўмовах адзінага народнагаспадарчага комплексу (1944–1991) забяспечыў устойлівае сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё рэспублікі на савецкім этапе мадэрнізацыі краіны. Індустрыя ўсходніх рэгіёнаў БССР у пасляваенны перыяд паспяхова і дастаткова ўстойліва развівалася больш за чатыры дзесяцігоддзі. Мянялася яе структура, з’яўляліся новыя больш сучасныя галіны прамысловасці. Паступова БССР ператварылася ва ўсесаюзны зборачны цэх машынабудаўнічай індустрыі. У той жа час, разам з поспехамі ў гаспадарчым развіцці выразна прасочваліся сур’ёзныя недахопы ў працы шматлікіх прамысловых прадпрыемстваў. Беларуская эканоміка, як і ўся савецкая, усё больш адставала ад эканомік вядучых капіталістычных краін па эфектыўнасці, тэхнічным і тэхналагічным узроўнях, большасці іншых паказчыкаў.

Поспехі індустрыяльнага развіцця сталі магчымыя, найперш дзякуючы напружанай працы прамысловых кадраў, іх уменню вучыцца, засвойваць новыя тэхналогіі і віды працы. Адбылося станаўленне кадраў прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў Беларусі – складаны працэс, у якім важную ролю адыграла як палітыка кіруючай эліты СССР, так і самадзейнасць, творчасць мясцовых органаў кіравання, работнікаў працоўных калектываў. Многія прыёмы і метады падрыхтоўкі і павышэнняя кваліфікацыі кадраў, вырашэння кадравых і вытворчых пытанняў і сёння заслугоўваюць увагі. У той жа час пралікі ў працы і вялікі кошт, які заплаціла грамадства за дасягненне поспехаў у прамысловым будаўніцтве, эканамічная неэфектыўнасць многіх тагачасных метадаў працы, патрабуюць удумлівага асэнсавання і асцярожнага прымянення.

## Бібліяграфія

### Архіўныя крыніцы


**Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці**

1. Ф. 1-п Віцебскі абласны камітэт КПБ.
2. Ф. 1966 Віцебскі абласны выканаўчы камітэт (савет народных дэпутатаў). 1948–1996.
3. Ф. 2856 Віцебскае вытворчасе кіраванне мясцовай прамысловасці Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта

**Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці**

4. Ф. 1174 Гомельскі абласны савет дэпутатаў працоўных і яго выканаўчы камітэт

**Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці**

5. Ф. 144 Гомельскі абласны камітэт КП(б)Б

**Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці**

6. Ф. 9 Магілёўскі абкам кампартыі Беларусі
7. Ф. 4317 Бабруйскі абласны камітэт КПБ

**Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці**

8. Ф. 7. Магілёўскі абласны савет народных дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт. г.Магілёў, БССР (1938–1994)
9. Ф. 11 Выканаўчы камітэт Магілёўскага гарадскога савета дэпутатаў
10. Ф. 1027 Магілёўскі абласны савет прафсаюзаў
11. Ф. р-2827 Упраўленне мясцовай прамысловасці Магілёўскага аблвыканкама

**Занальны дзяржаўны архіў у г. Оршы**

12. Ф. 27 Аршанскі гарадскі савет дэпутатаў і яго выканкам. 1944–1994 гг.
13. Ф. 86 Аршанскі інфармацыйна-вылічальны цэнтр статыстычнага ўпраўлення Віцебскай вобласці

**Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку**

14. Ф. 666. Аддзел статыстыкі па г. Полацку і Полацкаму раёну Віцебскага абласнога ўпраўлення статыстыкі. 1944–1956, 1958–2004 гг.
15. Ф. 1220. Аддзел статыстыкі па г. Наваполацку Віцебскага абласнога ўпраўлення статыстыкі. 1966–2002 гг.

**Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь**

16. Ф. 4 п Цэнтральны камітэт КП(б)Б
17. Ф. 7 Савет Міністраў БССР
18. Ф. 265 Цэнтральны савет прафесійных саюзаў БССР

**Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі**

19. Ф. Р-9497 Парламентская група СССР. 1989–1991 гг.
20. Ф. Р-9654 Съезд народных депутатов СССР, ВС СССР. 1989–1991 гг.

**Расійскі дзяржаўны архіў навейшай гісторыі**

21. Ф. 2 Пленумы ЦК ВКП(б) – ЦК КПСС. 1941–1990 гг.
22. Ф. 5 Аппарат ЦК КПСС. 1952–1984 гг.
23. Ф. 89 Коллекция рассекреченных документов

**Апублікаваныя крыніцы**

24. 35 лет Могилёвскому государственному университету продовольствия / редкол.; В. А. Шаршунов (пред.). – Минск: Изд. центр БГУ, 2009 . – 343 с.
25. Беларусь в постановлениях и распоряжениях Государственного Комитета Обороны СССР, 1941–1945 гг. : справочник / сост.: В.Д. Селеменёв [и др.]. – Минск : НАРБ, 2008. – 216 с.
26. Белорусская ССР в годы Советской власти. Статистический сборник. Под ред. Червенева Б. Н. и др. – Минск: Беларусь, 1967. – 403 с.
27. Биографический справочник Белорусская ССР: Крат. энциклопедия Т. 5. – Минск: Белорус.сов.энциклопедия, 1982. – 733 с.
28. БССР. Вярхоўны Савет. Скліканне (11). Сесія (8). Стэнаграфічная справаздача. – Мінск: Беларусь, 1988. – 190 с.
29. БССР. Вярхоўны Савет. Скліканне (11). Сесія (1). Стэнаграфічная справаздача. – Мінск: Беларусь, 1985. – 312 с.
30. Государственный архив Витебской области: путеводитель, 1917–2006 / сост. Т. В. Буевич, Ю. С. Петухов. – Минск: Медисонт, 2011. – 936 с.
31. Государственный архив Гомельской области: путеводитель/ сост.: В. Н. Надежина (ответств.сост.), Т. Ф. Поздняк; редкол.: П. М. Черный (гл.ред.) [и др.] – Минск: НАРБ, 2009 – 588 с.
32. Зональный государственный архив в г. Полоцке. Путеводитель. 1943–2007 / сост. Т. В. Буевич, Р. В. Счастная, И. Д. Третьяк. – Минск : Медисонт, 2011. – 448 с.
33. История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. Рабочий класс БССР накануне и в годы Великой Отечественной войны, в период упрочнения и развития социалистического общества (1938–1960) / Ин-т истории АН БССР. – Минск : Наука и техника, 1985. – 485 с.
34. Итоги Всесоюзной переписи населения 1970 года в 7 т. Т. IV. – М.: “Статистика”, 1972. – 647 с.
35. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. – Минск: Беларусь, 1983. – Т. 1. – 527 с.
36. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 4. 1945–1955. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; под ред. Г. Г. Бартошевича [и др.]. – Минск: Беларусь, 1986. – 615 с.
37. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. 1966-1975 / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; под ред. Г. Г. Бартошевича (председатель редкол.) и др. – Минск: Беларусь, 1986. – 623 с.
38. Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах 1918–1988. – Минск: Беларусь, 1988. – 254 с.
39. Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов

ЦК (1898–1986). Т. 9. 1956–1960. – 9-е изд., доп и испр. – М.: Политиздат, 1986. – 574 с.
40. Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–986). Т. 10. 1961–1965. – 9-е изд., доп и испр. – М.: Политиздат, 1986. – 494 с.
41. Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 11. 1966–1970. – 9-е изд., доп и испр. – М.: Политиздат, 1986. – 574 с.
42. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. 1971–1975. – 9-е изд., доп. и испр. – М.: Политиздат, 1986. – 574 с.
43. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 13. 1976–1980. – 9-е изд., доп. и испр. – М.: Политиздат, 1986. – 510 с.
44. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 14. 1981–1984. – 9-е изд., доп. и испр. – М.: Политиздат, 1987. – 639 с.
45. Народное хозяйство Белорусской ССР : статистический сборник / Статистическое управление Белорусской ССР. – М.: Государственное статистическое издательство, 1957. – 318 с.
46. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. Стат. ежегод. / ЦСУ БССР. – Минск : Беларусь, 1981. – 336 с.
47. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1982 г. / ЦСУ БССР – Минск: Беларусь, 1983. – 230 с.
48. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1987 г.: Стат. ежегодник / Госкомстат БССР. – Минск.: Беларусь, 1988. – 296 с.
49. Народное хозяйство Белорусской ССР. – Минск: Книжная палата БССР, 1965. – 349 с.
50. Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г.: стат. ежегод. / ЦСУ БССР. – Минск : Беларусь, 1975. – 336 с.
51. Народное хозяйство БССР в 1988 году: Стат. ежегодник. – Минск: Беларусь, 1989. – 264 с.
52. Народное хозяйство СССР в 1970 году: Стат. ежегодник. – М.: Изд-во “Статистика”, 1971. – 824 с.
53. Народное хозяйство СССР за 70 лет: Юбилейный стат. ежегодник / Госкомстат СССР. – М.: Финансы и статистика, 1987. – 766 с.
54. Население СССР: По данным Всесоюз. переписи населения 1979 г. – М.: Политиздат, 1980. – 32 с.
55. Население СССР: По данным Всесоюзной переписи населения 1989 г. / Госкомстат СССР. – М.: Финансы и статистика, 1990. – 45 с.
56. Образование и развитие Союза Советских Социалистических Республик (в документах). – М.: «Юридическая литература», 1973. – 735 с.
57. Освобождённая Беларусь: док. и материалы. В 2-х кн. Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944 / Сост.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2004. – 398 с.
58. Освобождённая Беларусь: док. и материалы. В 2-х кн. Кн. 2. Январь – декабрь 1945 / Сост.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2005. – 506 с.

59. Промышленность Белорусской ССР (1913–1975). – Минск : Беларусь, 1976. – 478 с.
60. Путеводитель. 1917–2004. Зональный государственный архив в г. Орше. – Орша: Оршанская типография, 2009. – 400 с.
61. Численность и состав населения СССР: По данным Всесоюзной переписи населения 1979г. / ЦСУ СССР. – М.: Финансы и статистика, 1984. – 366 с.

**Літаратура**

62. Агеев, А. Г. История профсоюзного движения Могилёвщины / А. Г. Агеев, И. А. Пушкин. – Могилёв: УПКП «Могилёвская областная укрупнённая типография имени Спиридона Собаля», 2005. – 216 с.
63. Агеев, А. Г. Производственные совещания на предприятиях Могилевской области в 1956–1965 гг. / А. Г. Агеев // Могилевщина. – 1991. – С. 60–63.
64. Агеев, А. Г. Бастовали ли рабочие до перестройки? / А. Г. Агеев // Человек и экономика. – 1991. – № 5. – С. 25–27.
65. Агеев, А. Г. Общественно-политическая деятельность рабочего класса Беларуси в 1956–1965 гг. Автореферат дис… к. и. н. – Минск, 1992. – 22 с.
66. Агееў, А. Р. Ідэалагічныя аспекты падрыхтоўкі кадраў для прамысловасці БССР у другой палове 1950–1960-х гг. / А. Р. Агееў // Октябрьская революция в исторических судьбах белорусской государственности : сборник статей / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2020. – С. 88–93.
67. Агееў, А. Р. Імітацыйнае самакіраванне на прамысловых прадпрыемствах БССР у другой палове 1950–1960-х гадах / А. Р. Агееў // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад., аўт. прадмовы І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў: МДУХ, 2017. – С. 103–109.
68. Агееў, А. Р. Кадравы патэнцыял прамысловасці Магілёўшчыны 1956-1970 гг. / А. Р. Агееў // Романовские чтения – 15: сборник статей Международной научной конференции / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2021. – С. 39–40.
69. Агееў, А. Р. Кіраўніцтва і кантроль за фарміраваннем кадраў прамысловых прадпрыемстваў БССР з боку ЦК КПСС у 1956–1970 гг. / А. Р. Агееў // Беларусьу кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2021. – С. 202.205.
70. Агееў, А. Р. Умовы і асаблівасці фарміравання кадравага патэнцыялу прамысловых прадпрыемстваў усходніх рэгіёнаў БССР (1956–1970 гг.) / А. Р. Агееў // Гістарычны лёс беларускай савецкай дзяржаўнасці (да 100-годдзя абвяшчэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі): зб. артыкулаў / Інстытут гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2021. – С. 280–286.
71. Агееў, А. Р. Паслясталінскія забастоўкі савецкіх рабочых у Магілеве і кадравая палітыка КПБ / А. Р. Агееў // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зборнік навуковых прац удзельнікаў Х Міжнар. навук. канф., 25‒26 мая 2017 г., г. Магілёў / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў: МДУХ, 2017. – С. 172‒177.
72. Адамушка, У. І. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі / У. І. Адамушка. – Мінск: Беларусь, 1994. – 158 с.

73. Акадэмік М. П. Касцюк / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: В. Г. Мазец, С. А. Траццяк, А. А. Капліеў. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – 135 с.
74. Андриенко, В. Ф. Совершенствование экономического стимулирования в промышленности / В. Ф. Андриенко. – Киев: Наукова думка, 1978. – 201 с.
75. Апостолов, Е. Урбанизация. Тенденции и гигиеническо-демографические проблемы / Е. Апостолов, Х. Мичков. – М.: Медицина, 1997. – 400 с.
76. Астаповский, В. Е. История белорусской государственности: Учеб. пособие / В. Е. Астаповский, В. А. Божанов, В. И. Малиновский. – Минск: Акад. упр. при Президенте Беларуси, 2002. – 192 с.
77. Афанасьев, В. Н. Состояние материальной базы строительства в БССР во второй половине 70-х – первой половине 80-х гг. / В. Н. Афанасьев // Романовские чтения : сборник трудов международной научной конференции, Могилев, 21 октября 2004 г / под ред. О. В. Дьяченко . – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2005. – С. 19–21.
78. Багровіч, А. Жыхарства Беларускае ССР у сьвятле перапісу 1959 г. / А. Багровіч / Бел. Інст. Навукі і Маст. – Нью-Ёрк, Мюнхен, 1962. – 88 с.
79. Барабаш, Н. Миграционные процессы в БССР в первые послевоенные годы (1946–1950) / Н. Барабаш // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2006. – № 3. – С. 22–25.
80. Барабаш, Н. Организованный набор рабочих и общественные призывы в БССР (1946–1965) гг. / Н. Барабаш // Гістарычна–археалагічны зборнік. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – Вып. 30. – С. 203–209.
81. Барановский, Е. И. Динамичный характер национальных отношений в СССР / Е. И. Барановский // Коммунист Белоруссии. – 1986. – № 12. – С. 14–22.
82. Барвінок, К. І. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах ХХ ст. / К. І. Барвінок, І. А. Саракавік // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2005. – № 4. – С. 69–75.
83. Батяев, В. Ф. Расселение и этнодемографические особенности белорусских евреев (по материалам переписей) / В. Ф. Батяев // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. / БДПУ пад рэд. А. Кавалені. – Мінск: БДПУ, 1998. – С. 57–76.
84. Бачило, И. Л. Организация советского государственного управления / И. Л. Бачило. – М.: Наука, 1984. – 237 с.
85. Бачило, И. Л. Функции органов управления / И. Л. Бачило. – М.: Юрид. лит., 1976. – 198 с.
86. Бегель, І. Развіцце эканомікі Беларусі : (50-я – першая палова 80-х гадоў ХХ стагоддзя) / І. Бегель // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2007. – № 5. – С. 8–13.
87. Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык, В. М. Белявіна, Г. І. Каспяровіч і інш.; Рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 433 с.
88. Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко і інш.; Рэдкал.: В. М. Бялявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 606 с.
89. Беларусь у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах 1946–2006 гг. / пад навук. рэд. М. П. Касцюк. – Мінск : Бел. навука, 2007. – 215 с.

90. Белорусская ССР: статус, достижения, развитие / В. И. Шабайлов [и др.] ; Акад. наук БССР, Ин-т философии и права. – Минск : Наука и техника, 1989. – 310 с.
91. Белорусы в Карелии. Исследования и материалы / Науч. ред. Л. И. Вавулинская, О. П. Илюха. – Петрозаводск: Карельский научный центр РАН, 2016. – 462 с.
92. Блистинов, М. М. Минский автомобильный. Очерк истории завода / М. М. Блистинов, Ю. К. Богушевич, Е. Г. Вайнруб. – Минск : Беларусь, 1972. – 240 с.
93. Бубнаў, Ю. М. “Кадры вырашаюць усё” / Ю. М. Бубнаў, І. А. Пушкін // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 года / Маг. дзярж. ун-т харч. ; уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў; рэдкал. : Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў: МДУХ, 2018. – С. 9–11.
94. Бунич, П. Г. Хозяйственный механизм развитого социализма / П. Г. Бунич. – М.: Наука, 1980. – 351 с.
95. Бутакова, А. Д. Обобществление труда и экономические интересы в развитом социалистическом обществе / А. Д. Бутакова, Г. И. Тамошина. – Воронеж: Изд. Воронежского университета, 1979. – 153 с.
96. Бушчык, Г. П. Выкарыстанне рэпарацый для аднаўлення гаспадаркі Беларусі пасля Другой сусветнай вайны / Г. П. Бушчык // XXI век: актуальные проблемы исторической науки. – Мн., 2004. – С. 237–238.
97. Бушчык, Г. П. Міжнародныя пагадненні аб рэпарацыях і іх паступленне ў БССР у 1945–1946 гг. / Г. П. Бушчык // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 8. – С. 10–15.
98. Бушчык, Г. П. Выкарыстанне германскіх рэпарацый для аднаўлення Мінска пасля Вялікай Айчыннай вайны / Г. П. Бушчык // Весці БДПУ. Сер. 2. – 2006. – № 2. – С. 3–7.
99. Бушчык, Г. П. Значэнне германскіх рэпарацый для аднаўлення гаспадаркі г. Магілёва і Магілёўскай вобласці пасля Другой сусветнай вайны / Г. П. Бушчык // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зб. навук. прац удзельнікаў міжнар. навук. канф., Магілёў, 22–23 мая 2003 г. : у 2 ч. / рэдкал.: І. А. Пушкін [і інш.]. – Магілёў, 2003. – Ч. 1. – С. 119–127.
100. Бушчык, Г. П. Эканамічныя сувязі Беларусі ў перыяд аднаўлення гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны: новыя даследаванні / Г. П. Бушчык // Веснік БДУ.– 2005. – № 2. – С. 40-44.
101. Бущик, Г. П. Роль германских репараций в формировании современного промышленного облика Минска / Г. П. Бущык // Устойчивое развитие современных крупных городов: теория, опыт, проблемы. – Минск, 2002. – С. 262–267.
102. Бущик, Г. П. Экономические связи Беларуси в годы послевоенного восстановления народного хозяйства / Г. П. Бущик // Директор. – 2005. – № 5. – С. 56–59.
103. Бущик, Г. П. Экономические связи Беларуси: исторический опыт развития / Г. П. Бущик // Веснік БДЭУ. – 2006. – № 1 – С. 100–106.
104. Быстров, И. Е. Управление кадровым обеспечением регионов на основе прогнозирования потребности в специалистах с высшим профессиональным

образованием: автореф. дис. … канд. экон. наук: 05.13.10 / И. Е. Быстров. – Воронеж, 2003. – 19 с.
105. Ванкевич, Е. Кадровые службы: направления активизации / Е. Ванкевич // Беларуская думка. – 2011. – № 1. – С. 52–59.
106. Веселков, Ф. С. Материальное стимулирование трудящихся в СССР / Ф. С. Веселков. – М.: Госполитиздат, 1962. – 239 с.
107. Вишневский А. Ф. Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917–1995). – Минск: ТПА “Форум” , 1995. – 266 с.
108. Владимиров, В. А. Ответственность за корыстные посягательства на социалистическую собственность / В. А. Владимиров, Ю. И. Ляпунов. – М.: Юрид. лит., 1986. – 224 с.
109. Владимиров, В. А. Социалистическая собственность под охраной закона / В. А. Владимиров, Ю. И. Ляпунов. – М.: Юрид. лит., 1979. – 200 с.
110. Возвращённые имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репресий. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 120 с.
111. Возрастание руководящей роли КПСС в строительстве социализма и коммунизма / Редкол.: Родионов П. А. и др. – М.: Политиздат, 1979. – 296 с.
112. Волженкин, Б. В. Ответственность за взяточничество / Б. В. Волженкин, В. Е. Квашис, С. Ш. Цагикян. – Ереван: Айастан, 1988. – 221 с.
113. Вопыт паспяховасці: крок за крокам (кейсы вырашэння праблем) : зборнік навуковых артыкулаў / уклад. А. Р. Агееў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2019. – 195 с.
114. Вялікі, А. Ф. Палякі ў савецкай Беларусі: “дваістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.) / А. Ф. Вялікі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У. І. Навіцкі, М. С. Сташкевіч. – Мінск: «Дэполіс», 2001. – С. 292–297.
115. Гавін, Т. Практыка адносінаў савецкай і партыйнай улады да мясцовага насельніцтва ў першыя пасляваенныя гады ў Гародні і вобласці / Т. Гавін // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст. / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2012. – С. 369–383.
116. Галахова, А. В. Превышение власти или служебных полномочий / А. В. Галахова. – М. Юрид. лит., 1978. – 185 с.
117. Ганбаров, Б. А. Азербайджанская диаспора в Республике Беларусь: организационная структура, социально-экономическое положение и основные направления деятельности (1989–2013 г.) / Б. А. Ганбаров. – Минск : Донарит, 2014. – 231 с.
118. Ганчарэнка, У. П. Методыка вызначэння прагнознай патрэбнасці ў кваліфікаваных кадрах на прадпрыемстве / У. П. Ганчарэнка, Д. М. Міронаў, І. А. Рыжанкоў // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2010. – № 2. – С. 48–51.
119. Гершкович, Б. Я. Экономические интересы в условиях развитого социалистического общества / Б. Я. Гершкович, В. И. Лившиц. – М.: Высшая школа, 1975. – 183 с.
120. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2007. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2007. – 616 с.
121. Гісторыя Беларускай ССР : У 2 т. / Пад. рэд. І. С. Краўчанкі, Н. В. Каменскай. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1958. – Т. 2. – 662 с.

122. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка,1972–1975. – Т. 4 : Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.) / І. С. Краўчанка [і інш.]. – 1975. – 640 с.
123. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 5 : Беларуская ССР у перыяд стварэння развітого сацыялістычнага грамадства і будаўніцтва камунізму (1945–1974 гг.) / А. А. Філімонаў [і інш.]. – 1975. – 776 с.
124. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. – Ч. 2. XIX–XX ст / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў і інш. – Мінск: РІВШ БДУ, 2002. – 498 с.
125. Гісторыя Беларусі : У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч і інш.; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.
126. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 / М. У. Смяховіч і інш.; рэдкал.: А. А. Каваленя і інш; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – 654 с.
127. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1 / А. А. Каваленя і інш.; рэдкал.: А. А. Каваленя і інш; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 584 с.
128. Гладкевич, А. И. Организация труда немецких военнопленных на предприятиях и стройках Беларуси / А. И. Гладкевич // Другая сусветная вайна: новыя аспекты даследаванняў. – Мінск, 2004. – С. 164–181.
129. Гомсельмаш / И. П. Котенок, Н. Н. Майоров, В. Я. Райский. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск : Беларусь, 1970. – 68 с.
130. Горбачев, О. В. Российская урбанизация в XX веке как междисциплинарная проблема / О. В. Горбачев // Вестник Брянского государственного университета имени академика И. Г. Петровского. История. Литературоведение. Языкознание. – 2012. – № 2. – С. 67–71.
131. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. – Мінск, 1990. – 246 с.
132. Грыбко, Ю. Мінск пасля нямецкай акупацыі / Ю. Грыбко // Материалы ежегодной науч. конф. студентов и магистрантов ун-та: В 4 ч. – Минск, 2002. – Ч. 1. – С. 199–203.
133. Дзімітрук, П. П. Кадравая сітуацыя ў навуцы Рэспублікі Беларусь / П. П. Дзмітрук // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2002. – № 1. – С. 5–13.
134. Дзярновіч, А. “Новыя гараджане” мегаполіса: трансфармацыя сацыякультурнага асяроддзя Мінска ў 1950-я – 1980-я гг.: пастаноўка праблемы // Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі: XIX – пачатак XXI ст.: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Я. А. Роўба, І. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адк. рэдактары) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2010. – С. 96–101.
135. Дудич, З. З. Материальные интересы и экономические законы в развитом социалистическом обществе / З. З. Дудич. – Минск: Наука и техника, 1978. – 173 с.
136. Ежов, В. А. Проблема возрождения освобожденных и прифронтовых районов СССР в период Великой Отечественной войны в советской историографии / В. А. Ежов // Возрождение прифронтовых и освобожденных районов СССР в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. – М., 1986. – С. 182–197.

137. Елизаров, С. А. Трансформация областного деления БССР (1944–1969 гг.) / С. А. Елизаров // Ученые записки УО «ВГУ имени П. М. Машерова» : Сборник научных трудов. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2013. – Т. 15. – С. 35–43.
138. Ермоленко, Н. А. Деятельность Компартии Белоруссии по восстановлению и дальнейшему развитию легкой промышленности республики в 1944–1950 гг.: Дис. … канд. ист. наук. – Минск, 1976. – 20 с.
139. Ефименко, А. Г. Направления инновационного развития перерабатывающих организаций АПК // И. И. Пантелеева, А. Г. Ефименко // Научные труды Белорус. гос. экон. ун-та; редкол. В.Н. Шимов [и др.]. – Минск, 2020. – Вып. № 13. – С. 220–228.
140. Ефименко, А. Г. Организация производства (пищевая промышленность): учебное пособие / А. Г. Ефименко, М. И. Какора. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – 268 с.
141. Ефименко, А. Г. Оценка эффективности стратегии развития организации / А. Г. Ефименко, М. И. Какора // Научные труды Белорус. гос. экон. ун-та; редкол. В. Н. Шимов [и др.]. – Минск, 2021. – Вып. № 14. – С. 145–151.
142. Запруднік, Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях / Я. Запруднік. – Мінск: ВЦ «Бацькаўшчына», 1996. – 264 с.
143. Игнатенко, И. М. Национальный вопрос и современность / И. М. Игнатенко // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук.канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001г.) / У. І. Навіцкі, М. С. Сташкевіч. – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 31–38.
144. Из истории социалистического и коммунистического строительства / Сб. статей. Науч.ред. А. Н. Мацко. – Минск: Ин-т истории АНБССР, 1973. – 193 с.
145. Из истории социалистического строительства Советской Белоруссии. Сб. статей. – Минск: Идв-во АН БССР, 1959. – 249 с.
146. Ильюшин, И. Народное образование в Белорусской ССР / И. Ильюшин, С. Умрейко. – Минск: Учпедгиз, 1961. – 483 с.
147. Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси : Краткий науч.-попул. очерк / Э. Г. Иоффе. – Минск: Арти-Фекс, 1996. – 292 с.
148. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 5. Национальная государственность на переломе эпох (вторая половина XX – начало XXI в.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. Н. В. Смехович ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларуская навука, 2020. – 759 с.
149. История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. Рабочий класс БССР накануне и в годы Великой Отечественной войны, в период упрочнения и развития социалистического общества (1938–1960) / Ин-т истории АН БССР. – Минск: Наука и техника, 1985. – 485с.
150. История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 3. Рабочий класс БССР накануне и в годы Великой Отечественной войны, в период упрочнения и развития социалистического общества (1938–1960) / Ин-т истории АН БССР. – Минск : Наука и техника, 1985. – 485с.
151. История рабочего класса Белорусской ССР: В 4-х т. Т. 4. Рабочий класс БССР на этапе совершенствования социализма (1961–1986) / Ин-т истории АН БССР; Редкол.тома: И. Е. Марченко (отв.ред.) и др. – Минск: Наука и техника, 1987. – 510 с.

152. История России (Россия в мировой цивилизации): Курс лекций / Сост. и отв. редактор А. А. Радугин. – М.: Центр, 2001. – 352 с.
153. История транспорта: Учеб. пособие / А. А. Михальченко и др. – Гомель, 2008. – 336 с.
154. Історія України / Відп. ред. Ю. Сливка; керівник авт.кол. Ю. Зайцев. – Выд. 3-тє, перероб. і доп. – Львів: Світ, 2002. – 520 с.
155. Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 года / Маг. дзярж. ун-т харч. ; уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў; рэдкал. : Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў: МДУХ, 2018. – 275 с.
156. Казаков, Ю. Л. Деятельность компартии Белоруссии по подготовке рабочих кадров и повышению их производственной квалификации (1951–1955) / Ю. Л. Казаков // Весн. Белорус. ун-та. Сер. 3. – 1981. – № 1. – С. 8.
157. Казаков, Г. М. Гомельский станкостроительный / Г. М. Казаков, В. Я. Райский, Д. М. Фабрикант. – Минск : Беларусь, 1979. – 142 с.
158. Калеснікава, Т. К. Дзейнасць КПБ па ўцягненню работнікаў легкай прамысловасці ў кіраванне вытворчасцю (1959–1965 гг.) / Т. К. Калеснікава // Веснік БДУ. Сер.3 Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 1974. – № 3. – С. 24–29.
159. Канапацкий, И. Б. Участие трудящихся БССР в освоении целинных земель Казахстана (1954–1960 гг.) : автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора исторических наук : 07.00.02 / И. Б. Канапацкий, Минский гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск : [б. и.], 1977. – 26 с.
160. Канапацкі, І. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць / І. Канапацкі, С. Думін. – Мінск: Полымя, 1993. – 206 с.
161. Канапацкі, І. Б. Гісторыя і культура беларускіх татар: [Вучэб. дапам.] / І. Б. Канапацкі, А. І. Смолік; Бел. Ун-т культуры. – Мінск: [Бел. Ун-т культуры], 2000. – 258 с.
162. Карзенка, Г. У. Дынаміка росту і структура навуковай інтэлігенцыі Беларусі ў 1919–1991 гг. (па матэрыялах афіцыйнай статыстыкі) / Г. У. Карзенка // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 8. – С. 25–27.
163. Касцюк, М. Сталіншчына і Беларусь / М. Касцюк // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 2. – С. 98–106.
164. Касцюк, М. П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. П. Касцюк. – Мінск: ВП Экаперспектыва, 2000. – 308 с.
165. Касцюк, М. П. Узаемаадносіны этнічных супольнасцей на Беларусі ў XX ст. / М. П. Касцюк // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001г.) / У. І. Навіцкі, М. С. Сташкевіч. – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 24–31.
166. Кашталян, І. С. Штодзённае жыццё беларускага грамадства (1944–1953 гг.) : аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук : 07.00.02 / І. С. Кашталян, Бел. дзярж. ун-т. – Минск : [б. и.], 2006. – 20 с.
167. Кірчук, Ю. В. Гістарыяграфія па тэме аднаўлення прамысловасці і транспарту Беларусі (сярэдзіна 1943 – сярэдзіна 1950-х гг.): этапы, праблемы, падыходы / Ю. В. Кірчук // Веснік БДУ. Сер.3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2012. – № 1 . – С. 22–26.

168. Клецко, Л. Г. Ответственность руководителя / Л. Г. Клецко // Партийная жизнь. – 1983. – № 1. – С. 30–35.
169. Кнацько, Г. Д. Праца насельніцтва Беларусі ў савецкім тыле і пасля выгнання захопнікаў / Г. Д. Кнацько // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. – Мінск, 1999. – С. 210–213.
170. Кожинов, В. В. Наследники победы / В. В. Кожинов. – М.: Изд-во Алгоритм, 2007. – 480 с.
171. Колышкин, А. И. Развитие промышленности Белоруссии в послевоенный период (1946–1960): Дис. … канд. экон. наук. – М., 1958. – 22 с.
172. Концевой, П. А. Репарации в восстановлении и дальнейшем развитии промышленности и сельского хозяйства Белорусской ССР (1945 – начало 1950-х гг.) / П. А. Концевой. – Минск : БИП, 2019. – 191 с.
173. Корзенко, Г. В. Научная интеллигенция Беларуси в 1944–1990 гг. Подготовка, рост, структура / Г. В. Корзенко. – Минск, 1995. – 74 с.
174. Королёв, М. Г. Медико-социальные последствия урбанизации в Беларуси / М. Г. Королёв, А. А. Герберг // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 года / Маг. дзярж. ун-т харч. ; уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў; рэдкал. : Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў: МДУХ, 2018. – С. 97–101.
175. Короткевич, А. Т. Минский вагоноремонтный / А. Т. Короткевич. – Минск : Беларусь, 1971. – 64 с.
176. Костеров, А. П. Формы и методы работы Компартии Белоруссии по подготовке, переподготовке и воспитанию партийных и советских кадров (1961–1965 гг.): Автореф.дис...канд.ист.наук 07.00.01 / БГУ. – Минск, 1984. – 22 с.
177. Костюк, М. П. Большевисткая система власти в Беларуси / М. П. Костюк. – М. : Ин-т рос. истории РАН, 2002. – 344 с.
178. Красовский, К. К. Урбанизация в Беларуси: экономико-географический анализ / К.К. Красовский. − Брест: Изд-во БрГУ, 2004. − 203 с.
179. Кригер, Г. А. Квалификация хищений социалистического имущества / Г. А. Кригер. – М.: Юридическая литература, 1971. – 360 с.
180. Кудряшов, В. С. Развитие машиностроительной промышленности БССР в послевоенный период (1946–1955): Дис. … канд. ист. наук. –М., 1958. – 22 с.
181. Кузьменка, У. І. Інтэлігенцыя Беларусі ў пасляакупацыйны ваенны перыяд / У. І. Кузьменка // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2003. – № 1. – С. 56–61.
182. Кузьменко, Ю. В. Партійно-радянська номенклатура Української РСР в умовах суспільно-політичних трансформацій 1985–1991 рр. / Ю. В. Кузьменко // Гістарычныя шляхі беларускага народа і суседзяў: узаемадзеянне і ўзаемаўплывы. Зборнік навуковых артыкулаў. Вып. 1. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – С. 191–198.
183. Кузьмін, А. Д. Роля кадравага патэнцыялу ў аднаўленні і развіцці прамысловасці БССР у 1944–1950 гг. / А. Д. Кузьмін // Октябрьская революция в исторических судьбах белорусской государственности : сборник статей / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2020. – С. 82–87.

184. Куличенко, Л. Школы партийно-хозяйственного актива важное средство теоретической и практической подготовки кадров / Л. Куличенко // Партийная жизнь. – 1982. – № 2. – С. 21–26.
185. Кунельский, Л. Э. Повышение стимулирующей роли заработной платы и оптимизация ее структуры / Л. Э. Кунельский. – М.: Экономика, 1975. – 223 с.
186. Купреева, А. П. Возрождение народного хозяйства Белоруссии. 1942–1945 гг. / А. П. Купреева. – Минск: Наука и техника, 1976. – 223 с.
187. Купреева, А. П. Народы СССР – трудящимся Белоруссии / А. П. Купреева. – Минск: Наука и техника, 1981. – 208 с.
188. Купрэева, Г. П. Дапамога савецкага ўрада і працоўных брацкіх рэспублік у аднаўленні народнай гаспадаркі Беларусі (верасень 1943–1945 г.) / А. П. Купреева // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1972. – № 2. – С. 13–21.
189. Курыловіч, Г. М. Украінцы на Беларусі / Г. М. Курыловіч // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. / БДПУ пад рэд. А. Кавалені. – Мінск: БДПУ, 1998. – С. 22–30.
190. Леднева, А. С. Интернациональные связи рабочего класса Белорусской ССР (1970–1987 гг.): производственное сотрудничество рабочего класса БССР с социалистическими странами / А. С. Леднева ; науч. ред. И. М. Игнатенко. – Минск : Наука и техника, 1988. – 176 с.
191. Ленин, В. И. Письмо к организациям РКП о подготовке к партийному съезду / В. И. Ленин // Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 40. – С. 140–144.
192. Лесько, И. Н. Методика изучения кадровой политики в государственных органах и организациях / И. Н. Лесько // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 года / Маг. дзярж. ун-т харч. ; уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў; рэдкал. : Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў: МДУХ, 2018. – С. 77–82.
193. Либезин, О. В. Общественно-политическая активность рабочего класса БССР (1966–1970 гг.) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук : 07.00.02 / О. В. Либезин, Ин-т истории АН БССР . – Минск : [б. и.], 1981 . – 20 с.
194. Лис, А. Г. Проблемы развития и размещения производительных сил Белоруссии / А. Г. Лис. – М.: Мысль, 1972. – 276 с.
195. Лисицин, Н. А. Экономика, организация и планирование промышленного производства : Учебное пособие для экономических вузов и факультетов / Н. А. Лисицин, Л. М. Синица, Ф. П. Висюлин; Под общ. ред. Н. А. Лисицина. – Минск : Вышэйшая школа, 1990. – 348 с.
196. Литвиновский, И. А. Кадровая политика Белорусской энергосистемы в 1945–1975 гг. / И. А. Литвиновский // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2010. – С. 91–102.
197. Лохманенко Н. А. Технический прогресс и творчество масс / Н. А. Лохманенко. – Минск : Наука и техника, 1976. – 215 с.
198. Лубинский, И. И. Взаимоотношения власти и народа в БССР в 1944–1953 гг.: историографический обзор / И. И. Лубинский // Романовские чтения – 5: сб. трудов Международной науч. конференции. – Могилёв: УО “МГУ им. А. А. Кулешова”, 2009. – С. 55–57.

199. Лыч, Л. Рускі прафесар на ніве беларускага нацыянальнага адраджэння: успаміны / Леанід Лыч. – Мінск: Кнігазбор, 2013. – 120 с.
200. Лыч, Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.) / Л. Лыч. – Мінск: Кнігазбор, 2007. – 76 с.
201. Лыч, Л. М. Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.) / Л. Лыч. – Мінск: Галіяфы, 2009. – 284 с.
202. Люцко, А. В. Деятельность КПБ по подбору, воспитанию и расстановке кадров. 1946–1950 гг. / А. В. Люцко. – Минск: Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1975. – 176 с.
203. Мазец, В. Г. Стремление к совершенству: ОАО «Лидапищеконцентраты» / сост. А. А. Гончаров, В. Г. Мазец; редсовет: А. А. Гончаров [и др.]. – Минск: Редакция журнала «Дело (Восток + Запад)», 2019. – 192 с.
204. Мазец, В. Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі / В. Мазец // Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. работ. Вып. 3 / сост. И. Кузнецов, Я. Басин; науч. ред. В. П. Андреев. – Минск, 2007. – С. 207–238.
205. Мазец, В. Г. «Время перемен» (1954–1964 годы) / В. Г. Мазец // Минская область в документах и материалах. – Вып. 4. Время перемен: 1954–1964 гг. / Главное управление юстиции Минского областного комитета, Государственный архив Минской области : сост. Ю. С. Ромашко [и др.]; редкол.: Ю. В. Матусевич (гл. ред.). – Минск : Колорград, 2017. – С. 8–10.
206. Мазец, В. Г. Беларуская чыгунка ва ўмовах эканамічнага эксперымента і гаспадарчага разліку (1985–1991 гг.) / В. Г. Мазец // Актуальные проблемы истории и культуры. Вып. 1. Европа: актуальные проблемы этнокультуры / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редкол.: В. В. Данилович [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2018. – С. 314–320.
207. Мазец, В. Г. Змены ў апараце Ўрада Беларускай ССР (1965–1985 гг.) / В. Г. Мазец // Романовские чтения – 12: сборник статей Международной научной конференции / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилёв: МГУ им. А. А. Кулешова, 2017. – С. 114–115.
208. Мазец, В. Нацыянальна дзяржаўная палітыка і змены этнічнай структуры насельніцтва Беларусі ў 1945–1986 гг. / В. Мазец // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 2. – Мінск, 2003. – С. 234–241.
209. Мазурова, Я. С. Государственные трудовые резервы Белоруссии в годы четвертой пятилетки / Я. С. Мазурова. – М.: Профиздат, 1962. – 104 с.
210. Макаров, С. П. Централизованное управление производством в условиях реформы / С. П. Макаров. – М.: Мысль, 1972. – 175 с.
211. Маковская, Н. В. Современные особенности функционирования рынка труда в Беларуси: монография / Н. В. Маковская. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. – 264 с.
212. Маковская, Н. В. Трансформация трудовых процессов в условиях модернизации предприятий: монография / Н. В. Маковская. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. – 144 с.
213. Марцуль, Г. Советский народ – новая историческая общность людей / Г. Марцуль // Коммунист Белоруссии. – 1987. – № 8. – С. 22–28.
214. Марцынкевіч, І. А. Пасляваенная штодзённасць інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны / І. А. Марцынкевіч // Ученые записки : сборник научных статей / гл. ред. А. В. Русецкий. – Витебск : Витебский гос. ун-т, 2002. – Т.18 : Ученые

записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова» / гл. ред. А. В. Егоров. – Витебск : Витебский гос. ун-т, 2014. – С. 73–81.
215. Марчанка, І. Я. Аднаўленне індустрыі Беларусі ў пасляваенныя гады: вопыт і праблемы / І. Я. Марчанка // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя у Рэспубліцы Беларусь. Новыя канцэпцыі і падыходы : Усебеларус. канферэнцыя гісторыкаў, Мінск, 3–5 лютага 1993 г.: У 2 ч. – Минск : Універсітэцкае, 1994. – Ч. 1 : Гісторыя Беларусі. – Минск : Універсітэцкае, 1994. – С. 219–225.
216. Марченко, И. Е. Рабочий класс БССР в послевоенные годы (1945–1950) / И. Е. Марченко. – Минск: Изд-во Акад.наук БССР, 1962. – 259 с.
217. Марченко, И. Е. Трудовой подвиг рабочего класса Белорусской ССР (1943–1950 гг.) / И. Е. Марченко. – Минск : Наука и техника, 1977. – 247 с.
218. Мировая экономика: тенденции 90-х годов. – М.: Наука, 1999. – 304 с.
219. Міранові, Я. Найноўшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч; Навук. рэд. А. Краўцэвіч. – СПб: Неўскі прасцяг, 2003. – 243 с.
220. Муталимов, М. Г. Закон распределения по труду и его использованиев развитом социалистическом обществе / М. Г. Муталимов. – Минск: Наука и техника, 1980. – 224 с.
221. Навіцкі, У. І. Савецкая палітыка ў адносінах да этнічных супольнасцей Беларусі / У. І. Навіцкі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук.канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001г.) / У. І. Навіцкі, М. С. Сташкевіч. – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 15–24.
222. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: ХХ стагоддзе / М. П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]; Нац.акад.навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус.навука, 2008. – 615 с.
223. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш.; Інстытут гісторыі АНБ. – Мінск: Беларусь, 1995. – 560 с.
224. Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў ХХ стагоддзі. Зб. нав. арт. – Мінск: БДПУ імя М.Танка, 1997. – 170 с.
225. Нестерович, Н. Б. АХОвое дело или за что сняли министра / Н. Б. Нестерович // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 года / Маг. дзярж. ун-т харч. ; уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў; рэдкал. : Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў: МДУХ, 2018. – С. 49–54.
226. Несцяровіч, М. Б. Змены ў складзе Ўрада Беларускай ССР (1944–1964 гг.) / М. Б. Несцяровіч// Романовские чтения – 12: сборник статей Международной научной конференции / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилёв: МГУ им. А. А. Кулешова, 2017. – С. 114–115.
227. Несцяровіч, М. Б. Эканоміка Беларусі ў аднаўленчы перыяд 1946–1950 гг. / М. Б. Несцяровіч // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2007. – № 1. – С. 54–61.
228. Несцяровіч, М. Эканоміка Беларусі ў 1941–1991 гг.: гістарыяграфія і крыніцы / М. Несцяровіч // Гістарычна-археалагічны зборнік / уклад. А. М. Мядзведзеў, А. А. Мяцельскі . – Минск : Ин-т истории АН Беларуси, 1996. Вып. 31 : Гістарычна-археалагічны зборнік / Нац. АН Беларусі, Ін-т гісторыі ; [рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд) [і інш.] . – Мінск : Бел. навука, 2016 . – С. 179–186.
229. Несцяровіч, М. Б. Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.) / М. Б. Несцяровіч // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2007. – № 4. – С. 43–50.

230. Несцяровіч, М. Эканамічнае становішча Беларусі (1970-я – першая палова 1980-х гг.) / М. Несцяровіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск : Бел. навука, 2014. – Вып. 29. – С. 201–208.
231. Никулина, Ю. Влияние урбанизационных процессов на социокультурную ситуацию в современной Беларуси / Ю. Никулина // Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі: XIX – пачатак XXI ст.: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Я. А. Роўба, І. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адк. рэдактары) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2010. – С. 318–327.
232. Носова, А. А. Трудоустройство репатриированных граждан в БССР / А. А. Носова // Веснік Гродзенскага ДУ. Сер.1. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – 2012. – №1. – С. 32–41.
233. Октябрьская революция в исторических судьбах белорусской государственности : сборник статей / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2020. – 309 с.
234. Олехнович, Г. И. Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны (1941–1945) / Г. И. Олехнович. – Минск : Изд-во БГУ, 1982. – 174 с.
235. Определение экономической эффективности систем премирования работников промышленности. Методические рекомендации. – М.: НИИ труда, 1978. – 123 с.
236. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии : В 2 ч. – Мінск: Беларусь, 1967. – Ч. 2: 1921–1961. – 588 с.
237. Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969). – Минск: Беларусь, 1970. – 474 с.
238. Памяць Беларусі: Рэспубліканская кніга / Мін-ва інфарм. Рэсп. Беларусь ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – 592 с.
239. Папиашвили, Ш. Г. Должностные преступления в теории уголовного права, законодательстве и судебной практике / Ш. Г. Папиашвили. – Тбилиси : Изд-во Тбил. ун-та, 1988. – 302 с.
240. Папкоў, А. А. Аграрныя кадры сяла: стан, праблемы і перспектывы / А. А. Папкоў // Весці НАНБ. Серыя гум. нав. – 2006. – № 2. – С. 40–45.
241. Паўловіч, Л. А. Прамысловасць Мінска / Л. А. Паўловіч, А. Я. Малышаў. – Мінск, 1972. – 119 с.
242. Петриков, П. Т. Организация и деятельность постоянных комиссий местных советов Белоруссии (1944–1970) / П. Т. Петриков. – Минск: Наука и техника, 1971. – 199 с.
243. Петровичев, Н. А. Возрастание руководящей роли КПСС и вопросы организационно-политической работы / Н. А. Петровичев. – М.: Политиздат, 1982. – 255 с.
244. Петроченко, П. Ф. Влияние научно-технического прогресса на содержание и организацию труда / П. Ф. Петроченко. – М.: Мысль, 1975. – 230 с.
245. Петухов, Р. М. Оценка эффективности промышленного производства : Методы и показатели / Р. М. Петухов. – М. : Экономика, 1990. – 92 с.
246. Пилипович, В. Ю. Междисциплинарный подход в изучении послевоенного белорусского социума (на примере репатриантов остарбайтеров) / В. Ю. Пилипович // Веснік Брэсцкага ун-та. Сер.2 Гісторыя. Эканоміка. Права. – № 2. – С. 62–66.

247. Подлипский, А. К вопросу о награждении витебских евреев государственными наградами СССР в послевоенный период / А. Подлипский // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 2. – Мінск, 2003. – С. 252–257.
248. Польский, С. А. Некоторые демографические проблемы изменения численности городского населения БССР в 1959–1971 гг. / С. А. Польский, Т. В. Захарова // Известия Всесоюзного географического общества. – 1974. – Т. 106. – Вып. 1. – С. 60–72.
249. Польский, С. А. Урбанизация в Белорусской ССР / С. А. Польский. – Минск, 1985. – 299 с.
250. Прамысловасць Беларусі. – Мінск : Беларусь. Сов. Энцикл., 1980. – 247 с.
251. Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі: XIX – пачатак XXI ст.: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Я. А. Роўба, І. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адк. рэдактары) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2010. − 389 с.
252. Промышленность Белорусской ССР (1913–1975). – Минск : Беларусь, 1976. – 478 с.
253. Пронин, И. И. Руководящие кадры: подбор, расстановка и воспитание / И. И. Пронин. – М.: Мысль, 1981. – 224 с.
254. Пушкин, И. А. Исторический очерк создания и деятельности Могилёвского государственного университета продовольствия / И. А. Пушкин // 35 лет Могилёвскому государственному университету продовольствия / редкол.; В. А. Шаршунов (пред.). – Минск: Изд. центр БГУ, 2009 . – С. 2–53.
255. Пушкин, И. А. Кадровый потенциал и злоупотребления властью в восточных регионах Советской Белоруссии (1970–1980) / И. А. Пушкин // Современные проблемы гуманитарных и общественных наук. Серия «Духовная жизнь общества и человека: история и современность» / ФГБОУ ВПО «ВГУИТ». – Вып. 3 (30). – Воронеж: Издательско-полиграфический центр «Научная книга», 2020. – С. 43–54.
256. Пушкин, И. А. Миграции белорусского населения из Могилевской области в Республику Карелия: влияние на восстановление и развитие кадрового потенциала БССР (1950-е гг.) / И. А. Пушкин // Молодежная Галактика № 13, 2017 год / Гл. ред. А. А. Козлов. – СПб.: ЭлекСис, 2017. – С. 171–178.
257. Пушкин, И. А. Переселение сельскохозяйственного населения из БССР в Карело-Финскую ССР в первое послевоенное десятилетие / И. А. Пушкин // Гістарычныя шляхі беларускага народа і суседзяў: узаемадзеянне і ўзаемаўплывы. Зборнік навуковых артыкулаў. Вып. 1. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – С. 141–149.
258. Пушкин, И. А. Письма белорусских переселенцев-колхозников из Карелии на родину (1950-е гг.) / И. А. Пушкин // Белорусы в Карелии. Исследования и материалы / Науч. ред. Л. И. Вавулинская, О. П. Илюха. – Петрозаводск: Карельский научный центр РАН, 2016. – С. 102–114.
259. Пушкин, И. А. Сельскохозяйственное и промышленное переселение белорусов в Карелию (опыт Могилевской области) / И. А. Пушкин // Белорусы в Карелии (середина XX – начало XXI в.): сб. науч. ст. / И. Калачёва и др.; под ред. И. Калачёвой. – Минск: БГУ, 2016. – С. 42–63.
260. Пушкін, І. А. Кадравая палітыка КПБ і сістэма перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў у прамысловасці БССР (1970–1980-я гг.) / І. А. Пушкін // Октябрьская революция в исторических судьбах белорусской

государственности : сборник статей / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2020. – С. 94–102.
261. Пушкін, І. А. Гісторыя (гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі): канспект лекцый / І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2014. – 138 с.
262. Пушкін, І. А. Дакументы па гісторыі нацыянальных супольнасцей Беларусі 1980–1990-х гг. у цэнтральных архівах Расійскай Федэрацыі / І. А. Пушкін // Архівы і справаводства. – 2014. – № 3. – С. 125–133.
263. Пушкін, І. А. Дэвіянтныя паводзіны кіруючых кадраў БССР ва ўмовах савецкай эканамічнай мадэрнізацыі (1970–1980-я гг.) / І. А. Пушкін // Беларусьу кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы ; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2021. – С. 243–247.
264. Пушкін, І. А. Кадравая палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей) / І. А. Пушкін // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2018. – № 2. – С. 25–30.
265. Пушкін, І. А. Кадравы патэнцыял прамысловасці БССР па матэрыялах рэгіянальных органаў КПБ / І. А. Пушкін // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 года / Маг. дзярж. ун-т харч. ; уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў; рэдкал. : Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў: МДУХ, 2018. – С. 65–73.
266. Пушкін, І. А. Кадравы патэнцыял прамысловасці напярэдадні адкрыцця Магілёўскага тэхналагічнага інстытута / І. А. Пушкін // Техника и технология пищевых производств: матер. XII Междунар. науч.-техн. конф. (Могилев, 19–20 апреля 2018 г.). В 2 т. / Учреждение образования «Могилевский государственный университет продовольствия»; редкол.: А. В. Акулич (отв. ред.). – Могилев: МГУП, 2018. – Т. 1. – С. 91–92.
267. Пушкін, І. А. Кадры і гандлёвае абслугоўванне насельніцтва гарадоў Савецкай Беларусі ў 1970–1980-я гг. / І. А. Пушкін // Техника и технология пищевых производств: материалы XIV Междунар. науч.-техн. конф., Могилев, 21–22 апреля 2022 г. : в 2-х т. / Учреждение образования «Белорусский государственный университет пищевых и химических технологий» ; редкол.: А.В. Акулич (отв. ред.) [и др.]. – Могилев: БГУТ, 2022. – Т. 2. – С. 158–159.
268. Пушкін, І. А. Нацыянальны склад кіруючых кадраў у прамысловасці Беларусі напярэдадні абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту / І. А. Пушкін // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (Гомель, 14 кастрычніка 2021 г.) / рэдкалегія : А. Р. Яшчанка (гал. рэд.) [і інш.] ; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2021. – С. 171–175.
269. Пушкін, І. А. Нацыянальны склад партыйна-дзяржаўнай наменклатуры БССР напярэдадні абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту / І. А.Пушкін // Романовские чтения – 5: сб. трудов Международной науч. конференции. – Могилёв: УО “МГУ им. А. А. Кулешова”, 2009. – С. 143–144.
270. Пушкін, І. А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія / І. А. Пушкін. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2007. – 206 с.

271. Пушкін, І. А. Нацыянальныя супольнасці ў дзейнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва Беларусі (1945–1990 гг.) / І. А. Пушкін // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова. – 2008. – № 4. – С. 20–25.
272. Пушкін, І. А. Неправамерныя дзеянні пасадавых асоб Савецкай Беларусі ў 1970–1980-я гг. / І. А. Пушкін // Правовая культура в современном обществе [Электронный ресурс] : сборник научных статей / Министерство внутренних дел Республики Беларусь, учреждение образования «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь» ; редкол.: И. А. Демидова (отв. ред.) [и др.]. – Могилев : Могилев. институт МВД, 2022. – С. 519–524.
273. Пушкін, І. А. Пралікі ў кадравай палітыкі БССР у 1970-я гг. / І. А. Пушкін // Современная молодёжь и общество: сб. науч. статей. Вып. 6 : Историческая память и преемственность. – Минск: РИВШ, 2018. – С. 29–33.
274. Пушкін, І. А. Роль замежных спецыялістаў пры фарміраванні прамысловага патэнцыялу ўсходніх рэгіёнаў БССР (1970–1980-я гг.) / І. А. Пушкін // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2020. – № 1. – С. 19–24.
275. Пушкін, І. А. Рэгіяналізацыя працэсаў сацыяльнага рэкрутавання адказных работнікаў: з вопыту падрыхтоўкі кадраў для прамысловасці Беларусі / І. А. Пушкін // Качество подготовки специалистов в техническом университете: проблемы, перспективы, инновационные подходы: материалы IV Межд. научно-методической конференции, 15–16 ноября 2018 г., Могилев / редкол.: А. С. Носиков (отв. ред.). – Могилев: МГУП, 2018. – С. 298–300.
276. Пушкін, І. А. Склад і змяняльнасць работнікаў кіруючага апарата органаў дзяржаўнага кіравання, прамысловых прадпрыемстваў і яб'яднанняў БССР (1970–1980-я гг.) / І. А. Пушкін // Романовские чтения – 12: сборник статей Международной научной конференции / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилёв: МГУ им. А. А. Кулешова, 2017. – С. 120–122.
277. Пушкін, І. А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.) : манаграфія / І. А. Пушкін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 319 с.
278. Пушкін, І. А. Фарміраване і ўдасканальванне кадравага патэнцыялу усходніх рэгіёнаў БССР (1970–1980-я гг.) / І. А. Пушкін // Гістарычны лёс беларускай савецкай дзяржаўнасці (да 100-годдзя абвяшчэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі): зб. артыкулаў / Інстытут гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2021. – С. 286–294.
279. Пушкін, І. А. Фарміраванне кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР: сістэма эканамічнай адукацыі працоўных у 1970–1980-я гг. / І. А. Пушкін // Информационно-разъяснительная работа как фактор развития социальной активности молодежи: материалы научно-практического семинара (Могилев, 29 ноября 2018 года) / под общей редакцией кандидата исторических наук доцента В. Д. Выборного ; Министерство внутренних дел Республики Беларусь, учреждение образования «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь». – Могилев : Могилев. институт МВД, 2019. – С. 58–64.
280. Пушкін, І. А. Эканамічныя і сацыяльныя праблемы ў прамысловасці БССР і меры па іх пераадоленню (1971–1990) / І. А. Пушкін // Романовские чтения – 15 : сборник статей Международной научной конференции, Могилев, 26–27 ноября

2020 г. / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2021. – С. 7–9.

281. Пушкін, І. Аўтарытарызм і самакіраванне ў пошуках шляхоў павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу прамысловасці ў савецкай Беларусі ў 1980-я гг. / І. Пушкін // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік навуковых матэрыялаў / уклад., аўт. прадмовы І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў: МДУХ, 2017. – С. 110–120.
282. Пушкін, І. Вытокі карупцыі і злоўжыванняў уладай у савецкім мінулым (на прыкладзе Беларусі) / Ігар Пушкін // Українознавчий альманах. Випуск 24. – Київ, 2019. – С. 93–100.
283. Пушкін, І. Украінская дыяспара Беларусі ў перыяд Навейшай гісторыі (1919–2009 гг.) / І. Пушкін // Українознавчий альманах. Випуск 17. – Київ, 2014. – С. 217–221.
284. Пушкін, І. А. Гісторыя падрыхтоўкі кадраў для грамадскага харчавання ў савецкай Беларусі / І. А. Пушкін // Качество подготовки специалистов в техническом университете: проблемы, перспективы, инновационные подходы: материалы III Международной научно-методической конференции, 24–25 ноября 2016 г., Могилев / редкол.: А. С. Носиков (отв. ред.). – Могилев: МГУП, 2016. – С. 312–313.
285. Пушкін, І. А. Грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Беларускай ССР (1919–1991) : манаграфія / І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2018. – 423 с.
286. Пянкевич, В. Л. Возрождение советской экономики в годы Великой Отечественной войны / В. Л. Пянкевич. – СПб., 1999. – 41 с.
287. Пянкевич, В. Л. Репарации и труд военнопленных как источники восстановления экономики СССР после Второй мировой войны / В. Л. Пянкевич. – СПб., 1999. – 29 с.
288. Равун, И. И. Национальный доход Белорусской ССР на этапе развитого социализма / И. И. Равун. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 126 с.
289. Развитие экономики Белоруссии в 1961–1970 гг. – Минск: Наука и техника, 1978. – 240 с.
290. Разумов, Е. З. Проблемы кадровой политики КПСС / Е. З. Разумов. – М.: Политиздат, 1983. – 192 с.
291. Раков, А. А. Население БССР / А. А. Раков. – Минск: Наука и техника, 1989. – 224 с.
292. Ридевский, Г. Урбанизация и процессы регионализации в Беларуси в конце XIX – начале XXI вв. / Г. В. Ридевский // Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі: XIX – пачатак XXI ст.: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Я. А. Роўба, І. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адк. рэдактары) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2010. – С. 15–24.
293. Ридевский, Г. В. Социально-эколого-экономическое районирование как основа модернизации административно-территориального деления для обеспечения устойчивого развития / Г. В. Ридевский // Теоретическое наследие Б. Н. Семевского и современная социально-экономическая география – Смоленск : Универсум, 2007. – С. 128–134.
294. Ридевский, Г. В. Территориальная организация Республики Беларусь: социально-эколого-экономическая модель перехода к устойчивому развитию / Г. В. Ридевский. – Могилёв, 2007. – 525 с.

295. Саковіч, В. С. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне АПК Беларусі ў 1980-я гг. / В. С. Саковіч // Весці НАН Беларусі. Сер. Гуманітарных навук. – 2007. – № 2. – С. 63–71.
296. Саковіч, А. Да гісторыі Беларускага Дзяржаўнага Універсітэту / А. Саковіч // Запісы БІНІМ. – Нью-Ёрк, 1954. – № 1(5). – С. 1–9.
297. Саковіч, В. С. Сельскагаспадарчыя кадры Рэспублікі Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стагоддзя / В. С. Саковіч // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2004. – № 3. – С. 52–59.
298. Саракавік, І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. – Мінск: “Современная школа”, 2006. – 456 с.
299. Сасім, А. М. Гаспадарчая рэформа 1960-х гадоў : вынікі і ўрокі / А. М. Сасім // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007 . – № 8 . – С. 12–17.
300. Сасим, А. М. Промышленность Беларуси в условиях реформирования и стагнации (1953–1985 гг.) / А. М. Сасим ; науч. ред. М. П. Костюк. – Минск : Экоперспектива, 2009. – 242 с.
301. Сасим, А. М. Проблемы научно-технического развития промышленности Беларуси : 50–60-е гг. XX ст. / А. М. Сасим // Веснік Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта. – 2002. – № 6. – С. 88–90.
302. Сасим, А. М. Промышленность Беларуси в годы «развитого социализма» (1965–1984) / А. М. Сасим. – Минск: Экоперспектива, 2001. – 38 с.
303. Сасим, А. М. Промышленность Беларуси в XX столетии : учеб. пособие / А. М. Сасим. – Минск : Экоперспектива, 2001. – 271 с.
304. Сасим, А. М. Хозяйственная реформа 1965 г. в промышленности БССР // Веснік Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. – 2019. – № 3. – С. 62–70.
305. Сенявский, А. С. Урбанизация России в XX веке : роль в историческом процессе / А. С. Сенявский. – М.: Наука, 2003. – 286 с.
306. Сидоренко, Б. И. Могилевский мясокомбинат (исторический очерк) / Б. И. Сидоренко. – Могилев, Областная типография, 2000. – 76 с.
307. Сидоров, П. А. Роль миграции в изменении численности городского населения БССР: Опыт расчета на ЭВМ «Минск-2» / П. А. Сидоров, Г. Г. Максимов. – Мн.: НИИЭМП при Госплане БССР, 1966. – 37 с.
308. Силиванчик, П. П. Взаимообогащение и сближение национальных культур в период строительства коммунизма / П. П. Силиванчик, А. П. Мельников. – Минск: Изд-во БГУ, 1974. – 63 с.
309. Смехович, Н. В. Комплексная механізацыя аграрнай вытворчасці ў Савецкай Беларусі: этапы і асаблівасці (1943–1991 гг.) / Н. В. Смехович // Веснік МДУ імя А. А. Куляшова. – 2017. – № 1. – С. 18–22.
310. Смехович, Н. В. Продовольственная программа БССР: ход выполнения и итоги реализации (1982–1990 гг.) / Н. В. Смехович // Вести Академии наук Республики Башкортостан. – 2020. – Том 34. – № 1. – С. 86–95.
311. Смехович, Н. В. Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943–1991 гадах: этапы развіцця, дасягненні, вопыт / Н. В. Смехович. – Минск: Беларуская навука, 2017. – 439 с.
312. Смехович, Н. В. Спецыялісты масавых прафесій у сельскай гаспадарцы Беларусі (1953–1985 гг.) / Н. В. Смехович // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова». Сб. научн. трудов. – 2017. – Том 23. – С. 13–21.

313. Смиловицкий, Л. Евреи Беларуси: из нашей общей истории. 1905–1953. Сборник статей / Л. Смиловицкий. – Минск: АРТИ-ФЕКС, 1999. – 362 с.
314. Смяховіч, М. У. Кадравая палітыка дзяржаўнай ўлады як інструмент павышэння эфектыўнасці аграрнай вытворчасці ў Беларусі (1944–1953 гг.) / М. У. Смяховіч // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 года / Маг. дзярж. ун-т харч. ; уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў; рэдкал. : Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў: МДУХ, 2018. – С. 43–49.
315. Снапкоўскі, У. Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі (1944–1953 гг.) / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск: Беларуская навука, 1997. – 208 с.
316. Социальные изменения рабочего класса Белоруссии в процессе строительства коммунизма / В. И. Степанов, [и др.] ; под ред. К. П. Буслова. – Минск : Наука и техника, 1985. – 255 с.
317. Станкевіч, Ст. Нацыянальная палітыка Крэмля ў Беларусі / Ст. Станкевіч // Беларускі зборнік. Кн.1. – Мюнхэн, 1955. – С. 34–47.
318. Страницы истории Компартии Белоруссии: Суждения, аргументы, факты / Сост. Ю. Н. Смирнов, Н. С. Сташкевич. – Минск: Университетское, 1990. – 446 с.
319. Таратута, В. Н. Залог успешной деятельности руководящих кадров / В. Н. Таратута // Партийная жизнь. – 1982. – № 7. – С. 27–32.
320. Тиковенко, А. Г. Кадровая политика в условиях перестройки / А. Г. Тиковенко ; под ред. В. И. Шабайлова. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 92 с.
321. Тимофеев, Р. Влияние процессов урбанизации на развитие транспорта Беларуси в 1970-80-е гг. / Р. Тимофеев // Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі: XIX – пачатак XXI ст.: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Я. А. Роўба, І. П. Крэнь, І. В. Соркіна (адк. рэдактары) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2010. – С. 205–211.
322. Тугай, У. В. Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі / У. В. Тугай / Пад навук. рэд. В. М. Фаміна. – 2-е выд. – Мінск: Выч.-выд. цэнтр БДПУ, 2003. – 305 с.
323. Тугай, У. В. Латышы на Беларусі / У. В. Тугай. – Мінск: Выд. Ул. М. Скакун, 1999. – 136 с.
324. Філімонаў, А. А. Працоўны подзвіг беларускага народа ў пасляваенныя гады / А. А. Філімонаў // Весці НАН Беларусі. Сер. Гуманітарных навук. – 1975. – № 1. – С. 5–11.
325. Федоров, А. В. Кадровая политика КПСС и советского правительства в конце 1950–1960-х гг. / А. В. Федоров // Сборник трудов молодых ученых МПИ ФСБ России. Вып 4. – М., 2003. – С. 35–48.
326. Федоров, А. В. Кадровая политика СССР в период внутри- и внешнеполитического развития в 1970–1980-х гг. / А. В. Федоров // Сборник трудов молодых ученых МПИ ФСБ России. Вып. 3. – М., 2004. – С. 12–19.
327. Федоров, А. В. Кадровая политика СССР на завершающем этапе индустриальной модернизации (конец 1950–1980-е гг.): автореферат диссертации на соискание учёной степени к.ист.н.: специальность 07.00.02 / А. В. Федоров. – Москва, 2005. – 16 с.

328. Филимонов, А. А. Укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в период развёрнутого строительства социализма / А. А. Филимонов. – Минск: Наука и техника, 1968. – 276 с.
329. Фомин, В. М. Профсоюзы Белоруссии в борьбе за технический прогресс в промышленности (1946–1971 гг.) / В. М. Фомин. – Минск : Наука и техника, 1971. – 280 с.
330. Шаньгин, Б. Подбор, расстановка и воспитание кадров ключевая задача / Б. Шаньгин // Партийная жизнь. – 1984. – № 29. – С. 39–43.
331. Шарков, А. В. Военнопленные и интернированные на территории Беларуси: Роль органов внутренних дел в их содержании и трудовом использовании (1944–1955 гг.) / А. В. Шарков ; под ред. В. П. Павлова. – Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 1997. – 159 с.
332. Шаркоў, А. В. Выкарыстанне працы ваеннапалонных і інтэрніраваных у аднаўленні гаспадаркі Беларусі / А. В. Шаркоў, У. П. Паўлаў // Беларус. гіст. часоп. – 1998. – № 2. – С. 71–79.
333. Шкурко, С. И. Совершенствование форм и систем заработной платы / С. И. Шкурко. – М.: Экономика, 1975. – 231 с.
334. Шыбека, З. В. Нарыс гісторыі Беларусі, 1795–2002 / З. В. Шыбека. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.
335. Шыбека, Захар. Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет / Захар Шыбека. – Вільня: ЕГУ, 2009. – 370 с.
336. Шыбека, Захар. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў) / Захар Шыбека. – Мінск: ЭўроФорум, 1997. – 320 с.
337. Эберхардт, П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1898–1989 / П. Эберхард / Пер. з польск. Ул. Люкевіча.– Минск (Берасьце): Белфорт, БФС, 1997. – 282 с.
338. Эканамічная гісторыя Беларусі / Пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. 2-е выд., дап. і перапрац. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – 432 с.
339. Экономика Белоруссии в период послевоенного возрождения / З. И. Георгидзе, В. И. Дриц, Т. Н. Крутилина и др.; под ред. В. И. Дрица. – Минск: Наука и техника, 1988. – 238 с.
340. Экономика Советской Белоруссии. 1917–1967 / редкол.: Ф. Мартинкевич (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1967. – 571 с.
341. Экономическая история Беларуси: Учеб. пособие. Допущено Министерством образован. РБ в кач. учеб. пособ. для студ. экономич. специальностей высш. учеб. заведений / В. И. Голубович, Г. И. Ермашкевич, Г. П. Бущик и др.; Под ред. проф. В. И. Голубовича. – Минск: УП «Экоперспектива», 2001. – 400 с.
342. Энергетика Белоруссии (1917–1967). – Минск : Наука и техника, 1968. – 157 с.
343. Этнические процессы и образ жизни : (на материалах исслед. населения городов БССР) / [авт. кол. : В. К. Бондарчик [и др.] ; ред. В. К. Бондарчик] ; Акад. наук БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : Наука и техника, 1980. – 279 с.
344. Ochmański, Jerzy. Historia Litwy / Jerzy Ochmański. – Wrocław–Warszawa–Kraków: Zakład narodowy imienia Ossolińskich wydawnictwo, 1990. – 396 s.
345. Szcześniak, Andrzej Leszek. Historia Polska i światnaszego wieki lata 1914–1990 / Andrzej Szcześniak. – Bydgoszcz: Somix, 1992. – 372 s.

# Дадаткі

ДАДАТАК А

## Выраблены даход у разліку на аднаго жыхара ў СССР, 1988 г.[1]

| Рэспубліка / год | Грашовы эквівалент (руб.) | | | Рост у працэнтах (%) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1980 | 1985 | 1988 | 1980 | 1985 | 1988 |
| СССР | 1741 | 2084 | 2210 | 100 | 100 | 100 |
| БССР | 1906 | 2356 | 2578 | 110 | 113 | 117 |
| РСФСР | 1976 | 2387 | 2623 | 113 | 115 | 119 |
| УССР | 1549 | 1897 | 1985 | 89 | 91 | 90 |
| КазССР | 1376 | 1596 | 1638 | 79 | 77 | 74 |
| МалССР | 1484 | 1707 | 1789 | 85 | 82 | 81 |
| ЛітССР | – | – | – | 98 | 103 | 110 |
| ЛатССР | – | – | – | 131 | 127 | 119 |
| ЭстССР | – | – | – | 125 | 121 | 117 |

ДАДАТАК Б

## Рост вытворчасці працы ў рэспубліках СССР ў 1980-я гг. (%)[2]

| Рэспубліка / год | 1980 | 1985 | 1988 |
|---|---|---|---|
| СССР | 100 | 100 | 100 |
| БССР | 101 | 104 | 106 |
| РСФСР | 108 | 110 | 114 |
| УССР | 85 | 87 | 87 |
| Казахская ССР | 90 | 86 | 80 |
| Малдаўская ССР | 78 | 76 | 79 |
| Літоўская ССР | 92 | 96 | 101 |
| Латвійская ССР | 121 | 116 | 109 |
| Эстонская ССР | 118 | 114 | 109 |

[1] Материалы по межнациональным отношениям // РДАНГ. Ф. 2. Воп. 5. Спр. 334. Арк. 6
[2] Материалы по межнациональным отношениям // Там жа. Арк. 7

ДАДАТАК В

## Сярэднямесячны заробак рабочых і служачых у СССР (руб.)[1]

| Рэспубліка / год | 1980 | 1985 | 1988 |
|---|---|---|---|
| СССР | 168,9 | 190,1 | 219,8 |
| БССР | 150 | 173,7 | 207,6 |
| РСФСР | 177,7 | 201,4 | 235,2 |
| УССР | 155,1 | 173,9 | 199,8 |
| Казахская ССР | 167,1 | 186,5 | 214,6 |
| Малдаўская ССР | 138,3 | 157,7 | 181,5 |
| Літоўская ССР | 166,1 | 190 | 222,6 |
| Латвійская ССР | 171,4 | 195,9 | 227 |
| Эстонская ССР | 188,7 | 215,1 | 249,2 |

[1] Материалы по межнациональным отношениям // РДАНГ. Ф. 2. Воп. 5. Спр. 334. Арк. 31

**Склад кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і яб’яднанняў БССР у 1980-я гг.**[1]

| | 01.07.1984 | | 01.07.1985 | | 01.07.1986 | | 01.07.1987 | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % |
| Усяго кіруючых пасад / замешчаны работнікамі | 204 / 203 | 99,5 | 205 / 205 | 100 | 168 / 167 | 99,4 | 229 / 225 | 98,3 |
| у тым ліку жанчын | 1 | 0,5 | 2[2] | 1,0 | 1 | 0,6 | 1 | 0,4 |
| Узрост работнікаў | | | | | | | | |
| ад 31 да 35 | 4 | 2,0 | 4 | 2,0 | 2 | 1,2 | 5 | 2,2 |
| ад 36 да 40 | 11 | 5,4 | 18 | 8,8 | 17 | 10,2 | 33 | 14,7 |
| ад 41 да 45 | 37 | 18,2 | 29 | 14,1 | 20 | 12,0 | 26 | 11,6 |
| ад 46 да 50 | 74 | 36,4 | 76 | 37,1 | 47 | 28,1 | 59 | 26,2 |
| ад 51 да 55 | 42 | 20,7 | 42 | 20,5 | 42 | 25,1 | 59 | 26,2 |
| ад 56 да 60 | 29 | 14,3 | 29 | 14,1 | 27 | 16,2 | 29 | 12,9 |
| старэйшыя за 60 год | 6 | 3,0 | 7 | 3,4 | 12 | 7,2 | 14 | 6,2 |
| З вышэйшай адукацыяй | 202 | 99,5 | 205 | 100 | 167 | 100 | 224 | 99,6 |
| З вышэйшай адукацыяй па спецыяльнасці | 201<br>196 | 99,0<br>96,5 | 203<br>199 | 99,0<br>97,1 | 160<br>156 | 95,8<br>93,4 | 224<br>221 | 99,6<br>98,2 |
| З сярэдняй спецыяльнай | 5 | 2,5 | 4 | 2,0 | 4 | 2,4 | 3 | 1,3 |
| Мелі партыйна-палітычную адукацыю | 3 | 1,5 | 5 | 2,4 | 4 | 2,4 | 4 | 1,8 |
| Беларусы | 98 | 48,2 | 105 | 51,2 | 91 | 54,5 | 127 | 56,4 |
| Кандыдаты навук | 3 | 1,5 | 2 | 1,0 | 4 | 2,4 | 4 | 1,8 |
| Дактары навук | – | – | – | – | – | – | 1 | 0,4 |
| Члены і кандыдаты ў члены КПСС | 203 | 100 | 205 | 100 | 167 | 100 | 225 | 100 |
| Стаж працы на займаемай пасадзе | | | | | | | | |
| да 1 года | 17 | 8,4 | 23 | 11,2 | 28 | 16,8 | 48 | 21,3 |
| ад 1 да 3 | 42 | 20,7 | 33 | 16,1 | 28 | 16,8 | 46 | 20,4 |
| ад 3 да 5 | 34 | 16,7 | 37 | 18,1 | 20 | 12,0 | 22 | 9,8 |
| ад 5 да 10 | 59 | 29,1 | 65 | 31,7 | 50 | 29,9 | 57 | 25,3 |
| больш за 10 год | 51 | 25,1 | 47 | 22,9 | 41 | 24,5 | 52 | 23,1 |

[1] Справка о составе и сменяемости руководителей промышленных предприятий и объединений БССР. 1984–1987 гг. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 982. Арк. 1-2 (1984–1985); Спр. 406. Арк. 4-5 (1986–1987).
[2] Генеральныя дырэктары вытворчых аб’яднанняў малочнай прамысловасці БССР.

ДАДАТАК Д

**Склад кіруючых кадраў прамысловых прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці на 01.07.1988 г.** [1]
(міністэрстваў СССР: чорнай металургіі; будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання; сельскагаспадарчага і трактарнага машынабудавання; прыборабудавання, сродкаў аўтаматызацыі і сістэм кіравання; аўтамабільнай прамысловасці; хімічнага і нафтахімічнага машынабудавання; электратэхнічнай прамысловасці; энэргетыкі і электрафікацыі)

| Назва пасады і прадпрыемства | Узрост | Адукацыя | Нацыя-нальнасць | Стаж працы | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | На кіруючай пасадзе | На займаемай пасадзе |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Дырэктар Магілёўскага металургічнага завода | 51–55 | выш. інж. | рус | больш 10 год | ад 5 да 10 год |
| Генеральны дырэктар Магілёўскага ВА “Страмаўталінія” | 46–50 | выш. інж. | рус. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Генеральны дырэктар ВА па выпуску машын для ўнясення ўгнаенняў “Бабруйскфермаш” | 36–40 | выш. інж. | рус. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў | 46–50 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | да 1 года |
| Дырэктар Магілёўскага вопытна-эксперыментальнага завода | 41–45 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар Магілёўскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання “Магілёўсельмаш” | 46–50 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | больш 10 год |
| Генеральны дырэктар Магілёўскага ВА “Тэхнапрыбор” | 51–55 | выш. экан. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар Магілёўскага аўтазавода імя С. Кірава | 51–55 | | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар Бабруйскага машынабудаўнічага завода | 51–55 | выш. экан. | укр. | больш 10 год | да 1 года |
| Дырэктар Магілёўскага завода “Электрарухавік” | 36–40 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |

[1] Список к статистичекому отчёту о составе и сменяемости кадров Могилёвской области по состоянию на 01.07.1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 99-162.

ДАДАТАК Е

**Склад кіруючых кадраў прамысловых прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці на 01.07.1988 г.**[1]

(міністэрстваў СССР: хімічнай прамысловасці; нафтаперапрацоўчай і нафтахімічнай прамысловасці; медыцынскай і мікрабіялагічнай прамысловасці; міністэрстваў БССР: лясной прамысловасці; лёгкай прамысловасці)

| Назва пасады і прадпрыемства | Узрост | Адукацыя | Нацыя-нальнасць | Стаж працы | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | На кіруючай пасадзе | На займаемай пасадзе |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Генеральны дырэктар Магілёўскага ВА “Хімвалакно” | 46–50 | выш. інж. | рус. | больш 10 год | ад 3 да 5 год |
| Генеральны дырэктар Бабруйскага ВА “Бабруйскшына” | 36–40 | выш. інж. | рус. | больш 10 год | больш 10 год |
| Генеральны дырэктар Бабруйскага ВА “Беларусьгуматэхніка” | 41–45 | выш. інж. | рус. | больш 10 год | да 1 года |
| Дырэктар Крычаўскага завода гумавых вырабаў | 46–50 | выш. інж. | укр. | больш 10 год | да 1 года |
| Дырэктар Магілёўскага рэгенератарнага завода | 46–50 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар Бабруйскага шынарамонтнага завода | 51–55 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар Бабруйскага гідролізнага завода | 51–55 | выш. інж. | татар | больш 10 год | больш 10 год |
| Дырэктар Шклоўскай папяровай фабрыкі “Спартак” | 56–60 | выш. экан. | рус. | больш 10 год | больш 10 год |
| Генеральны дырэктар Магілёўскага ВА шоўкавых тканін | 46–50 | выш. інж. | рус. | больш 10 год | ад 5 да 10 год |
| Дырэктар Магілёўскай стужкаткацкай фабрыкі | 46–50 (ж) | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар Магілёўскай вопытна-эксперыментальнай абутковай фабрыкі | 36–40 | выш. інж. | укр. | больш 10 год | больш 10 год |
| Дырэктар Бабруйскай абутковай фабрыкі | 46–50 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |

[1] Список к статистичекому отчёту о составе и сменяемости кадров Могилёвской области по состоянию на 01.07.1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 99-162.

**Склад кіруючых кадраў прамысловых прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці на 01.07.1988 г.**[1]

(міністэрстваў БССР: мантажных і спецыяльных будаўнічых прац; будаўніцтва; харчовай прамысловасці)

| Назва пасады і прадпрыемства | Узрост | Адукацыя | Нацыя-нальнасць | Стаж працы | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | На кіруючай пасадзе | На займаемай пасадзе |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Упраўляючы трэстам “Магілёўтэхмантаж” ВА “Прамтэхмантаж” | 51–55 | сярэд. спец. тэхн. | бел. | больш 10 год | ад 5 да 10 год |
| Упраўляючы Магілёўскім будтрэстам № 12 | 36–40 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | да 1 года |
| Упраўляючы Бабруйскім будтрэстам № 13 | 41–45 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | да 1 года |
| Упраўляючы будтрэстам № 17 “Лаўсанбуд” | 41–45 | выш. інж. | рус. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Упраўляючы будтрэстам № 10 “Цэментабуд” | 51–55 | выш. інж. | яўр. | ад 5 да 10 год | ад 1 да 3 год |
| Начальнік Бабруйскага домабудаўнічага камбіната | 36–40 | выш. інж. | укр. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Начальнік праектна-прамыслова-будаўнічага аб’яднання “Магілёўжылбуд” | 46–50 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 3 да 5 год |
| Генеральны дырэктар Магілёўскага ВА хлебапрадуктаў | 56–60 | выш. інж. | рус. | ад 5 да 10 год | ад 5 да 10 год |
| Дырэктар прадпрыемства мясной прамысловасці | 41–45 | выш. інж. | рус. | больш 10 год | больш 10 год |
| Дырэктар прадпрыемства мясной прамысловасці | 41–45 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар прадпрыемства мясной прамысловасці | 46–50 | выш. інж. | бел. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |
| Дырэктар прадпрыемства мясной прамысловасці | 51–55 (ж) | выш. экан. | пал. | больш 10 год | ад 3 да 5 год |
| Дырэктар Бабруйскага маслабойнага завода | 41–45 (ж) | выш. інж. | рус. | больш 10 год | ад 1 да 3 год |

[1] Список к статистичекому отчёту о составе и сменяемости кадров Могилёвской области по состоянию на 01.07.1988 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 99-162.

## Спіс скарачэнняў

**Аблвыканкам** – абласны выканаўчы камітэт
**АК** – абласны камітэт
**БРСПС** – Беларускі рэспубліканскі савет прафесійных саюзаў
**БССР** – Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка
**ВА –** вытворчае аб'яднанне
**ВНУ –** вышэйшыя навучальныя ўстановы
**ВПК** – ваенна-прамысловы комплекс
**ВС** – Вярхоўны Савет
**Гарвыканкам** – гарадскі выканаўчы камітэт
**ГК** – гарадскі камітэт
**ДАВц** – Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці
**ДАГАМаг** – Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці
**ДАГом** – Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці
**ДАГАГом** – Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці
**ДАМаг** – Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці
**ДАРФ** – Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі
**ЗДА г. Орша** – Занальны дзяржаўны архіў у г. Оршы
**ЗДА г. Полацк** – Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку
**ІТР** – інжынерна-тэхнічныя работнікі
**КНК –** камітэт народнага кантролю
**КПБ** – камуністычная партыя Беларусі
**КПСС** – камуністычная партыя Савецкага Саюза
**н. г. (нав. г.) –** навучальны год
**НАРБ** – Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь
**НТП (НТР)** – навыкова-тэхнічны прагрэс (рэвалюцыя)
**Райвыканкам** – раённы выканаўчы камітэт
**РДАНГ** – Расійскі дзяржаўны архіў навейшай гісторыі
**РК** – раённы камітэт
**РСФСР** – Расійская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка
**Саўнаргас –** Савет народнай гаспадаркі
**СМ** – Савет Міністраў
**СНГ –** савет народнай гаспадаркі
**СССР** – Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік
**УсеКП(б) –** Усесаюзная камуністычная партыя (бальшавікоў)
**УсеЦСПС** – Усесаюзны цэнтральны савет прафесійных саюзаў
**УсеЛКСМ** – Усесаюзны ленінскі камуністычны саюз моладзі
**ЦК** – цэнтральны камітэт

## Summary

**Пушкин, И. А.** Кадровый потенциал промышленности восточных регионов БССР (1944–1991): монография / И. А. Пушкин, А. Г. Агеев. – Могилев: БГУТ, 2022. – 302 с.

В монографии охарактеризованы промышленность и кадры предприятий восточных областей Советской Беларуси в 1944–1991 гг., основные направления кадровой политики партийно-советского руководства как инструмента повышения эффективности работы промышленных предприятий; определены пути формирования и совершенствования кадрового состава промышленности; система переподготовки и повышения квалификации кадров для промышленных предприятий республики; проведен анализ кадрового потенциала с учетом последствий урбанизации; выявлено влияние геополитических, социально-политических, демографических, аксиологических, социокультурных, гендерных, научно-технических, экономических и производственных факторов, межэтнического взаимодействия на процессы формирования, совершенствования и реализации кадрового потенциала белорусской промышленности; определены экономические и социальные проблемы, оказавшие значительное влияние на формирование и совершенствование кадрового потенциала промышленности восточной Беларуси и меры по их преодолению в 1944–1991 гг.

**Pushkin, I. A.** Personnel potential of industry in the eastern regions of the BSSR (1944–1991): monograph / I. A. Pushkin, A. G. Ageev. – Mogilev: BSUT, 2022. – 302 p.

The monograph describes the industry and personnel of enterprises in the eastern regions of Soviet Belarus, the main directions of the personnel policy of the Soviet leadership as a tool for increasing the efficiency of industrial enterprises in 1944–1991; the ways of formation and improvement of the personnel structure of the industry are determined; a system of retraining and advanced training of personnel for industrial enterprises of the republic; an analysis of human resources was carried out, taking into account the consequences of urbanization; the influence of geopolitical, socio-political, demographic, axiological, socio-cultural, gender, scientific, technical, economic and production factors, interethnic interaction on the processes of formation, improvement and implementation of the personnel potential of the Belarusian industry was revealed; the economic and social problems that had a significant impact on the formation and improvement of the personnel potential of the industry of Eastern Belarus and measures to overcome them in 1944–1991 were identified.

*Навуковае выданне*

**Пушкін** Ігар Аляксандравіч
**Агееў** Аляксандр Рыгоравіч

КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ПРАМЫСЛОВАСЦІ
ЎСХОДНІХ РЭГІЁНАЎ БССР (1944–1991)

Манаграфія

Тэхнічны рэдактар *К. А. Дзянісава*
Карэктар *Л. А. Пушкіна*
Дызайн вокладкі *К. А. Дзянісавай*

Падпісана да друку 06.10.2022.
Фармат 60×84 1/16. Гарнітура Times New Roman. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 17,6. Ул.-выд. арк. 22,6.
Тыраж 100 экз. Заказ 126.

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/272 ад 04.04.2014.
Пр-т Шміта, 3, 212027, Магілёў.

Надрукавана ва ўстанове адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій».
Пр-т Шміта, 3, 212027, Магілёў.